ARCHE Зьмест № 3’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. Рэжым і рэвалюцыя. Круглы стол у Рэдакцыі «ARCHE».
3. Віталь Сіліцкі. Палітычная кухня прэзідэнцкіх выбараў.
4. Юры Чавусаў. Ня бойцеся вызваленьня.
5. Сяргей Богдан. Амэрыканскія мары пра беларускую ўладу.
6. Алена Карасцялёва. Якасць дэмакратыі ў Беларусі й Украіне.
7. Алесь Смалянчук. Навошта Лукашэнку Трашчанок?
8. Міхась Тычына. Прывід гіпэртэксту.
9. Пётра Рудкоўскі. Як Пазьняк стаўся закладнікам Гісторыі.
10. Даніла Жукоўскі. Вылоўліванне ідэй з паветра.
11. Сяргей Навумчык. Сем гадоў Адраджэньня.
12. Павал Абрамовіч. Жорсткасьці.
13. Аляксей Каўка. Як Улашчык за мяжу ўцякаў.
14. «Не вечна беларускую культуру будуць таптаць генеральскія боты». Гутарка з пісьменнікам Анатолем Кудраўцом
15. Дзмітры Дзмітрыеў
16. Аляксей Дзермант, Сяргей Санько. Этнагенез Беларусаў II: Яшчэ раз пра навуку і ідэалогію, або Куды вядзе «логіка здаровага розуму»
17. Фрагмэнты абмеркаваньня артыкулу Пётры Рудкоўскага «Ad vocem» на сайце www.belintellectuals.com
18. Дзіма Смалякоў. Адчужаныя сутнасці Алены Гапавай
19. Алена Гапава. Усё адразу
20. Анатоль Трафімчык. Развянчанне брэнду беларускага Таджыкістана

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
[image]
3[image]-[image]**2006**
аналітыка•крытыка•гісторыя•эсэістыка•літаратура•палеміка•рэцэнзіі
[image] [image] [image]
[image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

АНАЛІТЫКА

РЭЖЫМ І РЭВАЛЮЦЫЯ Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE»
ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Палітычная кухня прэзыдэнцкіх выбараў
ЮРЫ ЧАВУСАЎ Ня бойцеся вызваленьня
СЯРГЕЙ БОГДАН Амэрыканскія мары пра беларускую ўладу
АЛЕНА КАРАСЬЦЯЛЁВА Якасьць дэмакратыі ў Беларусі і Ўкраіне

КРЫТЫКА

АЛЕСЬ СМАЛЯНЧУК Навошта Лукашэнку Трашчанок?
МІХАСЬ ТЫЧЫНА Прывід гіпэртэксту
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Як Пазьняк стаўся закладнікам Гісторыі
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Вылоўліваньне ідэй з паветра

ГІСТОРЫЯ

СЯРГЕЙ НАВУМЧЫК Сем гадоў Адраджэньня.
Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988–1995)

ЭСЭІСТЫКА

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Жорсткасьці
АЛЯКСЕЙ КАЎКА Як Улашчык за мяжу ўцякаў

ЛІТАРАТУРА

«Ня вечна беларускую культуру будуць таптаць генэральскія боты».
Гутарка зь пісьменьнікам АНАТОЛЕМ КУДРАЎЦОМ
ДЗЬМІТРЫ ДЗЬМІТРЫЕЎ Лірыка

ПАЛЕМІКА

АЛЯКСЕЙ ДЗЕРМАНТ, СЯРГЕЙ САНЬКО Этнагенэз беларусаў II: Яшчэ раз пра навуку і ідэалёгію, або Куды вядзе «лёгіка здаровага розуму»
Фрагмэнты абмеркаваньня артыкулу ПЁТРЫ РУДКОЎСКАГА «Ad vocem»
ДЗІМА СМАЛЯКОЎ Адчужаныя сутнасьці Алены Гапавай
АЛЕНА ГАПАВА Усё адразу

РЭЦЭНЗІІ

АНАТОЛЬ ТРАФІМЧЫК Разьвянчаньне брэнду беларускага Таджыкістану

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 3 (43) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/19
[image]

У круглым стале, які адбыўся 3 лютага, бралі ўдзел **Лявон Баршчэўскі** – ганаровы старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтру, галоўны рэдактар «ARCHE» **Валер Булгакаў**, галоўны рэдактар тыднёвіка «Наша Ніва» **Андрэй Дынько**, галоўны рэдактар часопісу «Палітычная сфера» **Андрэй Казакевіч**, актывіст нацыянальнага руху **Вадзім Карцаў**, незалежны палітоляг **Віталь Сіліцкі** й палітоляг **Андрэй Суздальцаў** – аналітык шэрагу расейскіх карпарацыяў.

Валер Булгакаў: Аляксандар Фядута, якому сёньня не ўдалося да нас прыйсьці, нядаўна ў прыватнай размове па-свойму глыбока пажартаваў: магчыма, галоўны вынік гэтай выбарчай кампаніі будзе ў тым, што па яе выніках Л… нікога не заб'е. Якія высновы зь яе можна зрабіць яшчэ сёньня? Што вас найбольш уразіла падчас гэтай кампаніі? Што стала для вас нечаканасьцю?

Лявон Баршчэўскі: Літаральна паўтара дня мне ўдалося паўдзельнічаць у зборы подпісаў, і мяне ўразіла ня проста пасіўнасьць маладога электарату, а хутчэй нават агрэсіўнае непрыманьне палітыкі – моладзь ня хоча нават весьці размову на гэтую тэму. Вялікі кантраст з тым, што было 10 год таму.

Андрэй Суздальцаў: Па-першае, зьдзівіў перанос выбараў на сакавік. Мы адчувалі, што 2006 год – вялікая праблема для ўлады, бо намяшана ўсяго: замежны фактар, унутраны фактар, эканоміка падвісала, энэргетыка найперш. І калі мы зразумелі, што выбары будуць перакінутыя на сакавік (гэта было ў другой палове кастрычніка), то доўгі час у гэта проста ня верылі. Потым паверылі. Гэта першы такі радыкальны выпадак – перакід выбараў амаль на паўгоду.

Другі момант: зьдзівіла слабасьць улады, якая праявілася ва ўсім – у мітусьні, быстрым павароце да выбараў. Хутка быў скачаны сцэнар, збор подпісаў. Улада зьбірала подпісы. Здавалася б, што ЦВК цалкам у руках улады, усе гэтыя пытаньні можна цалкам вырашаць. Але яны гэта рабілі! Гэта гаворыць, што ня ўсе магчымасьці ўлада мае на гэтых выбарах. Яшчэ зьдзівіла наіўнасьць Масквы, якую трэці раз «кінулі» зь «Бел-трансгазам». Я вось на Радзе замежнай і абароннай палітыкі выступаў, казаў: не хвалюйцеся – увосень будуць яшчэ раз «Белтрансгаз» прадаваць, у чацьвёрты раз. У іх там эўфарыя ад узьніклай магчымасьці, яны лічаць, што гэтае пытаньне яны могуць «разруліць». Але я думаю, што яны ня змогуць яго «разруліць» – да лета дакладна.

Глябальныя праблемы, якія паўсталі перад краінай, сёлета склаліся разам – гэта таксама зьдзівіла. І я нават закідаю такую крамольную думку: які б ні быў чалавек ва ўладзе, зь якім заўгодна прозьвішчам, ён іх бліжэйшым часам ня вырашыць.

Віталь Сіліцкі: Зьдзівіла, што некаторыя рэчы робяцца зусім не празрыста. Прызначэньне выбараў на наступны дзень пасьля візыту ў Расею пры тым, што апошнімі трыма гадамі грымела ў афіцыйным дыскурсе тэма незалежнасьці. А тут адкрыта паехаў, прыехаў – прызначыў выбары. Зьдзівіла лічба 1 мільён 900 тысячаў падпісантаў за Лукашэнку. Шмат каго заганялі... Ну, усе ведалі, як зьбіралі подпісы. Вялікае глупства! Мільён з гэтых подпісаў можна было сабраць і так, а пасягнуўшы на другі мільён – паказваюць грамадзтву наўпрост, што гэта за кампанія. Зьдзівіў нейкі мэтафізычны страх улады, нягледзячы на тое, што цяпер яна можа ажыцьцяўляць любыя палітычныя праекты ў межах Беларусі. І дабіцца пераабраньня Лукашэнкі

для яе не стварала вялікай праблемы. Гэта паказальны страх!

Не магу сказаць, што гэта нечаканасьць. Такой «тапорнай» лініі ўлады я й чакаў, маючы на ўвазе тое, што адбылося ў Беларусі за апошнія два гады. Але ж усё роўна ўражвае.

Прыемна ўразіла, што нягледзячы на ўсё дэмакратычная апазыцыя даказала, што яна яшчэ захавалася (гэта як мінімум). Што будзе далей і ці можа яна выціснуць з факту ўласнага захаваньня штосьці большае – пакажа час.

Андрэй Дынько: Першым моцным досьведам для мяне стала забарона распаўсюду прэсы. Мы ў СМІ чакалі рэпрэсіяў, але не ўяўлялі, што гэта будзе так адразу і татальна. Зь іншага боку, я асабіста чакаў, што будучая кампанія прынясе таксама блякаваньне Інтэрнэту, а такога дагэтуль не адбылося.

Таксама я быў уражаны тым, што ўлада вырашыла сапраўды зьбіраць подпісы. Яна кінула гэтых бедных БРСМаўцаў стаяць на марозе і хадзіць па кватэрах, дзе людзі іх лаялі і пракліналі за дзьвярыма. Падчас папярэдніх кампаніяў улада зьбірала подпісы старым савецкім мэтадам – у працоўных калектывах, і ўсё.

Я, папраўдзе, чакаў горшага і ў дачыненьні да стану правоў чалавека ў Беларусі. Я думаў, што ў нас могуць распачацца масавыя арышты, але пакуль усё абмежавалася адзінкавымі выпадкамі для застрашваньня моладзі. Хочацца спадзявацца, што гэта адбываецца ня дзеля загаду ўладаў, а дзеля пасіўнага супраціву рэпрэсіўнае машыны, якая ня хоча заводзіцца.

Што датычыць дэмакратычнае апазыцыі, тут два найбольшыя ўражаньні процілеглыя. З аднаго боку, прыкра, што дэмакратычная апазыцыя ня здолела сабраць 250 тысячаў подпісаў, пра якія заяўляла, ня кажучы ўжо пра 500 тысячаў ці мільён, на якія Калякін замахваўся раней. Зь іншага боку, за чатыры месяцы пасьля правядзе-ньня Кангрэсу дэмакратычных сілаў уладам не ўдалося адкалоць ад кааліцыі ніводнага яе элемэнту. Пры ўсіх намёках, што раскольнікі атрымаюць магчымасьць выступаць на БТ і гарантыі ўласнай недатыкальнасьці. Гэта фэнамэнальна! Наша грамадзянская

супольнасьць сталейшая, чым мы самі меркавалі.

Вадзім Карцаў: Уражвае падабенства цяперашняй кампаніі з выбарамі-2001 і рэфэрэндумам-2004. І тады, і цяпер аб'яднаная апазыцыя не агучвае выразнага пляну перамогі.

Андрэй Казакевіч: Зьдзівіла адсутнасьць зьдзіўленьняў. Сумная кампанія, неактыўная. На пачатку восені падавалася, што ўсё будзе жарстчэй, але й дынамічней. Калі выключыць розныя дэталі (СМІ, папраўкі ў Крымінальны кодэкс), то збольшага можна назіраць працу добра адладжанай бюракратычнай машыны. Нават ціск на розныя структуры, як падаецца, ня столькі вынік цэнтралізаванае палітычнае працы, колькі ведамаснае лабіраваньне нейкіх захадаў, каб пацьвердзіць свой палітычны статус. Не было нечаканых хадоў ні з боку апазыцыі, ні з боку ўлады. Такое адчуваньне, што абодва бакі гэта збольшага задавальняе.

Кампанія ўладаў – хутчэй бюракратычная. На праспэктах вісяць плякаты «За Беларусь!» – больш рэкляма «сыстэмы», чым самога Лукашэнкі. У дзяржаўных СМІ падкрэсьліваецца, што была створана асаблівая беларуская мадэль – самадастатковая і самакарысная, прычым практычна безасабовая. Прэзыдэнт прысутнічае, але на другім узроўні: Лукашэнка тут толькі сымбаль, гарант.

Віталь Сіліцкі: Наконт стылю кампаніі. Сацыёлягі кажуць, што зьмянілася стаўленьне да Лукашэнкі ў грамадзтве – да больш рацыянальна-традыцыйнага. Харызматычнасьць улады выдыхаецца, і застаецца адзін толькі сацыяльны кантракт. Грамадзтва больш не чакае цудаў, а проста жыве. Як па-мойму, рэжым Лукашэнкі ўваходзіць у пэрыяд брэжнеўшчыны. Ня ведаю, ці позьні гэта пэрыяд – застой працягваўся ж 18 гадоў. Як мінімум, гэта сярэдні Лукашэнка. Пэрыяд раньняга лукашызму ўжо відавочна закончыўся. Сёньня гэта сярэдні ці позьні лукашызм – час пакажа.

Лявон Баршчэўскі: 75-ты год.

Віталь Сіліцкі: Вось менавіта так – сярэдзіна 70-х гадоў у Беларусі вярнулася. А што такое застой? Калі нізы ня ведаюць,

як жыць па-новаму, а вярхі ня хочуць і ня здольныя нічога ўспрыняць – такая, калі хочаце, контрарэвалюцыйная сытуацыя пры спрыяньні вонкавых фактараў (а Савецкі Саюз існаваў у застойным стане таксама шмат у чым пры спрыяньні вонкавых фактараў). Дабрабыт вялікай імпэрыі таксама залежаў ад тых жа цэнаў на энэрганосьбіты. Але ж там былі іншыя цэнавыя варункі. Як кажуць, што расейцу добра, то беларусу (у сэнсе газавых цэнаў) – сьмерць. Гэта адна з супярэчнасьцяў беларуска-расейскіх адносінаў – майце на ўвазе.

Так што сёньня ў Беларусі брэжнеўшчына. Потым наступае перабудова...

Андрэй Суздальцаў: Брэжнеўшчына – гэта посттаталітарная фаза. Чым характэрная посттаталітарная фаза? Гэта ўсеагульная крывадушнасьць. Ніхто ні ў што ня верыць. Кухня, фразы «ну, вы ж разумееце, такая сытуацыя», ханжаства глябальнае – калі настаўнікі ў вучняў просяць прабачэньня («ну, трэба там, зразумейце»). Бунтуюць дзеці ў школе: «Ды навошта гэтая фігня?» –«Ну, трэба». Гэта пра што кажа? Гэта прыводзіць звычайна да 1991 году, калі ўся Масква езьдзіла на рынкі, лецішчы і г. д., а нехта там у цэнтры ладзіў путч і ў выніку – Саюзу ня стала. Ніхто ня выйшаў! І ён гэта адчувае: што ён слабы, што ён адзін! Пабудаваная сыстэма на адным чалавеку. Вось паваліўся, нагу паламаў – катастрофа, трагедыя. І ўсе гэтыя размовы – пра эканамічную бясьпеку, звароты ў Кітай (гэта шукаецца замена Расеі, нейкія варыянты). Усе гэтыя рэчы – посттаталітарны момант. Таму я ўсё ж такі за «позьняга Лукашэнку». Чаму? Бо ён не ньюсмэйкер! Раней як было? 96-ты, 97-ты, 98-ты гады: ён адчубучыць што на экране, едзеш у тралейбусе – увесь тралейбус абмяркоўвае! Цяпер хоць голым бегай па экране – нуль увагі! Ён там увечары вяшчае з экрана: «Усіх паперасаджу!» Даўно не саджае нікога. А зранку ў тралейбусе – цішыня, усе занятыя сваімі справамі.

Вось тут нехта сказаў, што прызвычаіліся. Ён упісаўся ў агульную карціну. Людзі зразумелі, што не ад яго многія рэчы залежаць. Народ беларускі – надзвычайны: ён настолькі інтуітыўна выбірае тое, што мае нейкае значэньне і нейкі ўплыў – проста на кончыках пазногцяў адчувае.

Віталь Сіліцкі: Адрозьненьне лукашызму ад брэжнеўскага застою ў тым, што тадышняя сыстэма раптам пад уплывам нейкіх абставінаў пачала самарэфармавацца. І гэта стварыла пэўны досьвед, які ўжо мае Лукашэнка. Ён ведае, да чаго прыводзіць самарэфармаваньне. Таму мне здаецца, гэта не настолькі яшчэ «позьні лукашызм», але магчыма, я памыляюся...

Валер Булгакаў: Баюся, гэтыя вашы развагі малацікавыя для чытачоў. Пра гэты лукашызм-брэжневізм мне сем гадоў назад за півам гаварыў Алесь Анціпенка. Кожны жорсткі аўтарытарны рэжым, які не дапускае палітычнай канкурэнцыі, мае сваю лёгіку разьвіцьця – ён старэе, губляе жыцьцёвасьць адначасна з сваім лідэрам. Давайце паспрабуем намацаць іншыя ніткі для аналізу.

Сп. Суздальцаў увесь час выстаўляе Расею як «белую і пушыстую». Маўляў, тра-гічна наіўнае расейскае кіраўніцтва раз за разам купляецца на падступныя ашуканствы беларускага рэжыму, таму і забясьпечвае фэнамэнальна нізкую цану на газ для Беларусі напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў.

Што да адзінага дэмакратычнага кандыдата. Здаецца, Мілінкевічу ўдалося тое, чаго не ўдавалася зрабіць ніводнаму яго папярэдніку. Такога кансэнсусу сярод элітаў краінаў эўрапейскай супольнасьці ў прыняцьці беларускага дэмакратычнага лідэра я не прыпомню. Па-за нашай увагай застаюцца таксама важныя аспэкты кампаніі дэмакратычных сілаў – праца выбарчага штабу, узаемадзеяньне паміж суб'ектамі шырокай міжпартыйнай кааліцыі, агітацыйнае і сымбалічнае забесьпячэньне кампаніі, яе мабілізацыйны складнік. Цікава было б пачуць вашы ацэнкі ўсяго гэтага.

Андрэй Казакевіч: Яшчэ год таму даводзілася чуць, што Расея можа не падтрымаць Лукашэнку ці разыгрываць іншыя палітычныя праекты ў Беларусі. Цяпер пра гэта болей ня згадваюць. У прынцыпе, неймаверна, каб Расея не падтрымала Лукашэнкі. Беларусь – адзіная краіна ў рэгіёне, якая захоўвае палітычную ляяльнасьць Расеі. Натуральна, што пры захаваньні гэтага рэжыму будзе трываць ізаляцыя ад Захаду, а значыць і палітычная ляяльнасьць і дастатковая вонкавапалітычная

непаўнавартасьць Беларусі. Электаральная сытуацыя для Лукашэнкі спрыяльная. Таму прамое атакаваньне Лукашэнкі Крамлём і рызыкоўнае, і патрабуе зашмат рознага кшталту рэсурсаў. Ці магчымая нейкая зьмена пазыцыі ў 2011 годзе? Я ня думаю, што гэта будзе залежаць ад самой Расеі. Пры зьмене сытуацыі ў Беларусі і ўзьнікненьні пагрозы для рэжыму Расея, натуральна, прыкладзе намаганьні, каб перамог нехта больш-менш ляяльны. Але сама Расея ня будзе праводзіць сплянаванай палітыкі для канструяваньня тут новых палітычных праектаў. Гэта будзе хутчэй рэакцыя на тое, што тут адбываецца, пры жаданьні захаваць той статус, які яна мае.

Валер Булгакаў: Сп. Суздальцаў і іншыя палітычныя камэнтатары, якія прытрымліваюцца такога аналітычнага стылю, шмат гавораць, што магчымы раптоўны паварот лукашэнкаўскага рэжыму ў бок Захаду і NATO. Ці ёсьць нехта, згодны з такім меркаваньнем?

Андрэй Казакевіч: Гэта немагчыма. Пытаньне ня ў тым, што Лукашэнка ня хоча гэта зрабіць. Проста сама лёгіка ўзаемаадносінаў з Захадам мае пэўныя правілы. Калі быў створаны імідж Лукашэнкі як чалавека, які парушае правы чалавека, нацыянальных мяншыняў, прыняты адпаведныя заявы, калі ўжо былі створаныя дастаткова аформленыя групы ў Эўропе, якія дрэнна ставяцца да гэтага рэжыму, то звычайныя дэклярацыі Лукашэнкі ня будуць мець ніякага значэньня. Пераарыентацыі ня будзе, пакуль ня будзе зьмененая прынамсі галоўная фігура – замест Лукашэнкі нехта іншы, хто ўжо ня будзе мець усяго гэтага іміджу. NATO, Эўрапейскі Саюз і г. д. – структуры ўсё ж бюракратычныя. І раз было прынята рашэньне аднесьці Беларусь, умоўна кажучы, да «краінаў-ізгояў», перайграць яго цяжка. Трэба зноў падключаць розныя бюракратычныя мэханізмы, пераадольваць супраціўленьне арганізацыяў і краінаў, якія будуць супраць гэтага. Напрыклад, Польшча, Літва ці праваабарончыя арганізацыі, хутчэй за ўсё, будуць падтрымліваць пазыцыю, зь якой выступае беларуская апазыцыя. Калі спатрэбілася 5–7 гадоў, каб Беларусь як палітычная праблема зьявілася ў эўрапейскім парадку дня, то спатрэбіцца яшчэ ня ведаю колькі гадоў для таго, каб яе адтуль скінуць.

Віталь Сіліцкі: Андрэй Суздальцаў любіць нагадваць пра ордэн, які Юшчанка даў Туркмэнбашы. Ведаеце, Чаўшэску атрымліваў ордэны ад заходніх дзяржаваў, але адна справа – з кімсьці піць каньяк, а іншая – пэўныя інстытуцыянальныя сувязі з пэўнай палітычнай прасторай, якая заснавана не на асабістых сувязях і нават не на эканамічных інтарэсах, а на супольных мэтах і каштоўнасьцях. Таму давайце ўсялякія гаворкі пра паварот на бок Захаду проста спынім.

Я хачу таксама адказаць Валеру, што мусіць зрабіцца ў Беларусі, каб у 2011 годзе Расея падтрымала кагосьці іншага. Для гэтага Лукашэнка павінен правесьці пэўную лібэралізацыю – каб стварыць магчымасьці для такой падтрымкі. Цяпер ніхто, у тым ліку Расея, ня можа рэалізаваць палітычныя праекты ўнутры Беларусі, бо такіх магчымасьцяў не існуе. Ёсьць магчымасьці вонкавага ціску. Я згаджуся, што яны патэнцыйна больш эфэктыўныя з боку Расеі, чым з боку Захаду, але там таксама ёсьць пэўныя абмежаваньні. Дык вось, першае – гэта лібэралізацыя, што створыць магчымасьці. Па-другое, Лукашэнка павінен распачаць будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы, што створыць сэнс такой падтрымкі. Бо стан, у якім замарожана Беларусь – бюракратычнай, а не нацыянальнай дзяржавы, – абсалютна задавальняе Расею і пазбаўляе сэнсу любы ціск на Лукашэнку, за выключэньнем дробнага эканамічнага.

Валер Булгакаў: Калі палітычна Лукашэнка больш-менш незалежны – Вы сказалі, што ён можа блякаваць альтэрнатыўныя праекты, – то наколькі ён эканамічна самастойны? Наколькі беларуская эканоміка ў сьвятле пераарыентацыі экспартных плыняў на Эўрасаюз дазваляе яму мець поле для манэўру?

Віталь Сіліцкі: Я б сказаў – *Лукашэнка* ня мае. Ісьці на структурную перабудову беларускай эканомікі, якая б дазволіла прыстасавацца да жарстчэйшых умоваў па коштах на газ, – гэта таксама азначае праводзіць дэмантаж, поўны ці частковы, свайго палітычнага рэжыму. А беларуская экано-міка магла б з гэтага скарыстаць – гэта безумоўна! Яна выжывала і ў сярэдзіне 90-х, калі крызіс, які мы мелі, быў крызісам менавіта

прамысловых гігантаў. Лукашэнка амаль захаваў тую эканамічную структуру, але і там ёсьць пэўныя зьмены. У машынабудаваньні занятасьць скарацілася, скажам, удвая ў параўнаньні з савецкім часам. Але засталіся тыя самыя праблемы, дылемы й міты, якія панавалі ў нас 10–15 гадоў таму.

Андрэй Суздальцаў: Наконт павароту на Захад. Спадарства, ён столькі паваротаў зрабіў за гэтыя гады! Пачаў з таго, што прадаў адзіны С-300 амэрыканцам за капейкі, зьезьдзіў у ЗША і потым бравіраваў гэтым перад Масквой. Потым ён ударыўся ў інтэграцыйны гвалт. Потым забраў практычна ўсе сьцягі БНФ: стаў ярым прыхільнікам незалежнасьці й г. д. Гэта тры павароты! Думаеце, цяжка павярнуць? Зразумейце маленькую рэч: гэта мы разумеем, што на Захадзе яму рабіць няма чаго, але ж ён так ня лічыць! Ён лічыць сябе маладым, жвавым, што ён усіх можа прычараваць. Новая легітымнасьць, новыя магчымасьці. Лічы – новы тэрмін!..

Галоўная віна Лукашэнкі ў чым? Маючы ўсе легальныя магчымасьці для таго, каб эканоміку насамрэч рэфармаваць, перарабіць (калі ўжо так хацелася – нават пад кітайскі варыянт, дзе ёсьць дзіўнае спалучэньне вечных дзядоў у кіраўніцтве і цалкам рынкавай эканомікі), і гэтага не зрабіў! Вось галоўная бяда яго. Ён патрапіў у пастку і зацягнуў туды ўсю краіну. 2006 год – няпросты год для Беларусі. Незалежна ад таго, хто будзе абраны.

Віталь Сіліцкі: Наконт газавага канфлікту з Расеяй у мяне ёсьць вэрсія. Што адбудзецца пасьля выбараў? У красавіку я чакаю велізарнага скандалу і канфлікту з Расеяй. А ці ня будзе гэта драматургія, каб адцягнуць увагу ад праблемы магчымых злоўжываньняў на выбарах, каб увагу ўнутры і міжнародную перацягнуць да новай валтузьні й канфрантацыі з Расеяй?

Андрэй Суздальцаў: 3 млрд 800 млн даляраў – цана пытаньня! Якое тут «адцягнуць увагу»?

Віталь Сіліцкі: Паколькі Лукашэнка прадае «Белтрансгаз» трэці раз, я адмаўляюся верыць, што Расея пасьля першых двух разоў нічому не навучылася. І што гэты працэс дзесьці ня

ўзгоднены і няма паразуменьня наконт таго, што насамрэч адбываецца.

Лявон Баршчэўскі: Лукашэнка быў, безумоўна, адным з падтрыманых Расеяй праектаў. Вядома, цяпер у Расеі існуюць розныя структуры, якія па-рознаму ставяць на некага, рыхтуюць некага, бачаць у некім пэрспэктыўнага для Расеі палітыка. Яны будуць існаваць і далей. Але, па-мойму, на сёньня альтэрнатывы Лукашэнку Расея ня бачыць.

Вадзім Карцаў: Падтрымка Крамлём рэжыму Лукашэнкі можа мець грунтам толькі адно – Расеі гэта выгадна эканамічна. У аснове любых палітычных працэсаў ляжыць эканоміка – з гэтым не спрачаюцца ад часоў Маркса. Таму разважаць, «ці пражывём мы без Расеі», некарэктна. Насамрэч, Расея зарабляе на Беларусі і няблага зарабляе.

Валер Булгакаў: Пераходзім да наступнага блёку. Мілінкевіча з уздымам сустракаюць на Захадзе, ажно нейкі прадстаўнік беларускага МЗС публічна выказаў зьдзіўленьне, чаму гэта шараговаму кандыдату надаецца такая надзвычайная ўвага. Што гэта значыць?

Віталь Сіліцкі: Гэта кампэнсацыя ранейшага голаду. Дагэтуль альтэрнатыўная Беларусь (нават не бяру беларускай апазыцыі) ніколі не імкнулася так сябе ўвасобіць у канкрэтнай пэрсоне. Гэта, можа, нават не залежыць ад асабістых якасьцяў сп. Мілінкевіча, а ад абранай стратэгіі і ад пэўнага чаканьня з боку Захаду. Тое самае пытаньне задае беларускі абываталь: калі не Лукашэнка, дык хто? Вось паказалі – напрыклад, гэты. І зьявілася ўвасабленьне.

Міжнародны посьпех яшчэ не азначае ўнутранага посьпеху. Аднак і на ўнутраным палітычным рынку альтэрнатыўны кандыдат цяпер знаходзіцца ці не ў найлепшым стане за ўсе лукашэнкаўскія гады, нягледзячы на тое, што электаральныя рэсурсы самога Лукашэнкі таксама ў найлепшым стане. Сам факт увасабленьня альтэрнатывы спрацаваў, і ў студзені рэйтынг адзінага кандыдата дасягнуў 16–18 %. Ці досыць гэта для перамогі? Думаю, што не. Але сама тэндэнцыя пэўнай палярызацыі, разьмежаваньня і вызначэньня альтэрнатывы

спрацавала.

Андрэй Дынько: У праграмным інтэрвію Лукашэнкі нацыянальным тэлеканалам ён упарта стараўся даказаць несамастойнасьць беларускай апазыцыі, асацыятыўна зьвязаўшы яе з Захадам: разоў пяць згадваў яе ў зьвязку з замежнымі пасольствамі і г. д. Напэўна, гэтае раздратаваньне выкліканае найперш адваротным – пасьлядоўнай самастойнасьцю беларускай апазыцыі. Калі параўноўваць нашу дэмакратычную апазыцыю з апазыцыяй у Расеі, то заўважаеш, наколькі беларуская апазыцыя не кіраваная рэжымам. У Расеі апазыцыя пагаджаецца на сыстэму кіраванай дэмакратыі, удзельнічае ў ёй, гуляе па яе правілах! А беларуская – захоўвае вернасьць сваім ідэалам. Таму я ня схільны празь меру крытыкаваць беларускую апазыцыю. Яе цяперашні дыпляматычны наступ ня быў бы такім пасьпяховым, калі б ён не грунтаваўся на ўнутраных посьпехах адзінага кандыдата, які ня даў ніякае падставы для аслабленьня кааліцыі і пазьбягаў рэзкіх крокаў. Сп. Казакевіч трапна заўважыў, што кампанія прадказальная і прэсная, людзі робяць тое, чаго ад іх і чакалі. Але па-свойму ўражвае, што апазыцыя не зрабіла ніводнай істотнай памылкі за час гэтай кампаніі.

Фэномэн Мілінкевіча, які ў неспрыяльных палітычных умовах здолеў мабілізаваць унутраныя і замежныя рэсурсы для сваёй кампаніі, заўдзячвае і таму, што быў абраны палітык не з лукашэнкаўскага кубла, а які ўвасабляе сабою выразную альтэрнатыву Лукашэнку– ідэалягічную, культурную.

Андрэй Казакевіч: А я стаўлюся да кампаніі Мілінкевіча крытычна. І не лічу, што быў нейкі міжнародны посьпех. Тое, што кандыдат быў прыняты шырока і добра на эўрапейскай прасторы, было вынікам аднаго факту – што Беларусь трапіла ў парадак дня як нейкая праблема. Прычынаў гэтага шмат: пашырэньне Эўразьвязу, канфлікт з Саюзам палякаў і інш. Але гэта ніяк не было зьвязана з «выдатнымі хадамі» адзінага кандыдата. Сапраўды, не было памылак, але не было й прарываў. Давайце зірнём на ўнутрынацыянальную кампанію. Былі зададзеныя пэўныя электаральныя рамкі (напрыклад, 20 %), рамкі паводзінаў (што можна рабіць, чаго нельга рабіць).

Між гэтых рамак праца ідзе, і нядрэнна: памылак няма. Але гэта праца ў межах вызначанага сэктару. Яна не арыентаваная на прарывы, рызыкоўныя хады. Ёсьць уражаньне, што ўсё гэта цалкам стасуецца з тым, што робіць улада. Ня тое, каб іх цалкам задавальняла гэтая сытуацыя, але яна зьяўляецца для іх прымальнай, бо не пагражае нейкай дэстабілізацыяй.

Аднак я ня думаю, што калі б адзіным кандыдатам быў абраны Лябедзька, кампанія была б іншай. Збольшага было б тое самае, Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы – калектыўны суб'ект, і тут далёка ня ўсё залежыць ад лідэра.

Віталь Сіліцкі: Было б тое ж самае!

Лявон Баршчэўскі: Кааліцыя магла б развалiцца.

Віталь Сіліцкі: Не развалілася б!..

Андрэй Дынько: Лукашэнкаўцы баяцца нацыянальнай ідэі і яе носьбітаў. Калі б Кангрэс дэмакратычных сілаў спыніў свой выбар на чалавеку, які ў меншай ступені зьяўляецца носьбітам нацыянальнай ідэі, які ў меншай ступені ўяўляў нечаканасьць для сыстэмы (а Мілінкевіч уяўляў нечаканасьць, гэта была новая фігура. Газэты змаглі пісаць пра яго, што гэта «новы лідэр апазыцыі». Мы не маглі б пісаць пра Лябедзьку, што гэта «новы лідэр». Мілінкевіч стаў «новым» і ў вачах сьвету), ён быў бы для лукашэнкаўцаў зручнейшы.

Калі б лідэр быў ня новы ці не гатовы выкарыстоўваць патэнцыял нацыянальнай сьвядомасьці, то, магчыма, мне было б сёньня лягчэй, бо распаўсюд прэсы не забаранілі б. Я гэтага не выключаю. Пэўныя крокі лукашэнкаўцаў былі яўна справакаваныя тым, што лідэр быў абраны і што гэта быў такі лідэр.

Андрэй Суздальцаў: Мілінкевіч мне, безумоўна, падабаецца як чалавек. Хаця ў палітычным пляне я лічу, што ў Беларусі тры рэальныя палітыкі: Лукашэнка, Лябедзька і Пазьняк. Я прыхільнік Лябедзькі як палітыка, і не хаваю гэтага. А Лукашэнка – не баіцца ён нацыянальнай ідэі! Іншая рэч, што Лукашэнка пакуль не інтэграваў сабе статуснай арганізацыі.

Таварыства беларускай мовы трактуе пытаньні беларускай мовы. Вось як мы дамагліся таго, што беларуская мова ператварылася ў мову палітычнага гета – гэта ўвогуле кашмар. Вырашыце пытаньне мовы – увогуле ўсе пытаньні паздымаюцца. Не баіцца Лукашэнка нацыянальнай ідэі! Ён іншага баіцца. Чаго? Лябедзьку! Бо Лябедзьку ведаюць у Расеі…

Валер Булгакаў: Нашто Лукашэнку баяцца Расеі, калі ён амаль дамовіўся пра ўступку ёй стратэгічнага актыву – «Белтрансгазу»?

Андрэй Суздальцаў: Гэты чалавек сваю дзялку зямлі, як лецішча, арашае, не апускаючы рукі. Ён манапалізаваў усе сувязі з Расеяй. І калі хтосьці прарываецца зь беларускага палітычнага поля (нават ягоныя людзі!) – гэта ўжо ворагі назаўжды! Гэта кармушка, дойная карова…

Лявон Баршчэўскі: Я адзін нюанс хацеў бы падкрэсьліць. Я ведаю ўзаемаадносіны ўнутры кааліцыі. Ведаючы ўнутраную кухню, кажу, што Лябедзька ня здолеў бы ўтрымаць кааліцыі, што дастаткова моцнага аўтарытэту ўнутры гэтай кааліцыі ў яго няма. Мякка кажучы, успрымаецца Лябедзька як малады й пэрспэктыўны палітык – ня больш за тое. А Мілінкевіч – як сталы дзядзька, ня надта нам знаёмы, але які недзе ва ўладзе працаваў, шмат чаго ведае.

Іншае пытаньне – як далей пойдзе гэтая кампанія ў існых варунках. Я даўно і прынцыпова не ўжываю слова «апазыцыя» ў тым сэнсе, у якім яго ўжываюць беларускія дзяржаўныя і недзяржаўныя СМІ. Апазыцыя – гэта ж пэўная група канцэнтраваньня й выяўленьня нечых канкрэтных інтарэсаў; людзі, якія рэпрэзэнтуюць групы, што рэальна ўплываюць на падзеі. У нас пасьля 1995–1996 гадоў і разгрому Вярхоўнага Савету сталі дысыдэнцкія групы, а не апазыцыя. Грамадзянская супольнасьць – магчыма. Але не апазыцыя. Таму як лідэр апазыцыі Мілінкевіч яшчэ не адбыўся і ня можа адбыцца. Але гэта пэрспэктыўны лідэр грамадзянскай супольнасьці, калі ўдасца яго асобу цярплівымі намаганьнямі захаваць на поле грамадзкай чыннасьці (бо ж будуць наскокі, спробы зваліць на Мілінкевіча віну, калі ня ўдасца перамагчы 19-га)… Калі

розуму, сталасьці, трываласьці хопіць у гэтай грамадзянскай супольнасьці далей рабіць у гэтым кірунку, гэта будзе пэрспэктыўна. Грамадзтва раней бачыла Пазьняка як пэрспэктыўную альтэрнатыву. Але ў сілу розных абставінаў, у тым ліку і паводзінаў самога Пазьняка не ў апошнюю чаргу, гэтая альтэрнатыва зьнікае. Моладзь ужо ня ведае нават гэтага прозьвішча. А многія нават ня чулі, хто такі Пазьняк.

Калі я хадзіў па кватэрах падчас збору подпісаў, была розная рэакцыя, але было й уражаньне, што прозьвішча Мілінкевіча шмат дзе ўжо чулі. Чула яго нават цётка, што захлопвала дзьверы перад табой, калі ты гаварыў: «Я з групы Мілінкевіча». Адказ мог быць: «Ня нада нам Мілінкевіч». Нечаканая пазнавальнасьць, якой ніхто не спадзяваўся дасягнуць за такі кароткі час. І далей гэта можна толькі палепшыць – насуперак прапагандзе! Я ведаю, БТ ужо зьняло фільм нейкі пра Мілінкевіча. Але гэта толькі дадасьць яму вядомасьці...

Валер Булгакаў: І апошняе. Што рабіць нашым чытачам 19 сакавіка?

Віталь Сіліцкі: …калі ў выбарчым бюлетэні застануцца «Саша і Сірожа»…

Лявон Баршчэўскі: Што рабіць? Калі была сыстэмная палітыка, калі была ўлада і апазыцыя, тады б маглі сур'ёзна гучаць развагі: байкот – не байкот, гэта, другое, трэцяе, прыкладам, Народнае галасаваньне... У нашым жа грамадзтве, даведзеным да стану абсалютнай пасіўнасьці (не ў апошнюю чаргу – намаганьнямі тых самых уладаў), любы грамадзкі чын – нават паход на абсалютна сфальсыфікаваныя выбары – у прынцыпе карысны. Нават (гэта мая асабістая пазыцыя!), калі ў бюлетэні будуць толькі «Саша і Сірожа». Можна ж, зрэшты, выкрэсьліваць усіх. Людзі павінны прывыкаць да нейкіх грамадзкіх чынаў. Беларуская палітыка як зьява павінна існаваць. Дый у дысыдэнцкім лягеры ўсе, здаецца, згодныя, што паўнавартасны байкот зарганізаваць у сёньняшніх варунках у Беларусі немагчыма. У 2000 годзе байкот адбыўся ў Менску, Віцебску, Горадні, Баранавічах, Наваполацку – сёньня й там гэта праблематычна. Таму на сёньня тэма байкоту адыходзіць, яе не абмяркоўваем. Можна скарыстаць любую кампанію на

сваю карысьць, у тым ліку – і на карысьць Мілінкевіча. Нават калі Мілінкевіча ня будзе ў бюлетэнях.

Віталь Сіліцкі: Я думаю, што ўсё ж будуць тры Сашы і Сірожа, а ня проста «Саша і Сірожа». Выключыць Мілінке-віча гвалтоўна з кампаніі – гэта было б фактычна прызнаць яго. На мой погляд, будзе рэалізаваны варыянт, калі Гайдукевіч выводзіцца на другое месца.

Валер Булгакаў: Чаму Гайдукевіч, а не Казулін?

Віталь Сіліцкі: А навошта Казулін? Навошта Гайдукевіч – я разумею. А навошта ім Казулін?

Валер Булгакаў: Новы брэнд, тонкая палітычная гульня… Ён гуртуе вакол сябе пад бел-чырвона-белым сьцягам «нацыянальна заклапочаных» пры дапамозе палітычна нізкавокіх і матэрыяльна своекарысьлівых беларускіх пісьменьнікаў. Прычым гэта робіцца настолькі тонка, як заўважыў неяк у размове Андрэй Дынько, што толькі на самым версе ведаюць, што Казулін – гэта новы Гайдукевіч, а для шараговага камэнданта інтэрнату ў Жабінкаўскім раёне ён застаецца здраднікам і адшчапенцам. Так расколваецца нацыянальны сьвядомы эклектарат: для ўладаў важна, каб выбары засьведчылі ня толькі абсалютную перамогу Лукашэнкі, але і поўную дыскрэдытацыю сапраўды апазыцыйнага кандыдата.

Віталь Сіліцкі: Казулін існуе менавіта для таго, каб Мілінкевіча паставіць на трэцяе, а магчыма – на чацьвертае месца ў гэтай гонцы. Вось пабачыце!

Андрэй Суздальцаў: Так няможна казаць: «праект улады» і ўсё іншае. Мы ж ня ведаем гэтых рэчаў. Можам здагадвацца пра нешта. Пакуль што па маіх выкладках выходзіць такая камбінацыя – Лукашэнка, Гайдукевіч і Казулін. Тры чалавекі ў бюлетэні. Лукашэнка не рызыкне, ён слабы. Не рызыкне разьбірацца з Захадам… І я згодны з сп. Баршчэўскім, што ў Мілінкевіча ёсьць вялікая будучыня ў пляне грама-дзянскай супольнасьці.

Вызначаць, хто за каго стаіць, Захад–Усход, – самая гадкая рэч гэта для Беларусі… Але Казулін прэтэндуе на нейкія сувязі з Масквой, ён мае там нейкія магчымасьці. То бок ён круціцца на камунікацыях Лукашэнкі. Хаця Гайдукевіч у кастрычніку-лістападзе дзе толькі мог і ня мог заяўляў пра тое, што яго падтрымлівае Захад.

Валер Булгакаў: Казулін фрагмэнтуе апазыцыю.

Віталь Сіліцкі: Адбыўся пераварот у партыі Статкевіча… Я ў твар сказаў прадстаўнікам «Грамады»: выкінуўшы Статкевіча, вы працягваеце яго былую справу, калі ў Статкевіча былі амбіцыі стаць галоўнай альтэрнатыўнай апазыцыяй. Відавочна, што гэтая праца ў пэўныя праекты ўпісваецца. Вось гэта і прывяло да ўзьнікненьня кандыдатуры Казуліна.

Андрэй Суздальцаў: Так, гэта аб'ектыўна фактар.

Віталь Сіліцкі: Падваеньне Казулін – Мілінкевіч дазваляе пры пэўных абста-вінах калі не зрабіць усё вельмі прыгожа, то прынамсі павазіць апазыцыю фэйсам аб глебу. Калі проста выкінуць Мілінкевіча з дыстанцыі, гэта выпісвае апазыцыі індульгенцыю. А калі пасадзіць Мілінкевіча на трэцяе ці чацьвертае месца… Што застанецца, выходзіць на вуліцу і крычаць: «Патрабуем другога месца!»…

Андрэй Суздальцаў: Ідзе спэцапэрацыя, каб Мілінкевіч і Казулін пачалі мяцеліць адзін аднаго. Іх нацкоўваюць адзін на аднаго, і на гэта ўсё разьлічана. І будуць да апошняга цягнуць – ледзь не да выбараў, – каб гэта адбывалася. Яны абапіраюцца на розныя сілы. Розныя сілы давалі ім авансы. І яны будуць іх адпрацоўваць. Безвынікова – ніякага зьняцьця ня будзе.

Андрэй Дынько: Усе канстатавалі, што кампанія ідзе прадказальна і ніхто козыраў з рукава не дастаў. Наадварот, Лукашэнка абмежаваў сваё поле для манэўру, анансаваўшы будучую канфрантацыю з Расеяй. У такім разе я не разумею, дзе ўлада можа знайсьці той рэсурс, каб зьнізіць папулярнасьць апазыцыйнага кандыдата Мілінкевіча, каб ён апынуўся на трэцім-чацьвертым месцы?

Віталь Сіліцкі: Хто кажа пра папулярнасьць?!

Андрэй Суздальцаў: Якія падлікі?!

Віталь Сіліцкі: Мы не гаворым пра нейкія рэчы, каб ня мець праблемаў з Кры-мінальным кодэксам.

Андрэй Дынько: Вашы словы не адпавядаюць беларускім палітычным рэаліям. Не было ў Беларусі ніводнай кампаніі, калі б вынікі, агучаныя Цэнтравыбаркамам, і рэальныя вынікі адрозьніваліся да супрацьлегласьці. Калі ў рэальнасьці ў грамадзтве на другое месца выходзіць Мілінкевіч, то ён выйдзе на другое месца і па выніках падліку. Іначай рэакцыя грамадзтва можа аказацца таксама прапарцыйна ўзмоцненая, і гэта нясе пэўную рызыку для легітымнасьці ўлады.

Лявон Баршчэўскі: Я запярэчу. Наша грамадзтва не такое салідарнае, як польскае, і ня будуць людзі масава гаварыць між сабой, хто за каго галасаваў. Адбылося – і ўсе гэта праглынулі. А ў красавіку, можа быць, пачнецца новая газавая вайна з Расеяй, Лукашэнка ўсіх змабілізуе, і ўжо нават сяму-таму сорамна будзе абмяркоўваць, што ты галасаваў ня так.

Андрэй Суздальцаў: Наконт выбарчай тэхналёгіі мы павінны разумець адну рэч. Ён павінен атрымаць больш за 90 % галасоў. Проста абавязаны! Гэта ж аўтарытарны лад, а не дэмакратыя. 52 % для яго – гэта страта ўлады. Нават 68 % – страта ўлады. 92 % павінна быць. Ён сам патрапіў у гэтую пастку, і накідвае, накідвае, накідвае...

Андрэй Казакевіч: Наконт 19 сакавіка я цалкам пагаджуся з Баршчэўскім. Прынамсі трэба прыйсьці прагаласаваць. І галасаваць нягледзячы на тое, хто будзе ў бюлетэні. Гэта ёсьць палітычным удзелам. І я ня думаю, што будуць маштабныя вулічныя акцыі пратэсту.

Вадзім Карцаў: Для ачышчэньня сумленьня я забяру бюлетэнь з сабою, а там пабачым. Ня варта цяпер адсоўваць ідэю Народнага галасаваньня. У мажлівасьці масавых дэманстрацыяў без рэалізацыі Народнага галасаваньня сумняюся, бо для дэманстрацыяў трэба ня толькі пратэстны

настрой, але й зачэпка. Нават тысяча афі-цыйных бюлетэняў такой зачэпкай стала б, а пратакол ЦВК – не, ня стане.

Віталь Сіліцкі: Абараняць другое месца ніхто ня будзе. Галоўная задача, якая цяпер стаіць перад апазыцыяй, – гэта данесьці да грамадзтва, што зьявілася пэўная альтэрнатыва. Гэта праграма-мінімум на гэтыя выбары. І альтэрнатыва павінна застацца пасьля выбараў!

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: **2006/02/19**

[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 3 (43) - 2006

[image]

[image]

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

Віталь Сіліцкі Палітычная кухня прэзідэнцкіх выбараў

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

палітэканом, доктар філязофіі унівэрсытэту Ратгерса. Яго апошні аналіз «Выбары навыварат» пасьля публікацыі на сайце «ARCHE» пабіў усе ранейшыя рэкорды наведвальнасьці.

Нейкія дзіўныя гэты раз у нас прэзідэнцкія выбары. З аднаго боку, выбары як выбары – у Беларусі гэта даўно ўжо найперш адміністрацыйная працэдура. З іншага – калісьці было так, што надаць гэтай адміністрацыйнай працэдуры выгляд менавіта выбараў імкнулася найперш улада, а апазіцыя, ці яе большая частка, імкнулася гэты выгляд разбіваць. Цяпер улада нават амаль што і не саромеецца самой сябе. То збіраюць амаль два мільёны подпісаў, то абвяшчаюць будучае, «пасля выбараў», месца працы Шэймана нават перад датэрміновым галасаваннем. А вось апазіцыя, рэальная і фармальная – хай сабе, вядома, і не сцвярджае, што ўсё чыста і па законе, але паводзіць сябе так, як быццам бы ў гэтай адміністрацыйнай працэдуры ёсць нейкая канкурэнтнасць і прадказальнасць, іншымі словамі, займаецца выбарамі, якіх няма. Такі вось асіметрычны адказ уладзе... Дык ці ёсць насамрэч у гэтай працэдуры хоць нейкая інтрыга?

Дарэчы, пра збор подпісаў. Калі стала зразумела, што адбываецца і колькі нарэшце збярэцца за галоўнага кандыдата, найперш хацелася затэлефанаваць у адміністрацыю і спытацца, ці разумеюць яны, што сваімі рукамі робяць чорны піяр уласнай кампаніі. Мільён з тых двух можна было сабраць пры

мінімальным ужыванні адмінрэсурсу. Мабілізавалі б працаўнікоў ЖЭСаў, далі б адрасы пенсіянераў, і хай падпісваліся б добраахвотна. А так колькасць падпісантаў сведчыць найперш пра тое, колькі грамадзянаў РБ могуць страціць працу пры найменшым непадпарадкаванні ўладзе. Некаторым сваім знаёмым на дзяржслужбе, якія дзяліліся са мной падобнымі думкамі, я раіў мацней сціскаць дулі ў кішэні.

Аднак, казаць, што такую дулю трымаў кожны другі, таксама не выпадае. Калі ўлада ставіла задачу «ўбіць» у галовы беларусаў, што выбары мусяць праводзіцца так, а не інакш, што па-іншаму ўжо не будзе і наагул не бывае, то першыя поспехі на гэтым шляху ўжо відавочныя. Асабліва ўражвае пакорлівасць і абыякавасць маладога пакалення. Па вялікім рахунку, уражваць не павінна, але па інерцыі згадваюцца падзеі і моладзь сямі-дзесяцігадовай даўніны… Актывісты НДА, якім дзесяць год таму самім было дзесьці «наццаць», хапаюцца за сэрцы, чуючы разважанні аб палітыцы ўвогуле і аб выбарах у прыватнасці сваіх малодшых братоў, сястрычак і пляменнікаў. Здаецца, цяперашнія выбары – першыя, на якіх ва ўсёй красе праявіць сябе так званае лукашэнкаўскае пакаленне. У сэнсе, ніяк не праявіць.

Улада трохі здзівіла сваёй прадказальнасцю. Усе яе захады (акрамя, магчыма, заўчаснага абвяшчэння галасавання), увесь змест прапаганды, усе канцэрты і лозунгі, страшылкі і агіткі – і нідзе нічога новага. Аднак прапагандысцкая машына – як тая беларуская эканоміка – трымаецца на старым багажы, а рэсурс яшчэ далёка не выпрацаваны. Гэта і нядзіўна – замарозіўшы грамадства ў пэўным стане, можна ўвесь час круціць адну і тую ж кружэлку.

Вяртаючыся да пачатку артыкула, зазначу, што апазіцыя ўсё ж вымушаная гуляць у выбары, таму што ў адваротным выпадку ў ёй проста няма патрэбы. Калі апаненты ўлады назавуць рэчы сваімі імёнамі і, як кажуць, умыюць рукі, то навошта ўсе гэтыя партыі, кааліцыі, кандыдаты? Тады трэба вяртацца да дысідэнцкай практыкі савецкага часу – альбо шукаць метады палітычнай барацьбы па-за выбарчым календаром. Дзеля гэтага, аднак, патрэбныя моцныя каналы сацыяльнай

камунікацыі і магчымасці грамадскай мабілізацыі, якіх у апазіцыі якраз і бракуе. Каб неяк паменшыць іх дэфіцыт, апазіцыя вымушаная ісці ў народ якраз тады, калі ёй гэта дазваляе ўлада – падчас афіцыйных выбарчых кампаній. Атрымліваецца замкнёнае кола. Дэфіцыт супольных, яднаючых каштоўнасцяў, веры, салідарнасці, самаадданасці і неабыякавасці. Ці могуць гэта зрабіць выбарчыя кампаніі, палітыкі наагул, прынамсі, у беларускіх умовах закручаных гаек? Пэўна, не, але без палітыкі, без выбараў, нават без гульні ў выбары, у грамадстве фармуецца дэфіцыт надзеі.

Дык якая інтрыга магла б быць у такіх выбараў, які сюрпрыз маглі б яны прынесці і нам, і ўладзе, і грамадству, і свету? Па-першае, будзем рэалістамі, нечаканасцю была б сама выразная праява грамадскага супраціву. Збор подпісаў, дарэчы, ужо здзівіў тых, хто канчаткова пахаваў апазіцыю: не, яна яшчэ жывая. Але гэтага, вядома, мала. Па-другое, значнай падзеяй было б тое, што па выніках кампаніі выразна выкрышталізавалася б дэмакратычная альтэрнатыва, што апазіцыйная кааліцыя мела б працяг, а яе лідэр стаў бы прызнаным лідэрам, увасабленнем «іншай» Беларусі. Тады, можа, і адбылося б адраджэнне надзеі. На гэта яшчэ ёсць шанцы. Іншыя інтрыгі зводзяцца выключна да паводзінаў уладаў – каго зарэгіструюць і які будзе разбор палётаў пасля 19 сакавіка. Але гэта ўжо нават не інтрыга, а чаканне непазбежнага.

Радыкалізацыі падзеяў чакаць цяжка. Сапраўды, апазіцыя пакуль працуе ў фармаце выбараў, а гэта значыць, цалкам прадказальна. Некаторыя рэчы самі па сабе выдаюць млявасць і апатыю, якія распаўсюдзіліся нават на апанентаў улады. Скажам, эканамічная праграма адзінага кандыдата, якая, мяркуючы па публікацыях у «Народнай Волі», прыводзіць да думкі, а навошта тады тая апазіцыя, калі ў Беларусі «расце вытворчасць, заробкі і выплачваюцца пенсіі»... Апазіцыя мусіць найперш апаніраваць: прызнаўшы, што чагосьці ламаць не варта, трэба ўсё ж выразней падкрэсліваць альтэрнатыву, а не спяваць біблейскае «не хлебам адзіным жывы чалавек»! Інакш гэта не апазіцыя, а місіянерства нейкае...

Аднак, нягледзячы на сонны характар кампаніі, адзіны апазіцыйны прэтэндэнт відавочных памылак да апошняга часу не дапускаў. Хутчэй, можна было казаць не пра памылкі, а пра хранічныя хваробы беларускай апазіцыі. Напрыклад, палітычны прынцып фармавання перадвыбарных штабоў, у выніку якога некаторых дзеячаў і дустам вывесці немагчыма. Усіх называць не буду, аднак, напрыклад, які дурань мог дапусціць, што ў ліку «менеджэраў» ізноў усплылі тыя, хто «добрасумленна» заваліў кампанію Ганчарыка пяць год таму – гэта пытанне, якое задаюць многія. Аднак гэта дробязі ў параўнанні з іншымі. Першымі сваімі крокамі апазіцыя сапраўды прасунулася да фармавання той самай альтэрнатывы. Нягледзячы на ўсе памылкі, унутраныя спрэчкі і скандалы, адзіны быў вылучаны, кааліцыя пасля кангрэсу не развалілася, спадара Мілінкевіча тая частка грамадства, якая зарыентаваная на перамены, імкліва прызнавала за лідэра, а сам Мілінкевіч стварыў прывабны вобраз дэмакратычнай альтэрнатывы, наагул іншай Беларусі, у Еўропе.

Скептыкі скажуць, што Мілінкевіч і наагул апазіцыя паводзяць сабе даволі вяла, што кампаніі бракуе нестандартных крокаў, дынамізму, што Мілінкевіч наагул праводзіць больш часу за мяжой, чым дома. Аднак любыя дзеянні, аб якіх не даведаецца грамадства, застануцца безвыніковымі. Склалася так, што інфармацыйную блакаду Мілінкевічу лягчэй за ўсё было прабіць менавіта за мяжой. Мілінкевіч сапраўды там выглядаў як лідэр, як іншы палітык. Спакойны, салідны, інтэлігентны. Для таго, каб чвэрць грамадства прызнала яго сваім – дастаткова. Большага пакуль што не прынесла, але невядома, ці дапамаглі б тут высмактаныя з пальца «інфармацыйныя нагоды».

Дарэчы, як высветлілася з незалежных даследаванняў, усё большая частка грамадства, асабліва тыя, хто арыентаваныя на перамены, атрымліваюць навіны не з традыцыйных медыяў, а з Інтэрнету і замежных тэлепраграмаў. У доўгатэрміновай перспектыве прабіць інфармацыйныя бар'еры, выбудаваныя дзяржавай, ужо не ўяўляецца цалкам немагчымым. Калі, вядома, не запусцяць кітайскіх праграмаў.

Крытыкі Мілінкевіча часцяком кажуць, што ён пакуль што не даў адказу на пытанне – што рабіць 19 сакавіка. Аднак для яго імкліва ўзнікае іншая праблема – Аляксандр Уладзіслававіч Казулін. Яе, дарэчы, аб'яднаная апазіцыя павялічыла, як кажуць, на роўным месцы.

Супраць спадара Казуліна я нічога не маю. Ён грамадзянін Беларусі і, значыць, мае права балатавацца. Яго прэтэнзіі на палітычнае лідэрства таксама цалкам законныя. Але ёсць пытанні да Казуліна як дэмакратычнага палітыка. Па-першае, вельмі хуткі пераход у статусе з сталпоў рэжыму да галоўных апазіцыянераў. Казулін, вядома, не адзін такі, але, як мінімум, можна было б чакаць прабачэнняў за выключэнні студэнтаў, пацярпелых за палітычную дзейнасць падчас яго рэктарства ў БДУ. Па-другое, вельмі сумнеўны подыгрыш з боку ўладаў падчас высвятлення пытання ў барацьбе за лідэрства ў БСДП. Па-трэцяе, і самае галоўнае, даволі красамоўныя заявы, зробленыя спадаром Казуліным у пачатку лютага, што ўздымаюць пытанне: ці ён яшчэ адзін дэмакрат ці яшчэ адзін Гайдукевіч?

Вось некалькі цікавых фактаў. Іміджавыя інтэрв'ю Казуліна з'яўляюцца не толькі ў «Народнай Волі», але і ў праўладнай газеце «Обозреватель». Гасціннасць, з якой аддала Казуліну свае старонкі газета, уладальнік якой некалькі год таму ледзь не пахаваў тую самую «Народную Волю», даволі паказальная. З цяжкасцю верыцца, што «Обозреватель» дазволіць камусьці крытыкаваць на сваіх старонках Лукашэнку з уласнай ініцыятывы. Аднак Казулін у сваім інтэрв'ю 3 лютага, як кажуць, «раскалоўся» і сапраўды пачаў агітацыю (як яшчэ назваць выкладанне ўласных планаў пасля магчымага абрання прэзідэнтаў) у стылі бэк-вакалу дзяржаўнай прапаганды. Чытаем: Казулін – «працiўнік дэстабілізацыі ў краіне» (маецца на ўвазе: Мілінкевіч за дэстабілізацыю); Мілінкевіч кіраваў рэсурснымі цэнтрамі і сядзеў на замежным фінансаванні (а то праказулінская заказуха ў «Народнай Волі» забяспечваецца беларускімі крыніцамі, і наагул: хто некалькі год сядзеў на тых ільготах, якія прапісаў калісьці БДУ Лукашэнка?); Мілінкевіч – вылучэнец БНФ (а то ў штабе Казуліна нацыяналістаў менш) і г. д. Цікава, што Казулін пачаў атаку на Мілінкевіча менавіта

тады, калі рэзка ўзмацнілася атака афіцыёзу на апазіцыю, калі дзяржаўнае тэлебачанне запусціла ў эфір чарговы цыкл антыапазіцыйных дакументальных фільмаў. Карацей, адразу і не разбярэшся, альбо гэта Казулін, альбо Азаронак.

Дык вось, галоўная памылка, якую здзейснілі Мілінкевіч і яго каманда, гэта пачатак перамоваў са штабам Казуліна да таго, як апошні выразна вызначыў сваю пазіцыю і праявіў, на якім баку ён насамрэч гуляе. Сеўшы за стол перамоваў, аб'яднаная апазіцыя прызнала Казуліна не толькі роўным сабе, але і дэмакратычным прэтэндэнтам, выпісаўшы яму індульгенцыю за ўсе астатнія ўчынкі падчас рэшты кампаніі. Сказаўшы А, трэба казаць і Б, і цяпер трэба пачынаць гульню ў аб'яднанне. А Казулін між тым выкарыстоўвае свае інфармацыйныя рэсурсы (дарэчы, калі б у Мілінкевіча сапраўды было столькі грошай, пра што намякае Казулін, «Народная Воля» выходзіла б зусім з іншымі матэрыяламі!), каб надалей ствараць вобраз «біпалярнай» апазіцыі. Як вынік, дэмакратычная альтэрнатыва падчас кампаніі канчаткова размываецца. Добра хоць тое, што Мілінкевіч часткова падправіў уласную памылку і прапанаваў Казуліну, каб адзін з кандыдатаў зняўся на карысць іншага. Казулін меў рацыю, калі назваў гэтую прапанову правакацыйнай, але гэтая правакацыя, здаецца, дапамагла высветліць, хто ёсць хто. Сапраўды, Казулін адыгрывае ў дадзенай кампаніі пэўную ролю, якая зусім не зводзіцца да мабілізацыі прыхільнікаў перамен. Дзеля таго, каб ён гуляў іншую ролю, штабу Мілінкевіча трэба было пазбягаць крокаў насустрач як мінімум да таго, калі Казулін сам бы вызначыўся, альбо «заціснуўшы» сябе ў рамкі апазіцыянера, альбо пачаўшы тую гульню, якую ён урэшце і пачаў. Але гэта ўжо ўмоўны лад.

Нават калі Казулін – фігура, незалежная ад уладаў (у чым ён сам даў падставы сумнявацца), размыванне дэмакратычнай альтэрнатывы цяпер дазваляе ўладзе рэалізаваць сцэнары, што могуць не дазволіць апазіцыі нават рэалізаваць праграму-мінімум. Напрыклад, нерэгістрацыя Мілінкевіча: выбарчы бюлетэнь жа будзе выглядаць амаль так, як і на папярэдніх выбарах! Аднак, хутчэй за ўсё, зарэгістраванымі будуць усе чатыры кандыдаты. Шляхам статыстычнага «размыву» галасоў дэмакратычнага электарату на другое месца можна будзе

вывесці, напрыклад, спадара Гайдукевіча. Пытанне, каго паставяць на трэцяе месца, Казуліна ці Мілінкевіча, ужо не прынцыповае. Пры такім раскладзе можна канчаткова забіць веру ў апазіцыю, а разам з тым веру і ў тое, што аб'яднанне, салідарнасць, адзінства чагосьці вартыя ў палітычнай барацьбе.

Такім чынам, пытанне аб тым, што адбудзецца 19 сакавіка, адпадае само сабой. Паспрабуйце прымусіць кагосьці выйсці на вуліцы для таго, каб даказаць сваё кроўнае другое месца! Акрамя таго, няўдача на выбарах і на вуліцы можа выклікаць хуткі развал дэмакратычнай кааліцыі пасля выбараў. Згадваючы, колькі незадаволеных выбарам адзінага кандыдата было на Кангрэсе дэмакратычных сіл, з якой перавагай перамог Мілінкевіч, і як аб ім адгукаліся некаторыя кааліцыянты, можна сабе ўявіць, што тыя, хто лічыў сябе пераможаным у выніку гонкі за адзінага, проста спашлюцца на тое, на што спасылаліся прыхільнікі Домаша падчас паразы пяцігадовай даўніны: маўляў, кандыдат не той.

Цяпер ламаць сітуацыю аб'яднанай апазіцыі можна хіба што радыкальнымі метадамі. Напрыклад, Мілінкевіч прапануе Казуліну, што ён добраахвотна здымае сваю кандыдатуру, але пры гэтым Казулін займае яго месца і становіцца кандыдатам ад дэмакратычных сілаў. Але трэба добра ведаць палітычную кухню як афіцыйнай, так і альтэрнатыўнай Беларусі, каб зразумець, што такога не адбудзецца.

Дык ці застанецца ў гэтых выбараў інтрыга? Нечаканасці заўжды могуць быць. Але цяпер, здаецца, трэба прыкладаць звышвысілкі для дасягнення міні-вынікаў...
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/19
[image]

ЮРЫ ЧАВУСАЎ
палітоляг, сталы аўтар «ARCHE». Яго апошняя публікацыя – агляд «Як выжыць падчас рэвалюцыі» (6/2005).

Юры Чавусаў
Ня бойцеся вызваленьня

Вялікая колькасьць аналізаў сучаснай палітычнай сытуацыі ў Беларусі звычайна пачынаецца зь сьцьвярджэньня, што сытуацыя ў краіне характарызуецца спакоем, стабільнасьцю, адсутнасьцю альбо слабасьцю крыніцаў для патэнцыйнай дэстабілізацыі сыстэмы. І ў доўгатэрміновай пэрспэктыве, і ў бліжэйшай ужываецца простая экстрапаляцыя, перанос сучасных паказьнікаў у будучыню зь неахвотнай адмовай ад ужо напрацаваных тлумачэньняў цяперашняга стану. Канцэпты «захаваньня ранейшага стану» і «працягу старых тэндэнцыяў» асабліва характэрныя для палітычных і эканамічных аглядальнікаў. Гэткая пазыцыя зручная: ня трэба вынаходзіць новых мадэляў, і аўдыторыя ставіцца са спачуваньнем – і апазыцыйная, і канфармісцкая яе часткі ўжо аб'яднаныя страхам таго, што ў выпадку пераменаў становішча, хутчэй за ўсё, можа зьмяніцца ў горшы бок.

Праўрадавыя ідэолягі фармулююць стабільнасьць як стабільны рост, азначаны нязьменна пазытыўнай дынамікай разьвіцьця ў межах таго курсу, які быў абраны ў 1994 годзе (1996-м, 2001-м). Для ўладаў стабільнасьць пераўтварылася ў сапраўдны фэтыш, цэнтральны элемэнт дзяржаўнай прапаганды, прынцыповы лёзунг для здабыцьця «ўсенароднай» падтрымкі падчас наступных прэзыдэнцкіх выбараў і для легітымацыі іх вынікаў.

Пачэснае месца адводзіцца стабільнасьці і ў прамовах дзейнага кіраўніка дзяржавы. Толькі за першы тыдзень 2006 году БелТА распаўсюдзіла тры паведамленьні, у загалоўку якіх ужывалася паняцьце «стабільнасьць» у розных кантэкстах, датычных агульнага сацыяльна-эканамічнага стану ў беларускай дзяржаве.

«Тое, што ўлада не дапусьціць дэстабілізацыі абстаноўкі, – у гэтым можаце быць абсалютна ўпэўненыя», – падкрэсьліў Лукашэнка ў інтэрвію журналістам падчас паездкі ў Віцебскую вобласьць. І пасьлей:

У тым, што ў Беларусі пануюць стабільнасьць і ўзаемаразуменьне паміж людзьмі – вялікая заслуга праваслаўнай царквы. Такую стабільнасьць без удзелу царквы забясьпечыць у грамадзтве немагчыма.

Абапіраючыся на ўласныя сілы, свой працоўны, навуковы і інтэлектуальны патэнцыял, у мінулым годзе мы дасягнулі значных посьпехаў у эканоміцы. І, што асабліва важна, не дапусьцілі ўзрушэньняў, якія адбываюцца, на жаль, у іншых дзяржавах. Мы забясьпечылі стабільнае і спакойнае разьвіцьцё Беларусі.

Гэтымі ідэалягічнымі тэзамі рэжым абгрунтоўвае нязьменнасьць існага грамадзка-палітычнага ладу і наяўнай схемы разьмеркаваньня палітычнай улады ў краіне. Пры гэтым катэгорыі «стабільнасьць» і «спакой», выступаючы ў амаль неразрыўнай зьвязцы, грунтуюцца, перш за ўсё, на эканамічных паказьніках, хоць самі па сабе гэтыя катэгорыі ўжываюцца ў палітычным значэньні. Дзяржаўная ўлада і яе вярхоўны носьбіт гавораць са сваім народам на сацыяльна-эканамічнай мове, на мове дабрабыту – і на гэтай мове пераконваюць у неабходнасьці падаўжэньня сваёй неабмежаванай улады.

Стаўленьне ж грамадзтва да такой «стабільнасьці» не такое адназначнае. Людзі ня хочуць пераменаў – але пагроза захаваньня і ўмацаваньня гэтай «стабільнасьці» таксама выклікае ў іх нэгатыўную рэакцыю. Грамадзкая думка выдатна

адлюстроўвае парадаксальнае становішча: дэкляраваная сацыяльна-эканамічная стабільнасьць, памножаная на палітычны спакой і зьнішчэньне ўсіх верагодных пагрозаў існай палітычнай сыстэме, пераўтвараюцца ў супрацьлегласьць спакою і стабільнасьці, у пастаянную і няспынную пагрозу раптоўнага рэвалюцыйнага выбуху. Найбольш яскрава і радыкальна гэткае парадаксальнае адчуваньне адлюстроўваецца ў адказе аднаго з рэспандэнтаў на пытаньне сацыёляга: «Ну, а як увогуле жыцьцё ў Беларусі?» «Стабільна ў нас… спакой… але жывём як на вулькане»[1].

Такая стабільнасьць успрымаецца як адсутнасьць пэрспэктываў і адчуваньне пастаяннай пагрозы нармальнаму прыватнаму жыцьцю. Беларусы ня маюць асаб-лівай прагі да пераменаў – але ў дачыненьні да стабільнасьці спрацоўвае эфэкт адмоўнай адаптацыі, як да штодзённай і навязьлівай прапагандысцкай маны. У атмасфэры татальнага страху грамадзяне ня бачаць сьмеласьці адкрыта выступіць з пратэстам супраць «Новак». несправядлівага сацыяльна-палітычнага ладу – але дэманстраваць скепсіс да ідэі стабільнасьці яны здольныя. Катэгорыі «стабільнасьці» і «спакою» ў сацыяльным сэнсе карыстаюцца найменшай падтрымкай у параўнаньні зь іншымі каштоўнасьцямі.

[1] Тут і далей ва дзеяньні сацыялягічныя дасьледаваньні адсістэмнай ня бачаць ня бачаць

Дзіўна, але раней палітычная альтэрнатыва даволі млява аспрэчвала самі пастуляты стабільнасьці і спакою. Скептычна ставячыся да пазытыўных эканамічных паказьнікаў, беларуская апазыцыя альбо адмаўляе факт дасягненьня эканамічнай стабільнасьці, альбо сьцьвярджае, што пад выглядам «стабільнасьці» хаваецца стагнацыя і заняпад. Нават заклік да пераменаў, што актыўна трансьлюецца апазыцыяй пачынаючы з 1990-х гадоў, можа трактавацца як парадаксальнае сьведчаньне таго, што пераменаў у грамадзтве цяпер няма. Мы як бы пераносімся ў часы «застою», калі стабільнасьці быццам бы было аж занадта, усе яе адчувалі і ніхто зь ёй не спрачаўся, але гэты стан не прыносіў задаволенасьці ў грамадзтва. Наяўныя элемэнты сацыяльнага і эканамічнага пратэсту не канвэртуюцца ў пратэст палітычны, не ствараюць апірышча для распаўсюджаньня апазыцыйнасьці. Назіраецца малая грама-дзкая падтрымка трансьляванай апазыцыяй ідэі рэвалюцыі

альбо радыкальных пераменаў – аднак і ідэя канчатковай стабілізацыі і кансэрваваньня наяўнага стану рэчаў назаўжды зусім не прываблівае беларусаў.

Сама тэза «захаваньня ранейшага стану» часта ўжываецца ў палітычных тэкстах апазыцыйных сілаў. Сярод часткі незалежных аналітыкаў папулярная таксама цяпер тэза пра нязьменнасьць палітычнага раскладу ў апазыцыі ў параўнаньні з прэзыдэнцкімі выбарамі 2001 году. Маўляў, усе тыя ж твары, усё той жа брак ідэяў, усё тыя ж нязьменныя тэхналёгіі прывядуць зноўку да звыклай паразы – гэта свайго роду зваротны бок мэдаля прапагандысцкіх енкаў пра стабільнасьць. Аднак у параўнаньні з прэзыдэнцкімі выбарамі 2001 году цяпер у палітычным раскладзе адбыўся шэраг зьменаў, якія прынцыповым чынам уплываюць на сытуацыю. Зьмянілася міжнароднае атачэньне, іншым стала стаўленьне ключавых вонкавапалітычных актораў, амаль зьнішчаныя незалежныя крыніцы інфармацыі ўнутры краіны, радыкальна іншым стаў стан няўрадавых арганізацыяў і астатніх структураў грамадзянскай супольнасьці, больш жорсткім і эфэктыўным стаў мэханізм палітычных рэпрэсіяў супраць апанэнтаў рэжыму, у грамадзтве згусьцілася атмасфэра страху. Большасьць гэтых паказьнікаў не на карысьць дэмакратычным пераўтварэньням у краіне – стыль вядзеньня кампаніі 2006 году мала нагадвае стыль кампаніі 2001 году. Але побач з гэтымі важнымі, але тэхнічнымі характарыстыкамі палітычнага поля ёсьць некалькі чыньнікаў, якія зьмяніліся прынцыпова – і могуць паўплываць на разьвіцьцё палітычных падзеяў пасьля 19 сакавіка 2006 году.

Яны зьвязаныя з адказамі на пытаньні: «Хто замест Лукашэнкі?», «Навошта мяняць уладу?» і «Якім чынам можна зьмяніць гэтую ўладу?». Калі два першыя пытаньні найбольш часта ставяцца перад носьбітамі палітычнае альтэрнатывы, то адказ на трэцяе пытаньне яна павінна даць перш за ўсё сама для сябе. Ад адказу на гэтыя пытаньні залежыць лёс дэмакратызацыі Беларусі.

«ХТО ЗАМЕСТ ЯГО?»

Галоўнае адрозьненьне палітычнай сытуацыі напярэдадні выбараў 2006 году палягае ў відавочнай прысутнасьці пэрсаніфікаванай альтэрнатывы дзейнаму прэзыдэнту. Палітычная апазыцыя, здаецца, нарэшце сфармулявала годны адказ на пытаньне «А хто замест яго?». Абраньне адзінага кандыдата – перамога апазыцыі. Але гэта малая перамога, таму што гэта перамога апазыцыі над самой сабой.

Мілінкевіч быў абраны па выніках двух тураў таемнага галасаваньня дэлегатаў Кангрэсу дэмакратычных сілаў Беларусі, які праходзіў 1–2 кастрычніка 2005 году ў Менску. Цяпер ужо зразумела, што прызначэньне Кангрэсу на такі позьні тэрмін было стратэгічна не абгрунтаванае – яго правядзеньне ў чэрвені 2005 году альбо яшчэ раней дало б магчымасьць палітычнай апазыцыі шырэй і эфэктыўней распаўсюдзіць інфармацыю пра вынікі Кангрэсу, пра абранага на ім адзінага прэтэндэнта. Шмат часу было выдаткавана на ўзгадненьні парадку фармаваньня складу Кангрэсу і рэглямэнту абраньня адзінага кандыдата. Зь іншага боку, Кангрэс мог быць прызначаны і на студзень 2006 году, як прапаноўвалі некаторыя гарачыя галовы – у гэтым выпадку крок уладаў з датэрміновым правядзеньнем выбараў цалкам бы разбурыў пляны апазыцыі.

Статус адзінага прэтэндэнта і высокая легітымнасьць самой працэдуры вылучэньня сталі тым пазытыўным падмуркам, на якім Аляксандру Мілінкевічу было наканавана будаваць сваю выбарчую кампанію. Дзякуючы гэтаму рэсурсу ён адсунуў на пэрыфэрыю ўсіх іншых прэтэндэнтаў на ролю апазыцыйнага кандыдата. Тыя ж зь іх, хто не падтрымаў вынікаў Кангрэсу і працягваў заяўляць пра ўласны намер удзельнічаць у выбарах, былі пастаўленыя ў пазыцыю лялек у Лукашэнкавай батлейцы, граючы ролі, прапісаныя ім у адміністрацыі прэзыдэнта.

Працэдура абраньня вызначыла прадстаўнічасьць і кааліцыйнасьць групы падтрымкі адзінага кандыдата, але яна ж вызначыла і тыя цяжкасьці, зь якімі Мілінкевічу давялося сутыкнуцца ў часе кампаніі. Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы засталіся хісткай міжпартыйнай кааліцыяй, якую трэба было сцэмэнтаваць для стваральнай працы. Кепскі і

нефункцыянальны штаб – таксама наступства кааліцыйнасьці. Акрамя працоўнай функцыі штаб адначасова выконвае функцыю дадатковага органу палітычнага ўзгадненьня – пазьбегнуць міжпартыйных канфліктаў не ўдаецца.

Вызначэньне супрацоўнікаў штабу не па прафэсійных паказьніках, а па партыйных квотах і на знак павагі да палітычных рэгаліяў вельмі нашкодзіла рэальнай працы. Асабліва гэта паўплывала на іміджава-агітацыйны складнік працы, які быў адзначаны бессыстэмнасьцю і сабатажам. Ранейшая міжпартыйная плянава-аналітычная група Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, якая распрацоўвала агітацыйную кампанію падчас парлямэнцкіх выбараў і працавала над ідэяй Кангрэсу, фактычна была распушчаная. Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы пазбавіліся органу папярэдняй тэхнічнай прапрацоўкі палітычных рашэньняў. У выніку пытаньні колеру кампаніі, сымболікі, лягатыпаў і г. д. вырашаліся на паўаматарскім узроўні і з маніпуляваньнем вынікамі сацыялягічных дасьледаваньняў. Нарэшце маючы пэрсаніфікаваную альтэрнатыву рэжыму, апазыцыя надзіва бязглузда правяла пазыцыянаваньне гэтай альтэрнатывы ў грамадзтве. Нават нэўтралізацыя тэхнічных кандыдатаў (Вайтовіч, Пазьняк, Казулін, Фралоў) не была зьдзейсьненая як сьлед.

Можна сказаць, што на пачатку кампаніі (ад Кангрэсу да афіцыйнага абвяшчэньня выбараў) Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы жылі старым аўтарытэтам, назапашаным дзякуючы пасьпяхова праведзенаму Кангрэсу. Толькі з рэгістрацыяй ініцыятыўнай групы і пачаткам збору подпісаў праца штабу наладзілася, аднак агітацыйна-прапагандысцкі і аналітычны кірункі па-ранейшаму засталіся правальнымі.

У адрозьненьне ад клясычнай схемы пабудовы перадвыбарнага штабу, сам адзіны прэтэндэнт актыўна прымае ўдзел у яго працы – гэта яшчэ раз засьведчвае палітычны характар гэтага органу. Разам зь Мілінкевічам дзейнічае ягоная асабістая каманда, яна адстойвае яго інтарэсы ў сутыкненьнях з шматпартыйным кіраўніцтвам штабу. Такім чынам, сам адзіны прэтэндэнт актыўна ўдзельнічае ў распрацоўцы стратэгіі і

ключавых рашэньняў для перадвыбарнай кампаніі.

Задача штабу – узняцьце рэйтынгу прэтэндэнта. Аднак пры гэтым і сам штаб цудоўна ўсьведамляе, што ўва ўмовах беларускай выбарчай сыстэмы само па сабе ўзняцьце рэйтынгу ня грае вялікай ролі для здабыцьця перамогі. Пэрсаніфікацыя палітычнай альтэрнатывы – зарука пасьпяховасьці, але гэта толькі адзін з фактараў, які можа прывесьці да зьмены сытуацыі ў Беларусі…

Палітычны адказ на першае пытаньне прымушае задумацца над тым, што будзе пасьля 19 сакавіка. Хто такі Мілінкевіч пасьля выбараў? Кіраўнік дзяржавы, якая здолела мірным шляхам зрынуць аўтарытарную дыктатуру, правадыр рэвалюцыйнага паўстаньня, лідэр агульнанацыянальнай аб'яднанай апазыцыі, найбольш аўтарытэтны зь лідэраў нацыянальна-вызваленчага руху, кіраўнік Партыі БНФ альбо асоба, адказная за правал («чарговы правал») дэмакратаў? Адказ на гэтыя пытаньні – справа бліжэйшай будучыні. Якім ён будзе – залежыць ад таго, наколькі пасьпяховае будзе вырашэньне іншых прынцыповых праблемаў, што стаяць перад дэмакратычным праектам цяпер.

«НАВОШТА?»

Адказаўшы на пытаньне «Хто?» («Мілінкевіч!») мы пераходзім да пытаньня «Навошта?». Сапраўды, а навошта мы прагнем зьмяніць уладу ў Беларусі?

«Паездкі па Беларусі я б параўнаў з самай карыснай, павучальнай, цікавай і горкай кнігай, якую я калі-кольвек прачытаў у сваім жыцьці. У гэтых паездках я пастаянна пераконваюся – наколькі моцным ёсьць чаканьне зьменаў. І на вёсцы, і ў мястэчках, і ў вялікіх гарадах. Большасьці абрыдла «стабільнасьць», якую прапагандуе ўлада. Такая стабільнасьць бывае толькі на могілках. Людзі прагнуць разьвіцьця, пэрспэктывы для сябе, сваіх дзяцей», – сказаў Аляксандар Мілінкевіч падчас онлайн-форуму на радыё «Свабода» 23 студзеня 2006 году. Ізноў рыторыка пра непрыняцьце стабільнасьці, пра прагу да пераменаў, пра абнаўленьне. Але

якіх менавіта пераменаў хочуць людзі?

Гэтымі пераменамі ня могуць быць перамены ў эканамічнай сфэры. Параўнальна высокія заробкі ў буйных гарадох разам зь дзяржаўнай прапагандай ствараюць уражаньне квітнеючага аазісу пасярод мора крызаў, дэфолтаў і банкруцтваў. Нават калі грамадзяне і праяўляюць незадаволенасьць сацыяльна-эканамічным станам, адзначаюць наяўнасьць эканамічных праблемаў, яны ня зьвязваюць вырашэньня гэтых праблемаў з апазыцыяй, з палітычнай дзейнасьцю. Збольшага вырашэньне эканамічных праблемаў успрымаецца як функцыя дзяржаўнай улады, а сацыяльна актыўныя грамадзяне, пазбаўленыя патэрналісцкага комплексу, зьвязваюць вырашэньне эканамічных праблемаў з уласнымі высілкамі.

Апазыцыя мусіць даць цьвёрдыя адказы на галоўныя эканамічныя выклікі, што стаяць перад Беларусьсю – прыватызацыя і лёс буйных прамысловых прадпрыемстваў, дывэрсыфікацыя энэргетычнага імпарту, суадносіны прыватнай і дзяржаўнай уласнасьці, лёс сельскагаспадарчага комплексу, рэформа пэнсійнай сыстэмы і інш. Але было б памылкай адрасаваць гэтыя адказы электарату і чакаць ад яго падтрымкі ў радыкальнай зьмене існай грамадзка-палітычнай сыстэмы. Хутчэй, гэтыя мэсыджы мусяць быць адрасаваныя элітам.

Да таго ж, складана было б прыдумаць адэкватную праграму сацыяльна-эканамічных рэформаў для кандыдата, які прадстаўляе амаль увесь спэктар палітычнага поля – ад камуністаў да кансэрватараў. Пра эканамічны складнік праграмы добра сказаў Вінцук Вячорка: «Што яднае нас, сапраўды такіх розных? Адказ ёсьць – адказ «ад супраціўнага». Выпрацоўка эканамічнай праграмы адзінага прэтэндэнта на падставе ідэалёгіяў і праграмаў тых партыяў, што яго падтрымліваюць, немагчымая. Таму праграма апазыцыі ў сфэры сацыяльна-эканамічных рэформаў ня можа быць тым штуршком, які запаліць іскру грамадзкага пратэсту – праграма ў лепшым выпадку будзе эклектычнай, а ў горшым выпадку ў ёй будуць прынцыповыя супярэчнасьці.

Іскру могуць запаліць толькі каштоўнасныя арыентацыі людзей, найперш каштоўнасьць свабоды. Як паказвае аналіз

агульнанацыянальных апытаньняў 2005 году, вызначальнай каштоўнасьцю для значнай часткі беларусаў ёсьць менавіта паняцьце «свабода» (да 70 % апытаных адчуваюць недахоп свабоды).

Паколькі свабода ёсьць адной з асноўных каштоўнасьцяў, то яе прыхільнікі ня зьнікнуць пасьля 19 сакавіка 2006 году нават у выпадку паразы адзінага прэтэндэнта. Матывы імкненьня да свабоды ў гэтым выпадку могуць вельмі павялічыцца, а непрыняцьце рэжыму можа выліцца ў акцыі грамадзянскага пратэсту.

Рыторыка свабоды ўжо актыўна ўжываецца адзіным кандыдатам, таксама як і рыторыка нэгатыўнага стаўленьня да лукашэнкаўскай стабільнасьці. Здаецца, Лукашэнка нават пачынае апраўдвацца, калі гаворка заходзіць пра свабоду. Надышоў час, калі спрэчка з лукашызмам павінна адбывацца на ідэалягічным полі, на полі каштоўнасьцяў.

«ЯКІМ ЧЫНАМ?»

У адрозьненьне ад прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году, цяпер амаль ніхто ня верыць, што перамога над рэжымам і зьмена прэзыдэнта магчымыя электаральным шляхам. Ніхто не ўяўляе сабе Ярмошыну, якая пасьля 19 сакавіка з жалем абвяшчае пра паразу Лукашэнкі. Чыста палітычныя, «легальныя» мэтады адхіленьня рэжыму ад улады не павінны быць галоўным кірункам актыўнасьці дэмакратычных сілаў. Такая палітычная кампанія, як выбары, – цяпер толькі нагода для больш актыўнай агітацыі і канцэнтрацыі сілаў, а ў лепшым выпадку – для масавага разгортваньня акцыяў пратэсту.

Як жа здабыць перамогу? Адказ просты: «Вуліца». І зноў- такі, і ўлады, і апазыцыя рыхтуюцца менавіта да рэвалюцыйнага, вулічнага разьвіцьця падзеяў. Мінус апазыцыі ў тым, што яна рыхтуецца да гэтага толькі на словах. Як мы ўжо адзначалі, задача штабу Мілінкевіча – павялічваць рэйтынг і забясьпечваць яго электаральную перамогу. Арганізацыя акцыяў вулічнага пратэсту і патрабаваньня справядлівых

выбараў выведзена па-за яго межы.

Разумеючы прынцыповы і ключавы характар вулічнага пратэсту, апазыцыя адсунула гэтую дзейнасьць на другі плян. Так што Лукашэнка дарма абвінавачвае яе ў рэвалюцыйнай дзейнасьці – рэвалюцыйныя памкненьні ёсьць, рэвалюцыйнай дзейнасьці няма. Супрацьдзеяньне ўладаў будуецца зыходзячы з факту рэвалюцыйнай пагрозы, якая выкарыстоўваецца як сродак легітымацыі палітычных рэпрэсіяў.

І нарэшце апошняе. Любы прагноз ня ўлічвае прынцыповых зьменаў сытуацыі – гэта аксіёма палітычнага прагназаваньня. Тым больш гэта справядліва да прагнозаў, якія пераўтвараюцца ў плян, за выкананьне якога прагназіст нясе пэрсанальную адказнасьць. Нікому яшчэ не ўдалося стварыць плянавай палітыкі, і Лукашэнкаў рэжым ня будзе выняткам.

[image]
03.02.2006
Дзяржаўны
Ацыянальнай
Чыгуначнай
Чайкоўскі
канфіскаваў
першы
нумар
«ARCHE» ў
нашага
сталага
аўтара Юр'я
Чавусава,
падазраючы,
што такі
часопіс ня
можа
легальна
выдавацца ў
Беларусі.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 3 (43) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/04/02
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

Сяргей Богдан Амэрыканскія мары пра беларускую ўладу

СЯРГЕЙ БОГДАН
выпускнік факультэту міжнародных дачыненьняў БДУ. Вывучае ісламскую тэалёгію. Аўтар часопісаў «ARCHE», «Палітычная сфера», «Праўнік», «Минарет».

Bekkerman Gerald J. *The End of Last Dictatorship in Europe: Four Keys to a Successful Color Revolution in Belarus*.

Гэты даклад быў прадстаўлены Джэралдам Бэкерманам у Чыкаска-Кенцкім каледжы права ў верасьні 2005 году. Адначасова зь беларускай тэмай на сэмінары «Законы нацыятварэньня» шырока абмяркоўваліся пэрспэктывы паўстаньня ў Тыбэце. (Трэба думаць, што гэтыя дзьве тэмы былі аб’яднаныя разам дзеля падкрэсьленай міралюбнасьці беларускага і тыбэцкага рухаў. Адпаведна, прапанаваныя сцэнары беларускай рэвалюцыі і тыбэцкага паўстаньня ўключаюць толькі мірныя захады.) Яшчэ адзін даклад – Енса Фрыдрыха Віснэра – разглядаў магчымасьці фінансаваньня беларускай рэвалюцыі і тыбэцкага паўстаньня празь нямецкія і амэрыканскія дабрачынныя фундацыі.

Падыход арыгінальны, бо гісторыя амаль выключна мірнага супраціву ў Тыбэце і Беларусі магутным дзяржаўным апаратам недэмакратычных рэжымаў дае падставы разважаць пра пэрспэктывы мірнага руху за дэмакратызацыю ў гэтых дзьвюх краінах паралельна. У гэтым сэнсе беларуская сытуацыя

сапраўды больш нагадвае супрацьстаяньне тыбэтцаў магутнай кітайскай уладзе, а не каляровыя рэвалюцыі ўва ўмовах мяккіх аўтакратычных рэжымаў. Каляровая рэвалюцыя мажлівая, калі існуе магчымасьць разьбіць намёты на цэнтральным пляцы сталіцы. Гэта – Грузія восені 2003 году і Ўкраіна восені 2004 году. У Тыбэце і Беларусі нашых дзён такой магчымасьці няма.

На думку Джэралда Бэкермана, дамагчыся кардынальнага зьмяненьня сытуацыі ў Беларусі можна толькі пры ўмове наяўнасьці агульнай стратэгіі апазыцыйнага руху. Дзеля яе распрацоўкі трэба спачатку мець яснае ўяўленьне пра існуючае становішча. Яго даклад распачынаецца ўводзінамі «Апошняя сапраўдная дыктатура ў Эўропе»:

З 1994 году былой савецкай рэспублікай Беларусяй, якая займае стратэгічнае становішча паміж Расеяй і Ўсходняй Эўропай, кіруе лідэр савецкага тыпу Аляксандар Лукашэнка. За часы свайго скандальнага кіраваньня Лукашэнка зьмяніў канстытуцыю, перасьледаваў і падаўляў палітычных супернікаў, журналістаў і замежных дыпляматаў, разбурыў касьцяк палітычнай апазыцыі, усталяваў дзяржкантроль над СМІ і мадэляваў вынікі выбараў, каб запабегчы адхіленьню сябе ад улады. Лукашэнкава візія Беларусі – гэта візія аб'яднаных у выглядзе імпэрыі Беларусі і Расеі. У выніку Лукашэнка выключыў Беларусь з усіх аспэктаў заходняй інтэграцыі, у краіне працьвітае ўспадкаваны з савецкіх часоў эканамічны і сацыяльны парадак. Беларусь – адзіная постсавецкая дзяржава, дзе спэцслужбы па-ранейшаму завуцца КДБ і прынамсі 80 адсоткаў беларускай эканомікі падлягае цэнтральнаму плянаваньню, а дробны дазволены прыватны бізнэс жорстка рэгулюецца і абкладаецца падаткамі. У краіне па-ранейшаму не захоўваюцца сацыяльныя і палітычныя правы, асабліва для тых, хто апазыцыйна ставіцца да рэжыму.

Такі аналіз цяжка назваць вычарпальным. Усе спасылкі да дакладу – інтэрнэтныя лінкі, аніводнай кніжкі аб Беларусі або прынамсі па Ўсходняй Эўропе. Адсякаецца ўся лішняя інфармацыя, важны толькі «цмок» – дыктатура, якая павінна быць зьнішчаная. Гэта зьдзіўляе, бо беларуская дыктатура ёсьць натуральным прадуктам беларускага грамадзтва, і

змагацца зь ёй, не зразумеўшы яе прычынаў, марна.

Бэкерман асобна падкрэсьлівае ў сваім аналізе важнасьць досьведу нядаўніх каляровых рэвалюцыяў для Беларусі, бо «сытуацыя, зь якой сутыкнулася сёньня Беларусь, добра вядомая». Ён шматкроць падкрэсьлівае падабенства: «Элемэнты каляровых рэвалюцыяў былі падобныя ўва ўсіх трох савецкіх рэспубліках, а ў сваёй аснове ляжалі падобныя рэвалюцыйныя элемэнты, што раней былі наяўныя ў падобных рухах ва ўсім сьвеце».

Значыцца, пры маральнай падтрымцы і фінансаваньні з боку міжнароднай супольнасьці дэмакратычная апазыцыя, аб'яднаная супольным лідэрам, супрацьстаіць аўтарытарнаму лідэру ў часе чарговых выбараў. Дзеля папулярызацыі апазыцыйнага кандыдата праводзіцца масавая мабілізацыя людзей, ажыцьцяўляная моладзевым рухам і харызматычнымі палітыкамі, якія не баяцца рэпрэсіяў, а таксама незалежнымі СМІ. Намаганьні па мабілізацыі з боку аб'яднанай апазыцыі дасягаюць свайго апагею ў дні пасьля сфальшаваных выбараў, калі людзі далучаюцца да грамадзянскага руху, патрабуючы абвяшчэньня сапраўдных вынікаў выбараў і адмаўляючыся ісьці ўладам на саступкі. Ува Ўкраіне, Кіргізіі і Грузіі вынікам гэтага ланцужка падзеяў была дэмакратычна абраная ўлада, арыентаваная на Захад.

Такім чынам, трэба паказаць простасьць рэвалюцыі і дэміталягізаваць яе. Нельга дэманізаваць рэжым і глядзець на яго як на касьмічнае, вечнае Ліха. Бо калі рэжым – звышнатуральны фэномэн, дык і для змаганьня зь ім патрэбныя звышнатуральныя супэргероі. Але калі ўбачыць у беларускім рэжыме ўсяго толькі крыху больш зацяты адпаведнік рэжымаў, нядаўна паваленых ува Ўкраіне ці Грузіі, дык яго дэмантаж застаецца справай тэхналёгіі. Для амэрыканскага аналітыка важныя не спэцыфічныя нацыянальныя асаблівасьці, ён пэўны: каляровую рэвалюцыю ў Беларусі можна ажыцьцявіць за чатыры крокі».

Гэтыя чатыры асноўныя кампанэнты будучай каляровай рэвалюцыі ў Беларусі выглядаюць так:

1. Арганізаваны, інавацыйны і тэхналягічна падкаваны моладзевы апазыцыйны рух, што дзейнічае ў рамках герархічнай сыстэмы. Гэткі моладзевы рух павінна ўзначальваць падпольнае кіраўніцтва, што складаецца з найбольш актыўных і выдатных рэвалюцыянэраў. Моладзевы рух павінен выкарыстоўваць шматлікія тэхналягічныя навацыі і разьвівацца ў ходзе таемнай мабілізацыйнай кампаніі, імкнучыся пашырыць свае шэрагі і публічна прапагандаваць ідэі апазыцыі сярод масаў. Гэты рух моладзевай апазыцыі стане іскрай, ад якой запаліцца аб'яднаны агульнанацыянальны грамадзянскі апазыцыйны рух.

2. Аб'яднаная палітычная кааліцыя, што складаецца з асноўных апазыцыйных партыяў, якія разам працуюць над супольнай мэтай перамогі над Лукашэнкам падчас выбараў. Аб'яднанай апазыцыі трэба абраць аднаго кандыдата і падтрымліваць яго як адзінага, тым самым пазьбягаючы любых унутраных палітычных разыходжаньняў. Палітычнай апазыцыі трэба надалей працаваць зь міжнароднай супольнасьцю, НДА і моладзевым рухам над арганізацыяй пасьпяховай прэзыдэнцкай кампаніі, накіраванай на перамогу над Лукашэнкам.

3. Вольныя, жыцьцяздольныя і папулярныя СМІ, якія здатныя пераадолець жорсткі кантроль, усталяваны Лукашэнкавым рэжымам над дзяржаўнымі СМІ. Незалежныя СМІ будуць служыць голасам апазыцыйнага руху і супрацьстаяць нястрымнай прапагандзе дзяржаўных СМІ. Каб пазьбегчы ўціску з боку рэжыму, незалежныя СМІ маюць выкарыстоўваць Інтэрнэт, магчымасьці ТБ і радыёвяшчаньня з-за мяжы, падпольныя друкарні, надзейна схаваныя ад уладаў.

4. Міжнародная падтрымка і ўмяшаньне з боку міжнароднай супольнасьці, перадусім Злучаных Штатаў і Эўразьвязу. У лік дзеяньняў, якія можа ажыцьцявіць міжнародная супольнасьць, апрача фінансаваньня і падтрымкі апазыцыі, уваходзяць: увядзеньне лёгкіх эканамічных санкцыяў, абмежаваньне магчымасьцяў замежных паездак для вярхушкі рэжыму і замарожваньне яе рахункаў у замежных банках.

Моладзь. Джэры Бэкерман кажа пра ўплыў на моладзевыя апазыцыйныя групы пасьпяховай дзейнасьці іх украінскіх і грузінскіх калегаў («Пары» і «Кмары») дый пра эфэктыўнасьць моладзевай апазыцыі ў супрацьстаяньні з рэжымам. Але наш сёньняшні моладзевы рух слабейшы, чым нават пяць гадоў таму. Моладзь было прасьцей прыцягнуць да сябе ў ранейшыя гады, калі ішлося ня толькі і ня столькі пра дэмакратыю, колькі пра незалежнасьць і супраціў інкарпарацыі ў Расею. У змаганьні ж за правы чалавека рамантыкі менш, а мудрагелістасьці больш.

Дзеля стварэньня пасьпяховай моладзевай апазыцыі Джэры Бэкерман прапануе моладзевым групам зрабіць тры крокі.

Па-першае, розныя апазыцыйныя моладзевыя групы павінны аб'яднацца ў адзіную структуру, пажадана на ўзор пасьпяховага аб'яднаньня ўкраінскіх моладзевых апазыцыйных груповак у грамадзянскі рух «Пара». Па-другое, моладзевыя апазыцыйныя групы павінны праводзіць старанна сплянаваны падпольны працэс рэкрутацыі, як сярод студэнтаў, так і сярод шырокіх слаёў моладзі, каб павялічыць сваю колькасную базу. Па-трэцяе, моладзевыя групы павінны арганізаваць добра прадуманы маніторынг выбарчай кампаніі і пашыраць свае ідэі сярод масаў (асабліва старэйшага пакаленьня беларусаў)… Урэшце, моладзевая апазыцыя павінна падрыхтавацца да прэзыдэнцкіх выбараў, выкарыстоўваючы тэхнікі назіраньня за выбарамі, абнародаваньня выбарчых фальсыфікацыяў і выхад на вуліцы дзеля пратэсту супраць падтасаваных вынікаў галасаваньня.

Тым, хто ўсумніцца ў тым, што рэвалюцыя магчымая, прапануецца зьвярнуць увагу на досьвед украінскае «Пары», прыкладамі з гісторыі якой шчодра перасыпаныя рэкамэндацыі. Эквівалентам «Пары» ў сёньняшняй Беларусі для аўтара зьяўляецца ўсё той жа незарэгістраваны «Зубр», чые колькасны склад і фінансавы патэнцыял, маўляў, растуць, што спрыяе яго пераходу да больш сучасных тэхналёгіяў. У беларускай сытуацыі Джэры Бэкерман арыентуецца зусім слаба і лічыць моладзевымі групамі ня толькі незарэгістраваныя «Зубр»

(ягоны фаварыт), «Лімон» (чамусьці прыпісваючы яго да АГП), «Малады фронт», але і «Вясну» ды нават часопіс «Студэнцкая думка».

Такім чынам, патрэбная моладзевая арганізацыя, здольная на тое і тое; перад ёй будуць стаяць наступныя задачы – А, Б, В. Пры ўзьнікненьні такой сытуацыі дзейнічаем па пляне 1, інакш – па пляне 2. І гэтак далей. Ня важныя ідэалягічныя асаблівасьці – галоўнае, каб арганізацыя выконвала пастаўленыя задачы і прывяла да ўлады дэмакратычны ўрад.

Так, моладзевыя апазыцыйныя групы павінны зьліцца. Сьпярша аб'яднацца пад кіраўніцтвам шырокага грамадзкага руху ў адзіную нацыянальную арганізацыю з зыркім брэндам, а пасьля пашырыць свой колькасны склад дый разгарнуць шырокую гарызантальную сетку, падобную да той, што была створаная «Парой». Гэта дазволіць «забясьпечыць рэзананс апазыцыі ўва ўсёй краіне»:

Арганізацыйная структура грамадзянскай кампаніі «Пары» была пабудаваная на мадэлі, пры дапамозе якой ажыцьцяўляецца кіраваньне гарызантальнай сеткай. Згодна зь ёй, мабільныя групы, прызначаныя праводзіць інфармацыйную і адукацыйную дзейнасьць, высылаліся ў розныя рэгіёны Ўкраіны. Калі браць разам, ад 380 да 400 гэтых групаў утваралі арганізаваную сетку, што функцыянавала цягам выбарчае кампаніі, а іх дзейнасьць, паводле пэўных ацэнак, ахапіла 25 мільёнаў грамадзянаў… Дзейнасьць гэтае вялізнае сеткі была арганізаваная каардынацыйным цэнтрам кампаніі пад кіраўніцтвам лідэраў «Пары», які адказваў за выпрацоўку інфармацыйнай стратэгіі кампаніі, каардынаваў дзеяньні рэгіянальных аддзелаў, арганізоўваў вытворчасьць і распаўсюд друкаванай прадукцыі, а таксама ажыцьцяўляў кансультацыі з партнэрамі.

Бэкерман пералічвае колькасьць ВНУ, мабільнікаў і карыстальнікаў Інтэрнэту ў Беларусі і прыходзіць да высновы, што сучасная беларуская моладзь валодае адпаведным патэнцыялам дзеля барацьбы, у тым ліку з выкарыстаньнем

высокіх тэхналёгіяў, бо ўсе адпаведныя паказьнікі супастаўныя з украінскімі. Ён кажа пра «спрыяльную» для росту апазыцыі сытуацыю з ВНУ і студэнцтвам. Застаецца толькі зьдзівіцца, чаму гэтая рэвалюцыя яшчэ не адбылася!

Апазыцыйная вэртыкаль. У герархіі моладзевай апазыцыі маюць быць тры ўзроўні. Карыстаючыся сучаснымі сродкамі камунікацыі цэнтар руху (першы ўзровень) ў Менску мае на прынцыпах герархіі кіраваць разгалінаванай сеткай моладзевых групаў у шматлікіх унівэрсытэтах краіны па-за Менскам, ажыцьцяўляючы фінансавае і іншае забесьпячэньне, неабходнае дзеля апазыцыйнай дзейнасьці.

Паколькі кіраўнікі падпольнага цэнтру занадта вядомыя, каб самім пранікнуць у ВНУ, цэнтар руху павінен кіраваць падпольнай сеткай праз кібэрпрастору. За пасярэдніцтвам гэтай сеткі актывісты руху, што навучаюцца ў ВНУ, змогуць кіраваць тайнымі падпольнымі групамі сярод студэнтаў, выкарыстоўваючы сукурсьнікаў, што сымпатызуюць іх справе, і распаўсюджваючы ідэі руху ў ВНУ і за яе межамі. Удзельнікі гэтага другога ўзроўню руху – унівэрсытэцкія студэнты і падрыхтаваныя рэвалюцыянэры ў менскіх арганізацыях – змогуць зьвязацца з студэнтамі зь іншых асноўных рэгіянальных унівэрсытэтаў. Гэтыя студэнты-добраахвотнікі ў гарадох па-за Менскам (трэці ўзровень)… будуць адказваць за распаўсюджаньне апазыцыйных ідэяў ува ўсіх рэгіёнах краіны, тым самым дасягаючы прынцыпова важнай глыбінкі, у якой людзі, магчыма, нават і не ўсьведамляюць, што рэвалюцыйны працэс ідзе.

Зацікаўленасьці моладзі ў перамозе апазыцыі спрыяюць тры чыньнікі. Па-першае, яе незадаволенасьць жорсткім кантролем Лукашэнкі над грамадзтвам і яе імкненьне да пашырэньня індывідуальных свабодаў; па-другое, прыклад грузінскай ды ўкраінскай моладзі; па-трэцяе, «беларуская моладзь, незадаволеная адсутнасьцю дэмакратычных рэформаў і эўрапейскай інтэграцыі пасьля падзеньня камунізму ў 1991 годзе імкнецца стаць часткай заходняга сьвету».

Праўда, выяўляецца, што ў моладзевым руху рэжым на крок ужо апярэдзіў апазыцыю, стварыўшы свой буйнамаштабны праект БРСМ, і гвалтоўныя дзеяньні ўладаў могуць эфэктыўна задушыць паўстаньне моладзі:

Як жа моладзевая апазыцыя можа выйграць барацьбу за папаўненьне сваіх шэрагаў? Зноў-такі, гэтая барацьба пачынаецца з герархічнай мадэлі арганізацыі... Пры дапамозе тэхналягічных сродкаў, пачынаючы з падпольнага ядра і даходзячы да валянтэраў ува ўнівэрсытэтах усёй краіны, моладзевыя групы павінны працягваць добра арганізаваную мабілізацыйную кампанію, каб павялічыць колькасьць удзельнікаў рэвалюцыйнага руху.

Тэхналягічна гэта таксама нібыта проста: «Важным складнікам працэсу мабілізацыі ёсьць цэнтральны сайт у Інтэрнэце, які прадстаўляе аб'яднаны моладзевы рух… і будзе служыць ключавой крыніцай інфармацыі для патэнцыйных прыхільнікаў моладзевай апазыцыі, якія могуць пазнаёміцца на ім з мэтамі і стратэгіяй апазыцыйнага руху… Сайт будзе прапагандаваць дзейнасьць апазыцыі, а таксама служыць падпольнай крыніцай інфармацыі аб апазыцыйных мітынгах, дэманстрацыях і спадарожных мерапрыемствах». Маўляў, і сайт гэты прапагандаваць можна безь вялікай рызыкі, пішучы ягоны адрас дзе заўгодна, напрыклад, на дошцы ў аўдыторыі. Праўда, супрацьлеглы бок добра ўсьведамляе такія пагрозы і ўсё больш абмяжоўвае доступ да Інтэрнэту.

Амэрыканскі аналітык кажа пра неабходнасьць выкарыстаньня яшчэ дзьвюх тактык мабілізацыі, якія добра зарэкамэндавалі сябе ва Ўкраіне – графіці і музычных канцэртаў. «Рэжым ня будзе разглядаць канцэрт як нешта відавочна варожае». На жаль, рэжым ужо іх так разглядае, а таму паўтарыць досьвед «Пары» з арганізацыяй дзясяткаў перадвыбарных канцэртаў у Беларусі наўрад ці каму ўдасца. Рэглямэнтацыя грамадзкай актыўнасьці ў Беларусі сягнула шмат глыбей, і хаця здаровы амэрыканскі розум кажа, што канцэрт ня будуць разглядаць з такой падазронасьцю, як дэманстрацыю на плошчы, аднак практычны беларускі розум падказвае, што дазволу на

правядзеньне ні першага, ні другога не дадуць.

Апрацоўка масаў. Пасьля пасьпяховай арганізацыі і павелічэньня сваіх шэрагаў моладзевы рух павінен пайсьці ў народныя масы і сказаць людзям праўду пра скарумпаванасьць рэжыму, выгады пераменаў і перавагі сумленнага выбарчага працэсу:

Апрача выкарыстаньня незалежных СМІ, самымі важнымі складнікамі пасьпяховага распаўсюджваньня ідэалаў руху зьяўляюцца: 1) выбар адмысловага стылю, у тым ліку колеру, лёга, слогану ці іншай візуальнай сымболікі; 2) друкаваньне флаераў, сьцяжкоў, маек і іншай рэклямнай прадукцыі, а таксама іх распаўсюд на гарадзкіх плошчах ці ў сетцы грамадзкага транспарту; 3) арганізацыя пікетаў, сядзячых страйкаў і дэманстрацыяў на плошчах у гадзіны, якія найбольш прыдатныя, каб прыцягнуць увагу звычайнага насельніцтва.

Вядома, сучасная рэкляма сягнула вышыняў у распрацоўцы мэтадаў перакананьня чалавека. Але гэткія тэхналёгіі нічога ня вартыя там, дзе іх павярхоўнае ўзьдзеяньне натыкнецца на глыбока закарэнены і штодня падмацоўваны страх сапраўдных ці ўяўных рэпрэсіяў. Зрэшты, сам аўтар прызнае, што моладзевы рух у Беларусі чакаюць значна больш сур'ёзныя выпрабаваньні, чым тое было ва Ўкраіне: «рэжым Лукашэнкі таксама засвоіў навуку Памаранчавай рэвалюцыі. Верагодней за ўсё, Лукашэнка ніколі не дазволіць грамадзянскім хваляваньням дасягнуць узроўню, нават блізкага таму, які дазволілі ўкраінскія ўлады перад выбарамі». Таму трэба спадзявацца на моц і волю апазыцыянэраў.

Дзень «Х» – назіраньне за выбарамі і арганізацыя пратэстаў. «Пасьля многіх месяцаў герархічнай арганізацыі, мабілізацыі і раскруткі, а таксама масавага пашырэньня дэмакратычных ідэяў, моладзевы апазыцыйны рух у Беларусі павінен падрыхтавацца да крытычнага дня ў сваёй грамадзянскай кампаніі: выбараў. Каб дасягнуць посьпеху ў дзень выбараў,

моладзевы рух павінен скаардынаваць свае дзеяньні з назіральнікамі, што фіксуюць выбарчыя падтасоўкі, супрацоўнічаць з партыяй асноўнага апазыцыйнага кандыдата дый эфэктыўна арганізаваць масавыя мірныя пратэсты ў дзень выбараў, закліканыя прыцягнуць міжнародную ўвагу». На жаль, украінскі тактычны досьвед у гэтым разе зноў выглядае сумнеўна, хаця Джэры Бэкерман і заклікае да яго перайманьня. Арганізаваць масавую кампанію назіраньня за выбарамі ў паўнавартасным выглядзе таксама, хутчэй за ўсё, ня ўдасца. Дамагчыся ж непрызнаньня выбараў у сьвеце для апазыцыі будзе няцяжка, проста ў самой Беларусі ад гэтага нічога ня зьменіцца. Сапраўды, як піша Джэры Бэкерман, толькі «неадкладная рэакцыя на непазьбежныя выбарчыя падтасоўкі вызначыць посьпех вольных і сумленных выбараў у Беларусі»:

Выкарыстоўваючы доказы падтасовак у часе выбараў, моладзевы апазыцыйны рух павінен паведаміць пра гэта народу празь незалежныя СМІ, выпусьціўшы адпаведны прэсавы рэліз… які абвяшчае, што моладзевы рух і народ Беларусі не прымаюць вынікаў выбараў. Гэты грамадзкі прэс-рэліз ня толькі дасьць народу Беларусі знак, што выбарчы працэс нелегітымны, але і будзе служыць апраўданьнем для масавых вулічных пратэстаў, якія моладзевая апазыцыя павінна арганізоўваць, пачынаючы з ночы выбараў і працягваць столькі, колькі трэба, пакуль вынікі выбараў ня будуць афіцыйна абвешчаныя несапраўднымі.

Ува Ўкраіне зрабіць гэта было няцяжка. З пачаткам 2006 году незалежныя СМІ ў Беларусі пазбаўленыя шырокай аўдыторыі, не распаўсюджваюцца праз падпіску і не прадаюцца ў звыклых месцах. І як жа тады паведаміць масам пра падтасоўкі?

Апрача гэтага, яшчэ да выбараў моладзевы апазыцыйны рух павінен пачаць працаваць з асноўным дэмакратычным кандыдатам і ягонай партыяй:

У прэсавы рэліз з нагоды выбараў трэба ўключыць заяву лідэра дэмакратычнай апазыцыі. Лідэр апазыцыі павінен быць цэнтральнай часткай працэсу дэманстрацыяў, гэта

прадугледжвае выраб гіганцкіх постэраў з выявай лідэра апазыцыі, слоганы зь ягоным іменем і арганізацыю прамоваў на дэманстрацыях.

Сур'ёзнай праблемай, зь якой не сутыкалася ўкраінская апазыцыя, але якая, відаць, паўстане перад беларускім рухам, будзе адсутнасьць другога туру выбараў.

Упарта вызначаючы ўсё новыя і новыя адрозьненьні паміж Беларусяй і Ўкраінай, Бэкерман працягвае, тым ня менш, распрацоўваць сцэнар паўтарэньня ўкраінскай Памаранчавай рэвалюцыі ў Беларусі. Але зважаючы на глыбокія адрозьненьні паміж беларускай сытуацыяй і сытуацыямі, якія існавалі на момант пачатку каляровых рэвалюцыяў у Грузіі, Украіне ды Кыргызстане, мы ня маем падставаў разглядаць сцэнар разьвіцьця падзеяў у згаданых краінах як рэалістычны і верагодны для Беларусі. Досьвед украінскага руху стратэгічна правільны для Беларусі (як і для кожнай краіны сьвету, якую чакае пераход да дэмакратыі), але тактычна ён для Беларусі нічога ня варты.

Бэкерман сьцьвярджае, што калі б у верасьні 2001 году супраць фальшаваньняў выйшлі пратэставаць ня пара тысячаў, а некалькі сотняў тысячаў чалавек, перамога Лукашэнкі была б пад сур'ёзным сумневам. Але калі б выйшлі некалькі сотняў тысячаў, дык гэта была б іншая краіна зь іншымі ўмовамі. Выбары 2001 году паказалі сапраўдную вартасьць маркетынгава-рэклямных захадаў і «грамадзянскіх кампаніяў», бо нягледзячы на ўсю каляровую апазыцыйную прадукцыю ахвотных галасаваць за апазыцыйнага кандыдата не паболела, а бараніць Палац прафсаюзаў і дэмакратыю прыйшлі толькі нацыяналісты. Тое самае тычыцца і 1996 году.

Таму футурыстычнымі здаюцца такія тактычныя парады, як:

Сьледуючы ўкраінскай мадэлі, трэба ўсталяваць намётавыя мястэчкі на галоўных бульварах і сквэрах ў гарадох ува ўсёй краіне, але перадусім у Менску. Гэтыя намётавыя мястэчкі, укамплектаваныя з актыўных валянтэраў і лідэраў моладзевага

руху, а таксама іншых прыхільнікаў справы дэмакратыі і нават простых беларускіх грамадзянаў, што вераць у мэты і ідэі моладзевага руху, павінны быць афарбаваныя ў колеры рэвалюцыйнага руху, там павінны быць сьцягі, мэгафоны ды іншыя візуальныя і аўдыёсродкі дзеля пашырэньня ідэяў руху. Выкарыстаньне знакамітых асобаў і папулярных музычных гуртоў, прыхільных да дэмакратыі, будзе служыць мэтам легітымізацыі пратэстаў. Посьпех вулічных пратэстаў і намётавых мястэчак залежыць выключна ад колькасьці людзей, гатовых прыйсьці, каб падтрымаць дэмакратыю. Гэта дадасьць легітымнасьці і дазволіць пазьбегчы ўражаньня, што гэтыя пратэсты ёсьць толькі разрозьненымі студэнцкімі дэманстрацыямі, дый будзе спрыяць пераадоленьню псыхалягічных бар'ераў, зь якімі сутыкаецца звычайны грамадзянін, які баіцца палітычнай дзейнасьці, перш як далучыцца да дэманстрацыі.

Гэтыя намётавыя мястэчкі і вулічныя пратэсты павінны прыцягваць да сябе ўвагу паспалітых грамадзянаў ужо сваёй маштабнасьцю і зладжанасьцю, бо спадзявацца на ўвагу да іх з боку дзяржаўных мэдыяў не выпадае. Удзельнікі гэтых акцыяў павінны падрыхтавацца доўжыць іх датуль, пакуль вынікі выбараў ня будуць абвешчаныя несапраўднымі. Але «ключом да іх посьпеху будзе міжнародная ўвага, якую яны прыцягнуць». Зважаючы на ранейшы досьвед разгону масавых акцыяў, варта чакаць выкарыстаньня гвалту супраць удзельнікаў намётавых мястэчак:

Як мага большая колькасьць удзельнікаў ня толькі зробіць вайсковую контрапэрацыю больш складанай задачай, але і любая вайсковая апэрацыя супраць такой вялікай дэманстрацыі, праўдападобна, выкліча міжнароднае абурэньне… Шырокамаштабная міжнародная ўвага да ўдзельнікаў пратэстаў абмяжуе магчымасьці… гвалтоўнага разгону негвалтоўных дэманстрацыяў і, праўдападобна, прывядзе да легітымізацыі руху ў вачах беларускага народу.

Аб'яднаньне апазыцыі.

Разьдзел дакладу Бэкермана, прысьвечаны аб'яднаньню апазыцыі, пацьвярджае тэарэтычную правільнасьць дзеяньняў апазыцыі ў абраньні адзінага кандыдата. «Аб'яднаньне (unification) і арганізацыя асноўных апазыцыйных палітычных партыяў Беларусі – крытычна важны чыньнік для патэнцыйнага адхіленьня Лукашэнкі ад улады ў 2006 годзе». Каб дасягнуць посьпеху ў стварэньні ў Беларусі дэмакратычнага і празаходняга рэжыму, палітычныя апазыцыйныя партыі павінны:

– аб'яднацца ды абраць адзінага кандыдата, што будзе процістаяць Лукашэнку;

– супрацоўнічаць з дэмакратычнымі НДА і арганізацыямі, што працуюць над зьмяненьнем рэжыму ў Беларусі;

– цесна супрацоўнічаць з моладзевым апазыцыйным рухам у каардынацыі выбарчага працэсу і пашырэньні рэвалюцыйных ідэяў у масах.

Першы пункт гэтага пляну пасьпяхова выконваецца, і шэраг партыяў ужо супрацоўнічаюць. Праўда, вырашальным чыньнікам могуць аказацца хутчэй ня партыі, а недзяржаўныя арганізацыі – НДА, чыя сетка і патэнцыял у краіне пакуль не зусім ясныя. У гэтым палягае вялікае Невядомае будучых падзеяў. (Падобная інтрыга была і ў 2001 годзе, калі вялікім Невядомым былі прафсаюзныя структуры. У выніку выбараў высьветлілася, што значэньне гэтай Невядомай малое, а разьлік на яе пахаваў усю кампанію апазыцыі.) Няважна, як НДА сябе павядуць у выбарчай барацьбе, іх віна палягае ўжо ў тым, што зь іх асяродзьдзя выйшаў галоўны апанэнт Лукашэнкі на гэтых выбарах – Аляксандар Мілінкевіч, як на папярэдніх выбарах з асяродзьдзя прафсаюзаў выйшаў Ганчарык, што стала прысудам для ўсёй незалежнай прафсаюзнай супольнасьці. Таму папярэджаньні Джэры Бэкермана пра неабходнасьць разьмежаваньня паміж НДА і апазыцыяй, каб перадухіліць рэпрэсіі супраць НДА, наўрад ці апраўданыя.

Джэры Бэкерман нястомна паўтарае пра патрэбу цеснай каардынацыі і супрацы паміж моладзевымі групамі і партыямі.

Прынцыпова важна, каб знойдзеныя партыямі грошы ішлі на падтрымку дзейнасьці моладзевай апазыцыі. Супраца з моладзьдзю павінна быць ключавой задачай для палітычнай апазыцыі ў тых сфэрах, дзе моладзь робіць тую чарнавую работу, якой ня могуць зрабіць партыйныя палітыкі. Моладзевы рух ня толькі лепш валодае Інтэрнэтам і зьвязанымі зь ім тэхналёгіямі, але таксама мае добраахвотнікаў, гатовых за сваю справу цярпець пабоі, арышты і нават зьняволеньне. Маладыя ўдзельнікі пратэстаў, што раздаюць улёткі, арганізуюць канцэрты і пратэсты ў гарадзкіх парках, будуць шчытом для палітычных партыяў, якія ня могуць падстаўляць сваё кіраўніцтва пад пагрозу зьняволеньня ці высылкі. У прыватнасьці, апазыцыйны кандыдат Аляксандар Мілінкевіч павінен супрацоўнічаць з моладзевым рухам, каб забясьпечыць зьяўленьне свайго аблічча на постэрах, бігбордах і іншай прапагандысцкай прадукцыі.

Сродкі масавай інфармацыі.

Каб пераадолець перашкоды, створаныя рэжымам для дзейнасьці незалежных СМІ, трэба выкарыстаць перавагі сучасных тэхналёгіяў – Інтэрнэту, ТБ і радыёперадаваньня з-за мяжы. Друкаваным СМІ варта самім сысьці ў падпольле, папярэдне стварыўшы друкарні і наладзіўшы пры дапамозе палітычнай апазыцыі і моладзевага руху падпольныя сеткі распаўсюду. Фактычна, гэта ўжо адбываецца.

Бэкерман кажа пра манаполію дзяржаўных мэдыяў, але не заўважае яе татальнага характару ў Беларусі. У Беларусі, напрыклад, *ніколі* не існавала недзяржаўнага агульнанацыянальнага каналу тэлебачаньня. Сёньня стаіць пытаньне пра выжываньне нават апошніх друкаваных незалежных СМІ. Ідзецца ўжо не пра ахоп большае аўдыторыі ў зьвязку з выбарамі. Ідзецца пра выжываньне – быць альбо ня быць! Апазыцыя не спадзяецца на свае сілы ў гэтай галіне наагул, пакладаючыся на замежнае вяшчаньне.

Каб забясьпечыць пасьпяховае функцыянаваньне незалежных СМІ, прапануецца 1) выкарыстоўваць тэхналягічныя дасягненьні дзеля дзейнасьці СМІ і забясьпечыць вяшчаньне на

Беларусь з суседніх краінаў; 2) выкарыстоўваць падпольныя друкарні і сетку распаўсюду, каб абысьці юрыдычныя перашкоды; 3) даваць палітычны прытулак у Эўропе журналістам, якіх перасьледуе рэжым.

Праўда, прызнае Джэры Бэкерман, «апазыцыйныя вэб-старонкі будуць недасяжныя для ключавой аўдыторыі – людзей старэйшага веку з правінцыі, у якіх няма доступу да Інтэрнэту. Аднак гэтая крыніца незалежнай інфармацыі будзе дасягальная для тэхналягічна падкаваных прадстаўнікоў моладзі і старэйшых пакаленьняў у буйных гарадох».

І далей:

Падобна моладзеваму апазыцыйнаму руху, які будзе дзейнічаць у падпольлі, незалежныя СМІ таксама павінны быць гатовыя зьмяніць спосаб друку сваіх выданьняў… Пасьпяховае функцыянаваньне падпольнага друку вымагае двух складнікаў: друкарні і сеткі распаўсюду. Забароненыя да друку газэты й часопісы павінны без адвалокі зьмяніць месца дысьлякацыі і працягваць выхад, хаця б у меншым маштабе ды ў падпольлі. Жыцьцёва важны момант для падпольнага выданьня незалежнага друку – эфэктыўная дапамога яму з боку палітычнай апазыцыі і моладзевага руху.

Палітычная апазыцыя павінна неадкладна аказваць дапамогу СМІ, якія былі зачыненыя ўладамі. Выкарыстоўваючы свае палітычныя сувязі і іншыя сродкі, СМІ павінны перамясьціць сваё абсталяваньне (калі яно ацалела) і свае рэдакцыі ў невядомыя ўладам месцы. У пэўных выпадках разумнай альтэрнатывай будзе перамяшчэньне рэдакцыяў за мяжу, хаця тады занадта складана будзе перакідваць праз кардон у Беларусь вялікія наклады выданьняў. Найлепшым варыянтам для незалежных СМІ будзе разьмяшчэньне падпольных друкарняў у складзкіх комплексах ці іншых складаных для правядзеньня праверак раёнах такіх местаў, як Менск, альбо на фэрмах у вясковай мясцовасьці.

Пасьля пераезду і працягу сваёй работы ў падпольлі, незалежныя СМІ павінны скарыстаць з магчымасьцяў

моладзевага руху ў пляне распаўсюджаньня. Газэты й часопісы павінны выкарыстоўваць свае фінансавыя рэсурсы, каб наймаць удзельнікаў моладзевага руху распаўсюднікамі. Моладзевы рух можа выкарыстоўваць пры гэтым тыя ж каналы распаўсюду, па якіх ён рассылае ўлёткі ды іншыя прапагандысцкія матэрыялы… Зноў жа ідэальным спосабам ахопу найвялікшай аўдыторыі будзе распаўсюд у шматлюдных гарадзкіх месцах і ў грамадзкім транспарце.

Хаця большасьць падпольных журналістаў будзе выкарыстоўваць… адпаведныя тэхнікі, каб унікнуць выкрыцьця, аднак надзвычай важна, каб існавала міжнародная сетка бясьпекі для журналістаў незалежных СМІ, якія маглі б уцячы на бясьпечную тэрыторыю…

Апынуўшыся ў бясьпецы за межамі Беларусі, гэтыя журналісты працягнуць, на думку Бэкермана, сваю дзейнасьць на карысьць дэмакратыі і будуць натхняць рух, а таксама спрыяць дэлегітымізацыі рэжыму ў эўрапейскіх краінах і прапагандзе справы апазыцыі.

Міжнароднае ўмяшаньне і падтрымка. «У дадатак да работы, зробленай унутры краіны палітычнай апазыцыяй, моладзевым рухам, НДА і незалежнымі СМІ, адной з самых важных частак прасоўваньня да дэмакратызацыі і зьмяненьня рэжыму ў Беларусі зьяўляецца ўплыў міжнароднай супольнасьці. У авангардзе міжнароднага ціску… будуць Злучаныя Штаты і Эўразьвяз. Дэмакратычная, празаходняя Беларусь выгадная як беларускаму народу, гэтак і ЗША ды ЭЗ… Каб дасягнуць сапраўднай эфэктыўнасьці, ЗША неабходна: 1) узаемадзейнічаць з аб'яднанай палітычнай апазыцыяй у Беларусі, спрыяючы апазыцыйнаму кандыдату і фінансуючы апазыцыю ўнутры Беларусі; 2) супрацоўнічаць з моладзевым апазыцыйным рухам, фінансуючы яго дзейнасьць і забясьпечваючы юрыдычную падтрымку для ягоных лідэраў; 3) увесьці лёгкія эканамічныя санкцыі, а таксама санкцыі, скіраваныя на зьмяншэньне легітымнасьці рэжыму ўнутры краіны, у тым ліку празь візавыя абмежаваньні і абмежаваньні перамяшчэньня кіраўніцтва дзяржавы».

Сёньняшняй адміністрацыі Белага дому трэба дэманстрацыйна сустрэцца зь Мілінкевічам, каб падвысіць ягоную легітымнасьць і паказаць гатовасьць Вашынгтону працаваць з апазыцыйным кандыдатам у выпадку яго абраньня прэзыдэнтам. ЗША разам з апазыцыйным кандыдатам і аб'яднанай апазыцыяй варта распрацаваць супольную плятформу, бо «апазыцыйны кандыдат зможа весьці кампанію, выкарыстоўваючы пэрспэктывы эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларусяй і ЗША».

Больш важна тое, што:

Валодаючы досьведам і ведамі ў правядзеньні сумленных выбараў, ЗША павінны навучыць апазыцыю, як весьці кампанію, ажыцьцяўляць публічныя выступы, назіраць за выбарамі… ЗША павінны цесна супрацоўнічаць з апазыцыяй у распрацоўцы слоганаў і стратэгіяў кампаніі. Яшчэ больш важна, каб ЗША забясьпечылі ўсім неабходным правядзеньне назіраньня ў дзень выбараў… Калі прадстаўнікам ЗША не дазволяць назіраць за выбарамі, ЗША павінны падрыхтаваць беларускіх назіральнікаў і забясьпечыць іх неабходным абсталяваньнем… ЗША павінны падтрымаць кампанію апазыцыйнага руху, у тым ліку празь фінансаваньне НДА і незалежных СМІ…

(Кажучы пра ўсе тыя кантакты і фінансаваньне, варта памятаць, што дэманстрацыйна аказваная дапамога можа мець адваротны эфэкт і дыскрэдытаваць дэмакратычную апазыцыю.)

Апрача чыста фінансавай дапамогі, ЗША могуць адыграць ключавую ролю ў забесьпячэньні юрыдычнай дапамогі моладзевым актывістам, чые правы парушыць рэжым… ЗША павінны ня толькі падтрымліваць НДА, што спрыяюць умацаваньню свабоды слова, сумленным выбарам і правам чалавека, але і… праз сваіх юрыдычных экспэртаў… абараняць лідэраў і актывістаў моладзевай апазыцыі… Іншай добрай альтэрнатывай будзе падрыхтоўка маладых юрыстаў зь Беларусі ў галіне міжнароднага права і юрыдычных аспэктаў абароны правоў чалавека.

Амэрыканскі «Акт аб дэмакратыі ў Беларусі» 2004 году прадугледжвае два віды санкцыяў супраць рэжыму: 1) лёгкія эканамічныя санкцыі і 2) замарожваньне банкаўскіх рахункаў і абмежаваньне замежных паездак кіраўніцтва рэжыму. Бэкерман перасьцерагае ад увядзеньня цяжкіх санкцыяў, якія толькі паспрыяюць захаваньню рэжыму. «Аднак дакладна ажыццяўляныя [слабыя] эканамічныя санкцыі могуць паслужыць карыснай мэце, бо ў іх выніку рэжым Лукашэнкі ў вачах народу будзе выглядаць слабым». Праўда, пачынаючы з 1970 году аднабаковыя амэрыканскія санкцыі былі дзейсныя толькі ў 13 % выпадкаў. Таму лепшай альтэрнатывай, на думку амэрыканскага аналітыка, будуць візавыя абмежаваньні для вярхушкі рэжыму, якая дзеля няздольнасьці сустракацца з замежнымі лідэрамі выглядацьме слабой і нелегітымнай.

Але такая сытуацыя захоўваецца з 1997 году і, здаецца, цяперашні рэжым ужо прызвычаіўся да яе. Больш важна для кіраўніцтва Беларусі тое, якую пазыцыю зойме наш сусед Эўразьвяз. Таму любыя дзеяньні з боку Эўразьвязу будуць мець шмат больш уплыву на афіцыйны Менск, чымся ўсе санкцыі Вашынгтону разам узятыя:

Апрача супрацы з палітычнай апазыцыяй і моладзевым рухам, а таксама ўвядзеньня лёгкіх эканамічных санкцыяў і забароны на падарожжы для беларускай вярхушкі, Эўразьвяз павінен зрабіць колькі іншых ключавых крокаў… Найперш, ЭЗ павінен стаць прытулкам для незалежных СМІ, якія будуць ажыццяўляць вяшчаньне на Беларусь, напрыклад, радыё- і тэлестанцыяў… ЭЗ павінен забясьпечыць стыпэндыямі для працягу адукацыі маладых беларусаў, выключаных з універсытэтаў за распаўсюджваньне апазыцыйных ідэяў, альбо студэнтаў з універсытэтаў, што былі зачыненыя рэжымам… Урэшце павінен тым ці іншым спосабам адкрыта асудзіць рэжым Лукашэнкі, прыняўшы нешта падобнае да амэрыканскага «Акту аб дэмакратыі ў Беларусі». Афіцыйны і адзінадушны заклік з Брусэлю да дэмакратычных пераменаў у Беларусі дасьць беларускаму народу сыгнал, што ягоныя эўрапейскія суседзі і ўся міжнародная супольнасьць, а ня толькі ЗША, падтрымліваюць зьмяненьне рэжыму ў Беларусі.

* * *

Як зазначае Джэры Бэкерман, «беларускаму народу пэрспэктывы палітычных пераменаў падаюцца пажаданымі, але складанымі дзеля ажыццяўленьня». Таму, працягнем яго думку, так важна гаварыць пра зьмяненьні, пра «рэвалюцыю-перамены-дэмакратызацыю» і г. д. Па-першае, гэта прывучыць людзей не палохацца гэтых словаў. Па-другое, дапаможа знайсьці аптымальныя шляхі ажыццяўленьня пераменаў. Таму трэба абмяркоўваць тэму пераменаў, і даклад Джэры Бэкермана, відаць, нечакана для аўтара прыцягнуў да сябе ўвагу беларускіх палітолягаў.

Ахвотным рабіць рэвалюцыю ў Беларусі можна параіць натхняцца каляровымі рэвалюцыямі ў былым СССР, але выйсьці ўрэшце зь іх ценю, бо ў тактычным пляне Беларусь вымагае іншых падыходаў. Краіна больш зьяднаная з рэгіянальнага пункту гледжаньня (чым Грузія, ад якой адкалоліся аўтаномныя ўскраіны), багацейшая эканамічна (чым Украіна ці Грузія) і мае больш адукаванае насельніцтва (чым Кыргызстан).

Стратэгічныя выкладкі Джэры Бэкермана простыя і дзеля таго геніяльна слушныя *для ўсяго чалавецтва*. Дэмакратызацыя сапраўды пойдзе гэтым шляхам. Але тактыка, то бок сцэнар, выклікаюць шмат пытаньняў што да іх рэалістычнасьці. Праектаваная ім рэвалюцыя – гэта фактычна тэхналягічны працэс. Другі ўдзельнік дэбатаў па Беларусі Енс Віснэр наагул параўноўвае рэвалюцыйную дзейнасьць з карпарацыйнай. Але наўрад ці хто хоча падстаўляць сваю галаву за «карпарацыю» ці тэхналёгію. Ідэі, якія нясе рэвалюцыя, апісваная Бэкерманам, лібэральныя. Яшчэ Бэнэдыкт Андэрсан задаў рытарычнае пытаньне: «Усе бачылі помнікі невядомаму жаўнеру, але ці хто бачыў Помнік невядомаму загінуламу лібэралу?».

Разважаючы пра эвалюцыю ўва ўмовах дыктатуры, варта памятаць, што толькі высокія ідэалы, а не імкненьне да неабмежаванага спажываньня заходніх фільмаў і нашэньня заходняй вопраткі (якія, на думку Бэкермана, забароненыя беларускім рэжымам), заахвоцяць людзей да самаахвярнасьці.

На любую тэхналёгію апазыцыі добра арганізаваны дзяржаўны апарат (а ня той, што панаваў у Грузіі, Кыргызстане і Ўкраіне) знойдзе контратэхналёгію. Але супраць высокіх ідэалаў тэхналёгія бясьсільная. Ідэалы – гэта ня доступ да вопраткі і фільмаў, ідэалы – гэта тое, дзеля чаго ахвяруюць, дзеля чаго салідарызуюцца мільёны. Ідэал – гэта калі нехта гатовы нават загінуць, каб праклясьці дарогу іншым. Але гэта ўжо выходзіць за межы тэхналёгіі, а таму ў дакладзе Бэкермана ня згадваецца.

Рэвалюцыя павінна быць натуральным прадуктам тутэйшага грамадзтва. Французкія асьветнікі гадамі пісалі й спрачаліся, каб настаў 1789 год, а марксісты – каб прычакаць 1917 году! Памаранчавая рэвалюцыя таксама вымагала магутнага інтэлектуальнага зруху. Вядома, паспалітыя ўкраінцы не чыталі Рабчука або Кузё, але іх чыталі тыя, хто распрацоўваў стратэгію тае ж «Пары».

На маю думку, перамены ў Беларусі ня толькі будуць ісьці згодна зь іншым «некаляровым варыянтам», але і будуць зыходзіць зь іншых асяродкаў – ня сёньняшніх партыяў і арганізацыяў. Магчыма, вернецца пэрыяд «народнага фронту», калі будзе створаная новая палітычная арганізацыя з нуля.

У Беларусі цяперашнія выбары ня будуць роўныя рэвалюцыі. Рэвалюцыя можа быць прысьпешаная, зьвязаная, аблегчаная сфальшаванымі выбарамі, але адбудзецца яна зь іншай нагоды і па іншым сцэнары, калі ня будзе перадухіленая ў далейшым праз эвалюцыю рэжыму. Развагі пра рэвалюцыю па ўкраінскім сцэнары ў Беларусі 19 сакавіка павінны суправаджацца адной істотнай заўвагай – калі Бог даруе цуд.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 3 (43) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/19
[image]

[image]

A R C H E П а ч а т а к № 3 (43) - 2006

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]2006
"Дзеяньне"
[image] [image] [image]

АЛЕНА КАРАСЦЯЛЁВА
палітоляг. У 1994 годзе скончыла БДУ, затым атрымала ступень магістра ў Манчэстэрскім унівэрсытэце і доктара – ува ўнівэрсытэце г. Бат. Працавала на катэдры палітыкі ўнівэрсытэту Глазга, з жніўня 2004 – супрацоўніца катэдры міжнароднай палітыкі Валійскага ўнівэрсытэту ў Абэрыстуіце. Адна з

Алена Карасцялёва
Якасць дэмакратыі ў Беларусі й Украіне

УВОДЗІНЫ

Мэта артыкула – разгледзець і параўнаць асаблівасці дэмакратыі[1] ў Беларусі і Украіне і вызначыць, якія тыпы дзяржаўнага ладу развіваюцца ў гэты момант у гэтых краінах.

ПЕРААСЭНСАВАННЕ РОЛІ «ДЗЕЙНЫХ АСОБ» У ВЫЗНАЧЭННІ ДЭМАКРАТЫІ

У найбольш папулярных вызначэннях дэмакратыі, па сутнасці, за аснову бярэцца практыка выбараў, бо менавіта яны даюць грамадзянам магчымасць ажыццяўляць свае права голасу і выбіраць кіраўніцтва, якое ім больш падабаецца.

Аднак перш-наперш неабходна акрэсліць некаторыя зыходныя прынцыпы. Па-першае, якімі б «няўстойлівымі» або «ілюзорнымі» ні падаваліся новыя рэжымы, мы будзем разглядаюць іх не як пераходныя, а як кансадаваныя сістэмы. То бок мы падыходзім да іх як да сістэмаў, што ўжо набылі пэўны ўзровень «нармальнасці», з уласцівай ёй адноснай стабільнасцю і прадказальнасцю.

Па-другое, дарма што тэрмін «дэмакратыя» ўжываецца ўжо больш за дзве тысячы гадоў – дагэтуль застаецца шмат няяснасцяў адносна яго значэння, а таксама і магчымых

формаў дэмакратыі. Значыць, застаюцца пытанні адносна больш і менш дэмакратычных рэжымаў. З сучасных палітalагічных дыскусій відаць, як цяжка знайсці вызначэнне *сучасным* рэжымам, бо іх колькасць расце, яны робяцца ўсё больш і больш размаітымі. З аднаго боку, у наш час «сталейшыя» палітычныя сістэмы ў сваім развіцці набываюць рысы, што часам прымушаюць нас сумнявацца ў слушнасці традыцыйнага разумення дэмакратыі. З другога боку, паўстаюць новыя рэжымы, звязаныя з больш складаным і неаднародным грамадска-палітычным кантэкстам. Таму трэба на канцэптуальным узроўні высветліць, што ж насамрэч неабходна разумець пад паняткам «сучасная дэмакратыя». Такім чынам, у нашым доследзе мы будзем зыходзіць з таго, што формаў дэмакратыі – ад ліберальнай да дэлегатыўнай і дэмагагічнай – можа быць столькі, колькі дзяржаў. Адзіная неабходная ўмова – Канстытуцыя фармальна гарантуе грамадзянам магчымасць выбіраць і кантраляваць уладу.

Па-трэцяе, з вышэйсказанага вынікае, што ліберальная дэмакратыя (дэмакратыя ў традыцыйным заходнім разуменні) – неабавязкова адзіны або найлепшы спосаб арганізацыі ўстойлівага кіравання. Могуць існаваць і іншыя палітычныя сістэмы, якія тэарэтычна маглі б спаборнічаць з дэмакратыяй у кіраванні стабільнымі дзяржавамі, дзе захоўваецца культурная разнастайнасць і забяспечваюцца структурныя асновы для партнёрства паміж сацыяльнымі групамі.

Нарэшце, тут мы падыходзім да апошняга ўступнага тэзіса. Важна не толькі ўдасканаліць наша разуменне дэмакратыі як такой, але і знайсці адпаведны інструментар, каб вызначаць ступень развіцця дэмакратыі. У сваёй працы мы трымаемся лініі Гільерма О'Доналда, які ў вызначэнні дэмакратыі наробіць з выбарамі і свабодамі нястомна падкрэслівае ролю *дзейных асоб* (*agency*) (у тэрміналогіі Арыстоцеля – грамадзянін), калі кожны чалавек успрымаецца «як асоба з гледзішча закона, асоба, надзеленая правамі суб'екта, які робіць выбар і нясе за яго адказнасць»[3]. Мы лічым, што вызначэнне дэмакратыі

---

[3] Для мэтаў нашай працы Беларусь ці Украіну лепей разглядаць як выпадкі «квазідэмакратыі», дэкаратыўнай дэмакратыі, што мае дэмакратычны фасад, завіхам хаваюцца маладэмакратычныя парадкі, ці, кажучы словамі Арыстоцеля, «дэмакратыю-дэмагогію». Такі падыход дапаможа лепей зразумець усе ўласцівыя гэтай сістэме адрозненні, якія ўскладняюць або нават вяртаюць назад рух да дэмакратыі, замяняючы яго аўтарытарнымі практыкамі.

Дадатковая літаратура

Diamond, L. (2008). The Spirit of Democracy: The Struggle to Build Free Societies Throughout the World. New York: Times Books.

Dworkin, R. (2006). Is Democracy Possible Here? Princeton, NJ: Princeton University Press.

Fukuyama, F. (2012). The Origins of Political Order: From Prehuman Times to the French Revolution. London: Profile Books.

Gamson, W. A. (1968). Power and Discontent. Homewood, IL: Dorsey Press.

Gilley, B. (2009). The Right to Rule: How States Win and Lose Legitimacy. New York: Columbia University Press.

Hadenius, A. (Ed.). (2001). Institutions and Democratic Citizenship. Oxford: Oxford University Press.

Hadenius, A., & Teorell, J. (2005). Cultural and Economic Prerequisites of Democracy: Reconsidering Recent Opinions. Democratization, 12(5), 723–744.

Hadenius, A., & Teorell, J. (2007). Pathways from Authoritarianism. Journal of Democracy, 18(1), 143–157.

Hagopian, F. (2005). Democracy by Undemocratic Means? Elites, Political Pacts, and Regime Transition in Brazil. Comparative Political Studies, 23(2), 147–170.

Hagopian, F. (2007). Combating Corruption, Enhancing Constitutional Democracy, and Improving the Quality of Representation in Latin America. In F. Hagopian & S. P. Mainwaring (Eds.), The Third Wave of Democratization in Latin America: Advances and Setbacks (pp. 304–337). Cambridge: Cambridge University Press.

Hagopian, F., & Mainwaring, S. P. (Eds.). (2005). The Third Wave of Democratization in Latin America: Advances and Setbacks. Cambridge: Cambridge University Press.

Hale, H. E. (2005). Regime Cycles: Democracy, Autocracy, and Revolution in Post-Soviet Eurasia. World Politics, 58(1), 133–165.

Hale, H. E. (2006). Democracy or Autocracy on the March? The Colored Revolutions as Normal Dynamics. Communist and Post-Communist Studies, 39(3), 305–329.

Hale, H. E. (2010). Eurasian Polities and Patronal Politics. In M. McFaul & K. Stoner-Weiss (Eds.), After the Collapse of Communism: Comparative Lessons of Transitions (pp. 228–260). Cambridge: Cambridge University Press.

Hale, H. E. (2011). Formal Constitutions and Informal Institutions: Rethinking Semi-Presidentialism in Light of Patronal Politics. Journal of Communist Studies and Transition Politics, 27(3–4), 553–581.

Hale, H. E. (2013). Regime Change Cascades: What We Have Learned from the 1848 Revolutions to Twenty-First-Century Eurasia and Beyond. Annual Review of Political Science, 16, 331–353.

Hale, H. E. (2014). Patronal Politics: Eurasian Regime Dynamics in Comparative Perspective. Cambridge: Cambridge University Press.

Hale, H. E. (2015). Why Not Parties in Russia? Democracy, Federalism, and the State System. Cambridge: Cambridge University Press.

Hale, H. E. (2016). Eurasian Polities and Patronal Politics. In M. McFaul & K. Stoner-Weiss (Eds.), After the Collapse of Communism: Comparative Lessons of Transitions (pp. 228–260). Cambridge: Cambridge University Press.

Hale, H. E. (2017). Formal Constitutions and Informal Institutions: Rethinking Semi-Presidentialism in Light of Patronal Politics. Journal of Communist Studies and Transition Politics, 27(3–4), 553–581.

Hale, H. E. (2018). Regime Change Cascades: What We Have Learned from the 1848 Revolutions to Twenty-First-Century Eurasia and Beyond. Annual Review of Political Science, 16, 331–353.

Hale, H. E. (2019). Patronal Politics: Eurasian Regime Dynamics in Comparative Perspective. Cambridge: Cambridge University Press.

Hale, H. E. (2020). Why Not Parties in Russia? Democracy, Federalism, and the State System. Cambridge: Cambridge University Press.

Hale, H. E. (2021). Eurasian Polities and Patronal Politics. In M. McFaul & K. Stoner-Weiss (Eds.), After the Collapse of Communism: Comparative Lessons of Transitions (pp. 228–260). Cambridge: Cambridge University Press.

Hale, H. E. (2022). Formal Constitutions and Informal Institutions: Rethinking Semi-Presidentialism in Light of Patronal Politics. Journal of Communist Studies and Transition Politics, 27(3–4), 553–581.

Hale, H. E. (2023). Regime Change Cascades: What We Have Learned from the 1848 Revolutions to Twenty-First-Century Eurasia and Beyond. Annual Review of Political Science, 16, 331–353.

Hale, H. E. (2024). Patronal Politics: Eurasian Regime Dynamics in Comparative Perspective. Cambridge: Cambridge University Press.

Hale, H. E. (2025). Why Not Parties in Russia? Democracy, Federalism, and the State System. Cambridge: Cambridge University Press.

Аднак практыка некаторых сучасных рэжымаў паказвае, што нават калі рэгулярнае правядзенне выбараў замацаванае ў заканадаўстве, калі выбарцы маюць права ўдзельнічаць у выбарах і вылучаць свае кандыдатуры, калі сам рэжым – устойлівы, усё роўна сістэма не робіцца ад гэтага больш дэмакратычнай – у найлепшым выпадку яна застаецца «квазідэмакратыяй». Таму О'Донэл выказвае меркаванне, што няяснасці ў канцэптуальным вызначэнні сучаснай дэмакратыі выкліканыя не колькасцю і разнастайнасцю новых рэжымаў, а тым, што ў *вызначэнне* дэмакратыі дасюль не ўключаліся грамадзяне як «самастойныя, разумныя і адказныя сацыяльныя істоты»[4].

Новы рэжым, прымаючы інстытуты дэмакратыі (выбарную[4] Там сама.
канстытуцыю, парламент і гэтак далей), адначасова ўсталёўвае прававую сістэму, якая прызнае правы і абавязкі асобы з гледзішча закону. Аднак калі інстытуцыйныя атрыбуты не абапіраюцца на замацаваныя ў грамадстве *маральныя* арыенціры, можа ўзнікаць рэзкае разыходжанне «паміж гэтымі правамі і агульнай структурай грамадства». Функцыянаванне гэткага рэжыму вызначаецца не столькі інстытуцыйнымі і прававымі рамкамі, колькі разуменнем чаканняў людзей і іх паводзін. Будаваць дэмакратыю ў гэткіх абставінах – усё адно што будаваць карабель у моры. Гэта будзе спроба ўзвесці інстытуцыйна-прававую надбудову дэмакратыі на няісным або недастатковым сацыяльным падмурку такога грамадства. У

выніку зазвычай новыя рэжымы або рухаюцца па коле (як ува Украіне) або пераходзяць да аўтарытарнага кіравання (як у Беларусі), бо электарат не гатовы да шматбаковага ўзаемадзеяння з абранай ім уладай, не гатовы напоўніць прынесеную канцэпцыю дэмакратыі зместам «палітычнай адказнасці». Больш за тое, пры гэткіх рэжымах палітычная свядомасць, ці «дасведчанасць», грамадзян аслабляецца пры дапамозе наагул дзейснай прававой сістэмы, якую часцяком умацоўваюць, каб зрабіць служкай улады, а не простых грамадзян. Прычынай – няўменне падначаленых весці з прызначаным кіраўніцтвам дыялог аб сваіх правах.

ЗНАЧЭННЕ ДЭМАКРАТЫІ-ДЭМАГОГІІ

Арыстоцель зазначаў, што з усіх магчымых формаў дэмакратыі адна асабліва падпадае пад маніпуляванне і дыктат алігархіі – ён называе яе «дэмакратыяй-дэмагогіяй». Не на карысць гэтага тыпу дэмакратыі сведчыць яе канстытуцыйная неправамоцнасць, бо пры ёй указы маюць большую вагу, чым закон:ДЭМАКРАТЫЯ-ДЭМАГОГІЯ Ў БЕЛАРУСІ І ВА УКРАІНЕ: ПАПЯРЭДНІЯ ВЫСНОВЫ

У святле вышэйпрыведзеных разважанняў пра дэмакратыю варта задаць пытанне: ці належаць Беларусь і Украіна да выпадкаў дэмакратыі-дэмагогіі? Ані цалкам аўтарытарныя, ані цалкам дэмакратычныя, яны, хутчэй, трапляюць пад азначэнне «квазі-дэмакратыі». Так, яны маюць інстытуцыйна замацаваныя выбары і пэўныя свабоды, прадстаўніцтва на ўсіх узроўнях і канстытуцыйнае кіраванне, калі фармальна ўсе падпарадкоўваюцца закону і без згоды народу не прымаюцца ніякія папраўкі. Аднак прававая сістэма працуе не на тое, каб абараніць грамадзян – то бок «разумных, адказных асоб з гледзішча закону», а на тое, каб надаць легітымнасць тым, хто пры ўладзе. Яна дзейнічае як праз дэкрэты і канстытуцыйныя рэформы, гэтак і праз нябачныя механізмы прававога кантролю і маніпулявання. Кантроль узмацняецца, каб абмежаваць магчымасці выбарцаў падвысіць узровень палітычнай пісьменнасці, а значыць, і навыкі дыялога з уладай, што да іх правоў і абавязкаў.

Ёсць розныя формы дэмакратыі... пятая форма дэмакратыі –

такая, у якой найвышэйшая ўлада належыць не закону, а большасці: яе ўказы маюць вяршэнства над законам. Гэткі стан рэчаў ствараюць дэмагогі... Дэмагогі робяць так, каб пастановы народу адмянялі законы, усё выносячы на народны сход. І так яны ўзвялічваюцца, бо ўсё ў руках народу, а ў іхных руках – галасы паслухмянага ім народу...

Тым не менш Арыстоцель называў гэты рэжым ад пачатку формай *дэмакратыі*. У дэмакратычным кантынууме дэмакратыя-дэмагогія ўяўляе сабой памежны выпадак. Гэта і не дэмакратыя, і не дыктатура, а своеасаблівая «квазідэмакратыя», «нібы»-дэмакратыя. Ёй уласцівая ўстойлівасць улады і «квазі»-дэмакратычнасць сістэмы – што, аднак, «квазі»-задавальняе грамадзян.

Тым не менш, сутнасць гэткай дэмакратыі – у *маніпуляванні*. І як б ні ствараліся ўражанне квазі-далучанасці звычайных грамадзян да ўлады, канкурэнцыі тых, хто пры ўладзе, за галасы грамадзян – усё роўна праглядаецца моцны ўхіл у бок уладных сілаў – дэмагогаў. Яны карыстаюцца нізкім узроўнем грамадскай свядомасці, каб на законных падставах атрымаць ад гэтай сістэмы выгоды сабе.

Квінтэсенцыю дэмакратыі-дэмагогіі складаюць адукаванасць грамадзян і грамадская повязь паміж уладай і звычайнымі грамадзянамі, бо кіраўнік можа «ўладарыць» над законам, толькі калі мае поўную легітымнасць і поўную згоду з боку кіраваных. Гэтую грамадскую повязь складае ўзаемная задаволенасць і захапленне, а таксама разуменне, што адзін без другога абодва бакі не змогуць ажыццяўляць уладу. Кіраўніку патрэбны «натоўп», на які б абапіралася ягоная ўлада. Умацоўваючы яе, ён будзе патрабаваць калектыўнага ўслаўлення, палкай падтрымкі ягоных подзвігаў. Ён пачынае ўспрымаць іх як вялікі «бескарыслівы» дарунак уласнаму народу і лічыць за абавязак працягваць сваё «кіраванне». Простаму народу, у сваю чаргу, патрэбна адчуванне далучанасці да ўлады і ўплыву на прыняцце рашэнняў – гэта дадае ім даверу да ўлады і ўпэўненасці ў слушнасці свайго выбару. Апроч таго, ува ўладзе ім патрэбны сябар, просты чалавек, які можа зразумець іх патрэбы і абараніць іх погляды.

Гэткім чынам яны ўцягваюцца ў «заклятае партнёрства», калі замест таго, каб палепшыць сваё становішча, людзі жывуць у бясконцым чаканні перамен, бо вераць няспынным публічным абяцанням і ўскладаюць надзеі на змены Канстытуцыі. Часовую перамогу атрымлівае ўлада, якая працягвае кіраваць пры дапамозе дыялога, а калі той больш не дзейнічае, дык і праз прымус. Чым далей трывае такое партнёрства, тым верагодней, што яно набудзе рысы тыраніі і перажыве свой дэмакратычны фармат. Каб захаваць належны баланс улады, як правіла, будуць ужывацца прыхаваны гвалт, прымусовая мабілізацыя масаў і ўвядзенне дзяржаўнай ідэалогіі – да тае пары, пакуль натоўп з уласнага досведу не зразумее (згадайма «дасведчанасць»), наколькі неадэкватнае такое партнёрства.

Выспяванне дэмакратыі-дэмагогіі можа быць доўгім і пакручастым. Яна набывае ўстойлівасць, калі адпаведныя дачыненні замацоўваюцца заканадаўча. Па змене ўлады старая прававая сістэма можа захавацца і стрымліваць развіццё новага ладу. Тыповыя прыклады таго, як укараняецца дэмакратыя-дэмагогія, прасочваюцца ў сітуацыі ўва Украіне і асабліва ў Беларусі, дзе змяненне ў 1996 г. Канстытуцыі адкрыла шлях да кіравання праз дэкрэты і прэзідэнцкае ўсеўладдзе. Трымаецца гэты лад на недасведчаным натоўпе, які не разумее механізмаў дэмакратыі.

Беларусь і Украіна – два маладыя рэжымы, якія, падобна, адпавядаюць (у рознай ступені) «працэдурнаму» вызначэнню дэмакратыі. Іх можна аднесці да дэмакратыі-дэмагогіі, або «квазідэмакратыі», што прадугледжвае пэўныя інстытуты дэмакратыі, аднак не забяспечвае ўмоваў, каб грамадзяне дзейнічалі згодна з адпаведнымі «маральнымі прынцыпамі». У Беларусі ўлада няспынна ўдасканальвае майстэрства «нібы-дыялога» і «нібы-партнёрства» з грамадзянамі. Узяць хоць бы наступнае выказванне беларускага прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі: «Калі народ вызначыць, што я магу яшчэ працаваць прэзідэнтам у Беларусі, значыць Лукашэнка будзе працаваць. Калі народу я абрыдаў, то, ведама, я навязваць сябе не буду, паверце. Мне хапіла і за гэтыя гады» [5]. Ува Украіне ж у дадзены момант* «вярхі» дзеля захавання ўлады робяць усё магчымае,

каб перагледзець свае патрэбы і абмежаваць палітычную адукаванасць і палітычную пісьменнасць народу.

Каб зразумець, як функцыянуюць абодва рэжымы і якую будучыню ім рыхтуе дэмакратыя-дэмагогія, разгледзім *modus operandi* грамадскай думкі – традыцыйна лічыцца, што менавіта ад яе залежыць стабільнасць або нестабільнасць рэжыму. Мы спынімся на тым, як людзі разумеюць дэмакратыю, якой логікай яны кіруюцца пры галасаванні і чаму падтрымліваюць цяперашніх лідэраў.

НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ АПЫТАННІ Ў 1998 І 2003 гг. [6]

[5] Гл. поўны тэкст інтэрв'ю Лукашэнкі праграме «Личный вклад» ад 19 ліпеня 2003 г. на (снежань 2003 г.).

* Артыкул напісаны ў 2003 г. - *Заўв. перакл.*

Апытанні 2003 г. у Беларусі і ва Украіне распрацоўваліся такім чынам, каб адлюстраваць усе трансфармацыі грамадскай думкі з 1998 да 2003 г. За гэтыя пяць гадоў у грамадстве выспявалі пэўныя перамены – да іх спрычыніліся і іх засведчылі як парламенцкія (у 2000 г. у Беларусі і ў 2002 г. ува Украіне), так і прэзідэнцкія (у 2001 г. у Беларусі і ў 1999 г. ува Украіне) выбары. Ад пачатку 1990-х гэта ўжо трэці цыкл выбараў, таму можна было б меркаваць, што ў грамадстве замацаваліся пэўныя свабоды, неад'емныя ад свабоднай і сумленнай барацьбы за галасы выбарцаў[7]. Каб выявіць іх разумеўшы дэмакратыі, а таксама вызначыць, ці змяніліся іх каштоўнасці і ступень даверу да розных інстытутаў, рэспандэнтам прапанавалі спіс пытанняў, падобных да тых, што задаваліся ў 1998 г.

Чакалася, што за 12 гадоў існавання дэмакратычных інстытутаў (такіх, як выбары, парламент, адносна свабодныя СМІ, суды і інш.) выбарцы ўспрынялі дэмакратычны дыскурс на ўзроўні як установак, так і паводзін. Аднак гэтага не адбылося. Вынікі апытанняў у вялікай ступені выяўляюць непаслядоўнасць у каштоўнаснай арыентацыі людзей і іх паводзінах. Высветлілася, што грамадзяне абедзвюх краін

[6] Нацыянальныя апытанні заяўляліся кутаркай у Украіне, у Беларусі (Цэнтр сацыяльна-і палітычных даследаваў БДУ) і ва Украіне (SOCIS–Gallup). Агульнанацыянальная выбарка ўключала 1000 дарослых,

гатовыя падтрымліваць дэмакратыю «фармальна», але не на ўзроўні «сацыяльных установак», паводзін і перакананняў. Іншымі словамі, хоць інстытуцыйныя атрыбуты дэмакратыі паспяхова ўкараніліся і занялі трывалае месца ў грамадскай думцы, але каштоўнасныя арыентацыі збольшага не змяніліся або з часам рэгрэсавалі ў бок больш «аўтарытарных» поглядаў.

Калі казаць пра станоўчае, назіраюцца некаторыя заўважныя змены ў стаўленні да дэмакратычных інстытутаў. Апытанні 2003 г. сведчаць, што людзі наагул выступаюць супраць прамога прэзідэнцкага кіравання, цэнзуры СМІ і забароны партый. Яны таксама лічаць антыдэмакратычным і негуманным выкарыстанне міліцыі і войскаў для разгону дэманстрацый, судовыя прысуды ўдзельнікам акцый пратэсту і прыняцце парламентам закона аб забароне дэманстрацый. Больш за тое, у абедзвюх краінах большасць рэспандэнтаў бачыць выбары найлепшым спосабам прыходу да дэмакратычнай улады, а парламент лічыць неабходным «для паляпшэння сітуацыі ў краіне» (гл. Табліцу 1).

Табліца 1. **Грамадскае стаўленне да дэмакратычных інстытутаў і каштоўнасцяў, 2003**

Ці ўхваляеце вы…	**Беларусь (%)**	**Украіна (%)**		
Так ці хутчэй так	Не ці хутчэй не	Так ці хутчэй так	Не ці хутчэй не	
Простае прэзідэнцкае кіраванне	44	43	36	55
Строгую цэнзуру СМІ	28	61	29	63
Забарону партый і грамадскіх арганізацый	24	58	28	51
Ужыванне міліцыі для разгону	20	67	9	84

старэйшых за 18 у Беларусі і 1250 ка Украіне; а пытанне кожнага праводзілася асабіста; ступень імавернасці 99,47 %. Вынікі за 1998 г. узятыя з даследавання Understanding Democracy’, якое выконвалі тыя самыя арганізацыі ва Украіне і ў Беларусі. Вынікі пацвердзіліся пры зборы матэрыялу аўтаркай (у снежні 2000 – студзені 2001 гг.) у рамках даследавання EU–INTAS research (99–0245) у партнёрстве з вышэйзгаданымі

Судовыя пакаранні	22	64	9	73
Законы, што забараняюць пратэсты	10	76	5	87
Ужыванне войска для разгону акцый пратэсту	7	81	3	93

Заўвагі: Прыведзеныя вынікі засноўваюцца на пытаннях: «Ці згодныя вы з тым, што ў выпадку надзвычайнай сітуацыі было б лепей, калі б (а) прэзідэнт абвясціў простае прэзідэнцкае кіраванне; (б) уводзілася б строгая цэнзура СМІ; (в) мы б пазбавіліся ад палітычных партый і грамадскіх арганізацый; (г) правы міліцыі былі б пашыраныя; (д) суды выносілі б жорсткія прысуды, каб пакараць удзельнікаў акцый пратэсту; (е) урад прыняў бы законы, якія б забаранялі грамадскія пратэсты; (ё) урад ужыў бы войска для спынення забастовак?» Сума лічбаў па гарызанталі не складае 100 працэнтаў, бо былі іншыя варыянты адказу («не ведаю» і «адмовіўся адказаць»), выключаныя з аналізу. Працэнтныя дадзеныя акругляліся да цэлай лічбы, 0,5 працэнта акруглялася ў бок павелічэння.

Крыніца: Апытанні, замоўленыя аўтаркай.

Аднак гэтым пазітыўным тэндэнцыям у развіцці грамадскай думкі супярэчыць той факт, што траціна насельніцтва ў абедзвюх краінах не магла вызначыць, якую ролю адыгрывае парламент, і была пэўная, што дэмакратыя – чужы для іх краіны дзяржаўны лад. Каля паловы не бачыла ніякай розніцы паміж наяўнымі партыямі, а большасць лічыла, што партыі служаць інтарэсам іх лідэраў. Больш за тое, у абедзвюх краінах абсалютная большасць рэспандэнтаў меркавала, што палітыкам нельга давяраць, што тыя заўжды маніпулююць грамадскай думкай на сваю карысць. Гэтая лічба павялічылася з 1998 г. на 10 % у Беларусі і на 20 % – ува Украіне.

Гэтыя тэндэнцыі выяўляюцца яшчэ больш яскрава ва ўяўленнях пра дэмакратыю. Напрыклад, на пытанне, што азначае дэмакратыя і што разумеюць пад гэтым словам рэспандэнты,

толькі 3 % у Беларусі і, як ні дзіўна, 1 % ува Украіне адказалі, што ў іх уяўленні дэмакратыя азначае «ўладу народу». Што «дэмакратыя дае людзям магчымасць паўплываць на прыняцце рашэнняў у краіне» і прадугледжвае «асабістую адказнасць, павагу для іншых і боль абавязкаў», адказалі толькі 1 % апытаных у Беларусі і 0 % ува Украіне. Каля траціны рэспандэнтаў у абедзвюх краінах звязвалі дэмакратыю з забеспячэннем свабод, асабліва свабоды выказвання і сходаў, а ў некаторых выпадках і абсалютнай свабоды. Вельмі мала хто згадваў законнасць, правы чалавека і роўнасць. У Беларусі на другое месца ў адказе на пытанне, што вы разумееце пад дэмакратыяй, займаў варыянт «крызіс і поўная анархія», а больш за адну пятую апытаных у абедзвюх краінах палічыла пытанне занадта складаным. Тым не менш, уражвае, наколькі па-рознаму апытаныя вызначылі дэмакратыю: ад «чагосьці адрознага ад камунізму», «годнага жыцця» і «жыцця без азірання назад, свабоднага ад страху» да «невыканальнай місіі» і «палітычнага рэжыму ЗША».

Калі параўнаць гэтыя вынікі з дадзенымі 1998 г., *адзінай* станоўчай зменай, якую можна заўважыць, будзе нязначнае памяншэнне колькасці тых, хто не вызначыўся з адказам. Магчыма, гэта сведчыць, што людзі нарэшце пачынаюць больш дакладна фармуляваць сваё стаўленне да дэмакратыі. Аднак за апошнія пяць гадоў амаль або зусім не паболела тых, хто высветліў, што дэмакратыя звязаная з «забеспячэннем свабод». І наадварот, падобна, што некаторыя сутнасныя рысы дэмакратыі страцілі прывабнасць для насельніцтва (гл. Табліцу 2).

Табліца 2. **Грамадскае разуменне дэмакратыі, 2003 і 1998 гг.**

Што для вас азначае слова «дэмакратыя»?	**Беларусь (%)**	**Украіна (%)**
Забеспячэнне свабод (усіх свабод)	30 (-0,9)	23 (-14,7)
Крызіс, анархія, карупцыя	13	4

Цяжка сказаць	13 (-16,7)	19 (-8,6)
Падпарадкаванне закону	6 (-0,6)	9 (-1,1)
Абарона правоў чалавека	5 (+1)	3 (-8,8)
Поўная свабода	3	11
Улада народу	3 (-9,9)	1 (-5,5)
Роўнасць	1	9

Заўвагі: Працэнтныя змены паміж вынікамі апытанняў 1998 г. і 2003 г. па тых вызначэннях дэмакратыі, якія паўтараліся рэспандэнтамі, прыведзеныя ў дужках. Знак + або - паказвае на павелічэнне ці памяншэнне колькасці прыхільнікаў аднаго і таго ж меркавання. Працэнты акругляліся да бліжэйшай цэлай лічбы. Сума дадзеных у слупках не роўная 100 %, бо адабраныя варыянты адказаў, якія набралі больш за 1 % і маюць асаблівае значэнне для дадзенай працы.

Крыніца: Апытанне, замоўленае аўтаркай, і вытрымкі з апытання 1998 г. «Разуменне дэмакратыі», гл. зноску 6.

Параўнанне апытанняў 1998 і 2003 гг. таксама выяўляе безумоўны рост па ўсіх пазіцыях прыхільнасці да «антыдысідэнцтва», аднадумства і аўтарытарызму (гл. Табліцу 3). Разыходжанні выяўляліся толькі пры ацэнцы ролі іншадумства і прысутнасці замежнікаў, што крытычна ставяцца да ўрада.

Табліца 3. **Грамадскае стаўленне да «аўтарытарных каштоўнасцяў»**

Ці лічыце вы, што...?	**Беларусь (%)**	**Украіна (%)**		
Так ці хутчэй так	Не ці хутчэй не	Так ці хутчэй так	Не ці хутчэй не	
Грамадства не павінна талерантна ставіцца да палітычных поглядаў, рэзка адрозных ад	49 (+12)	36	40 (-0,9)	42

поглядаў большасці				
Трэба забараніць дэманстрацыі і маршы пратэсту за распальванне экстрэмізму і беспарадкаў	46 (+1)	34	48 (-2,1)	
Свабода выказвання можа быць шкоднай, калі яна дазваляе існаванне розных экстрэмісцкіх поглядаў	49 (+4)	28	39 (-0,8)	46
Лепей жыць ва ўпарадкаваным грамадстве, чым дазваляць, каб пэўнымі свабодамі карысталіся для таго, каб нас знішчыць	47 (-0,2)	33	49 (-13)	40
Тым, каму не падабаецца наш лад жыцця, нельга даваць	20	71 (+8)	19	73 (+12)

магчымасць выказвацца				
Замежнікаў, якія крытыкуюць наша кіраўніцтва, належыць выдаляць з краіны	36 (-0,2)	52 (+7)	38 (-2,1)	50 (+9)

Заўвага: Працэнтныя змены паміж 1998 і 2003 гг. па пытаннях, якія паўтараліся, падаюцца ў дужках. Працэнты акругляліся да бліжэйшай цэлай лічбы.

Паміж краінамі назіраецца на некаторае відавочнае падабенства ў развіцці грамадскай думкі. Але калі прааналізаваць стаўленне людзей да палітыкі, праступаюць відавочныя адрозненні. У Беларусі 58 % апытаных не абыходзіць, хто мае ўладу, пры ўмове, што сітуацыя ў краіне паляпшаецца – між тым 76 % украінцаў хвалюе «характар лідэрства». Зноў-такі, 47 % беларусаў, хутчэй, схільныя не ўмешвацца ў палітыку, бо гэта можа пацягнуць за сабой небяспечныя наступствы – а 86 % украінцаў не згодныя з гэтым меркаваннем. Так ці інакш, большасць апытаных у абедзвюх краінах пагадзілася, што «простых людзей ніколі не дапусцяць да ўлады». Нягледзячы на сваю яўную пасіўнасць, ашаламляльная колькасць – 46 % беларусаў (+27 %) – лічыць, што ўдзел у палітыцы – гэта «абавязак», а 75 % украінцаў трымаюцца супрацьлеглага меркавання.

Яшчэ адно сведчанне таго, ці людзі маральна гатовыя ўзаемадзейнічаць з уладай, весці дыялог наконт сваіх правоў і абавязкаў – давер людзей да розных інстытутаў. Выявілася, што ў сярэднім давер да іх з 1998 г. у абедзвюх краінах вырас на 10 %. Аднак пры гэтым давер беларусаў да свайго прэзідэнта ўпаў на 10 % (тым не менш, ён сягае 65 % і застаецца вышэйшы, чым да любога іншага палітычнага інстытута ў краіне, апрача арміі*). У Беларусі найменш давяраюць такім інстытутам, як палітычныя партыі (12 %, на 7 % больш за 1998 г.), прафсаюзы (23 %, на 1 % больш), парламент (30 %, на 3 % менш) і суды (32 %, на 5 % больш). Ува Украіне ж найменшым даверам

карыстаюцца партыі (14 %, на 10 % больш за 1998 г.), прэзідэнцкая адміністрацыя (20 %), парламент (21 %, на 13 % больш), а таксама прэзідэнт (23 %, на 12 % больш) і ўрад (23 %, на 14 % больш).

Страхі людзей у абедзвюх краінах таксама адрозніваюцца. У Беларусі каля 86 % насельніцтва заклапочаныя збядненнем, узмацненнем дзяржаўнай апекі і тым, што ім бракуе сродкаў на адзенне, лекі і ежу (пералік у парадку памяншэння). У Украіне асноўны клопат – карупцыя і ўмяшанне дзяржавы (88 % апытаных), а таксама рост няроўнасці і некампетэнтнасць уладаў. Перспектыва дыктатуры ў абедзвюх краінах пужае найменш – яе баяцца толькі 13 % у Беларусі і 47 % ува Украіне.

Артыкул апублікаваны ў 2003 г. *Заўв. перакл.*

Калі падсумоўваць усё вышэйсказанае, то, паводле нядаўніх апытанняў, пасля блізу 15 гадоў перамен і існавання дэмакратычных інстытутаў грамадзяне абедзвюх краін па-ранейшаму дэманструюць непаслядоўнасць поглядаў і супярэчлівасць у ацэнках структур і прынцыпаў дэмакратыі.

Як пазітыўны знак можна ўспрымаць тое, што на сённяшні дзень грамадзяне ўжо звыкліся з прысутнасцю інстытутаў дэмакратыі, хаця дзейнасць і ўплыў на сістэму некаторых з іх (напрыклад, партый, парламентаў, судоў) па-ранейшаму ацэньваюцца досыць нізка. Магчыма, гэта ў большай ступені тлумачыцца практыкай іх дзейнасці, чым зместам іх як інстытутаў.

Што па-ранейшаму моцна хвалюе, дык гэта заўважнае разыходжанне паміж тым, як людзі ўспрымаюць дэмакратыю «інстытуцыйна» і «эмацыйна». Хоць яны дзейнічаюць у адпаведнасці з новымі інстытуцыйнымі рамкамі, але адначасова выказваюць нецярпімасць да іншадумства і відавочную памяркоўнасць у дачыненні моцных лідэраў і кіравання пры дапамозе дэкрэтаў (асабліва ў Беларусі). Яны могуць вітаць выбары і шматпартыйнасць, аднак пры гэтым ні на каліва не давяраць ніводнаму з узроўняў улады і не ўдзельнічаць у галасаванні. А такім чынам касуецца партнёрства паміж уладамі і звычайнымі грамадзянамі – сваё права выбару і прыняцця рашэнняў народ «дэлегуе» *прызначаным на пасады* чыноўнікам. Іншымі словамі, хоць у

грамадстве ўкараніліся і прымаюцца інстытуты дэмакратыі, аднак людзі не маюць да іх даверу і не адчуваюць з імі сувязі.

Выявілася, што насельніцтва Беларусі больш падрыхтаванае служыць ідэям дэмакратыі «як інстытутам» і «з абавязку». Аднак у сваіх поглядах яно выглядала больш «аўтарытарна» настроеным і, нягледзячы на адукаванасць, пачувалася менш далучаным да актуальнага палітычнага працэсу. Украінцы прадэманстравалі большую крытычнасць і лепшую дасведчанасць. Аднак, насуперак гэтаму, 75 % апытаных лічыць, што «ўдзел у палітыцы» не мае ніякага дачынення да правоў і абавязкаў грамадзян.

ДАСЛЕДАВАННІ Ў ФОКУС-ГРУПАХ У 1999 І 2003 гг.[8]

Даследаванні ў фокус-групах распрацоўваліся такім чынам, каб параўнаць і ацаніць глыбінныя погляды і перакананні людзей. Апытаных папрасілі акрэсліць, што для іх азначае дэмакратыя, ацаніць стан дэмакратыі ў іх уласнай краіне, выказаць свае каштоўнасныя арыентацыі і, нарэшце, ацаніць сваю сувязь з нацыянальнымі лідэрамі. Вынікі аказаліся ў адным рэчышчы з дадзенымі нацыянальных апытанняў і дапамаглі з агульнай карціны па ўсёй краіне вылучыць пэўныя меркаванні на асабовым узроўні. Галоўныя вынікі адлюстроўваюць разыходжанні паміж насельніцтвам Украіны і Беларусі ў разуменні дэмакратыі і ў каштоўнаснай арыентацыі. Магчыма, тут крыюцца прычыны, чаму дэмакратыя не замацавалася ў Беларусі і чаму Украіна па-ранейшаму марудна рухаецца да дэмакратыі.

УЯЎЛЕННЕ ПРА ДЭМАКРАТЫЮ АЦЭНКА ДЭМАКРАТЫІ Ў СВАЁЙ КРАІНЕ

Украіна зноўку была «лідэрам» у разуменні «інстытуцыйных» механізмаў функцыянавання дэмакратыі. Хаця шмат хто з украінцаў і апісваў рэальны стан рэчаў як «крымінальную дэмакратыю», «бязладную дэмакратыю», «кланавую дэмакратыю» і «карумпаваную дзяржаву», яны верылі ў даўгавечнасць дэмакратыі ў сваёй краіне і прыводзілі

[8] У кожнай з краін дэмакратыя, ў фокус-групах праводзіліся з агульнай кіраўніках дзяржавы – г. Магчыма, Лукашэнку ў Беларусі і Л. Кучму ва Украіне. Каб праверыць вынікі, па кожным кіраўніку праводзілася апытанне дзвюх групаў рэспандэнтаў.

абгрунтаваныя тлумачэнні, чаму яе бракуе. Некаторыя з апытаных сцвярджалі, што «нам трэба памяняць закон» і «судовую сістэму, якая павінна быць незалежнай і бесстаронняй», змяніць не структуру, а «сэнсавае наступнае» парламента, прэзідэнцкай адміністрацыі і пасады прэзідэнта – фактычна, «усіх галін улады» – каб «пазбавіцца былых камуністаў», якія перашкаджаюць дэмакратызацыі. Усе адзінадушна пагаджаліся, што асноўная прычына маруднай руху да дэмакратыі – у «савецкім менталітэце» людзей і стэрэатыпах мінуўшчыны.

У абедзвюх краінах фокус-групы выявілі добрае разуменне таго, што мусіць мець на ўвазе дэмакратыя з інстытуцыйнага гледзішча. Гэта асабліва справядліва ў выпадку Украіны, дзе некалькі апытаных зазначыла, што дэмакратыя – гэта «калі паважаюцца правы чалавека»; «адзіная магчымасць паўплываць на прыняцце ўладамі рашэнняў – праз выбары. Таму мы мусім дабівацца свабодных і справядлівых выбараў»; «гэта сіла ідэі і вяршэнства закону» і, нарэшце, «гэта свабода слова, выказвання і СМІ». Інакш кажучы, падаецца, ува Украіне інстытуцыйныя атрыбуты дэмакратыі трывала замацаваліся ва ўяўленнях людзей, а апытаныя былі б супраць поўнай забароны ці адмены партый, парламента або выбараў. Тым не менш была і пэўная колькасць нетыповых адказаў – ад абагульненага азначэння дэмакратыі як «абсалютнай свабоды» або «ўлады грошай» да акрэслення яе як формы дзяржавы, дзе нельга «забіваць» ці «рэпрэсаваць».

Беларусы прадэманстравалі іншае разуменне дэмакратыі. Шмат для каго яна аказалася «цяжкай для разумення» і азначала «абсалютны парадак», «падпарадкаванне правілам», «дысцыпліну, высокамаральнасць», «павагу да іншых» і «роўнасць і адукацыю». Для іншых гэта быў «механізм падпарадкавання меншасці большасцю», а таксама «сіла рэпрэсій», «неэфектыўнае прадстаўніцтва», «грамадскі гвалт» і «ўсёдазволенасць». Пераважаў лейтматыў «парадку і паслухмянасці правілам» і «абавязкаў і адказнасці».

Выбарка рэспандэнтаў адлюстроўвала апытаныя сацыяльна-дэмаграфічны профіль грудавой зайлі да лідэра (вызначаны ў працэсе апытанняў грамадскай думкі). Групы для кожнага інтэрв'ю складаліся з В–У чалавек, адабраных на падставе станоўчых адказаў на наступныя пытанні:

1. Ці падтрымлівалі вы гэтага лідэра?
2. Ці паласавалі вы за гэтага лідэра на апошніх выбарах?

Удзельнікі адбіраліся пры дапамозе «snowball method», групавыя інтэрв'ю доўжыліся ў сярэднім дзве гадзіны і запісваліся як на аўдыё, так і на відэа.

Большасць надавала парламенту «не проста вялікае, а вельмі

вялікае значэнне». Але пры гэтым рэспандэнты заўважалі, што «трэба разабрацца, як зрабіць яго больш эфектыўным і як яго кантраляваць», бо ўрэшце «мы іх кормім» (!). Аднак падобныя заявы ўраўнаважваліся супрацьлеглымі: «парламент неэфектыўны, таму нам патрэбны адзін моцны лідэр са сваёй камандай» і «дэпутаты нам патрэбныя толькі для таго, каб дапамагаць прэзідэнту». Адсюль вынікае, што хаця прадстаўнічая і заканадаўчая ўлада лічыцца істотнай для грамадства, тым не менш яе дасюль разглядаюць як дапаможны сродак да лідэрства аднаго чалавека, а ключавой фігурай уяўляецца прэзідэнт.

Беларусы зноў-такі выяўляюць іншае разуменне механізмаў дэмакратыі. Па-першае, яны не здолелі апісаць цяперашняе становішча ў краіне: даваліся агульныя адказы, накшталт «развалены калгас», «дзяржава «без ідэалогіі», «у якой няма імя». Некаторыя казалі, што «ніколі не разважалі ў гэткім вялікім маштабе» і ім патрэбны час, «каб пачытаць і занатаваць штосьці па гэтым пытанні» (!). У адказах на пытанне, што належыць зрабіць, каб палепшыць сітуацыю ў краіне, рэспандэнты прыгадвалі «маральнае выхаванне», «адукацыю грамадства» і «больш дысцыпліны», нароўні з «дзяржаўным органам, каб назіраць за працэсам (як у старыя часы)», «моцнай выканаўчай уладай» і «моцнымі лідэрамі». Яны таксама заяўлялі, што сённяшнім беларусам не хапае «культуры», «супольнай ідэі, ідэалогіі» і «сацыяльнай абароненасці».

Ацэньваючы ролю парламенту і дэпутатаў, шмат хто заўважаў, што «нам не патрэбныя цяперашнія дэпутаты», «яны ўсе карупцыянеры і нягоднікі», і «мы іх не ведаем». Наагул, «яны нам не патрэбныя», бо «яны не вырашаць нашых канкрэтных праблем, для нас гэта зробіць выканаўчая ўлада». «Магчыма, нам патрэбны Вярхоўны савет[9], аднак не мясцовыя дэпутаты», «у іх няма ніякай улады пры цяперашніх законах».

Уражвае розніца ў поглядах рэспандэнтаў у Беларусі і ва Украіне, асабліва ў ацэнцы патрэбы ў дэмакратычным кантролі на інстытутах. Ува Украіне, якім бы «неэфектыўным» ні быў парламент, «нам нізавошта нельга ад яго пазбаўляцца – яго належыць рэфармаваць», «мы павінны кантраляваць

сітуацыю». Між тым у Беларусі адчуваецца бездань, парламента. раздзяляе простых грамадзян і ўладу – а тая зводзіцца да адной асобы. Як сведчаць факты, хаця беларусы, магчыма, і гатовыя пагадзіцца з інстытуцыйнымі атрыбутамі дэмакратыі, яна яшчэ не стала жыццёва неабходнай, арганічнай часткай іх жыцця. Яны не пазбавяцца ад парламента ці партый не таму, што разумеюць іх істотнасць для функцыянавання дэмакратыі, а таму, што тыя ўжо існуюць, а старыя рэчы зазвычай не выкідаюць – а раптам у адзін цудоўны дзень прыдадуцца?

КАШТОЎНАСЦІ І ПЕРАКАНАННІ

Рэспандэнтам задаваліся пытанні, як яны ўяўляюць функцыянальныя дачыненні паміж парламентам і прэзідэнтам, як ставяцца да аднаасобнай улады, асабліва ў надзвычайных сітуацыях, і якім яны бачаць ідэальнага лідэра. Украінцы зноўку былі на першым месцы паводле колькасці адмоўных адказаў на пытанне, ці можа ў надзвычайнай сітуацыі ўлада лідэра выходзіць за рамкі закона, а таксама ў каментарах кшталту «ніхто не можа быць па-над законам – ні пры якіх абставінах», бо ў адваротным выпадку «гэта непазбежна прывядзе да дыктатуры». У Беларусі, наадварот, большасць станоўча ацаніла магчымасць перадачы паўнамоцтваў прэзідэнту ў выпадку надзвычайнай сітуацыі. Рэспандэнты прыгадвалі, што раней гэткія паўнамоцтвы атрымлівалі дэ Голь, Гітлер, Сталін і Джордж У. Буш.ШЧЫЛЬНАЯ ПОВЯЗЬ, ШТО ЛУЧЫЦЬ «ЦЯБЕ І ТВАЙГО ПРЭЗІДЭНТА»

У абедзвюх краінах меркаванні наконт аднаасобнага кіравання наагул падзяліліся. Пры гэтым адна частка сцвярджала, што «адна галава – добра, а дзесяць – лепей», а «апазіцыя будзе абавязкова трымаць лідэра пад кантролем» (Украіна). Аднак пераважала меркаванне іншых рэспандэнтаў: «павінен быць адзін моцны лідэр», «які падпарадкоўваецца закону» (Украіна, Беларусь).

Сярод прыкладаў ідэальных кіраўнікоў ува Украіне прыводзілі Пятра Першага, Джона Ф. Кенедзі, Уладзіміра Пуціна і Аляксандра Лукашэнку. Пра беларускага прэзідэнта казалі, што ён умее «трымаць народ пад кантролем», «не абапіраецца на алігархаў», а ў выніку «мае некарумпаваны ўрад», «ён наагул

добры кіраўнік». Беларусы згадвалі Маргарэт Тэтчэр, Сталіна, Леніна і зноў-такі Аляксандра Лукашэнку. Адзін нават заўважыў: «Я шчыра не ўяўляю сабе, як можа існаваць якая-небудзь іншая альтэрнатыва нашаму прэзідэнту Лукашэнку» (мужчына, 65 год).

І нарэшце, пры адказе на пытанне, ці павінен прэзідэнт, сыходзячы ў адстаўку, прызначаць наступніка, думкі зноў разышліся. Як украінскія, так і беларускія ўдзельнікі апытання адзначылі, што яны б віталі спадкаемцу, «калі б гэта быў нармальны чалавек і... у дэмакратычнай краіне». Іншыя – невялікая колькасць – адзначылі, што «мы мусім самі выбіраць сваіх прэзідэнтаў», аднак «можна прымаць рэкамендацыі прэзідэнта, што пакідае пасаду».

Вынікае, што «эмацыйна» рэспандэнты ў абедзвюх краінах яшчэ не гатовыя да дэмакратыі, бо падтрымліваюць моцную, аднаасобную ўладу і не вызначыліся адносна вяршэнства закону падчас крызісу. Беларусь ізноўку прадэманстравала схільнасць да традыцыйных асабістых шчыльных дачыненняў паміж уладаром і падуладнымі.

Нарэшце, параўнанне даследаванняў у фокус-групах у 2000 і 2003 гг., а таксама вынікаў нацыянальных апытанняў паказвае: нішто пакуль не «закранула» блізкай сувязі, якая яднае прэзідэнта і ягоны народ. Хаця шмат хто незадаволены вынікамі кіравання Кучмы за апошнія восем гадоў, 18 % апытаных ува Украіне прызналіся, што зноўку б за яго прагаласавалі, і называлі яго надзейным, паслядоўным, вартым даверу і дасведчаным. Аднак у абгрунтаванні падтрымкі прэзідэнту выявілася новая тэндэнцыя: замест «мне падабаецца ягоная праграма», як у 2000 г., апытаныя ў 2003 г. адказвалі: «іншай альтэрнатывы няма» або «ён – найменшае зло».

У Беларусі, адрозна ад Украіны, рэспандэнты часта адзначалі, што прэзідэнт – адкрыты, шчыры і варты даверу – дагэтуль застаецца для іх кумірам, хаця і прызнавалі, што шмат у чым ён не апраўдаў надзей тых, хто за яго галасаваў. Некаторыя сцвярджалі, што іх думка пра прэзідэнта «змянілася... у лепшы

бок», і што яны працягваюць верыць ягоным абяцанням: «Ён вельмі клапатлівы: ён даў нам усё, што нам трэба» (жанчына, 74 гады).

Наагул, тым не менш, можна назіраць павелічэнне крытычных ацэнак: «Мне часта сорамна, што ў мяне такі прэзідэнт», «асабліва калі людзі пытаюцца: «Што адбываецца ў Беларусі?», пытаюцца, чаму знікаюць людзі і калі здарыцца аб'яднанне Беларусі і Расіі, мне сорамна, я не магу знайсціся, што адказаць» (мужчына, 46 гадоў); «Я мяркую, ён ужо зрабіў усё, што мог, і выгарэў. Ён нічога лепшага не зробіць. Нічога не зменіцца» (жанчына, 54 гады). Некаторыя тым не менш падтрымлівалі ягоную «асцярожнасць» і паступовасць у рэфармаванні сістэмы, асабліва што датычыць Саюза Расіі і Беларусі і ўвядзення расійскага рубля. Іншыя адзначалі, што «на сёння рэальнай альтэрнатывы гэтаму прэзідэнту няма, і я мяркую, нам давядзецца прагаласаваць за яго і трэці раз» (мужчына, 67 год). Адбыўся відавочны зрух у грамадскай думцы: рэспандэнты адышлі ад ранейшага любоўнага пакланення перад сваім лідэрам і палкай яго абароны, што выяўляліся ў 2000 г., у прыватнасці, у выказваннях такога кшталту:

Я лічу, што шмат у якіх выпадках яго проста няправільна інфармуюць. Ён не можа адзін усяго пракантраляваць. А тыя, што вакол яго, заўсёды яму кепства робяць (жанчына, 53 гады, снежань 2000 г.).

Хаця ён [Аляксандр Лукашэнка] і тыран, ён наш, свой [тыран], і… гэта грэе нам сэрцы» (мужчына, 44 гады, снежань 2000 г.).

У 2003 г. беларускі прэзідэнт атрымліваў ужо больш крытычныя ацэнкі, але яны ўсё ж бліжэйшыя да «крытычнага адабрэння», чым сапраўднай крытыкі:

Я разумею, што гэта цяжка… Аднак ён не выканаў таго, што абяцаў, цяпер паўсюль больш бюракратыі, колькасць міліцыі

вырасла ў тры разы, а цана жылля падвоілася. Я разумею, што яму патрэбная добрая каманда, але ж ніхто яго не прымушаў выбіраць сабе кепскую (мужчына, 65 гадоў, красавік 2003 г.).

Я дагэтуль веру ў яго і ў ягоныя абяцанні і заявы. Аднак я не спадзяюся на нешта лепшае. Толькі і засталося, што надзея... і ты сам (жанчына, 48 гадоў, красавік 2003 г.).

Падсумоўваючы, можна сказаць, што хаця, магчыма, і адбыліся некаторыя змены ў кірунку прымання інстытуцыйных формаў дэмакратыі і абмежаванай крытыкі палітыкі, што праводзяць улады, гэта мала што змяніла ў эмацыйных прыхільнасцях і каштоўнаснай арыентацыі людзей. Яны па-ранейшаму вераць у блізкую повязь, што лучыць іх з лідэрам, і спадзяюцца на яго як на адзінага, хто можа прынесці краіне стабільнасць і мір.

Такое становішча спрыяе росквіту дэмакратыі-дэмагогіі, што стварае ілюзію дэмакратыі. Выбарцы вераць, што ўсталявалі блізкую сувязь з уладай, і такім чынам праз выбары маюць квазі-кантроль над сістэмай. Аднак насамрэч улада па-ранейшаму бачыць у людскім даверы магчымасць надаць законную моц свайму аўтакратычнаму кіраванню, што і робіць пры дапамозе дэкрэтаў і маніпулявання. Каб падтрымліваць у выбарцах надзею, рупліва прапагандуецца «нібы»-дэмакратычная абгортка дзеянняў улады. Між тым, унутраныя механізмы сістэмы, цяпер ужо замацаваныя на прававым узроўні, служаць падмуркам іншай, аўтарытарнай, улады.

Абедзве сістэмы, беларуская і ўкраінская, працягваюць дзейнічаць са згоды народу і ў рамках Канстытуцыі (так, прэзідэнт не можа і не будзе ўносіць змены ў Канстытуцыю, калі за гэта не прагаласуе большасць на падставе народнага волевыўлення). Адзін з рэспандэнтаў у 2000 г. назваў гэтую мадэль «дэмакратычны аўтарытарызм», то бок «дэмакратычны спосаб выбраць аўтарытарнага лідэра». Мы разглядаем яго як ілюзорную форму дэмакратыі, прыклад «дэмакратыі-дэмагогіі». Гэтая квазідэмакратыя фармальна стварае ўмовы для масавага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці і выжывае дзякуючы маніпуляванню, падману і, калі спатрэбіцца, рэпрэсіям.

Насамрэч рэжым карыстаецца дэмакратычнымі нормамі і грамадскім ухваленнем, каб прыстасаваць сістэму да ўласных мэтаў. І найлепшы спосаб дасягнуць сваёй мэты ён бачыць у тым, каб захаваць вяршэнства прэзідэнцкай улады над усімі іншымі інстытутамі ўлады і ў імя сваёй даўгавечнасці забяспечыць як мага даўжэйшае знаходжанне прэзідэнта на пасадзе. Да таго ж, напрыклад, прэзідэнт выступае як увасабленне і гарант стабільнасці ў краіне, таму яго адхіленне ад улады расцэньваецца як падрыў нацыянальных інтарэсаў. Як заўважыў Арыстоцель, хаця дэмакратыя і ёсць адхіленнем ад канстытуцыйнага кіравання, яна тым не менш застаецца найбольш дапушчальным адхіленнем, дзе нармальная роля ўрада – «дзейнічаць у інтарэсах грамадзян, аднак гэта не абавязкова значыць дзейнічаць у адпаведнасці з іх жаданнямі, бо ўлада можа лепш разумець, што служыць інтарэсам грамадзян, чым яны самі».

З ангельскай мовы пераклала Аляксандра Каласоўская паводле: Journal of Communist Studies and Transition Politics. Vol. 20. No. 1. March 2004. P. 122–142.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 3 (43) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/05/14
[image]

АЛЕСЬ СМАЛЯНЧУК
(нар. у 1959 на Слонімшчыне) – доктар гістарычных навук, прафэсар катэдры тэорыі і гісторыі права Беларускага інстытуту праваабароны (Гарадзенская філія).
Аўтар кніг «Пакуль жывуць людзі» (2000), «Пакуль жывуць людзі. Кнігі 1907 і 1908 гадоў» (2006), «Пакуль жывуць людзі. Кнігі 1905 і 1906 гадоў» (2009), а таксама кнігі «Беларусь: Ці нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на

Алесь Смалянчук

Навошта Лукашэнку Трашчанок?

Трещенок Я. И. *История Беларуси*. В двух частях. Часть 1. – Могилев: МГУ, 2004. – 296 с.

История Беларуси. В двух частях. Часть 2. / Под ред. Я. И. Трещенка. – Могилев: МГУ, 2005. – 310 с.

Хваля ідэалагічнай істэрыі апошніх гадоў вынесла на павярхоўства гістарычнай адукацыі асобу дацэнта Магілёўскага ўніверсітэта Якава Іванавіча Трашчанка. Напачатку гэта выклікала толькі ўсмешкі гісторыкаў з акадэмічнага асяроддзя. Адзін Аўтар кніг Сагановіч адчуў небяспеку і тры гады таму на старонках «Народнай волі» звярнуў увагу, як на лабіраванне пасіянарыі і магілёўскага дацэнта прадстаўнікамі дзяржаўных структур, так і на баязліва-абыякавую пазіцыю кіраўніцтва Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Урэшце якраз яно і дало «пуцёўку ў жыццё» пісанням Я. Трашчанка. Сёння мы маем ужо некалькі падручнікаў гісторыі Беларусі, якія актыўна навязваюцца Міністэрствам адукацыі ВНУ. Апошні з іх (История Беларуси. В двух частях. Часть 2) выйшаў з друку летам 2005 г.

Пісаць звычайную навуковую рэцэнзію на падручнікі Я. Трашчанка немагчыма. Напрыклад, згаданая другая частка

«Гісторыі Беларусі», рэкамендаваная Міністэрствам адукацыі ў якасці «вучэбнага дапаможніка для студэнтаў», на самай справе ўяўляе сабой палітычны памфлет. Дзеля дакладнасці трэба адзначыць, што ў напісанні «пособия» апроч Я. Трашчанка ўдзельнічалі таксама Аляксандр Вараб'ёў, Марыя Мацюшэўская і Наталля Пурышава. Яны з'яўляюцца аўтарамі II раздзела (Усталяванне савецкай сацыяльна-эканамічнай і сацыякультурнай сістэмы ў Беларусі»). Гэта адзіны раздзел, які сваёй інфармацыйнай насычанасцю нагадвае тэкст падручніка. Якаў Трашчанок напісаў раздзелы I («Станаўленне беларускай дзяржаўнасці»), III («Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны і паваеннага аднаўлення. 1941–1953 гг.)» і IV («Нарастанне крызісу савецкай сістэмы. Распад СССР і абвяшчэнне суверэннай Рэспублікі Беларусь»). Ён жа стаў аўтарам шматлікіх «гістарыяграфічных адступленняў», а таксама рэдактарам выдання. Рэцэнзентамі былі прафесары Яўген Новік і Мікалай Сташкевіч, а таксама супрацоўнікі кафедраў гісторыі Беларусі Берасцейскага і Віцебскага універсітэтаў (загадчыкі адпаведна П. Рамановіч і В. Акуневіч).

«Феномен Трашчанка» ў першую чаргу цікавы як эпізод эвалюцыі «дырэктыўнай гістарыяграфіі». На адной з канферэнцый Беларускага гістарычнага таварыства Андрэй Кіштымаў задаў цікавае пытанне: *Навошта сённяшняму рэжыму Трашчанок, калі ёсць Абэцэдарскі?*[1]. Пытанне сапраўды вартае таго, каб на ім засяродзіцца. *Як суадносяцца погляды Я. Трашчанка з характэрнымі рысамі і канцэпцыяй беларускай савецкай гістарыяграфіі? Ці выявіліся здольнымі сучасныя прадстаўнікі «дырэктыўнай гістарыяграфіі» на мадэрнізацыю савецкай версіі мінулага Беларусі?* Дзеля адказу на гэтыя пытанні звернемся да тэксту згаданага падручніка[2].

На пачатку кнігі Я. Трашчанок двойчы прыгадаў вядомага нямецкага гісторыка XIX ст. Леапольда Ранке і ягоны прынцып апавядаць толькі тое, што было на самай справе. Я. Трашчанок нібыта вяртаецца ў рэчышча рамантычнага пазітывізму пазамінулага стагоддзя і абяцае «зразумець і прыняць тое, што было на самай справе» (с. 4, 53). Аднак знаёмства з тэкстам, вельмі хутка пераконвае ў максімальнай палітызаванасці падручніка. Цяжка змагацца з уражаннем, што тэкст

[1] Захар Шыбека, Таццяна Кіштымава, Аляксандр Смалянчук, Ігар Марзалюк, Ірына Ганчарэнка, Ірына Ганчарэнка, Ірына Ганчарэнка

нават не палітычна ангажаваны гісторык, а нейкі палітык ХІ прыватнасці, тэкст перанасычаны камплiментамі на адрас мудрага палітычнага курса прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Менавіта А. Лукашэнка з'яўляецца найчасцей згадваемай постаццю айчыннай гісторыі XX–XXI стст.

Адначасна Якаў Іванавіч актыўна падкрэслівае ўласную «аб'ектыўнасць». На ягоную думку, існуюць дзве «ідэалагічныя схемы» інтэрпрэтацыі гісторыі паслярэвалюцыйнай Беларусі – «савецкая» і «нацыяналістычная». Я. Трашчанок як сапраўдны «аб'ектыўны гісторык» не прымае ні першай, ні другой. «Савецкую» версію ён адмаўляецца прыняць, бо ў ёй «міфалагізаваная... гісторыя партыі фактычна замяніла грамадзянскую гісторыю» (с. 26). Яшчэ больш рэзка рэдактар і аўтар «дапаможніка» крытыкуе версію «нацыяналістычную». Калі «савецкая» канцэпцыя, на думку аўтара, патрабуе «сур'ёзнага карэгавання і пераасэнсавання», то другая «іджывая па сваёй сутнасці і не адлюстроўвае рэальнага гістарычнага працэсу» (с. 30).

Якаў Трашчанок быццам уздымаецца над «ідэалагічнымі схемамі» і апавядае чытачу, як «усё было на самай справе». Прэтэнзіі на звышаб'ектыўнасць некалі былі характэрныя для тыповых прадстаўнікоў савецкай гістарыяграфіі. Толькі ў «дырэктыўныя» гісторыкі адчувалі сябе носьбітамі «ісціны ў апошняй інстанцыі» альбо старанна гралі гэтую ролю. Міжволі згадваецца Лаўрэнці Абэцэдарскі і ягоная брашура «У святле неабвержных фактаў» (Менск, 1969). Характэрнай рысай савецкай гістарыяграфіі было фармальнае панаванне культу гістарычнага факту. Вось толькі месца пошуку гэтага факту і сродкі, якімі валодаў гісторык, вызначаліся не ў навуковых лабараторыях, а ў партыйных кабінетах прыхільнікаў «адзіна правільнай» марксісцка-ленінскай ідэалогіі. А гэта вельмі істотны момант кожнага гістарычнага даследавання, бо месца (дзе шукаць) і сродкі (як шукаць) істотна ўплываюць на селекцыю фактаў. У тагачасных працах тэарэтычныя падыходы звычайна замяняліся падборам неабходных цытат з класікаў або з партыйных дакументаў, а «даследаванне» абмяжоўвалася пошукам фактаў, якія пацвярджалі гэтыя цытаты. Нормай была тэарэтычная і метадалагічная галеча гістарыяграфіі. Я.

Трашчанка, Я. Нарысы ды нататкі іншых прысутнічае фактычнае апраўданне царызму і спроба сумясціць савецкую канцэпцыю з поглядамі, напрыклад, М. Кяловіча ды іншых прадстаўнікоў афіцыёзу часоў Расійскай імперыі (IV канферэнцыя ВСГ была прысвечаная аналізу беларускай савецкай гістарыяграфіі. Гл. Гістарычны альманах. Том 10. 2004. с. 9–10).

Трашчанок пайшоў далей за сваіх савецкіх папярэднікаў. Ужо «Уводзіны» пачынаюцца цытаваннем колішняга генеральнага сакратара ЦК КПСС Ю. Андропава, далей сустракаюцца цытаты з твораў У. Леніна, Ф. Дзяржынскага, В. Кнорына ды інш. «правільных» палітыкаў савецкай эпохі. Затое ў тэкстах Я. Трашчанка няма аніводнай спасылкі на сучасную беларускую ды іншыя гістарыяграфіі. Тэкст пераконвае, што на самай справе дацэнт Трашчанок займаецца рэанімацыяй савецкіх ідэалагемаў у іх найгоршай версіі.

У першую чаргу гэта ідэалагема савецкай беларускай дзяржаўнасці: «Рэальная беларуская дзяржава з'явілася на мапе свету як савецкая сацыялістычная рэспубліка…» (с. 4). Дзеля параўнання зноў згадаем Лаўрэнція Абэцэдарскага: «Толькі дзякуючы перамозе Кастрычніка беларускі народ атрымаў права на самавызначэнне, аж да дзяржаўнага аддзялення, стварыў сваю рабоча-сялянскую дзяржаву...»[3]. А вось што пісаў іншы прадстаўнік «дырэктыўнай гістарыяграфіі» БССР 80-х гг. XX ст.: «...Утварэнне Беларускай ССР было… абумоўлена перамогай Вялікага Кастрычніка і трыумфам ленінскай нацыянальнай палітыкі, у выніку чаго беларусам была дадзена магчымасць не толькі развіваць сваю культуру і карыстацца роднай мовай, але і стварыць нацыянальную дзяржаўнасць»[4].

Аднак тэкст «дапаможніка» дазваляе казаць пра пэўны адыход Я. Трашчанка ад класічнай савецкай ідэалагемы. У першых двух раздзелах падручніка ён актыўна навязвае чытачу сцвярджэнні штучнасці беларускай рэспублікі. Маўляў, Беларусь — набыццё бальшавікоў была нацыянальнай ускраінай Расіі («Яе традыцыйна лічылі толькі этнаграфічна своеасаблівай вобласцю ўласна Расіі,…» (с. 31)), дзеячы беларускага нацыянальнага руху не мелі падтрымкі («Тут нацыянал-сепаратысты не мелі ніякага ўплыву ў народных масах» (с. 31 і далей)). БНР ацэньваецца як дапаможная структура нямецкай акупацыйнай адміністрацыі (с. 37), а БССР — як рэалізацыя палітычнай волі І. Сталіна, абумоўленая геапалітычнымі супярэчнасцямі ў «буферным» Заходнім краі» (с. 33). Я. Трашчанок нават параўнаў БССР з Далёкаўсходняй рэспублікай (с. 42). На думку аўтара і рэдактара «Гісторыі Беларусі», уласна беларускі народ не жадаў аддзялення ад Расіі і не імкнуўся да дзяржаўнага

[3] Абэцэдарскі Л. Утварэнне Беларускай ССР // Гісторыя Беларускай ССР: Кароткі нарыс. Мінск, 1969. с. 40–41.

[4] Бродко И. А. Критика буржуазной фальсификации истории образования БССР. Минск, 1987. с. 41.

самавызначэння (с. 43, 52 і далей).

Следам за савецкімі гісторыкамі Я. Трашчанок асудзіў дзеячаў беларускага руху як «нацыянал-сепаратыстаў», якія нібыта былі пераканаными праціўнікамі народнай улады, камуністычнай ідэі і інтэрнацыяналізму (с. 28 ды інш.). Зразумела, што пры гэтым яны не мелі ніякага ўплыву і арыентаваліся на знешнія антырасійскія сілы (Антанта, Польшча, Нямеччына). Напрыклад: «Беларускія нацыяналістычныя гурткі ніякага рэальнага ўплыву ў масах не мелі. Беларуская сацыялістычная грамада, хоць і гучна называла сябе партыяй, захоўвала дробнагуртковы, дробнаінтэлігенцкі характар і не здолела набыць шырокай сацыяльнай базы» (с. 22). Відавочна здзеклівасць і абсурднасць тэрміналагічных «знаходак» Трашчанка. Але больш цікава тое, што ў гэтай «характарыстыцы» беларускага нацыянальнага руху заўважная пэўная мадэрнізацыя савецкай канцэпцыі. Беларускі рух трактуецца не проста як «антынародная дробнабуржуазная стыхія», а як галоўным чынам антырасійская сіла. Тэкст падручніка прымушае згадаць пра ідэалогію «заходнерусізму» ў яго найбольш антыбеларускім варыянце.

Аўтар імкнецца даказаць, што самавызначэнне Беларусі ў першай чвэрці XX ст. адбывалася насуперак волі беларускага народу. За ўсім гэтым стаіць яшчэ адна прынцыповая ідэя беларускай савецкай гістарыяграфіі: *беларусы не былі стваральнікамі ўласнай гісторыі*. У савецкі час яны трактаваліся як аб’ект уздзеяння розных сацыяльных, палітычных і нацыянальных сілаў і ніколі не ўспрымаліся ў якасці суб’екта гісторыі. Менавіта так трактуе беларусаў і Якаў Трашчанок. Фактычна, у ягонай інтэрпрэтацыі гісторыі яны («беларускі народ») толькі аднойчы ажыццявілі сваю волю, а менавіта падчас прэзідэнцкіх выбараў 1994 г. Але і ў гэтай сітуацыі беларусы выступаюць як цалкам абесчалавечаная тэарэтычная канструкцыя. І тут можна заўважыць адраджэнне не найлепшых традыцый беларускай савецкай гістарыяграфіі. У пэўным сэнсе менавіта яна ініцыявала «масавыя рэпрэсіі» супраць гістарычных постацяў, якія, за выключэннем камуністычных дзеячаў, практычна зніклі са старонак гістарычных працаў. Адпаведна, у падручніку Я. Трашчанка

толькі аднойчы згадваюцца Вацлаў Ластоўскі, браты Луцкевічы, «камуністы-нацыяналісты» А. Чарвякоў і З. Жылуновіч. А вось Янка Серада, Язэп Варонка, Раман Скірмунт і Язэп Лёсік згаданыя выключна як аўтары тэлеграмы нямецкаму імператару Вільгельму II (25 красавіка 1918 г.), г. зн. як «калабарацыяністы» (с. 37).

У пошуках абгрунтавання сваіх ацэнак і суджэнняў Я. Трашчанок звычайна звяртаецца да расійскай гісторыі. Напрыклад: «Ва ўмовах Расіі дзяржаўная цэнтралізацыя ажыццяўлялася на феадальным эканамічным грунце… Станаўленне абсалютызму адбывалася на фоне вызвалення краіны ад мангола-татарскага ярма і не магло пазбегнуць уплыву Залатой Арды на ўсе бакі жыцця» (с. 94); «Расійская мадэль арганізацыі соцыуму не раз даводзіла сваю адэкватнасць айчынным умовам. Самымі жыццяздольнымі нязменна выяўляліся інстытуты, што ідуць каранямі менавіта ў мясцовую традыцыю (напрыклад, артэльная арганізацыя працы, народныя сходы і г. д.). Так, у гісторыі Расіі дзяржаўная ўлада значыла больш, чым на Захадзе…» (с. 97) ды інш. Традыцыі Полацкай зямлі і Вялікага Княства Літоўскага ігнаруюцца. Расійская гістарычная адметнасць у тэкстах Трашчанка цалкам падмяняе беларускую. А дзеля разумення асаблівасцяў савецкай эпохі ён звяртаецца да рысаў расійскага нацыянальнага характару (с. 8–12).

Хутка пачынаеш разумець, што аўтара цікавіць не лёс Беларусі, а лёс той еўразійскай дзяржавы, якая напачатку называлася Расійскай імперыяй, а потым Савецкім Саюзам. Палітычная гісторыя нашай краіны для Якава Трашчанка – гэта толькі нагода, каб паразважаць пра лёс «вялікай Расіі», асудзіць «сепаратыстаў» і «знешнія антырасійскія» сілы, якія прычыніліся да краху Імперыі. Пра гэта сведчыць таксама выкарыстанне аўтарамі тэрміну «краіна». Ён адначасна ўжываецца як сінонім Расійскай імперыі, СССР і (зрэдку) Беларусі.

Шкадаванне пра распад Імперыі лагічна перацякае ў тэзіс пра непазбежнасць «рэінтэграцыі вялікай еўразійскай агульнасці народаў» (с. 3, 53, 295 ды інш.). Гэты тэзіс рэфрэнам гучыць ва

ўсіх раздзелах падручніка. Паводле Я. Трашчанка, у авангардзе працэсу рэінтэграцыі ідзе беларукі народ пад кіраўніцтвам А. Лукашэнкі. «Ядром» гэтага працэсу ён лічыць Расію, а яго найважнейшым этапам – стварэнне саюзнай расійска-беларускай дзяржавы (с. 61). «Гісторыя Беларусі» паступова ператвараецца ў гісторыю знішчэння і адраджэння Імперыі. За псеўдагістарычнымі аргументамі хаваецца заклік да ліквідацыі незалежнай беларускай дзяржавы.

Цалкам у згодзе з канцэпцыяй «заходнерусізму» рэдактар выдання падводзіць чытача да высновы, што ўласна беларускай гісторыі ніколі не існавала. Такім чынам, Беларусь перастае быць ужо і аб'ектам даследавання. Гэта асабліва відавочна пры знаёмстве з IV раздзелам кнігі, прысвечаным гісторыі Беларусі 1953–1991 гг. З 24 старонак гэтага раздзела толькі чатыры (?!) распавядаюць пра сітуацыю ў Беларусі. Астатнія прысвечаныя гісторыі Расіі (=СССР) і перапоўнены аўтарскімі разважаннямі пра «гістарычную вялікасць» Сталіна і створанай ім планава-бюракратычнай партыйнай сістэмы (с. 272), пра інтрыгана Хрушчова (с. 272), пра дысідэнтаў, якія высмейвалі не толькі сістэму, але і «саму Айчыну» (с. 277), пра гарбачоўскую перабудову, якая ператварылася ў дэмантаж існуючага ладу (с. 277), пра «цынічнага дэмагога» Ельцына (с. 284) ды інш. Аўтар старанна ўзнаўляе ідэалагемы ўжо сучаснай расійскай нацыяналістычнай публіцыстыкі.

Трэба адзначыць, што ідэі «заходнерусізму» былі неад'емнай часткай беларускай савецкай гістарыяграфіі. Як адзначаў яшчэ Міхась Біч, гэты «метадалагічны гібрыд» канчаткова аформіўся ў паслявоенныя дзесяцігоддзі і цалкам адпавядаў устаноўкам ідэолагаў КПСС-КПБ на стварэнне выхаванага ў камуністычна-імперскім духу расійскамоўнага «савецкага народа» як новай гістарычнай супольнасці. Пры гэтым «нацыянальныя гістарычныя каштоўнасці і арыенціры былі амаль цалкам выкінуты з айчыннай гісторыі. Спробы аб'ектыўнай навуковай ацэнкі з'яваў і дзеячаў нацыянальнай гісторыі заканчваліся палітычнымі абвінавачваннямі і рэпрэсіямі»[5]. Аднак у савецкай гістарыяграфіі «заходнерусізм» быў толькі дадаткам да марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Той жа Л. Абэцэдарскі ў сваіх вядомых працах «Беларусы ў Маскве XVII в.» (Менск, 1957) і

«Нарысы руска-беларускіх сувязяў другой паловы XVI–XVII стст.» (Менск, 1978) адным з першых надрукаваў звесткі пра перасяленне беларусаў у Маскву і пра іх значны ўклад у развіццё культуры гэтага горада. Вядома і тое, што чалавек, які дзякуючы таленавітым эсэ У. Арлова ўспрымаецца сёння як нейкі антынавуковы кашмар і жудасны сімвал палітызаванасці гістарычнай навукі, рэзка крытыкаваў погляды галоўнага «заходнерускага» ідэолага Міхаіла Каяловіча. А вось у падручніку Якава Трашчанка «заходнерусізм» адыгрывае дамінуючую ролю.

Рэдактара падручніка ўдала дапаўняюць малодшыя калегі. Аб з'яўленне дапамагае зразумець, што «феномен Трашчанка» нельга расцэньваць толькі як рэанімацыю асобы, інтэлектуальнае развіццё якой спынілася гадоў пятнаццаць таму. Мы маем дачыненне хутчэй з пэўнай з'явай сацыяльна-культурнага жыцця, зрэшты, добра вядомай тым, хто жыў у савецкую эпоху.

Аляксандр Вараб'ёў у параграфе, прысвечаным міжпартыйнай барацьбе на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX ст. – 1920-х гг., галоўную ўвагу ўдзяліў дзейнасці агульнарасейскіх партый. БССР і тут выглядае як частка Расеі, народ якой ніколі не падтрымліваў «сепаратыстаў» з Беларускай Сацыялістычнай Грамады ды іншых «Нацыяналістычных» партый (с. 80 ды інш.). Наталля Пурышава, раскрываючы праблемы станаўлення беларускай савецкай культуры, заўважыла, што ў перыяд БНР культура мела «сепаратысцкі, антырускі характар і імкнулася абуджаць у масах нацыяналістычныя настроі», што, зразумела, «не сустракала ўхвалы ў насельніцтва» (с. 104). Беларусізацыя 20-х гг. XX ст., на думку даследчыцы, была выключна прымусовай і мела адваротны эфект. Кіраўнікоў гэтай палітыкі адрознівала «нацыянальная абмежаванасць» (с. 112). Якаў Трашчанок у падсумаванні гэтай тэмы падкрэсліў несамастойнасць беларускай культуры, для якой нібыта «мадэльным узорам» стала «вялікая руская культура», а таксама (у меншай ступені) – польская і ўкраінская (с. 148). Беларускую нацыянальную культуру ён ахарактарызаваў як «гістарычную навацыю, якая не існавала ніколі раней» (с. 149). Марыя Мацюшэўская, апавядаючы пра цяжкі стан насельніцтва

[5] Бітэм М. Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 1. с. 17.

Заходняй Беларусі пад польскай уладай, здолела пазбегнуць нават згадкі пра Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду і пра беларускі вызвольны рух наогул. Паводле М. Мацюшэўскай, паратунак для беларусаў прыйшоў у верасні 1939 г. разам з пераможнай Чырвонай арміяй. Зразумела, што аўтар тэксту таксама «забылася» згадаць, што гэты паход быў рэалізацыяй сумеснага сталінска-гітлераўскага плана па развязванні Другой сусветнай вайны. Дарэчы, цалкам у адпаведнасці з савецкай ідэалагемай гэтая вайна пачалася летам 1941 г., а не ў верасні 1939 г.

Асвятленне лёсу Беларусі ў Другой сусветнай вайне зроблена Я. Трашчанком амаль цалкам у адпаведнасці з нормамі савецкай гістарыяграфіі. Аўтар не пасаромеўся нават адкрытага паклёпу, абвінаваціўшы с. Станкевіча, К. Езавітава ды інш. у тым, што іх рукі «залітыя крывёй беларускага народу». Ф. Кушаль быў названы «афіцэрам СС», які «актыўна ўдзельнічаў у расправах над мірным насельніцтвам» (с. 238). Падобная хлусня ў адносінах да беларускай калабарацыі была амаль нормай для той часткі савецкіх прапагандыстаў-гісторыкаў, якія рамяство даследчыка пастаянна блыталі з функцыямі пракурора. Да таго ж мелі абсалютную ўпэўненасць, што адказваць за паклёп ім не давядзецца.

Уся гісторыя XX ст. бачыцца аўтару і рэдактару «дапаможніка» як бясконцая барацьба з ворагамі народу. Гэта таксама вяртае нас да канцэпцыі беларускай савецкай гістарыяграфіі. Варта нагадаць, што гістарычная навука ўспрымалася савецкімі і партыйнымі кіраўнікамі, а таксама значнай часткай гісторыкаў як сродак ідэалагічнай барацьбы з г. зв. «буржуазнымі фальсіфікатарамі», якія ў Беларусі звычайна выступалі як «буржуазныя нацыяналісты». У выніку для савецкай гістарыяграфіі было характэрным *выключна канфрантацыйнае бачанне мінулага*. Многія гістарычныя падзеі тлумачыліся пры дапамозе вобраза ворага, які ў залежнасці ад канкрэтнага эпізоду набываў сацыяльнае, нацыянальнае або рэлігійнае аблічча. Ворагам № 1 у падручніку дацэнта з Магілёва таксама з'яўляюцца «нацыяналісты». Знік толькі прыметнік «буржуазныя».

На працягу ўсяго падручніка дзеячы беларускага руху характарызуюцца выключна як нацыяналісты-радыкалы або як нацыянал-сепаратысты, якія імкнуцца пасеяць зерне нацыянальнай варожасці і экстрэмізму. У гісторыі БССР 40–90-х гг. XX ст. Я. Трашчанок заўважыў дзве спробы «нацыяналістычнага рэваншу». Першую ён звязаў з калабарацыяй на акупаванай нямецкімі войскамі тэрыторыі Беларусі ў час Другой сусветнай вайны, а другую ўбачыў у спробе нацыянальна-культурнага Адраджэння ў «парламенцкі перыяд» гісторыі Рэспублікі Беларусь. Гэты перыяд ён характарызуе як час «ашалелага прымусу», «спробы рэабілітацыі здраднікаў-калабарантаў і нават забарон на прафесіі паводле моўнай прыкметы», «разгрому сістэмы гуманітарнай адукацыі і навукі» (с. 151) і г. д.

Другое месца ў намінацыі «ворагі беларускага народу» цалкам згодна з савецкай канцэпцыяй займаюць палякі. У гэтым месцы варта спыніцца і згадаць «польскі сюжэт» у першай частцы «Гісторыі Беларусі», прысвечанай «дасавецкаму перыяду»[6]. Ва ўмовах адсутнасці «беларускіх нацыянал-сепаратыстаў» ролю галоўнага ворага сталі адыгрываць польскія памешчыкі і каталіцкае духавенства. Паводле Я. Трашчанка, першыя з іх давялі беларускіх сялянаў да мяжы фізічнага выраджэння, а другія з дапамогай Берасцейскай уніі спрабавалі духоўна знішчыць беларусаў і завяршыць працэс паланізацыі. Паўстанне 1863 г. у Беларусі і Літве разглядаецца Якавам Іванавічам як выключна польскае паўстанне, у падаўленні якога актыўна ўдзельнічалі беларускія сяляне, якія пры гэтым кіраваліся «вякамі назапашанай нянавісцю да польскага пана». Беларусь наогул трактуецца аўтарам як «яблык спрэчкі ў вечным расійска-польскім супрацьстаянні». Аўтар сцвярджае, што ў гэтае супрацьстаянне «польскія шавіністы» нібыта паспрабавалі ўцягнуць усе па-антырасійску настроеныя еўрапейскія колы[7].

У другой частцы свайго падручніка ён дамаляваў вобраз «польскага ворага» сюжэтам пра польскую экспансію на ўсходзе ў 1919–1920 гг. і абвінавачваннем палякаў у генацыдзе беларускіх чырвонаармейцаў. Насуперак вядомым гістарычным фактам пра тое, як савецкая Расія гандлявала беларускай зямлёй на перамовах у Рызе, Я. Трашчанок сцвердзіў, што менавіта яна і

[6] Трашчанок Я. І. Гісторыя Беларусі: Дасавецкі і савецкі перыяды. Частка 1. — Мінск: Беларускі кнігазбор, 2020. — 384 с.

выратавала Беларусь (с. 50). Могилев, 2003.

Аўтар і рэдактар «дапаможніка» паспрабаваў захаваць і
7 Гл. прыклад: Трашчанка А. Г. Образ «польскага ворага» як аднаго з галоўных у беларускай гісторыі. Пры гэтым варта задумацца, чаму гісторыка, погляды якога вагаюцца паміж «заходнерусізмам» і вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, наогул хвалюе праблема паланізацыі. Зразумела, не таму, што яму баліць душа за лёс беларускай культуры. Хутчэй, мы маем справу з асуджэннем палякаў і палітыкі паланізацыі ў Беларусі толькі таму, што яны «сапсавалі» частку адзінага «рускага народу», вынікам чаго і стала з'яўленне беларусаў. Падобна, што апошні тэзіс, які нарадзіўся яшчэ ў XIX ст. падчас актыўных намаганняў афіцыйных ідэолагаў даказаць легітымнасць расійскага валодання беларускай зямлёй, і сёння з'яўляецца ідэйным падмуркам разважанняў аўтараў тыпу Трашчанка. На самай справе, антыпольскасць вялікарасійскіх шавіністаў грунтавалася (і грунтуецца!) на тым, што прысутнасць палякаў і каталіцкага касцёла ў беларускай гісторыі прынамсі з апошняй чвэрці XIX ст. істотна перашкаджала завяршэнню русіфікацыі Беларусі.

Таксама ўражвае імкненне Я. Трашчанка апраўдаць савецкі таталітарызм і дыктатуру. Яго разважанні зводзяцца да двух аргументаў. Па-першае, таталітарны рэжым спыніў «рэвалюцыйную стыхію», і бальшавікі сталі ратавальнікамі Расіі; а па-другое, таталітарызм адпавядаў «векавой ментальнасці народу з яго традыцыйным маральным максімалізмам, схільнасцю ўпадаць у крайнасці, вечнай надзеяй на строгага і справядлівага правіцеля» (с. 215). Магчыма, Якаў Іванавіч менавіта гэтую асаблівасць савецкага ладу меў на ўвазе, калі пасля разважанняў пра прыроду таталітарызму заўважыў, што «многае, некрытычна адкінутае ў 90-я гг., паступова вяртаецца ў наша жыццё сёння» (с. 215–216).

Найбольш відавочны адыход ад канцэпцыі беларускай савецкай гістарыяграфіі заўважны ў адносінах да ролі Рускай праваслаўнай царквы і праваслаўя наогул. Якаў Трашчанок рашуча асудзіў савецкае «багаборства», і нават назваў РПЦ сярод фактараў перамогі над нацысцкай Нямеччынай (с. 255).

Яшчэ больш высока ён ацаніў станоўчую ролю праваслаўя ў «дасавецкім перыядзе» гісторыі. У першай частцы падручніка праваслаўе характарызавалася як «вырашальны фактар этнічнага з'яднання ўсходніх славян, кансалідацыі старажытнарускай народнасці»[8]. Адпаведна, адыход ад праваслаўя непазбежна абарочваўся «культурнай, моўнай, этнічнай асіміляцыяй»[9].

Відавочная спроба мадэрнізаваць гістарыяграфічную савецкасць з дапамогай «заходнерусізму» і вялікаімперскага шавінізму, дапоўненымі добрай дозай праваслаўнага фанатызму. Аднак «феномен Трашчанка» не абмяжоўваецца толькі гістарыяграфічнымі навацыямі ў духу ідэалогіі адраджэння Імперыі. Фактычна, мы сустракаемся з такой родавай прыкметай беларускай савецкай гістарыяграфіі, як *ідэалагічнае абслугоўванне ўладнага рэжыму*. Як некалі заўважыў вядомы расійскі гісторык Юры Афанасьеў, «партыі і савецкай дзяржаве былі патрэбныя гісторыкі, для якіх палітычная мэтазгоднасць была крытэрам (…) больш важным, чым гістарычная праўда. Прычым, гэтае патрабаванне закладвалася ў падмурак і прафесійнай адукацыі, і фармавання маральных якасцяў асобы. Гісторык мог лічыцца прафесіяналам толькі ў той ступені, у якой ён быў «байцом партыі». Падобныя абставіны нярэдка прыводзілі да прафесійнай і маральнай дэфармацыі»[10].

Сёння месца былой камуністычнай ідэалогіі заняла, паводле Я.Трашчанка, «узважаная дзяржаўна-патрыятычная ідэалогія, якая выключае ўсякія праявы экстрэмізму – як нацыянальнага, так і сацыяльна-класавага» (с. 151). Менавіта сучасны варыянт такой ідэалогіі, на думку аўтара, і павінны ўкараняць у свядомасць беларусаў настаўнікі гісторыі. Дзіўна, што ў зборніку, прысвечаным праблемам выкладання гісторыі ў школе, не знайшлося месца для сучасных прадстаўнікоў гістарычнай навукі, якія маглі б расказаць пра сучасныя падыходы да выкладання гісторыі ў Беларусі, пра тое, якія падручнікі выкарыстоўваюцца ў школах краіны, якія праблемы існуюць у гэтай сферы. Замест гэтага ў зборніку змешчаны толькі артыкул Т.Шаўлякевіч, у якім аўтар, на жаль, не выйшаў за межы агульных разважанняў пра ролю гісторыі ў выхаванні грамадзяніна.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў Беларусі пакуль не сфарміравалася ні адзінай канцэпцыі выкладання гісторыі, ні адзінага падручніка. Гэта, безумоўна, з'ява станоўчая, бо ў краіне, дзе ўлада імкнецца ператварыць гісторыю ў інструмент сваёй палітыкі, адсутнасць адзінага падручніка – гэта ўжо вялікае дасягненне. Але ці можна лічыць нармальнай сітуацыю, калі ў краіне, дзе ўлада ўжо 25 гадоў, не сфарміравалася ні адзінай канцэпцыі выкладання гісторыі, ні адзінага падручніка? Ці не сведчыць гэта пра тое, што ўлада не ведае, якога грамадзяніна яна хоча бачыць

пачалі вяртацца да звыклай з часу БССР ролі паслугача ўлады. Намаганнямі былых і сучасных гісторыкаў-прапагандыстаў навуку зноў спрабуюць звесці да ролі сродка ідэалагічнага выхавання. Ці здадуць беларускія гісторыкі чарговы іспыт на сумленнасць і гонар?

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

№ 3 (43) - 2006

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/05/14

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

МІХАСЬ ТЫЧЫНА

Міхась Тычына Прывід гіпэртэксту Агляд літаратуры 2005 году «вачыма злодзея»

Міхась Тычына нарадзіўся 10 лютага 1943 году ў пасёлку Ленінскі Алданскага раёну (Якуцкай АССР) у сям’і ссыльнага. Скончыў філялягічны факультэт Берасьцейскага пэдагагічнага інстытуту (1964), асьпірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1970), дзе й працуе навуковым

Пасьля таго як зьявіўся холдынг «Литература и искусство», а ад СБП адкалолася група «пісьменьнікаў на пасадзе», літаратурны працэс нагадвае вясновы ледаход. Каб перабрацца на другі бераг і стаць на трывалую глебу сучаснага мастацкага мысьленьня, трэба абмінуць таросы эрзац-тэкстаў спэцрэалізму (вызначэньне сацрэалізму Віктара Каваленкі), рыхлыя сьнягі нэасэнтымэнтальнай адліжнай «спавядальнасьці», сьлізготу растыражаванага сучаснага псэўдагістарызму і запазычанага нэаміталягізму, уяўную даступнасьць пэрформанснага шляху.

ІРОНІЯ ГІСТОРЫІ

Адным зь першых патрэбу ў зьмене вобразнай мовы, якою беларускі пісьменьнік мусіў зьвяртацца да сучаснага чытача, адчуў Васіль Быкаў. Адчуваньне сябе ў гісторыі, а гісторыі ў сабе было разьвітае ў ім надзвычайна. Ці не адгэтуль ідзе ўнікальная своечасовасьць зьяўленьня ў друку ягоных тэкстаў? І гэтак на працягу сарака гадоў.

Праўда, інакш кажучы, абсалютная ісьціна, убачаная вачыма асобнага чалавека, – самае зьмястоўнае паняцьце ў творчасьці Быкава. Найперш гэта праўда пра вайну, з адкрыцьця якой пачынаў пісьменьнік, шпарка пашыраючы гістарычную прастору, на фоне якой бачыліся падзеі вайны. «Гаварыць няпраўду аб ёй, – сьцьвяр-джаў Быкаў, – ня толькі аматарства, але і злачынна як у адносінах да мільёнаў яе ахвяраў, так і ў адносінах да будучыні. Людзі Зямлі павінны ведаць, ад якой небясьпекі яны пазбавіліся і якой цаной дасталося ім гэтае збавеньне». У гэтых словах адчуваецца гранічная асабістая перакананасьць пісьменьніка ў несумненнай перавазе адноснай ісьціны чалавека, які нясе ў сабе, як асколкі ў целе (у гутарцы з Алесем Адамовічам ён згадваў пра «асколачак», што і напамінаў яму аб сабе), памяць пра мінулае. Адчуваецца таксама, у якіх умовах даводзілася яму гэтую простую чалавечую ісьціну абараняць.

Іншыя пісьменьнікі, ведаючы пра вайну ня менш, чым Быкаў, таксама ішлі шляхам праўды, аднак маштаб іх думкі быў інакшы, і гэта выяўлялася ў мове, то лішне патаснай, то сэнтымэнтальна-расчуленай, але ў любым выпадку надзвычай прыблізнай. Дзеяньне такога маўленьня, якое нясе ў сабе зьбедненае паведамленьне пра тое, што аўтар яшчэ «жывы» і «ўспамінае», разьлічана на кароткую дыстанцыю. (Летась, праўда, зьявілася некалькі тэкстаў, як бы наўздагон асноўнаму корпусу «ваеннай прозы», каштоўнасьць якіх у кагнітыўнай інфармацыйнасьці незадурманенай ідэалягемамі памяці: «Хлапчук са старога здымка» Валянціна Тараса, «У кожнага свая вайна» Міколы Дубоўскага.)

Васіль Быкаў вялікім намаганьнем волі «вяртаў» чытача «ў агонь»: адсюль рэдкая ў літаратуры рэчыўнасьць ягонага сьвету, сугестыўнае ўзьдзеяньне на падсьвядомасьць. Змучаны астмай, зусім не асілак, ён, як старадаўні музыка Тыртэй, уздымаў сваімі творамі баявы дух беларусаў. Быкаў пісаў: «Мёртвым не баліць...», а чытач утараваў: «...баліць жывым». Быкаў пісаў белай крэйдай на чорным папялішчы хутару Яхімоўшчына: «Знак бяды», а чытач, усьлед за ім, называў мноства «знакаў бяды», пачынаючы ад радкоў Якуба Коласа пра «сьцежачкі крывенькія», што «зарасьлі не палынамі, не

Сябрам Беларускага ПЭН-Цэнтру з 1989 году.
Летась у «ARCHE» ў рукавой ім гэтае абістаўлы
Зера (каментарыў) «Вагамі з мраўлянага сьцену».

крапівой, не драсянамі, не чаратом, не лебядою – а беларускаю бядою». Коласаўскае мудраслоўе «Казак жыцьця», зь іхным іншасказаньнем, нацыянальнымі, палітычнымі, літаратурнымі алюзіямі, горкай іроніяй адгукнулася ў быкаўскіх «Парадоксах жыцьця».

Быкаўскі парадаксалізм, абсурдызм і чорны пэсымізм, які вяртае зь нябёсаў літаратуры на грэшную зямлю і пазбаўляе ўсялякіх ілюзіяў наконт шчасьлівага фіналу, надзіва суладна перагукваецца з нацыянальным нэарамантызмам надзеленай незвычайнай сілаю духу Ларысы Геніюш, з эпісталярнай спадчынай якой мы пазнаёміліся ў кнізе «Каб вы ведалі», з адным з «рыцараў сумленьня і свабоды» Ўладзімерам Караткевічам, пра якога мы ўспамінаем разам з аўтарамі кнігі «Ўладзімер Караткевіч. Быў. Ёсьць. Буду!». (Эх, каб у гэтым прыгожа афармленым фаліянце ды яшчэ знайшлося месца для самых яркіх успамінаў пра свайго найлепшага сябра Васіля Быкава і Рыгора Барадуліна! Не абышлося бяз лыжкі дзёгцю баязьлівых кнігавыдаўцоў, што палохаюцца яшчэ да таго, як нешта мусіць здарыцца. Што, так і будзем спачатку «раскопваць кар'еры», а потым заліваць іх асфальтам, каб зноў раскопваць і зноўку заліваць?!)

Быкаў, як і яго сябры-паэты, адмовіўся прыняць спэцыфічны пісьменьніцкі лёс адначасова ўсенароднага ўлюбёнца і абляўрэачанага ўладай пестуна. Пры ўсёй сваёй прыхільнасьці да «жорсткага рэалізму», ён заставаўся, аднак, непапраўным рамантыкам, бо мысьліў у маштабах кантаўскага катэгарычнага імпэратыву («рабі так, як бы максыма твайго ўчынку з апорай на тваю волю павінна была стаць усеагульным законам прыроды») і той жа «незацікаўленасьці меркаваньня», адсутнасьці ўсялякага ўтылітарнага інтарэсу патрабаваў ад сваіх герояў. Зразумела, што гэты маральны рыгарызм адлюстраваўся ў яго маўленьні, у сухім слоўніку вайсковых статутаў, у кароткіх, як перастрэлка, дыялёгах, у пазбаўленым складаназлучаных сказаў сынтаксісе, у гатычнай архітэктоніцы тэксту. Не выключэньне й запісы з агульных сшыткаў, апублікаваныя пад назвай «Пункціры жыцьця»: успаміны, пачынаючы зь першых уражаньняў маленства, камэнтары да прачытанага, рэакцыя на актуальныя падзеі – усё напісана

моваю кінэматографу, «кадрамі», «плянамі», якія суправаджаюцца ляканічнымі замалёўкамі графіка.

Бунін піша ў дзёньніку, што ўсе свае творы выдумаў. Баюся сабе прызнацца, але, мусіць, і я таксама. А пасьля неяк сачыняў «гісторыю стварэньня», бо няёмка было прызнацца, што прыдумаў. Дый чытачам нецікава.

У некага (Рэмарка?) ёсьць выраз: «Дробязі суцяшаюць». Ня ведаю, як у каго, а ў мяне дык скрозь дробязі раздражняюць. Ці гэта такое жыцьцё? Ці склад характару? Ці ўзрост?

Усе гады на чужыне быў сярод чужых людзей. А так хацелася спаткаць земляка, чалавека зь Беларусі. Хоць каб павітацца, а то пагаварыць, успомніць. На жаль, тое здаралася дужа рэдка. Было ў батарэі два-тры чалавекі, салдаты аднекуль з-пад Берасьця. З афіцэраў за вайну не сустрэў ніводнага беларуса.

Гаворка зайшла пра сексотаў, усе пагаджаліся, што, як і ўсюды, у нас былі сексоты. Але колькі? Меркавалі, чалавек пяць. Іншыя сьцьвярджалі: палавіна. Тады нехта прапанаваў напісаць паперкі і кінуць у шапку. Хай сексоты зробяць метку-крыжык, а іншыя – прочырк. Так і зрабілі. Ананімнасьць была захаваная. Пасьля разгарнулі паперкі.

Аказалася, з 25 паперак у 18 былі крыжыкі. Усе былі ашаломленыя. Але кожны лічыў, што ён паставіў прочырк. Між іншым, членаў КПСС з нас таксама было 18.

ЛЕПШ ПАЗЬНЯК, ЧЫМ НІКОЛІ

Цікава, ці чытае ўспаміны і мэмуары пакаленьне сёньняшніх 30-гадовых? Яшчэ больш цікава, ці прачытаў хто з падпісчыкаў «Дзеяслова» паэму ў трох частках «Вя-лікае Княства» Зянона? Я прачытаў, але пасьля таго, як узьнікла задума апісаць сваё ўспрыняцьце сучаснай беларускай мастацкай літаратуры. Сьпярша падумаў: «Ну вось, «Новая зямля» ў век кампутараў!»

У аўтарскай прадмове чутно добра знаёмы голас, інтанацыі, публіцыстычны патас народнага трыбуна Зянона Пазьняка. На жаль, былога, у ганаровай адстаўцы. Сіла духоўнага ўплыву такой асобы непазьбежна нараджае вакол сябе міты, сярод якіх і травэставаная прымаўка «Лепш пазьняк, чым ніколі». Накаркалі на свой голаў: час волі спазьняецца, а шлях у нікуды, у нічога, у ніколі, «дзе праносяцца коні і асядае пыл», – вось ён, перад намі. У мадэлі Ўнівэрсуму палітыка Пазьняка пераважае нэгатыў часьціцы «не»:

Няўжо гэтак можна ўпасьці?! Яны ня ведалі нічога: хто яны, адкуль прыйшлі, куды ідуць. Яны не ідуць нікуды. Яны даўно не змагаюцца за Радзіму, за сябе, за народ. Яны нічога ня чулі пра Княства, пра Патоп, пра вялікае існаваньне. Яны слухаюць сваіх нішчыцеляў і ненавідзяць сваё. Ім бессэнсоўна і небясьпечна пра гэта казаць, бо могуць данесьці нішчыцелям, каб забіць.

Пазытыў нагадвае аб сабе ў лірыцы Зянона, як і ў яго выкшталцоных фатаграфіях, дзе жыве і вольна дыхае беларушчына. Яна стылёва някідкая, ляканічная, сьціплая, паветраная. Як карціны Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Як японскае хоку. У ёй, быццам пасьля бурнай ліпеньскай навальніцы, шмат азону. У паэме таксама гучыць «звон падкоў і даносіцца вецер Вялікага Княства…». Кранае душу скрушны роздум паэта пра лёс Айчыны. Блізкае кожнаму беларусу нежаданьне зьмірыцца з трагізмам народнага існаваньня. Шмат хто з нас паўтарае, усьлед за аўтарам, словы: «Мне баліць мая Літва». Праўда, у завочнай спрэчцы Зянона з Алесем Дударом, што і хто сталася прычынаю нацыянальнага заняпаду, схіляесься да больш абгрунтаванага сьцьверджаньня папярэдніка. У Зянона: «Мой народ масква пасекла», а ў Дудара: «Пасеклі наш край папалам».

Паводле мітастваральных законаў, падобна, арганізаваны і паэтычны сьвет эпасу Зянона. У ягонай лірычна-філязофскай прасторы сустракаем згадкі пра герояў беларускай мінуўшчыны, рамантызаваныя вобразы і тыпы «апошніх беларусаў», якія захавала з маленства аўтарская памяць, шчодра рассыпаны замалёўкі беларускіх краявідаў, гучаць

цудоўныя народныя песьні, філіпікі ў гонар шляхетнасьці і рыцарскай ахвярнасьці, узьнёслыя малітвы лірычнага героя-апавядальніка. У такіх выпадках часта хочацца ўсклікнуць, як некалі Максім Горкі, «вялікі пралетарскі пісьменьнік», усклікнуў, прачытаўшы «ляўкоўскі цыкль» Янкі Купалы і напісаўшы на палях: *«Славно!»*

На нашых вачах адбываецца апошняе (якое па ліку ў нас?) разьвітаньне з аграрнай цывілізацыяй, зь вёскай, якая «сыходзіць зь яснай явы», зь яе натуральнай гаспадаркай, арыентаванай на традыцыйныя каштоўнасьці (родны кут, лад у хаце, сямейны дабрабыт, жыцьцё на ўлоньні прыроды, народныя сьвяты, багатае застольле, беларуская гасьціннасьць), з хутарамі і фальваркамі – фрагмэнтамі былой велічы Вялікага Княства, – дакладней, з успамінамі пра басаногае дзяцінства, калі неба было высокае, дні доўгія, дрэвы вялікія.

Шмат што нагадвае ў паэме то «Песьню пра зубра», то «Пана Тадэвуша», то «Новую зямлю»... Зянон па-майстэрску валодае прафэсійным інструмэнтарыем вялікіх папярэднікаў, ствараючы своеасаблівы ліраэпічны канспэкт новай і найноўшай беларускай літаратуры, уключаючы, акрамя вышэй названых тэкстаў, «Людзей на балоце» Івана Мележа, «Знак бяды» Васіля Быкава, «Дануту» Аляксея Карпюка (у чытацкім замілаваньні да апошняй некалі прызнаваўся сам Зянон, а ў яго асобе, можна сказаць, і пакаленьне «дзяцей вайны»). У нейкай ступені паэму можна аднесьці да тэкстаў, сьвядома супрацьстаўленых культурнай прасторы, якая шпарка трансфармуецца. Яна зьяўляецца інтэлектуальным выклікам эпосе глябалізацыі і нівэліроўкі нацыянальнай самабытнасьці, безь якой горача каханая паэтам і палітыкам Зянонам Пазьняком Беларусь страціць шмат прывабнага, калі ня ўсё. Але як прымірыць у адной шырока задуманай рэчы дзьве эпохі: клясычную і мадэрнісцкую?

Некалі ў 1930-я – 1940-я гады спрабаваў злучыць у адну шырокую плынь паэтычнага эпасу «жывую» і «мёртвую» ваду Якуб Колас. Ягоны творчы экспэрымэнт, прадыктаваны біялягічным страхам перад уладай бальшавікоў, скончыўся

нічым. Наш клясык, які навучыў беларускую мову «гаварыць вершамі» і лёгка мог напісаць за раз тысячу радкоў, ня здолеў сябе прымусіць дапісаць усяго два разьдзелы з задуманых 30-ці паэмы «На шляхах волі». Не пра тыя «шляхі» пісаў і не пра тую «волю»! Менавіта таму ён у самым канцы жыцьця марыў напісаць аўтабіяграфію, у якой хацеў распавесьці, як усё было насамрэч.

Зянон піша якраз пра «шырокія шляхі» і пра «беларускую мару», пра волю жыць на роднай зямлі ў добрым ладзе з сабой і сваім сумленьнем. Мог напісаць успаміны ці мэмуары, аднак выбраў мову паэзіі. Адно – усьлед за абодвума Міцкевічамі – паэтызаваць беларускі сусьвет вачыма шляхціца і селяніна, другое – стрымліваць сябе ад справядлівага гневу супраць нелюдзяў, якія зруйнавалі гэты сусьвет, і трэцяе – апісваць «васьмідзясятыя гады – часы вялікіх перамен». Ці адпавядае нашаму часу мова СМІ, зьмешаная зь бюракратычнай і гутарковай: *«Балянс грамадзтва ўжо зьмяніўся І дух свабоды аднавіўся. І засьвяцілася надзея, Жыцьця ў няволі панацэя… Гэй-гэй, наперад – можа быць. Па конях – хопіць гаварыць… Бліснула наша рэвалюцыя. Мы незалежнасьць здабылі – Галоўна ейна рэзалюцыя»*. Гэта зусім ня стружкі з варштату палітыка і навукоўца, які хварэе на філялягічны флюс, не запіскі беларускага Дантэ, які прайшоў тры кругі пекла, не журнал капітана, карабель якога ідзе на дно. Але нават Дантэ вымагае ў наш час літаратурных камэнтароў і музычнай аранжыроўкі.

Аб мастацкай вычарпанасьці традыцыйнай паэтычнай мовы і наагул ліраэпасу (магчыма, часовай, бо сакрэт старэньня і адраджэньня жанраў і стыляў пакуль што не разгаданы) сёньня дастаткова сьведчаньняў. Лёгкасьць чытаньня паэмы Віктара Сьлінка з баечнай назвай «Жбан і вада» – усяго толькі адваротны бок натужнай напружанасьці штучна выбудаванага сюжэту і кепска дапасаванай да прадмета гаворкі «сялянскай» лексыкі. Як можа скласьціся ў нешта цэласнае беспарадкавае пералічэньне рэчаў: *човен, жбан, куфар, плот, цела, кокан, ложак*?! А што азначае двухрадкоўе: *«Так, ты мая – дачка, сястра, жана, Рукою некранутая ніколі»?! Далей болей: клетка, птушка, зерне, дзіця, хата, дым і комін, сьнег, мёд у малацэ, дачка, сені, аконца, плот у сьнезе, сьляды гусей…*

МЫ СЯБЕ Ў НЕМАТУ ВЯРТАЕМ

Усё на сьвеце адноснае. У тым ліку і мастацкія каштоўнасьці. Літаратурная творчасьць гістарычна абмежаваная, а таму – спадзявайся на большае, і тады атрымаеш меншае, што таксама ня кепска. Бо мастацтва слова паўсюль адступае, пакідаючы амаль без супраціўленьня прастору візуальным відам мастацтва: эстрадзе, танцу, кіно, тэлебачаньню.

Мастацтва слова адступае яшчэ і таму, што сотні год выкарыстоўваюцца адны і тыя ж функцыянальныя пласты мовы, адкрытыя некалі клясыкамі. Нават найбагацейшы слоўнік творчасьці Якуба Коласа налічвае ўсяго толькі прыблізна чвэрць агульнанацыянальнага лексычнага корпусу (мовазнаўцы кажуць пра адзін мільён картак, на якія выпісаны яшчэ ў савецкія часы беларускія словы і іх шматлікія варыянты, пазьней перанесеныя ў кампутарны банк зьвестак).

Пурысты ад мовы на працягу апошніх дзесяцігодзьдзяў, пачынаючы з «наркамаўкі», ці як яе назваў Алесь Разанаў, «нармаванкі», з узаконьваньня «крапіўніцы» (назваў бы я па аналёгіі з «тарашкевіцай» і назвай дзіцячай хваробы) у сумнаславутым расійска-беларускім слоўніку 1950-х гадоў, на свой лад разумелі паняцьце «моўная норма», «літаратурная мова». Яны з дапамогай рэдактараў і выдаўцоў старанна ачышчалі слоўнік ад натуральнага пранікненьня ў літаратурную мову дыялектызмаў, народна-гутарковых, прастамоўных, ненармаваных лексычных і граматычных элемэнтаў. Нашаніўцы, узвышаўцы, філялягічнае пакаленьне ў свой час зьвярнулі ўвагу на такую самавідавочную і першасную асаблівасьць літаратуры, як мастацтва слова, прыгожае пісьменства, і ўголас загаварылі пра культуру творчасьці, узбагацілі зьведзеную да прымітыву мэханічную моўную практыку за кошт народнай мовы і г. д. Менавіта так, з мовы, з дыскусій пра мову, пачынаўся шторaз беларускі Рэнэсанс, як зазвычай, кароткі і бурны.

Такія прадстаўнікі «філялягічнага пакаленьня», старэйшыя і маладзейшыя, як Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Янка Сіпакоў, Алег Лойка, Віктар Казько, Ніна Мацяш,

Алесь Разанаў, Сяргей Законьнікаў, Вольга Іпатава, Уладзімер Някляеў (называю тых, хто выступаў у леташнім друку), зьяўляючыся *«вялікімі прыгоннымі»* роднай мовы і не зважаючы на ўзрост, хваробы, настроі, па-ранейшаму варочаюць *«слоўныя глыбы»*, адчуваючы, як за імі *«дыхае глыбіня»* (Р. Барадулін). Яны перакананыя ў тым, што кожны, хто мае справу з мовай, міжволі выплывае на літаратурны мэйнстрым і кранаецца залатога дна ісьціны.

Я, напэўна, апошні,
Хто моліцца слову,
Як сьсівелы паганец
Жывому агню.
Зь ветру зьвітыя
Весьніцы я зачыню,
Каб спрыяліся поціху
Цёмнаму лову.
Каб сьвятлелася ўдачы
У сквапнай начы,
Дзе агонь пераемнасьці
Не затухае.
А душа чуе ўсё,
Як і ноч неглухая.
І палаюць смаліста
Сузор'яў карчы.

Гэта верш Рыгора Барадуліна. Паэт хваравіта чулы да таго, што адбываецца ня толькі з мовай у цэлым, але і з кожным словам паасобку. Менавіта ў мове, на яго думку, чалавек становіцца чалавекам. У мове знаходзіцца магчымасьць зьдзейсьніць сваё найвышэйшае прызначэньне. У слове выяўляецца боская сутнасьць чалавека: *«Прашаптаныя зь нематы, Мы сябе ў нямату вяртаем»*.

Справа ня толькі ў тым, што *«Забараняць лягчэй, цяжэй абараняць І мову, і забытую Айчыну»*, хоць людзі, якія маніпулююць моваю дзеля сваіх часовых мэтаў, прымушаюць іншых кідацца з адчаю ў роспач. Справа ў тым, лічыць французскі драматург Валер Наварына, «што некаторыя рэчы

адбываюцца пад уплывам аднае толькі мовы. Сьмерць моваў, гісторыя моваў нараджае гістарычныя падзеі ў ня меншай ступені, чым геалёгія: абрынутая скала, землятрус у Лісабоне, цунамі – усё стварае гісторыю, але і мова сама па сабе ёсьць сілай, якая існуе вакол нас, яна дзее ў адзіночку, у гэтым страшна прызнавацца, але гэта відавочна, а людзі робяцца да гэтага ўсё менш і менш чулыя, яны проста недастаткова зьвяртаюць на гэта ўвагу. Уся французская супольнасьць пачынае хвалявацца празь зьмены, якія адбываюцца ў адносінах да мовы. У часы Малярмэ пытаньні стылю цікавілі толькі людзей адукаваных. Сёньня, у эпоху мас-мэдыяў, пытаньне аб мове апынаецца ў цэнтры ўсяго. Таму, магчыма, варта расплюшчыць вочы, раскрыць вушы: «Будзьце асьцярожныя з моваю!»

Паводле словаў Барадуліна, людзі, якія ведаюць мову, цэняць слова, разумеюць, дзякуючы гэтаму, глыбінную існасьць сьвету. Зьвяртаючыся зноў да разваг Валера Наварына, можна перайначыць ягонае выказваньне пра тэатар прыкладна так: людзі чытаюць кнігі, каб выкарыстаць карацейшыя шляхі, розьніцу ў хуткасьці і навучыцца даваць слову іншае значэньне, чым тое, якое яму надаюць слухачы радыё і гледачы тэлебачаньня. Менавіта тады «мова ўплывае ва ўсім сваім аб'ёме, пры дапамозе капіляраў, мэханікі нэрвовых токаў і тэрмадынамікі, і яе ўплыў мае зваротную сілу». У Барадуліна тое самае адгукаецца ў радках:

Слова хоча маўчаць
І само ўжо шкадуе,
Што даверыла некаму таямніцы свае.

Рыхласьць слова, разгайданасьць вершаванага радка амаль немагчымыя, калі ў цэнтры ўвагі знаходзіцца лёс слова. За словам стаіць цень таямніцы, і гэтая таямніца ёсьць сьмерцю асобы і нацыі. Не да звыклага псэўдалірычнага размазваньня слоўнай масы Васілю Зуёнку, не да таннага тыражаваньня агульных месцаў, калі апісваеш ня баль, а выказваеш боль. Тады радкі ляцяць, як трасіруючыя чэргі, і ўсе ў цэль, «у дзясятку», а ў канцы – «кантрольны стрэл»:

Слоў родных здрадзіўшы красе,
Трасянку моўную трасем.

Сваёй пазбыўшыся душы,
П'ём за чужыя барышы.

І з нафтаю падносіць гляк
Наш першы сібірак Ярмак.

Славуты прыхадзень ён быў –
Пітво Расіі раздабыў.

З той «чашы кругавой» і нам
Трапляе ў дар па колькі грам…

Глыні – ды бульбінай заеж,
Гуляй – бяз хаты і бязь меж!..

І сэнс адзін у той гульбе:
Труба… трубою… у трубе…

І мы – ужо амаль ня мы, –
Трубі ў трубу, народ нямы…

БЯЗЬЛІТАСНАЯ ХАДА ЧАСУ

У Кузьмы Чорнага ёсьць выраз «Бязьлітасная хада часу». Час, у яго разуменьні, хутчэй руйнуе, чым будуе. Ёсьць і такое выказваньне: «Вялікі Злодзей час…». Гэта той час, які крадзе ў дзяцей іх бацькоў, а ў бацькоў – маленства дзяцей. Праўда, сустракаецца і нешта зусім іншае: «Час – вялікі доктар». Яшчэ ішла вайна, «яшчэ ня ўсе загадчыкі аддзелаў атрымалі ордэны», як скардзіўся адзін з герояў Чорнага, а пісьменнік ужо думаў над тым, што вырасьце зь «дзяцей вайны», якія бачылі, як на іх вачах забівалі іх бацькоў, палілі людзей, зь якою ношаю памяці пойдзе па беларускім шляху народ і ці здужае ён выжыць у паваенным тыглі «зьмяшэньня нацый». Магчыма, што спатрэбіцца, лічыў ён, псыхааналітык.

Наўрад ці адпавядае аўтарскай задуме назва раману «Скокі

сьмерці» Людмілы Рублеўскай. «Скокі на могілках» Міхася Чарота мы ўжо некалі чыталі (*«Паглядзіце, мы скачам на могілках, І чырвоным віном паліваем крыжы»*). Раман не пра сьмерць, а пра Час як адну з асноўных, поруч з Прасторай, канстантаў чалавечага быцьця. Дакладней, пра кругазварот зьяваў у прыродзе і цыклічную паўторнасьць падзеяў. Пра што, дарэчы, добра сказаў Уладзімер Караткевіч: *«Сьвет добры. Сьвет мяне паўторыць. Ну а ня сьвет – дык Беларусь. Мне досыць»* (гэтыя словы ўзятыя ў якасьці эпіграфу да раману).

У беларусаў чамусьці пераважае якраз цыклічнае разьвіцьцё падзеяў, а лінейны рух гісторыі штораз зьбіваецца з рытму. Затое ў нас у мінулым шмат таямніцаў, і, пакуль мы іх не разгадаем (вядома, з дапамогай аўтараў гістарычнай прозы), датуль змушаныя будзем зноў і зноў паўтараць тое, што ўжо аднойчы было, славутае *deja vu*. Жанр гатычнага раману, фактычна ўзаконены Караткевічам у нашай літаратуры, несумненна, адпавядае хвалі позьнерамантычных настрояў, якімі жыве беларуская супольнасьць, нашай мэлянхалічнай патрэбе ў сузіраньні замшэлых руінаў старадаўніх замкаў, у раскадзіроўцы загадак нашай гісторыі, таямніцаў нашай падсьвядомасьці, адкідваньні забаронаў.

Раман Рублеўскай можа служыць узорам для школьнага разбору ўсіх пераваг гатычнага жанру, а саму пісьменьніцу сьмела можна далучыць да шматлюднай кагорты пасьлядоўнікаў Караткевіча. Усё ў рамане на месцы: займальная інтрыга, крута задуманы сюжэт, зладжанасьць сыстэмы пэрсанажаў, крымінал, любоўныя сантымэнты, пераможны, у опэрным духу, фінал. Адно што *alter ego* аўтаркі, гераіня-апавядальніца, дарэмна гуляе ў сьціпласьць нібыта звычайнай журналісткі-аўтсайдэркі, расчараванай у сабе, у сваіх журналісцкіх здольнасьцях, у магчымасьці што-небудзь зьмяніць у сьвеце, а тым больш у роднай краіне Беларусі, нарэшце, у мужнасьці беларускіх мужчынаў. Як-ніяк, але яе вопыту, інтэлекту, інтуіцыі хапіла, каб разгадаць ці не найвялікшую таямніцу беларускае мінуўшчыны. Міжволі падумаеш, што ў выпадку чаго варта зьвярнуцца з рамонтам гадзіньнікаў менавіта да Людмілы Рублеўскай. Магла ж вельмі хутка разабраць усе дванаццаць іржавых гадзіньнікаў нейкага

Гервасія (ну а як яшчэ назваць!) Люіджы (тым больш!) Бэрнаконі (усе гэтыя італьянцы зьвязаныя са слугамі чорнага прадоньня!), «абвінавачанага шматлікімі сьведкамі ў вядзьмарстве», і не сабраць. Аднак жа сабрала, дапасавала мноства зубчастых кольцаў і шасьцяронак-зорачак, і ўсё гэта ў апошні міг, калі магла здарыцца вялікая бяда. Вось бы так усім нам!

Куды цяжэй, аднак, разабрацца з таямніцамі сучаснасьці. Аб чым выразна сьведчыць аповесьць Віктара Казька «Час зьбіраць косьці». Добра было б, вядома, «разабраць» яе гадзіньнікавы мэханізм, зьвярнуўшыся да ягонага раману «Бунт незапатрабаванага праху» як мадэлі мадэрнізаванага Эвангельля. Але дзеля гэтага трэба ўбачыць тэкст вачыма гадзіньнікавага майстра, які даўно і цьвёрда засвоіў, што гадзіньнік – гэта ўсяго толькі грамадзкая дамова па працэсе сынхранізацыі часу з дапамогаю сьветлавога сыгналу, што Час па-за гэтай дамоваю проста не існуе. *«Есть только миг между прошлым и будущим, Именно он называется жизнь»*. Лепш убачыць падзеі «вачыма злодзея», як агледзеў у Віктара Казька сваю разрабаваную хату-летнік гаспадар-наратар. А пазьней, астыўшы, асэнсаваўшы, паіранізаваўшы, апісаць яе «пад Луку». Пра што? Як абакралі? Ці варта? Лепш вось пра што: *«Як жа хутка псее чалавек. Толькі што прымерваў крыльлі, але не пасьпеў іх прыладзіць, як паперлі рогі»*. Пра Вялікую Псоту ХХ стагодзьдзя.

Апорныя эпізоды, на якіх трымаецца задума твору, ужо ня раз апісаны ў іншых тэкстах празаіка. І ня толькі мастацкіх, але і ў скрушна-гнеўнай эсэістыцы. Аднак, зірнуўшы ў вочы чытача, ён не знаходзіць жаданага паразуменьня, а толькі – Пустату, якая замяняе Прастору. І тады ён зноў і зноў вяртае нас у пекла, якое мы ўжо ўспрымаем як звычайную вясковую лазьню сярод пыльнага быльніку і зарасьляў крапівы з павуцінаю ў прылазьніку. Як у Дастаеўскага. (Някепскае параўнаньне ў «Броўнаўскіх думках» Алега Аблажэя: *«У пекле прыбіральні будуць такія ж, як у беларускіх вёсках»*.) Сьмерць нас ужо амаль ня ўражвае: статыстыка! У Барадуліна: *«Хаўтуры ўжо, як Імяніны…»*. Ідзём далей, сваёй дарогаю. Нібыта нават наперад, а насамрэч назад і назад, да нэандэртальцаў і пітэкантрапаў.

Як у Кузьмы Чорнага: *«Ты вечна ідзі. І жадай толькі аднаго, каб было табе, куды вечна ісьці. І калі ты вернесься назад, памятай, што ты быў ужо тут. Бо калі забудзеш – тады пойдзеш назад і назад».*

Вайна пайшла ўжо зь іх вёскі. Немцаў прагналі. Але першая весьняя вызваленчая паводка зьбірала з узгоркаў і лагчынаў іх трупы і зносіла, сплаўляла ў раку Лету. Яны дабрэлі, так набракалі ад вады і цяпла, што ўзвышаліся на рачной плыні, нібы вялізныя смаленыя вепрукі.

Вясковыя падшыванцы, узброеныя аўтаматамі, пісталетамі і стрэльбамі, ладзілі паляваньне на тыя трупы. Рабілі сваю вайну, шалелі, як шалее чалавек, трымаючы сьмерць у сваіх руках. Ладзілі паляваньне на забітых ужо. Зь берагу цэлілі і стралялі па нябожчыках. І калі той ці іншы трапляў у чэрава тапельцу, адразу ж гучаў выбух. Мёртвая сіла назапашанай і непазбытай злосьцю і ярасьцю апошнім збаўляльным пракляцьцем чужой вады, зямлі і неба ўздымала труп угару. Нежывая пара разьюшана пакідала яго.

І сорам, сорам са спалохам і гідотай, а часам зь непраходным ванітаваньнем давалі таму, хто страляў, адчуваньне жудасьці і брыды сьмерці, суўдзельнасьці ў ёй – непамыснасьці і нячыстасьці да самага суднага дня.

Не шукайце адказаў на нашы праклятыя беларускія пытаньні ў лірычных скаргах на долю-нядолю і праўду-крыўду. Адказы даўно дадзены. Беларусаў напаткала Вялікая Псота. А нехта, добра ведаючы гэта, толькі выкарыстаў выпадак. Эпоха Псоты працягваецца. Тэхналёгія ўдасканальваецца. Працэс незваротны.

Можна згаджацца ці не згаджацца зь Віктарам Казьком, але дыягназ пастаўлены. Соцыюм ужо ня зьменіш, дык можа, павярнуцца да самога сябе? І зьмяніць сябе? Як тое зрабіў безыменны апавядальнік у аповесьці «Час зьбіраць косьці». Не біблійныя камяні, а менавіта косьці. Чарапы, шкілеты, труны… На якіх стаяць жылыя будынкі, пабудаваныя фабрычныя цэхі і

прыватныя гаражы. (Верш Барадуліна «На балючым праху...» пачынаецца са словаў: *«Кажуць, што дом, з вакна якога выкінулася Яўгенія Янішчыц, пабудаваны на могілках, дзе пахавана Марына Мнішак...»*. Імя і прозьвішча Марыны Мнішак хутчэй для ўзьнёслай літаратурнасьці, дастаткова і простага, а таму жахлівага: «дом... пабудаваны на могілках».) Ой, як шмат знойдзецца ў скляпеньнях нашай памяці магілаў, трунаў, трупаў!..

Мо таму мы і ацалелі, захаваліся на матухне-зямлі, што вакол нас – і ў небе, і пад нашымі нагамі, на дрэвах, якія дачасна сьсечаны, у рэках, і азёрах, і нашым колішнім моры, перасохлым моры Герадота – гэта ж трэба так: усе астатнія моры ацалелі, а нашае перасохла?! – на зорках у далёкім космасе столькі згубленых і загубленых нашых душ. Столькі іх, пяшчотных, самаахвярных і трапяткіх, гатовых заўжды ахвяраваць сабой у нас пад нагамі, пад нагамі нашых ворагаў і чужынцаў. І нават у кожным з нас.

Час выяўляе ня толькі фізычную працягласьць нашага зямнога існаваньня, але і акцэнтавана акрэсьлены індывідуальны спосаб перажываньня чалавекам сьвету. Ёсьць рэальны час сьвету самога па сабе і ёсьць рэальны чалавечы час як сфэра эмацыянальных перажываньняў і інтэлектуальных экспэрымэнтаў.

У творчай прасторы Алеся Разанава пануе лінейны час, які стралою імчыць да мэты. Той стралою, якая, паводле апорыі старажытнагрэцкага парадаксаліста Зянона, у кожны асобны момант знаходзіцца ў тым ці іншым пункце ў нерухомым стане, якую досыць лёгка зафіксаваць з дапамогаю лічбавага фотаапарата вэрсэту, вершаказу, зномы, квантэмы, пункціраў. Яго інтэлект небеспадстаўна здаецца «чыстым», амаль пазбаўленым якой-небудзь асабовасьці. Аднак час у яго паэтычнай сыстэме пачынае свой адлік з моманту маленства: *«Там – пачатак. Там – вытак»*. Такім чынам эмацыйная энэргія закладваецца ў міжрадкоўе, у міжслоўе, у фонасэмантыку. Гэта першачас, прамова і прападзеі рацыяналістычнай мадэлі разанаўскага паэтычнага космасу. Ягоны сон пра Залаты век.

Алесь Разанаў – і гэта лёгка заўважаецца ў яго тэкстах – у працэсе адстароненага ад усяго зямнога палёту шукае цэнтар, у якім канцэнтруецца звышсэнс быцьця. Ён кожнае імгненьне гатовы да развароту вакол зямной восі:

Звон зазваніў:
прастора
займела цэнтар.

Аднак, у адрозьненьне ад часу, адзінага, цэласнага, мэтанакіраванага, прастора зь яе трыма вымярэньнямі на вачах распадаецца на мноства рэчаў і прадметаў, якімі перапоўнены вершаказы паэта, бы напрасткі запазычаных зь любой старонкі слоўніка. Бадай, няма такога слова, якое не выклікала б ва ўяве Разанава фаервэрк сэнсаў, фарбаў, гукаў, адценьняў, нюансаў.

Гэта, аднак, Разанаў, а не машыны, бяздушныя мэханізмы, з размовы дзьвюх маладзіц *«выхоплівае кавалкі»*, а з багацьця і шматстайнасьці навакольнага сьвету – *«возера ў акупунктуры», «у каласах зярняты – сьлязінкі», «за шклом вітрыны файныя кубачкі», «дол у жалезе, у срэбры траву»*... Жыцьцёвыя рэаліі, убачаныя зоркім вокам паэта, можна пералічваць бясконца: сотні гадоў ня хопіць, каб ахапіць усю стракатую карціну сьвету, дзе ўсё поўніцца сэнсам і значэньнем і ўсё нагадвае пра веліч і харство Божага твору (*Павеяла прахалодаю: шле рака прывітаньне; Коціцца і бразгоча па бруку бляшанка: вясткуе буру; Ну хоць бы хто зачапіў!.. Ля сьцежкі шыпшына ў шыпшынінах перасьпелых; Парушаны мур. Упарта трымаюцца камяні за даўнюю веліч; «Так даўно цябе не было!..» Сьцяблінка выжальваецца лістку; Хапаецца за каменьне бурлівы ручай: няўжо я ўжо дабег да мора?!*). Проста і мудра, мудра і проста!

БАБСКІ БУНТ

У прамым сэнсе наўрад ці варта гаварыць пра «ружовыя раманы» і «дамскую прозу» ў беларускім кантэксьце. Папулярнае чытаньне, баевікі, дэтэктывы, маскульт – гэта для расейскамоўных. Нешматлікія тэксты, у якіх цепліцца дух

фэмініcтычнага руху, таму выразным доказам. Жаночыя яны, аднак, толькі на павярхоўны погляд, а насамрэч і кансэрватыўныя, і патрыярхатныя, і, ёсьць падазрэньне, што чытаюць гэтыя тэксты жанчыны, якія пераступілі парог «бальзакаўскага веку». Жаночая спэцыфіка і жаночая праблематыка выяўляюць прыкметнае намаганьне аўтараў узысьці на гендэрныя вышыні і хоць бы гэткім чынам сьцьвердзіць сур'ёзнасьць сваіх намераў і выказаць свой пратэст.

«Бабскі бунт», уражліва апісаны Шолахавым ва «Ўзьнятай цаліне» і Галавачом у «Спалоху на загонах», у нашых умовах, падобна, хутчэй тлее, чым сьпее. Дзесьці на пэрыфэрыі сучаснай літаратуры блукаюць, як купалаўскія відмы сярод балотных агнёў, раманы Таісы Бондар («Гульня ў падкіднога»), аповесьці Зінаіды Дудзюк («Славянскія князі»), апавяданьні Раісы Баравіковай («Вока Сусьвету»). Дасьледчыца любоўных раманаў Джэніс Рэдуэй вывела наступную іх формулу: «...любоўны раман паказвае, што жанчына павінна навучыцца давяраць свайму абраньніку і не сумнявацца ў яго глыбокай любові, нават маючы перад сабою велізарную колькасьць сьведчаньняў аб адваротным... Разьвязка раману абяцае, што, навучыўшыся добра разумець мужчынскія паводзіны, яна выявіць, як яе патрэба ў бацькавай апецы, матчыным клопаце і страснай любові будзе задавальняцца ідэальным чынам». Любоўны раман, на думку Рэдуэй, з'яўляецца своеасаблівым трэнажорам, які дае магчымасьць жанчыне ўявіць сябе ў адпаведнай сытуацыі і канструяваць самастойна ідэальную мадэль паводзінаў.

Маналёг жанчыны, несумненна, выклікае чаканьне псыхалягічных адкрыцьцяў і лірычнай споведзі. Нейкую эмацыйную інфармацыю раўнівае мужчынскае сэрца сапраўды атрымлівае для свайго самасуцяшэньня. Міраслава Навіш не навічок у жанры споведзі: запомнілася яе небеспадстаўнае імкненьне вымераць бязьмернае, вырваць у маўклівай прыроды таямніцу эрасу, зразумець мову каханьня ў апавяданьні «Ёсьць мера любові». Мера ў бязьмер'і ўжо ўражвае.

У апавяданьні з шматзначнай – і псыхалягічнай, і маральнай, і

філязофскай, і, зразумела, гендэрнай – назвай «Адна» распрацоўваюцца, як у музыцы, «варыяцыі на тэму» любоўных пакутаў, сардэчных горкіх перажыванняў, ствараецца атмасфэра ружовых нэасэнтымэнтальных крозаў. Плынь сьвядомасьці, дзеля зручнасьці разьбітую на асобныя фрагмэнты эсэістычнага характару, лірычная гераіня, яна ж і наратар, прысьвячае пакутам літаратурнай творчасьці. Пакуты гэтыя, прадыктаваныя пачуцьцём незадаволенасьці сабой, адсутнасьцю водгуку на сардэчныя парывы, здобранай сарказмам зайздрасьцю да посьпехаў пісьменьнікаў-мужчынаў, адразу выдаюць іх паходжаньне сваёй «жаночай лёгікай». Там, дзе мужчына паставіў бы кропку, жанчына абавязкова ўдакладняе: *«Я хацела б аднойчы раніцай забыць гэтае імя. Проста забыць»; «Прыгожая (абавязкова!) брунэтка. Ці бляндынка»; «У залежнасьці ад настрою мяняюць прычоскі. У залежнасьці ад настрою мяняюць спадніцы, прынамсі іх даўжыню. У залежнасьці ад настрою чытаюць кнігі».*

Эстэтычнае пачуцьцё і пэўныя ўрокі творчых паводзінаў падказваюць аўтарцы, што паўторы пачынаюць нагадваць сапсаваную кружэлку, калі цяжка адолець стыхію эмоцыяў, і яна выкарыстоўвае ўсечаную фразу, пазбаўленую дзеясловаў ці займенькаў. Эротыка падносіцца дазавана, з дапамогаю фігураў умаўчаньня і паэтыкі дастаткова празрыстых намёкаў на інтым. Стэрэатыпнасьць вобразна-стылёвай структуры «жаночай прозы» навідавоку. Ратуе задуму Міраславы Навіш уменьне перадаць жывое адчуваньне сучаснай беларускай жанчыны ва ўмовах драматычнай дэмаграфічнай сытуацыі і дзікай побытавай неўладкаванасьці, пра што ў навэлі сказана намёкамі, і гэта добра.

Псыхалёгія творчасьці сьцьвярджае, што натхненьне патрабуе душэўнага супакою і раўнавагі. Аднак Навіш неаднаразова дэманструе сваё пераконаньне ў тым, што раздражненьне, сьвядомая кплівасьць у адносінах да жаночага і мужчынскага роду, да «рамантыкаў-няўдачнікаў», «інтэлігентаў-філёлягаў», «інтэлектуалак», «ахвяраў дыетаў», «хворых на фрайдызм» таксама здольныя натхняць на свой лад. Заадно адпадаюць усе трывіяльныя прэтэнзіі магчымых крытыкаў, накшталт таго, што ўсё тлумачыцца элемэнтарна, няхай сабе і груба: «жанчына

камплексуе», «узрост клімаксу» і інш. Фабула аповеду іншая, і аўтарка маналёгу-плыні не хаваецца: *«Жанчына шукае Мужчыну Жанчына кахае Мужчыну Жанчына жыве без Мужчыны Жанчына ідзе да Мужчыны»*.

Выдатная, хоць і сьвядомая, гэтая адсутнасьць знакаў прыпынку. Але гераіня і гэта заўважае, сьпяшаючы растлумачыць, які сэнс нясуць у сабе розныя знакі прыпынку, зразумела, не фармальна-школьны. Фабула набывае адваротнае адлюстраваньне: *«Мужчыну шукае Жанчына Мужчыну кахае Жанчына Без Мужчыны жыве Жанчына Да Мужчыны ідзе Жанчына»*. Падрабязнасьці мала што дадаюць да вобразу гераіні, але сярод іх мільгаюць сьвятлячкамі поўныя сымболікі паняцьці і катэгорыі, добра знаёмыя філёзафам: *імя, я і ня-я, ты, ён, ёсьць, няма, час, мова каханьня, самота*. Калі ёсьць *фабула*, то мусіць быць і *выснова*. Вось яна: *«Не чытайце жаночых раманаў, мужчыны: так неспадзеўку можна стаць рыцарам. Не чытайце жаночых раманаў, жанчыны: хэпі-энду ўсё роўна няма»*. Апавяданьня Навіш гэта не датычыцца.

А ці трэба так сур'ёзна аналізаваць «дамскі раман»? Ці мае ён наагул якія-небудзь адносіны да культуры і літаратуры? Якія такія гендэрныя праблемы ён уздымае і якія сацыякультурныя калізіі вырашае?

Выбар, у параўнаньні з рынкам расейскамоўнай маскультуры, не вялікі. Аднак варты ўвагі як з пункту гледжаньня сацыялягічнага, так і эстэтычнага.

Да «высокай» мастацкай літаратуры, несумненна, адносяцца навэля Марыі Вайцяшонак «Восень мая доўгая...» і яе ж апавяданьне «Прэзэнтацыя, або адценьні навальніцы». Жанравая прыналежнасьць «разьведзена» не выпадкова: у навэлі адзін-два эпізоды, два-тры пэрсанажы, але эмацыйна-інтэлектуальная насычанасьць аповеду надзвычайная. Магчыма, таму што само быцьцё лірычнай гераіні ў вёсцы Грыдзькі на Пастаўшчыне на самоце, у горадзе ў чаканьні, калі нарэшце аб'явіцца сяброўка Паўліна, тая, якая «заўсёды ў зоне доступу», як наэлектрызаванае. У эпіцэнтры жаночай душы інтымныя дачыненьні, любоўныя гісторыі, *«рэстарацыі, курорты, чужыя таямнічыя лецішчы і ружы... касмэтолягі і*

розныя спа… масаж… забарона пытацца ў прыгожай жанчыны, як яна сябе адчувае». А яшчэ – словы самой навэлісткі – *«містыка любові», «ноч каханьня», «тое, чаго даўно ня мае дома», «мантра», «легенды».* Дыстанцыя паміж наратарам і пэрсанажам, да якой (у навэлі гэта Паўліна) адрасуецца маналёг наратара, забясьпечвае давер да мройлівага фону і прыкметнай рамантызаванай умоўнасьці сытуацыі.

Апавяданьне, па сутнасьці, – працяг навэлі: тая ж удумлівая інтанацыя, скрушны настрой, разуменьне ўсяго і ўсіх і – адзінота. І жаданая, і нежаданая адначасова. Бо столькі ўсяго адразу ў думках і на душы: дзіцячыя беды, дарослы клопат, восеньскае самаадчуваньне, здань нябыту, падкрэсьленая занядбаньнем вёскі, яскравымі галасамі вясковых цётак і дзядзькоў, «якія нас пакідаюць». І дзіўныя, тым больш што дзіцячыя, шчырыя і наіўныя:

– Чаму даўно не заходзіла да мяне? – пытаюся ў маладой дзяўчыны.

– У цябе так многа кветак, я думала… нечым будзе дыхаць…

– У тваім садзе ўвесь час сьпявае салавей. Ён табе не перашкаджае?! – пытаецца другая.

– Салавей? Перашкаджае? Чаму?

– Ну… гэта такая незвычайная, асаблівая птушка… – адказвае.

Спробы мужчынаў у жанры «жаночага раману» расчароўваюць. Магчыма, гэта пакуль што выпадковасьць. Шматстаронкавы аповед «зязюлі» пад назваю «Кручонікі й сын мой» Франца Сіўка – аўтара колішняга выдатнага «Ўдога», які нават я, невялікі цяпер заўзятар мастацкае прозы, з захапленьнем чытаў, – па-мужчынску строгі, нават жорсткі месцамі, хаця маналёг пра сваё жыцьцё-быцьцё прамаўляе жанчына. Такая ў яе выдалася пляніда. Вядома, імітацыя споведзі «пад жанчыну»: *«любошчы, ловы шчасьця, пакуты – што ні абыходзіць людзтву…».* Нягледзячы на замах на большае, на апэляцыю да

людзтва, аповед пра Кручонікаў, нехлямяжых мужычынак, непрыкаяных шукальнікаў «учарашняга дня», якія зьмянялі адзін аднаго і зьбягалі, не жадаючы мець клопату з хваравекаватым інвалідам Паўлікам, якому маці-«зязюля» шукае «бацьку», здаецца спрошчаным. Зашмат падштурхоўваньня чытача да роздуму пра лёс хлопчыка і замала рэальнага багацьця жаночай душы, пра якое можа распавесьці хіба сама жанчына. Проза вымагае ня проста адной, няхай сабе і генэралізуючай у сюжэце, думкі, а менавіта думак пра паўнату жыцьця.

Генэтычную сувязь зь дзявочымі сшыткамі і альбомамі, дзе ўсё пра адно і тое ж, а менавіта «пра любоў», з куды больш сур'ёзнымі і аналітычнымі жаночымі дзёньнікамі лёгка заўважыць у аповесьці Сяргея Рублеўскага «Спавядальныя дні ў чужым горадзе». Аўтар, мужчына, пераўвасабляецца ў асобу супрацьлеглага полу, жанчыну сярэдніх гадоў, якой ужо ня трэба траціцца на апісаньне дзявочых сардэчных кіданьняў з надзеі ў адчай і якая добра ведае цану сабе, нарэшце адшуканаму каханьню. Усё ў аповедзе працуе на стрыжнявую думку Вольгі, якая едзе ў Нямеччыну да мужа з трывогаю за яго жыцьцё. Ейны Андрэй, выкладчык па кантракце ў ліцэі, трапіў у жудасную аўтамабільную аварыю і ляжыць у коме ў шпіталі. У аўтара няма патрэбы апісваць замежную экзотыку, стэрэатыпныя ўяўленьні «саўка» пра закардонны рай, бо ён дакладна ўлічвае душэўны стан сваёй гераіні, якая жыве страхам за лёс мужа і ў хвіліны, калі застаецца сам-насам, ажыўляе ў памяці ва ўсіх інтымных падрабязнасьцях сумеснае зь ім жыцьцё, зорныя імгненьні. У тэксьце нямала прыгожых, ня бог ведае якіх глыбокіх, сэнтэнцыяў, народжаных вопытам працяглага сужыцьця ў сям'і.

Калі жанчына перапоўненая каханьнем, яно, нібы шыпучы напой, перабягае цераз край душы: любіш увесь белы сьвет – і кусьлівую жамярынку, і мятліка, і, вядома, лю-дзей.

…каб трымацца Божага пляну, як ні дзіўна, трэба занурыцца і ў першаісны грахоўны затулак, да дна выпіць атруту жарсьці і праз свайго адзінага ці адзіную палюбіць усіх бліжніх. Як сябе,

і нават больш таго – як яго ці яе.

Жанчыне амаль адразу адкрылася: апроч як пра каханьне, больш ні пра што гаварыць Андрэю яна ня можа, усё астатняе – пустыя дробязі.

Фінал аповесьці вытрыманы ў клясычнай традыцыі дзявочага мэлядраматычнага стылю, хаця і зьмікшыраванага «мужчынскай» стрыманасьцю: *«Праз колькі хвілінаў дзьверы шырока расчыніліся, і ў праёме зьявілася разгубленая, са сьлязьмі на вачах Моніка. Сястрыца і падумаць не магла, што Вольга ўжо ўсё ведае пра простую лінію на дысплэі, якая незваротна закрэсьлівае надзею»*. Каханьне на фоне сьмерці і сьмерць на фоне каханьня – гэта да скону часоў будзе прыцягваць увагу чытачоў.

ЯК НЯВЕХНЯ Ў НЯРОДНАЙ СЯМ'І

Андрэй Хадановіч мог бы, пры зьбегу акалічнасьцяў, стаць някепскім расейскамоўным паэтам-бардам. Але ня стаў. Ці не захацеў. Лепш быць першым хлопцам «на дзярэўні», чым апошнім у Тамбове. У нейкі шчасьлівы момант, калі зоркі сышліся ці адбыўся парад плянэт, ён зразумеў, што сапраўднае, лёсавызначальнае (ужывём лексыку часоў перабудовы) адбываецца ў сфэры беларушчыны, гвалтам адсунутай на пэрыфэрыю сацыякультурнага жыцьця нацыі. Што беларуская прасодыя не такая саветызаваная, як расейскамоўная стыхія, якой хапае хіба толькі для перадачы інфармацыі ад беларуса да беларуса, аднак вельмі мала, каб адчуць душэўную цеплыню простых чалавечых стасункаў. Што беларускае слова ўжо паводле свайго прызначэньня апазыцыйнае, як і сама паэзія, якая ня можа ня быць не ў апазыцыі да любога, нават самага дэмакратычнага, рэжыму.

Пытаньне, наколькі шчыры і пасьлядоўны гэты рух у бок беларускага слова, якое ўжо сотні гадоў пачуваецца, кажучы словамі Максіма Багдановіча, «як нявехня ў няроднай сям'і». Наколькі глыбока асабістае гэтае рашэньне ўзяць бок

прыніжаных і пакрыўджаных, без чаго, дадамо, няма сапраўднага пісьменьніка, быць ня з тымі, хто топча нацыянальную ніву, а з тымі, хто дбайна яе даглядае. Катэгарычны імпэратыў «жыць не па лжы», аб прыхільнасьці да якога Хадановіч поўнагалоса заявіў у сваіх першых зборніках, адразу надаў яго ў асноўным іранічна-карнавальнай лірыцы маштаб грамадзянскасьці. Прынамсі, сам ён досыць хутка адчуў, асабліва пасьля сыходу Васіля Быкава і ад'езду Алеся Разанава за мяжу, адсутнасьць на літаратурным Парнасе фігуры нацыянальнай велічыні, наагул разрэджанасьць паветра на вяршыні і наяўнасьць азонавых дзірак. Гаворка не пра асабістыя амбіцыі, а пра агульнанацыянальныя задачы.

Урэшце Андрэй Хадановіч заняў месца, як я гэта ўяўляю, недзе паміж Р. Барадуліным і А. Разанавым. Зноў жа гаворка не пра ганаровую лесьвіцу на Парнас, а пра імкненьне быць бліжэй да пакаленьня 20–30-гадовых, спалучаць у сваёй творчасьці простанароднае і інтэлігенцкае, дыянісійскае і апалянічнае. На гэтую нішу прэтэндуюць многія, але найбольш шанцаў яе заняць усё ж у Хадановіча. Ён і паэт, і перакладчык, і выкладчык, і бард, і «шчыры беларус». На месца паэта агульнацыянальнага замаху мог прэтэндаваць Анатоль Сыс, але ён ня вытрымаў цяжар шырокай любові і вялікай адказнасьці за свой талент. Думаю, што яму ў гэтым, калі помніць пра злавесны вопыт савецкіх часоў, дапамаглі.

Вядома, добра было б мець адпаведную біяграфію ахвяры альбо піярыць сябе на ўсіх скрыжаваньнях. Але ці не залішне шмат у гісторыі беларускай культуры ахвяраў, каб дадаваць да іх новыя? Прэтэнзіі на большае, чым можаш, таксама небясьпечныя, бо лёгка страціць сябе, калі «талент друзіцца на пыл» (Якуб Колас). Пісаць «у шуфляду», разьлічваць на тое, што «рукапісы не гараць» і што «самі ўсё прынясуць і аддадуць», таксама не даводзіцца. Таленту, гэтага Божага дару, таксама недастаткова, каб нешта зрабіць для беларусаў.

Чытаючы леташнія публікацыі, і вершаваныя, і эсэістычныя, Хадановіча, пачынаю смутна падазраваць, што паэт знаходзіцца на разьвілцы.

будуеш замкі з паветра і першы блін
выходзіць нечым сярэднім між бібліятэкай і вежай
на гэтым сьвеце так многа кніг і цаглін
а ты з усіх акадэмій ня скончыў нават мядзьведжай.

і можна згубіцца ў трох дарожных слупох
і ў думках так ціха – чуваць як робіцца муха
сланом і ты так доўга ў дарозе што Бог
здаецца сузор'ем Вялікага Віні-Пуха

А што далей? Іронія, гульня, пэрформансы, прапаганда і агітацыя за беларускую ідэю – выдатны спосаб утрымаць хаду падзеяў на мяжы прорвы, захаваць настроі веры і надзеі, якія пакрысе падмяняюцца ў нашым соцыюме адчаем і цынізмам. Але душа прагне большага. Эпоха таксама кідае выклік, і на яго трэба адказваць. Зрэшты, гэтая задача стаіць непадступнаю скалою ня толькі перад Хадановічам. Пакуль што ён шукае, і шукае куды больш актыўна, чым іншыя: у «небе над Бэрлінам», у «папрыцы зорак», у «восені на вогнішчы», у «эўрапейскай пясочніцы». Хто шукае, той заўсёды знаходзіць.

Скідай дарэмны багаж,
нашто валачыць каменьне,
калі ў загашніку гаш,
калі ў займеньніку меней
за ймія, няверны Тамаш,
ці варта помніць найменьне?

НЕДАРОСЬЛІКІ

Напрыканцы гэтага ці то агляду, ці то нагляду («вачыма злодзея», як у Казька, з намерам, а што тут у вас можна ўкрасьці) некалькі назіраньняў над тэкстамі маладых. Менавіта тэкстамі, бо тэкстаў можа быць багата, а вось творчых знаходак, трапных выказваньняў, запамінальных радочкаў і ў клясыкаў раз-два і аблічыўся. Прычым гаворка не пра дзіцячыя сакрэты, не пра школьны фальклёр і не пра падлеткавую субкультуру, а пра ўваходжаньне новага пакаленьня, пакуль

што «недаросьлікаў» ва ўсіх сэнсах і адценьнях, у сьвет «дарослай» літаратуры. Сучаснай беларускай літаратуры пачатку трэцяга тысячагодзьдзя.

Пэрыяд, калі бумбамлітаўцы распавядалі страшныя гісторыі, прыдумлялі дзіцячыя трылеры з «расчлянёнкай», разыгрывалі малаэстэтычныя пэрформансы, старанна прыхоў-ваючы сапраўдны парадыйны зьмест сваіх «тэкстаў», здаецца, мінае. Апошнія адгалоскі ўзроставай хваробы адгучалі пазалетась у літаратурна-мастацкім праекце «Тэксты» і летась у падборцы Зьмітра Вішнёва і ў аповедзе «Фільмы» Ільлі Сіна. Сэнс гэтага своеасаблівага рытуалу юнацкай ініцыяцыі заключаецца ў тым, каб, хоць у фантазіі, пазбавіцца ад рэальных кашмараў паўсядзённага бытаваньня «ў краіне цудаў», перажыць разам з патэнцыяльнымі чытачамі, слухачамі і гледачамі «пустыя страхі» і нарэшце адолець іх сумесна.

К павольна пакрочыў праз вэстыбюль, са зьдзівам аглядаючы яго амаль люстраныя сьцены. Гэта вялікае прастакутнае памяшканьне з высокай столлю, асьветленае шматлямпавай жырандолью ў форме вычварнай дзесяцігаловай жамярыцы. Наўпрост пад ёй вакол уласнае восі круціцца трупік немаўляці – магчыма нават сапраўдны. К пасьлядоўна адлюстроўваецца ў кожным зь люстэркаў. Ён не сьпяшаецца. І не хавае зьдзіўленьня.

– Вот, мля, лахоў зь дзярэўні панаехала, – нягучна сказаў ахоўнік, унурыўшыся ў сваё сьпід-інфо.

К шпульнуў у яго выпадкова знойдзенай у кішэні лімонкай, і амбалу адарвала нагу. Усё яшчэ зьдзіўляючыся харaству інтэр'еру, хлопец пашкандыбаў далей.

Магчыма, гэта выкінуты ў сьметніцу кінасцэнар бясконцага расейскага сэрыялу пра «брыгаду» ці «спэцназ». Магчыма, гэта згублены друкапіс нашчадка Франца Каўкі і казачніцы пра Зьмея Гарыныча. Адно несумненна, што гэта пратакольны запіс ранішняга сну тынэйджара, які і ў свае 30 гадоў застаўся дзіцем.

Сьпяць і мышкі, і стрыжы, сьпяць машыны ў гаражы, сьпяць трохвокія монстры, сьпяць супэрмэны і сэкс-сымбалі нацыі, сьпіць, падклаўшы пад галаву ватоўку, Біл Гейтс, і тая заўсёды шчасьлівая бляндыначка, і бялявы хлопчык, які верыць у свой жыцьцёвы посьпех...

Чытаючы мастацкія тэксты, міжволі ўслухоўваесься ў «гул мовы», які сьведчыць «аб шуме спраўнай работы», каб выявіць «сэнс, які трапечацца ў гэтым гуле», і пачуць артыкуляваны ў моўных структурах «голас быцьця» (Ралян Барт). У гэтых тэкстах блукае прывід гіпэртэксту.

Несумненна, што сучасная гарадзкая цывілізацыя і навакольнае асяродзьдзе нясуць у сабе зусім рэальныя пагрозы жыцьцю і што наш сьвет не зьяўляецца насамрэч «найлепшым з сусьветаў». Аднак несумненна і тое, што на гэты сьвет можна глядзець і іншымі вачыма. У нашу літаратуру ідзе «новая хваля», пакаленьні цяперашніх падлеткаў і юнакоў, якія прытрымліваюцца нармальнай мастацкай традыцыі і арыентуюцца на клясыку. Ня толькі нацыянальную, але і сусьветную. У гэтага пакаленьня іншае стаўленьне да мовы, чым у непасрэдных папярэднікаў. Адчуваецца, што выпрацоўка ўласнай вобразнай мовы і сучаснага стылю мысьленьня даецца яго прадстаўнікам цяжка. Аднак гэта ўжо ўсё-такі норма, а не паталёгія. Гэта пакуль што першы кволы праменьчык у перадранішні міг.

У ліцэйскім зборніку вершаў Ванькі Булвы з нашаніўскай назвай «Мая праўда» ёсьць верш «Малітва па Літаратуры і Мастацтве», дзе рыфмуецца ледзь ня ўвесь тэзаўрус сусьветнай літаратуры, які трэба вывучыць, каб здаць экзамэн. А вось як выяўляецца гэтае магутнае ўзьдзеяньне сусьветнай традыцыі на ўласныя творчыя досыць сур'ёзныя спробы і практыкаваньні самога Ванькі Булвы:

У хуткасьцях пагоні эстэтычнай
Жыцьцёвых вартасьцяў пазбыўся сьвет.
Жанчына, нацягнуўшая карсэт,

Бязьлітаснаю стала і цынічнай
Ў адносінах да Гані, бо камічна
Глядзіцца сёньня формаў яе квет.
Напэўна, мая Ганечка бязь бед
Жыла б ў абшчыне палеалітычнай,
Дзе кожны правадыр усё душой
Хацеў убачыць яе жонкаю сваёй.
Іначай быць ня можа, не паверу.
І мо мне ўяўленьня не стае,
Але вось толькі падаецца, што зь яе
Рабілі Вілендорскую Вэнэру.

Чамусьці ў цяперашніх маладых паэтаў і празаікаў дзея часта адбываецца ў мэтро. Павал Анціпаў распавядае розныя вусьцішныя гісторыі, якія здараюцца ў менскім мэтрапалітэне. Як, напрыклад, у навэлі «Калі ласка, пакіньце вагоны», дзе апавядаецца пра бабулю, якая стала пастаяннай жыхаркаю мэтро, ператварылася ў мэтропрывід, бяскрыўдны, прыгаломшаны бядой. Бабуля прыехала ў сталіцу наведаць унучку Ганначку, якая жыла непадалёк ад станцыі «Магілёўская», але заблукала. Чорны тунэль, грымучы цягнік, патойбочны голас у мікрафон, зьменлівы натоўп людзей, абыякавых да бабулі, і ёй ужо заставалася толькі падпарадкоўвацца невядомаму Голасу, які час ад часу загадваў пакінуць вагоны, ізноўку садзіцца на цягнік, каб ехаць далей. Мэтрапалітэнаўцы даўно ўжо прывыклі да бабулі, падкормліваюць яе, і яна ў іх накшталт сына палка.

У вершы Ярыны Дашынай «Думкі ў мэтро» сугестыя пачуцьця сягае ўзроўню кленічаў і замоваў:

Ведаю, чым гэта скончыцца:
ад безвыходнасьці скурчыцца
месяц, і цемра абрушыцца,
і цалкам Сусьвет аглушыцца...

Стаю над Пустэчаю нейкаю
з падфарбаванымі вейкамі,
з падфарбаванымі слушнымі

думкамі вэнэушнымі.

Мне да прыпынку канечнага,
самага небясьпечнага,
ад станцыі Незалежнасьці
да станцыі Непазьбежнасьці...

Нягледзячы на зьнешнюю прастату формы, лексыкі і стылю, разрыў з традыцыяй у маладых больш радыкальны, чым у непасрэдных папярэднікаў бумбамлітаўцаў. Аспрэчваць ім ужо няма каго пасьля таго глябальнага перагляду, амаль астрожнага шмону, які зьдзейсьнілі перад імі іншыя. Ім ужо не абавязкова, як старэйшым і сьмялейшым, петушыцца сваёю авангарднасьцю і непадабенствам да традыцыяналістаў. Падчас чытаньня гэтых, зразумела, кволых па думцы і неадгабляваных па форме радочкаў першае, што прыходзіць у голаў: беларуская літаратурная традыцыя разьвіваецца дастаткова натуральна і пасьлядоўна. Прынамсі, тут шмат карыснай інфармацыі ня толькі для сацыёлягаў і культуролягаў.

Я адзімую. І вар мой выбеліцца.
І люты ў вочы заселіць век.
Ты – вязень, шыбенік.
Я – краты, шыбеніца.
Дзяўчына-кат.
Дзяўчына-зьдзек.
(Яраслава Ананка)

Ты баісься?
Я – баюся.
Ты ня верыш?
І я – не.
Ў нашай вольнай Беларусі
Кожны дзень, як на вайне!
(Антаніна Курдзя)

Гэта іншае мысьленьне, іншая мова – мова ня толькі страху перад сьветам, але і мова любові да гэтага сапраўды страшнага, але ж і чароўнага сьвету. У час першай рэакцыі літаратуры,

якая вызвалялася ад савецкай дагматыкі, натуральна, пераважала адштурхоўваньне, у час «новай хвалі», якая прыняла эстэтыку, выяўленую ў радку «простыя словы, простыя рэчы», на першы плян прыйшло менавіта прыняцьце гэтага сьвету, якім ён ёсьць насамрэч. Эстэтыка, як выдатна, на ўсе часы і для ўсіх асобна і разам, сказаў Ніцшэ, – будучая этыка. Мы жывём у час, калі ідэалізм – стваральны. Безь яго цяпер, як без паветра, як пісаў у сваім дзёньніку Жылка.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/02/19**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

Пётра Рудкоўскі Як Пазьняк стаўся закладнікам Гісторыі

ПЁТРА РУДКОЎСКІ філёзаф, багаслоў; законьнік дамініканскага кляштару ў Кракаве. Яго апошняя публікацыя ў «ARCHE» выйшла пад назвай «Ад ідэнтычнасьці да саборнасьці. Пару зацемак з нагоды дыскусіі вакол беларускай тоеснасьці».

Пазьняк, Зянон. *Гутаркі з Антонам Шукялойцем*. – Варшава: Беларускія ведамасьці. Вільня: Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, 2003.

Пазьняк, Зянон. *Беларуска-Расейская ВАЙНА. Belarus is an eastern outpost*. – Варшава: Беларускія ведамасьці. Вільня: Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, 2005.

«Я ніколі ня ўзяў ад ураду Амэрыкі ніводнага цэнта». Інтэрвію зь Зянонам Пазьняком на радыё «Свабода». 2005. 17 траўня.

Пазьняк, Зянон. *Прамаскоўскі рэжым.*

Пазьняк глядзеў далей і бачыў болей.
Зрэшты, так яно і мае быць.
Сапраўдны апостал праўды і справядлівасьці
заўжды апераджае час.

Васіль Быкаў

К финишу Позняка последовательно привела
внутренняя политическая логика. (...)
Его просто-напросто забыли.

Павел Якубович

«Апостал праўды» ці «вычарпаны палітык, пра якога папросту забыліся»? Яго ідэі «апераджаюць час» ці, наадварот, яны адсталыя, застыглыя і дагматычныя? Яго палітычная думка здольная трансфармаваць Беларусь і вызваліць схаваны патэнцыял беларусаў ці можа толькі спарадзіць новыя падзелы і ўнутраную дэзынтэграцыю?

Базуючыся на чатырох працах Зянона Пазьняка, паспрабуем высьветліць, якая прэфілязофія стаіць за ягонымі (геа)палітычнымі поглядамі, якая сыстэма каштоўнасьцяў прапаноўваецца бацькам сучанага беларускага адраджэньня, наколькі яна ўнутрана зьвязная і ці магчымы на яе базе грамадзкі кансэнсус.

ГІСТОРЫЯ КОНТРА ГІСТОРЫЯ

Хвалебны тытул «апостал праўды», нададзены Пазьняку не абы-кім, а вялікім Быкавым, можа быць зразуметы, калі глянем на Пазьняка як на ахоўніка гістарычнага быцьця беларускага народу. Пазьняк – гэта Вялікі Наратар, гістарыёзаф і прапаведнік. Пад яго пяром – ня літары, а малюнкі, у яго працах – не фактаграфія, а агіяграфія, на яго вуснах – не беларускі народ (з малой літары – звыклы мэнтальны канструкт), а Беларускі Народ (зь вялікай літары – нязвыклы рэальны арганізм). Пазьняк па-майстэрску *канкрэтызуе* Беларусь, робіць яе аб'ектам досьведу, а нават больш: аб'ектам жаданьня!

Як адбівалася палітычнае жыцьцё Вільні на студэнцкім жыцьці, на ўнівэрсытэце? (...) Ці былі якія выкладчыкі, якія б спрыялі беларушчыне? (...) Калі б студэнт тэалёгіі пайшоў бы на цэнтральна-польскі ўнівэрсытэт, то па заканчэньні ён меў бы

права вярнуцца на Віленшчыну, ці не?

Гэта – з арсэналу пытаньняў, якія Пазьняк задае свайму суразмоўцу ў кнізе «Гутаркі з Антонам Шукелойцем». Фармальна Пазьняк тут выступае ў ролі карэспандэнта, рэальна – у ролі заўзятара-шукальніка, кагосьці, хто «аднойчы знайшоўшы, усьцяж шукаць павінен».

«Гутаркі...» даюць магчымасьць глянуць на гісторыю Беларусі ХХ стагодзьдзя (перадусім трагічных 1930-х і 1940-х гадоў) скрозь прызму біяграфіі аднаго выбітнага беларускага дзеяча, кіраўніка Беларуска-амэрыканскага задзіночаньня, згаданага ўжо А. Шукелойця.

Шукелойць нарадзіўся і выхоўваўся ў Заходняй Беларусі. Этап яго высьпяваньня і фармаваньня самастойнай пазыцыі прыпаў на пэрыяд польскага панаваньня. Чым ён, гэты пэрыяд, быў спэцыфічны для фармаваньня беларускае нацыі?

Тады ў Барунах – расказвае спадар Шукелойць пра выпадак са свайго раньняга дзяцінства – быў адзін зь ведамых беларускіх дзеячаў, ксёндз Міхал Пятроўскі такі. Дык вось гэты ксёндз Пятроўскі, выступаючы, кажа: «Слухайце, у нас, дай Бог, каб каровы штогод цяліліся, якога тут уцяленьня гэтыя палякі хочуць ад нас».

У словах ксяндза Пятроўскага няма агрэсіі, ёсьць адно толькі бескампрамісны мірны сыгнал «мы – гэта мы». Гульня слоў «цяліліся» – «уцяленьне» (ад польск. *wcielenie* – інкарпарацыя) дазваляе адчуць сілу *простага* (прастамоўнага) беларускага гумару, а сам зварот, які мае форму *антытэтычнага паралелізму* зьмяшчае пасланьне: мы дастаткова моцна скансалідаваныя *нашым* свойскім парадкам, каб надоўга супрацьпаставіцца ўсякім «уцяленьням». Вось ён, першы спэцыфічны момант – у конадзень далучэньня Сярэдняй Літвы да Польшчы сярод беларусаў існаваў даволі моцны *кансэнсус* наконт захаваньня сваёй адметнасьці.

«У маёй хаце ня пшыкаць! Тут трэба гаварыць папросту»

– гэты ляпідарны загад прагучаў з вуснаў дзеда Антона Шукелойця.

«Панская Польшча», аднак, ня раз прымушала плаціць несправядлівую даніну за гэтае свабодалюбства. Вельмі красамоўнымі зьяўляюцца пэўныя асаблівасьці перапісу насельніцтва ў 1930 годзе, у які сам Шукелойць, будучы яшчэ гімназістам, быў заангажаваны:

А загадана было запісваць так: каталік, гаворыш пацеры па-польску – паляк. Мова ня важная. Ня мае значэньня, на якой мове гаворыш. Гэта была афіцыйная польская ўстаноўка.

Зьліцьцё канфэсіі і нацыянальнасьці надоўга застанецца спэцыфікай мэнтальнасьці каталіцкага насельніцтва паўночна-заходняй Беларусі. Ясна было – і тады, і цяпер – што адзінай, бадай, сілай, здольнай «разарваць» гэтыя два паняцьці, ёсьць беларускае нацыянальна сьведамае духавенства. Але

На Багаслоўе не прымалі нікога, хто запісаўся беларусам. Вось, напрыклад, Папуцэвіч (такі ведамы дзеяч), ці як тут у Амэрыцы – Пануцэвіч. Ён два гады быў на тэалёгіі, вельмі добра скончыў філязофію, але выявіў сябе беларусам (...). Яго рэктар сэмінарыі паклікаў і кажа: «Ты гэтага рабіць ня можаш. Калі хочаш, мы ня маем да цябе ніякіх засьцярог, пераносься ў Цэнтральную Польшчу і там будзеш мець магчымасьць стаць сьвятаром».

Ну, а ведама было, што «перанясеньне» ў якуюсь цэнтральна-польскую сэмінарыю мела свае праўныя наступствы. Клерык (будучы сьвятар) ставаўся ў такім выпадку «інкардынаваны» да тае дыяцэзіі, на тэрыторыі якой знаходзілася сэмінарыя, гэта значыць, практычна ня мог ужо вярнуцца на Віленшчыну, каб працаваць сярод беларусаў.

Уся гэтая стратэгія асыміляцыі беларусаў праз пасярэдніцтва

Каталіцкага касьцёлу будзе жыўцом перанесена польскім духавенствам на Гарадзеншчыну і стасавацца напрыканцы XX – пачатку XXI ст. «Ліміт беларускасьці», які нефармальна абавязвае ў Гарадзенскай дыяцэзіі ўвогуле і духоўнай сэмінарыі ў прыватнасьці, надалей даволі эфэктыўна блякуе трансфармацыю сьвядомасьці заходнебеларускіх прастамоўных каталікоў.

Польская правіца пасьлядоўна і жорстка «дысцыплінавала» нацыянальна сьвядомых і палітычна актыўных беларусаў. Беларускі (а таксама літоўскі і ўкраінскі) «казус» стаўся цёмнай плямай польскага *risorgimento*. А гэта таму, што ў польскім вызвольным руху *жыцьцяносны* элемэнт (адраджэньне свайго народу) сышоўся са *сьмерцяносным* элемэнтам (паглынаньне іншага этнасу). Для некаторых палякаў асымілятарская праца становіцца ці не адзінай крыніцай пачуцьця ўласнае вартасьці. «Паглынаньне» іншага, больш слабога этнасу часьцяком больш захапляе, чым якаясь звыклая, штодзённая праца для павелічэньня дабрабыту свайго народу.

Такім чынам, сьведамыя беларусы натуральным чынам гравітавалі ў левым кірунку. Сам Шукелойць – жывы прыклад беларуса-левака ў практыцы і тэорыі:

Мяне цікавілі ўсе левыя кірункі, пачынаючы ад анархістаў. Бакуніна чытаў, Маркса «Капітал» прачытаў у 5-й клясе гімназіі недзе, першы том яго. (...) Для мяне быў найбліжэйшы сялянскі сацыялізм. І ён меў, паводле нас, традыцыю. Гэта Каліноўскі, браты Луцкевічы, Грамада і гэтак далей...

І гэта – левая афарбоўка – ёсьць чарговым спэцыфічным момантам беларускага нацыястанаўленьня на заходнім абшары Беларусі. Усьведамленьне гэтага моманту мае немалаважнае значэньне для фармуляваньня сучаснага беларускага праекту. Гісторыя Беларусі хавае ў сабе гуманныя і сьветлыя варыянты сацыялістычных і сацыял-дэмакратычных ідэяў, якія могуць стацца альтэрнатыўнымі ў стасунку да дэструктыўных у этычным пляне традыцыяў савецкай лявіцы, якія так старанна берагуцца і культывуюцца беларускімі ўладамі сёньня.

Беларуская небальшавіцкая лявіца характарызавалася высокім узроўнем грамадзянскай і чалавечай салідарнасьці. Шукелойць расказвае, што калі польскі нацыяналіст ксёндз Вуйціцкі, стаўшы рэктарам у 1937 годзе, увёў асобныя лаўкі для габрэйскай моладзі ў Віленскім універсытэце, сябры Беларускага студэнцкага саюзу дэманстратыўна сядалі разам з габрэямі на адных лаўках.

Пазьней, у гады нямецкай акупацыі, салідарнасьць з пакрыўджанымі станецца праграмным пунктам Беларускай незалежніцкай партыі, якая прадугледжвала – поруч зь беларусізацыяй – «усюды, дзе толькі можна, памагаць жыдам. Калі можна, дапамагаць ім пераходзіць на арыйскія дакумэнты, дапамагаць дзецям, выцягваць з гета і гэтак далей».

Беларускае адраджэньне было, як бачым, пазначана лёгікай павагі да *іншасьці*. Прагматычная ўстаноўка – выкарыстоўваць любы момант на самаадраджэньне і эмансыпацыю – непарыўна была зьвязана з высокамаральнай устаноўкай: адраджаць сябе безь знішчэньня таго, што родзіцца (або жыве) побач.

З «Гутарак...» даведваемся шмат рэчаў: пра шляхетнага немца, загадчыка аддзелу культуры ў Менску, які ня толькі быў абаронцам беларускай культуры, але і адкрыта выступаў супраць перасьледу габрэяў, пра Саюз беларускай моладзі, Беларускую Цэнтральную Раду, аднаўленьне беларускай Аўтакефаліі, багата пра гісторыю БНР і інш.

Гэтыя гісторыі – часьцяком вельмі падрабязна (і займальна) расказаныя Шукелойцем – ня будзем тут пераказваць. Важна нам тут будзе зьвярнуць увагу на некаторыя *інтэрпрэтацыі* падзеяў, якія падаюцца з вуснаў Зянона Пазьняка.

У тым месцы, дзе Шукелойць распавядае пра напружаньне паміж Беларускай Цэнтральнай Радай (створанай напрыканцы 1943-га немцамі) і БНР, Пазьняк робіць такую ўстаўку:

На першы павярхоўны погляд выглядае, што немцы тады рабілі тое самае, што цяпер рускі КГБ і АБСЭ зь немцам Гансам Вікам на чале зрабілі на Беларусі. Яны раскалолі Беларускі

незалежніцкі рух.

Іншы момант, які выяўляе гістарыцысцкі-наканавальніцкі спосаб мысьленьня Пазьняка:

Дрэнны час на сьвеце. Дэмакратыя перажывае агульны ідэйна-маральны крызіс. Ідзе працэс дэградацыі каштоўнасьцяў. (Бо лібэралізм – гэта не дэмакратыя. Гэта, ведаеце, як ракако, дакладней, як маньерызм у мастацтве, калі рэнэсанс вырадзіўся ў маньерызм.)

Ці лібэралізм – гэта этап дэградацыі дэмакратыі і ці наагул можна храналягічна разьмяркоўваць гэтыя дзьве зьявы, застаецца вельмі праблемным пытаньнем. Пытаньне, што было перш: дэмакратыя ці лібэралізм, ёсьць пытаньнем вельмі падобным да іншага вядомага: што было перш: яйка ці курыца? Ці з дэмакратыі «вылупіўся» лібэралізм, ці наадварот, лібэральная думка, якая цягнецца ад старажытных грэкаў Дэмакрыта і Пэрыкла, спарадзіла дэмакратыю ў сучасным разуменьні слова?

Для Пазьняка, аднак, існуюць тры розныя рэчы: дэмакратыя (са знакам плюс), лібэралізм (са знакам мінус) і адвечная бэрлінска-маскоўская змова супраць беларусаў (якая мае амаль дэманічны характар).

Гэтыя «тры знакі» ўтвараюць аснову Пазьняковай мэтадалёгіі: усякія падзеі і праекты ў дыскурсе Пазьняка набываюць адпаведныя «знакі» (станоўчы, адмоўны або дэманічны) у залежнасьці ад таго, у якой блізіні ці сваяцтве з вышэйназванымі аксіялягічнымі канструктамі яны знаходзяцца. Дэмакратыя безь лібэралізму, а Беларусь па-за сфэрай уплываў Масквы і Бэрліна – вось галоўны маральны і адначасова палітычны пасыл Зянона Пазьняка. Пад першым (дэмакратыя безь лібэралізму) мог бы спакойна падпісацца Аляксандар Лукашэнка (яго інвэктывы кшталту «нэалібэральны тэрор» нават пераўзыходзяць пазьнякоўскую антылібэральную рыторыку), а што да другога (маскоўска-бэрлінскае змовы),

дык Пазьняк добра месьціцца ў традыцыі «прынцыповага недаверу» і культываваньня вобразу ворага. Апавяданьне Пазьняка пра раскол БНФ як вынік дзеяньня вонкавых варожых сілаў да болю нагадвае спосаб апавяданьня афіцыйнай прапаганды пра развал Савецкага Саюзу. І тут, і там галоўным інтэрпрэтантам падзеяў зьяўляецца прымітыўная катэгорыя: «змова».

Нельга, аднак, рабіць з гэтага выснову, што Пазьняк – гэта «альтэр-Лукашэнка» альбо наадварот, як гэта робяць некаторыя паважныя публіцысты кшталту Шарамета, Фядуты, Хадыкі. Прыведзеныя вышэй аналёгіі паказваюць адно толькі акцыдэнтальныя супадзеньні, але не адлюстроўваюць сутнасьці ідэйнай і палітычнай пазыцыяў аднаго і другога. Пазьняк пры ўсім яго эўраскептыцызьме і схільнасьці апэраваць паняткам вонкавага ворага застаецца вялікім філянтропам, які верыць у Бога і ў чалавека, якому ўласьціва здольнасьць думаць у катэгорыях *bonum commune*. Высокая этычная адчувальнасьць Пазьняка вельмі кантрастуе з этычным нігілізмам сёньняшняй беларускай улады.

Адзначаныя супадзеньні, аднак, па-свойму павучальныя. Пазьняк у сваіх ацэнках рэаліяў залежны ад гісторыі, і то не абы-якой гісторыі, а Вялікай Гісторыі Вялікага Народу, якая пішацца «пад дыктатам сэрца». Менавіта таму падзел БНФ у 1999 годзе на кансэрватыўнае і лібэральнае крыло ёсьць для Пазьняка нечым большым, чым звычайным сацыялягічным фактам. Гэты падзел явіцца для заснавальніка Фронту як чарговы пасьпяховы праект антыбеларускай маскоўска-бэрлінскай кааліцыі, які месьціцца на той самай лініі, што і палітыка Тэўтонскага ордэну, падзел Рэчы Паспалітай і бальшавіцкая ды нямецкая акупацыі. Тымчасам, калі глянуць на зьяву больш спакойна, то нялёгка заўважыць «банальнасьць» гэтага падзелу: польская «Салідарнасьць» ці літоўскі «Саюдзіс» яшчэ раней распаліся на некалькі (часьцяком пасвараных паміж сабой) фракцыяў. Ад самага пачатку была відаць ідэйная і сьветапоглядная неаднароднасьць Фронту, таму больш трэба дзівіцца, што ён падзяліўся так позна, чымсьці бедаваць, што ён наагул падзяліўся. Ды і сам Пазьняк у свой час сьцьвярджаў прагматычную мэтазгоднасьць такога па-дзелу, зазначаючы:

навошта, каб адна частка Фронту паралізавала другую частку. Хай лепей будзе «двухкрылы» канфэдэратыўны Фронт.

Зянон Пазьняк, застаючыся вялікім адкрывальнікам і ахоўнікам важных старонак беларускай гісторыі, застаючыся магутным голасам беларускай бяды (і ў гэтым – станоўчы бок яго харызмы), сам у пэўны момант становіцца закладнікам гісторыі. Гаворка не ідзе пра *гісторыю падзеяў*, а пра *гісторыю беларускіх прагненьняў і спадзяваньняў*. Пазьняк адчуў сябе акумулятарам гэтых прагненьняў і, адчуўшы, ужо ніяк не хацеў прызнаць магчымасьці іншых, альтэрнатыўных гісторыяў, напісаных трохі інакш або іншым колерам. Лепш зразумеем гэты парадокс, калі больш пільна прааналізуем макраканцэпт «Беларусь» у дыскурсе Пазьняка.

МАКРАКАНЦЭПТ «БЕЛАРУСЬ»

Да нядаўняга часу думаньне і распавяданьне пра Беларусь было «заінфэктавана» ці то мэтафізыкай нацыянальнай ідэі, ці то савецкай ідэалёгіяй. Дарэчы, тут трэба зрабіць немалаважную праўку: калі ў выпадку нацыянальна-мэтафізычнага падыходу можна яшчэ гаварыць пра *думаньне* (праўда, малакрытычнае), то ў выпадку савецкай ідэалёгіі *думаць* пра Беларусь зусім не прыходзілася.

Сёньня да мэтафізычнага і ідэалягічнага дыскурсаў пра Беларусь дадаецца яшчэ навуковы. Адразу ж нехта можа зацеміць, што ніякі дыскурс зь біркай «навуковы» насамрэч ня вольны ані ад мэтафізыкі, ані ад ідэалёгіі. Каб дакладна разгледзець гэтую праблему, трэба было б напісаць асобную працу, таму абмяжуемся тут толькі прапановай прыняць у якасьці рабочай *тэзу аб узаемаперакрыжоўваньні* ідэалёгіі, мэтафізыкі і навукі, а адкінуць тэзу – як занадта радыкальную і кантравэрсійную – аб тоеснасьці: навука = ідэалёгія або навука = мэтафізыка.

На месца мэтафізыкі і ідэалёгіі прыходзяць сёньня больш «строгія» мэтадалёгіі ў дасьледаваньні беларускай гісторыі, самасьвядомасьці жыхароў Беларусі і беларускай тоеснасьці. Пачынае дамінаваць фэнамэналягічны, эмпірыцыстычны і

нэамарксісцкі (не заінфэктаваны савецка-ленінскай дагматыкай) падыход. Гэтыя дасьледаваньні выяўляюць такія асаблівасьці беларускай культуры, як *памежнасьць* – перасяканьне ў яе абсязе розных этнічных, моўных і рэлігійных субкультураў, *інтэрфэрэнцыя* – узаеманакладаньне розных культурных плыняў, *дыфузія культурных формаў* (размытасьць) і *«хваляваньне»* – чаргаваньне «прыліваў» і «адліваў» з Усходу і з Захаду. (Апошняя асаблівасьць выяўлена яшчэ Абдзіраловічам.) Добрай падагульняльнай мэтафарай беларускай рэчаіснасьці ёсьць славуты Акудовічаў «Архіпэляг Беларусь».

Зянона Пазьняка мала хвалююць усякія спробы фэнамэналягічна-эмпірычнага апісаньня беларускай рэчаіснасьці. Ён застаецца артадаксальным спадкаемцам мэтафізычнай традыцыі. Георг Гэгель, Фэлікс Канэчны, Карл Шміт, Сэмюэль Гантынгтан – вось «далёкі філязафічны кантэкст» спосабу мысьленьня Пазьняка. А «блізкі кантэкст» утвараюць такія беларускія навукоўцы і мысьляры, як Мікола Ермаловіч, Леанід Лыч, Мікола Крукоўскі.

«Мы на самым краі Хрысьціянства» – цытуе Пазьняк Міколу Гусоўскага і пазначае, што пад словам «Хрысьціянства» трэба разумець «эўрапейскі лад жыцьця». Як кожнаму народу «на краі», беларусам наканавана было (і наканавана цяпер) змагацца з чужароднай стыхіяй, іншай, варожай цывілізацыяй. З кім канкрэтна? Аб гэтым ясна гаворыць сам назоў кніжыцы «Беларуска-расейская вайна» з ангельскамоўным дадаткам пад назовам «Belarus is an eastern outpost».

Беларусы гістарычна прайгралі гэтую вайну. Прайгралі перш за ўсё таму, што ніхто ў Эўропе не зразумеў яе як сваё змаганьне ў абарону эўрапейскай культуры. Эўрапейскай салідарнасьці хапіла тады хіба што на Крыжовыя паходы. Беларусь у асобе Вялікага Княства Літоўскага была тады адна перад Ардой і сапраўды, як пісаў Гусоўскі, на краі Хрысьціянства.

Гэтае выказваньне добра выяўляе спэцыфіку Пазьняковай мэтафізыкі. Яна грунтуецца на ідэі *antemurale christianitatis*

(«перадмур'е Хрысьціянства»), ідэі, якой кармініся і кормяцца розныя польскія мэсіянскія ідэалёгіі. Пазьняк здолеў у беларускай гісторыі знайсьці вялікага хаўрусьніка гэтай ідэі – Міколу Гусоўскага, што чыніць яе «сваёй», гістарычна прысутнай у культурным генакодзе беларусаў. Ці сапраўды аказіянальны тэрмін «мы» ў выказваньні Гусоўскага адносіцца да ВКЛ (а не да Польска-Вялікакняскай Уніі, узятай у цэлым), і ці сапраўды ВКЛ і Беларусь – тоесныя, застаецца тут па-за дыскусіяй. Дыктат амбітнага беларускага сэрца цьвердзіць: беларусы – адвечныя абаронцы Хрысьціянства, то бок, «эўрапейскага ладу жыцьця», то бок, абаронцы самой Эўропы.

Важна ў вышэйпрыведзеным выказваньні Пазьняка заўважыць інтэнцыю скантраставаць Беларусь і астатнюю частку Эўропы: у той час, як першая займалася шляхетнай справай – абаронай Хрысьціянства перад ардоўскімі і расейскімі «нехрысьцямі», тая займалася арганізоўваньнем ганебных Крыжовых паходаў, дэ-факта кампрамэтуючых Хрысьціянства і Эўропу. Беларусь, такім чынам, явіцца ня толькі як ратавальнік эўрапейскай цывілізацыі ад пагрозы звонку, але таксама як унутраны гарант захаваньня гэтай цывілізацыі ў яе «здаровай» вэрсіі. Можна сказаць, Беларусь – гэта Эўропа са знакам якасьці (што было б люстраным адбіткам вядомай з афіцыйнай прапаганды ідэі: «Беларусь – гэта Расея, толькі са знакам якасьці»).

Вялікае Княства Літоўскае, Вільня выступілі на той час у якасьці абаронцаў і зьбіральнікаў усіх усходнеславянскіх земляў. Вялікае Княства зрабілася збройнай, палітычнай і культурнай сілай на ўсходзе Эўропы.

«Беларусі гісторыяй, часам і становішчам наканавана быць лідэрам усходнеславянскай цывілізацыі», – казаў спадар Лукашэнка на ідэалягічным сэмінары ў 2001 годзе. Гэтае чарговае супадзеньне ізноў жа ня сьведчыць аўтаматычна пра «роднасьць» Пазьняка і Лукашэнкі, аднак паказвае, у якой небясьпечнай блізкасьці знаходзіцца мэтафізычны дыскурс да дыскурсу палітычнай прапаганды. Адно вельмі лёгка можа перайсьці ў другое.

Цывілізацыйную вайну, як лічыць Пазьняк, Беларусь *гістарычна* прайграла. Але не прайграла цалкам. У будучым Беларусь *можа* выйграць гэтую вайну, калі выкарыстае дадзеныя ёй гісторыяй шанцы, а нават *павінна* выйграць, згодна з аб'ектыўнай хадой гісторыі (тут варта адзначыць факт суіснаваньня ў дыскурсе Пазьняка дзьвюх вэрсій гістарыязофіі – «актывістычнай» і «дэтэрміністычнай»).

Этапам гістарычнага поступу Беларусі ў кірунку здабыцьця страчанай тоеснасьці (быцьця *antemurale christianitatis* і зьбіральнікам усходнеславянскіх земляў) ёсьць паўстаньне БНФ «Адраджэньне».

Канцэпцыя Беларускага Нацыянальнага Адраджэньня грунтуецца на народнай гісторыі. Без каранёў нічога доўга не існуе. У беларусаў, як у мала каго іншага, ёсьць магутны гістарычны грунт – іхная вялікая дзяржава, якую яны страцілі ў канцы XVIII стагодзьдзя ў выніку міжнароднай змовы і наступнай затым расейскай акупацыі

– піша Пазьняк у тэксьце «Прамаскоўскі рэжым». Бэнэдыкт Андэрсан выставіў тэзу, што «нацыі – гэта ўяўленыя супольнасьці». У арганізоўваньні групы людзей у нацыю на першы плян выходзіць *visio* – візія, бачаньне гэтай групы як аднаго цэлага. І тут нельга абысьціся без рэтравізіі, цэльнага і зьвязнага бачаньня мінулага дадзенай супольнасьці. Патрэбна такое бачаньне, якое здольнае будзе спарадзіць *пачуцьцё арганічнасьці*, цэльнасьці, еднасьці.

«Без каранёў нічога доўга не існуе», – кажа Пазьняк, але не заўважае, расьлінка, якая завецца нацыяй, расьце вельмі нетыпова: зьверху ўніз! Бо спачатку паўстае *ідэя, візія, уяўленьне* нацыі, а потым ужо пачынаюць расьці яе «карані», г. зн. пісаньне «нацыянальнай гісторыі», якая выконвае ня столькі інфармацыйна-пазнавальную функцыю, колькі *пэрфарматыўна-інтэгравальную* (паклікана «выканаць», «спарадзіць» пэўную гаму пачуцьцяў, якія будуць пачуцьцямі супольнымі, яднальнымі для дадзенай групы людзей).

Дзьве задачы, якія ставіць Пазьняк перад сабой і перад нацыянальна сьведамай інтэлігенцыяй, наступныя: «Вярнуць гістарычную сьведамасьць у родны дом – у Вялікае Княства Літоўскае. Наступны абавязковы этап – палітычны: вярнуць афіцыйную назву дзяржавы». Гэтыя дзьве задачы маюць маральны характар:

Калі гэтага не зрабіць – значыць, будаваць незалежнасьць на пяску, запраграмаваць шчарбатае, трэснутае грамадзтва з кволай самаідэнтыфікацыяй, поўнае супярэчнасьцяў на роўным месцы і абсурдных спрэчак па недыскусійных пытаньнях.

Асабліва насьцярожвае тут прэсупазыцыя апошняй часткі выказваньня: Пазьняк сугеруе існаваньне «недыскусійных пытаньняў» і існаваньне «абсурдных спрэчак» па гэтых пытаньнях. Якія гэта пытаньні? Пазьняк не канкрэтызуе іх, але можна меркаваць, што гэта тыя пытаньні, якія так ці інакш разбураюць макраканцэпт «Беларусь». А ён складаецца з наступных тэзаў-канцэптаў (тэзы гэтыя будуць рэканструкцыяй, г. зн. выражаныя на больш сьціслай, аналітычнай мове):

1. ВКЛ – Беларуская дзяржава.

2. Існуе адназначная ўзаемасувязь паміж гістарызмам «ліцьвін» і сучасным паняткам «беларус».

3. Мова ВКЛ – беларуская.

4. ВКЛ-Беларусь – «край Хрысьціянства».

5. БНФ «Адраджэньне» зьяўляецца ня толькі першай, але і адзінай у найноўшай гісторыі Беларусі сілай, якая здольная вярнуць Беларусі яе сапраўдную тоеснасьць.

Кожны, бадай, навуковец скажа, што вышэйпералічаныя тэзы ў найлепшым выпадку – дыскутавальныя, а ў горшым – наўпрост фальшывыя. Коратка пракамэнтуем гэтыя тэзы:

(1) Калі ведама, што ВКЛ было канфэдэрацыяй трох этнасаў –

«жмудзкага», «ліцьвінскага» і «маларускага» (назоўніцтва тут даволі ўмоўнае), то на якой падставе яго называем «Беларускай дзяржавай»? Тут сувыступаюць дзьве мэтадалягічныя праблемы, якія трэба разглядаць асобна: а) праблема накладаньня сучаснага паняцьця («беларускі») на гістарычную зьяву (ВКЛ); б) праблема інфляцыйнага ўжываньня тэрміну «беларускі»: нават калі ўдасца абараніць тэзу аб адназначнай пераходнасьці «ліцьвін – беларус», застаецца пытаньне, што рабіць са жмудзінамі і маларусамі? І тут хаваецца чарговы «парадокс Зянона», парадокс, які мае ўжо ня проста мэтадалягічны, але і палітычны і этычны характар. Праблема (б) наводзіць на думку, што ВКЛ для Пазьняка – гэта ня проста «Беларуская дзяржава», а «Беларуская Імпэрыя», дзе адна група (этнічная або нацыянальная) ажыцьцяўляе сваю ўладу над іншымі этнасамі ці народнасьцямі. Тым часам варожасьць Пазьняка да якой-кольвечы імпэрыі ўсім вядомая: «Імпэрыі не рэфармуюцца, яны разбураюцца», «Імпэрыя – гэта сусьветнае зло». Калі Пазьняк трактуе ВКЛ як імпэрыю, а імпэрыя – гэта *ex definitione* зло, то навошта яго адраджаць? А калі трактуе яе як дзяржаву трох раўнапраўных суб'ектаў, то на якой падставе Беларусь мае прыўлашчваць назву ВКЛ? Цалкам магчыма, што пад абсалютысцкай этыкай Пазьняка хаваецца рэлятывісцкая тэза: усякая імпэрыя – нядобрая, апрача імпэрыі беларускай, або: усякая імпэрыя – добрая, апрача небеларускай.

Тэза (2) ня менш праблемная. Па-першае, трэба спачатку высьветліць, ці «ліцьвін» – гэта этнонім ці ўсё ж палітонім. Ці назва гэтая ўказвае на этнічную прыналежнасьць, ці на прыналежнасьць да пэўнае дзяржавы (ліцьвін = абывацель Вялікага Княства Літоўскага). Цалкам магчыма, што «ліцьвін» у розных кантэкстах выступае ў розных значэньнях. Па-другое, у любым выпадку застаецца праблемным пытаньне, ці існуе адназначная пераходнасьць паміж «ліцьвінам» і «беларусам». Валер Булгакаў у свой час паказаў на прыкладзе Ф. Багушэвіча наяўнасьць «пасярэдняга зьвяна» ў ланцугу этнакультурнай трансфармацыі, магчымасьць такой сытуацыі: «памёр» ліцьвін, але яшчэ «не нарадзіўся» беларус»[1]. Такім чынам, можна сказаць, што вялікакняскі ліцьвін уяўляе сабой «матэрыю» ў стасунку да розных «формаў»: ён можа стацца беларусам, літоўцам, украінцам, палякам, расейцам. Гістарычны ліцьвін –

гэта не беларус, а протабеларус («патэнцыйны беларус»), проталітовец («патэнцыйны літовец»), протаўкраінец і г. д. Можна прыняць тэзу аб «дыспазыцыйнай няроўнасьці», г. зн., што «ліцьвін», які гаварыў на беларускай гаворцы, больш «дыспанаваны», каб стацца беларусам, чым літоўцам ці ўкраінцам, але нельга прымаць *тэзу аб наканаваньні*. Мэтафізычная тэза аб адназначнай пераходнасьці ліцьвіна ў беларуса (а тым болей аб іхнай тоеснасьці) ёсьць толькі доказам жывучасьці дэтэрміністычнага мысьленьня.

(3) Канцылярская мова ВКЛ нідзе, бадай, у гістарычных крыніцах не называецца беларускай. Гэта, канечне, яшчэ не падстава лічыць, што яна такой не была. Адна і тая ж зьнішак можа «абслугоўвацца» рознымі назвамі (*магла* існаваць беларуская мова, не называючыся «беларускаю», гэтак сама як у старажытнасьці існавала эстэтыка, не называючыся «эстэтыкай»). Тым ня менш, адсутнасьць назвы спарадкае неабходнасьць апраўдваць і абгрунтоўваць права *ex post* называць канцылярскую мову ВКЛ беларускай. Вось яна падаецца, што справа з гэтым абгрунтаваньнем не такая простая. Нарвэскі навуковец, знаўца гісторыі балцкіх і славянскіх моваў Хрыстыян Станг выявіў шматварыянтнасьць афіцыйнай мовы ВКЛ. Ад часоў Міндаўга да Вітаўта гэтая мова была пазначана ўплывам валынскіх гаворак, у другой палове XV стагодзьдзя пачынаюць дамінаваць уплывы паўночна-валынскіх і паўднёва-беларускіх дыялектаў, пад канец XV і ў першай палове XVI стагодзьдзе далі аб сабе знаць гаворкі зь берасьцейска-наваградзкага рэгіёну і толькі ў другой палове XVI канцылярская мова значна «зьбеларусела», г. зн. паменшала колькасьць стараславянскіх элемэнтаў, зьніклі паўночна-валынскія рысы, а пачаў дамінаваць уплыў цэнтральнабеларускіх гаворак. Тым ня менш, ад пачатку (XIII стагодзьдзе) і да канца (XVII стагодзьдзя) «матрыцай» заставалася стараславянская мова. Вобразна кажучы, стараславянская мова, ужываная ў ВКЛ, была як «вяхотка», якая ўвабрала ў сябе многія элемэнты тагачаснай беларускай мовы, але гэтая «насякнутасьць» не зрабіла яе яшчэ беларускаю.

Тэза (4) можа быць прынята толькі пры прыняцьці спасылкі, што праваслаўе не зьяўляецца хрысьціянствам. У гэтым

1. Булгакаў, Валеры Францішак Багушэвіч: чытаем спачатку // Літаратура і мастацтва. 1998. 31 ліпеня.

выпадку статус «недыскутавальнай» трэба надаць, хутчэй, тэзе супрацьлеглай: на ўсход ад ВКЛ таксама ёсьць Хрысьціянства.

Праблема, аднак, у тым, што Пазьнякова бачаньне расейскага праваслаўя заінфэктавана яго спрошчанай мэтадалёгіяй, асноўныя рысы якой называліся раней. Праваслаўе ёсьць адно толькі элемэнтам імпэрскай палітыкі Расеі, як гэта вынікае з даўняга, зь першай паловы 1990-х гадоў, тэксту Пазьняка «О русском империализме и его опасности». Цалкам падобны падыход можна заўважыць у права-кансэрватыўных літоўскіх публіцыстаў, прыкладам, гісторык Стасіс Маziляўскас сьцьвярджае функцыянальную тоеснасьць камуністычнай ідэалёгіі і расейскага праваслаўя.

Такі падыход, які нагадвае мэнтальнасьць з часоў «рэлігійных войнаў», ніяк ня ўпісваецца ў хрысьціянскую тоеснасьць. Супрацьпастаўленьне хрысьціянства хрысьціянству – гэта нехрысьціянскі занятак.

(5) БНФ не бяз рацыі можна лічыць адкрывальнікам новай старонкі ў беларускім адраджэньні. Роля кансэрватыўнага крыла БНФ і сёньня, і заўтра будзе напэўна вялікая. Тым ня менш, упартая прэтэнзія на манаполію ў справе нацыянальнай ідэі і татальная крытыка ўсяго і ўсіх, што навокал, могуць паспрыяць адно толькі большай самаізаляцыі гэтай партыі (альбо, як хоча яе лідэр, *сілы*) і дэзынтэграцыі грамадзтва.

У папярэднім разьдзеле мы сказалі, што Пазьняк стаўся закладнікам Гісторыі. Падагульняючы гэты разьдзел, можам сказаць нешта падобнае, толькі ўва ўзмоцненай вэрсіі: Пазьняк стаўся *ахвярай* чараў Беларусі. Беларусь для яго – гэта *anima*, якая – згодна зь Юнгам – носіць рысы Дзявіцы і Маці. Пазьняк доўгі час мусіў жыць у напружаньні, спароджаным адчуваньнем сталай пагрозы для яго шляхетнай душы і чыстага сумленьня з боку амаральнай савецка-гэбісцкай таталітарнай махіны. Кожнаму ясна, якую моц мела гэтая махіна і колькі душаў і сумленьняў яна зьнішчыла. Пазьняк у гэтым змаганьні за сумленьне і за веру застаўся самім сабой, але гэтае змаганьне пакінула пэўны сьлед: у яго сьвядомасьці (або падсьвядомасьці) «зрасьліся» тры вобразы – Сталін – КГБ – Расея. Гэты

«трохгаловы» цмок увесь час пагражаў яго тоеснасьці, але вось напрыканцы 1980-х, пачатку 1990-х яму давялося перажыць нечаканы трыюмф над «цмокам»: разваліўся СССР, Беларусь здабыла незалежнасьць, а дзякуючы яго доўгагадовай працы беларускае грамадзтва і міжнародная супольнасьць даведаліся пра мэтадычнае зьнішчэньне людзей на тэрыторыі Беларусі ў час сталінскага тэрору.

Псыхічная энэргія (*лібіда* ў юнгаўскім значэньні) скіравана цяпер на абарону Беларусі, гэтаксама як раней яна была скіравана на абарону сваёй душы. І тут маем справу з чарговым «парадоксам Зянона», гэтым разам экзыстэнцыйным парадоксам. Пазьняк перастаў адрозьніваць сваю душу ад калектыўнага суб'екту (Беларусі), што спарадзіла *псыхічную інфляцыю*, успрыманьне самога сябе як «звышчалавека», а гэта прывяло да ўзросту прэтэнзіяў на адзіна праўдзівую інтэрпрэтацыю падзеяў, спарадзіла няздольнасьць да кампрамісаў і кааліцыяў, хранічную падазронасьць і інш. Тым часам Беларусь складаецца не з адной Пазьняковай душы, а з многіх душаў, якія маюць свае біяграфіі і маюць права па-свойму, інакш перажываць беларускасьць.

* * *

Пазьняка можна параўнаць зь біблійным Самсонам, які дзякуючы надзвычайнай сіле аднаасобна перамагаў у бітвах зь філістынцамі, але ў пэўны момант згубіў сваю сілу з-за жанчыны. Моцны Пазьняк, які маральна перамог КГБ і савецкую сыстэму, страціў моц, «нелегальна» атаясаміўшы сваю душу зь Беларусьсю.

Вось такую псыхааналітычную гіпотэзу можна запрапанаваць для выясьненьня «парадоксаў Зянона». Такім чынам, і Быкаў, і Якубовіч, сказаўшы, на першы погляд, цалкам супрацьлеглыя рэчы, у значнай ступені абодва маюць рацыю: Пазьняк сапраўды быў «апосталам праўды», быў Самсонам, але «яго прывяла да фінішу ўнутраная палітычная лёгіка», лёгіка, якая патрабуе мастацтва *ўзаема*дзеяньня, і выключае практыкі *аднаасобнага* дзеяньня.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/19
[image]

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

Даніла Жукоўскі крытык літаратуры, аб’ект нападак і злосьці беларускіх пісьменьнікаў сярэдняга пакаленьня.2

Вылоўліванне ідэй з паветра

Балахонаў Сяргей. *Імя грушы*. – Менск: Логвінаў, 2005.

Бацюкоў Аляксей. *Уся праўда пра горад Бобер* // ARCHE. № 3. 2005.

Бацюкоў Аляксей. *А я думаў, у нас сын*.

Паветрам ёсць усё, што прыпадабняецца да пустога, адкрытае погляду ад самае зямлі аж да Месяца, і з яго бярэцца жыватворны дух. І дзеля таго, што яно вільготнае, у ім лётаюць птушкі – гэтак жа, як рыбы плаваюць у вадзе. У паветры жывуць дэманы, якія чакаюць пакараннуў Страшнага суда.

Gonorius Augustodiensis. Imago Mundi

Літаратура па вылоўліванні ідэй з паветра надзвычай багатая, традыцыя занятку неймаверна старая, але менавіта апошняя з вышэйпрыведзеных *думак* аўтарытэтнага даследчыка найбольш каштоўная для нашай тэмы. Бесцялесныя духі-ідэі чакаюць, каб іх вылавілі, бо ўрэшце, што жахлівае можа іх спаткаць у параўнанні з апошнім выракам? Ідэі гатовыя быць вылаўленымі, а можа – хто ведае – каторыя самі палююць на паляўнічых.

Вялікая небяспека для духаловаў, якія, захапіўшыся думкаю старадаўняга эрудыта, пашырылі спакуслівую аналогію і прыраўналі рыбалоўства і духалоўства. Рыбаку найважней выцягнуць рыбіну, духалову – правільна пакарыстацца здабычаю. Нездарма гэтулькі вядомых і ’шчэ больш ананімных аўтараў папярэджвалі пра неабходнасць асцярожнага ды прадуманага абыходжання з духамі й дакладнага фармулявання сваіх жаданняў.

Закінуўшы нерат, набраў Сяргей Балахонаў усяго, што трапілася, і памногу. Атрымаўся, так бы мовіць, поўны кош з верхам, і зверху, безумоўна, ляжыць лексіка. Тут неабходна зазначыць, што першасна пісьменнік з Гомеля мае рацыю. Сапраўды, той пласт словаў і граматычных канструкцый, які адкрыўся для шырокага карыстання пасля перабудовы, уражвае і прыцягвае. І не віна Насовіча, Ластоўскага ці Станкевіча, што выкарыстанне тое зусім не шырокае, але гэты папрок адрасуецца каму заўгодна, толькі не аўтару «Імя грушы». Колькасць экзатычных выразаў бянтэжыць, іхняя стракатасць абцяжарвае, карыстаючыся той жа стылістыкаю, «чытацкія глузды», і толькі праз пэўны час прыходзіць разуменне, што тут нешта не так. І слушна. У кнізе Балахонава намеры ўлову маюць не меншы ўплыў на вынік, чым уласныя намаганні аўтара.

Па-першае, не зусім зразумела, навошта гэтак шчыльна насычаць тэкст экзатызмамі. Калі гэта архаізацыя, задума відавочна мінаецца з мэтаю, бо выбраныя аўтарам словы адбіваюць хутчэй шмат у чым аўтарскую лексіку Ластоўскага і Станкевіча, чымсьці асаблівасці беларускае пісьмовае мовы сярэдзіны XIX ст. Немагчыма патлумачыць лексічны анахранізм

памылкаю, бо раней Сяргей Балахонаў дэманстраваў веданне асаблівасцяў беларускага пісьменства розных эпох. Эклектычны збор экзотыкі павінен мець нейкую мэту, але якую? Хутчэй за ўсё, толькі адну: прэзентацыі «пакрыўджаных» слоў і «рэабілітаванай» граматыкі.

Незразумела таксама, чаму, задэкларавáўшы дзве часткі з трох як пераклады ўспамінаў (з расійскае і польскае моваў), аўтар не паклапаціўся надаць тэкстам адпаведных рысаў. Стылізацыі пад расійшчыну і пальшчызну не адбылося, а мэта, імя перакладчыка й час перакладу засталіся па-за кадрам, хаця гэткім шляхам можна было б прывязаць да тэксту вышэйапісаныя шчодрыя запазычанні са слоўнікаў-«дысідэнтаў» XX ст., стылізаваўшы яго пад твор эмігранцкага паходжання.

Апошняя частка аповесці, напісаная як успаміны маладой жанчыны, пераемніка патаемнае паганскае традыцыі, носьбіта высокае і таемнае паганскае веды, парадавала б Власта, але абсалютна незразумела, навошта Балахонаву ствараць гэткую звышэкзатычную гераіню. Яна не робіць нічога, чаго б не магла зрабіць жанчына больш шараговая, а вось пытанні наконт верагоднасці існавання кагосьці, хаця б трошкі падобнага да Ірэны Галавацкай, застаюцца, як тая стрэмка. Неабавязковыя для развіцця сюжэту моманты падкрэсліваюць сціпласць сюжэтных ліній, рассейваюць напружанне інтрыгі, падкопваюцца пад створаную з намаганнямі візію. Навошта памнажаць існасці сабе на шкоду?

Тлумачэннем (але не адказам!) можа быць завялікая канцэнтрацыя нявыкарыстаных ідэй у паветры, якім дыхае сп. Балахонаў. Літаратурнае наша «паветра» нагэтулькі перапоўненае несправядліва выштурхнутымі ў забыццё ідэямі, што ім сапраўды цяжка дыхаць. А як цяжка спыніцца, калі ў нядбала кінутым нераце трапечуцца ў цеснаце рыбіскі, а вакол віруе ў сто разоў больш! Вось толькі найбуйнейшыя з вылаўленых неасэнсаванасцяў: разнастайнасць літататурнае беларускае мовы, вялізны і занядбаны абсяг лексікі; побач тыпова урбаністычны матыў «чорнага Менска»; паганская спадчына Беларусі; масонства; містычна-чарнакніжная

традыцыя – ад кабалістаў і суфіяў да праваслаўных старцаў, каталіцкіх экзарцыстаў і народных знахараў; загінулая беларуская кніжнасць – ад філосафаў ды алхімікаў да забытых паэтаў і палітыкаў, канспіралогія і крыптагісторыя ў адным флаконе.

Нерат спадара з Гомеля хутка перапоўніўся, а выпусціць частку здабычы не хапіла цвёрдасці (бо, як пісалася вышэй, цалкам верагодна, што выгнаннікі ў паветра з радасцю лезуць у сеткі, стаміўшыся бясчыннасцю). Дзеля гэтага ў аповесць убілася столькі ідэй-зародкаў, што большасць не мела аніякіх шанцаў для годнага выяўлення і развіцця; «свабодныя канцы» тырчаць з сюжэтнага клубка, і гэта не робіць твор прыгажэйшым. Пад гэткім ціскам нявыказанага якая спроба стылізацыі можа мець поспех? Стылізацыя грунтуецца на адборы, на селекцыі, на бязлітасным адкіданні несуладнага, ашчадным ужыванні непазнавальнага.

Хто і навошта сабраў разам тры сведчанні пра таямнічыя падзеі ў губернскім Менску? Адкуль узялася аўтарка трэцяе часткі і, як высвятляецца, галоўная гераіня аповесці? Хто ўсё ж-такі ёсць галоўным героем? Вывераныя дасціпныя ўдакладненні анічым не зашкодзілі б твору, зрабілі б прэзентаваную ў ім візію цікавейшай і больш пераканаўчай. Навошта спатрэбілася зусім *неабавязковая* (і таксама без развязання) лінія з маньякам-забойцам? Неабавязковасць – ключавое слова для «Імя грушы». Яно тычыцца нават назвы, бо фактычна акрамя алюзіі на слынны шэдэўр постмадэрнісцкае прозы яна не мае істотнае зачэпкі з творам.

Чаму ў гэты ж час надзіва мала ўвагі нададзена рэканструкцыі побыту губернскага Менска, які мог бы стацца сапраўднаю акрасаю аповесці, спалучальным рэчывам для разнародных элементаў? Прычына, як падаецца, у слабой распрацаванасці персанажаў. Патрэбныя партрэты і характары, асабістае жыццё, звычкі, планы і задумы. Але персанажаў не павыцягваеш з прорваў забыцця – іх трэба прыдумваць адмыслова. Праз дробныя жыццёвыя чыннасці, броўнаўскі рух і някідкія галасы штодзённасці старасвецкі Менск мог бы выявіцца – без дапамогі персанажаў ён застаецца ў памяці імглістым,

невыразным і незапамінальным, як нявыкарыстаная ў поўную меру тэатральная дэкарацыя.

Лепш у гэтым плане выглядаюць апавяданні. Там і стылізацыя пад эпоху атрымалася лепш (а ў «Смерці лютністы» яна мае й выразныя парадыйныя абертоны), і сюжэтная плынь больш маналітная, і мэта аўтарскіх намаганняў больш празрыстая, і дзейныя асобы прапісаныя больш дэтальна. Хаця зноў жа адчуваецца паспешлівасць у выкарыстанні вылаўленых ідэй. Ідэі зразумець можна – яны стаміліся чакаць увасаблення. Аўтару ж хочацца пажадаць большай цярплівасці і пераборлівасці.

2

Працуючы на фабрыцы ілюзій (нават калі на магілёўскай фабрыцы ілюзій) натуральна сфакусавацца на механізмах (сама)падману. Калі Зянон Пазьняк, нарадзіўшыся ў 1944 годзе, адразу ж па-ступіў быў у паліцыю, дык і абкружаная дывізія SS можа прыкінуцца насельніцтвам вызваленага гарадка на нашай усходняй ускраіне – вось логіка, якой усталяваны г. Бобер.

Інфармацыйны прадукт, які ў віртуалізаванай ТБ рэчаіснасці узурпаваў усе праявы ўдзелу (хай сабе нават толькі пасіўна-інтэлектуальнага) шараговага грамадзяніна ў палітыцы сваёй дзяржавы, ёсць адзіным рэальна існым феноменам, які можа прэтэндаваць на ролю падставы для фантазій Аляксея Бацюкова: інфармацыйны прадукт і эмацыйная рэакцыя на яго… аднаго з абслугоўнікаў «машыны кроз».

Апавяданне таго ж аўтара «А я думаў, у нас сын» – рэч больш празрыстая і пераканаўчая, бо не сягае па-за межы індывідуальнага жыцця. У полі агульнавядомых унутрысямейных рэалій шкілет немагчымага паспяхова хаваецца пад пераканаўчымі (бо непрыдуманымі) дэталямі мізансцэны ў тэлестудыі. Менавіта выяўленне таго, што аскепкі абсалютна нармальнага жыцця, паўнамоцнага прадстаўніка *адзіна магчымай* рэальнасці, з гэткім самым спрытам могуць рэпрэзентаваць рэальнасць абсалютна немагчымую, стварае

наймацнейшы мастацкі эфект у фантастычным творы – ці то проста фантастыка, ці навуковая фантастыка, ці магічны рэалізм, ці яшчэ што.

Але патэнцыял шырэйшага ахопу грамадства, спроба чаго робіцца ў «Боберы», нашмат большы: тут больш магчымасцяў скалануць інтэлект чытача, выставіўшы ў нечаканым выглядзе звычкі і стэрэатыпы ягонага мыслення. Але, як пісаў адзін англійскі крытык: «Writing a novel… takes courage and immense clarity of vision». Са смеласцю, здаецца, у аўтара ўсё добра. Дасканаласць жа выдумкі, мусіць, гэтак жа недасягальная, як кожная дасканаласць. Але ж…

У сённяшнім сваім выглядзе «Бобер» хутчэй палемічны праз сваю задуму, чымся праз сваё выкананне – мастацкі. Ёсць нямала таго, што амаль відавочна, і – хутчэй за ўсё – асягальна, але выкарыстана ў нязначнай толькі ступені. Стараннае прапісванне дэталяў (а ў апавяданні няма нават запамінальнага апісання знешняга выгляду патаемна анямечанага Бобера), псіхалагічна напоўненыя персанажы, штохвілінная ўвага да падтрымання ілюзіі нармальнасці дзеяння (што для Беларусі дзіўнага ў тым, што міжсобку людзі гавораць зусім іншаю моваю, чым з чужымі, ды яшчэ начальствам?), захаванне будзённай логікі ў дробязях дазволілі б збалансаваць аповед, стварыць чытачу шанец пагадзіцца з аўтарскімі рэвалюцыйнымі канструкцыямі.

Здавалася б, навошта гратэску гэткая асцярожнасць? Але, як і ў выпадку з тэкстамі Сяргея Балахонава, праблема палягае ў пераканаўчасці, а клопат – у перадазіроўцы навацый. Калі ўжо аўтар сягае гэтак далёка ад звычайнага для «звычайнага» чытача, разумна напачатку зусім няшчыра прапанаваць апошняму захоўваць веру ў выверанyя жыццём прынцыпы, якія служылі дагэтуль верай і праўдаю, а сваю сістэму прапанаваць як абмежаваную мадэль, прызначаную нібыта адно спрасціць навігацыю па выштукаваным аўтарам Сусвеце. Мастацкая крывадушнасць выклікаецца не толькі патрэбаю адаптацыі, з чым можа справіцца добра распрацаваная экспазіцыя. Для задавальнення чытача пажадана яшчэ стварыць ілюзію, быццам ён да нечага дадумаўся сам; тады ён паверыць у кожную

прыдумку.

Бацюкоў выцягнуў з паветра (тут мо’ больш да месца сказаць – з эфіру) афіцыёзнага паходжання штампы пра ваенны гераізм, «правільна пражытае», поўнае стваральнае працы жыццё… Гэтыя канцэпты дзеля хранічнага канфлікту паміж прыгожым словам і трохі іншай практыкаю афіцыёза даўно вызваліліся з-пад ягонай улады, але надаць ім новыя ролі няпроста. Мо’ калі б сп. Бацюкоў больш рашуча звярнуўся б да сатырычнага інструментарыю (што ў сваю чаргу запатрабуе больш прапісаных характараў), магло б атрымацца. Урэшце, адкінуўшы недарэчную тут сарамлівасць, хіба Салтыкоў-Шчадрын не ўваходзіў ва ўладную вертыкаль – а напісаў жа «Сучасную ідылію».

3

Застаецца, аднак, пытанне: а навошта аўтары пастваралі гэткія, шмат у чым сумнеўныя, канструкцыі, адрынуўшы залатыя традыцыі «традыцыйнае беларускае прозы»? Па-першае, хісткасць гэтая ў значнай ступені тлумачыцца менавіта традыцыйнымі для сучаснае беларускае літаратуры падыходамі да персанажаў, якія разглядаюцца хутчэй як рупары аўтара, чымся паўнавартасныя вобразы асоб з непаўторным нутраным светам і ўласным разуменнем свету знешняга. Чамусьці сучасны аўтар адчувае выразную неахвоту да дзейснага персанажа, які выяўляецца праз учынкі і кантакты з іншымі, і зварот да псіхалогіі нязменна абарочваецца нудна(вата)й рэфлексіяй, а адмова ад псіхалагізму – стратай індывідуальнасці дзейных асоб. Паказальна, што ў «Боберы» Аляксей Бацюкоў здолеў аддаць даніну адразу абедзвюм тэндэнцыям.

Але вернемся да сутнасці пытання. Падаецца, пёрам спадароў з Усходу не ў апошнюю чаргу дадавала імпэту пачуццё пратэсту. Гэта пратэст супраць шэрасці літаратуры (амаль заўсёды адчувальны ў тэкстах Сяргея Балахонава), супраць шэрасці нутранага свету асобы, шэрага бу-дзённага жыцця і нарэшце супраць шэрых архітэктараў гэткага жыцця. Пратэст супраць шэрасці вельмі актуальны для маладых аўтараў – гады лятуць, і

можна апынуцца ў незайздросным становішчы спадара Федарэнкі, які падчас прыемнага ва ўсіх адносінах падарожжа робіць не зусім прыемныя адкрыцці адносна сябе і беларускага грамадства:

А які плюс, што я ні разу за свае 36 гадоў не быў не тое што ў Еўропе, а ўвогуле ў заходнім накірунку далей Баранавічаў?

...Што сказаць? Справа нават не ў мове, хоць і гэта важна (французскую трэба было вучыць, а не ўрокі прагульваць, у кустах каля школы пакурваючы!). Што сказаць? Што я хачу жыць у вашай Францыі? Таму што ў Беларусі жыву бедна? Дык хто табе вінаваты? Пры чым тут французы? Што раман не пішацца? І гэтаму Францыя не паможа. Што кніжка вось ужо амаль сем гадоў не выходзіць у «Мастацкай літаратуры»? Дык яшчэ паўдня давядзецца беднаму, успацеламу жандару тлумачыць, што гэта за дзяржаўнае выдавецтва такое, і чаму там існуе чарга, і што гэта за такія заказы, якія павінны збіраць пісьменнікі, – а самае галоўнае, калі шчыра, і добра, што яна не выходзіць.

Такія пытанні вартыя таго, каб пазбягаць іхняе актуальнасці ўсімі сродкамі.

Пратэст супраць шэрасці, нават у недасканалых і абмежаваных праявах, хочацца толькі вітаць, як імпульс, які надае літаратуры вартасць станоўча ўплываць на жыццё, хаця б толькі аўтараў (згадваецца імкненне Сяргея Балахонава «атрымліваць асалоду ад кожнае хвіліны натхнення») і іхніх нешматлікіх удзячных чытачоў. Але калі я чарговы раз заўважаю, як дзеля адміністрацыйнае пільнасці гарадскога начальства знікла з гарадзенскіх вулак чарговая прыгожая купа дрэваў, агаліўшы чарговы занядбаны й пачварны ў архітэктурным сэнсе будынак, мне не хочацца згадваць недахопы шмат у чым каструбаватых тэкстаў з усходніх ускраінаў Бацькаўшчыны. Важней, што пасля прачытання ў мяне сфармавалася перакананне, што Сяргей Балахонаў гэтых дрэваў бы не ссек, Аляксей Бацюкоў – хаця і ссек бы (бо праца

такая), але потым не супакоіўся б, пакуль не пасадзіў новых. Ну а Алесь Разанаў адным рухам намаляваў бы дрэва не горш за сапраўднае. А Умберта Эка – стварыў бы й цэлы лес. Таму хочацца верыць, разгледжаныя тэксты, нягледзячы на тэхнічныя недахопы, застаюцца ў шэрагах літаратуры, хаця вялікім грахом супраць ісціны было б прыменшыць адлегласць паміж імі і творамі таго ж Разанава.

Падсумоўваючы ўражанні, дзве кароткія парады аўтарам. Першая, безумоўна, будзе: «Пішыце!»

Другая: «Пішыце лепей».
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/05/14
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

да Зміцера

[image] [image] [image]

СЯРГЕЙ НАВУМЧЫК

Сяргей Навумчык Сем гадоў Адраджэньня Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988–1995)

нарадзіўся 15 сьнежня 1961 году ў Паставах, скончыў факультэт журналістыкі БДУ. З сакавіка 1990 па студзень 1996 – дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня, каардынатар парлямэнцкай апазыцыі БНФ. У «ARCHE» друкаваліся яго эсэ («Слоўнік Свабоды», 2000), а таксама нататкі на тэмы

Пэрыяд апошняга Адраджэньня пасьпеў абрасьці гэткай колькасьцю мітаў, што прабрацца празь іх да ісьціны ўсё цяжэй. Афіцыйная прапаганда стварае свой стэрэатып, які найбольш яскрава ўвасобіўся ў тэлевізійным псэўдадакумэнтальным блёкбастэры: «Лукашэнка – бацька. У тым ліку – і беларускай Незалежнасьці». З другога боку – пэрыяд гэты і сапраўды найменш дасьледаваны, усё з той жа прычыны блізкасьці па часе і неўсьвядомленасьці яго гістарычнасьці.

Патрэбу зрабіць храналёгію апошняй хвалі нацыянальнага Адраджэньня я адчуў падчас працы над кнігай радыёпубліцыстыкі Васіля Быкава – мае маладзейшыя калегі прасілі патлумачыць нейкія выказваньні, бо палітычны кантэкст таго часу быў ім папросту не вядомы. Я са зьдзіўленьнем убачыў, што няма нейкага адзінага, больш-менш падрабязнага тэксту, прысьвечанага менавіта гэтаму пэрыяду. Давялося зьвяртацца да ўласнага архіву (з боскай дапамогай, жонка і сябры перавезьлі мне практычна ўсё, зьвязанае зь дзейнасьцю апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце 12-га

скліканьня – арыгіналы заяваў, варыянты законапраектаў, нейкую перапіску, пратаколы паседжаньняў, якія я мусіў весці як сакратар. каардынатар, і г. д. Гэта – некалькі кубамэтраў папераў плюс магнітафонныя і відэастужкі, сыстэматызацыя якіх набліжаецца да завяршэньня. Частка архіву Пазьняка засталася на Варвашэні, 8 – але ў канцы 1990-х на сядзібу БНФ былі напады міліцыі, і лёс архіву не вядомы ні Пазьняку, ні мне).

У свой час Быкаў узяў зь мяне слова, што я напішу гісторыю апошняй хвалі нацыянальнага Адраджэньня і змаганьня Беларускага Народнага Фронту; перачытваючы нядаўна перапіску, пабачыў згадкі пра гэта і ў ягоных лістах. Гэтае абяцаньне я выканаю, што, вядома, зойме некалькі гадоў.

Але цяперашні тэкст – не мэмуары, хаця ў нечым ён зьяўляецца максымальна скарочаным іх канспэктам. Менш за ўсё мне хацелася зрабіць яго падобным да ўспамінаў, з апісаньнем сустрэчаў, перамоваў, цытаваньнем перапіскі й запісаў, ацэнкай асобаў ды камэнтарамі іх паводзінаў, нарэшце, прыгадваньнем уласных адчуваньняў. На жаль, у некаторых месцах не ўдалося; выглядае, удзельніку нейкіх падзеяў нерэальна цалкам абстрагавацца ад суб'ектыўнага погляду. Прашу прабачэньня ў чытачоў і суцяшаюся тым, што, магчыма, суб'ектывізм дапаможа крыху больш дакладна адчуць атмасфэру таго часу.

Вядома, гэтая храналёгія няпоўная і фрагмэнтарная: у ёй ня згадваюцца некаторыя падзеі, якія хаця і былі яскравымі і цікавымі, аднак не адыгралі кардынальнай ролі ў працэсе нацыянальнага Адраджэньня.

ПАПЯРЭДНІКІ

У «Нарысе гісторыі Беларусі. 1795–2002» гісторык Захар Шыбека вылучае пяць пэрыядаў вызваленчай барацьбы беларусаў, дарэчы, дакладна і слушна характарызуючы яе памкненьнямі да незалежнасьці ад Расеі.

Першы – «пад сьцягам аднаўленьня страчанай дзяржаўнасьці Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай» – цягнуўся да

80-х гадоў XIX стагодзьдзя. Другі быў зьвязаны з ідэяй «адміністрацыйна-культурнай аўтаноміі ў складзе Расейскай імпэрыі» (да 1915 году) і завяршыўся пазбаўленьнем ад царызму. Трэці пэрыяд Захар Шыбека вызначае межамі 1915–1945 гадоў і вылучае ў ім ідэю поўнай незалежнасьці Беларусі (што на кароткі час увасобілася ў БНР). Чацьверты пэрыяд (1950-я – 1980-я гады) гісторык акрэсьлівае як самы «змрочны», калі пра Незалежнасьць марылі адзінкі, а змаганьне за беларускую дэмакратыю перамясьцілася ў эміграцыю. Нарэшце апошні, пяты, пэрыяд пачаўся з гарбачоўскай лібэралізацыяй – гэта час «узнаўленьня і ажыцьцяўленьня незалежніцкіх ідэалаў у Беларусі».

Як бачым, далёка не заўсёды барацьба мела посьпех і суправаджалася нацыянальным Адраджэньнем. Што бясспрэчна – найвышэйшым посьпехам такой барацьбы ёсьць абвяшчэньне дзяржаўнай Незалежнасьці. У азначаны час гэта было двойчы: у 1918 і ў 1991 гадах. На жаль, Беларуская Народная Рэспубліка была зьнішчаная маскоўскімі камуністамі і не пасьпела стварыць умоваў для разьвіцьця нацыі. А вось падзеі 1991 году былі адначасна і вынікам, і каталізатарам нацыянальнага Адраджэньня – і на сёньня мы можам казаць пра гэты працэс як пра апошняе па часе Адраджэньне Беларусі.

І калі ў вызначэньні папярэдніх хваляў гісторыкі апэруюць тэрмінамі «плюс-мінус» год, а то і дзесяцігодзьдзе, дык апошняе Адраджэньне мы нават можам вылічыць па днях.

Падаецца, што гэты пэрыяд вызначаны 1988 годам, калі ў чэрвені быў надрукаваны артыкул Пазьняка і Шмыгалёва «Курапаты – дарога сьмерці», а ў кастрычніку ўтвораны Аргкамітэт БНФ, – і працягваўся да лукашэнкаўскага рэфэрэндуму ў траўні 1995 году. Калі больш канкрэтна – з 3 чэрвеня 1988 году да 14 траўня 1995-га.

Гэта – сем гадоў.

Альбо 2537 дзён.

Аб’яднаньні нацыянальнай накіраванасьці (нелегальныя альбо напаўлегальныя), якія сымпатызавалі ідэі беларускай

незалежнасьці, існавалі і ў папярэднія дзесяцігодзьдзі. Прыгадаем Саюз беларускіх патрыётаў, групы маладых інтэлектуалаў 1960-х гадоў (Баразна, Пазьняк, Разанаў, Чарняўскі і інш.), «Майстроўню» (пачатак-сярэдзіна 1980-х), нарэшце, «Талаку» і «Тутэйшых». Пры бясспрэчным маральным і ідэалягічным значэньні гэтых арганізацыяў, іх ролі ў фармаваньні сьвядомасьці эліты, мастацкіх здабытках (як у выпадку з «Тутэйшымі») – яны ня мелі шырокага ўплыву на насельніцтва і ня выліліся ў масавы рух, які мог бы кардынальна ўзьдзейнічаць на палітычную сытуацыю. Тым ня менш, менавіта гэтыя суполкі (нароўні зь беларускай дыяспарай на чале з Радай БНР) увасаблялі ідэю неад'емнага права беларускага народу на сувэрэннае існаваньне, падрыхтавалі глебу для шырокага масавага руху і новай хвалі нацыянальнага Адраджэньня.

Тактыка камуністычнага кіраўніцтва палягала ў тым, каб спыніць праявы нацыянальнай сьвядомасьці ў самым іх пачатку, жорстка караць тых, хто асьмеліцца стварыць якія-небудзь нацыянальныя апазыцыйныя арганізацыі (так было з актывістамі Саюзу беларускіх патрыётаў), а вакол іх ініцыятараў стварыць інфармацыйны вакуўм. Самым галоўным было не дапусьціць стварэньня сеткі агульнанацыянальнай арганізацыі. Гэткая рэпрэсіўная палітыка была даволі эфэктыўная.

У выніку адсутнічалі некалькі чыньнікаў, якія не дазвалялі беларускім суполкам ды акцыям энтузіястаў пераўтварыцца ў масавы рух і распачаць Адраджэньне. Па-першае, яны былі лякальныя і ня мелі агульнанацыянальнага маштабу. Суполкі Саюзу беларускіх патрыётаў дзейнічалі ў Паставах і Глыбокім – але ў іншых, усходніх раёнах Віцебскай вобласьці структураў СБП не было. Яўген Кулік зьбіраў мастакоў «На паддашку» – але пераважна менскіх, а гомельскія ці берасьцейскія мастакі пра гэта маглі і ня ведаць. Выступ Разанава ўскалыхнуў філфак БДУ, але на філфаку Віцебскага пэдынстытуту, напрыклад, усё было «ціха». А вось у 1987 годзе нацыянальная моладзь аб'ядналася ў Вальны сойм моладзевых суполак – здавалася б, агульнанацыянальная (ці, як тады казалі, «рэспубліканская») арганізацыя, тым болей што адзін з талакоўцаў, Сяргей

Абламейка, прыгадвае пра разьмеркаваньне адказных за вобласьці, – аднак інфармацыі пра гэта ў СМІ было няшмат (і гэта – у час росквіту гарбачоўскай «галоснасьці»). У 1974 годзе Зянон Пазьняк напісаў артыкул «Становішча ў Беларусі. 1974 год» пра сытуацыю, у якой апынулася нацыянальная інтэлігенцыя, але яго прачытала вузкае кола сяброў (што, праўда, не перашкодзіла ўладам выгнаць яго з працы). Гэтая палітыка замоўчваньня вытрымлівалася цьвёрда – у газэтах 1960-х – пачатку 1980-х гадоў вы ня знойдзеце ніякай (нават адмоўнай) інфармацыі пра ініцыятывы ні тых жа Пазьняка і Разанава, ні Анатоля Сідарэвіча, ні – пазьней – Вінцука Вячоркі ды Сяргея Дубаўца. Але вось артыкул Барыса Сачанкі, надрукаваны ў 1957 годзе з прапановай перавесьці ўсе школы на беларускую мову, здавалася б, мог разьлічваць на шырокі грамадзкі розгалас, бо выйшаў не «самвыдатам», а быў надрукаваны ў «ЛіМе». Але, як пацьвярджае Захар Шыбека, ініцыятары публікацыі і тыя, хто падтрымаў аўтара, імгненна трапілі пад рэпрэсіі КДБ, таму рэалізацыі ў нейкіх шырокіх грамадзкіх ініцыятывах артыкул ня меў.

І ўсё ж вышэйсказанае ані ў якім разе не зьмяншае значнасьці такіх выступаў. Згадаю яшчэ ліст віцебскага настаўніка Франца Сіўка «Прашу вызваліць...» (аб нежаданьні бацькоў навучаць дзяцей на роднай мове) у «ЛіМе», які выклікаў гарачую дыскусію, і зварот прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі да генэральнага сакратара ЦК КПСС Міхаіла Гарбачова аб дыскрымінацыі беларускай мовы, – абодва ў 1986 годзе.

ПРАЎДА ПРА КУРАПАТЫ

Але ў 1988 годзе адбылося тое, што (дзякуючы і больш спрыяльным і дэмакратычным абставінам, але і асабістай мужнасьці ініцыятара) мела вынікам шырокае аб'яднаньне грамадзтва вакол ідэі нацыянальнага адраджэньня і – гэта галоўнае – стварэньне палітычнай арганізацыі, якая дамаглася аднаўленьня дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі.

Менавіта такой падзеяй зьяўляецца публікацыя 3 чэрвеня 1988 году ў «ЛіМе» артыкулу Зянона Пазьняка і Яўгена Шмыгалёва «Курапаты – дарога сьмерці» (артыкул увайшоў у гісторыю з

падвоеным аўтарствам; насамрэч жа ад першага да апошняга слова пісаў яго адзін Пазьняк. Шмыгалёў удзельнічаў у апытаньнях людзей у навакольлі Курапатаў, і Пазьняк палічыў карэктным паставіць пад артыкулам і ягонае прозьвішча).

Дасьледчыкі яшчэ прааналізуюць фэномэн той публікацыі ў грамадзкай сьвядомасьці беларусаў, мы ж адзначым некалькі істотных акалічнасьцяў. Пра сталінскія рэпрэсіі ў масавым савецкім друку пачалі пісаць недзе зь сярэдзіны 1986 году, і таму ў гэтым сэнсе публікацыя ў «ЛіМе», здавалася б, не магла лічыцца адкрыцьцём. У 1987 годзе «Тутэйшыя» нават правялі Дзяды з ушанаваньнем памяці рэпрэсаваных. З другога боку – у артыкуле ўжываюцца тэрміны «злачынствы 1930-х – 1950-х гадоў» (а не, напрыклад, з 1917-га), «сталінскія турмы і лягеры» (а не «бальшавіцкія»). Публікацыя стала магчымая дзякуючы прадмове Васіля Быкава, які піша пра «ахвяраў сталіншчыны» (а не камунізму), «яжоўска-берыеўскія рэпрэсіі» (а не камуністычныя). У гэтым сэнсе Салжаніцын у «Архіпэлягу ГУЛагу» ці Аляхновіч з «У капцюрох ГПУ» былі бліжэйшыя да ісьціны, бо канстатавалі рэпрэсіі як вынік і неад'емную частку ленінскай палітыкі і камуністычнай ідэалёгіі. Аднак кніга Аляхновіча, выдадзеная ў больш як дзесяці краінах, была не вядомая ў Беларусі, Салжаніцына таксама не друкавалі ў СССР. Па-другое, фраза кшталту «бальшавіцкія рэпрэсіі» зрабіла б публікацыю ў 1988 годзе немагчымай; зрэшты, ад таго, што рэпрэсіі былі названыя не «камуністычнымі», а «яжоўскімі» ці «сталінскімі», яны не рабіліся менш жахлівыя.

Пазьняк упершыню сказаў іншае, і ў той момант значна больш важнае, чым, напрыклад, сьцьвярджэньне, што «Ленін – бандыт», калі б яго нейкім цудам і ўдалося апублікаваць.

Па-першае, было даказана, што рэпрэсіі мелі не эпізадычны характар і тычыліся ня двух ці трох дзясяткаў чалавек – у Курапатах паляглі тысячы і тысячы. Па-другое, у маскоўскай ды менскай прэсе шмат пісалася пра «трагічныя лёсы» Бухарына ды Тухачэўскага (якія ў 1917–1918 самі і ўсталёўвалі крывавымі мэтадамі бальшавіцкі рэжым), ці пра камуністычных функцыянэраў Галадзеда ды Шаранговіча, ці пра пагібель прадстаўнікоў творчай ды навуковай эліты. У ЛіМаўскай жа

публікацыі выразна паказана, што расстрэльвалі простых людзей, сялянаў – якраз тых, хто, паводле камуністычнай ідэалёгіі, кваліфікаваўся як «кляса» (інтэлігенцыя лічылася «праслойкай»). Расстрэльвалі народ. І, нарэшце, у артыкуле ўжыты тэрмін «генацыд». Гэта значыць – зьнішчэньне людзей паводле нацыянальнай прыкметы (цяпер ужо ня трэба даводзіць, што беларускае слова магло быць дастатковым аргумэнтам для рэпрэсіяў). Істотным быў і «эфэкт прысутнасьці»: злачынствы адбываліся не ў Сібіры ці на маскоўскай Лубянцы, а вось тут, побач (а шмат для якіх менчукоў – у месцы іх адпачынку). Аўтары настойліва зьвярталі ўвагу і на праблему пакараньня арганізатараў і выканаўцаў расстрэлаў, пакараньня бяз тэрміну даўніны – а менавіта вэтэраны НКВД–КГБ складалі ў той час даволі забясьпечаную і палітычна актыўную касту.

Ніводнага з гэтых кампанэнтаў не было ў ранейшых маскоўскіх ці менскіх публікацыях – у ЛіМаўскім артыкуле ж яны прысутнічалі супольна.

У тыя часы я працаваў у абласной газэце «Віцебскі рабочы», уваходзіў у склад клюбу «Ўзгор'е», падтрымліваў кантакты зь менскімі актывістамі нефармальнага, як тады казалі, руху. Словам, быў чалавекам адносна інфармаваным, але шмат якія акцыі «Талакі» ці «Тутэйшых» былі невядомыя нават мне. Артыкул жа «Курапаты – дарога сьмерці» зрабіўся публікацыяй, эфэкт ад якой не магу параўнаць з вынікам ніякага іншага артыкулу. Тэкст імгненна быў перадрукаваны на ратапрынтах, яго чыталі на заводах, у інстытутах, яго абмяркоўвалі – я сьведчу пра правінцыйны Віцебск, у Менску ж розгалас, зразумела, быў куды большы.

СХОД У ДОМЕ КІНО. «МАРТЫРАЛЁГ» І АРГКАМІТЭТ БНФ

Вынікам публікацыі і шырокага яе розгаласу было ініцыяваньне стварэньня арганізацыі памяці ахвяраў рэпрэсіяў. Сход адбыўся 19 кастрычніка 1988 году ў будынку Дому кіно (цяпер Чырвоны касьцёл). Мы зьбіраліся туды, як было пазначана ў запрашэньнях, для ўтварэньня «Беларускага камітэту памяці

ахвяраў сталінізму «Камітэт-58» (паводле назову рэпрэсіўнага артыкулу Крымінальнага кодэксу). Асабіста я атрымаў запрашэньне ад Аляксандра Лукашука, кабінэт якога ў рэдакцыі «Звязды» быў адным зь месцаў збору ініцыятараў Камітэту памяці ахвяраў сталінізму (здаецца, там я ўпершыню і пабачыў Пазьняка. Потым гэткая актыўнасьць каштавала Лукашуку рэдакцыйнай пасады).

Колькі чалавек ведала пра тое, што будзе ўтвораны аргкамітэт Народнага Фронту? Дакладна ведалі Пазьняк, Дубянецкі, Быкаў і яшчэ адна асоба. У ліку тых, хто ведаў пра такую ініцыятыву, Пазьняк не называе, напрыклад, Сяргея Дубаўца. Але калі мы зь Сяргеем ішлі ў Дом кіно, Сяргей выпытваў, як бы я паставіўся да ідэі ўтварэньня Народнага Фронту. А першае, што я пачуў ад Арлова, якога спаткаў у Доме кіно перад паседжаньнем, было: «Ну ты ведаеш, што будзем ствараць Народны Фронт?» Для мяне гэта было навіной, хаця ідэя такой арганізацыі аднойчы абмяркоўвалася намі з Уладзімерам Арловым яшчэ ў ягонай наваполацкай кватэры. Усё гэта сьведчыць, што калі і ня ведалі, дык здагадваліся – словам, ідэя, як кажуць, «вісела ў паветры».

Спачатку было ўтворана Беларускае гісторыка-асьветніцкае таварыства памяці ахвяраў сталінізму «Мартыралёг Беларусі». Ад таго, хто будзе абраны старшынём, залежала далейшая праца сходу, а менавіта: ці ён прапануе людзям разыходзіцца, ці паставіць на галасаваньне стварэньне Народнага Фронту, да чаго ўжо заклікалі прамоўцы. Васіль Быкаў прапанаваў Пазьняка – гэтаму запярэчыў прадстаўнік ЦК КПБ Расьціслаў Бузук, які паспрабаваў сарваць сход. Аднак Быкаў узяў мікрафон і правёў галасаваньне. Пазьняк быў абраны, і празь некалькі хвілінаў пад воплескі залі выставіў на галасаваньне прапанову аб утварэньні Аргкамітэту Народнага Фронту.

У склад Аргкамітэту ўвайшлі Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў, Анатоль Грыцкевіч, Уладзімер Конан, Зянон Пазьняк, Пімен Панчанка, Алег Белавусаў, Алесь Бяляцкі, Анатоль Варава, Вінцук Вячорка, Ніл Гілевіч, Павал Дзьмітрук, Юры Дракахруст, Міхал Дубянецкі, Алесь Емяльянаў, Вячаслаў Жыбуль, Яўген Кулік, Мікола Купава, Адам Мальдзіс, Аляксей Марачкін,

Валеры Масьлюк, Пятро Садоўскі, Алесь Суша, Сымон Сьвістуновіч, Кастусь Тарасаў, Міхась Ткачоў, Алег Трусаў, Генадзь Тумаш, Ігар Чарняўскі, Міхась Чарняўскі, Яўген Шунейка, Васіль Якавенка (даю пералік у пасьлядоўнасьці, пададзенай у «Інфармацыйным паведамленьні» Аргкамітэту, якое выйшла празь некалькі дзён; пазьней у склад Аргкамітэту былі кааптаваныя некаторыя іншыя асобы, а некаторыя – сышлі).

Ужо ў першай праграмнай заяве – нароўні з падтрымкай «перабудовы», «распачатай лепшымі сіламі КПСС» – казалася пра неабходнасьць нацыянальнага Адраджэньня, дзяржаўнасьці беларускай мовы, «рэальнага сувэрэнітэту Беларусі, абвешчанага Канстытуцыяй БССР і СССР». БНФ выступаў за «аднаўленьне праўдзівай, навуковай гісторыі Беларусі», «усебаковае разьвіцьцё культуры беларускага народу» і «свабоднае разьвіцьцё моваў і культураў усіх нацыянальнасьцяў, што жывуць на Беларусі». Гаварылася і пра «поўны рэспубліканскі гаспадарчы разьлік» (у тых умовах гэта азначала – эканамічную самастойнасьць ад Масквы).

На Дзяды 30 кастрычніка тысячы менчукоў сабраліся ля Маскоўскіх могілак (цяпер – Усходнія). Вось як піша пра тыя падзеі па-біблійнаму ляканічна Васіль Быкаў у «Доўгай дарозе дадому»: «Людзей пачалі разганяць, біць, арыштоўваць, труціць газам з партатыўных балёнчыкаў. Атруцілі і Пазьняка, які ішоў на чале калёны. Але Пазьняк не саступіў. Ён скіраваў натоўп на ўскраіну і павёў да Курапатаў. Аднак і там шлях калёне перагарадзілі войскі. Тады Пазьняк завярнуў усіх у поле. І ў чыстым полі пад сьняжком, які сыпаў з хмарнага неба, адбылося набажэнства. Угары разьвяваўся бел-чырвона-белы сьцяг, выступалі прамоўцы і сярод іх пісьменьнік Уладзімер Арлоў».

Дадам, што там, пад Курапатамі, упершыню ў найноўшай гісторыі Беларусі перад вялікім сходам людзей быў узьняты бел-чырвона-белы сьцяг.

Разгон «Дзядоў» меў шырокі розгалас. Апраўдваючыся, улады былі вымушаныя казаць і пра ўтварэньне БНФ – хай і ў адмоўным ракурсе. Суполкі БНФ пачалі ствараццa ня толькі ў

Менску, але і ў рэгіёнах.

Пашыраліся патрабаваньні беларусізацыі, вяртаньня гістарычнай памяці. 16 лістапада група літаратараў (Уладзімер Арлоў, Алесь Асташонак, Лявон Баршчэўскі і іншыя) апублікавалі ў «ЛіМе» ліст з патрабаваньнем вярнуць у правапіс мяккі знак і пераднаціскное «я», адначасна ацаніўшы моўную рэформу 1933 году як «рэпрэсіўную».

ДЭНАЦЫЯНАЛІЗАВАНЫЯ КАМУНІСТЫ

Увогуле, пэрыяд да вясны 1990 году, калі нацыянальныя сілы атрымалі прадстаўніцтва ў заканадаўчым органе, быў пэрыядам іх ідэалягічнага змаганьня з рэакцыйным, цалкам арыентаваным на Маскву, камуністычным кіраўніцтвам БССР.

І тут, на пачатку хвалі нацыянальнага Адраджэньня, вельмі важную ролю мела пазыцыя камуністычнага кіраўніцтва Беларусі. Тое, што дэмакратычныя перамены вышэйшае кіраўніцтва ўспрымала як пагрозу ўласнаму становішчу, яшчэ можна зразумець. Гэта палітычная барацьба, і адбывалася яна і ў суседніх зь Беларусьсю Латвіі, Літве, а таксама ў Эстоніі.

Але літоўскія, напрыклад, камуністы не аспрэчвалі нацыянальных каштоўнасьцяў, спрыялі разьвіцьцю літоўскай мовы, культуры і адукацыі. Нельга ўявіць, каб, напрыклад, кіраўніцтва кампартыі Літвы загадала зруйнаваць Троцкі замак альбо віленскую вежу Гедыміна. А вось у Менску Машэраў загадаў зруйнаваць Нямігу, Сьлюнькоў – знакавы для беларускай тэатральнай гісторыі будынак, у Віцебску быў зьнішчаны ледзь ня ўвесь гістарычны цэнтар, у тым ліку Дабравешчанская царква XII стагодзьдзя. Падобнае было не магчыма ні ў Літве, ні ў Латвіі, ні ў Эстоніі – затое спрэс адбывалася ў Расеі. Беларускія камуністы перанялі гэтую мэнтальнасьць з усходу.

Адрозьненьне паміж беларускім камуністычным кіраўніцтвам і іх літоўскімі калегамі выяўляецца нават у тым, што менавіта дзякуючы распараджэньню ЦК кампартыі Літвы ў Вільні змог адбыцца ўстаноўчы зьезд БНФ – пасьля таго, як у Менску яго

праводзіць было забаронена.

Ня мною было заўважана, што ў канцы 1980-х гадоў у эшалёне вышэйшага кіраўніцтва былі толькі два сакратары, беларускія па сьвядомасьці – Менскага гаркаму Пятро Краўчанка і Віцебскага абкаму Ёсіф Навумчык. Тут, вядома, трэба зрабіць папраўку адносна абмежаванасьці іх нацыянальнай сьвядомасьці – гаворка ня можа ісьці, напрыклад, пра ўсьведамленьне імі ў той момант неабходнасьці нацыянальнай Незалежнасьці; да таго ж яны былі носьбітамі камуністычнай ідэалёгіі. Праўда, яны хаця б не цураліся публічна размаўляць па-беларуску. Аднак іх уплыў быў тэрытарыяльна абмежаваны. Кіраўніцтва ж ЦК было папросту антынацыянальнае, што асабліва выявілася пасьля высылкі другога сакратара ЦК Генадзя Барташэвіча, які сымпатызаваў нацыянальнай інтэлігенцыі, амбасадарам Савецкага Саюзу ў Паўночную Карэю. Так, быў у складзе ЦК КПБ Генадзь Бураўкін, але менавіта як старшыня Дзяржтэлерадыё; у аддзеле культуры ЦК нейкі час працаваў Сяргей Законьнікаў, але ў канцы 1980-х ён ужо быў рэдактарам «Полымя».

Зусім магчыма, што калі б на пасадзе сакратара ЦК КПБ па ідэалёгіі заставаўся Аляксандар Кузьмін, які спрыяў і Васілю Быкаву, і Ўладзімеру Караткевічу, які не баяўся сустракацца з творчай інтэлігенцыяй і не пазьбягаў дыскусіяў, настроі кіраўніцтва ў Беларусі ў канцы 1980-х гадоў не былі б нагэтулькі рэакцыйныя. Аднак пасьля канфлікту са Сьлюньковым з прычыны Чарнобылю Кузьміна адправілі на пэнсію, а ягонае месца заняў Валер Пячэньнікаў – як ён сам сябе вызначаў, «інжынэр». Прыход жа першым сакратаром ЦК Яфрэма Сакалова, які атрымаў зорку Героя сацпрацы за будаўніцтва экалягічна шкодных сьвінакомплексаў, канчаткова зрабіў немагчымым дыялёг партыйнага камуністычнага кіраўніцтва з нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыяй і, у далейшым, з кіраўніцтвам Народнага Фронту.

ЦК КПБ абраў тактыку забаронаў і паклёпу.

Увесну 1989 году актывісты БНФ узялі ўдзел у першых адносна свабодных выбарах на тэрыторыі СССР. Практычна ўсе лідэры Народнага Фронту былі вылучаныя «кандыдатамі ў кандыдаты»

ў народныя дэпутаты СССР. Аднак дзеля таго, каб патрапіць у выбарчы бюлетэнь, трэба было прайсьці зацьвярджэньне праз так званыя «акруговыя сходы» (300–400 прадстаўнікоў «працоўных калектываў», якія фармаваліся камуністычнымі органамі). Ніводзін зь лідэраў БНФ праз гэтыя сходы не прайшоў (напрыклад, я быў вылучаны шасьцю працоўнымі калектывамі Віцебску, у тым ліку найбуйнейшага прадпрыемства ў горадзе – тэлезаводу, але гэта ня мела ніякага значэньня). Паводле квоты Саюзу пісьменьнікаў дэпутатам стаў Васіль Быкаў, ад Саюзу кінэматаграфістаў – Алесь Адамовіч. Акрамя таго, па шэрагу сталічных акруг пры падтрымцы БНФ былі абраныя Аляксандар Дабравольскі, Станіслаў Шушкевіч, Мікалай Ігнатовіч і некаторыя іншыя. Трэба адзначыць, што ў Менску падтрымка БНФ мела вызначальную ролю: тыя, супраць каго агітаваў Фронт, абраныя не былі.

Маскоўскія зьезды ішлі ў прамой трансьляцыі і прыцягвалі да сябе вялізную ўвагу. Аднак адсутнасьць у складзе беларускай дэлегацыі колькі-небудзь значнай групы палітыкаў з выразна нацыянальнай арыентацыяй не дазволіла вынесьці на шырокае абмеркаваньне пытаньня аб незалежнасьці – як тое было зроблена дэпутатамі з прыбалтыйскіх краінаў. Падкрэсьліваю гэтую акалічнасьць, бо, напрыклад, прысутнасьць Быкава на зьезьдзе ва ўмовах, калі шлях на трыбуну жорстка кантраляваўся, у гэтым сэнсе ня мела істотнага значэньня – літоўцы ці эстонцы бралі якраз масавымі калектыўнымі дэмаршамі (напрыклад, пакіданьнем залі). Зрэшты, і прыбалты даволі хутка пераканаліся, што Крэмль – ня тое месца, дзе будуць спакойна выслухоўваць пра дзяржаўны сувэрэнітэт.

Увесь 1989 год быў для БНФ часам нацыянальнай і антыкамуністычнай агітацыі. Распачаўся год другім Вальным соймам беларускіх суполак, які прайшоў 14–15 студзеня ў Вільні; абмяркоўваліся аспэкты сувэрэнітэту, дзяржаўнасьці мовы, а таксама «рэспубліканскага грамадзянства» (існавала толькі грамадзянства СССР).

25 сакавіка мастак Алесь Пушкін правёў пэрформанс ля Дому друку, прымеркаваны да гадавіны ўтварэньня БНР. Гэтая акцыя каштавала яму суду і зласьлівых артыкулаў – зь якіх, аднак,

шмат хто ўпершыню даведаўся пра БНР.

26 красавіка, у гадавіну Чарнобылю, Аргкамітэт БНФ правёў гадзінны мітынг на плошчы Леніна – некалькі соцень людзей стаялі моўчкі; праз кожныя пяць хвілінаў біў звон. Найважнейшай падзеяй стаўся арганізаваны БНФ у верасьні шматтысячны мітынг з патрабаваньнем абнародаваньня праўды пра Чарнобыль, пакараньня вінаватых у замоўчваньні вынікаў аварыі ды ліквідацыі яе наступстваў. Афіцыйны друк зьмясьціў скажоную інфармацыю, абвінаваціўшы лідэраў БНФ у «палітыканстве».

І ўсё ж, дзякуючы намаганьням БНФ, маскоўскае і менскае кіраўніцтва вымушанае было пачаць казаць праўду пра Чарнобыль. Жыхары Беларусі ўбачылі хлусьню маскоўскіх чыноўнікаў, іх імкненьне пазьбегнуць адказнасьці і нежаданьне рэальна дапамагаць ахвярам Чарнобылю. Гэта спарадзіла шмат у каго першыя сумневы ў здольнасьці «саюзнага цэнтру» вырашыць праблемы, зьвязаныя з жыцьцём іх і іхных блізкіх.

ВЫБАРЫ ПАД КАНТРОЛЕМ КАМУНІСТАЎ

26 студзеня 1990 году, перад спыненьнем сваіх паўнамоцтваў, Вярхоўны Савет 11-га скліканьня прыняў Закон аб мовах. Гэта было зроблена ў адказ на патрабаваньні грамадзкасьці – так, пры абмеркаваньні праекту ў друку 15 тысяч чалавек выказаліся за наданьне беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай мовы. За месяц да прыняцьця закону такі статус быў вымушаны прызнаць і ЦК КПБ на сваім пленуме, імкнучыся перахапіць ініцыятыву БНФ, які патрабаваньне гарантыяў беларускай мове зрабіў адным з галоўных сваіх праграмных палажэньняў.

Аднак грамадзкія настроі маглі б быць і ня ўлічаныя, як здарылася гэта на некалькі тыдняў раней з новым выбарчым законам, калі б у камісіі і непасрэдна на сэсіі ВС у абарону дзяржаўнасьці беларускай мовы ня выступілі дэпутаты Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Іван Чыгрынаў, Іван Шамякін, віцэ-прэм'ер Ніна Мазай, міністар адукацыі Міхаіл Дзямчук і сакратар менскага гаркаму кампартыі Пятро Краўчанка. Сярод

дэпутатаў былі актыўныя праціўнікі закону, найперш зь ліку прамысловай намэнклятуры. Аднак гэта быў той самы выпадак, калі шматгадовая звычка галасаваць, як загадвае партыйнае начальства, спрацавала не на шкоду, а на карысьць нацыі.

Падаецца, што прыняцьце Закону аб мовах было самым станоўчым крокам за ўсе часы існаваньня адзінаццаці кадэнцыяў беларускага Вярхоўнага Савету, пасьля далучэньня ў 1939 годзе Заходняй Беларусі (зрэшты, апошняе было шмат у чым і вынікам сталінскага геапалітычнага раскладу; у дачыненьні да Вільні расклад Крамля быў іншы).

Васіль Быкаў ацаніў закон як палавіністы, і гэта слушная ацэнка – але нават калі б улады выконвалі хаця б тое, што прадугледжваў закон, мова не апынулася б пад пагрозай зьнішчэньня.

Прыняўшы Закон аб мовах, кіраўніцтва кампартыі, тым ня менш, імгненна пачало распаўсюджваць тэзу, што нібыта БНФ заклапочаны толькі лёсам беларускай мовы, а не эканомікай, не жаданьнем «накарміць народ». Гэтае сьцьверджаньне хутка пераўтварылася ва ўстойлівы стэрэатып, які суправаджаў парлямэнцкія выбары.

Выбары ў Вярхоўны Савет БССР 12-га скліканьня, які складаўся з 360 мандатаў, прайшлі ўвесну 1990 году. Яшчэ ўвосень 1989 году падчас прыняцьця новага Закону аб выбарах Вярхоўны Савет пад ціскам грамадзкасьці вырашыў ня ўводзіць гарантаванага прадстаўніцтва ад кампартыі і камсамолу (100 прадстаўнікоў ад КПСС на зьезьдзе народных дэпутатаў СССР у народзе называлі «чорнай сотняй»). Аднак 50 дэпутатаў вылучаліся ад грамадзкіх арганізацыяў, а менавіта: пракамуністычнай вэтэранскай арганізацыі, а таксама таварыстваў сьляпых, глухіх і інвалідаў.

(Зрэшты, некалькі дэпутатаў ад гэтых таварыстваў будуць падтрымліваць некаторыя прапановы БНФ; аднак большасьць, асабліва вэтэраны ў поўным складзе, выступяць выключна з пракамуністычных і праімпэрскіх пазыцыяў. Наяўнасьць гэтых дэпутатаў фатальна паўплывае на балянс сілаў у парлямэнце.)

На выбары дэмакратычныя сілы ішлі адзіным блёкам, у складзе БНФ, ТБМ, Беларускага экалягічнага саюзу, Беларускага сялянскага саюзу і Саюзу каапэратываў Беларусі.

Шмат у чым выбарчая кампанія 1990 году ў Вярхоўны Савет 12-га скліканьня (люты–сакавік 1990 году) перадвызначыла будучыню Беларусі, паколькі менавіта гэтаму Вярхоўнаму Савету давялося аднаўляць незалежнасьць і ствараць дзяржаўныя інстытуцыі. Калі б дэпутатаў БНФ было болей, лёс краіны мог бы быць зусім іншы. Таму тыя выбары калі-небудзь будуць прадметам глыбокага аналізу.

Пакуль жа адзначу, што кіраўніцтва ЦК КПБ на чале зь Яфрэмам Сакаловым і падкантрольны яму тагачасны Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету на чале зь Мікалаем Дземянцеем стварылі надзвычай неспрыяльныя ўмовы для дэмакратычных кандыдатаў.

Па-першае, Народнаму Фронту было адмоўлена ў рэгістрацыі, і, адпаведна, ён ня мог вылучаць сваіх кандыдатаў. Выйсьце было знойдзена – вылучэньне фронтаўцаў праходзіла пераважна праз Таварыства беларускай мовы. Аднак гэтая арганізацыя знаходзілася пад кантролем кампартыі (у Менску яе курыраваў другі сакратар гаркаму Пятро Краўчанка, і адбыліся далёка ня ўсе заплянаваныя вылучэньні). Але не былі зарэгістраваныя і некаторыя кандыдаты Фронту, якія вылучаліся працоўнымі калектывамі (напрыклад, адзін з кіраўнікоў выбарчага штабу БНФ Віктар Івашкевіч).

Па-другое, парушаўся прынцып «роўных магчымасьцяў», нібыта гарантаваных законам. Аглядальнік «ЛіМу» Андрэй Ганчароў у тыя дні слушна назваў такую палітыку «дыскрымінацыйнай». Кожнаму кандыдату на агітацыю было выдаткавана 50 рублёў; перавышэньне пагражала скасаваньнем рэгістрацыі. Пры гэтым фармальна кандыдаты мелі «роўную» магчымасьць праводзіць сустрэчы ў працоўных калектывах. Аднак кандыдатам ад БНФ патрапіць на завод ці ў НДІ было значна цяжэй; чыноўнікі ж лёгка праходзілі куды заўгодна. Да прыкладу, кандыдат у дэпутаты па адной зь віцебскіх акруг, начальнік абласнога ўпраўленьня міліцыі Мечыслаў Грыб наведваў заводы, студэнцкія аўдыторыі, бацькоўскія сходы ў школах – каб

праінфармаваць пра барацьбу са злачыннасьцю. Ягоны канкурэнт ад БНФ, кіраўнік клюбу «Ўзгор'е» археоляг Ігар Цішкін такой магчымасьці ня меў.

Трэцяе і, бадай што, галоўнае. Уся прапагандысцкая машына (тэлебачаньне, радыё, друк) знаходзілася пад кантролем улады і працавала супраць БНФ. Дэмакратычныя кандыдаты мелі некалькі хвілінаў на мясцовым тэлебачаньні і маглі надрукаваць свае праграмы ў мясцовых газэтах. Аднак кіраўніцтва Народнага Фронту было пазбаўленае магчымасьці выступіць па агульнанацыянальным тэлебачаньні з тлумачэньнем праграмных палажэньняў БНФ ды абвергнуць інсынуацыі, якія штодня перадаваліся ў СМІ. Тым часам, кіраўніцтва КПБ свабодна праводзіла агітацыю ва ўсіх сродках масавай інфармацыі.

Праўда, аднойчы гэтае правіла было парушана – 25 лютага на плошчы Леніна БНФ арганізаваў мітынг пратэсту супраць проціпраўнай дзейнасьці Цэнтральнай выбарчай камісіі. Сабралося каля ста тысяч чалавек. Упершыню Менск бачыў такі масавы выступ, і ўпершыню на ім адбылася публічная дыскусія паміж БНФ і кіраўніцтвам КПБ, а менавіта – паміж лідэрам БНФ Зянонам Пазьняком і першым сакратаром ЦК КПБ Яфрэмам Сакаловым (выступ апошняга пачаўся пад воклічы «Шапку здымі! Перад народам гаворыш!», а скончыўся скандаваньнем плошчы «Ў адстаўку!»).

Мітынг запатрабаваў тэрміновай адстаўкі кіраўніцтва БССР, была прынятая рэзалюцыя з патрабаваньнем ад Дзяржтэлерадыё часу ў жывым тэлеэтэры арганізатарам мітынгу. Статысячная калёна рушыла па Ленінскім праспэкце да тэлецэнтру на вуліцы Камуністычнай. У 18 гадзінаў у жывой тэлетрансьляцыі выступілі Зянон Пазьняк, Вінцук Вячорка і Аляксей Марачкін. Пасьля іх выступу сорак хвілінаў на тэлеэкранах была нерухомая застаўка; затым зьявіліся першы сакратар ЦК Сакалоў, старшыня Прэзыдыюму ВС Дземянцей, міністар юстыцыі Валер Ціхіня, сакратар ЦВК Лагір і некаторыя іншыя кіраўнікі, якія абрынуліся з абвінавачаньнямі на БНФ, а статысячны мітынг назвалі «натоўпам экстрэмістаў».

Ужо ў першым туры выбараў 4 сакавіка дэпутатамі ВС былі

абраны Зянон Пазьняк, кіраўнік камітэту БНФ «Дзецям Чарнобылю» Генадзь Грушавы, рэдактар «ЛіМу» Анатоль Вярцінскі, прарэктар БДУ Станіслаў Шушкевіч, а таксама некаторыя іншыя асобы, якіх падтрымліваў БНФ (у тым ліку і аўтар гэтых радкоў) – за нас было пададзена больш як 50 адсоткаў галасоў выбарцаў (гэта былі вымушаныя прызнаць і выбарчыя камісіі; у маёй акрузе на ўчастках, дзе былі назіральнікі, колькасьць галасоў перавышала і 60 адсоткаў, але на двух участках, дзе назіральнікаў не было – не дасягала 50-ці; там, дзе мы не кантралявалі сытуацыю, адбыліся фальсыфікацыі). Іншыя кандыдаты ад БНФ (у тым ліку Юры Хадыка, Вінцук Вячорка, Міхась Ткачоў, Сяргей Законьнікаў, Аляксей Марачкін, Кастусь Тарасаў) прайшлі ў другі тур. Усе яны мелі шанцы быць абранымі ў Вярхоўны Савет.

11 сакавіка Літва абвясьціла незалежнасьць. У Беларусі камуністычная ўлада скарыстала гэты факт дзеля антыфронтаўскай прапаганды – маўляў, «экстрэмісты з БНФ хочуць, на прыклад сваіх паплечнікаў зь літоўскага «Саюдзісу», разваліць СССР, а гэта прывядзе да крыві, паглядзіце, што адбываецца ў Баку». Чаго БНФ жадае насамрэч, якімі шляхамі будзе гэтага дамагацца – сказаць пра гэта фронтаўцы ня мелі магчымасьці; тэле- і радыёэтэр кандыдатам БНФ пасьля першага туру практычна не даваўся. Не ўдалося абвергнуць і паклёпніцкіх артыкулаў у газэтах пра кандыдатаў БНФ.

У другім туры 18 сакавіка ўсё ж прайшлі ў Вярхоўны Савет Лявон Баршчэўскі, Юрась Беленькі, Валянцін Голубеў, Сяргей Папкоў, Пятро Садоўскі ды некаторыя іншыя прадстаўнікі БНФ. Аднак пераважную большасьць дэпутацкіх месцаў (каля 90 адсоткаў) узялі прадстаўнікі камуністычнай намэнклятуры.

І ўсё ж бясспрэчна, што менавіта абраньне кандыдатаў ад БНФ дэпутатамі Вярхоўнага Савету зрабілася галоўным вынікам папярэдняга пэрыяду.

ПАЧАТАК БЕЛАРУСКАГА ПАРЛЯМЭНТАРЫЗМУ

15 траўня 1990 году распачала працу першая сэсія Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня. Упершыню ў найноўшай гісторыі

Беларусі нацыянальная палітычная сіла атрымала прадстаўніцтва ў вышэйшым заканадаўчым органе ўлады.

Цяпер ёсьць спробы прынізіць ролю БНФ і яго дэпутатаў; некаторыя дапісаліся да таго, што вынікі дзейнасьці Народнага Фронту (аднаўленьне незалежнасьці ў 1991 годзе, беларусізацыю) называюць «квазіпосьпехам».

Парадаксальна, што асобы, якіх я ніколі ня бачыў ні на адным зь мітынгаў, ні на Соймах БНФ, ні на паседжаньнях парлямэнцкай апазыцыі БНФ ці яе ценявога кабінэту – прыпісваюць сабе паплечніцтва з Пазьняком; а некаторыя ідуць далей і ўвогуле заяўляюць, што Пазьняк і БНФ нічога ня значылі. Псыхалягічна падобныя заявы асобаў, якія, адчуўшы прафэсійнае фіяска, жадаюць хоць вось так упісаць сябе ў гісторыю, зразумелыя. Але гэта ўжо сфэра псыхалёгіі.

А з гледзішча паліталёгіі і гістарычнай навукі ўсё проста. Ёсьць выпадкі – і ў гісторыі іх багата, – калі нацыя здабывае незалежнасьць вайной, баявымі дзеяньнямі. У такім разе цэнтрам робіцца ваенны ці партызанскі штаб, аргумэнтам змаганьня выступае зброя, а посьпех залежыць ад тых людзей у форме, якія выпрацоўваюць плян апэрацыі (зрэшты, і ад байцоў-выканаўцаў таксама). Там, дзе сувэрэнітэт дасягнуты мірным, заканадаўчым шляхам, дзе выкарыстоўваюцца палітычныя мэханізмы, цэнтрам змаганьня робіцца парлямэнт, а вызначальная роля адведзеная тым парлямэнцкім фракцыям (альбо фракцыі), якія вылучылі дасягненьне сувэрэнітэту як галоўную палітычную мэту. У канцы ХХ стагодзьдзя гэтая роля прыпала на парлямэнцкую фракцыю БНФ на чале з Пазьняком. Гэтыя палітыкі ды іх лідэр могуць падабацца альбо не падабацца, іх дзеяньні могуць і павінны аналізавацца, але гісторыю не перапішаш і іншыя імёны ў яе не падставіш.

Між іншым, цэнтрам палітычнага змаганьня за незалежнасьць фракцыя БНФ зрабілася не адразу – даволі працяглы час рашэньні прымалі не дэпутаты, а сябры Сойму БНФ; пры гэтым далёка ня ўсе дэпутаты былі сябрамі Сойму. Даволі працяглы час менавіта Сойм быў месцам выпрацоўкі палітычных рашэньняў, дэпутацкая фракцыя ж выступала ў ролі выканаўцаў. Магчыма, такое разьмеркаваньне мела сэнс: сябры

Сойму мелі большы палітычны досьвед, асабліва ў параўнаньні з дэпутатамі з правінцыі, да таго ж там было шмат асобаў з даўняй «нацыянальнай» біяграфіяй. Аднак ужо праз год сытуацыя кардынальна зьмянілася: парлямэнцкі досьвед вывеў на ролю палітычнага цэнтру менавіта дэпутацкую апазыцыю.

Ужо на другі дзень сэсіі большасьць дэпутатаў адмовілася прагаласаваць за рэгістрацыю БНФ (супраць выказаліся 150 дэпутатаў – пераважна сакратары камуністычных камітэтаў, вайскоўцы, дэпутаты ад вэтэранскай арганізацыі). Гэта быў адзін зь першых парадоксаў Вярхоўнага Савету: прадстаўнікі палітычнай партыі былі абраныя ў парлямэнт, а самой партыі юрыдычна не існавала, больш за тое – парлямэнт адмаўляў ёй у праве на існаваньне.

Былі і іншыя парадоксы.

Беларусь была адзінай постсавецкай краінай, дзе найвышэйшы заканадаўчы орган фактычна канцэнтраваўся тымі, хто адмаўляў незалежнае існаваньне краіны і дзяржаўнасьць мовы тытульнай нацыі. Арыентацыя абсалютнай большасьці дэпутатаў ВС ад першага да апошняга дня кадэнцыі 12-га скліканьня была накіраваная на Маскву – спачатку як на сталіцу СССР, потым – «братэрскай» Расеі. Другая парадаксальная адметнасьць – дэпутаты ў большасьці не адчувалі сябе палітыкамі, успрымаючы наяўнасьць мандату выключна як спосаб ці то зрабіць уласную кар'еру ў выканаўчых структурах, ці наладзіць уласны бізнэс, ці, у лепшым разе, «выбіць» для калгасу, саўгасу ці заводу нейкія матэрыяльныя рэсурсы.

«Я ўвогуле да мікрафона не імкнуўся выходзіць... увогуле два разы выступаў ад мікрафона: калі ішлі перавыбары сьпікера і яшчэ да таго, у гадавіну Віскулёў. Я сказаў тады, што Віскулі – яшчэ большы ўдар па Беларусі, чым Чарнобыль», – прыгадвае сваё дэпутацтва ў ВС 12-га скліканьня былы першы сакратар Магілёўскага абкаму партыі і архітэктар праекту «Адзіны кандыдат-2001» Васіль Лявонаў (Работа над ошибками. Смоленск. 2003. с. 45). Зьвернем увагу не на ўспрыманьне дасягненьня незалежнасьці як катастрофы, а на стаўленьне да парлямэнцкай дзейнасьці, найвайжнейшай часткай якой ёсьць

дыскусія.

Наагул, дыскусію прадстаўнікі партнамэнклятуры весьці ня ўмелі (за выключэньнем хіба што Краўчанкі, якога адразу ж прызначылі міністрам замежных справаў). Словы «сувэрэнітэт» ці «геапалітыка» гучалі для іх, як незнаёмыя тэрміны. Яны не былі палітыкамі і нават уявіць не маглі, што ім трэба займацца палітыкай. «Займацца палітыкай» – гучала як крамола. Гэта была прэрагатыва Палітбюро ЦК КПСС, ну, магчыма, першага сакратара ЦК КПБ, а дэпутатаў народ абраў – «зрабіць жыцьцё лепей»: то бок асфальтаваць вуліцы ў горадзе, дапамагаць калгасу здабываць камбікорм і гэтак далей. Яны проста «ціснулі на кнопкі» паводле ўказаньняў з ЦК КПБ, а пасьля 1991 году з Саўміну – і бралі большасьцю.

Наўрад ці можна назваць самастойнымі палітыкамі і дэпутатаў, якія пасьля забароны КПБ-КПСС утварылі групу «Беларусь» – Казлова, Паўлава, Скарыніна.

З аднаго боку, вось яны якраз пралічвалі дзеяньні з д'ябальскай дакладнасьцю, прымушаючы парлямэнцкую большасьць прымаць рашэньні, адно за адным, у інтарэсах Масквы. Яны ў значнай ступені і прывялі да падпісаньня Дамовы аб калектыўнай бясьпецы СНД і да ўвядзеньня прэзыдэнцтва (апошняе – ужо разам з Лукашэнкам, «маладымі ваўкамі» і групай Карпенкі). Аднак потым гэтыя дэпутаты падазрона хутка абсалютна сышлі з палітычнай арэны, што нельга патлумачыць, напрыклад, паразай на выбарах Кебіча ці неперааброньнем дэпутатамі (не сышлі ж з арэны Пазьняк альбо Баршчэўскі). За выключэньнем, бадай што, Валер'я Паўлава, які ў ВС прайшоў шлях ад падпалкоўніка да генэрала, а цяпер у Маскве, выступае ў друку супраць Лукашэнкі, за дэмакратычную Беларусь, але – падкрэсьлена – без нацыяналіста Пазьняка і навязваньня беларускай мовы.

Фразы кшталту «геапалітычная сытуацыя», «абарона нацыянальных інтарэсаў» імі не ўспрымаліся. Аднак гэтыя дэпутаты паслухмяна галасавалі, калі ішоў загад ад прадстаўнікоў Савету Міністраў у парлямэнце, а пазьней аб'ядналіся ў групу «Беларусь», якая хутка набыла прыкметы фракцыі (хай і ня ў той ступені, як апазыцыя БНФ) – са сваім

кіраўніцтвам і з парлямэнцкай дысцыплінай.

Толькі некалькі разоў парлямэнцкая большасьць прагаласавала радыкальна на карысьць сувэрэнітэту і дэмакратызацыі грамадзтва – калі на плошчы Незалежнасьці знаходзіліся дзясяткі тысяч людзей (жнівень 1991-га).

У траўні 1990-га «Дэмакратычная плынь» вылучыла сваіх прадстаўнікоў на пасады старшыняў камісіяў ВС. Гэтыя пасады былі істотныя, паколькі старшыні камісіяў аўтаматычна ўваходзілі ў склад Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету – органу, якому на бліжэйшыя гады было наканавана ажыцьцяўляць ролю своеасаблівага «калектыўнага прэзыдэнта» Беларусі. Аднак толькі пяць кандыдатураў ад «дэмплыні» былі абраныя на пасады старшыняў (Садоўскі, Гілевіч, Булахаў, Сасноў, Сьлямнёў), астатнія месцы былі запоўненыя прадстаўнікамі камуністычнай намэнклятуры. Фракцыя БНФ правяла на пасаду старшыні камісіі толькі аднаго дэпутата – Пятра Садоўскага, які ўзначаліў камісію па міжнародных справах. Некаторыя дэпутаты БНФ былі зацьверджаныя намесьнікамі старшыняў і сакратарамі камісіяў.

Пэрыяд з траўня па ліпень 1990 году вызначаўся структурызацыяй Вярхоўнага Савету.

Тут я працытую публікацыю ў «Народнай Волі» Лявона Дзейкі – ён фіксаваў членства дэпутатаў.

Рашэньне аб утварэньні дэпутацкай групы БНФ было прынята на сходзе дэпутатаў Вярхоўнага Савету ў тагачасным Доме кіно, што месьціўся побач з Домам ураду, у Чырвоным касьцёле. Сёньня варта пайменна ўзгадаць тых, хто ўвайшоў у першае палітычнае аб'яднаньне дэпутатаў у вышэйшым заканадаўчым органе Беларусі: Валянцін Голубеў (каардынатар ДГ БНФ), Мікалай Крыжаноўскі, Зянон Пазьняк (старшыня ДГ БНФ), Уладзімер Грыбанаў, Сяргей Навумчык (каардынатар ДГ БНФ), Пятро Садоўскі, Юрась Беленькі, Уладзімер Заблоцкі (намесьнік старшыні ДГ БНФ), Уладзімер Новік (сакратар ДГ БНФ), Ігар Гермянчук, Алег Трусаў (намесьнік старшыні ДГ БНФ), Сяргей Антончык, Мікалай Маркевіч, Генадзь Грушавы, Барыс Гюнтар,

Сяргей Слабчанка, Уладзімер Станкевіч, Лявон Дзейка, Лявонці Зданевіч, Віктар Алампіеў, Галіна Сямдзянава, Мікалай Аксаміт, Віктар Какоўка, Сяргей Папкоў, Лявон Баршчэўскі (каардынатар ДГ БНФ), Вольга Галубовіч – усяго 26 чалавек...

Акрамя вышэйзгаданых 26 сяброў дэпутацкай групы БНФ, у склад апазыцыі ўвайшлі: Васіль Шачак, Міхаіл Сукач, Яўген Глушкевіч, Віталь Малашка, Іван Герасюк, Аляксандар Сасноў, Аляксандар Шут, Аляксандар Паруль, Ігар Пырх, Яўген Цумараў, Станіслаў Бабачонак, Васіль Даўгалёў, Валеры Зяленін, Лявон Тарасенка, Валеры Сярдзюк, Аляксандар Сьпіглазаў, Яўген Новікаў, Павал Холад, Іван Сямашка, Леанід Зьвераў, Генадзь Маісееў, Аляксей Канцэвіч.

Потым на аснове дэпутацкай апазыцыі будзе ўтвораны Дэмакратычны дэпутацкі клюб, які складуць дэпутаты апазыцыі і яшчэ больш за паўсотні акрамя вышэйзгаданых сяброў апазыцыі дэпутатаў Вярхоўнага Савету, якія падтрымлівалі асноўныя палажэньні апазыцыйнай плятформы – дасягненьне сувэрэнітэту Беларусі, стварэньне парлямэнцкай сыстэмы ўлады, усталяваньне дэмакратычнага ладу ў Беларусі, ліквідацыя таталітарызму ў палітыцы, ідэалёгіі, эканоміцы і культуры, ратаваньне народу ад наступстваў чарнобыльскай катастрофы, адраджэньне беларускай культуры і г. д. Яны бралі ўдзел у сумеснай працы над законапраектамі, падтрымліваючы іх падчас абмеркаваньня або галасаваньня, падпісвалі ініцыяваныя апазыцыяй заявы па актуальных палітычных, сацыяльных ды іншых пытаньнях. Такімі вызначыліся найперш наступныя дэпутаты: Міхаіл Мацюшонак, Пятро Драган, Уладзімер Сапронаў, Уладзімер Хвошч, Генадзь Карпенка, Віктар Радамысьльскі. Пад асобнымі заявамі ставілі свае подпісы Віктар Ганчар, Анатоль Лябедзька, Анатоль Вярцінскі, Ніл Гілевіч, Сяргей Бярдаўцаў, Яўген Бядулін, Анатоль Барысенка, Ніна Салдатава, Міхаіл Сьлямнёў, Рыгор Вячэрскі, Анатоль Лятко, Эдуард Багаўцоў, Мікалай Каўбаска, Аляксей Даўлюд, Анатоль Кузьма, Аляксандар Шыпко, Генадзь Нікіцін, Ігар Палагеча, Леанід Сечка, Анатоль Янец, Віктар Уласенка, Анатоль Волкаў, Уладзімер Лазарэвіч, Раман Плоцкі, Уладзімер Шаўцоў, Барыс Савіцкі, Уладзімер Цялежнікаў, Аляксей Шаўнін і іншыя.

У апошнім сьпісе Лявон Дзейка пералічыў тых, хто меў хоць нейкае дачыненьне да дзейнасьці апазыцыі; шмат хто з гэтых асобаў ужо ў 1992 годзе перайшлі на бок намэнклятуры. Як вядома, у склад каманды Лукашэнкі ўвайшлі Віктар Ганчар, Анатоль Лябедзька. Зрэшты, і сярод «фармальных» сяброў апазыцыі БНФ былі тыя, хто ў апошнія гады дзейнасьці ВС выступаў супраць прапановаў апазыцыі – Уладзімер Новік і Яўген Новікаў.

З аднаго боку, у параўнаньні зь іншымі прадстаўнікамі нацыянальнай эліты, дэпутаты ВС мелі непараўнальна большы ўплыў як на палітычныя працэсы, гэтак і на дзейнасьць дзяржаўных органаў улады. Гэтаму ў значнай ступені спрыяў сам дэпутацкі статус. У 1990–1992 гадах я займаў пасаду сакратара Камісіі ВС у справах галоснасьці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека. У сыстэме, дзе вызначэньню статусу дзяржаўных службоўцаў надавалася падкрэсьленая ўвага, гэтая пасада фармальна была вышэйшая за міністэрскую, бо аплачвалася вышэй. Памятаецца, як аднойчы, падчас спрэчкі на нейкай нарадзе, Станіслаў Шушкевіч абарваў нейкага супрацоўніка Саўміну, які выказваўся ў бок дэпутата ледзь не з абразай: «Не забывайцеся, хто Вы, а хто ён. Вы – чыноўнік, а ён – саноўнік».

Аднак гэтыя «саноўнікі» былі пазбаўленыя колькі-небудзь рэальнай улады – калі не належалі да намэнклятуры, якая імгненна вылічвала розьніцу па прынцыпе «свой–чужы».

Дэпутаты БНФ даволі лёгка – калі б пажадалі – маглі б здабыць сабе, напрыклад, кватэру ў самым прэстыжным раёне Менску – дастаткова было зьвярнуцца да кіраўніцтва Саўміну. Да гонару дэпутатаў БНФ – ніхто гэтым не скарыстаўся (і таму калі Лукашэнку спатрэбілася заплямiць апазыцыянэраў «карупцыяй», ён не знайшоў нічога, акрамя «іншамарак» Заблоцкага і Навумчыка – я быў купіў чатырнаццацігадовае аўто, якое літаральна сыпалася; машына Заблоцкага была не нашмат навейшая).

Але і дзеля грамадзкіх справаў (напрыклад, дапамогі нейкай газэце з паперай, тады гэта была вострая праблема) трэба было

зьвяртацца да чыноўнікаў адпаведнага аддзелу Саўміну. Мой зварот да дырэктара друкарні ня меў ніякага выніку – званок самага звычайнага супрацоўніка апарату Саўміну вырашаў усё. У большасьці выпадкаў самы нізкапастаўлены чыноўнік райвыканкаму мог болей, чым дэпутат Вярхоўнага Савету – калі гэта дэпутат БНФ. Тут ужо працавала чынавенская, карпаратыўная салідарнасьць. З другога боку, пры гэтым дэпутат мог атрымаць аўдыенцыю ў старшыні Саўміну Кебіча (прычым, у той самы дзень і, як правіла, па-за чаргой) ці нейкага зь ягоных намесьнікаў, і звычайна на просьбы накладаліся станоўчыя рэзалюцыі. Менавіта такім чынам былі прасунутыя шмат якія ініцыятывы адукацыйна-культурніцкага характару (напрыклад, Кебіч падпісаў распараджэньне аб стварэньні Коласаўскага ліцэю).

Словам, можна было нечага дамагчыся, але толькі папрасіўшы Кебіча. Аднак зразумела, што па кожным пытаньні да прэм'ера ці віцэ-прэм'ера зьвяртацца ня будзеш (да таго ж, гэта апрыёры ставіла нас у сытуацыю пэўнай маральнай залежнасьці – неяк няёмка на наступны дзень пасьля такога візыту крытыкаваць прэм'ера з парлямэнцкай трыбуны).

Ня менш важная, чым заканадаўчая дзейнасьць (а паводле ўплыву на грамадзкую сьвядомасьць дык і непараўнальна больш выніковая), была прапагандысцкая праца дэпутатаў апазыцыі БНФ. Першыя сэсіі ВС ішлі ў жывой радыётрансьляцыі; пазьней тэлебачаньне і радыё перадавалі даволі падрабязныя рэпартажы з сэсіяў, а выступы ў «Розным» перадаваліся без купюраў аж да 1995 году. Менавіта з вуснаў дэпутатаў праз тэлерадыётрансьляцыю большасьць жыхароў Беларусі пачулі раней ім невядомыя гістарычныя факты, а галоўнае – аргумэнтацыю неабходнасьці сувэрэннага існаваньня. Скарыстоўваўся дэпутацкі статус і для выступаў на тэлебачаньні і радыё, а таксама ў пэрыядычным друку (хаця кіраўніцтва дзяржаўных СМІ ігнаравала добрую палову такіх зваротаў).

ПРА ТАКТЫКУ І ДЫСЦЫПЛІНУ

Тыя, хто сачыў за падзеямі ў Вярхоўным Савеце праз СМІ,

назіралі вонкавы бок дзейнасьці апазыцыі БНФ: выступы дэпутатаў, дыскусіі, прыняцьце законаў. Аднак гэта была ўсяго толькі частка палітычнай дзейнасьці.

Паводле рэглямэнту, сэсіі ВС павінны былі склікацца два разы на год, але ў рэальнасьці яны зьбіраліся часьцей і звычайна цягнуліся пару месяцаў (за рэдкімі выключэньнямі – напрыклад, самая вызначальная, гістарычная пазачарговая сэсія ў жніўні 1991 году была і самай кароткай – два дні).

Паміж сэсіямі дзейнасьць дэпутатаў апазыцыі не спынялася. Працавалі адмысловыя групы з удзелам экспэртаў (на пачатку – эканамісты А. Станкевіч, У. Тарасаў, пазьней В. Масквіч, с. Гусак, акадэмік Р. Гарэцкі, член-карэспандэнт акадэміі І. Нікітчанка, прафэсар У. Кулажанка – гэта толькі некаторыя імёны).

Увосень 1990 году прадстаўнікі парлямэнцкай большасьці былі зьдзіўленыя, калі апазыцыя БНФ вынесла на 2-ю сэсію некалькі дзясяткаў заканадаўчых прапаноў, пераважна датычных эканомікі і дзяржаўнага будаўніцтва. З гэтага моманту з вуснаў нашых апанэнтаў, ва ўсялякім разе ў Авальнай залі, практычна не гучалі папрокі, што «БНФ выступае толькі за беларускую мову і не займаецца эканомікай» (што, аднак, пазьней пачалі пісаць некаторыя лібэральныя палітычныя аналітыкі). Апазыцыяй БНФ была падрыхтаваная праграма пераходу Беларусі да рынкавых узаемаадносінаў, падмацаваная адпаведнымі законапраектамі.

Камуністы казалі, што ў апазыцыі існуе жорсткая дысцыпліна; усе галасуюць так, як скажа Пазьняк. Насамрэч палітычная тактыка выпрацоўвалася ў часе дыскусіяў, меркаваньне Пазьняка як палітычнага лідэра было, бясспрэчна, важнае, асабліва з улікам ягоных бязьмежных (азначэньне Васіля Быкава) аналітычных здольнасьцяў і нейкай надзвычайнай палітычнай інтуіцыі. Аднак я не сказаў бы, што з боку Пазьняка назіраўся «інтэлектуальны дыктат»: што да тактыкі, дык досыць часта пад уплывам іншых меркаваньняў ён зьмяняў пазыцыю (лінія на дзяржаўны сувэрэнітэт, вядома, заставалася непахіснай).

Тактыка дзеяньняў на сэсіі абіралася з улікам магчымых варыянтаў паводзінаў нашых апанэнтаў. Паколькі мы складалі 1/10 частку парлямэнту, дык усё даводзілася пралічваць вельмі дакладна. І ўжо калі тактыка прымалася – на сэсіі ў Авальнай залі яе трэба было трымацца ўсім. Вядома, часам пры абмеркаваньнях ці галасаваньні сытуацыя мянялася, раіцца не было калі, рашэньне даводзілася прымаць імгненна, і ў такіх выпадках вызначальнае слова заставалася, зразумела, за Пазьняком (але гэта – клясычны парлямэнцкі закон, які ў Брытаніі існуе ўжо некалькі дзесяцігодзьдзяў).

Усе дэпутаты апазыцыі ведалі стратэгічныя мэты і тактыку іх дасягненьня. Таму калі ў нейкіх выпадках, напрыклад, нехта з нашых апанэнтаў (часам і сам Кебіч) не маглі зьвязацца з Пазьняком, яны выходзілі ці на Баршчэўскага, ці на Голубева, ці на мяне (мы выконвалі функцыі каардынатараў апазыцыі) і маглі быць пэўныя, што дамоўленасьці будуць выконвацца. Зразумела, што ў такім разе мы інфармавалі Пазьняка і іншых дэпутатаў. Зрэшты, нейкая герархія ўнутры апазыцыі адсутнічала, функцыі каардынатараў былі хутчэй тэхнічныя, чым палітычныя.

У тых выпадках, дзе прынцып узгодненасьці (ці, калі хочаце, палітычнай дысцыпліны) парушаўся, наступствы маглі быць вельмі сур'ёзныя. Так здарылася ў 1994 годзе, калі намесьнік Пазьняка па апазыцыі і лідэр БСДГ Алег Трусаў разам з паплечнікамі нечакана падтрымалі на прэзыдэнцкіх выбарах не Пазьняка, а Шушкевіча.

І наадварот – падчас прыманьня Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце менавіта дакладна абраная тактыка прывяла да посьпеху (падрабязна пра гэта – пазьней).

Былі і ўнікальныя прыёмы, якія можна было скарыстаць толькі аднойчы.

Так, неяк парлямэнцкая большасьць вынесла заканадаўчую прапанову аб адкліканьні дэпутатаў – мэханізм быў такі, што даваў магчымасьць намэнклятуры адклікаць практычна ўсіх апазыцыйных дэпутатаў; нават калі б мы не вылазілі са сваіх акруг, забыўшыся на палітыку і займаліся толькі

асфальтаваньнем вуліцаў, пракладкай каналізацыі і г. д (для чаго яшчэ трэба было выпрасіць той асфальт ды трубы) – нас бы ўсё роўна пазбавілі дэпутацкіх мандатаў.

Сытуацыя ўзьнікла цяжкая, крытычная і, як падавалася – безвыходная. Намэнклятура была ўпэўненая, што заблякаваць гэты закон нам ня ўдасца.

І тут пры абмеркаваньні на карысьць закону выступіў Валянцін Голубеў. А Зянон Пазьняк падышоў да мікрафона і заявіў, што звычайна ў нас парадак прыняцьця законаў спачатку ў першым чытаньні, потым у другім, а гэты закон так дасканала распрацаваны, што трэба прымаць адразу ў другім чытаньні. Дэпутаты, натуральна, пагаджаюцца.

Абмеркаваньне скончылася – час галасаваць. Пазьняк уздымаецца зь месца: «Так, апазыцыя – галасуем! Сяргей (гэта да мяне, бо я сядзеў ля дзьвярэй), паглядзі, хто там з нашых у фае, хай бягуць у залю!» Баршчэўскі, Маркевіч, Гюнтэр з розных сэктараў з залі, гучна: «Хлопцы, дык галасуем, як дамовіліся! Цісьнем «за».

Сьпікер разгублены – а трэба ўжо вымаўляць: «Хто – «за»? Прашу галасаваць». Дэпутаты-камуністы бачаць, што БНФ чамусьці вельмі зацікаўлены ў законе – і значная іх частка «за» не галасуе. Мы, натуральна, таксама не галасуем (кнопка для галасаваньня прыкрывалася пласьцінай, і калі ты жадаў – сусед мог ня бачыць, калі ты яе цісьнеш). Усё вырашылі літаральна дзесяць сэкундаў. Законапраект галасоў не дабраў. Паколькі, паводле прапановы Пазьняка, галасавалася адразу ў другім чытаньні, і закон ня быў прыняты – ён не павінен галасавацца зноў, павінен быць адпраўлены на дапрацоўку. Гэта быў апошні дзень сэсіі – у наступную сэсію палажэньне аб адкліканьні дэпутатаў ужо не ўключалі; мы правялі зь некаторымі кулюарную працу. Але ў той раз ужо празь пяць хвілінаў усе ўсё зразумелі, ды і мы не маглі стрымаць сьмеху, калі камуністы нам казалі: «Ну, вы нас і надурылі! Больш не паддамося». Зразумела, што такі прыём скарыстаць ізноў было б немагчыма.

Ну а па-за межамі Авальнай залі Дому ўраду ды офісу БНФ на

Варвашэні, 8 у нас былі сустрэчы на прадпрыемствах, у інстытутах ды розных арганізацыях як у Менску, гэтак і ў рэгіёнах. Так, увосень 1994 году мы аб'ездзілі дзясяткі раёнаў Заходняй Беларусі – сотні выступаў у гарадах, мястэчках і вёсках.

Вышэй я спаслаўся на клясычную практыку парлямэнцкай дысцыпліны Вялікабрытаніі. Аднак у Лёндане дэпутаты ведаюць, што выкананьне партыйных патрабаваньняў дасьць ім магчымасьць пераабрацца на іншы тэрмін, магчыма, заняць нейкую пасаду ў парлямэнце, а пры зьмене ўлады – увайсьці ў склад ураду. Такіх гарантыяў дэпутатам апазыцыі БНФ ніхто не даваў, дый даць ня мог. Усё трымалася на веры ў найвышэйшую мэту – Незалежнасьць Беларусі.

Ну і, нарэшце, падаецца нялішнім абнародаваць фінансавы аспэкт нашай дзейнасьці.

За ўсе гады існаваньня апазыцыі БНФ на распрацоўку ці экспэртны аналіз законапраектаў, Дэклярацыі і Канстытуцыі, увогуле на палітычную дзейнасьць мы не атрымалі ад замежных дзяржаваў ці небеларускіх арганізацыяў ніводнага, як цяпер модна казаць, «гранту», ніводнага даляра, рубля, франка, маркі, злотага, кроны і г. д.

ДЭКЛЯРАЦЫЯ АБ СУВЭРЭНІТЭЦЕ: ПАКУЛЬ ШТО – У СКЛАДЗЕ СССР

Паказальна, што ў траўні 1990 году ў Сойме БНФ яшчэ вяліся дыскусіі наконт незалежнасьці.

«Супраць незалежнасьці цяпер выказаўся Юры Дракахруст. Людзі не гатовыя да аддзяленьня. («А хіба мы ўжо заўтра выходзім?» – кінуў рэпліку Ўладзімер Крукоўскі.) Таму незалежнасьць ня можа быць сёньня галоўным палітычным лёзунгам. «Трэба, – працягваў Ю. Дракахруст, – узьняць галоўны лёзунг цяперашніх пераўтварэньняў у ГДР: «Камунізм – больш ніколі!» З-за лёзунгу незалежнасьці мы прайгралі выбары». Міхась Чарняўскі: «Нельга сказаць, што мы прайгралі выбары. Да выбараў мы ня мелі нічога, а цяпер маем

дэпутатаў». (Свабода. Травень 1990. № 5–6).

Зазначу, што я ні ў якім разе не хачу закінуць Юр'ю Дракахрусту папроку ў жаданьні пазбавіць Беларусь незалежнасьці наагул; гаворка на Сойме ішла пра тое, што павінна быць спачатку – дэмакратызацыя альбо незалежнасьць. У нечым тая дыскусія паказальная, калі ўлічыць далейшае разьмежаваньне ў дэмлягеры па лініі «агульныя дэмакраты» – «незалежнікі».

Але трэба сказаць, што аднадушша наконт незалежнасьці не было і ў дэпутатаў, якія ўвайшлі ў «Дэмакратычную плынь», якая пазьней пераўтварылася ў «Дэмакратычны клюб». Усьведамленьне неабходнасьці сувэрэнітэту прыйшло паступова, хоць і даволі хутка: ужо праз два месяцы пасьля пачатку першай сэсіі да дэпутатаў ад БНФ далучыліся тыя, хто меў аб праграме Фронту цьмянае ўяўленьне альбо нават канкураваў на выбарах з фронтаўскімі кандыдатамі. Шмат у чым паспрыялі гэтаму цынізм, зь якім дэпутаты – прадстаўнікі камуністычнай намэнклятуры адкідвалі кадравыя прапановы «Дэмклюбу» падчас выбараў старшыняў парлямэнцкіх камісіяў.

11 траўня Сойм БНФ заявіў, што дасягненьне сувэрэнітэту немагчымае ў складзе СССР, а ў пачатку ліпеня 1990 году канфэрэнцыя БНФ прыняла праект Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце.

Спачатку дэпутаты-камуністы і чуць не хацелі ні пра якую дэклярацыю; пасьля прыняцьця аналягічнага дакумэнту Вярхоўным Саветам РСФСР пра яе неабходнасьць заявіў і старшыня Вярхоўнага Савету Мікалай Дземянцей.

27 ліпеня была прынятая Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце БССР.

Пазьней Станіслаў Шушкевіч будзе казаць, што дэпутаты БНФ ня бралі ўдзелу ў галасаваньні, сышлі з залі – некарэктна замоўчваючы вельмі істотныя акалічнасьці.

Па-першае, сама Дэклярацыя была напісаная дэпутатамі БНФ.

Па-другое, мы бралі ўдзел у абмеркаваньні ўсіх артыкулаў і галасаваньні па іх.

Прапанаваныя намі палажэньні Дэклярацыі, хоць і пасьля гарачых дыскусіяў, але, збольшага, прымаліся. Заставаўся апошні артыкул, у які прыхільнікі СССР жадалі ўключыць пункт аб неабходнасьці падпісаньня «саюзнай дамовы». Да таго ж большасьць адмаўляла нашае патрабаваньне – надаць Дэклярацыі статус канстытуцыйнай сілы (гэта значыць, у выпадку супярэчнасьці Канстытуцыі і законаў СССР Канстытуцыі і законам Беларусі перавагу б мелі апошнія).

Узьнікала і яшчэ адна пагроза – пасьля паартыкульнага галасаваньня Дэклярацыя павінна была прымацца «ў цэлым», і тут магла пачацца рэвізія раней прынятых палажэньняў, іх выхалошчваньне (гэта было б парушэньнем рэглямэнту, але нязначным). Ішло да таго, што Дэклярацыя ўвогуле магла быць не прынятая. Так, дэпутат Леанід Козік (сябра Прэзыдыюму ВС, пры Лукашэнку – лідэр праўладных прафсаюзаў) падчас абмеркаваньня заявіў, што «калі мы прымем тую Дэклярацыю, дык яна накіраваная на 100 працэнтаў на прамы выхад з Саюзу».

У гэтых умовах Пазьняк прапанаваў дэпутатам БНФ, калі большасьць будзе настойваць на «саюзнай дамове» і адмовіцца ад канстытуцыйнасьці Дэклярацыі – выйсьці з Авальнай залі. Гэта мела б псыхалягічны эфэкт, заблытала б дэпутатаў, яны б дзейнічалі ад «супрацьлеглага» («насуперак» БНФ). У фракцыі БНФ адбылася дыскусія. Прапанова была вельмі рызыкоўная, але Пазьняку ўдалося пераканаць у яе слушнасьці; некалькі чалавек усё ж вырашылі пакінуць у залі ў якасьці назіральнікаў.

Фактычна, у той момант Пазьняк паставіў на карту свой аўтарытэт сярод калегаў і палітычную будучыню; калі б тактыка не спрацавала і Дэклярацыя была не прынятая, ці адбылася б рэвізія ўжо прынятых артыкулаў, ён успрымаўся б сваімі ж паплечнікамі як авантурыст. Аднак мэта сувэрэнітэту была нагэтулькі важная, што ён пайшоў на такую рызыку, будучы ўпэўнены, што пераможа.

Калі дайшлі да апошняга артыкулу, была адкінутая канстытуцыйнасьць Дэклярацыі і ўведзеная «саюзная дамова»; дэпутаты БНФ заявілі, што пакідаюць залю і ня ўдзельнічаюць у галасаваньні. Сабраліся ў памяшканьні за прэзыдыюмам, дзе па тэлевізары ішла трансьляцыя (той самы пакой, дзе ў час Машэрава зьбіралася ў перапынках сэсіяў вышэйшае кіраўніцтва).

Я быў сярод пакінутых назіральнікаў і бачыў, які эфэкт зрабіў выхад з залі двух дзясяткаў дэпутатаў на чале з Пазьняком на дэпутатаў-камуністаў: «Яны ня хочуць галасаваць! Ну дык мы прагаласуем».

У выніку Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце БССР была прынятая (праўда, з «саюзнай дамовай» і без канстытуцыйнага статусу, што будзе выпраўлена ў жніўні 1991-га). Вядома, нават ва «ўсечаным» варыянце Дэклярацыя была значным крокам наперад – да таго ж, на працягу двухдзённых дэбатаў 26–27 ліпеня нам удалося адстаяць некаторыя істотныя палажэньні, напрыклад, бязьядзернасьць Беларусі.

НАПАЎСУВЭРЭННАСЬЦЬ

У той жа дзень, 27 ліпеня, было заяўлена пра ўтварэньне апазыцыі ў Вярхоўным Савеце – да гэтага мы называліся фракцыяй. Аднак ні фракцыяў, ні апазыцыі кіраўніцтва Вярхоўнага Савету не прызнавала – юрыдычна існавалі толькі камісіі ВС, аддзелы ў апараце ВС, а апазыцыі БНФ нібыта і не было. Не было – юрыдычна – і самога БНФ. Праўда, Пазьняку ўдалося «выбіць» пакой на трэцім паверсе Дому ўраду, у правым крыле (калі стаць тварам да фасаду). Насуперак нашым чаканьням, нічым нам не спрыяў і Станіслаў Шушкевіч, які пасаду першага намесьніка старшыні ВС ня мог бы заняць без падтрымкі дэпутатаў БНФ.

Зь ліпеня 1990 году па жнівень 1991-га доўжыўся пэрыяд напаўсувэрэннасьці Беларусі.

Апазыцыя БНФ у гэты час распрацавала і падала на разгляд камісіяў і Вярхоўнага Савету некалькі дзясяткаў

законапраектаў, накіраваных найперш на ўмацаваньне беларускай дзяржаўнасьці – аб уласнай грашова-фінансавай банкаўскай сыстэме, а таксама рынкавых формах гаспадараньня (сярод якіх і блёк законапраектаў, аб'яднаных у Зямельны кодэкс, з правам прыватнай уласнасьці на зямлю).

Але практычна ўсе законапраекты апазыцыі БНФ былі адрынутыя пракамуністычнай парлямэнцкай большасьцю, і хаця шмат якія нашыя напрацоўкі былі прынятыя ў выглядзе асобных артыкулаў у законах, Беларусь імкліва губляла час, які прыбалты ды палякі выкарыстоўвалі для стварэньня рынкавай эканомікі.

У сакавіку 1991 году з ініцыятывы М. Гарбачова быў праведзены рэфэрэндум аб захаваньні СССР. Сам «плебісцыт» у Беларусі быў прызначаны пры адсутнасьці беларускага Закону аб рэфэрэндуме, з парушэньнямі нават так званага «саюзнага» заканадаўства, з фальсыфікацыямі. Агітацыя вялася на карысьць Саюзу – Пазьняку, Сямдзянавай і мне адмовілі ў тэлеэтэры для агітацыі супраць захаваньня СССР. Зрэшты, галоўнае было нават ня ў гэтым. Пазыцыя БНФ палягала ў тым, што, паколькі СССР утвараўся не праз рэфэрэндум, а шляхам падпісаньня дамовы, не рэфэрэндум павінен вызначаць і лёс імпэрыі. З гэтага гледзішча пазьнейшае падпісаньне Віскулёўскага пагадненьня аб скасаваньні Саюзу і ратыфікацыя яго Вярхоўнымі Саветамі краінаў-заснавальніц СССР было абсалютна легітымным рашэньнем і, скажам так, цалкам юрыдычна адэкватным падпісаньню Дамовы аб утварэньні СССР у Маскве ў 1922 годзе.

Тым часам Крэмль губляў кантроль над сытуацыяй у рэспубліках; эканамічная палітыка Гарбачова, якая абапіралася на інтарэсы вайскова-прамысловага комплексу, прывяла да паглыбленьня інфляцыі і ўзьнікненьня дэфіцыту на самыя элемэнтарныя тавары (посуд, электралямпачкі, цыгарэты і г. д.).

У красавіку 1991 году некалькі дзясяткаў тысяч рабочых менскіх прадпрыемстваў распачалі страйк і выйшлі на плошчу перад Домам ураду. Першапачатковай прычынай было падвышэньне цэнаў; аднак ужо ў першы дзень актывістам БНФ

удалося прапанаваць страйкамаўцам палітычныя лёзунгі, у тым ліку і патрабаваньне аб новых выбарах у Вярхоўны Савет. Але кіраўніцтва Савету Міністраў уцягнула некаторых лідэраў страйкаму ў бясплённыя перамовы пра падвышэньне заробкаў, і страйк скончыўся. А празь некалькі месяцаў інфляцыя «зьела» і тыя сьціплыя падвышэньні зарплатаў.

Літаратар Валянцін Акудовіч у адным з інтэрвію сказаў, што рабочыя выйшлі з трывогай за існаваньне Савецкага Саюзу. Словы пра трывогу – выразны прыклад таго, як пад нейкія «высновы» (інтэрвію было прысьвечанае «нізьвяржэньню» Пазьняка) падбіваюцца не адпаведныя сапраўднасьці факты. Сярод патрабаваньняў удзельнікаў страйку няма пункту аб захаваньні СССР; яго і не магло быць, таму што адным зь лідэраў страйкаму самімі ж рабочымі быў абраны дэпутат апазыцыі БНФ Сяргей Антончык.

Больш за тое. Патрабаваньне сувэрэнітэту гучала ўжо і з вуснаў кіраўнікоў прадпрыемстваў. Так, у траўні 1991 году мне як дэпутату ад Віцебскай акругі быў перададзены «Зварот сходу прадстаўнікоў працоўных калектываў прамысловых прадпрыемстваў г. Віцебску», падпісаны дырэктарамі, кіраўнікамі прафкамаў і старшынямі страйкамаў пяці самых буйных прадпрыемстваў гораду – станкабудаўнічага заводу імя Кірава, заводу заточных станкоў, станкабудаўнічага заводу імя Камінтэрну, тэлевізійнага заводу і вытворчага аб'яднаньня «Маналіт», на якіх працавала некалькі дзясяткаў тысяч чалавек. У пераліку палітычных патрабаваньняў першым стаіць: «Надаць Дэклярацыі аб сувэрэнітэце Беларусі канстытуцыйны характар».

ЖНІВЕНЬ 1991: ПУТЧ І НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ

Раніцай 19 жніўня 1991 году маскоўскае тэлебачаньне і радыё паведаміла пра адхіленьне ад пасады Міхаіла Гарбачова і стварэньне Дзяржаўнага камітэту ў справе надзвычайнага становішча (у гісторыю ён увайшоў з расейскай абрэвіятурай – ГКЧП).

Мы не былі ад Гарбачова ў вялікім захапленьні, уласьцівым

маскоўскай лібэральнай інтэлігенцыі і іх менскім адэптам. Асабіста ў мяне апошнія ілюзіі зьніклі пасьля кароткай размовы зь ім у лютым 1991 году пра дзеяньні кіраўніцтва СССР падчас Чарнобылю. Генэральны сакратар ЦК КПСС і прэзыдэнт ядзернай звышдзяржавы паводзіў сябе, як вучань, які выправіў ацэнку ў дзёньніку. У той жа дзень, выступаючы ў беларускай Акадэміі навук, Гарбачоў абрынуўся з рэзкімі выпадамі на дэмакратаў; я сядзеў у першым радзе, Міхаіл Сяргеевіч паказваў на мяне пальцам, тэлекамэры трансьлявалі, і цешча ў Глуску думала, што гэта – канец. Аднак было абсалютна зразумела, што пры адным зь яго папярэднікаў – Андропаву – за мае пытаньні мяне б чакаў арышт, а пры яшчэ ранейшым папярэдніку, Сталіну – расстрэл. Разумелі мы і тое, што замест адносна лібэральнага, хоць і непасьлядоўнага Гарбачова на трон можа ўзысьці пасьлядоўны ў сваёй рэакцыйнасьці вылучэнец вайскова-прамысловага комплексу.

Яшчэ за некалькі тыдняў да абвяшчэньня ГКЧП у СМІ зьявілася заява групы «дзеячаў літаратуры і мастацтва» пра небясьпеку распаду СССР з заклікам прыняць рашучыя меры; ГКЧП і стаў выразьнікам вяртаньня ў старыя часы. Наяўнасьць у ГКЧП сілавых міністраў і кіраўнікоў вайскова-прамысловага комплексу не пакідала ілюзіяў наконт антыдэмакратычнасьці і рэпрэсіўнасьці мэтадаў, якімі будуць захоўваць СССР ад распаду.

Той жа раніцай 19 жніўня дэпутаты апазыцыі БНФ сабраліся ў Вярхоўным Савеце і зрабілі шэраг заяваў, ацаніўшы падзеі як спробу захаваць савецкую імпэрыю шляхам усталяваньня вайсковай дыктатуры. Мы (Л. Баршчэўскі, Ю. Беленькі, І. Гермянчук, В. Голубеў, У. Заблоцкі ды аўтар гэтых радкоў) пайшлі да старшыні Вярхоўнага Савету М. Дземянцея і запатрабавалі ад яго неадкладна склікаць сэсію ВС. «Беларускі народ добра памятае жудасныя злачынствы сталінскай дыктатуры і не даруе патураньня тым, хто зноў імкнецца растаптаць яго сувэрэнітэт і свабоду», – гаварылася ў нашым звароце да Дземянцея. Той сказаў нам, што нібыта Гарбачоў сам падаў у адстаўку і што на працягу тыдня будзе скліканая сэсія Вярхоўнага Савету СССР – таму зьбіраць сэсію беларускага парлямэнту няма патрэбы.

Тады ж, 19 жніўня, мы накіравалі звароты да старшыні Саўміну В. Кебіча, міністра ўнутраных справаў, старшыні КДБ, у якіх канстатавалі, што «спроба антыканстытуцыйнага перавароту, зробленая... групай палітычных авантурыстаў у Маскве, накіраваная супраць дэмакратыі, законных органаў улады і сувэрэнітэту рэспублік, зьяўляецца дзяржаўным злачынствам. Безадказныя дзеяньні путчыстаў у СССР не павінны мець ніякай падтрымкі ў Беларусі. Усе іхныя распараджэньні зьяўляюцца незаконнымі і не павінны выконвацца ніякімі органамі ўлады Беларускай ССР. Мы заклікаем Вас праявіць дзяржаўную мудрасьць, вытрымку, вернасьць беларускай рэспубліцы...». І старшыня КДБ, і міністар унутраных справаў занялі нэўтральную пазыцыю (але пазьней стала вядома, што на чыгуначнай станцыі былі падрыхтаваныя эшалёны для «транспартаваньня» тых, хто, як выказаўся ў той дзень Дземянцей, «падбухторвае людзей»).

Кіраўніцтва ЦК КПБ на чале зь першым сакратаром Малафеевым цалкам падтрымала дзеяньні ГКЧП, абавязаўшы партыйныя камітэты выконваць яго распараджэньні. Старшыня Дзяржтэлерадыё А. Сталяроў спыніў вяшчаньне беларускага каналу і пераключыў яго на Маскву, з трансьляцыяй распараджэньняў ГКЧП. Члену Прэзыдыюму ВС М. Сьлямнёву, які хацеў выступіць супраць ГКЧП, было адмоўлена ў радыёэтэры.

Увечары 19 жніўня перад будынкам Дому ўраду мы правялі мітынг – на яго прыйшло некалькі соцень чалавек. Зянон Пазьняк ды іншыя дэпутаты БНФ заклікалі не выконваць распараджэньняў ГКЧП. Мітынг адбыўся і 20 жніўня, ужо больш шматлюдны. Да патрабаваньня аб скліканьні сэсіі далучыліся і іншыя дэпутаты, у тым ліку першы намесьнік старшыні ВС с. Шушкевіч. Аднак шмат хто вырашыў заняць пазыцыю чаканьня, і на 13 гадзінаў 20 жніўня мы мелі ўсяго 33 подпісы дэпутатаў (для скліканьня нечарговай сэсіі іх патрабавалася 120).

Увечары 21 жніўня ГКЧП пацярпеў паразу. У 16 гадзінаў на чале з Пазьняком мы зноў былі ў кабінэце М. Дземянцея; цяпер ужо ён быў вымушаны прымаць рашэньне аб скліканьні

нечарговай сэсіі, якая прызначалася на 24 жніўня.

На наступны дзень нам далі час у жывым тэлеэтэры. У сваёй заяве дэпутаты апазыцыі БНФ выказалі ўпэўненасьць, што «народ Беларусі ў гэтыя дні канчаткова зразумеў неабходнасьць поўнай незалежнасьці Рэспублікі... Толькі ў свабодзе і незалежнасьці наша будучыня». Акрамя таго, мы запатрабавалі неадкладнага прыняцьця новага Закону аб выбарах дэпутатаў, праект якога мы перадалі ў Прэзыдыюм ВС яшчэ ў траўні), і прызначэньня новых парлямэнцкіх выбараў.

Намэнклятура знаходзілася ў стане разгубленасьці, камісіі ВС ня мелі абсалютна ніякіх напрацовак, і за тры дні і ночы (21–24 жніўня) мы падрыхтавалі пакет законапраектаў, якія былі неабходныя для абвяшчэньня і замацаваньня незалежнасьці. Цяпер, калі я прыгадваю тыя суткі, не магу падзяліць дзень і ноч – здаецца, яны зьліліся ў адно.

Патрабаваньне аб наданьні Дэкларацыі аб сувэрэнітэце статусу канстытуцыйнай сілы, зразумела, было галоўным – нароўні з патрабаваньнем аб роспуску КПБ–КПСС і адстаўцы тых, хто падчас путчу ня выканаў сваіх канстытуцыйных абавязкаў. Так, прапаноўвалася «асудзіць бязьдзейнасьць і безадказнасьць у справе абароны Канстытуцыі і сувэрэнітэту Беларускай ССР членаў Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету БССР Дземянцея М. І, Шаладонава В. І., Гаркуна У. г., Гілевіча Н. с., Грыба М. І., Жуковіча Я. Б., Жукоўскага М. Д., Капытава М. Я., Каратчэні І. М., Козіка Л. П., Кулічкова А. М., Котава с. М., Леўчыка У. К., Міцько П. А., Савіцкага Б. П., Смоляра І. М., Сівіцкага Д. А., Унучкі Р. І. у час спробы дзяржаўнага перавароту 19–21 жніўня г. г. Лічыць немагчымым далейшае выкананьне імі абавязкаў членаў Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету Беларускай ССР... Выказаць недавер і вызваліць ад займаных пасадаў Старшыню Савету Міністраў БССР Кебіча В. Ф. і яго намесьнікаў, міністра юстыцыі Беларускай ССР Дашука Л. А., Старшыню Дзяржтэлерадыё БССР Сталярова А. Р., кіраўніцтва Пракуратуры БССР за бязьдзейнасьць і неканстытуцыйныя паводзіны падчас спробы дзяржаўнага перавароту».

Я адмыслова прыводжу тут гэтую даўгую цытату, таму што адразу пасьля сэсіі ў бок дэпутатаў апазыцыі БНФ пасыпаліся

папрокі, што, нібыта, мы «купіліся» на згоду нашых палітычных апанэнтаў прыняць сувэрэнітэт і ледзь не падпісалі зь імі пагадненьня.

Сэсія ВС праходзіла 24–25 жніўня – БНФ вывеў на плошчу перад Домам ураду некалькі тысяч чалавек, і «голас народу» даходзіў у фае перад Авальнай заляй. Пазьней шмат пісалі, што нібыта сакратара ЦК КПБ В. Ціхіню ледзь уратавалі ад лінчаваньня – насамрэч ніхто Ціхіню не чапаў, яго проста аплявалі; праўда, актывістам БНФ сапраўды прыйшлося «эвакуяваць» яго з плошчы.

Большасьць з нашых заканадаўчых прапановаў на сэсіі не прайшла. І ўсё ж удалося дасягнуць галоўнага – Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце набыла статус канстытуцыйнай сілы. Акрамя таго, была прыпыненая дзейнасьць КПБ–КПСС, пайшоў у адстаўку М. Дземянцей.

Аднак сябры Прэзыдыюму ВС і кіраўніцтва Саўміну засталіся на сваіх пасадах. Нам проста не хапіла сілаў (а канкрэтна – парлямэнцкіх галасоў), каб зьдзейсьніць тое, што было зроблена ў Чэхіі і іншых краінах – цалкам зьмяніць вярхушку дзяржаўнага апарату, паставіць новых людзей. Былая камуністычная прэса імгненна пачала папярэджваць, каб, барані Божа, не пачалося «паляваньне на вядзьмарак». Супраць такога паляваньня выступіў і Станіслаў Шушкевіч.

Было праігнараванае і нашае патрабаваньне аб новых парлямэнцкіх выбарах.

ЧАМУ НЕ БЫЛО ШТУРМУ

І тут ёсьць адна важная акалічнасьць – запатрабаваўшы адыходу з палітычнай сцэны намэнклятуры, забароны КПБ–КПСС, Пазьняк у першы ж дзень аднаўленьня незалежнасьці зьвярнуўся да «былых камуністаў» з заклікам далучыцца да стваральнай працы для адбудовы дзяржаўнасьці. Нам была абсалютна зразумелая неабходнасьць пазбаўленьня былых камуністаў вышэйшых кіраўнічых пасадаў. Аднак у кампартыі было васямсот тысяч чалавек – і нельга было забараніць ім

працаваць паводле спэцыяльнасьці. Гэты заклік Пазьняка не надрукавала ніводнае афіцыйнае выданьне, пра яго ўвогуле ня згадваюць – намэнклятуры, старой ды новай, было куды выгадней ляпіць з Пазьняка чалавека, які «будзе страляць ды вешаць камуністаў» (пройдзе час, і былыя камуністы ў лукашэнкаўскіх структурах будуць звальняць людзей з працы за адну толькі прыналежнасьць да Народнага Фронту).

Паказальная пазыцыя лібэральных, «агульнадэмакратычных» публіцыстаў, якая выявілася ў тым ліку і ў дыскусіі ў расейскамоўнай газэце «Знамя юности».

«Такім чынам, мы свабодныя і незалежныя... Але чаму, чаму, вяртаюся я да ранейшай думкі, няма народнай радасьці, таго, што называюць грамадзкім уздымам? – пытаўся Сямён Букчын у артыкуле ў «Знамя юности» за 27 жніўня. – Незалежнасьць рэспублікі мы атрымалі з потных рук партакратычнай большасьці ў Вярхоўным Савеце... І гэта абражае маю годнасьць грамадзяніна».

«Сама ідэя сувэрэнітэту не вінаватая ў тым, што да яе прысмакталася розная камуністычная шваль. Мне асабіста ўсё роўна, з чыіх рук атрыманыя свабода і незалежнасьць», – адказаў яму Віталь Цыганкоў. Букчын на гэта: «Вас задавальняе намэнклятурна-партыйная сувэрэнізацыя Беларусі?.. Можна сотні разоў заклікаць да прыватызацыі, да рынку і г. д., але вызначаць гэтыя працэсы, тым ня менш, будзе тая ж намэнклятура. І Ваш, Віталь, чэкісцкі заклік «быць пільнымі», каб «яны не скарысталі наш сувэрэнітэт», абсалютна бясплённы. Яны ім ужо скарысталіся. І вельмі звыкла і своечасова».

Букчын ня бачыў (альбо не пажадаў бачыць), што сувэрэнітэту дамагалася ня партнамэнклятура – гэта было якраз патрабаваньне тысяч людзей на плошчы. Не сказаў ён ні слова й пра тое, што апазыцыя БНФ запатрабавала і адставак, і новых выбараў.

Ну, а тое, што за сувэрэнітэт прагаласавалі і «рукі партакратыі» – дык такі ўжо быў на той момант Вярхоўны Савет (зрэшты, ні раней, ні пазьней лепшага і не было). Мы якраз і скарысталі

парлямэнцкі мэханізм (у дадзеным выпадку – так, у тым ліку і мэханізм палітычнага ціску), каб шляхам галасаваньня канстытуцыйна зацьвердзіць незалежнасьць.

Дзякуй богу, што нам удалося здабыць незалежнасьць палітычным, парлямэнцкім мэтадам.

Гісторыя, аднак, ведае багата прыкладаў, калі сувэрэнітэт дасягаўся зусім іншымі спосабамі, коштам соцень і тысяч ахвяраў, коштам крыві. У некаторых нацыяў такое змаганьне цягнецца дзесяцігодзьдзямі, а колькасьць палеглых пры гэтым вымяраецца дзясяткамі тысяч.

Паўтараю, што ў нас не было ніякай магчымасьці зьмяніць вышэйшую ўладу ў Менску і ў рэгіёнах. Пры тым, што палітычныя патрабаваньні пра такую зьмену ў тыя жнівеньскія дні мы выказалі – і з парлямэнцкай трыбуны, і праз СМІ.

Былі вычарпаныя ўсе легальныя спосабы – заставаліся нелегітымныя.

А менавіта тыя, якія, паводле меркаваньня некаторых сёньняшніх камэнтатараў, мы маглі б скарыстаць: заклікаць да захопу будынкаў ЦК, КДБ, сілавых міністэрстваў.

Што да ЦК – дык разам зь Сяргеем Антончыкам і Валянцінам Голубевым мы літаральна выкінулі Малафеева з кабінэту першага сакратара (былы машэраўскі, потым – шушкевічаўскі, а цяпер лукашэнкаўскі кабінэт). Будынак ЦК быў апячатаны.

Для захопу ж іншых месцаў нам неабходны былі зусім ня тыя сілы, на якія мы маглі разьлічваць. І галоўнае – ні КДБ, ні Мінабароны яшчэ юрыдычна не знаходзіліся ў падпарадкаваньні Менску (так было да сьнежня 1991-га, да Віскулёў. У Літве абаронцы Вярхоўнага Савету мелі хоць нейкую зброю – у нас яе не было абсалютна. У нас не было нават дзясятка ўзброеных людзей).

Не было ніякай гарантыі, што не пачнецца стралянінa па тых, каго б мы падштурхнулі на захоп будынкаў (фактычна, па моладзі, па жанчынах і дзецях, якія сабраліся на плошчы

Незалежнасьці). Таму ўсе гэтыя развагі пра «захопы» – зь ліку нерэальных варыянтаў.

А вось што было рэальна ў тыя дні – гэта выяўленьне палітычнай волі Станіслава Шушкевіча, які пасьля адстаўкі Дземянцея заняў найвышэйшую ў краіне пасаду і атрымаў непараўнальна большыя магчымасьці, чым лідэр апазыцыі Пазьняк. Аднак Станіслаў Станіслававіч імгненна пачаў шукаць «згоду» з тымі, хто праз два гады адправіць яго ў адстаўку.

НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ – ВЫНІК ЗМАГАНЬНЯ ПАКАЛЕНЬНЯЎ

Ёсьць і яшчэ адна тэорыя, якая раз-пораз гучыць падчас ацэнак падзеяў 1991 году: «беларусам незалежнасьць звалілася зь неба», бо «ўсё вырашылі падзеі ў Маскве».

Паказальныя ў гэтым сэнсе словы таго ж Акудовіча. «Плыня таго бурапеннага часу самахоць рабіла патрэбную нам справу, яна сама разбурыла бэрлінскую сьцяну, камуністычны блёк, Савецкі Саюз... Дарэчы, менавіта ў эпохі тэктанічных ператрусаў найлепей бачная ўся пустата ды нікчэмнасьць палітыкі і палітыкаў. Нічога яны... не маглі тады зрабіць: ні стрымаць вялікага распаду, ні скіраваць яго ў патрэбнае ім рэчышча... Бадай тут якраз да тэмы будзе згадаць, што бліскучае ўмельства прыўлашчваньня чужога як свайго напрыканцы 1980-х – у першай палове 1990-х прадэманстраваў Зянон Пазьняк. Ён, ачоліўшы нацыянальна-дэмакратычны рух, які фармаваўся літаральна на маршы, на ўсе сто (ці мо і значна болей) адсоткаў скарыстаўся плёнам расейскай дэмакратычнай публіцыстыкі, прыбалтыйскіх народных франтоў, заходняй прапаганды і дыпляматыі, інтэлектуальным наробкам і палітычнай энэргіяй уласна дэмакратычнай і лібэральна настроенай інтэлігенцыі, – гаворыць Акудовіч і далей абвяргае сам сябе: – Калі б слова «геній» можна было дастасоўваць да палітыка, то трэба было б прызнаць, што ў тую пару Зянон Пазьняк быў геніяльным палітыкам, паколькі скарыстаўся з сытуацыі значна больш, чым яна мела ў сваім патэнцыяле для нацыянальна-вызвольнага руху» (Свободные новости. 2002. 25 апреля).

З практычнага гледзішча, такі падыход лягічна павінен прывесьці да высновы, што ніякая палітычная дзейнасьць, ніякае змаганьне не патрэбныя ўвогуле. Напрыклад, змаганьне з дыктатурай: усё адно, рана ці позна, кожнага дыктатара прыбірае Бог.

Навідавоку і перакручваньне фактаў: калі ж гэта «расейская лібэральная публіцыстыка» хоць слова напісала пра неабходнасьць сувэрэнітэту Беларусі ці адраджэньня беларускай мовы? Наконт жа выкарыстаньня Пазьняком інтэлектуальнага наробку нацыянальнай эліты пагаджуся, дадаўшы сюды, праўда, і ранейшыя пакаленьні – а інакш і быць не магло, бо дасягненьне сувэрэнітэту было марай і мэтай і Каліноўскага, і Купалы…

Зрэшты, у мяне няма жаданьня камэнтаваць супярэчлівыя сэнтэнцыі гэтага літаратара – здаецца, большасьць ягоных тэкстаў якраз і пабудаваная на прынцыпе абсурду, і калі знаходзяцца ахвотныя чытаць і ўспрымаць падобнае – дык калі ласка. Іншая справа, што гэты экстравагантны прынцып абсалютна некарэктны для аналізу рэальных палітычных падзеяў.

Але ёсьць і сур’ёзныя дасьледчыкі, якія грунтуюцца не на аргумэнтах кшталту «плыні бурапеннага часу», а на аб’ектыўным і цьвярозым дасьледаваньні магчымых варыянтаў – і вось такія выказваньні вартыя аналізу.

Так, у якасьці пацьверджаньня тэорыі «сувэрэнітэт зь неба» прыводзіцца прыклад рэспублік, дзе нацыянальна-вызвольныя рухі практычна адсутнічалі – але, вось жа, пасьля жніўня 1991 году і яны атрымалі сувэрэнітэт.

Пры аналізе прычынаў распаду любой імпэрыі цяжка аспрэчваць важнасьць падзеяў у яе сталіцы. Гісторыя ж ведае і выпадкі, калі тэрыторыі адна за другой адвальваліся, але цэнтар працягваў выконваць свае імпэрскія функцыі, і таму краіна захоўвала ўсе прыкметы імпэрыі (такой застаецца Расейская Фэдэрацыя). Падзеі ў Маскве ў жніўні 1991-га, бясспрэчна, мелі вызначальны характар як сыгнал да распаду імпэрыі – але трэба ўлічваць, што шмат у чым яны самі былі

перадвызначаныя сытуацыяй у тагачасных саюзных рэспубліках.

Найперш – нацыянальна-вызвольнымі рухамі, якія дамагаліся сувэрэннасьці сваіх рэспублік, і Ельцын быў вымушаны ўлічваць такія настроі. Менавіта на гэтых тэндэнцыях, дарэчы, і згуляў Ельцын падчас амаль чатырохмесячнага (жнівень–сьнежань 1991-га) супрацьстаяньня з Гарбачовым, які спрабаваў фарсіраваць падпісаньне «саюзнай дамовы» (так званы «новаагароўскі працэс»). Ужо не кажу пра тое, што менавіта падзеі ў Курапатах на Дзяды 1988 году сталіся ці ня першым гучным масавым выступам на тагачасных «імпэрскіх ускраінах», першым гучным сыгналам Маскве аб закаце савецкай імпэрскай эры.

Уласна, Масква толькі на некалькі дзён аслабіла імпэрскія ланцугі – і мы гэтым імгненна скарысталіся. Ну, а калі б не скарысталіся?

Не запатрабуй дэпутаты апазыцыі БНФ неадкладнага наданьня Дэклярацыі аб сувэрэнітэце статусу канстытуцыйнай сілы – зусім верагодна, што захаваўся б статус-кво; прыгадаем, што лідэр кампартыі Малафееў (а камуністы былі ў ВС у большасьці) казаў толькі пра эканамічную самастойнасьць рэспублікі. І менавіта з боку апазыцыі БНФ ішоў штодзённы прэсінг на Станіслава Шушкевіча ўсе тыя месяцы, што папярэднічалі Віскулям – з патрабаваньнем не падпісваць гарбачоўскую «саюзную дамову».

Без канстытуцыйнасьці Дэклярацыі Масква магла б утрымліваць Беларусь як частку сваёй тэрыторыі – пры поўнай згодзе Захаду (ён і згаджаўся з гэтым аж да Віскулёў). Ці былі ў Масквы сілы нэўтралізаваць у такой сытуацыі (пры згодзе Захаду) нацыянальна-вызвольныя выступы ў Беларусі? Бясспрэчна, былі.

У падобных сытуацыях істотнае значэньне мае пазыцыя сілавых структураў і, найперш, войска. Неўзабаве пасьля аднаўленьня незалежнасьці было ўтворанае Міністэрства абароны і быў прызначаны выканаўца абавязкаў міністра (генэрал Пятро Чавус). Аднак міністэрства складалася зь некалькіх кабінэтаў.

А арміі і дывізіі ўсё яшчэ знаходзіліся ў падпарадкаваньні начальніка акругі генэрала Кастэнкі, які непасрэдна падпарадкоўваўся маскоўскаму Генштабу. І па камандзе з Масквы апошні дзейнічаў бы гэтак, як ён і дзейнічаў у дні ГКЧП – у інтарэсах Масквы. Падобным чынам паводзіў сябе ў Малдове расейскі генэрал Лебедзь – і Маскве ўдалося, фактычна, адкалоць Прыднястроўе.

У Беларусі было моцнае войска, якое, акрамя стратэгічных ракетных ды дапаможных фармаваньняў, складалася з трох танкавых арміяў (гэта дзевяць танкавых і мотастралковых дывізіяў). Эфэктыўнасьць выкарыстаньня такіх войскаў для задушэньня пратэстных выступаў была пацьверджаная ў Будапэшце, Празе і ў крыху меншых маштабах у Польшчы. У студзені 1991 году ў Вільні тактыка не спрацавала, але толькі таму, што на абарону парлямэнту выйшла некалькі соцень тысяч літоўцаў (у тыя дні я быў у літоўскім парлямэнце і ведаю, пра што кажу). У Менску столькі б людзей на абарону Вярхоўнага Савету ня выйшла – зрэшты, войскам і не спатрэбілася б яго штурмаваць, калі б ён заняў (а ён потым і заняў) прамаскоўскую пазыцыю.

Некаторыя палітолягі, імкнучыся зьменшыць значнасьць канстытуцыйнасьці Дэклярацыі аб сувэрэнітэце, супрацьпастаўляюць ёй як лёсавызначальную падзею падпісаньне Віскулёўскіх пагадненьняў.

Калі ўжо разглядаць падзеі ў такім ракурсе, дык ёсьць некаторыя акалічнасьці, якія ніяк не дазваляюць успрымаць 25 жніўня 1991 году як другарадную падзею ў параўнаньні зь Віскулямі.

Маю на ўвазе дакумэнты сакрэтных фондаў, якія нядаўна былі абнародаваныя.

Ніводны аналітык ня будзе аспрэчваць ролі сілавых, рэпрэсіўных структураў у працэсе стрымліваньня сувэрэнізацыі рэспублік былога СССР. На працягу дзесяцігодзьдзяў выступы нацыянальных сілаў падаўляліся з рознай ступеньню жорсткасьці. Прыклады – кастрычнік 1988-га ў Менску, красавік 1989-га ў Тбілісі; нарэшце, нават шматтысячны выступ

літоўцаў у студзені 1991-га быў прыдушаны спэцвойскамі КДБ.

Аднак аналіз абнародаванных фондаў ЦК КПСС і КДБ СССР паказвае, што ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў рэпрэсіўныя мэтады патрабавалі фармальнай легітымізацыі і абапіраліся на прававыя рашэньні (іншая рэч – наколькі дэмакратычна прымаліся тыя рашэньні).

Так, пастановай Кабінэту Міністраў СССР ад 10 красавіка 1991 году і загадам старшыні КДБ СССР ад 17 красавіка таго ж году было створанае Ўпраўленьне па кіраўніцтве адмысловымі часткамі войскаў КДБ (так званае Ўпраўленьне «СЧ»). Гэтыя спэцчасткі павінны былі ўдзельнічаць у «забесьпячэньні канстытуцыйнага ладу, бясьпекі і тэрытарыяльнай цэласнасьці СССР».

Заўважым: спэцчасткі створаныя пасьля т. зв. сакавіцкага «рэфэрэндуму» аб захаваньні СССР; КДБ атрымаў у выніку «рэфэрэндуму» і «волевыяўленьня народу» нібыта легітымную падставу для сілавой абароны існаваньня СССР.

У жніўні былыя савецкія рэспублікі абвясьцілі незалежнасьць, пераважна праз наданьне Дэклярацыям статусу канстытуцыйнай сілы. Некалькі месяцаў Гарбачоў спрабаваў захаваць СССР, але 22 кастрычніка 1991 году Дзяржсавет СССР (акрамя прэзыдэнта СССР у яго ўваходзілі кіраўнікі рэспублік) скасоўвае КДБ СССР і стварае службы выведкі, аховы мяжы, так званую міжрэспубліканскую службу бясьпекі.

А 3 сьнежня 1991 году прэзыдэнт Гарбачоў падпісвае закон, які абавязвае «лічыць органы бясьпекі рэспублік у выключнай юрысдыкцыі сувэрэнных рэспублік (дзяржаваў)» (Лубянка. Органы ВЧК–ОГПУ–НКВД–НКГБ–МГБ–МВД–КГБ. 1917–1991. – Международный Фонд «Демократия»: Москва. Издательство Йельского университета, США, 2003).

Такім чынам, юрыдычная ліквідацыя агульнаімпэрскай рэспрэсіўнай сыстэмы адбылася пасьля прыняцьця Дэклярацыяў – і перад Віскулямі (ці не адкрыла менавіта гэтая ліквідацыя Ельцыну, Краўчуку і Шушкевічу шлях да падпісаньня празь некалькі дзён пагадненьня – тэма асобнага

дасьледаваньня).

Нарэшце – і, магчыма, гэта галоўнае, – адсутнасьць канстытуцыйнасьці Дэклярацыі, якая была нададзеная ў жніўні 1991-га, стварыла б зусім іншую атмасфэру ў вышэйшых уладных і элітных колах Беларусі ў сьнежні. Да Віскулёў справа і не дайшла б. Бо пасьля канстытуцыялізацыі Дэклярацыі Шушкевіч і Кебіч былі проста вымушаныя рабіць наступны крок (пра рэальную пазыцыю Шушкевіча ў дні перад Віскулямі гаворка ніжэй).

І тое, што нам у жніўні 1991-га ўдалося «зламаць» Кебіча, павярнуць яго ў бок да сувэрэнітэту, адыграла выключную ролю пры падпісаньні, а затым ратыфікацыі Віскулёўскіх пагадненьняў.

Дарэчы, наколькі я магу меркаваць, ініцыятыва сустрэчы кіраўнікоў трох краінаў зыходзіла ад Кебіча. Ва ўсялякім разе, пра неабходнасьць такога спатканьня я пачуў ад яго яшчэ ўвосень 1991 году, падчас размовы ў фае Дому ўраду. Адзін з удзельнікаў той увогуле выпадковай, кароткай сустрэчы – дэпутат Яўген Глушкевіч – ужо не жыве. Акрамя мяне і, зразумела, Кебіча, гэта мог бы пацьвердзіць чацьверты ўдзельнік той размовы – Аляксандар Лукашэнка.

Віскулёўскія пагадненьні ад імя Беларусі падпісаў не адзін Шушкевіч, як прынята лічыць, а яшчэ і Кебіч як старшыня ўраду (адпаведна, падпісаліся і кіраўнікі ўрадаў Расеі і Ўкраіны). Падаецца, што менавіта наяўнасьць подпісу Кебіча, які ў сьнежні 1991 году ў значнай ступені кантраляваў Вярхоўны Савет, і паспрыяла таму, што дэпутаты (за выключэньнем аднаго толькі Ціхіні) прагаласавалі за ратыфікацыю пагадненьняў аб ліквідацыі СССР.

Пры ўсёй крытычнасьці ацэнкі дзейнасьці Кебіча ў наступны пэрыяд, вось гэтую акалічнасьць канца 1991 году нельга выкрасьліць з гісторыі.

Словам, калі б рашэньне аб Дэклярацыі 25 жніўня не было прынятае, Расея ўжо ў 1992 годзе магла б паглынуць Беларусь, паколькі ў рэальнасьці адразу пасьля Віскулёў пачаўся працэс

энэргічнага ўцягваньня нашай краіны ў арбіту расейскіх палітычных і вайсковых інтарэсаў.

Нарэшце, тыя, хто гаворыць пра «дармовасьць» Незалежнасьці, забываюцца на ахвяры, якія пакаленьні беларусаў на працягу стагодзьдзяў прыносілі дзеля таго, што ў жніўні 1991-га ўдалося зрабіць бяскроўна.

Увогуле ж, прыкра апраўдвацца за дзейнасьць у справе дасягненьня дзяржаўнай незалежнасьці. Прыкра, але ня дзіўна, калі ведаць беларускую спэцыфіку аплёўваньня. Падобнае магчыма, бадай, толькі ў Беларусі – і больш нідзе ў сьвеце. Падазраю, што менавіта з прычыны гэтай беларускай спэцыфікі прыйдзецца яшчэ не аднойчы выслухоўваць словы розных экзальтаваных камэнтатараў пра «плыні бурапеннага часу», якія ўсё робяць «самахоць».

У суцяшэньне ж паплечнікам па апазыцыі (калі яны маюць у ім патрэбу) магу толькі выказаць прагноз, што ў гісторыі застануцца ня гэтыя ацэнкі, а словы Васіля Быкава: «Што ж датычыцца апазыцыі ў Вярхоўным Савеце, дык я думаю, што ў тых умовах, у той час менавіта апазыцыя Беларускага Народнага Фронту зрабіла гераічны ўчынак з таго, што дамаглася менавіта гэтай сувэрэннасьці. І чым далей, незалежна ад таго, чым гэта скончыцца, незалежна ад лёсу Беларусі наагул, у гістарычным вымярэньні гэта будзе вельмі значна, гэта будзе ацэнена празь вякі».

Бясспрэчна, што гэтая ацэнка належыць да ўсіх актывістаў БНФ, якія дамагаліся сувэрэнітэту, ды ўсіх тых грамадзянаў, якія прыйшлі ў жнівеньскія дні 1991 году на плошчу Незалежнасьці, каб спраўдзіць мару пакаленьняў беларусаў.

СА СЬЦЯГАМ, З «ПАГОНЯЙ», АЛЕ БЯЗ ГІМНУ

Фактычна, апошнія дні жніўня – гэта адзіны час, калі нацыянальныя сілы маглі эфэктыўна ўплываць у тым ліку на дзеяньні органаў выканаўчай улады. Дарэчы, сьцьвярджэньні пра тое, што Кебіч нібыта прапаноўваў Пазьняку «ўзяць сфэру адукацыі і культуры», – ня больш, чым міт. Ніякай падобнай

прапановы не было (як і не прапаноўвалася прадстаўнікам БНФ увайсьці ў склад ураду). Усё: стварэньне новых беларускамоўных навучальных установаў, гістарычных часопісаў і гэтак далей – даводзілася «выбіваць». Аднак калі гэта яшчэ ўдавалася, дык нашыя патрабаваньні аб нацыянальнай валюце ды ўласным войску кіраўніцтвам новаўтворанай краіны не ўспрымаліся. Ні парлямэнцкая большасьць, ні Савет Міністраў не імкнуліся скарыстаць час і замацаваць незалежнасьць стварэньнем неабходных атрыбутаў дзяржаўнасьці – што актыўна рабілася ў краінах Балтыі.

19 верасьня ў якасьці дзяржаўных сымбаляў былі зацьверджаныя бел-чырвона-белы сьцяг і герб «Пагоня». Але зроблена гэта было вялізнымі намаганьнямі – дастаткова сказаць, што рашэньні былі прынятыя «голас у голас». Іншымі словамі, адсутнасьць хаця б аднаго прыхільніка незалежніцкай сымболікі ў залі не дала б патрэбнага выніку галасаваньня. Таму аўтар гэтых радкоў шчасьлівы, што раніцай у той дзень разам з дэпутатам Міхаілам Сьлямнёвым адмовіўся ад паездкі ў Малдову на выбары ў якасьці назіральніка.

Істотна паўплывалі на вынікі галасаваньня выступы на карысьць нацыянальных сымбаляў былога старшыні Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету, а ў той момант сябра Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР Георгія Таразевіча і прэзыдэнта Акадэміі навук Уладзімера Платонава.

Заставалася зьмяніць гімн. Быў абвешчаны конкурс. У лістападзе Алесь Адамовіч, Рыгор Барадулін і Васіль Быкаў выступілі са зваротам, у якім прапанавалі зрабіць дзяржаўным гімнам «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Арыгінал гэтага звароту на просьбу Васіля Ўладзімеравіча Быкава я перадаў у сакратарыят Вярхоўнага Савету; ён павінен знаходзіцца ў архіве ВС (сабе пакінуў копію): «Ці трэба нам новы, сьвежастворaны, не ахрышчаны часам і гісторыяй каньюнктурны гімн? Ці хутка ён стане адной з важнейшых сьвятыняў нацыі? Асабліва калі ў гістарычнай народнай памяці яшчэ велічна гучыць колішні, ахрышчаны нешчасьлівым лёсам (дарэчы, тым, які хрысьціў беларускі народ і саму Рэспубліку Беларусь) гімн на словы Макара Краўцова. А між тым, гэта

велічная мэлёдыя і выдатны тэкст. І ня так важна, што некаторыя моманты яго не адэкватныя сучаснай палітыцы Беларусі, што яны, можа, палітычна састарэлыя. Гэта зусім ня той выпадак, калі патрэбна злабадзённасьць. Тэксты гімнаў цывілізаваных краінаў звычайна архаічныя, але яны нязьменна кананічныя, ахрышчаны крывавай гісторыяй, і ў тым іх мастацкая і духоўная сіла. Мы прапануем узаконіць гімн на словы М. Краўцова, ажыцьцявіўшы тым важнейшы дзяржаўны акт па шляху да сапраўднай сувэрэннасьці Рэспублікі Беларусь».

Словы гэтыя, аднак, не былі пачутыя: ня выключана, што некаторым хацелася самім выступіць у якасьці стваральнікаў гімну. Конкурс доўжыўся не адзін год – аж да таго часу, пакуль да ўлады не прайшоў Лукашэнка, які «мадэрнізаваў» савецкі гімн. Курыраваў конкурс старшыня парлямэнцкай камісіі па адукацыі Ніл Гілевіч.

Былі прапановы зрабіць дзяржаўным гімнам і «Магутны Божа». Зрэшты, я перакананы, што, калі б камісія Гілевіча апэратыўна ўнесла адзін з гэтых твораў на разгляд ВС, ужо ў лістападзе 1991-га большасьць дэпутатаў прагаласавала б супраць; за два месяцы пракамуністычная намэнклятура ачуняла ад пасьляпутчавага шоку і, нягледзячы на супраціў апазыцыі БНФ, імкліва адваявала свае пазыцыі ў Вярхоўным Савеце. Не ў малой ступені спрыяла гэтаму і палітыка новаабранага сьпікера Станіслава Шушкевіча, накіраваная на пошукі «згоды».

СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ: «ДАЗВОЛЬЦЕ МНЕ НЕ СТАНАВІЦЦА ПАД ВАШЫЯ ШТАНДАРЫ»

9 лістапада апазыцыя БНФ прыняла заяву, у якой адзначалася, што Дэклярацыя аб сувэрэнітэце застаецца толькі на паперы. Войска, спэцслужбы (у тым ліку КДБ) знаходзіліся збольшага ў падпарадкаваньні Масквы. Замежная палітыка таксама вызначалася ў Маскве (усё яшчэ дзейнічала «саюзнае» МЗС). Беларусь ня мела ўласных грошай. Беларусь ізноў страчвала час – замест каб ствараць рэальныя інстытуцыі дзяржаўнасьці, вышэйшае кіраўніцтва (С. Шушкевіч і В. Кебіч) уцягнулася ў навязаны М. Гарбачовым так званы «новаагароўскі працэс» у

справе падпісаньня «саюзнай дамовы», гэтым разам – на падставе канфэдэрацыі.

Тым ня менш, прыняцьцё былымі рэспублікамі Дэкларацыяў аб сувэрэнітэце давала свой плён.

На пачатку сьнежня стала вядома, што ў Менск прыедуць прэзыдэнт Расеі Барыс Ельцын і прэзыдэнт Украіны Леанід Краўчук (ва Ўкраіне прайшоў рэфэрэндум, дзе ўкраінцы выказаліся за незалежнасьць ад Масквы).

5 сьнежня старшыня ВС с. Шушкевіч сустрэўся з дэпутатамі апазыцыі БНФ (гэта быў першы і апошні раз за ўсе гады яго сьпікерства, калі ён прыйшоў у памяшканьне апазыцыі). Мы выказалі занепакоенасьць ягоным удзелам у працэсе стварэньня «саюзнай дамовы», заявіўшы, што Беларусі патрэбныя ўласнае войска і ўласныя грошы. Вось некалькі фрагмэнтаў той сустрэчы:

«*Голубеў*: Незалежнасьць. Мы ня ведаем Вашай пазыцыі ў адносінах да будучыні Беларусі. Саюзная дамова: Вы сказалі, што Вы – за падпісаньне эканамічнага пагадненьня, заявілі, што палітычнага пагадненьня ня будзе, але цяпер гэта робіце. Мы тут ня бачым плюсаў для Беларусі. Чаму старшыня ВС не праводзіць палітыкі па войску? Ельцын можа пераўтварыць яго ў акупацыйнае войска... Адносіны да ўвядзеньня ўласнай валюты – адзін месяц купонаў прывядзе да дыскрэдытацыі.

Пазьняк: Уяўленьне ад Вашай дзейнасьці – ігнараваньне гэтых фактараў, што падводзіць да страты сувэрэнітэту, крызісу эканомікі. Палітык павінен мець апору. Вы разьвіваліся на нашых вачах, ня можаце абаперціся ні на Фронт, ні на камуністаў. Абапіраецеся на палітыку Ельцына і Гарбачова. Мы стаім на парозе згубы сувэрэнітэту.

Шушкевіч: На здаровы сэнс абапіраюся. У нас з вамі розныя погляды на свабоду і дэмакратыю. Наконт Саюзнай дамовы – дазвольце мне не станавіцца пад вашыя штандары... Вялікае войска ніколі ня ўтворыцца, Ельцын можа паставіць войскі супроць Беларусі вельмі проста...

Пазьняк: Мы былі ініцыятарамі, каб склікаць сэсію надзвычайную. Мы не пераканалі Вярхоўны Савет. Але цяпер апынуліся ў найбольш небясьпечным становішчы. Альбо мы возьмем гэтае войска і прывядзём яго да прысягі...

Шушкевіч: Вы – дрэнны тактык і лічыце сябе вялікім стратэгам.

Пазьняк: Вы ў гэтай сытуацыі несяце адказнасьць...

Шушкевіч: Вы, мышы, сабраліся і хочаце кату павесіць званочак на хвост. Хоць хто-небудзь з вас працаваў ва ўрадзе? Начхаць нам на саюз з Малдовай і Прыбалтыкай – у іх нафты няма! Так, я чакаю, што Масква можа пайсьці на параліч эканомікі Беларусі. Але ў нашым урадзе не такія дурні...

Пазьняк: Вы правільна ацэньваеце Расею. Але чаму тады Вашая палітыка ўвесь час абапіраецца на Расею? А не на Прыбалтыку, Захад?

Шушкевіч: Да палітыкі, якую можа праводзіць дзяржава – нам трэба ісьці яшчэ доўга».

Сярод іншага, Шушкевіч на той сустрэчы сказаў: «Я езьдзіў, ежджу і буду езьдзіць у Нова-Агарова» (на абмеркаваньне з Гарбачовым «саюзнай дамовы»).

Такім чынам, у выказваньнях Шушкевіча не было нічога, што давала б падставы прагназаваць тое, што адбылося празь некалькі дзён у Віскулях – наадварот, ён выступаў за «саюзную дамову» і нярэзкія дзеяньні. Верагодна, у Віскулях меў месца ўплыў Ельцына і Краўчука.

І тым ня менш, ужо празь некалькі дзён Шушкевіч паставіў подпіс пад Віскулёўскім пагадненьнем аб ліквідацыі СССР, што, бясспрэчна, упісала ягонае імя ў гісторыю.

Аднак адначасна зь ліквідацыяй Саюзу было заяўлена аб стварэньні СНД, у чым мы пабачылі небясьпеку рэстаўрацыі старой імпэрыі, але ў новай форме. Мы лічылі, што ў справе сувэрэнітэту Беларусь павінна заняць пазыцыю, аналягічную Літве, Латвіі і Эстоніі: незалежнасьць і ніякіх палітычных альбо

вайсковых саюзаў з Масквой.

Ратыфікацыя Віскулёўскага пагадненьня ў сьнежні 1991 году, відавочна, была апошнім радыкальным крокам Вярхоўнага Савету ў кірунку ўмацаваньня дзяржаўнасьці.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ І ЯЕ ПРАЦІЎНІКІ

Актывісты Народнага Фронту выкарыстоўвалі ўсе магчымасьці для беларусізацыі краіны, нібыта адчуваючы, што часу застаецца ўсё менш і менш.

Дзякуючы намаганьням Камісіі па культуры і захаваньні гістарычнай спадчыны ВС, у лістападзе 1991-га загадам Міністэрства адукацыі на базе ранейшага нядзельнага ліцэю ствараецца Беларускі гуманітарны ліцэй. А 15 студзеня 1992 году распараджэньнем Савету Міністраў яму перадаецца будынак на Кірава, 21. У Менску і ў іншых гарадах павялічваецца колькасьць беларускамоўных школаў, выходзяць новыя падручнікі, выдаецца гістарычная літаратура, друкуюцца раней забароненыя творы. Праўда, друкуюцца абмежаваным накладам – у параўнаньні зь нізкапробнай расейскамоўнай літаратурай, на якой новаўтвораныя камэрцыйныя структуры зарабляюць капіталы.

Прыклад таго, што беларускамоўны друк можа мець камэрцыйны посьпех, паказаў наш калега па дэпутацкай апазыцыі Ігар Гермянчук. Ён рэдагаваў «Свабоду», якая ня толькі выдавалася па-беларуску, але ў 1991–1994 гадах выходзіла на тарашкевіцы, і пры гэтым яе наклад быў пазначаны 90 тысяч асобнікаў. Газэта выдавалася зусім невялікім калектывам (у рэгіёнах быў толькі адзін карэспандэнт – Сяргей Астраўцоў), чыноўнікі не спрыялі ні ў друкаваньні, ні ў распаўсюдзе, і ўсё ж у пачатку 1990-х «Свабода» Ігара Герменчука была адной з найбольш папулярных газэтаў.

Беларускамоўныя незалежныя газэты ствараліся і ў рэгіёнах, прычым некаторыя выданьні былі піянэрамі ў спэцыялізаваных галінах – так, у Віцебску Ўладзіслаў Яндзюк пачаў выдаваць

«Кампутарную прахтыку».

У 1992 годзе з 1 верасьня малодшыя клясы сярэдніх школаў перайшлі на беларускую мову. Дзесяць гадоў такой практыкі – і на пачатку XXI стагодзьдзя праблемы выжываньня беларускай мовы папросту не існавала б.

Аднак палітыка беларусізацыі сустрэла вялізнае непрыманьне праімпэрскіх сілаў – прычым пачалося з так званых «нізавых ініцыятываў».

У чэрвені ў парлямэнцкай «Народнай газеце» намесьнік яе рэдактара Іван Макаловіч канстатаваў, што «ў Беларусі працэс нацыянальнага Адраджэньня ідзе надзвычай марудна, квола, робяцца толькі першыя няўпэўненыя крокі, але нават яны выклікаюць абурэньне расейскамоўнага насельніцтва». Гэтак быў пракамэнтаваны ліст групы бацькоў з Рагачова (17 подпісаў), у якім тыя называлі Закон аб мовах «антынародным», палітыку беларусізацыі – «генацыдам», запалохваючы «спальваньнем на плошчах усёй рускай літаратуры» і г. д. Завяршаўся ліст заклікам да бацькоў першаклясьнікаў «не прыводзіць дзяцей у школы 1 верасьня» – у беларускія клясы – «пакуль ня будзе забясьпечанае свабоднае права выбару, раўнапраўе навучаньня як для беларускамоўных, так і для расейскамоўных дзяцей...».

Супраць беларусізацыі былі скіраваныя і выступы газэты «Фемида», якую выдаваў кіраўнік фірмы «Эрыдан» Аляксандар Патупа. На аналягічных пазыцыях знаходзілася і газэта «Европейское время», якую рэдагаваў Сямён Букчын. Шэраг падобных расейскамоўных выданьняў выходзіў пры падтрымцы Фонду Сораса, некаторыя прадстаўнікі якога ў Беларусі насаджалі «лібэральныя каштоўнасьці» і ў лепшым разе вельмі насьцярожана ставіліся да праяваў нацыянальнага Адраджэньня.

Ужо летам 1992 году падкантрольныя Кебічу расейскамоўныя выданьні (якія мелі вялікі наклад) пачалі пераходзіць на антынацыянальныя пазыцыі.

Тут прывяду ў прыклад публікацыю ў газэце Савету Міністраў

«Рэспубліка» ад 10 чэрвеня 1992 году: «Хіба не цікава, што 16-гадовы чалавек думае пра наш час», – пытаецца рэдакцыя ва ўступным слове і аддае пад развагі падлетка цэлую паласу (тым часам як ні ў водным нумары ніколі «Рэспубліка» не надрукавала ніводнага радка дэпутатаў апазыцыі БНФ).

Увесь артыкул – гэта трызьненьне па разбуранай савецкай імпэрыі, абарона «патрыётаў, якія стаялі за вялікую і непадзельную Айчыну», апэляцыя да гарбачоўскага «рэфэрэндуму» 1991 году аб захаваньні СССР, бо «воляй лёсу мы апынуліся юрыдычна і палітычна ізаляванымі ад Расеі», але, спадзяецца аўтар, «гэта часовы разрыў».

Фактычна, распад савецкай імпэрыі і стварэньне сувэрэннай дзяржавы падаюцца як вялізнае зло – і гэта ва ўрадавай дзяржаўнай газэце. Была заяўленая катэгарычная падтрымка пракамуністычнаму Вярхоўнаму Савету і Савету Міністраў і сказана, што «вельмі неабходна супрацьпаставіць «нацыянал-дэмакратам», як яны самі сябе называюць, магутную патрыятычную арганізацыю, якая б аб'яднала людзей, якія ўсьведамляюць пагібельнасьць залежнасьці ад Захаду».

Аўтар гэтай публікацыі – Усевалад Янчэўскі. (Зусім ня дзіўна, што празь некалькі гадоў ён узначаліць пралукашэнкаўскую моладзевую арганізацыю («лукамол») – дзіўнавата тое, што пасьля такіх заяваў яго возьме да сябе ў каманду Станіслаў Шушкевіч.)

Можна заўважыць супярэчнасьць: з аднаго боку, у саўмінаўскай газэце друкуюцца антынезалежніцкія артыкулы, з другога – у тым жа чэрвені 1992-га Саўмін прымае рашэньне аб выданьні часопісу «Беларуская мінуўшчына», а часопіс «Спадчына» атрымлівае дзяржаўныя датацыі (праўда, мізэрных памераў, калі параўноўваць з антынезалежніцкімі выданьнямі).

Гэта тлумачыцца пастаянным ціскам дэпутатаў апазыцыі БНФ на органы дзяржаўнага кіраваньня там, дзе трэба было прымяніць ціск, і «кулюарнай працай» з тымі прадстаўнікамі апарату, якія хаця б не адрыналі ідэі Адраджэньня, а ў шэрагу выпадкаў і спрыялі ім.

Ці былі прыхільнікі беларускага Адраджэньня ў дзяржаўным апараце, у выканаўчых органах улады? Бясспрэчна, былі, хоць і няшмат. На вышэйшым узроўні варта адзначыць віцэ-прэм'ера Мікалая Дземчука і міністра замежных справаў Пятра Краўчанку, міністра інфармацыі Анатоля Бутэвіча (пры тым, што ў шэрагу палітычных пытаньняў іх пазыцыя кардынальна разыходзілася з поглядамі БНФ і ацэньвалася намі як антыдэмакратычная). Іх дзеяньні найчасьцей былі даволі асьцярожныя, аднак зь іх дапамогай удалося рэалізаваць некаторыя нацыянальныя ініцыятывы.

Галоўны здабытак нацыянальных сілаў у гэты пэрыяд – якраз стварэньне адукацыйных ды прапагандысцкіх беларускамоўных асяродкаў ды закладаньне сыстэмы нацыянальнай адукацыі. Усё гэта дзейнічала яшчэ і ў першыя гады пасьля прыходу да ўлады Лукашэнкі і дазволіла выхаваць нацыянальна сьвядомую частку новага пакаленьня, якое ўступіла ў палітычную дзейнасьць на мяжы стагодзьдзяў. Варта адзначыць і тое, што Беларусь пачала ўсьведамляцца ўсясьветнай супольнасьцю як сувэрэнная і незалежная дзяржава.

І ўсё ж, усе здабыткі на ніве нацыянальнага Адраджэньня былі дасягнутыя ня дзякуючы пазыцыі вышэйшага кіраўніцтва, а насуперак ёй. Палітычная ж сытуацыя ў Беларусі наагул рабілася ўсё больш напружаная. Адна з прычынаў гэтага была выкладзеная ў заяве апазыцыі БНФ у жніўні 1992 году: «З аднаго боку, адсутнасьць найважнейшых законаў у сфэры эканамічнага жыцьця, якія абавязаны быў прыняць Вярхоўны Савет, пазбавіла народ Беларусі права на ўласнасьць, на валоданьне зямлёй і сродкамі вытворчасьці і, фактычна, пакінула людзей безабароннымі перад хваляй беспрацоўя. З другога боку – шалёныя тэмпы намэнклятурнай прыватызацыі, калі ня толькі сотні мільёнаў дзяржаўных рублёў, але і цэлыя прадпрыемствы, установы пераходзяць у прыватную ўласнасьць былых камуністаў».

Найважнейшай адметнасьцю гэтай ня вельмі і прыхаванай намэнклятурнай прыватызацыі было тое, што новая кляса ўласьнікаў, якая стваралася з былых партыйных, камсамольскіх чыноўнікаў і супрацоўнікаў КДБ, была ня проста цалкам

пазбаўленая нацыянальнай сьвядомасьці, але мела прамаскоўскую, і часам вельмі агрэсіўную антыбеларускую арыентацыю.

Тут таксама быў парадокс: з усіх партыяў толькі БНФ падаў законапраекты, накіраваныя на рынкавыя рэформы, але БНФ практычна ня меў падтрымкі буйных прадпрымальнікаў. Тлумачыцца гэта тым, што бізнэсоўцам было куды больш выгадна падтрымліваць прадстаўнікоў улады, бо менавіта ад чыноўніка, а не ад закону, залежаў лёс таго альбо іншага бізнэсу. Словам, бізнэсоўцы паводзілі сябе вельмі недальнабачна, спакусіўшыся на імгненныя выгады і адмовіўшы ў падтрымцы сіле, якая б у пэрспэктыве магла стварыць гарантыі для вольнага бізнэсу. Зрэшты, магчыма, якраз такая сытуацыя гэтых бізнэсоўцаў задавальняла куды болей, чым магчымая свабодная канкурэнцыя, дзе посьпех вызначаецца, галоўным чынам, ня блізкасьцю да чыноўніка, а прадпрымальніцкімі здольнасьцямі. Нарэшце, ключавыя пазыцыі ў бізнэсе занялі асобы, набліжаныя да былых высокапастаўленых кіраўнікоў партыі і КДБ, з традыцыйна антыбеларускай арыентацыяй; пад іх падладжваліся і астатнія.

Натуральна, сярод дробных прадпрымальнікаў былі і нацыянальна сьвядомыя, але, як правіла, гэта былі людзі з зусім сьціплымі «капіталамі», якіх, да прыкладу, не хапіла б на выпуск уласнай газэты. Толькі ўладальнікі кампутарнай фірмы «Дайнова» падкрэсьлена дапамагалі беларускім культурніцкім ініцыятывам. Але і гэта была ня самая магутная фірма ў сваёй сфэры – самыя буйныя, ізноў жа, арыентаваліся на Расею.

Што будуць уяўляць сабою мас-мэдыі, створаныя буйнымі прадпрымальнікамі, мы маглі меркаваць паводле неўзабаве ўзьніклай «Газеты Андрея Климова», якая выходзіла па-расейску і даволі зьедліва пісала пра БНФ.

Мы прагназавалі, што пры такім разьвіцьці падзеяў праз некалькі гадоў новаўтвораная дэнацыяналізаваная кляса буржуа самым «дэмакратычным» чынам – праз свабодныя выбары з дапамогай уласных СМІ і нанятых паліттэхнолягаў – правядзе і ў парлямэнт, і ў выканаўчыя структуры прарасейскія антыбеларускія сілы, якія нават у выпадку ляяльнасьці да

сувэрэнітэту адвядуць беларускай мове месца духоўнай рэзэрвацыі (дарэчы, гэта можа здарыцца і, хутчэй за ўсё, здарыцца пасьля падзеньня лукашэнкаўскага рэжыму – бізнэс у сёньняшняй Беларусі збольшага прарасейскі).

РЭФЭРЭНДУМ, ЯКІ НЕ АДБЫЎСЯ

Патрабаваньне новых выбараў, якое гучала і раней, у 1992-м зрабілася ляйтматывам палітычнай дзейнасьці БНФ. У мэтах зьмены ўлады БНФ пачаў зьбіраць подпісы за рэфэрэндум аб датэрміновых выбарах. Выбары мусілі прайсьці паводле новага закону на падставе прапарцыйна-мажарытарнай сыстэмы (50 на 50, палова мандатаў – па акругах, палова – па партыйных сьпісах). Такі варыянт падаваўся бяспройгрышным: на рэфэрэндуме большасьць прагаласавала б за новыя выбары, а партыйныя сьпісы дазволілі б правесьці ў Вярхоўны Савет значна больш прадстаўнікоў БНФ і дэмакратычных партыяў, чым іх было ў ВС 12-га скліканьня. Народны Фронт сабраў больш як паўмільёна подпісаў; ЦВК прызнала сапраўднымі 442 тысячы.

Аднак ідэя рэфэрэндуму аб датэрміновых выбарах у Вярхоўны Савет паводле дэмакратычнага выбарчага закону не знайшла падтрымкі ні ў Станіслава Шушкевіча, ні ў большасьці дэпутатаў Вярхоўнага Савету; старшыня парлямэнцкай камісіі па заканадаўстве Дзьмітры Булахаў «абгрунтаваў» нямэтазгоднасьць такога рэфэрэндуму.

Воля 442 тысяч грамадзянаў была праігнараваная; адмаўляючы ў рэфэрэндуме, Вярхоўны Савет прыняў нелегітымнае рашэньне і, фактычна, паставіў сябе па-за законам. З гэтага моманту – з 29 кастрычніка 1992 году – прарасейскія сілы і ў парлямэнце, і ў структурах выканаўчай улады адкінулі прыгожыя фразы і адкрыта сталі на шлях ліквідацыі беларускай дзяржаўнасьці.

У палітычным жыцьці краіны ўзьнікла і яшчэ адна адметнасьць: зь лета 1992 году пачалі стварацца альбо ўзмацняцца партыі, якія абвяшчалі сябе альтэрнатывай Народнаму Фронту. Была ўтвораная Партыя народнай згоды – з ініцыятывы былой і

дзейнай прамысловай намэнклятуры, якую ўзначаліў Генадзь Карпенка.

Зянон Пазьняк перакананы, што шэраг партыяў былі створаныя КДБ для аслабленьня Народнага Фронту. Аналягічнага меркаваньня прытрымліваўся і Васіль Быкаў, які да таго ж ставіў пад сумнеў іх дэмакратызм: «У Беларусі ёсьць некалькі дэмакратычных партыяў – ва ўсялякім разе, намінальна дэмакратычных. Я асабіста сумняюся ў дэмакратызьме некаторых зь іх. Магу і памыліцца, але пакуль яны нешта не сьпяшаюцца выявіць сваёй дэмакратычнасьці на справе. Што ж да Беларускага Народнага Фронту, гатовы гарантаваць, што гэта сапраўды дэмакратычная арганізацыя». Гэтыя словы Быкаў сказаў у інтэрвію «Свабодзе» ў пачатку 1996 году; а ў 1992-м некаторыя дэмпартыі раптам (ці ня раптам?) зрабілі заявы, дыямэтральна супрацьлеглыя стратэгічным прынцыпам БНФ.

Захаваньне парлямэнцкай рэспублікі было адным з галоўных патрабаваньняў апазыцыі БНФ, і да нейкага часу нам удавалася ўтрымліваць сяброў Канстытуцыйнай камісіі ад уключэньня «прэзыдэнцкіх» разьдзелаў у праект Канстытуцыі. Сытуацыя карэнным чынам зьмянілася, калі супраць парлямэнцкай рэспублікі выступілі нашы саюзьнікі па дэмакратычным лягеры.

8 чэрвеня 1992 году ў менскай газэце «Добры вечар» дэпутат сталічнага гарсавету, намесьнік старшыні Аб’яднанай дэмакратычнай партыі (потым улілася ў АГП) Міхась Пліска заявіў пра неабходнасьць увядзеньня ў Беларусі прэзыдэнцтва; у якасьці аргумэнтаў супраць парлямэнцкай рэспублікі прыводзіліся прыклады краінаў, дзе перамогу атрымалі нацыянальныя дэмакраты. М. Пліска канстатаваў: «Былых прадстаўнікоў ад парт- і дзяржнамэнклятуры, нацыянальных дэмакратаў, як, зрэшты, і дэмакратаў-дзяржаўнікаў, родніць адных з другімі абсалютызацыя ўлады парлямэнту». Міне колькі гадоў – і прыклад Літвы, Латвіі і Эстоніі будзе, наадварот, менскімі лібэраламі прыводзіцца як станоўчы, у немалой ступені дзякуючы таму, што пачатковы пэрыяд дзяржаўнага станаўленьня і пачатку рынкавых рэформаў супаў менавіта зь вяршэнствам парлямэнту, дзе захоўваўся балянс

інтарэсаў.

Што да «балянсу інтарэсаў» у нашай Канстытуцыйнай камісіі, дык гэтым і падобнымі выступамі ён быў парушаны. «Кебічысты» адчулі, што сярод дэмакратаў ужо няма адзінства (за прэзыдэнцтва пачалі выступаць Карпенка, Ганчар і іншыя, пабачыўшы ў гэтай пасадзе магчымасьць уласнай самарэалізацыі) і фарсіравалі ўвядзеньне прэзыдэнцкіх разьдзелаў – пры згодзе старшыні Канстытуцыйнай камісіі Станіслава Шушкевіча.

Дарэчы, артыкул М. Пліскі называўся «Прэзыдэнцкая рэспубліка як сродак падзелу выканаўчай і заканадаўчай улады». Міжволі прыгадваецца, што добрымі намерамі брукаваная дарога ў пекла.

ДВА ФОРУМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ТРЫЮМФУ

У 1993 годзе адбыліся падзеі, якія - пасьля аднаўленьня незалежнасьці - можна лічыць самымі знакавымі ў апошнім Адраджэньні - але на гэты ж год прыпадае і найбольш брутальны (да пэрыяду прэзыдэнцтва) наступ праціўнікаў нацыянальнай ідэі.

У сакавіку 1993 году адзначаліся 75-я ўгодкі ўтварэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Урачыстае паседжаньне прайшло ў будынку філярмоніі з удзелам Старшыні Вярхоўнага Савета Станіслава Шушкевіча і Старшыні Рады БНР Язэпа Сажыча. Урачыстасьці па-за межамі сталіцы былі значна больш сьціплымі. Але вось у Беластоку, дзе ў тыя дні мне давялося прадстаўляць БНФ, на сьвяткаваньне прыехаў і нават выступіў з прамовай амбасадар Беларусі ў Польшчы У. Сянько. Сёньня немагчыма ўявіць, каб на сьвяткаваньні 25 сакавіка прысутнічаў хаця б самы нізкапастаўлены чыноўнік райвыканкаму - калі не лічыць высокапастаўленых супрацоўнікаў міліцыі і спэцслужбаў падчас разгону маніфэстацыяў. Дый беларускія дыпляматы не наведваюць урачыстасьці, якія ў гонар БНР штогод ладзяцца ва ўсіх буйных асяродках беларускай дыяспары - у Празе, Лёндане, Антвэрпэне, Нью-Ёрку, Кліўлендзе, Таронта ды іншых месцах.

У опэрным тэатры на працягу трох дзён, з 8 да 10 ліпеня адбываўся Першы зьезд беларусаў сьвету. Варта нагадаць, што да пабудовы «Палаца Рэспублікі» менавіта ў опэрным тэатры адбываліся найбольш важныя ўрачыстасьці, прычым далёка не штогод (на прамяць прыходзіць ўручэньне Л. Брэжневым залатой зоркі гораду-героя Менску ў 1978 годзе). Нацыянальным сілам удалося прадухіліць задуму, якую выношвалі ў Саўміне - каб Рада БНР склала свае паўнамоцтвы і перадала іх ураду Кебіча (аналягічны крок зрабіла Ўкраінская Народная Рада). Менская дыпляматыя актыўна «апрацоўвала» сябраў Рады, аднак, да гонару кіраўніцтва, і найперш тагачаснага Старшыні Рады БНР Язэпа Сажыча - свае паўнамоцтвы яна ня склала. У прэзыдыюме зьезду былі с. Шушкевіч, віцэ-прэм'ер М. Дзямчук, міністры П. Краўчанка, А. Бутэвіч і іншыя высокапастаўленыя дзеячы. Зьезд віталі Васіль Быкаў і Зянон Пазьняк. Большасьць замежных удзельнікаў упершыню прыехалі ў Беларусь пасьля дзесяцігодзьдзяў жыцьця на чужыне - яшчэ зусім нядаўна іх называлі абразьлівымі словамі (праз тры-чатыры гады гэтая лексіка вернецца).

Зрэшты, ужо празь некалькі тыдняў пасьля Зьезду само гэтае мерапрыемства і ягоныя ўдзельнікі былі раскрытыкаваныя. Іван Антановіч (былы загадчык аддзелу культуры ЦК КПБ і будучы міністар замежных справаў пры Лукашэнку) у «Звяздзе» (7 верасня 1993 г.) выказаў незадавальненьне, што ў сваёй прамове на зьезьдзе с. Шушкевіч «бярэ на сябе цяжкі грэх, калі проціпастаўляе камуністычную ідэю праблемам і задачам нацыянальнага адраджэньня. Мы ня можам згадзіцца, што калі-небудзь на Беларусі камуністычная ідэя супрацьстаяла нацыянальнай». Насамрэч, усе сем дзесяцігодзьдзяў панаваньня камуністычнай улады гэтая ўлада зьнішчала галоўную нацыянальную ідэю – ідэю беларускай незалежнасьці. Зьнішчала і яе носьбітаў – у Курапатах ды іншых месцах. Свой артыкул Іван Антановіч падпісаў навуковымі тытуламі – «доктар філязофскіх навук, прафэсар», не пазначыўшы, што зьяўляецца адным з галоўных ідэалягічных дарадцаў прэм'ера Кебіча. Зрэшты, пра пазыцыю Кебіча ў 1993 годзе – крыху пазьней, а пакуль адзначым яшчэ некалькі станоўчых прыкладаў беларусізацыі.

У 1993 годзе ў дзяржаўных выдавецтвах пачалі выходзіць раней забароненыя творы рэпрэсаваных аўтараў і пісьменнікаў-эмігрантаў. Працягваў друкавацца збор твораў Васіля Быкава, выходзілі кнігі Рыгора Барадуліна, Уладзімера Арлова. У выдавецтве «Беларусь» у перакладзе з польскай пабачыла сьвет дасьледаваньне Юр'я Туронка «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» – упершыню масавы чытач мог пазнаёміцца зь невядомымі, забароненымі старонкамі нядаўняй гісторыі.

Зрэшты, беларускае кнігадрукаваньне разьвівалася ня дзякуючы дзяржаўным органам, а хутчэй, насуперак ім. Да прыкладу, 4-ты том збору твораў В. Быкава быў здадзены ў набор 15 траўня 1992 году, а падпісаны ў набор толькі празь пятнаццаць (!) месяцаў – 10 жніўня 1993 году. Зборнік Уладзімера Арлова «Пяць мужчын у лесьнічоўцы» здадзены ў набор 3 красавіка 1993 году, а падпісаны ў набор 14 лютага 1994-га. Гэта можна было б патлумачыць тагачасным дэфіцытам паперы – але ў той самы час зь менскіх друкарняў ледзь не мільённымі накладамі выходзілі сотні і тысячы найменьняў расейскамоўнай «жоўтай» прадукцыі. Пазьней нават у афіцыйным друку зьявіліся сьведчаньні, што бізнэсоўцы плацілі грошы кіраўнікам выдавецтваў асабіста, што, аднак, можа зьяўляцца толькі частковым тлумачэньнем. Гэта была праява агульнай, дзяржаўнай тэндэнцыі – кіраўнікі друкарняў разумелі, што выканаўчая ўлада, ад якой яны залежалі, у беларусізацыі не зацікаўленая.

ШУШКЕВІЧ ШУКАЕ ЗГОДЫ

Пасьля забароны ў кастрычніку 1992 году рэфэрэндуму аб датэрміновых выбарах пракамуністычныя, антыбеларускія сілы ўзмацнілі наступ і на нацыянальны рух, і на кіраўніка парлямэнту Станіслава Шушкевіча.

Суб'ектыўна, Шушкевіч працягваў заставацца незалежнікам (у чым я перакананы). Лічыў і лічу Станіслава Станіслававіча высокамаральным, сумленным чалавекам; займаючы найвышэйшую ў краіне пасаду, ён паказваў прыклад асабістай сьціпласьці (і тым самым выклікаў нянавісьць у намэнклятуры). Сын рэпрэсаванага пісьменьніка, ён меў дэмакратычны

сьветапогляд, быў высокаадукаваны – напэўна, упершыню гэтыя якасьці спалучыліся ў асобе, якая займала найвышэйшую ў Беларусі пасаду (я пішу ў мінулым часе, бо ацэньваю ягоныя якасьці на пасадзе старшыні ВС, у гістарычным ужо кантэксьце).

Вялікім мінусам Шушкевіча была ягоная непасьлядоўнасьць і нейкае наіўнае жаданьне знайсьці паразуменьне з тымі, хто мовы кампрамісаў не разумее ў прынцыпе. У выніку кампрамісы абарочваліся здачай вельмі істотных пазыцыяў. Ён увесь час шукаў «згоды» паміж апазыцыяй БНФ і парлямэнцкай большасьцю, і вынік гэтых пошукаў быў заўсёды не на нашу карысьць (часам пішуць – «Шушкевіч лавіраваў»; насамрэч з восені 1992 году ніякіх палітычных «рэвэрансаў» у бок БНФ сьпікер ужо не рабіў).

У адрозьненьне ад Шушкевіча, Кебіч быў чалавекам пасьлядоўным. На мяжы 1989–1990 гадоў ён выгадна вылучаўся з найвышэйшай гаспадарчай партыйнай намэнклятуры сваёй энэргічнасьцю; неўзабаве пасьля таго, як увесну 1990-га ён заняў пасаду старшыні Саўміну, Васіль Быкаў у артыкуле ў маскоўскай «Литературной газете» назваў яго прэм'ерам, зь якім зьвязаныя спадзяваньні. Асабіста на мяне першая гутарка з Кебічам (я прыйшоў прасіць трубы для камунальных службаў маёй выбарчай акругі) таксама зрабіла станоўчае ўражаньне.

Намэнклятурнае пакаленьне Кебіча асабіста я вызначаю як «дзяцей вайны» – іх дзяцінства альбо раньняе юнацтва прыпала на гады нястачаў, калі вельмі шмат значылі чалавечыя якасьці, што часта толькі і былі адзінай надзеяй на выратаваньне ад самага звычайнага голаду. Прычым, гэта быў час усенароднага гора (у пазьнейшыя часы нястачы дзіцяці маглі быць вынікам нейкіх сямейных прычынаў альбо п'янства бацькоў, і на фоне адноснай дагледжанасьці раўналеткаў гэта магло спарадзіць звыродлівыя комплексы). Да таго ж, гэтае пакаленьне ў большасьці вучылася ў беларускіх школах. Ва ўсялякім разе, не магу дапусьціць думкі, каб Кебіч аддаў каманду на брутальныя дзеяньні кшталту зьбіцьця дэпутатаў альбо пасьлядоўна і мэтанакіравана, крок за крокам, вынішчаў бы беларускія

асяродкі, што рабілі прадстаўнікі наступнага пакаленьня – прэзыдэнт Лукашэнка і кіраўнікі ягонай адміністрацыі Сініцын, Латыпаў ды Шэйман. Усё ж для Кебіча існавала нейкая мяжа.

Вядома, кожны чалавек – сам стваральнік свайго лёсу, у тым ліку і палітычнага, і асабіста нясе за яго адказнасьць. У трансфармацыі іміджу Кебіча – ад «прэм'ера спадзяваньняў» да ўвасабленьня антыдэмакратычных сілаў – найперш вінаваты сам Вячаслаў Францавіч. Аднак адбылося гэта не ў апошнюю чаргу дзякуючы некаторым асобам зь ягонага найбліжэйшага атачэньня, якія свае пасады выкарыстоўвалі выключна ў інтарэсах уласнага матэрыяльнага дабрабыту. Гуляючы на некаторых чалавечых слабасьцях, у гэтае «найбліжэйшае кола» ўвайшлі і тыя, для каго галоўным быў інтарэс Масквы.

Да 1993 году пазыцыя Кебіча (ва ўсялякім разе, палітычная пазыцыя ягонага ўраду) канчаткова сфармавалася і палягала ў жаданьні ўтрымаць уладу праз падтрымку (найперш эканамічную) Масквы. Гэтыя спадзяваньні на расейскія нафту, газ ды пазыкі Крэмль і Лубянка выкарыстоўвалі, каб як мацней прывязаць да сябе Беларусь. Чым слабейшай эканамічна была Беларусь, тым больш шанцаў на посьпех мела такая стратэгія. Беларускі Народны Фронт успрымаўся імі (і абсалютна справядліва) як галоўная сіла, якая перашкаджала такой палітыцы.

У сярэдзіне студзеня 1993 году адбылося сумеснае паседжаньне Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету і Прэзыдыюму Савету Міністраў, зь якога, у парушэньне закону, выставілі «звычайных» дэпутатаў. Паседжаньне вялі с. Шушкевіч і В. Кебіч. Было вырашана, як пазьней паінфармаваў Шушкевіч, «пайсьці па шляху пераважна дзяржаўнай уласнасьці на зямлю». 18 студзеня с. Шушкевіч правёў кансультацыйную сустрэчу з прадстаўнікамі парлямэнцкіх фракцыяў. Сьпікер выказаў незадавальненьне тым, што сэсія ВС ідзе «марудна». На нарадзе ў мяне адбылася гарачая дыскусія з каардынатарам групы «Беларусь» г. Казловым, які прапанаваў скасаваць «Рознае» (штодня перад пачаткам паседжаньняў паўгадзіны дэпутаты маглі выступіць на самыя розныя тэмы, зрабіць запыты і г. д. Мы актыўна выкарыстоўвалі «Рознае», паколькі

яно перадавалася ў радыё і тэлебачаньні ў поўным запісе, без купюраў). У выніку с. Шушкевіч прыняў прапанову скасаваць «Рознае» (што, аднак, не было зроблена – нават «большасьць» парлямэнцкай «большасьці» не пагадзілася на гэта, бо губляла магчымасьць «сьвяціцца» перад уласнымі выбарцамі).

3 лютага большасьць дэпутатаў ВС галасуе за скасаваньне Пастановы аб прыпыненьні дзейнасьці КПБ–КПСС – пры працэдурных парушэньнях з боку Шушкевіча (адключаў мікрафоны ў дэпутатаў апазыцыі).

У ВАЙСКОВУЮ АРБІТУ РАСЕІ

Зь вясны 1992 году набірае абароты кампанія ўцягваньня Беларусі ў Дамову аб калектыўнай бясьпецы СНД (ДКБ). Вайсковым міністэрствам краінаў СНД у блёку адводзіцца дэкаратыўная роля; стратэгію выпрацоўвае расейскі Генштаб. У Вярхоўным Савеце кампанію ўзначальваюць старшыня парлямэнцкай камісіі па справах бясьпекі М. Грыб, а таксама намесьнікі начальніка Ўпраўленьня грамадзкай бясьпекі і абароны Саўміну Генадзь Казлоў і Валер Паўлаў. Уласна, патрабаваньне аб далучэньні краіны да ДКБ робіцца ляйтматывам дзейнасьці парлямэнцкай большасьці на працягу ўсяго 1993 году.

19 сакавіка апазыцыя БНФ выступае з заявай «Аб дачыненьнях у войску», у якой выказваецца супраць далучэньня да ДКБ і вайсковага саюзу з Расеяй. У пачатку красавіка кіраўнікі грамадзкіх арганізацыяў і вядомыя дзеячы (у тым ліку В. Быкаў, Р. Барадулін, с. Законьнікаў, У. Арлоў, Р. Гарэцкі, А. Дудараў, М. Купава, А. Мальдзіс, г. Сурмач) выступілі са зваротам «Беларускі народ ня можа плаціць за нафту крывёю сваіх сыноў».

8 красавіка Зянон Пазьняк зьвяртаецца да жанчын Беларусі з заклікам падаць голас пратэсту супраць вайсковага саюзу і скасаваньня нэўтралітэту. «Ня верце ні гэтаму ўраду, ні гэтаму Вярхоўнаму Савету. Яны створаныя з камуністычнай намэнклятуры яшчэ пры савецкім таталітарным рэжыме...».

Падчас абмеркаваньня вайсковага пытаньня на 11-й нечарговай сэсіі ВС Станіслаў Шушкевіч фактычна блякуе дзеяньні апазыцыі БНФ. «Гэтым разам выбар быў пастаўлены вельмі сур'ёзна. Адмова ад нэўтралітэту і бязьядзернасьці Беларусі, вайсковы саюз з Расеяй і азіяцкімі краінамі – гэта ня толькі пэрспэктыва страты незалежнасьці, гэта крах мірнай незалежнай палітыкі, страта прэстыжу і пазыцыяў у сьвеце. Гэта пагроза жыцьцям грамадзянаў Беларусі… Намэнклятура паставіла сьпікера (ці, як яны вымаўляюць, «скіпера») перад выбарам, намякаючы адначасна пра магчымасьць яго адстаўкі. Прыём заўсёды спрацоўваў бездакорна. Ад «скіпера» патрабавалася ня даць нармальна працаваць апазыцыі – адзінай сіле ў Вярхоўным Савеце, якая можа сапсаваць гульню большасьці. Кіраўнік сэсіі заўсёды стараўся. Груба парушаліся законы, рэглямэнт, адключаліся мікрафоны, не давалася слова, галасаваньнем большасьці спынялася дыскусія. Ужываліся нават адкрытыя падтасоўкі галасаваньня… Дэпутатаў апазыцыі пад гіканьне і выкрыкі, ёрніцтва старшыні, разьлічаныя на ўхваленьне камуністычнай большасьці, фактычна пазбаўлялі на сэсіі дэпутацкіх правоў», – пісаў у «Навінах БНФ» (спэцвыпуск, красавік 1993 г.) Мар'ян Ваньковіч (псэўданім З. Пазьняка).

Шушкевіч рабіўся закладнікам уласнай непасьлядоўнасьці.

Вынік: большасьцю галасоў Вярхоўны Савет прымае рашэньне даручыць с. Шушкевічу падпісаць ад імя Беларусі Дамову аб калектыўнай бясьпецы СНД (сярод 188 дэпутатаў, якія прагаласавалі за гэта – А. Лукашэнка).

Шушкевіч заяўляе: «Я павінен выконваць рашэньне Вярхоўнага Савету, хоць я ня згодны», – і адначасна выступае з прапановай рэфэрэндуму аб захаваньні вайсковага нэўтралітэту. 27 красавіка ўдзельнікі Кансультацыйнай нарады патрыятычна-дэмакратычных сілаў Беларусі падтрымліваюць ініцыятыву с. Шушкевіча. Аднак прапанова ня мела заканадаўчага разьвіцьця.

Яшчэ ў 1992 годзе афіцэры не былі прыведзеныя да прысягі на вернасьць Беларусі (!). Шмат хто зь іх заяўляў, што «прысягаў СССР» і «перапрысягаць» не зьбіраецца. Каму служыць – справа кожнага; аднак у іншай краіне пасьля такіх заяваў афіцэр быў

бы звольнены на працягу 24 гадзінаў. У Беларусі ж неабходнасьць прыняцьця прысягі ўсё яшчэ дэбатавалася, а звальнялі афіцэраў зусім за іншае.

Рукамі міністра абароны Казлоўскага ўрад распачынае звальненьне з войска афіцэраў – актывістаў Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў, якія ўзяліся «ў цяжкіх умовах нярэдка непрыхільнай да беларушчыны атмасфэры ў сучасным войску прапагандаваць уласным прыкладам беларускі дзяржаўны патрыятызм, вяртаць у войска беларускую мову і традыцыі, тым самым пераадольваючы адчужэньне паміж навастворанай беларускай арміяй і беларускім народам».

Апошняя цытата – са звароту да грамадзянаў Беларусі ў абарону актывістаў БЗВ і яго кіраўніка М. Статкевіча, які падпісалі больш як восемдзесят палітычных і грамадзкіх дзеячаў, у тым ліку В. Быкаў (ягоны подпіс стаіць першым), Б. Сачанка, А. Пісьмянкоў, г. Сагановіч, М. Чарняўскі, У. Кулажанка, Т. Мархель. Пад зваротам подпісаліся 55 дэпутатаў Вярхоўнага Савету, у тым ліку апазыцыя БНФ у поўным складзе.

«УСЁ БЕЛАРУСКАЕ ДЛЯ ІХ – ВАРОЖАЕ»

Праімпэрскія сілы актыўна ідуць у наступ: дэпутаты-вэтэраны ініцыююць дыскусію аб скасаваньні бел-чырвона-белага сьцяга і герба «Пагоня» ў якасьці дзяржаўных сымбаляў і пераносе сьвяткаваньня Дня сувэрэнітэту з 27 ліпеня на іншы дзень (ужо тады ў апошняй прапанове праглядалася мэта – зьнішчыць прызнаньне дзяржаўным сьвятам юрыдычнае прыняцьце Дэклярацыі аб сувэрэнітэце, а фактычна – незалежнасьці ад Масквы; бо 3 ліпеня – гэта дзень вызваленьня Менску ад нямецкай акупацыі, з ідэяй сувэрэнітэту ён ніяк не зьвязаны).

У чэрвені 1993-га Савет Міністраў спрабуе юрыдычна перападпарадкаваць сабе КДБ (паводле закону, КДБ падпарадкоўваецца Вярхоўнаму Савету; насамрэч інфармацыю з КДБ маюць толькі с. Шушкевіч, М. Грыб і яшчэ, магчыма, два-тры дэпутаты. Фактычна, КДБ знаходзіцца ў падпарадкаваньні Саўміну).

29–30 чэрвеня дэлегацыя на чале з Кебічам наведвае Маскву і дамаўляецца з расейскім прэм'ерам Чарнамырдзіным аб умовах, на якіх у Беларусі будзе ўведзены расейскі рубель у якасьці «адзінага законнага плацежнага сродку». З гэтага моманту ідэя ўвядзеньня расейскага рубля робіцца галоўнай прапагандысцкай тэмай В. Кебіча; пазьней яе будзе выкарыстоўваць і А. Лукашэнка.

«Нацыя і воля – вось вечныя праблемы і калізія, ці можа што быць важнейшым за іх? Ворагі – так, ворагаў у нас заўсёды хапала, не паменела іх і зараз… Усё нацыянальна беларускае для іх – варожае, а ўсё агіднае, варожае для нацыі – іхнае… – казаў Васіль Быкаў падчас адкрыцьця 3-га зьезду БНФ, які адбыўся ў тыя ж апошнія дні чэрвеня. – І калі нам кажуць: трэба болей цярпімасьці, памяркоўнасьці, трэба менш радыкалізму і рыгарызму, бо важней за ўсё паступовасьць, нацыянальная згода – мы ведаем: гэта гавораць яны ці іхныя адвакаты, нават тады, калі гавораць па-беларуску. Увесь наш гістарычны вопыт пярэчыць супраць іх д'ябальскай лёгікі… Так, цяпер можна з упэўненасьцю сказаць, што менавіта БНФ напрыканцы XX стагодзьдзя абудзіў нацыю, даў ёй надзею… І калі не перамог канчаткова, дык у тым адлюстравалася не заганнасьць ягоных мэтадаў, а найбольш – грандыёзнасьць задачы. Але БНФ і не ўяўляў яе меншай, тая задача сапраўды нечувана грандыёзная, і як цяпер відаць, па сіле хіба не аднаму пакаленьню нацыянальна-сьведамых беларусаў… Няўдачаў і перамог яшчэ будзе нямала. Але ў нас ёсьць гарант – найперш гэта незваротная хада гісторыі, прагрэсу і чалавечнасьці. Нас павінна натхняць сьвятасьць нашае мэты, зарука дасягненьня якой – народная воля, выпрабаванае, узбагачанае вопытам кіраўніцтва БНФ. А таксама ягоны лідэр, які ў шматлікіх варунках барацьбы засьведчыў сваю надзвычайную вартасьць. Можна з упэўненасьцю сказаць, што нацыі пашчасьціла на яе лідэра, якім зьяўляецца пасланы нам Богам Зянон Станіслававіч Пазьняк».

Зьезд БНФ абвясьціў галоўнай мэтай сваёй праграмы свабоднага чалавека ў адноўленай незалежнай Беларусі і пацьвердзіў, што выступае за беларускую мову як адзіную дзяржаўную, пры роўных умовах разьвіцьця нацыянальных

меншасьцяў. Пры гэтым Зянонам Пазьняком упершыню была вылучана тэза «парытэту» правоў чалавека і правоў дзяржавы (пад апошнім мелася на ўвазе ня тое, што завецца «машынай дзяржаўнага апарату», а незалежная Беларусь). Нягледзячы на тое, што гэтая тэза была падтрымана Васілём Быкавым, лібэральныя «дэмакраты» ўчынілі енк з той прычыны, што БНФ, нібыта, хоча такім чынам прынізіць правы чалавека, свабоду асобы, што супярэчыць прынцыпам так званага «адкрытага грамадзтва» і фундамэнту, на якім пабудаваная самая дэмакратычная краіна – ЗША. Міне восем гадоў, і пасьля атакі мусульманскіх тэрарыстаў на WTC ідэя парытэту знойдзе ўвасабленьне ў ЗША.

СПРОБА АДСТАЎКІ ШУШКЕВІЧА

У канцы чэрвеня парлямэнцкая большасьць пачынае працэс адхіленьня ад улады Станіслава Шушкевіча. На сэсіі Вярхоўнага Савету В. Ціхіня заяўляе пра неабходнасьць адстаўкі старшыні, Ціхіню падтрымліваюць А. Лукашэнка, Д. Булахаў, В. Ганчар, г. Карпенка (на той час – кіраўнік Партыі народнай згоды, складзенай пераважна з прадстаўнікоў прамысловай намэнклятуры).

«Атака – гэта працяг помсты, імкненьне апошні раз нашкодзіць, грымнуць дзьвярыма перад сваім канцом. Яны аджываюць, будучага няма, і тычыцца тое як адкормленых у партыйных сьвінарніках парсюкоў, так і атлусьцелай на дзяржаўных раскрадзеных сродках новай буржуазіі – намэнклятуры, якая своечасова апынулася менавіта там, дзе нешта прыватызуецца. І вось тут змыкаюцца інтарэсы Івана Трусава (дырэктара заводу ў Барысаве. – **С. Н.**) і Генадзя Карпенкі, вось тут і сябруюць камуніст з «дэмакратам». У захаваньні такога сэнсу і шукаюць апоры «товарищи» з «господами», заклікаючы да «Згоды» і «Стабільнасьці», – пісала ў тыя дні менская газэта «Добры вечар» (3 ліпеня 1993 г.).

Аднак былі і куды больш сур'ёзныя прычыны, чым прыватныя інтарэсы асобных дэпутатаў ці нават інтарэсы асобных партыяў. Праімпэрскія сілы разумелі, што Шушкевіч, пры ўсёй ягонай непасьлядоўнасьці, застаецца перашкодай на шляху

стварэньня вайсковага саюзу і, далей, поўнага вяртаньня Беларусі ў зону маскоўскага ўплыву.

Паказальна, што сярод ініцыятараў адстаўкі Шушкевіча былі тыя самыя дэпутаты, што актыўна дамагаліся ўцягваньня Беларусі ў зону калектыўнай бясьпекі – палкоўнікі Генадзь Казлоў і Валеры Паўлаў. А галоўным закідам Шушкевічу было тое, што ён не падпісвае Дамовы аб калектыўнай бясьпецы СНД.

Спрабуючы прадухіліць адстаўку, Шушкевіч заявіў, што накіраваў лідэрам дзяржаваў СНД ліст, у якім паведаміў аб далучэньні Беларусі да Дамовы, і што гэта, на яго, Шушкевіча, думку, фактычна зьяўляецца актам падпісаньня. У адказ на гэта міністар замежных справаў П. Краўчанка заявіў, што такі ліст ня мае юрыдычнай сілы. Прадстаўнікі парлямэнцкай большасьці (а таксама «незалежныя» дэпутаты) абвінавацілі Шушкевіча ў падмане і вынесьлі пытаньне аб недаверы.

Словы Шушкевіча адносна далучэньня да Дамовы аб калектыўнай бясьпецы выклікалі ў нас абурэньне.

Тым ня менш, менавіта апазыцыя БНФ выратавала Шушкевіча ад адстаўкі.

Так, ужо на стадыі ўключэньня пытаньня аб адстаўцы мы ў галасаваньні ня ўдзельнічалі. Для прыняцьця рашэньня трэба было 174 галасы, «за» было 148, не хапіла 26. Зразумеўшы, што легітымнае рашэньне аб адстаўцы правесьці ня ўдасца, апанэнты прапанавалі паставіць пытаньне аб даверы праз галасаваньне бюлетэнямі ў кабінах – з тым разьлікам, што калі большасьць выкажацца за недавер, Шушкевіч сам будзе вымушаны сысьці.

Дэпутаты БНФ адмовіліся ўдзельнічаць і ў гэтай працэдуры, не рэгістраваліся і ня бралі бюлетэняў. У выніку за недавер прагаласавалі 166 дэпутатаў – не хапіла 8 галасоў.

Між іншым, гэта абвяргае пазьнейшыя сьцьверджаньні Станіслава Станіслававіча, што нібыта апазыцыя на чале з Пазьняком жадала ягонай адстаўкі – калі б мы жадалі, дык

узялі б бюлетэні.

Але такое меркаваньне Шушкевіч выкажа толькі празь некалькі гадоў.

У тыя ж дні Шушкевіч даў інтэрвію карэспандэнтам БелаПАНу.

«Найбольш пасьлядоўна і адкрыта адстойвала Вас у гэтай сытуацыі апазыцыя БНФ. Ці перагледзіце Вы цяпер свае адносіны зь ёю?» – запытаўся карэспандэнт. Адказ: «Што тычыцца ацэнкі дзеяньняў апазыцыі ў апошнія дні... Я зразумеў, што яна стала «глыбейшай». Паглядзіце, наколькі эфэктыўна прымяніла яна яшчэ адну сваю «зброю» – байкот. Адзначу, што па пытаньнях культуры, мовы і гістарычнай спадчыны я заўсёды быў з апазыцыяй. Але па пытаньнях эканомікі трэба капаць глыбей, чым яна гэта робіць...» (Звязда. 1993. 3 ліпеня). Станіслаў Станіслававіч зрабіў выгляд, нібыта і ня ведае пра дзясяткі эканамічных заканадаўчых прапановаў, вылучаных апазыцяй і яе ценявым кабінэтам і адрынутых парлямэнцкай большасьцю, часам не без удзелу сьпікера...

У тыя дні ў Драздах у рэзыдэнцыі амэрыканскага амбасадара Дэвіда Сўорца адбыўся прыём з нагоды Дня незалежнасьці ЗША. Пасьля прыёму там жа, у рэзыдэнцыі, мы сабраліся ў больш вузкім коле – с. Шушкевіч, З. Пазьняк, І. Сярэдзіч, У. Заблоцкі – і падрабязна (трэба прызнацца, даволі эмацыйна, бо жонкі сядзелі асобна) абмеркавалі сытуацыю. Мы раілі Шушкевічу вызначыцца, перахапіць ініцыятыву і запатрабаваць адстаўкі ўраду Кебіча, але Станіслаў Станіслававіч быў перакананы, што тактыка «згоды» яшчэ ня вычарпала свайго патэнцыялу.

Праз два дні, выступаючы на 3-й усебеларускай палітычнай канфэрэнцыі, Зянон Пазьняк наступным чынам ахарактарызаваў сытуацыю: «Фармальна зьняцьце с. Шушкевіча з пасады старшыні Вярхоўнага Савету не ўяўляе ніякіх цяжкасьцяў. Ён ня мае ніякай апоры. Ні апазыцыя Народнага Фронту, ні іншыя дэмакратычныя дэпутаты яго не падтрымліваюць за згодніцтва, бесхрыбетнасьць і беспрынцыповае ўгодніцтва перад камуністычнай большасьцю ў Вярхоўным Савеце. с. Шушкевіч актыўна спрычыніўся да

такіх чорных яе справаў, як антызаконная забарона рэфэрэндуму 29 кастрычніка 1992 г. і аднаўленьне дзейнасьці КПБ–КПСС у Беларусі. с. Шушкевіч моцна вінаваты перад дэмакратамі, якія паднялі яго зь невядомасьці і зрабілі галоўнай службовай асобай дзяржавы. Тым ня менш, апазыцыя БНФ, ад якой залежаў лёс с. Шушкевіча на пасадзе старшыні, і іншыя дэмакратычныя дэпутаты спакойна ацанілі гэтую пэрманэнтна парадаксальную сытуацыю і вырашылі падтрымаць с. Шушкевіча байкотам рэгістрацыі і галасаваньня, штучным стварэньнем адсутнасьці кворуму. Бо справа, як бачым, зусім не ў яго асобе, як бы крытычна да яе ні адносіцца. Справа ў пагрозе незалежнасьці Беларусі. Ва ўсялякім разе, с. Шушкевіч не намэнклятура, не крадзе і адстойвае беларускую культуру... Зыходзячы са здаровай лёгікі, яму варта было б зрабіць рашучыя вывады і каваць жалеза, пакуль «працiўнік» падаўлены паражэньнем... На жаль, гэты чалавек наўрад ці здольны на рашучыя і асэнсаваныя дзеяньні. Найбольш верагодна, што застанецца балотнае «ўсё як было», быццам нічога ня сталася. Пры такім дачыненьні ў наступны раз захаваць статус-кво ў Вярхоўным Савеце і не дапусьціць безразьдзельнага панаваньня намэнклятурна-камуністычнай арды ня здолее ўжо і апазыцыя...»

Камэнтуючы няўдалую спробу адстаўкі Шушкевіча, аналітыкі (напрыклад, Віталь Цыганкоў) адзначалі, што ў Шушкевіча ёсьць тры варыянты паводзінаў: гучна падаць у адстаўку і расставіць для грамадзтва кропкі над «і», ліквідаваўшы дэмакратычную шырму кіраўніка дзяржавы пры недэмакратычным урадзе; далучыцца да апазыцыі або зрабіць выгляд, што нічога ня здарылася. Апошні варыянт толькі замаруджваў сытуацыю. «Альбо памяняецца Шушкевіч, альбо (рана ці позна) памяняюць яго», – пісаў Віталь Цыганкоў (Звязда. 1993. 3 ліпеня).

На вялікі жаль, Шушкевіч абраў гэты трэці шлях.

ЭНЭРГЕТЫЧНАЯ ЗАЛЕЖНАСЬЦЬ. ІДЭЯ БАЛЦКА-ЧАРНАМОРСКАГА КАЛЕКТАРУ

У ліпені 1993 году адбылася праведзеная з ініцыятывы Зянона

Пазьняка і лідэра Народнага Руху Ўкраіны канфэрэнцыя «Шляхі выхаду з паліўна-энэргетычнага крызісу», на якой абмяркоўвалася стварэньне Балцка-Чарнаморскага нафтавага калектару. У канчатковым выглядзе калектар мусіў зьвязаць парты Чорнага і Балтыйскага мораў, для Беларусі гэта азначала б выхад да альтэрнатыўных крыніцаў нафты і ліквідацыю поўнай паліўнай залежнасьці ад Расеі. Былі падрыхтаваныя фінансавыя і тэхнічныя абгрунтаваньні.

Разьвіваючы аргумэнтацыю на карысьць стварэньня Балцка-Чарнаморскай Судружнасьці, З. Пазьняк заўважыў, што «пасьля распаду СССР нашыя краіны выпалі са складзенай геапалітычнай прасторы паміж Усходам і Захадам. Вырваўшыся з імпэрскіх межаў, кожная з нашых краінаў сьпяшаецца як найхутчэй на Захад, імкнучыся вярнуцца ў Эўропу, прагне знайсьці новую стабільнасьць у сыстэме новых узаемаадносінаў. Але Захад існуе ў іншай сыстэме эканамічных каардынатаў. Нават такія краіны, як Польшча, Чэхія, Славаччына, Вугоршчына пайшлі ўжо далёка наперад. Эканамічныя раўнапраўныя партнэрскія дачыненьні зь імі з гэтай прычыны ўскладненыя. У той жа час, мы чуем за сьпінай цяжкі подых старой імпэрыі, якая ўсё яшчэ трымае нас за рукі, імкнучыся вярнуць. Мы апынуліся як бы паміж Усходам і Захадам. У гэтай сытуацыі найбольш плённым рашэньнем, на мой погляд, было б асэнсаваньне агульнасьці сваіх інтарэсаў, разуменьне сваёй ролі як стабілізуючай супрацьвагі паміж Усходам і Захадам. Пра гэта сьведчыць уся наша (дарэчы, у значнай частцы агульная) гісторыя і рэальная сытуацыя ў нашым рэгіёне Эўропы. Калі мы не пачнём рабіць крокі насустрач адзін аднаму і аб'ядноўваць намаганьні, мы ўскладнім сваё становішча. Калі, напрыклад, у Беларусі з прычыны штучна створаных умоваў адбудзецца эканамічны абвал, і наша краіна згубіць частку свайго сувэрэнітэту, вынікам гэтага будзе стварэньне тут расейскага стратэгічнага пляцдарму».

Апошняе, як вядома, і адбылося – а ў тыя дні афіцыйная (і ня толькі афіцыйная) прэса абсьмяяла як ідэю стварэньня Судружнасьці, так і нафтавага калектару. Значна пазьней стала вядома, што спэцслужбы Расеі паставіліся да гэтага праекту

вельмі сур'ёзна, паколькі ён супярэчыў таму, што Крэмль вызначае як «нацыянальныя інтарэсы Расеі» (а папросту – супярэчыў імпэрскай ідэі). Адказны за праект з украінскага боку, адзін з кіраўнікоў Народнага Руху М. Байчышын, бясьсьледна зьнік неўзабаве пасьля менскай канфэрэнцыі, разам з дакумэнтамі па калектары. Пошукі яго, у тым ліку на патрабаваньне Чарнавіла, з удзелам украінскіх спэцслужбаў, не далі выніку. І толькі ў канцы 2005 году ідэя Судружнасьці пачала рэалізоўвацца на кіеўскай сустрэчы кіраўнікоў усходнеэўрапейскіх дзяржаваў.

Урад Кебіча, наадварот, усё мацней прывязваў Беларусь да расейскага прамысловага комплексу; праблемы з пастаўкай нафты, якія абвастрыліся ў канцы лета 1993 году, былі скарыстаныя афіцыйнай прапагандай для замацаваньня стэрэатыпу, што «Без России нам не прожить!». Адсутнасьць рынкавых рэформаў у спалучэньні з намэнклятурнай прыватызацыяй спрыялі паглыбленьню эканамічнага крызісу, росту сацыяльнай напружанасьці. Менавіта ў 1993 годзе колькасьць памерлых пераўзышла колькасьць народжаных. Зь сярэдзіны 1993 году кіраўнікі буйных прадпрыемстваў, якія ўвайшлі ў так званы «Беларускі навукова-вытворчы кангрэс» (Санчукоўскі, Устымчук і інш.) пры падтрымцы Савету Міністраў распачалі кампанію за «аднаўленьне абарваных эканамічных сувязяў з Расеяй».

МАНАПАЛІЗАЦЫЯ СМІ

Расейскі ўплыў адбываўся і праз сродкі масавай інфармацыі. У Беларусі працягвалі трансьляцыю некалькіх расейскіх тэлеканалаў, стваруючы парадаксальнае ўспрыманьне насельніцтвам рэчаіснасьці. У Расеі ва ўладзе фармальна знаходзіліся «дэмакраты» (набліжаныя да Ельцына Чубайс, Гайдар, Шахрай, Бурбуліс, пазьней прыйшоў Нямцоў), якія энэргічна праводзілі прыватызацыю на карысьць, пераважна, «прызначаных» алігархаў, ігнаруючы інтарэсы шырокіх колаў насельніцтва Расеі. Празь некалькі гадоў шмат хто з ініцыятараў і правадніковў той прыватызацыі абнародаваў свае шматмільённыя назапашваньні (дарэчы, ужо ў 1992 годзе Пазьняк выступіў супраць прыватызацыі «па-чубайсаўску»,

прапанаваўшы цывілізаваны «чэскі» варыянт). Шмат хто, працягваючы лічыць Маскву «сталіцай нашай Радзімы» і ўспрымаць Беларусь з Расеяй адной дзяржавай, убачанае на маскоўскім ТБ успрымаў як падзеі, датычныя і Беларусі. Таму тэзы «дэмакраты ва ўладзе» і «дэмакраты – раскрадальнікі» прымаліся насельніцтвам як канстатацыя факту.

Беларускае тэлебачаньне і радыё праводзіла збольшага антынацыянальную, антыбеларускую палітыку, падтрымліваючы ў людзей уражаньне, што дэмакратычныя рэформы, якія нібыта адбыліся ў Беларусі, – прычына іх цяжкага эканамічнага становішча. У чэрвені 1992 году Вячаслаў Кебіч заявіў, што «наступствы «перабудовы» роўныя ваенным» (Мінская праўда. 1992. 16 чэрвеня), у 1993-м жа годзе падобныя заявы зрабіліся звычайнымі.

Яшчэ ў канцы 1991 году на даручэньне апазыцыі мне давялося распрацаваць канцэпцыю інфармацыйнай палітыкі, у аснове якой было разьдзяржаўленьне СМІ і стварэньне спрыяльных умоваў беларускамоўнай прэсе. Летам 1992-га, ужо як сакратар парлямэнцкай Камісіі па СМІ, я прапанаваў рэдактарам дзяржаўных выданьняў адмовіцца ад заснавальніцтва іх Саветам Міністраў і іншымі органамі, пайсьці на акцыянаваньне, аднак рэдактары палічылі за лепшае захаваць статус-кво.

Гэткая актыўнасьць, а таксама некалькі маіх размоваў з Кебічам адносна становішча ў СМІ былі ўспрынятыя прэм'ер-міністрам своеасабліва – ён падумаў, што я нечага дамагаюся асабіста для сябе. Мне прапанавалі заняць пасаду генэральнага дырэктара Белінфарму (так тады называлася БелТА); у сытуацыі, калі астатнія СМІ былі пад кіраўніцтвам адданых Кебічу асобаў і элемэнтарна блякавалі б інфармацыю, гэтая пасада ня мела ніякага істотнага значэньня, і я адмовіўся (пазьней ва ўспамінах Аляксандар Фядута апісвае, як увесну 1994 году Кебіч аддае абавязковы для выкананьня загад кіраўніку Белінфарму; безумоўна, пры такім стылі ўзаемаадносінаў прэм'ера са СМІ я б і да вясны 1994-га не дапрацаваў).

Дарэчы, гэта якраз была адна зь дзьвюх прапановаў заняць

дзяржаўную пасаду з боку Кебіча прадстаўнікам апазыцыі БНФ. Дэпутат Сяргей Слабчанка ўзначальваў Дзяржзнак, але на патрабаваньне Пазьняка, у інтарэсах забесьпячэньня выпуску нацыянальнай валюты. Аднак ні кіраўнік Белінфарму, ні кіраўнік Дзяржзнаку не ўваходзілі ў склад ураду, так што нават гэта ня можа лічыцца прапановамі «ўвайсьці ва ўрад». Прызначэньне ж дэпутата апазыцыі БНФ Пятра Садоўскага амбасадарам у Нямеччыне наагул рабілася Прэзыдыюмам Вярхоўнага Савету.

Да восені 1993 году працэс манапалізацыі СМІ, супраць якога актыўна выступала апазыцыя БНФ, быў завершаны – Кебіч кантраляваў значную большасьць штодзённых газэтаў і цалкам тэлебачаньне і радыё. У Савеце Міністраў былі створаныя Ўпраўленьне інфармацыі на чале з В. Драгаўцом і Аддзел друку, радыё і тэлебачаньня на чале з с. Паваляевым – неканстытуцыйныя фармаваньні, якія, у абыход Міністэрства інфармацыі, кантралявалі дзяржаўныя СМІ. Меркаваньні парлямэнцкай Камісіі ў пытаньнях СМІ (пасьля сыходу І. Каратчэні на пасаду каардынатара СНД Камісіяй фактычна кіраваў А. Вярцінскі), якая заяўляла аб антыдзяржаўнасьці некаторых тэле- і радыёперадачаў і недапушчальнасьці манапалізацыі, цалкам ігнараваліся.

У жніўні апазыцыя БНФ дапрацавала канцэпцыю інфармацыйнай палітыкі, якая прадугледжвала прыняцьце дэмакратычнага Закону аб друку, дэманапалізацыю СМІ, спрашчэньне працэдуры рэгістрацыі, прыярытэтнае разьвіцьцё цалкам беларускамоўных СМІ і інш. Гэтыя палажэньні былі пацьверджаныя ў заяве апазыцыі БНФ, дзе таксама прапаноўваліся і кадравыя зьмены. Нашыя прапановы былі абсьмяяныя (менавіта абсьмяяныя, як раней ідэя Балцка-Чарнаморскага калектару) у дзяржаўных выданьнях.

Гэтая манапалізацыя прэсы захаваецца і падчас першых прэзыдэнцкіх выбараў, а пасьля «кантрольны пакет СМІ» пяройдзе ў рукі новаабранага прэзыдэнта.

Аднак Лукашэнка на гэтай пасадзе мог і не апынуцца.

БЫКАЎ СУПРАЦЬ ЛУКАШЭНКІ

Наша заява аб сытуацыі ў СМІ была надрукаваная ў «Народнай газэце» 2 верасьня 1993 году, а на дзень раней газэта зьмясьціла артыкул, які мог бы вызначыць гісторыю Беларусі, калі б некаторыя дэпутаты нібыта дэмакратычнай арыентацыі (В. Ганчар, Д. Булахаў, А. Лябедзька і інш.) кіраваліся інтарэсамі Беларусі, а ня ўласнымі палітычнымі амбіцыямі.

Артыкул Васіля Быкава «Каб захаваць уладу, яны здольныя аб'яднацца хоць з самім д'яблам» займаў больш як паўпаласы і быў рэакцыяй на інтэрвію дэпутата А. Лукашэнкі маскоўскай газэце «Правда», у якім той заклікаў да аднаўленьня СССР.

Ні да гэтага, ні пасьля Быкаў не адгукаўся асобным артыкулам на нейкую канкрэтную публікацыю – несумненна, у словах Лукашэнкі ён адчуў вялізную небясьпеку, пра якую палічыў неабходным папярэдзіць нацыю.

«Народы былога Савецкага Саюзу мелі нядаўна шчасьлівую магчымасьць пазнаёміцца ў «Правде» з адметным сваёй незвычайнасьцю матэрыялам, – пісаў Быкаў. – Маецца на ўвазе інтэрвію з выразна малітоўнаю назвай «Да возродится!», арганізаванае ўласным карэспандэнтам гэтай газэты па Беларусі. Канечне, у свой час у гэтай газэце даводзілася чытаць і не такія матэрыялы (зрэшты, і ў пазьнейшы таксама), але каб з гэткай ашаламляльнай адкрытасьцю паставіцца да кволай незалежнасьці краіны, дзе нарадзіўся і жывеш, дзе будуць жыць твае дзеці, – такое трэба пашукаць у наш час сярод самай чырвона-карычневай прэсы».

Ужо ў першых радках артыкулу Быкаў даў маральную ацэнку праціўнікам беларускай незалежнасьці, а далей выкрыў сапраўдныя інтарэсы старой і новай пракамуністычнай намэнклятуры: «Глядзіш, народ раптам паразумнее, забярэ зямлю і пачне ладзіць жыцьцё на свой лад, як спрадвеку ладзілі яго продкі і ладзяць цяпер па ўсім сьвеце – на аснове здаровага сэнсу і прыватнай уласнасьці. Значыць, спадзяванка адна: звыклы камуністычны рэжым, дзе так салодка жылося вялізнай зграі партыйна-гаспадарчых захрыбетнікаў. І цяпер, спахапіўшыся, яны пачалі адмаўляць у сувэрэннасьці краіне, у якой звыкла валадараць. Так, цяпер кепска – і зьбядненьне, і

разлад, якія яны спрабуюць сьпісаць на дэмакратаў, на славуты разрыў сувязяў, на ізаляцыянізм як палітыку нацыяналістаў. Але ўсё тое – чыста бальшавіцкая прапаганда, замяшаная на гёбэльсаўскіх рэцэптах: чым болей неверагодная хлусьня, тым ахвотней у яе павераць. Дзе ў Беларусі тыя дэмакраты, пры якой служаць уладзе? Жменька дэпутатаў БНФ у Вярхоўным Савеце... Астатнія – камуністы ў сталіцы і раёнах».

«Нацыяналізм бывае розны, – пісаў далей Быкаў, – як і яго палітычныя антыподы. Характар яго вызначаюць шмат якія элемэнты нацыянальнай сутнасьці, геапалітычнай канкрэтнасьці. Нацыяналізм датчан ці фінаў, напрыклад, зусім іншая зьява, чым арабскі нацыяналізм. Зноў жа, у пэўных абставінах нават і антыподы могуць стацца роднаснымі, калі не па форме, дык па сэнсе. Прыгадаем расейскі бальшавізм і нямецкі фашызм, гэтыя два канцы адной палкі. Беларускі нацыяналізм больш вядомы як нацыянал-дэмакратызм, ён ня супраць каго-небудзь, ён – за. Найперш за лёс свае нацыі…

Сувэрэннасьць нацыі і дзяржавы – адна з самых сьвяшчэнных даброт супольнага чалавечага існаваньня, і толькі ва ўмовах скажонай, перакуленай сьвядомасьці зьяўляецца патрэба тое даказваць. Толькі зьнешні вораг ці ўнутраны здраднік можа ў наш час выступаць супраць права народу на самавызначэньне, на самастойнасьць яго існаваньня... Нацыянальная незалежнасьць, дзяржаўная сувэрэннасьць нацый і народаў сталі адметнай вяхой напрыканцы ХХ стагодзьдзя. Іншая справа, як распарадзіцца той сувэрэннасьцю, як на яе аснове наладзіць эканоміку, урэгуляваць прававое жыцьцё. Вядома, у нас яны ладзяцца з рук вон кепска. І тут галоўная прычына ў кіраўніцтве, ва ўладзе. Стала відавочна, што са зьменай сацыяльных адносін патрэбна і зьмена ўлады...»

Такім чынам, акрамя сьцьверджаньняў прыярытэту нацыянальнай незалежнасьці як бясспрэчнай каштоўнасьці, Быкаў адзначыў неабходнасьць палітычных пераўтварэньняў, зьмены ўлады, але пры гэтым – усім сваім артыкулам – паказаў, што Лукашэнка служыць інтарэсам той самай намэнклятуры, якая ўладарыць.

Ніхто з каманды так званых «маладых ваўкоў» (некаторыя

потым будуць клясьціся на творах Быкава) не пажадаў тады прыслухацца да быкаўскіх словаў ні пра сьвятасьць сувэрэнітэту і лёсу Беларусі, ні пра самога Лукашэнку, якога яны жадалі скарыстаць як таран для таго, каб «зваліць Кебіча» і задаволіць уласныя палітычныя амбіцыі. Лёсу Беларусі ў гэтых разьліках месца не было.

І толькі дэпутаты апазыцыі БНФ запатрабавалі ў тыя дні пазбавіць Лукашэнку дэпутацкіх паўнамоцтваў, чаму папярэднічалі і падзеі, што напачатку восені адбыліся ў Маскве.

АПАЗЫЦЫЯ БНФ ПАТРАБУЕ ПАЗБАВІЦЬ ЛУКАШЭНКУ ДЭПУТАЦТВА

Яшчэ летам вялікая група высокапастаўленых чыноўнікаў Савету Міністраў, старшыні аблвыканкамаў і некаторыя дэпутаты Вярхоўнага Савету (зрэшты, большасьць зь іх сумяшчалі свае пасады з дэпутацтвам) правялі па-за межамі Менску сход, які потым атрымаў назоў «патаемнай вячэры». На ім было вырашана давесьці да канца працэдуру адстаўкі Шушкевіча і фарсіраваць увядзеньне прэзыдэнцкага кіраваньня пад Вячаслава Кебіча. Адным з ініцыятараў гэтага сходу і прэтэндэнтам на пасаду сьпікера быў старшыня Гарадзенскага аблвыканкаму Дзьмітры Арціменя – адзін з найбольш антыдэмакратычных і антынезалежніцкіх дэпутатаў ВС зь дзейнай намэнклятуры (з дэпутатамі-вэтэранамі параўнацца ў рэакцыйнасьці ня мог ніхто, але гэтыя былі пазбаўленыя рэальнай улады).

Аднак у верасьні Арціменя быў забіты непадалёк ад свайго дому. Гэта было першае ў краіне забойства чыноўніка такога рангу, прычым адметна, што забойства не лічылі палітычным нават прадстаўнікі ўладаў. Пачалі абмяркоўвацца вэрсіі, зьвязаныя зь бізнэсовымі праектамі, да якіх меў дачыненьне Арціменя. Сьледзтва вялося ў таямніцы, у прэсу выплывала няшмат, аднак мы, дэпутаты, ведалі, што ў сэйфе Арцімені былі знойдзеныя 30 тысяч даляраў – астранамічныя па тым часе грошы (месячная зарплата Шушкевіча і таго ж Арцімені была значна меншая за 100 даляраў; трохпакаёвая кватэра ў

цэнтры Менску каштавала 3–4 тысячы).

У гэтыя ж дні, выступаючы на Гомельшчыне, В. Кебіч заявіў, што лічыць сваёй памылкай удзел у падпісаньні Віскулёўскіх пагадненьняў аб дэнансацыі Саюзнай дамовы. Гэта была адкрытая заява супраць беларускай дзяржаўнасьці. Кебіч таксама зрабіў некалькі закідаў у бок Шушкевіча. Супрацьстаяньне паміж Шушкевічам і Кебічам напрыканцы верасьня набыло адкрыта канфрантацыйны характар.

Аднак праціўнікі Шушкевіча меркавалі, што ў сьпікера ёсьць моцная падтрымка Ельцына, зь якім у Шушкевіча, як лічылася, добрыя асабістыя адносіны. Толькі ў канцы верасьня і сам Ельцын апынуўся ў крытычным становішчы.

Палітычныя апанэнты расейскага прэзыдэнта Ельцына на чале зь віцэ-прэзыдэнтам Руцкім і сьпікерам Вярхоўнага Савету Хасбулатавым паспрабавалі правесьці рэстаўрацыю, заявілі пра імпічмэнт Ельцыну і ўчынілі тое, што Быкаў назваў «мецяжом». У выніку супрацьстаяньня (штурму будынку парлямэнту войскамі, перастрэлкі ля тэлецэнтру) у Маскве 3–4 кастрычніка былі забітыя некалькі дзясяткаў (паводле іншых зьвестак – некалькі соцень) чалавек. У беларускай незалежнай прэсе прайшла інфармацыя, што пасьля правалу путчу баевікі хаваюцца на тэрыторыі Беларусі. Але яшчэ да таго, як мяцеж быў падаўлены, у Маскву зь Менску накіравалася дэлегацыя дэпутатаў Вярхоўнага Савету і высокапастаўленых чыноўнікаў Саўміну для «ўсталяваньня кантактаў» з групай Руцкога–Хасбулатава (а фактычна, іх падтрымкі).

5 кастрычніка дэпутаты апазыцыі БНФ прынялі зварот, у якім канстатавалі, што «грамадзтва Беларусі стала сьведкам здрады Радзіме часткі дэпутатаў пракамуністычнай большасьці Вярхоўнага Савету... пры спагадных адносінах пэўных структураў і асобаў ураду Беларусі (Г. Данілава, с. Гайдукевіча, В. Паўлава і інш.). Мы, дэпутаты апазыцыі БНФ, настойваем на тэрміновым скліканьні нечарговай сэсіі Вярхоўнага Савету Беларусі. Мы патрабуем ад Савету Міністраў Беларусі тэрміновых захадаў. Менавіта: гарантаваць бясьпеку тэрыторыі Рэспублікі Беларусі ад пранікненьня злачынных груповак і асобаў пасьля разгрому фашысцка-камуністычнага мецяжу ў

Расеі; тэрмінова ўвесьці дакумэнтальны і мытны кантроль на межах Беларусі з Расеяй. А ў бліжэйшы час разгледзець пытаньне аб увядзеньні візавага рэжыму; забараніць дзейнасьць камуністычных і праімпэрскіх партыяў і арганізацыяў (ПКБ–КПБ–КПСС, ДСПС, Саюз афіцэраў, Славянскі Сабор «Белая Русь»)... Мы зьвяртаемся да Генэральнага пракурора Беларусі сп. Шаладонава з патрабаваньнем прыступіць да расьсьледаваньня антыдзяржаўнай дзейнасьці гэтых арганізацыяў... Мы лічым неабходным паставіць пытаньне перад Вярхоўным Саветам аб пазбаўленьні дэпутацкіх паўнамоцтваў народных дэпутатаў Беларусі Генадзя Казлова, Мікалая Скарыніна, Аляксандра Лукашэнкі, Івана Трусава, Мікалая Грынёва, якія выступілі супраць незалежнасьці Беларусі... Мы патрабуем неадкладна спыніць распаўсюджваньне ў Беларусі расейскіх камуністычных і фашыстоўскіх газэт...». Зварот падпісалі 24 дэпутаты апазыцыі БНФ на чале з З. Пазьняком плюс член дэпутацкай групы «Згода» В. Даўгалёў (пазьней, пры Лукашэнку – губэрнатар Берасьцейшчыны і віцэ-прэм'ер).

Калі б гэты зварот быў успрыняты іншымі дэпутатамі – Лукашэнка быў бы пазбаўлены дэпутацкіх паўнамоцтваў, не было б праз два месяцы «антыкарупцыйнага» дакладу і, адпаведна, празь дзевяць месяцаў – ягонага прэзыдэнцтва.

ШУШКЕВІЧ: «ВЫ МНЕ КОЛА ВЫРАТАВАЛЬНАЕ КІДАЕЦЕ. А Я ВАМ КАЖУ: НЯ ТРЭБА!»

У тыя першыя дні кастрычніка 1993-га склалася ўнікальная сытуацыя (упершыню пасьля жніўня 1991 году), калі дэмакратычныя сілы маглі б правесьці свае патрабаваньні (адстаўка Кебіча і стварэньне кааліцыйнага ўраду). Але – пры ўмове, што будзе скліканая нечарговая сэсія ВС і што Шушкевіч, рэйтынг якога тады быў надзвычай высокі, запатрабуе адстаўкі ўраду Кебіча, папярэдзіўшы, што ў выпадку ігнараваньня парлямэнтам гэтага патрабаваньня наўпрост зьвернецца да нацыі.

Рэалізацыя гэтага залежала выключна ад старшыні ВС – ён меў права склікаць сэсію ўласным рашэньнем. І паводле пэўнай

інфармацыі мы ведалі, што Шушкевіч схіляецца да гэтага: на паседжаньні Прэзыдыюму ВС яшчэ ў сярэдзіне верасьня Шушкевіч выступіў з рэзкай крытыкай як заяваў Кебіча наконт «развалу СССР», так і эканамічнай палітыкі ягонага ўраду.

Гэтыя заявы Шушкевіча далі нам надзею.

Наагул, галоўнае патрабаваньне, якое мы вылучалі да Шушкевіча што да тактыкі ягоных паводзінаў, – больш пасьлядоўнасьці і рашучасьці.

Нашыя апанэнты паважалі толькі сілу – і ў Шушкевіча была магчымасьць у гэтым пераканацца.

На вакантнае месца старшыні Гарадзенскага аблсавету і аблвыканкаму замест забітага Арцімені намэнклятура мела свайго кандыдата; Шушкевіч жа аддаваў перавагу Сямёну Домашу. Раней Шушкевічу не ўдавалася правесьці ўласныя крэатуры на вакантнае месца свайго намесьніка. І гэта пры тым, што пасада віцэ-сьпікера была шмат у чым дэкаратыўная, у адрозьненьне ад пасады «губэрнатара», якая давала абсалютную паўнату ўлады ў рэгіёне і значны ўплыў ва ўрадзе (і, між іншым, кантроль над немалой часткай дэпутатаў ВС ад «сваёй» вобласьці). Дэпутаты Гарадзенскага абласнога савету (а зацьвярджаць кандыдатуру павінны былі менавіта яны), безумоўна, ведалі пра «вайну» Кебіча і Шушкевіча. Намэнклятурныя, пракамуністычныя дэпутаты з задавальненьнем чакалі зьяўленьня ў залі Шушкевіча, каб даць яму «чарговы ўрок», правёўшы сваю кандыдатуру, ды заадно і «прыгадаць Віскулі». Як казаў у такіх выпадках адзін камуністычны дэпутат, «уваліць, як каню». Ды і калі яшчэ правінцыйнаму чынавенству выпадзе задавальненьне прынізіць кіраўніка дзяржавы зь ліку дэмакратаў? Энтузіязм імгненна зьнік, калі дэпутаты ўбачылі, што разам з Шушкевічам у залю ўбеглі аўтаматчыкі. Насамрэч, да кадравай палітыкі гэта ня мела ніякага дачыненьня – патрэбы бясьпекі прадыктавалі менавіта такую сыстэму аховы першай асобы дзяржавы ў горадзе, дзе нядаўна быў забіты губэрнатар. Аднак псыхалягічнае ўзьдзеяньне было такім моцным, што тыя, хто зьбіраўся «ўваліць» Шушкевічу, хуценька прагаласавалі за прапанаваную сьпікерам кандыдатуру.

Не зьяўляючыся прыхільнікам «галасаваньня пад рулямі аўтаматаў», я ўсё ж быў перакананы, што ідэя незалежнасьці дзяржавы можа і павінна быць абароненая тымі спосабамі і мэханізмамі, якімі гэтая дзяржава, у адпаведнасьці з Канстытуцыяй, валодае. Ветлівая гутарка ў пракуратуры ці іншых адпаведных органах наконт антыканстытуцыйнасьці заклікаў да ліквідацыі Беларусі магла б пазбавіць шкоднай актыўнасьці шмат якіх дзеячаў; некаторым можна было б прадэманстраваць факты іх уласных незаконных бізнэс-гешэфтаў ці сумнеўныя зьдзелкі іх родзічаў.

Унікальнасьць выключна спрыяльнай для дэмакратаў сытуацыі кастрычніка 1993-га была яшчэ і ў тым, што бок Шушкевіча ўзялі старшыня КДБ Эдуард Шыркоўскі і міністар унутраных справаў Уладзімер Ягораў.

Такая падтрымка магла б стаць вызначальная. Гэта аксіёма, якую палітык павінен ведаць гэтак жа, як фізык – закон Ньютана: ва ўсе часы пры неабходнасьці ўтрымаць уладу (альбо ўзяць яе) палітыкі імкнуліся перацягнуць на свой бок сілавых міністраў. Як правіла, менавіта іх падтрымка (альбо непадтрымка) вызначала лёс улады. Тут жа і ня трэба было нікога перацягваць. Міністар унутраных справаў і старшыня КДБ галосна (у адкрытым лісьце на імя дэпутатаў ВС) выступілі супраць найбліжэйшага атачэньня Кебіча і спадзяваліся на спрыяньне старшыні Вярхоўнага Савету. Гэта была ўнікальная сытуацыя, якую Шушкевіч павінен быў скарыстаць.

У роспале канфлікту паміж сьпікерам і прэм'ерам да мяне зьвярнуўся начальнік аддзелу інфармацыі апарату ВС Васіль Вараб'ёў (ён уваходзіў у лік даверaных асобаў Шушкевіча) з просьбай паспрыяць сустрэчы Шушкевіча з прадстаўнікамі апазыцыі БНФ. Паколькі сам Станіслаў Станіслававіч выступіць з такой ініцыятывай ня мог (напэўна, не дазваляў гонар), я накіраваў яму ліст з просьбай правесьці такую сустрэчу. Тым болей, што была нагода – апазыцыя БНФ патрабавала правядзеньня нечарговай сэсіі, адстаўкі ўраду Кебіча і стварэньня кааліцыйнага ўраду. Паводле нашых зьвестак, даволі значная частка дэпутатаў – колішніх прыхільнікаў Кебіча, былі згодныя зьмясьціць яго з пасады прэм'ера і

стварыць новы ўрад з удзелам апазыцыі. Прычынай такіх зьменаў было абвастрэньне эканамічнай сытуацыі (найперш – дэфіцыт паліва; у мяне на бальконе стаяла як НЗ каністра з 10 літрамі бэнзіну, а калі спатрэбілася заліць бак, каб паехаць на даручэньне Пазьняка ў Беласток, давялося прасіць міністра, і той асабіста даваў распараджэньне на бэнзазапраўку).

Уласна, для дэпутатаў, у тым ліку й для апазыцыі, не было ніякай праблемы сустрэцца з Шушкевічам у любы дзень – ён вызначаўся дэмакратызмам паводзінаў і ахвотна нас прымаў, мы гэтым карысталіся, праўда, усё радзей, паколькі Станіслаў Станіслававіч любіў паўтараць, што ягоная ўлада распаўсюджваецца толькі на працэдурныя пытаньні падчас сэсіі. Але, як мне падавалася, цяперашняя сустрэча – а яна мела сэнс толькі пры ўдзеле лідэра апазыцыі Пазьняка – мела б зусім іншую танальнасьць; узьнікала магчымасьць скаардынаваць сумесныя дзеяньні, каб узяць палітычную ініцыятыву ў свае рукі.

Сустрэча адбылася 6 кастрычніка ў будынку ВС на К. Маркса. Ад апазыцыі БНФ былі Пазьняк, Трусаў, Голубеў, Холад і я, ад Партыі народнай згоды (лідэр – Карпенка) – Даўгалёў. У пакоі быў ахоўнік Шушкевіча, але зьдзівіла прысутнасьць прадстаўніка парлямэнцкай большасьці Мікалая Бамбізы. Мы яго не запрашалі – значыць, запрасіў Шушкевіч. Бамбіза, усю сустрэчу праседзеўшы моўчкі, празь некалькі тыдняў быў абраны намесьнікам сьпікера (пры Лукашэнку – кіраўнік нафтапаліўнага комплексу).

Ужо зь першай фразы Шушкевіча было зразумела, што ягоныя пляны зьмяніліся: «У апошні час узмацнілася такая тэндэнцыя – даваць шэраг даручэньняў старшыні Вярхоўнага Савету, даваць іх праз СМІ, і пасьля гаварыць, што ён ніяк не рэагуе на іх». Раздрукоўка магнітафоннага запісу сустрэчы займае некалькі дзясяткаў старонак, прывяду толькі некаторыя характэрныя эпізоды:

«*Голубеў*: Вярхоўны Савет павінен вызначыцца, у сувязі з тым, што шэраг дэпутатаў Вярхоўнага Савету, якія працуюць на вельмі адказных пасадах, выступалі і выступаюць супраць незалежнасьці Беларусі – за аднаўленьне старога,

таталітарнага ў нашай дзяржаве.

Навумчык: ...Пра стварэньне кааліцыйнага ўраду. Гэты кааліцыйны ўрад, як мы лічым, павінен зьдзейсьніць тры мэты. Першая – гарантаваць пачатак перадумоў для рынкавых рэформаў, спыніць гэтае раскраданьне маёмасьці. Другое – гарантаваць правы асобы, у тым ліку і права свабоды слова. І трэцяе – правесьці выбары. Гэта ўрад на 7–8 месяцаў, гэта ўрад бяз гэтага старшыні Савету Міністраў.

Пазьняк: Тая работа, якую робіць Кебіч – актыўная работа – па развале дзяржавы – Рэспублікі Беларусь, па зьнішчэньні яе сувэрэнітэту, – яна цалкам падтрымліваецца Вашай пазыцыяй. Вашай пазыцыяй нічоганерабленьня, безыніцыятыўнасьці. Больш за тое. Няма ніякай розьніцы – ці дзяржава Беларусь пойдзе ў пашчу Расеі хасбулатаўскай, ці яна пойдзе ў пашчу Расеі ельцынаўскай. Усё роўна вынік будзе адзін і той жа. І калі Ельцын расправіцца з камуністамі, – а ён расправіцца, гэта чалавек-танк, ён даказаў гэта ня раз, – ён будзе праводзіць тую самую геапалітыку, якую праводзіў усе гэтыя два гады. Войны ў Грузіі, у Таджыкістане, у Прыднястроўі. Яны стварылі гэтую банду, яны пастваралі гэтых баевікоў, яны захлынуліся гэтай жа самай крывёю... Вось у чым справа. Таму Вашая пазыцыя цяпер абсалютна неініцыятыўная, Вы не выкарыстоўваеце момант. Заўтра будзе позна. «Хороша ложка к обеду». Вы працягваеце тую самую палітыку, якую намеціў Кебіч для ліквідацыі нашых магчымасьцяў у фінансава-крэдытнай сыстэме, тое, што Вы цяпер падтрымліваеце аб'яднаньне грашовых сыстэм – гэта поўная ліквідацыя сувэрэнітэту. І ў гэтай сытуацыі, калі Вы не выкарыстаеце зараз – а з кожным днём Вашыя магчымасьці падаюць – калі Вы ня выкарыстаеце зараз мінімальных магчымасьцяў, то 9 лістапада (меркаваны пачатак чарговай сэсіі ВС. – **С. Н.**) хутчэй за ўсё Вас ня будзе. Вас ня будзе каму болей падтрымліваць.

Шушкевіч: Добра, дзякуй, у вас усё? Значыць, я разумею, што ваш зварот накіраваны на тое, каб, ня дай Бог, я ня страціў сваёй пазыцыі, ня страціў падтрымкі, і вы проста зьвярнуліся да мяне, каб мяне падтрымаць. Я вам удзячны.

Пазьняк: Не, ня так. Прабачце, што Вы, што Кебіч – для нас

адно і тое. І каб былі б гарантыі – вам трэба ісьці абодвум. Таму што ня можа быць дзяржава заложнікам двух пасрэдных людзей, якія паміж сабою як бараны сталі і талкуцца. Вось што: Вы несяце такую ж самую адказнасьць, як Кебіч, за гэта ўсё, і Вы павінны пра гэта ведаць. Поўную адказнасьць Вы несяце, і ня думайце, што Вы...

Шушкевіч: Зянон Станіслававіч, Вы зноў будзеце пачынаць некалькі разоў? Я Вас выслухаў...

Пазьняк: Пра Вас размова не ідзе.

Шушкевіч: Добра. Значыцца, калі растлумачыць вашу пазыцыю, вы мне кола выратавальнае кідаеце. А я вам кажу: ня трэба!..

Навумчык: Шаноўны старшыня...

Шушкевіч: Адну хвілінку! І нічога, акрамя лёзунгаў, у вас на сёньняшні дзень няма.

Навумчык: У якой ступені была, выбачайце, падрыхтавана сэсія 25 жніўня 1991 году? Акрамя таго, што падрыхтавала апазыцыя, не было нічога. Але была ж палітычная сытуацыя, якая вымагала пэўных палітычных дзеяньняў. Тое самае і цяпер, Станіслаў Станіслававіч...

Трусаў: Вы цудоўна ведаеце: структура Савету Міністраў нагадвае ЦК КПБ. Гэтых камітэтаў розных і службаў больш, чым міністэрстваў. Калі міністры нават не сядзяць з Кебічам, а сядзяць, як хлопчыкі, ззаду, а тут сядзяць нейкія невядомыя нам людзі. Калі мы да канца году захаваем старую структуру Саўміну, нас нічога добрага не чакае, што б там ні было ў Расеі ці ў Вашынгтоне. Вы паглядзіце, што атрымліваецца, як раздуўся гэты апарат.

Шушкевіч: Спадар Трусаў, а як яго зьмяніць?

Трусаў: Як зьмяніць? Вельмі проста – пачаць з кіраўніка.

Навумчык: Выйдзіце з ініцыятывай!

Шушкевіч: Вас падтрымае Вярхоўны Савет?

Навумчык: Выйдзіце з ініцыятывай!

Шушкевіч: Вас падтрымае Вярхоўны Савет?

Навумчык: Народ падтрымае.

Пазьняк: І можа падтрымаць Вярхоўны Савет, калі правільна арганізаваць работу.

Навумчык: Калі падтрымае народ, падтрымае і Вярхоўны Савет. Вярхоўны Савет не падтрымліваў незалежнасьці яшчэ ў маі 1991 году».

Шушкевіч адмовіўся склікаць сэсію (казалі, што «замірыўся» з Кебічам). Ініцыятыва пераходзіла ў рукі кіраўніцтва Савету Міністраў, якое адразу ж узмацніла дыскрэдытацыю Вярхоўнага Савету, не чапаючы пакуль пэрсанальна Шушкевіча.

На наступны дзень пасьля сустрэчы з Шушкевічам, 7 кастрычніка, разам з Анатолем Вярцінскім мы сабралі адмысловае паседжаньне Камісіі па галоснасьці, сродках масавай інфармацыі і правах чалавека, куды запрасілі і іншых дэпутатаў, якія ў склад Камісіі не ўваходзілі: З. Пазьняка, А. Трусава, Я. Цумарава, а таксама старшыню Дзяржтэлерадыё А. Сталярова і кіраўнікоў структураў Саўміну. Тэма паседжаньня была вызначаная каротка – «інфармацыйная бясьпека».

У гэты момант антынезалежніцкая гістэрыя ў афіцыйных СМІ дасягнула апагею; як адзначыў Зянон Пазьняк, «СМІ развальваюць нашую незалежнасьць». Яўген Цумараў зьвярнуў увагу на тое, што не выконваецца Закон аб мовах, прычым, не выконвае яго, фактычна, старшыня Савету Міністраў, пад чыім кантролем знаходзяцца дзяржаўныя СМІ – акрамя газэтаў «Звязда» і «Народнай газеты», заснавальнікамі ці сузаснавальнікамі якіх выступіў Вярхоўны Савет. Член камісіі, галоўны рэдактар «Народнай газеты» Іосіф Сярэдзіч прывёў лічбы фінансаваньня, якое Саўмін выдаткаваў на расейскамоўныя газэты, у якіх, да таго ж, праводзілася праімпэрская, антынезалежніцкая прапаганда: «Знамя юности» – 162 мільёны рублёў, «Советская Белоруссия» – 133 мільёны, «Рэспубліка» – 85 мільёнаў.

Кіраўніцтва антыбеларускай прапагандай ішло са структураў Саўміну; Камісія большасьцю галасоў (супраць выступілі дэпутаты пракамуністычнай арыентацыі) вырашыла патрабаваць ад В. Кебіча ліквідаваць неканстытуцыйныя структуры ў апараце Саўміну, на чале якіх былі В. Драгавец і с. Паваляеў. Апошні заявіў на паседжаньні: «Мяне прызначаў Кебіч – ён мяне і будзе здымаць, – і дадаў: – Паменей палітыкі – паболей справаў» (гэта ў твар дэпутатам парлямэнту).

Вынікі паседжаньня камісіі ў той жа дзень былі дакладзеныя намі с. Шушкевічу, аднак ніякіх канкрэтных захадаў ён не прыняў. Станіслаў Станіслававіч сапраўды паверыў у тое, што яму ўдалося знайсьці з Кебічам «згоду».

16 кастрычніка з ініцыятывы Зянона Пазьняка ў Доме літаратара адбылася Канфэрэнцыя некамуністычных і антыімпэрскіх сілаў Беларусі, на якой з палітычнымі дакладамі выступілі З. Пазьняк і А. Трусаў, з эканамічнымі – В. Алампіеў, с. Гусак, І. Нікітчанка, пра структуры і задачы пераходнага кааліцыйнага ўраду гаварыў У. Заблоцкі. Канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыю «Аб абароне дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі», адзначыўшы, што лічыць незалежнасьць «абавязковай умоваю, якая гарантуе магчымасьць пабудовы дэмакратычнага грамадзтва, здаровай рынкавай эканомікі, забесьпячэньня правоў чалавека і неабходнай сацыяльнай абароненасьці асобы, захоўвае пэрспэктыву існаваньня і разьвіцьця беларускага народу».

ВОЙСКІ Ў ПАРЛЯМЭНЦЕ – «ДАКЛАД» ЛУКАШЭНКІ – ПАДПІСАНЬНЕ ВАЙСКОВАЙ ДАМОВЫ

У пачатку лістапада апазыцыя БНФ правяла перад будынкам ВС мітынг супраць карупцыі ў дзяржаўных органах, гучалі прыклады незаконных дзеяньняў самых высокапастаўленых чыноўнікаў. Дзяржаўныя СМІ праігнаравалі абвешчаныя намі зьвесткі, сам жа мітынг ацанілі як праяву палітыканства. Максымальны розгалас з жывой тэле- і радыётрансьляцыяй рыхтаваўся ўрадам для іншага «антыкарупцыйнага» выступу. Якраз у гэтыя самыя дні ў будынку Дому ўраду пісаўся даклад

Лукашэнкі – пры актыўным удзеле Людмілы Масьлюковай, супрацоўніцы газэты Савету Міністраў «Советская Белоруссия», і аднаго зь лідэраў камуністычнай партыі Васіля Новікава. Асноўны ўдар рыхтаваўся па Шушкевічу і дэмакратычных дэпутатах – і менавіта Лукашэнку атачэньне Кебіча абрала ў ролі тарана, які павінен быў зваліць Шушкевіча (а каманда «маладых ваўкоў» вызначала яму тую самую ролю ў дачыненьні да Кебіча).

Усе гэтыя дні апрацоўваліся дэпутаты, якія ўсумніліся ў праве Кебіча займаць пасаду кіраўніка ўраду.

5 лістапада бліжэйшае атачэньне Кебіча нанесла першы ўдар. Урад выступіў са зваротам, у якім абвінавацiў БНФ у тым, што той нібыта заклікае да стварэньня баявых дружынаў, узброеных выступаў ды распальвае міжнацыянальную варожасьць. Як нам адразу стала вядома, заява пісалася ў кабінэце прэс-сакратара прэм'ера Ўладзімера Замяталіна. 6 лістапада прадстаўнікі дэмакратычных сілаў выступілі з заявай, у якой абверглі сьцьвярджэньні ўраду, назваўшы іх «правакацыйнымі». «Мы проціпастаўляем правакацыйным, гвалтоўным дзеяньням ураду цывілізаваныя крокі ў межах законнасьці. Мы патрабуем ад Вярхоўнага Савету прыняць канстытуцыйнае рашэньне – стварыць пераходны ўрад і правесьці датэрміновыя выбары паводле новага, сапраўды дэмакратычнага выбарчага закону, за што падпісаліся 442 тысячы грамадзянаў Беларусі, патрабуючы рэфэрэндуму», – гаварылася ў заяве, падпісанай лідэрамі трынаццаці партыяў і арганізацыяў, у тым ліку БНФ, БСДГ, ЗБС «Бацькаўшчына», БЗВ, ТБМ.

Сэсія ВС была прызначаная на 9 лістапада. 8 лістапада ў 14 гадзінаў Шушкевіч правёў прэс-канфэрэнцыю. Ён заявіў, што будзе галасаваць за «ўсе пазыцыі гэтай Канстытуцыі» (а значыць, і за прэзыдэнцтва), дапусьціў магчымасьць увядзеньня расейскага рубля («нават увядзеньне ўласнай валюты не супярэчыць адзінай рублёвай зоне, паколькі абапірацца будзе на расейскі рубель»). На пытаньне Аляксандра Старыкевіча адносна таго, чаму спэцназ пераведзены на казарменнае становішча (гэта значыць – прыведзены ў баявую гатовасьць), а па Менску распаўсюджваюцца ўлёткі нібыта ад БНФ з заклікам

да пагромаў, і ці ня бачыць ён у гэтым ініцыятывы Саўміну, Шушкевіч адказаў: «Я адрынаю такое падозраньне. Ня трэба правакатараў атаясамліваць з урадам. Надышоў час паважаць уладу».

Праз гадзіну адбылося паседжаньне апазыцыі БНФ – у прысутнасьці міністра ўнутраных справаў Уладзімера Ягорава (ён быў у канфлікце са сваім намесьнікам, камандуючым унутранымі войскамі Канстанцінам Платонавым, які быў на баку Кебіча). Міністар пацьвердзіў, што найбліжэйшае атачэньне Кебіча мае самае непасрэднае дачыненьне да выпуску масавым накладам улётак ад імя БНФ.

Увечары 8 лістапада мне паступіла інфармацыя, што якраз атачэньне Кебіча і лідэры дэпутацкай групы «Беларусь» рыхтуюць правакацыю заўтра, у першы дзень сэсіі, і маюць намер распачаць працэдуру адстаўкі Шушкевіча. Я патэлефанаваў Шушкевічу дахаты і папрасіў тэрмінова сустрэцца. Сустрэцца ён ня мог, прапанаваў перадаць інфармацыю пісьмова, дзеля чаго ён прышле свайго чалавека. Праз паўгадзіны да мяне ва Ўручча прыехаў адзін з супрацоўнікаў аховы Шушкевіча, празь якога я й перадаў ліст, у якім прапаноўваў ужо назаўтра, у першы дзень сэсіі, рэальна ацаніць сытуацыю, ня верыць «замірэньням» Кебіча, узяць ініцыятыву ў свае рукі і запатрабаваць адстаўкі ўраду (у мяне няма сумневу, што ліст ня трапіў да Кебіча – ахоўнікі Шушкевіча былі адданыя яму людзі, да таго ж старшыня КДБ Шыркоўскі быў на ягоным баку. Зрэшты, я б у той вечар з задавальненьнем прачытаў свой зварот у жывым тэлеэтэры, калі б была такая магчымасьць).

Нараніцу 9 лістапада, у першы дзень сэсіі, каля Дому ўраду стаялі БТРы, а ў самім будынку знаходзілася больш за тысячу ўзброеных байцоў унутраных войскаў са зброяй. Шушкевіч не пажадаў выносіць на сэсію пытаньне аб адстаўцы ўраду; прапановы аб адстаўцы, зробленыя апазыцыяй БНФ, не ўключаліся ў парадак дня сэсіі. Аднак у парадак парлямэнцкая большасьць прасунула пытаньне пра Дамову аб калектыўнай бясьпецы СНД.

Праімпэрскае лобі адразу актывізавала ідэю ўвядзеньня

расейскага рубля, і каардынатар групы «Беларусь» Генадзь Казлоў заявіў, што зацьвердзіць разьліковы білет Нацыянальнага банку РБ у якасьці адзінага плацежнага сродку (г. зн., увесьці нацыянальную валюту) нібыта імкнецца парлямэнцкае лобі, якое адстойвае інтарэсы камэрцыйных банкаў, і ён «не пераканаы, што ў дадзеным выпадку інтарэсы камэрцыйных банкаў супадаюць з інтарэсамі беларускага грамадзтва» (інфармбюлетэнь агенцтва «Павет», 20.11.1993). Нацыянальную валюту адстойвала якраз апазыцыя БНФ. У той момант я, зьяўляючыся яе каардынатарам, ня быў знаёмы ні з адным кіраўніком камэрцыйных банкаў – яны, як і 99,99 % бізнэсоўцаў, пазьбягалі кантактаў з намі, бо гэта магло б скампрамэтаваць іх перад уладай і пашкодзіла б іх бізнэсу.

14–15 сьнежня Аляксандар Лукашэнка выступіў са сваім «антыкарупцыйным» дакладам, у якім мінімальна гаварылася пра карупцыю ў структурах Савету Міністраў, затое на Шушкевіча і некаторых дэмакратычных дэпутатаў выліваліся памыі хлусьні. Прамовы Лукашэнкі (14 сьнежня быў даклад, 15-га – адказы на пытаньні) трансьляваліся ў жывым тэле- і радыёэтэры. Гэта дапамагло ўзьняць Лукашэнку вялізны рэйтынг; з гэтага моманту спыніць ягонае імкненьне да прэзыдэнцтва можна было толькі адмовіўшыся ад самой ідэі ўвядзеньня прэзыдэнцкай улады (апазыцыя БНФ працягвала выступаць супраць прэзыдэнцтва).

У апошні дзень 1993 году, 31 сьнежня, Станіслаў Шушкевіч афіцыйна пацьвердзіў далучэньне Беларусі да Дамовы аб калектыўнай бясьпецы СНД.

Дэпутаты апазыцыі БНФ склікалі экстраную прэс-канфэрэнцыю, на якой Пазьняк ацаніў учынак Шушкевіча як здраду нацыянальным інтарэсам Беларусі і зьвярнуў увагу на тое, што раней Шушкевіч заяўляў пра мэтазгоднасьць рэфэрэндуму адносна Дамовы аб КБ. Пазьняк таксама заявіў, што мае доказы дзеяньняў расейскіх разьведслужбаў у Беларусі.

Гэтак – уваходжаньнем Беларусі ў сыстэму расейскага вайскова-прамысловага комплексу, тую сыстэму, якая пазьней, з прыходам Пуціна, зрабілася асноўнай дамінантай імпэрскай палітыкі Крамля – завяршыўся для Беларусі 1993 год. А

канфлікты, якія набылі гранічную палярызацыю, разьвязаліся ў першыя тыдні новага году.

ТРЫ ПАДЗЕІ АДНАГО ДНЯ

Неяк ужо даводзілася зьвяртаць увагу на цікавы зьбег акалічнасьцяў: у адзін дзень, а менавіта 15 студзеня 1994 году, адбыліся тры адметныя падзеі найноўшай беларускай гісторыі.

15 студзеня Менск наведаў прэзыдэнт ЗША Біл Клінтан – гэта быў першы і пакуль адзіны візыт кіраўніка самай магутнай дзяржавы ў незалежную Беларусь. Гэтым самым выказвалася падтрымка Беларусі як дзяржаве, якая з уласнай ініцыятывы адмовілася ад ядзернага статусу. Мне даводзілася мець дачыненьне і да падрыхтоўкі гэтага візыту яшчэ ўлетку 1993 году, і да тых драматычных падзеяў, якія адбыліся за дзень да прыезду Клінтана вакол яго сустрэчы з прадстаўнікамі апазыцыі і наведваньня Курапатаў (выканаўчая ўлада рабіла ўсё, каб гэтага наведваньня не было). Тым ня менш, Клінтан прыехаў у Курапаты і, такім чынам, сустрэўся з З. Пазьняком двойчы на працягу дня (была яшчэ сустрэча ў Доме прыёмаў па вул. Захарава). З Кебічам (у прысутнасьці яго намесьнікаў і міністра Краўчанкі) Клінтан таксама сустрэўся. Гэтай гутарцы з Кебічам афіцыйныя СМІ надалі максымальную ўвагу, пра сустрэчы з Пазьняком была дадзена мінімальная інфармацыя. Не маглі СМІ ігнараваць і таго, хто сустракаў, суправаджаў і праводзіў амэрыканскага прэзыдэнта – старшыню Вярхоўнага Савету. У тыя дні прэса слушна адзначыла, што гэта быў «зорны дзень» Шушкевіча, ягоны трыюмф.

Дарэчы, праімпэрскія сілы ў Вярхоўным Савеце намагаліся скінуць Шушкевіча яшчэ да візыту, небеспадстаўна разьлічыўшы, што пасьля ягонай адстаўкі Клінтан можа і абмінуць Менск. Гэта было цалкам у інтарэсах Масквы – візыт амэрыканскага прэзыдэнта быў Крамлю нявыгадны, бо прыцягваў, хай сабе і на адзін дзень, увагу вядучых сродкаў масавай інфармацыі і, фактычна, інфармацыйна замацоўваў Беларусь на мапе сьвету, інфармацыйна легітымізаваў існаваньне незалежнай Беларусі. Аднак гэты разьлік уступіў у супярэчнасьць з асабістым інтарэсам Кебіча – яму, трэба

думаць, параілі не ўпускаць магчымасьці засьвяціцца з прэзыдэнтам ЗША ў прапагандысцкіх інтарэсах будучай прэзыдэнцкай кампаніі.

15 студзеня ў «Народнай газеце» быў надрукаваны артыкул Зянона Пазьняка «О русском империализме и его опасности».

Гэты артыкул выклікаў гістэрыю як у афіцыйнай прэсе, так і ў дэмакратычна-лібэральных выданьнях; аднак ніводны з аргумэнтаў Пазьняка да сёньня не абвергнуты. Калі б тады грамадзтва прыслухалася да высноваў, не былі б страчаныя гады на ілюзіі адносна Расеі, на ўсьведамленьне геапалітычных аксіёмаў ды месца Беларусі на мапе Эўропы.

У той жа дзень, 15 студзеня, літоўскія праваахоўныя органы арыштавалі на тэрыторыі Беларусі і вывезьлі ў Літву лідэраў літоўскай кампартыі, якія абвінавачваліся ў падтрымцы антыдзяржаўнага путчу ў студзені 1991 году і нелегальна хаваліся ў Менску.

Віна за «выдачу камуністаў» пракамуністычнай большасьцю была ўскладзеная на старшыню КДБ Э. Шыркоўскага і міністра ўнутраных справаў У. Ягорава. Як згадвалася вышэй, у апошнія тыдні 1993 году Шыркоўскі і Ягораў зьвярнуліся зь лістом да дэпутатаў Вярхоўнага Савету, у якім абвінавацілі атачэньне Кебіча ў неканстытуцыйных дзеяньнях. У прыватнасьці, у стварэньні неканстытуцыйных структураў. Апазыцыя БНФ выказала падтрымку пазыцыі Шыркоўскага і Ягорава. Шушкевіч ад заяваў устрымаўся.

Пасьля закрытага паседжаньня ВС Шыркоўскі і Ягораў былі адпраўленыя ў адстаўку.

АДСТАЎКА ШУШКЕВІЧА

На тым жа закрытым паседжаньні ВС, калі разглядалася справа Шыркоўскага і Ягорава, Лукашэнка выступіў з крытыкай с. Шушкевіча за тое, што ён не ўратаваў агентаў расейскай выведкі, якія былі выяўленыя ў нью-ёрскім прадстаўніцтве Беларусі ў ААН і высланыя з тэрыторыі ЗША. Між іншым,

менавіта гэтае абвінавачаньне, а не знакамітая «скрыня цьвікоў», якую нібыта Шушкевіч не аплаціў пры рамонце кватэры, была нагодай для ўключэньня ў парадак дня пытаньня аб адстаўцы. 26 студзеня 1994 году Шушкевіч быў зьняты з пасады старшыні Вярхоўнага Савету.

Дэпутаты апазыцыі БНФ ня ўдзельнічалі ў галасаваньні, але нашыя галасы ўжо не маглі нічога вырашыць: супраць Шушкевіча была настроеная значная частка дэпутатаў, якія называлі сябе дэмакратамі.

«Упаў першы белавескі зубар», – трыюмфальна заявіў адразу пасьля галасаваньня адзін з ініцыятараў адстаўкі Віктар Ганчар. «Ня справа мышэй ацэньваць паводзіны зуброў», – парыраваў Шушкевіч.

Пасьля гэтага кебічаўская намэнклятура, «маладыя ваўкі» і група Карпенкі пачалі фарсіраваць прыняцьце варыянту Канстытуцыі з прэзыдэнцкім кіраваньнем.

ПРЭЗЫДЭНЦТВА ПАД ПРЫМУСАМ

На працягу месяца, які папярэднічаў прыняцьцю Канстытуцыі, апазыцыя БНФ тройчы прымала заявы супраць увядзеньня прэзыдэнцтва, але нашы аргумэнты адносна таго, што такая форма кіраваньня пагражае Беларусі дыктатурай, зьдзекліва адкідаліся і атачэньнем Кебіча, і «маладымі ваўкамі».

У лютым лідэры групы «Беларусь» ініцыявалі галасаваньне пайменнымі бюлетэнямі за «прэзыдэнцкія» разьдзелы – прычым, на працягу трох дзён. Такі варыянт супярэчыў рэглямэнту ВС і, па сутнасьці, быў нелегітымны. У будынак Дому ўраду звозіліся дэпутаты, якія на сэсіях не былі гадамі (некаторых я ўвогуле бачыў упершыню), прывозілі дэпутатаў-вэтэранаў са шпіталяў – зьбіраўся патрэбны для прыняцьця канстытуцыйнага рашэньня (дзьве траціны галасоў ад колькасьці мандатаў) кворум.

І тут таксама мы скарысталі тактыку байкоту – дэпутаты апазыцыі БНФ ня бралі бюлетэняў і ня ўдзельнічалі ў

галасаваньні. Аднак за ўвядзеньне прэзыдэнцтва выказаліся «маладыя ваўкі» Лукашэнкі і група Карпенкі – і нашыя галасы ўжо не маглі паўплываць на вынік.

Пасьля таго, як прэзыдэнцтва было прынятае, мы запатрабавалі, каб прэзыдэнт ня быў кіраўніком выканаўчай улады, і каб яго выбары адбыліся не раней чым праз паўгоду пасьля парлямэнцкіх выбараў. Гэтая прапанова таксама была праігнараваная – сьпяшаўся Кебіч, сьпяшаліся «маладыя ваўкі».

Большасьць дэпутатаў адвергла і прапанаваную дэпутатамі апазыцыі БНФ прэамбулу Канстытуцыі, дзе нагадваліся вытокі беларускай дзяржаўнасьці – Вялікае Княства Літоўскае і Беларуская Народная Рэспубліка.

15 сакавіка Канстытуцыя з прэзыдэнцтвам шляхам грубага парушэньня рэглямэнту ВС была прынятая.

«МАЛАДЫЯ ВАЎКІ» СУПРАЦЬ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

У тыя дні я сказаў Кебічу, што ён вельмі памыляецца, калі бачыць у Лукашэнку свайго палітычнага партнэра. Вячаслаў Францавіч адказаў нешта накшталт таго, што, магчыма, я і маю рацыю, але «час пакажа».

Доўга чакаць прэм'ер-міністру не давялося.

27 сакавіка Лукашэнка падчас выступу ў жывым этэры беларускага радыё (на распараджэньне Саўміну Лукашэнку, у адрозьненьне ад нас, усё яшчэ давалі час у этэры) заявіў, што «калі Кебіч ня будзе прэзыдэнтам – ён будзе сядзець у турме».

З гэтага моманту Лукашэнка пачаў адкрытую палітычную гульню, незалежную ад Кебіча, але, як выглядае, вельмі залежную ад імпэрскіх інтарэсаў Масквы. Сярод дэпутатаў Вярхоўнага Савету ўтварылася група, якая падтрымала чалавека, што адкрыта і пасьлядоўна выказваўся за зьнішчэньне беларускай дзяржаўнасьці, ганьбіў нацыянальныя сымбалі, – Дзьмітры Булахаў, Віктар Ганчар, Віктар Кучынскі, Анатоль Лябедзька, Леанід Сініцын, Віктар Шэйман ды

некаторыя іншыя.

Асновай прапагандысцкай кампаніі Лукашэнкі зрабілася дэмагогія, замяшаная на антынезалежніцкай рыторыцы.

Ні на якім этапе выбараў Лукашэнка і ягоныя хаўрусьнікі ня выступілі ў падтрымку беларускай мовы; уся іх кампанія вялася па-расейску.

Паказальны рэпартаж А. Тамковіча ў газэце «Свободные новости» пра сустрэчу Лукашэнкі з выбарцамі ў Ашмянах.

Лукашэнка заявіў пра неабходнасьць аб'яднаньня грашовых сыстэмаў Беларусі і Расеі, з чым, на ягоную думку, урад Кебіча марудзіў. «Аддаўшы належнае Кебічу за правал з аб'яднаньнем грашовых сыстэмаў, Аляксандар Рыгоравіч панаракаў, што СССР развалены быў злачынна, бо тыя, хто сабраліся ў Белавескай пушчы, не ўяўлялі і не прагназавалі магчымага разьвіцьця падзеяў. І за гэта некаторым, менавіта Кебічу і Шушкевічу, яшчэ давядзецца адказваць...

Пытаньне: Чаму Вы ўзялі ўдзел у ганебным зьняцьці з пасады с. Шушкевіча?

Адказ А. Лукашэнкі: Шушкевіча зьнялі не за кіляграм цьвікоў, а за развал дзяржавы.

Пытаньне: Выступаючы ў Ашмянах, Зянон Пазьняк назваў Вас палітычным авантурыстам, які працуе па ўказцы Кебіча і на замежныя спэцслужбы.

Сьмех у залі.

Адказ: Дзякуй богу, што, у адрозьненьне ад некаторых палітыкаў, я не прэтэндую на бранскія і смаленскія землі.

З Лукашэнкам на ашмянскай сустрэчы прысутнічалі дэпутаты з руху «Новыя імёны – новая палітыка» Анатоль Лябедзька і Аляксандар Шыпко. І на душы было неяк весялей ад думкі, што палітыкай у Беларусі займаюцца ня толькі пэнсіянэры» (Свободные новости. Апрель 1994. № 8).

Такім чынам, яшчэ на самым пачатку выбарчай прэзыдэнцкай кампаніі Лукашэнка пацьвердзіў сваю пазыцыю як антынезалежніка (ліквідацыя нацыянальнай валюты, суд над «віноўнікамі» распаду СССР і інш.), пры поўнай згодзе членаў ягонай каманды.

ЖАДАНЬНЕ БЫКАВА, ЯКОЕ НЯ СПРАЎДЗІЛАСЯ

Дэбаты – на каго з двух дэмакратычных лідэраў, на Пазьняка ці на Шушкевіча, павінна была ставіць апазыцыя, разгарнуліся ўжо пасьля першага туру выбараў і доўжацца да сёньня. Так, дэпутаты БСДГ на чале з Алегам Трусавым (які адначасна зьяўляўся намесьнікам Пазьняка па апазыцыі БНФ) падтрымалі Шушкевіча. Мы ж не маглі зрабіць гэтага з тае прычыны, што, пры ўсёй сваёй сумленнасьці і маральнасьці, на працягу больш як двух гадоў знаходжаньня на пасадзе першай асобы ў дзяржаве Станіслаў Станіслававіч выявіўся непасьлядоўным, а ў шэрагу выпадкаў і непрадказальным палітыкам. Да таго ж ён быў не зусім разборлівы ў выбары найбліжэйшага палітычнага атачэньня (сярод ягоных дарадцаў былі Валер Цапкала, акадэмік Аляксандар Міхайлаў (нас насьцярожвалі заявы акадэміка адносна беларускай мовы); пазьней у ягонай камандзе апынуўся і Ўсевалад Янчэўскі – і гэта пасьля ягонага праімпэрскага артыкулу ў «Рэспубліцы»).

Паказальнымі былі словы аўтара публікацыі ў «Свабодзе» адразу пасьля выбараў, 28 жніўня: «Што датычыць маўклівага супрацьстаяньня камандаў Пазьняка і Шушкевіча, дык наяўнасьць двух кандыдатаў адназначна касавала шанцы абодвух... Але, не зважаючы на самаўпэўненую заяву Шушкевіча адной маскоўскай газэце «я выйграю», ён, безумоўна, меў меншыя за Пазьняка шанцы. Мне неаднаразова даводзілася чуць, як звычайныя людзі разважалі наконт ягонай кандыдатуры: «Ужо раз пасядзеў там, нічога не зрабіў». Не, Шушкевіч якраз сваю місію выканаў, узяўшы ўдзел у скасаваньні СССР. Дзякуючы гэтаму ён ужо ўпісаў сваё імя ў беларускую гісторыю. Але ў астатнім Шушкевіч сам адвёў сабе бясьпечную ролю начальніка над 5-цю мікрафонамі» (маюцца на ўвазе мікрафоны ў Авальнай залі парлямэнту).

У каманду Пазьняка ўвайшлі, апроч палітыкаў, юрыстаў ды эканамістаў, і вядомыя прадстаўнікі творчай эліты.

Праграма Пазьняка, распрацаваная пры ўдзеле ценявога кабінэту апазыцыі БНФ, палягала ва ўмацаваньні незалежнасьці Беларусі, эўрапейскім выбары ў міжнародных дачыненьнях і рынкавых прынцыпах у эканоміцы.

Мэтай было стварэньне прававой дэмакратычнай дзяржавы, дзе паважаліся б правы ўсіх нацыяў, дзе было б гарантаванае ўжываньне адзінай дзяржаўнай мовы – беларускай. Павінна была быць уведзеная забарона ўсіх арганізацыяў, якія выступаюць супраць незалежнасьці Беларусі. Пазьняк лічыў неабходным выхад Беларусі з СНД, вывад з тэрыторыі краіны расейскіх войскаў. Разам з тым, у праграме падкрэсьлівалася, што «галоўная задача беларускай зьнешняй палітыкі – наладжваньне раўнапраўных, узаемавыгадных партнэрскіх дачыненьняў з Расейскай Фэдэрацыяй».

У праграме Пазьняка не было ні слова, што дало б падставы папракнуць яго «экстрэмізмам»: нават тыя палажэньні, якія здаваліся найбольш радыкальнымі, рэалізоўваліся ў краінах Усходняй Эўропы (і менавіта яны, дарэчы, зьявіліся перадумовамі эканамічнага разьвіцьця гэтых краінаў у параўнаньні з краінамі СНД). І падчас сустрэчаў ужо праз гадзіну, пачуўшы тлумачэньні палажэньняў праграмы, большасьць аўдыторыі выяўляла прыхільнае стаўленьне да кандыдата ад Народнага Фронту.

Аднак у Пазьняка (як і ў іншых кандыдатаў) было толькі чатыры тэлевізійныя этэры, адзін зь якіх мы скарысталі для трансьляцыі адмыслова зробленага Ўладзімерам Коласам фільму «Невядомы Пазьняк», які павінен быў разбурыць гадамі створаны афіцыйнай прапагандай імідж. У адным з жывых тэлеэтэраў выступіў Васіль Быкаў, які ўваходзіў у лік дваццаці зарэгістраваных ЦВК даверaных асобаў кандыдата – ён заклікаў беларускі народ галасаваць за Пазьняка. А за некалькі дзён да першага туру, у дзень свайго 70-годзьдзя, выступаючы перад прыхільнікамі ў сквэры Янкі Купалы, Быкаў сказаў, што ягонае самае вялікае жаданьне – «каб прэзыдэнтам Беларусі быў абраны Зянон Станіслававіч Пазьняк».

Рэальна Лукашэнка перамог ужо ў першым туры, набраўшы больш як 50 % галасоў; на другім месцы быў Пазьняк, на трэцім – Шушкевіч, а Кебіч на чацьвертым. Пра гэта сьведчылі папярэднія зьвесткі, якія мелі нашыя назіральнікі на ўчастках. Аднак афіцыйна ў другі тур выйшлі Лукашэнка і Кебіч. (У тыя дні адзін з кіраўнікоў каманды Лукашэнкі прапанаваў мне зрабіць сумесную заяву пра сапраўдныя вынікі – «нам гэта дасьць ужо цяпер перамогу, а Пазьняку – ганаровае другое месца». Да гэтага не дайшло – ды і ў камандзе Лукашэнкі разумелі, што другі тур гарантавана прынясе ім перамогу.)

Але і на гэтым этапе яшчэ была магчымасьць не пусьціць Лукашэнку ў прэзыдэнцтва.

Празь дзень ці два пасьля першага туру выбараў мне патэлефанавалі ад Кебіча і папрасілі падтрымаць яго (была гаворка і з самім Кебічам).

Сытуацыя была такая, што адказ трэба было даваць імгненна, параіцца з Пазьняком магчымасьці не было. Я параіў Вячаславу Францавічу зьняць сваю кандыдатуру, пакінуўшы ў бюлетэні адно прозьвішча – Лукашэнка. У сваю чаргу, сказаў я, БНФ зьняў бы ўсіх сваіх назіральнікаў – а яны ў нас былі практычна на ўсіх выбарчых участках.

З улікам таго, што значная частка людзей (ня большая, але значная) ішла ня столькі «за Лукашэнку», колькі «супраць Кебіча», – на другі тур прыйшло б людзей значна менш, чым калі б Кебіч заставаўся ў бюлетэні. У выніку такіх дзеяньняў Кебіч прэзыдэнтам стаць ня мог – бо пасьля зьняцьця ягонай кандыдатуры ў бюлетэнях ягонага прозьвішча не было б, застаўся б адзін Лукашэнка. Па-другое, пры адсутнасьці назіральнікаў ад БНФ улада атрымала б магчымасьць скарыстаць «адміністрацыйны рэсурс», што перад небясьпекай прыходу Лукашэнкі на прэзыдэнцкую пасаду падавалася меншым злом.

У адказ я пачуў, што «мае дарадцы, вось Антановіч, напрыклад, перакананы, што мы пераможам». Аднак Кебіч сказаў, што «падумае».

Пазьней выявілася (і гэта адлюстравана ва ўспамінах Фядуты), што якраз гэты, прапанаваны Кебічу варыянт, – быў той адзіны варыянт, які найбольш палохаў каманду Лукашэнкі.

Пакуль Вячаслаў Францавіч і ягонае найбліжэйшае атачэньне (Мясьніковіч, Антановіч, Краўчанка, Патупа, Замяталін і інш.) разважалі, мы зь Зянонам Пазьняком правялі перамовы зь некаторымі асобамі «першага эшалёну ўлады», якія тычыліся далейшых дзеяньняў у тым выпадку, калі прэзыдэнт у другім туры ня быў бы абраны. Падрабязнасьці гэтых перамоваў абнародаваць яшчэ ня час, пакуль жа адзначу, што варыянт – шляхам пэўных канстытуцыйных захадаў – прадугледжваў немагчымасьць абраньня Лукашэнкі ў наступным раўндзе выбараў (разглядалася і магчымасьць скасаваньня прэзыдэнцтва наагул).

На жаль, Кебічу «нараілі» ўдзельнічаць у другім туры. Тады мы зьвярнуліся з просьбай даць нам хаця б пяць хвілінаў тэле- і радыёэтэру, каб абвясьціць рашэньне Сойму БНФ і заклікаць нашых прыхільнікаў не ісьці на другі тур, альбо, у крайнім выпадку, выкрэсьліваць абодвух – Лукашэнку і Кебіча. Натуральна, мы пасьпелі распаўсюдзіць заклік сярод свайго актыву – але толькі тэлебачаньне і радыё магло б даць магчымасьць данесьці аргумэнтацыю да кожнага з тых, хто галасаваў за Пазьняка. Верагодна, да такой парады прыслухалася б і значная частка прыхільнікаў Шушкевіча.

Аднак людзі Кебіча этэру нам не далі.

ПАЗЬНЯК І ЛУКАШЭНКА БЫЛІ НЯ ЎРОЎНЫХ УМОВАХ

Зьвярну ўвагу на адзін вельмі важны фактар, пра які ўжо аднойчы даводзілася казаць. Традыцыйна, аналізуючы прэзыдэнцкую кампанію 1994 году, аналітыкі гавораць пра «роўныя магчымасьці» кандыдатаў, якія былі ў апазыцыі да Кебіча. Асабліва любяць паўтараць гэта цяпер ужо былыя арганізатары выбарчай кампаніі Лукашэнкі – маўляў, Лукашэнка і Пазьняк былі пастаўленыя ў падобныя ўмовы, іх аднолькава прыціскалі ўлады. І таму барацьба была нібыта справядлівай.

Усё гэта вельмі далёка ад ісьціны.

Выбарчую кампанію 1994 году шмат у чым вырашыла пазыцыя сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку (і ў першую чаргу) і да пачатку самой кампаніі. І тут варта параўнаць інфармацыйныя магчымасьці Лукашэнкі і Пазьняка і інфармацыйную атмасфэру вакол іх.

У верасьні 1993 – сакавіку 1994 гадоў Лукашэнка атрымаў практычна неабмежаваны доступ да тэле- і радыёэтэру – аж да моманту антыкебічаўскага выступу 27 сакавіка. Вось тут каналы яму перакрылі – але было позна.

Зрэшты, і пасьля гэтага дзяржаўныя СМІ працавалі на Лукашэнку – бо афіцыйная прапаганда была накіраваная супраць ідэяў Народнага Фронту. І гэта нават было больш вызначальна, чымсьці колькасьць зьяўленьня Пазьняка альбо Лукашэнкі на тэлеэкранах ці ступень падтрымкі альбо непадтрымкі асобнымі журналістамі кожнага зь іх.

З другой паловы 1992 году афіцыйная прапаганда заняла агрэсіўна антынезалежніцкія, па сутнасьці, антыбеларускія пазыцыі. Практычна два гады грамадзтва апрацоўвалася ў прарасейскім, «інтэграцыйным» і антыдэмакратычным духу. З пачаткам выбарчай кампаніі гэтая рыторыка толькі ўзмацнілася.

Фармальна афіцыйная прапаганда, тэлебачаньне, радыё і друк агітавалі за Кебіча – а рэальна ж агітавалі за тое, за што выступаў і Лукашэнка. Прычым Лукашэнка на фоне гэтых лёзунгаў выглядаў больш прывабна. Кебіч агітаваў за далучэньне да расейскай рублёвай зоны – Лукашэнка крытыкаваў прэм'ера за прамаруджваньне і абяцаў, што пры ім рубель зьявіцца хутчэй. Кебіч вінаваціў у «развале эканомікі» распад СССР – Лукашэнка нагадваў, што ў тым ліку і Вячаслаў Францавіч падпісаў Віскулёўскія пагадненьні. Кебіч заяўляў, што без Расеі беларуская эканоміка ня вытрымае – Лукашэнка ішоў далей і патрабаваў аднаўленьня СССР.

Словам, агульны тон афіцыйнай прапаганды быў вельмі выгадны Лукашэнку і адыграў ключавую ролю ў ягонай

перамозе. Гэтую акалічнасьць замоўчваюць колішнія паплечнікі Лукашэнкі, магчыма, таму, што ў іншым разе ім давядзецца тлумачыць, чаму ж яны самі выступілі супраць незалежнасьці Беларусі.

КДБ І ЛУКАШЭНКА: НЕРАЗЛУЧАНЫЯ БЛІЗЬНЯТЫ

Лукашэнка сам неаднаразова прызнаваўся ў тым, што роля КДБ у ягоным прасоўваньні на пасаду прэзыдэнта была вызначальная.

Вядома, што Лукашэнка служыў у памежных войсках КДБ СССР, падчас дэпутацтва абараняў «чэкістаў», а ягонае прэзыдэнцтва адзначанае прызначэньнем афіцэраў КДБ на ключавыя пасады, узмацненьнем ролі спэцслужбаў і вяртаньнем іх да мэтадаў часоў сумнавядомага Андропава.

Што ж да падзеяў 1994 году, дык кропкі над «і» ў гэтай тэме паставіла прызнаньне былога афіцэра контравыведкі КДБ Сяргея Аніські, апублікаванае ў 1996 годзе:

«Няма нічога патаемнага, што калі-небудзь не зрабілася б відавочным. Аляксандар Рыгоравіч сваім узыходжаньнем шмат у чым абавязаны Камітэту дзяржаўнай бясьпекі альбо, прынамсі, асобным яго кіраўнікам. У пэрыяд прэзыдэнцкіх выбараў у спэцслужбе была створаная ініцыятыўная група падтрымкі Аляксандра Лукашэнкі, ідэйным натхняльнікам якой быў Валеры Кез (генэрал, намесьнік старшыні КДБ РБ. – **С. Н.**). Шматлікія супрацоўнікі цэнтральнага апарату камітэту ў Менску і абласных упраўленьняў КДБ адсочвалі абстаноўку падчас выбараў, кантралявалі дзеяньні асноўных канкурэнтаў на прэзыдэнцкую пасаду і прадстаўлялі папераджальную інфармацыю ў штаб Аляксандра Рыгоравіча. Менавіта камітэтчыкі своечасова атрымалі зьвесткі аб прыбыцьці з Уралу двух кілераў і іх месцазнаходжаньні ў адной зь дзяржаўных рэзыдэнцыяў. Наўмысная ўцечка інфармацыі ў прэсу не дазволіла некаторым экс-чыноўнікам дзяржаўнага маштабу ажыцьцявіць гэтую злачынную акцыю. Менавіта чэкісты ведалі сапраўдную карціну «лёзьненскага замаху», фінансаваньня прэзыдэнцкай кампаніі і парупіліся схаваць «канцы ў ваду».

Матэрыялы аб нэгатыўных аспэктах гандлю зброяй, развале войска і злачыннай дзейнасьці дзяржчыноўнікаў, якія знаходзілі жывы водгук у выбарцаў, таксама перадаваліся Аляксандру Рыгоравічу з будынку па вул. Камсамольскай» (Белорусская деловая газета. 1996. 15 лютага).

НОВЫ ПАРАДАК. АНТЫБЕЛАРУСКІ

Бясспрэчна – у прыходзе Лукашэнкі была зацікаўленая Масква. Свае «варыянты» Крэмль навязваў і літоўцам, і, пазьней, украінцам – аднак яны іх адрынулі; беларусы ж, як бы там ні было, самі схапіліся за кола гісторыі ў жаданьні яго спыніць.

Дзень абраньня Лукашэнкі прэзыдэнтам можна было б назваць канцом пэрыяду апошняга беларускага Адраджэньня. Аднак яшчэ дзесяць месяцаў над краінай лунаў бел-чырвона-белы сьцяг, «Пагоня» была дзяржаўным гербам, а беларуская мова мела статус адзінай дзяржаўнай. Але ўжо ў пачатку верасьня ўдзельнікі Дня вайсковай славы (гадавіны бітвы пад Воршай) былі сустрэтыя кардонам АМАПу.

Кіраўніком новаўтворанай прэзыдэнцкай адміністрацыі стаў Леанід Сініцын, і літаральна зь першых дзён пачалося «інтэграваньне» ў Расею.

Праз тыдзень пасьля інаўгурацыі Лукашэнкі, 28 ліпеня, дэпутаты апазыцыі БНФ і члены ценявога кабінэту адаслалі ў адміністрацыю прэзыдэнта заўвагі (па пунктах) да праекту Дамовы аб дружбе і супрацоўніцтве паміж Беларусьсю і Расеяй. Мы папярэджвалі, што Дамова (праект распрацоўваўся ў Маскве) складзеная «з мэтай забясьпечыць на міждзяржаўным узроўні палітычныя, прававыя і эканамічныя ўмовы для інкарпарацыі Беларусі ў Расейскую Фэдэрацыю, падрыву нашай дзяржаўнай самастойнасьці, падпарадкаваньня нашай эканомікі Расеі, захопу нацыянальнай уласнасьці і маёмасьці расейскімі суб'ектамі гаспадараньня, юрыдычнымі і фізычнымі асобамі».

Адказу на гэта мы не атрымалі. Каманда «маладых ваўкоў» адразу дала зразумець, якія парадкі будуць усталяваныя ў

краіне і якая будзе існаваць мадэль узаемаадносінаў зь беларускімі нацыянальнымі сіламі, у якіх яны бачылі нават не палітычных апанэнтаў, а праціўнікаў.

Сутнасьць гэтых узаемаадносінаў – «вас папросту не існуе». Калі пры віцэ-прэм'еру Дземчуку як куратару СМІ і Бутэвічу як міністру інфармацыі дэпутаты апазыцыі БНФ з другога, з трэцяга разу, але «выбівалі» паўгадзіны тэлеэтэру – пры віцэ-прэм'еру Ганчару і начальніку ўпраўленьня інфармацыі А. Фядуту на свае патрабаваньні мы не атрымлівалі нават фармальных адпісак. Між тым, гэта ішло насуперак закону, у гэтым выпадку – Закону аб статусе дэпутата Вярхоўнага Савету. І гвалт над законнасьцю ў краіне пры новаабраным прэзыдэнту пачаўся менавіта з гэтага.

АПОШНІ ШАНЕЦ ПАРЛЯМЭНТАРЫЗМУ

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў лідэры парлямэнцкіх фракцыяў (БНФ, камуністаў і сацыялістычнай партыі на чале зь віцэ-сьпікерам Кузняцовым) у выніку перамоваў і кансультацыяў пагадзіліся на прыняцьце новага Закону аб выбарах па прапарцыйна-мажарытарнай сыстэме. 75 % парлямэнту (195 мандатаў) абіраліся па акругах, а 25 % (65 мандатаў) па партыйных сьпісах (мы з Пазьняком накіравалі прапанову аб суадносінах 50/50, але для большасьці дэпутатаў гэта быў занадта «рэвалюцыйны» крок. Зрэшты, мы адмыслова прапанавалі такі радыкальны варыянт, каб суадносіны 75/25 успрымаліся як кампраміс і былі заканадаўча прынятыя). Вядома, гэта задавальняла партыйных лідэраў найбольш уплывовых партыяў, паколькі ўсе яны (лідэры) гарантавана праходзілі ў парлямэнт.

Што такі варыянт мог даць Беларусі?

Найперш – Вярхоўны Савет 13-га скліканьня меў бы прынцыпова іншы расклад палітычных сілаў. За кандыдатаў БНФ на выбарах у 1995 годзе прагаласуе каля мільёна выбарцаў. Гэта значыць, што ў выпадку наяўнасьці партыйных сьпісаў дэпутаты Фронту мелі б мінімум 20 % «партыйных» мандатаў, гэта значыць – каля 15 чалавек (гэта мінімум). І

нават пры тым, што ніводны дэпутат БНФ не абраўся б па акрузе (што пазьней і адбылося), БНФ меў бы прадстаўніцтва ў Вярхоўным Савеце ў якасьці найменш як пятнаццаці дэпутатаў.

Зразумела, што ўзначальваў бы сьпіс БНФ і прайшоў бы ў ВС Пазьняк. Пазьней Лявон Баршчэўскі заўважыў, што менавіта адсутнасьць Пазьняка на сумнавядомых начных перамовах Шарэцкага і членаў Прэзыдыюму ВС з Лукашэнкам пры пасярэдніцтве Чарнамырдзіна і іншых прадстаўнікоў Крамля ў лістападзе 1996 году дазволіла падпісаць пагадненьне аб спыненьні імпічмэнту. Сам Пазьняк на пытаньне, што ён рабіў бы ў той сытуацыі, адказвае, што фізычна выцягнуў бы Шарэцкага за каўнер. У верагоднасьці менавіта такога варыянту паводзінаў Пазьняка ў мяне асабіста няма ніякага сумневу. Аднак быць на тых перамовах Пазьняк мог толькі ў адным выпадку – калі б меў статус дэпутата Вярхоўнага Савету (прысутнічалі ж там Карпенка і Калякін). Калі б Пазьняк быў на тэрыторыі Беларусі, але ня быў бы дэпутатам – шанцаў патрапіць на перамовы ў яго не было б ніякіх (як не патрапіў ён ні на адно паседжаньне ці мерапрыемства ВС 13-га скліканьня – бо не было дэпутацкага мандату).

Шэраг палітолягаў і палітыкаў (напрыклад, той жа Пазьняк) лічаць, што шанец на дэмакратычнае разьвіцьцё Беларусі быў страчаны ўвосень 1992 году, калі ВС адмовіўся прызначыць рэфэрэндум аб новых выбарах. Мне ж падаецца, што канчаткова ён быў страчаны якраз увосень 1994-га, калі быў заблякаваны Закон аб выбарах па зьмяшанай сыстэме.

Да моманту пачатку восеньскай сэсіі мы ўжо пераканалі большасьць дэпутатаў у мэтазгоднасьці прыняцьця такога закону. Канструктыўную пазыцыю заняў і старшыня ВС М. Грыб. Перад сэсіяй дэпутатаў Грыб сабраў дэпутатаў, у тым ліку і прадстаўнікоў антынацыянальна настроенай вэтэранскай арганізацыі, каб ужо ўласным аўтарытэтам паўплываць на іх пазыцыю. Былі запрошаныя і лідэры партыяў, якія не былі дэпутатамі. Аргумэнты прыхільнікаў новага варыянту выбарчага закону, як быццам, успрымаліся. Аднак потым на трыбуну ўзьнялася, як яе прадставілі, палітоляг Вольга Абрамава (пазьней – лідэр арганізацыі, якая пазыцыянавала

сябе часткай расейскай партыі «Яблоко»). Абрамава азнаёміла прысутных з вынікамі нейкага сацыялягічнага апытаньня. Зь яго нібыта вынікала, што калі выбары пройдуць па новым варыянце закону – «бэнээфаўцы возьмуць 80 працэнтаў складу парлямэнту, а то і болей». Гэта выклікала шок у дэпутатаў-вэтэранаў.

І ўсё ж, верагоднасьць правесьці закон на сэсіі ўсё яшчэ заставалася. Як пацьвярджаюць дэпутаты апазыцыі БНФ, арганізатарам блякаваньня гэтага законапраекту ў Вярхоўным Савеце выступіў прадстаўнік прэзыдэнта ў ВС Анатоль Лябедзька. Тады, увосень 1994-га, Лябедзька не ўваходзіў ні ў якую партыю, а няўхільна праводзіў у Вярхоўным Савеце палітыку Лукашэнкі.

Масква ўсё больш кантралявала ня толькі ўнутраную, але і зьнешнюю палітыку Беларусі. Яшчэ ў красавіку 1995-га (Беларусь чацьверты год як была незалежная) у штаце беларускай амбасады ў Маскве не было ніводнага грамадзяніна Беларусі – спрэс грамадзяне Расейскай Фэдэрацыі, уключна з паслом (!). Не зьяўляліся грамадзянамі Беларусі і значная частка супрацоўнікаў беларускіх дыпляматычных місіяў і ў іншых краінах. Нарэшце, сярод дэпутатаў Вярхоўнага Савету Беларусі былі асобы... безь беларускага грамадзянства.

Прыход да ўлады Лукашэнкі практычна адразу спыніў той працэс непасьлядоўнай беларусізацыі, які БНФ удавалася праводзіць празь дзяржаўныя структуры і мэханізмы. Калі пры Кебічу яшчэ можна было – на ўзроўні асабістых кантактаў – дамовіцца пра рэалізацыю нейкіх адукацыйных ці культурніцкіх праектаў, дык з новай камандай, як яны сабе называлі, «прагматыкаў», гэта ня мела выніку.

Не спрыяў беларусізацыі і новапрызначаны віцэ-прэм’ер па культурных і сацыяльных пытаньнях Віктар Ганчар, ад якога я ў тыя часы ніколі ня чуў беларускага слова. Зрэшты, Ганчар хаця б не перашкаджаў – а з пачатку 1995 году ўся ідэалёгія апынулася ў руках палкоўніка Ўладзімера Замяталіна, які і не хаваў свайго варожага стаўленьня як да беларускай мовы, гэтак і да самога права беларускай нацыі на дзяржаўную незалежнасьць.

РЭФЭРЭНДУМ-95. ГАЛАДОЎКА ДЭПУТАТАЎ НЕ СПЫНІЛА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГАНЬБЫ

Вясной 1995 году Лукашэнка выступіў з ініцыятывай правесьці рэфэрэндум, вынікам якога павінны былі быць скасаваньне беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай, скасаваньне бел-чырвона-белага сьцяга і герба «Пагоня» як дзяржаўных сымбаляў, эканамічная інтэграцыя з Расеяй і права прэзыдэнта на роспуск парлямэнту. Адным з правадзікоў ідэі рэфэрэндуму быў кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі Леанід Сініцын.

Гэтая ініцыятыва мела антыканстытуцыйны характар, паколькі супярэчыла артыкулам Закону аб рэфэрэндуме (галоўнае – не павінны выносіцца пытаньні, якія закранаюць нацыянальныя каштоўнасьці).

Яшчэ 23 сакавіка дэпутаты апазыцыі БНФ падрыхтавалі праект пастановы ВС, у якой прапаноўвалася адхіліць прапанову Лукашэнкі аб рэфэрэндуме на той падставе, што «пытаньні аб статусе расейскай мовы і дачыненьнях з Расейскай Фэдэрацыяй супярэчаць частцы 3 артыкулу 3 Закону «Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме) у Рэспубліцы Беларусь», а пытаньні аб дзяржаўным гербе і сьцягу, а таксама магчымасьці роспуску Вярхоўнага Савету ня маюць юрыдычнай дакладнасьці і не даюць магчымасьці атрымаць адназначны адказ».

Гэтыя і іншыя аргумэнты пра антызаконнасьць рэфэрэндуму прыводзіліся намі на сэсіі, але прыхільнікі Лукашэнкі, пракамуністычныя дэпутаты (асабліва так званыя «вэтэраны»), былі няўмольныя ў сваёй антыбеларускасьці.

Да дня галасаваньня 11 красавіка ўсе традыцыйныя, клясычныя парлямэнцкія мэтады (унясеньне альтэрнатыўных варыянтаў, выступы на сэсіі, кулюарная праца) былі намі вычарпаныя і не далі эфэкту. Заставаліся нетрадыцыйныя.

Раніцай 11 красавіка мы (19 дэпутатаў апазыцыі БНФ) абвясьцілі галадоўку ў Авальнай залі. Пасьля выступу Зянона Пазьняка мы селі каля прэзыдыюму. Нашыя патрабаваньні былі наступныя (цытую паводле копіі тэксту, перададзенага

Пазьняком сьпікеру Мечыславу Грыбу; у поўным варыянце тэкст абнародуецца ўпершыню):

«1. Не прымаць супярэчную Закону і Канстытуцыі ініцыятыву Прэзыдэнта аб рэфэрэндуме. Выканаць у гэтым пытаньні Канстытуцыю і закон.

2. Адмяніць незаконны ўказ нумар 113 Прэзыдэнта Лукашэнкі аб увядзеньні цэнзуры ў Беларусі і звальненьні з пасады рэдактара «Народнай газеты» (Сярэдзіча. – **с. Н.**). Адмяніць манаполію на сродкі масавай інфармацыі ў руках прэзыдэнцкай улады, паколькі гэта супярэчыць закону, Канстытуцыі і парушае правы чалавека.

3. Прыцягнуць да адказнасьці людзей з адміністрацыі Прэзыдэнта Лукашэнкі, замяшаных у карупцыі. Спыніць судовы перасьлед дэпутата Сяргея Антончыка (ён перасьледаваўся за даклад аб карупцыі ў найбліжэйшым атачэньні Лукашэнкі. – **С. Н.**)».

Эфэкт абвяшчэньня галадоўкі быў імгненны: шмат хто з дэпутатаў, пэўна, зразумелі, што, калі іх калегі (хай і апанэнты) пайшлі на крайнюю меру, ініцыятыва Лукашэнкі сапраўды сумнеўная.

Прапановы аб уключэньні ў бюлетэнь рэфэрэндуму Лукашэнкавых пытаньняў пачалі правальвацца, не набіраючы патрэбнай колькасьці галасоў. Лукашэнка выступіў з гістэрычнай тырадай.

Уначы ў будынак Дому ўраду былі ўведзеныя войскі (паводле пазьнейшых зьвестак пракурорскага сьледзтва – больш за тысячу байцоў). Некалькі дзясяткаў афіцэраў элітнага спэцпадразьдзяленьня КДБ зьбілі нас у Авальнай залі. Дэпутатаў выцягнулі з будынку, пакідалі ў «варанкі» і выкінулі ў розных раёнах Менску.

Раніцай 12 красавіка сьпікер Мечыслаў Грыб заявіў, што краіна «ніколі не была так блізка да грамадзянскай вайны, як цяпер», аднак ужо празь некалькі гадзінаў адмовіўся ад сваіх словаў. На сэсіі Аляксандар Лукашэнка абвяргаў факт зьбіцьця; шмат

якія дэпутаты радаваліся, калі Аляксандар Шут непасрэдна ў Авальнай залі прадэманстраваў сьляды ад пабояў («Мала вам далі!»). Тут жа была ратыфікаваная дамова аб супрацоўніцтве з Расеяй.

«Краінай закіруе прэзыдэнцкая хунта», – прадбачліва пракамэнтаваў зьбіцьцё дэпутатаў апазыцыі БНФ Васіль Быкаў.

13 красавіка, праз дзень пасьля зьбіцьця дэпутатаў БНФ, 177 парлямэнтарыяў выказаліся за правядзеньне рэфрэндуму. Зроблена гэта было па прапанове дэпутата ад вэтранскай арганізацыі Міхаіла Качана, пры падтрымцы ад мікрафонаў дэпутатаў Мікалая Дземянцея (былы Старшыня ВС), Аляксея Камая (былы другі сакратар ЦК КПБ); асаблівую ролю адыграў спікер Мечыслаў Грыб, які спачатку, адразу пасьля зьбіцьця дэпутатаў заявіў, што «Беларусь як ніколі блізкая да грамадзянскай вайны», але потым павёў сэсію па сцэнары, выгодным Лукашэнку.

Прагаласаваўшы за рэфэрэндум, дэпутаты вярнулі дню 7 лістапада статус дзяржаўнага сьвята, а затым Лукашэнка запрасіў іх на банкет: «Я приглашу сейчас весь этот зал за счёт государства. Слышите? Я имею право. И выпьем и по сто, и по двести граммов... (шум у зале. Аплядысмэнты) «. Апошнія словы спікера Грыба на гэтай фатальнай для лёсу Беларусі сэсіі былі - «Усіх нас чакаюць у буфеце ўнізе. Калі ласка! Дзякуй за працу».

14 красавіка мне давялося прадстаўляць у Канстытуцыйным Судзе пазыцыю 84 дэпутатаў ў справе манапалізацыі прэзыдэнтам сродкаў масавай інфармацыі. Я ні слова не сказаў пра начныя падзеі ў Авальнай залі - лічыў, што працэс павінен палягаць у выключна прававым, юрыдычным полі, што павінна быць спаборніцтва фармулёвак, а не палітычных ацэнак. Праўда, пра зьбіцьцё дэпутатаў сказаў Алег Трусаў. Дарэчы, працэс мы выйгралі, і адзін з Указаў прэзыдэнта ўпершыню быў прызнаны неканастытуцыйным. Лукашэнка, аднак, насуперак рашэньню Канстытуцыйнага суда яго не скасаваў, і гэта магло б ужо тады быць пачаткам працэдуры імпічмэнту - калі б на тое была палітычная воля Вярхоўнага Савету.

Закон спрэс парушаўся і пры правядзеньні рэфэрэндуму; дастаткова сказаць, што апанэнты прэзыдэнта не атрымалі магчымасьці агітацыі праз СМІ, а значыць, грамадзяне не валодалі поўнай інфармацыяй і не маглі прыняць узважанага рашэньня.

Так, 9 траўня тры дэпутаты (З. Пазьняк, Л. Баршчэўскі, с. Навумчык) зьвярнуліся да старшыні Дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Л. Кісяля і Цэнтравыбаркаму з просьбай прадаставіць групе дэпутатаў апазыцыі БНФ 45 хвілінаў тэлеэтэру 13 траўня – за дзень да галасаваньня. Такое права гарантавалася трыма законамі – Законам аб выбарах, Законам аб усенародным галасаваньні (рэфэрэндуме) і Законам аб статусе дэпутата Вярхоўнага Савету. Ні этэру, ні нават фармальнага адказу не было.

Акрамя парушэньня заканадаўства падчас агітацыі, былі зафіксаваныя і шматлікія фальсыфікацыі на выбарчых участках (рэфэрэндум праходзіў у адзін дзень зь першым турам выбараў у Вярхоўны Савет).

Усё гэта ў сукупнасьці, а менавіта: неканстытуцыйнасьць вынесеных на рэфэрэндум пытаньняў, парушэньне закону падчас прызначэньня рэфэрэндуму і яго правядзеньня, – дае падставы лічыць, што вынікі рэфэрэндуму нелегітымныя. І бел-чырвона-белы сьцяг, і «Пагоня» дэ-юрэ застаюцца дзяржаўнымі сымбалямі Беларусі.

Новаму дэмакратычнаму беларускаму парлямэнту спатрэбіцца некалькі хвілінаў, каб пацьвердзіць дзяржаўны статус гістарычных сымбаляў і прыярытэт беларускай мовы.

Але гэта – у будучыні. У нядаўняй жа мінуўшчыне адразу пасьля «рэфэрэндуму» кіраўнік справаў Адміністрацыі прэзыдэнта Іван Ціцянкоў разам са сваімі хаўрусьнікамі ўзьлез на будынак адміністрацыі і перад відэакамэрай разарваў бел-чырвона-белы сьцяг.

Сродкі масавай інфармацыі – і расейскія, і ўсясьветныя – паведамілі, што ў Беларусі вернутая пракамуністычная сымболіка, што беларусы нібыта ледзь не адмовіліся ад сваёй

гісторыі. Палітыкі ЗША і Эўропы збольшага праігнаравалі заявы апазыцыі БНФ аб нелегітымнасьці рэфэрэндуму – яны былі занятыя праблемамі Югаславіі; паплечнікі ж Лукашэнкі (якія потым перайшлі ў апазыцыю) старанна стваралі свайму патрону імідж цывілізаванага палітыка.

Паказальна, што і цяпер абставіны правядзеньня рэфэрэндуму 1995 году замоўчваюцца, у чым я пераканаўся, наведаўшы ў кастрычніку 2005 году ў Брусэлі Эўрапарлямэнт і Эўракамісію. Калі я распавядаў пра зьбіцьцё дэпутатаў у залі парлямэнту, эўрапейскія дэпутаты папросту не жадалі гэтаму верыць. Больш за тое: яны ўвогуле ня чулі пра рэфэрэндум 1995 году, калі былі зьняважаны нацыянальныя сымбалі і беларуская мова, – затое шмат ведалі пра рэфэрэндум 1996 году, калі па-за сьценамі Авальнай залі апынуліся некаторыя цяперашнія лідэры апазыцыі.

КАНЕЦ АДРАДЖЭНЬНЯ

У сукупнасьці з тым, што на выбарах 1995 году ніводны кандыдат БНФ ня быў абраны ў Вярхоўны Савет (што таксама можна патлумачыць фальсыфікацыямі), рэфэрэндум зрабіў вялікі дэпрэсіўны эфэкт на прыхільнікаў беларускай ідэі. У Радашкавічах пэнсіянэр, былы настаўнік ангельскай мовы Ўладзімер Халопік, даведаўшыся пра вынікі рэфэрэндуму, памёр ад інфаркту.

Для актывістаў БНФ бел-чырвона-белы сьцяг па-ранейшаму заставаўся дзяржаўным; для ўладаў і паслухмянай ім міліцыі ён ужо быў падставай для рэпрэсіяў, зь першых дзён пасьля рэфэрэндуму:

«В. а. Генэральнага пракурора Рэспублікі Беларусь сп. Васілю Капітану. Нам паступіла копія скаргі, адрасаваная Вам групай грамадзянаў (Несьцер Уладзімер, Сіўчык Вячаслаў, Івашкевіч Віктар і іншыя). Гэтыя грамадзяне былі затрыманыя супрацоўнікамі органаў унутраных справаў 27 ліпеня на плошчы Незалежнасьці. Прычынай затрыманьня зьявілася тое, што яны трымалі бел-чырвона-белыя сьцягі. Грамадзяне былі дастаўленыя ў Маскоўскі РАУС г. Менску. Акрамя таго,

супрацоўнікамі міліцыі быў зьбіты і затрыманы дэпутат Менскага гарадзкога савету Ўладзімер Несьцер – за тое, што спрабаваў высьветліць прозьвішча міліцыянта, які кіраваў акцыяй. Гэтаксама нам вядома, што 27 ліпеня як у Менску, так і ў некаторых іншых населеных пунктах супрацоўнікі міліцыі прымянілі сілавыя мэтады да грамадзянаў, якія сьвяткавалі Дзень Незалежнасьці зь бел-чырвона-белымі сьцягамі... Дэпутаты ВС Зянон Пазьняк, Сяргей Навумчык, 30 ліпеня 1995 г.».

Вядома, такое стаўленьне да нацыянальных сымбаляў міліцэйскіх ніжэйшых чыноў (ніхто зь іх ня быў пакараны) не магло быць іх уласнай ініцыятывай (яны таксама насілі бел-чырвона-белыя нашыўкі ды значкі з «Пагоняй», бо «лукашэнкаўскіх» зрабіць яшчэ не пасьпелі). Міністрам унутраных справаў у той момант зьяўляўся Юры Захаранка.

Неўзабаве пасьля рэфэрэндуму паліцэйскія мэтады былі ўжытыя і да сфэры адукацыі. Лукашэнка распарадзіўся вярнуцца да сыстэмы, якая існавала да моманту абвяшчэньня незалежнасьці. «Распараджэньне прэзыдэнта Лукашэнкі аб выключэньні падручнікаў 1992–1995 гадоў з сыстэмы школьнай і вышэйшай адукацыі зьяўляецца, на наш погляд, працягам небясьпечнай палітыкі, пачатай рэфэрэндумам 14 траўня 1995 году. Новы крок вышэйшай улады ёсьць нічым іншым, як замахам на духоўную і інтэлектуальную свабоду нацыі, а значыць, на яе будучыню. Тое, што пад забарону трапляюць усе без выключэньня новыя падручнікі гуманітарнай сфэры, перакрэсьлівае вялізную працу ў пераарыентацыі на ўсясьветны ўзровень адукацыі, у вяртаньні гістарычнай праўды і вызваленьні грамадзтва ад дурману таталітарызму. Сыстэма нацыянальнай адукацыі будзе адкінутая ў мінулае і не дазволіць даць краіне духоўна свабодных і высокаадукаваных грамадзянаў, гатовых да жыцьця ў сучасным дэмакратычным сьвеце. На практыцы рэалізацыя распараджэньня азначае, што ў новым навучальным годзе школьнікі і студэнты апынуцца без падручнікаў па гісторыі, мове, літаратуры і іншых гуманітарных дысцыплінах, якія фармуюць сьветапогляд асобы. Можна ўявіць, у колькі абыдзецца дзяржаве падрыхтоўка і выданьне новых падручнікаў. А дзе гарантыя, што іх абяцанае

«шырокае грамадзкае рэцэнзаваньне» ня будзе нагэтулькі галосным, як і дзейнасьць таямнічай экспэртнай камісіі, матэрыялы якой зрабіліся падставай прэзыдэнцкага рашэньня? Робіцца спроба павярнуць гісторыю назад. Хаця вопыт эўрапейскіх краінаў, у тым ліку і найбліжэйшых суседзяў Беларусі, сьведчыць, што падобныя сацыяльна-палітычныя экспэрымэнты рана ці позна завяршаюцца крахам», – адзначалася ў заяве, якую падпісалі Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Уладзімер Арлоў, Сьвятлана Алексіевіч, Васіль Зуёнак, Карлас Шэрман, Генадзь Бураўкін, Сяргей Законьнікаў і Анатоль Кудравец.

«Мэта – выкрасьліць з нацыянальнай памяці ўсялякую інфармацыю пра тое, што Беларусь да 1919 году мела незалежнасьць – і ў часе Беларуска-Літоўскага княства, і ў 1918 годзе», – пракамэнтаваў у тыя дні агенцтву «Павет» прэзыдэнцкае распараджэньне Лявон Баршчэўскі.

Дзясяткі тысяч беларускіх падручнікаў былі зьнішчаныя.

Магу памыліцца, але, здаецца, на тэрыторыі Эўропы гэта было першае аўтадафэ такога маштабу – пасьля спаленьня фашыстамі тысяч «няўгодных» кніг у Мюнхэне і Бэрліне 10 траўня 1933 году.

Дадам, што таямнічай «экспэртнай камісіяй» кіраваў палкоўнік Уладзімер Замяталін. Ён, як і начальнік прэзыдэнцкай Адміністрацыі Леанід Сініцын, быў ідэолягам «рэфэрэндуму».

Увосень 2005 году ў інтэрвію радыё «Свабода» Сініцын прызнаўся, што гэта менавіта ён, Сініцын, «маляваў» лукашэнкаўскі герб і сьцяг, і пацьвердзіў «слушнасьць» рэфэрэндуму. «Дзесяць гадоў людзі жывуць ва ўмовах рэфэрэндуму, і асаблівых праблемаў няма... Справа пайшла ў іншым кірунку».

Гэта быў сапраўды паварот – паварот у супрацьлеглы бок ад нацыянальнага Адраджэньня, для якога 14 траўня 1995 году было днём катастрофы. Менавіта ў гэты дзень апошняя хваля Адраджэньня скончылася.

СУПРАЦЬ «САЮЗУ»
Наступныя старонкі – апісаньне высілкаў прадстаўнікоў нацыянальных сілаў захаваць тое беларускае, што яшчэ ня зьнішчана, і найперш – саму дзяржаву.

І пасьля рэфэрэндуму 1995 году яшчэ некалькі месяцаў у дзяржаўных выдавецтвах выходзілі заплянаваныя раней кнігі, дзе гісторыя Беларусі падавалася зь незалежніцкіх пазыцыяў, друкаваўся Васіль Быкаў, – але гэта, хутчэй, ішло па інэрцыі.

Камісія па культуры, адукацыі і захаваньні гістарычнай спадчыны Вярхоўнага Савету імкліва згубіла ўплыў на «профільныя» міністэрствы – разам з рэфэрэндумам адбыліся і выбары, на якіх БНФ пацярпеў паразу, ніхто з членаў камісіі ня быў пераабраны ў новы Вярхоўны Савет. Да таго ж, прэзыдэнт Лукашэнка заявіў, што ВС-12 павінен скласьці свае паўнамоцтвы, і адміністрацыя прэзыдэнта на чале зь Леанідам Сініцыным зрабіла ўсё, каб сарваць верасьнёўскую сэсію.

У апошнія месяцы кадэнцыі Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня ўплыў дэпутатаў нацыянальнай арыентацыі быў, фактычна, зьведзены да нуля, нават мясцовыя выканаўчыя структуры не лічылі патрэбным рэагаваць на афіцыйныя дэпутацкія запыты. Абараняць нацыянальныя інтарэсы на дзяржаўным узроўні ўжо не было каму.

Са спыненьнем парлямэнцкай дзейнасьці прадстаўнікоў БНФ (фармальна гэта адбылося 9 студзеня 1996 году, у дзень пачатку працы Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня, калі паўнамоцтвы ВС 12-га скліканьня скончыліся) быў канчаткова страчаны ўплыў нацыянальных сілаў і на дзейнасьць дзяржаўных органаў, у тым ліку ў галіне беларусізацыі.

У пачатку 1996 году Крамлю і Лукашэнку здавалася, што, не прапусьціўшы ніводнага прадстаўніка БНФ у Вярхоўны Савет, яны паставілі крыж на нацыянальным руху (як не без іроніі пісаў публіцыст Анатоль Майсеня, ужо ніколі ня будзе ў Менску шматтысячных шэсьцяў пад бел-чырвона-белымі сьцягамі). Прадстаўнікі АГП і іншыя дэмакратычныя дэпутаты (за выключэньнем Паўла Знаўца) не ўздымалі пытаньняў

нацыянальнай культуры, беларускай мовы і не выказвалі пратэсту супраць заплянаванага саюзу з Расеяй. Новаабраны сьпікер новаабранага парлямэнту Сямён Шарэцкі заявіў, што падпісаньне дамовы аб беларуска-расейскім саюзе – самы шчасьлівы дзень у ягоным жыцьці.

Аднак 24 сакавіка 1996 году БНФ, якому аналітыкі пасьля паразы на выбарах прадраклі хуткую сьмерць, вывеў на вуліцы Менску дзясяткі тысяч людзей – сьвяткаваньне ўгодкаў БНР спалучылася з пратэстам супраць падпісаньня дамовы аб утварэньні «беларуска-расейскай дзяржавы». Выступ быў жорстка падаўлены, дзясяткі людзей былі зьбітыя, аднак у сьвеце ўбачылі, што беларусы ня згодныя зьмірыцца зь ліквідацыяй сваёй краіны.

Такі масавы выступ быў поўнай нечаканасьцю і для Крамля, і для лукашэнкаўскай адміністрацыі. Таму вырашылі ўжыць самыя жорсткія на той час меры супраць арганізатараў. Мы з Пазьняком былі вымушаныя зьехаць зь Беларусі – як тады падавалася, на некалькі тыдняў, каб пазьбегнуць перасьледу ды адначасна паінфармаваць Эўропу пра пагрозу ўзмацненьня імпэрскай палітыкі Крамля.

Пасьля першай жа нашай прэсавай канфэрэнцыі ў Кіеве генпракуратура Беларусі накіравала ва Ўкраіну патрабаваньне аб нашай выдачы, аднак генэральны пракурор Украіны адмовіўся гэта зрабіць. (Інфармацыя пра гэта, як і пра аўтаматчыкаў каля дамоў, дзе жылі Пазьняк і я, была ў тыя дні ў менскім незалежным друку – аднак пазьней некаторыя журналісты пачалі пісаць, што нам «нічога не пагражала» – што, пэўна, адпавядала чыімсьці інтарэсам.) Перамовы аб нашым лёсе вёў Вячаслаў Чарнавіл; шмат што ў той сытуацыі залежала ад прэзыдэнта Кучмы. Вядома, нашае знаходжаньне ў Кіеве пры штодзённых інтэрвію ўкраінскім і заходнім СМІ ставіла ў двухсэнсоўную сытуацыю ўкраінскія ўлады і самога Кучму, і ўрэшце нам стварылі ўмовы для выезду на Захад.

У Чэхіі мы заявілі, што Беларусь павінна далучыцца да НАТО; гэтая заява была не зразуметая кіраўніцтвам БНФ у Менску. Там палічылі, што казаць пра гэта занадта рана; мы ж лічылі, што сказана пра гэта запозна.

Падчас сустрэчы ў адміністрацыі прэзыдэнта Вацлава Гаўла нас спрабавалі пераканаць, што Расея – дэмакратычная краіна, што Ельцын – дэмакратычны прэзыдэнт, і ён хутка выведзе Лукашэнку на шлях дэмакратызацыі. А ўвогуле, Беларусь – занадта на Ўсходзе, а Чэхія – ужо на Захадзе, каб беларуская праблематыка падавалася такой ужо істотнай. Нам, аднак, паабяцалі, у выпадку патрэбы, уладкоўваць у чэскія ВНУ беларускіх студэнтаў.

Было зразумела, што Захад не ўсьведамляе сутнасьці крамлёўскай палітыкі і ня бачыць яе небясьпекі.

Летам 1996 году Аляксандар Лукашэнка наведаў Парыж; прэзыдэнт Францыі Жак Шырак зрабіў яму ганаровае прыняцьце – нібыта не было ні зьбіцьця дэпутатаў, ні разгону масавых шэсьцяў, ні хвалебных словаў пра Гітлера. Узьнікла пагроза палітычнай і маральнай легітымізацыі рэжыму Лукашэнкі. У такой сытуацыі палітычную ініцыятыву прыйшлося браць на сябе лідэрам БНФ, якія апынуліся ў замежжы.

Пасьля таго, як у сэнаце ЗША нам сказалі, што «калі мы, амэрыканцы, не пагодзімся з аб'яднаньнем Беларусі і Расеі – Масква не дазволіць нам прыняць краіны Балтыі ў НАТО», намі было канчаткова прынятае рашэньне прасіць палітычнага прытулку, тым больш мы мелі інфармацыю, што падрыхтавалі для нас спэцслужбы Лукашэнкі. Белы Дом быў пастаўлены перад выбарам, якога ён вельмі не жадаў рабіць (з пазьнейшых мэмуараў Строўба Тэлбата, намесьніка дзяржсакратара і асабістага сябра Клінтана, стала зразумела, што Вашынгтон збольшага быў гатовы працягваць палітыку ігнараваньня таго, што адбываецца ў Беларусі – эпізадычныя пратэсты Дзяржджэпу не ішлі ў разьлік. Паказальна, што на 500 старонках тэксту кнігі намесьніка кіраўніка Дзяржджэпу па СНД Беларусь згадваецца толькі два разы).

Прадстаўленьне палітычнага прытулку Зянону Пазьняку было фактычна прызнаньнем існаваньня ў Беларусі дыктатарскага рэжыму Лукашэнкі («Краіна мяняе статус», – напісала ў тыя дні «Наша Ніва»). Гэта прыцягнула ўвагу да Менску вядучых усясьветных СМІ, і падзеі вакол патэнцыйнага імпічмэнту

Лукашэнку ды «рэфэрэндуму» адбываліся ўжо пад увагай міжнароднай супольнасьці. Імпічмэнт, аднак, быў бяздарна правалены кіраўніцтвам Вярхоўнага Савету і старшынём Канстытуцыйнага суду, якія спакусіліся на пасярэдніцтва Крамля.

Апошнія надзеі на беларусізацыю былі пахаваныя пасьля лістападаўскага рэфэрэндуму 1996 году, які апазыцыяй і міжнароднай супольнасьцю быў ацэнены як антыканстытуцыйны пераварот.

ШЛЯХ ДА ЗЬНІШЧЭНЬНЯ БЕЛАРУСІ

Мне могуць запярэчыць – ну як жа, ня зьнікла ж беларуская мова, зьяўляюцца і кнігі, існуюць – нават! – беларускія клясы.

Усё гэта так, але беларускае слова жыло і пры Мураўёву, «Знак бяды» пісаўся пры Брэжневу, а клясы (праўда, не ў сталіцы) існавалі і пры Машэраву. Але калі казаць пра Адраджэньне як працэс нацыянальнага разьвіцьця, дык усё, што было пасьля траўня 1995 году – гэта толькі падтрыманьне нацыянальнай ідэі намаганьнямі энтузіястаў, безь дзяржаўнага спрыяньня, а ў абсалютнай большасьці выпадкаў – насуперак афіцыйнай палітыцы.

Паказальная ў гэтым сэнсе сытуацыя з Коласаўскім гуманітарным ліцэем – адзінай сярэдняй навучальнай установай у сталіцы краіны, дзе выкладаньне ўсіх прадметаў вядзецца на беларускай мове. Вучні выкідваюцца з будынку; у сьцены былога ліцэю засяляюць суд, які пры Лукашэнку зьяўляецца часткай рэпрэсіўнай сыстэмы. Настаўнікі вымушаныя праводзіць заняткі на кансьпіратыўных кватэрах; хіба што толькі Інтэрнэт ды іншыя прыкметы XXI стагодзьдзя адрозьніваюць гэтых дзяцей ад першых хрысьціян-катакомбнікаў.

У катакомбы загнаная і ўся нацыянальная культура; апошнія свае гады Васіль Быкаў быў вымушаны правесьці на чужыне.

У пачатку XXI стагодзьдзя, пры Лукашэнку, упершыню з

моманту панаваньня расейскага царызму беларускае слова можа быць падставай для арышту. І гэта не эфэктная фраза. Калі я запытаўся ў аднаго былога высокапастаўленага чыноўніка (у Лукашэнкі ён займаў пасаду вышэйшую, чым міністар) – што было б, калі б на нарадзе ў прэзыдэнта нейкі чыноўнік, напрыклад, міністар, раптам загаварыў па-беларуску, пачуў у адказ: «Адназначна – арышт. Ня ў той жа момант, але празь некалькі тыдняў гэты чалавек бы сядзеў, бо беларуская мова атаясамліваецца зь неляяльнасьцю да рэжыму, гэта знак, што «ня наш», ну а знайсьці, за што пасадзіць, можна ў кожнага чыноўніка. А ня знойдуць – дык прыдумаюць».

Дзяржаўная палітыка, накіраваная на ліквідацыю сфэры ўжытку беларускай мовы, на выкрэсьліваньне з гістарычнай памяці пэрыядаў незалежнага існаваньня, вывядзеньне нацыянальнай эліты ў рэзэрвацыі, на маргінэс, служыць стварэньню дэнацыяналізаванага грамадзтва. Леанід Лыч слушна заўважыў, што «па-за роднай культурай беларусы становяцца бессыстэмнай этнічнай масай», – можна было б дадаць, што, пры патрэбе, могуць зрабіцца, як гэта ўжо здаралася ў гісторыі, і «біямасай», якую кінуць абараняць геапалітычныя імпэрскія інтарэсы.

Бясспрэчна, што такое грамадзтва ў выпадку рэфэрэндуму прагаласуе за ліквідацыю Беларусі як дзяржавы – і Масква падасьць гэта сьвету як заканамерную зьяву: «Гэта – рускія людзі. Яны ж самі прызналі, што іх мова – расейская, іх гісторыя – расейская, і аб'ядналіся з намі самым дэмакратычным чынам – рэфэрэндумам. Талерантна і негвалтоўна».

І Эўропа з гэтым пагодзіцца.

АДМЕТНАСЬЦІ І ВЫСНОВЫ

Можна вызначыць некалькі адметнасьцяў і заканамернасьцяў апошняга этапу нацыянальнага Адраджэньня (1988–1995), магчыма, у беларускай сытуацыі ўнівэрсальных.

Гучаць меркаваньні, што дэпутатам апазыцыі варта было б

адмовіцца ад чыста палітычнай барацьбы і сканцэнтравацца выключна на культурна-асьветніцкай дзейнасьці, што дало б магчымасьць у значна большай ступені, чым гэта адбылося, рэалізаваць нацыянальныя ініцыятывы. Такое сьцьверджаньне не падаецца слушным, паколькі магчымасьць уплываць на гэты працэс знаходзілася ў непасрэднай залежнасьці ад ступені палітычнага ўплыву і ад палітычнай актыўнасьці парлямэнцкіх прадстаўнікоў БНФ. Яна была большай у жніўні 1991 году, калі БНФ удалося дасягнуць найважнейшай праграмнай палітычнай мэты – дзяржаўнай незалежнасьці, і мінімальнай – пасьля прыходу Лукашэнкі да ўлады, калі прынцыпы парлямэнтарызму пачалі зьнішчацца прэзыдэнцкай адміністрацыяй.

Такім чынам, Адраджэньне наўпрост было зьвязанае з вынікамі палітычнай дзейнасьці яго ініцыятараў – актывістаў Беларускага Народнага Фронту. Прычым найбольшыя посьпехі беларусізацыі дасягаліся менавіта тады, калі БНФ удавалася захапіць «пляцдармы» ў дзяржаўных сфэрах, і гэта тычыцца як канстытуцыйна-прававога поля (Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце, шэраг заканадаўчых пастановаў ВС), так і органаў кіраваньня (парлямэнцкія камісіі, пры ўсёй абмежаванасьці іх уплыву і практычна поўнай адсутнасьці рэальнай улады).

Вопыт паказаў, што беларусізацыя немагчымая пры аўтарытарызьме і дыктатуры, яна магчымая толькі пры дэмакратыі.

Але адметнасьць у тым, што сама па сабе дэмакратыя яшчэ не гарантуе ажыцьцяўленьня беларусізацыі.

І тут выяўляецца істотная заканамернасьць: палітычнае дамінаваньне дэмакратычных партыяў, для якіх нацыянальная ідэя не зьяўляецца прыярытэтнай, ні ў якім разе не спрыяе рэалізацыі гэтай ідэі.

Віцэ-прэм'ерства Віктара Ганчара ў першыя месяцы пасьля прыходу Лукашэнкі да ўлады адзначылася згортваньнем нацыянальных праграмаў (мне не вядомы ніводны ягоны пратэст з гэтай нагоды; пазьнейшая адстаўка была ім матываваная іншымі прычынамі). У Вярхоўным Савеце 13-га

скліканьня Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП) была прадстаўленая ў працэнтных суадносінах да агульнай колькасьці дэпутатаў ня горш, чым БНФ у парлямэнце 12-га скліканьня пасьля выбараў 1990 году (большасьць дэпутатаў будучай апазыцыі БНФ далучыліся да Народнага Фронту толькі пасьля пачатку першай сэсіі), а разам зь іншымі апазыцыйнымі дэпутатамі (так званымі «незалежнымі») дык была і значна большая. Аднак за адзінаццаць месяцаў існаваньня Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня «дэмакраты» лібэральнага кірунку ня вынесьлі ніводнай заканадаўчай прапановы, якая б была накіраваная на ўмацаваньне пазыцыяў беларускай мовы, разьвіцьцё нацыянальнай культуры ці захаваньне гістарычных каштоўнасьцяў. Наадварот – гэтыя дэпутаты прагаласавалі за прызнаньне вынікаў рэфэрэндуму 1995 году аб «дзьвюхмоўі», ліквідацыі бел-чырвона-белага сьцягу і «Пагоні» як дзяржаўных сымбаляў і інтэграцыі з Расеяй. Натуральна, гэта адбывалася і пры аднадушнай падтрымцы камуністычнай фракцыі.

Гэта ставіць пад сумнеў папулярную ў некаторых палітолягаў тэзу, што, маўляў, галоўнае – прывесьці да ўлады дэмакратаў, не істотна якіх, а яны ўжо гарантуюць адраджэньне нацыянальных каштоўнасьцяў. Не гарантуюць.

Яшчэ адной асаблівасьцю апошняга Адраджэньня было тое, што ні на якіх сваіх этапах яно не падтрымлівалася дзяржаўнымі органамі. Яно былі ініцыяванае лідэрамі БНФ, дэпутаты парлямэнцкай апазыцыі БНФ дамагаліся ўвасабленьня нацыянальных ідэалаў у дзяржаўнай практыцы (насуперак пазыцыі Вярхоўнага Савету і Савету Міністраў). Шляхам брутальнага (у літаральным сэнсе – фізычнага) падаўленьня парлямэнцкай апазыцыі БНФ гэтае Адраджэньне і было спыненае.

У 1988–1995 гадах – як, зрэшты, і на ўсіх этапах беларускай гісторыі – Масква не падтрымала ні нацыянальнага Адраджэньня, ні імкненьня да дэмакратычных рэформаў. Паўтаруся: глыбока памылковым уяўляецца меркаваньне, што ў жніўні 1991-га Масква «падаравала» Беларусі (як і іншым былым савецкім рэспублікам) сувэрэнітэт. На ўсіх этапах апошняй хвалі нацыянальнага Адраджэньня яго прыхільнікам

даводзілася супрацьстаяць уплыву Расеі, а адным з магутных інструмэнтаў у руках праціўнікаў выступала расейская мова.

Мы кажам пра сем гадоў Адраджэньня, але час, калі нацыянальныя сілы маглі больш-менш эфэктыўна ўплываць на дзяржаўную палітыку, значна карацейшы – са жніўня 1991-га да адстаўкі Шушкевіча ў студзені 1994-га.

Прычыны – чаму ж не да канца быў скарыстаны грамадствам гістарычны шанец – будуць яшчэ неаднаразова прааналізаваныя гісторыкамі. І, бясспрэчна, нашчадкам з адлегласьці часу яны будуць бачыцца больш ясна, чым нам.

Галоўную прычыну, аднак, можна вызначыць ужо цяпер. Гэта – нізкі ўзровень нацыянальнай сьвядомасьці грамадзтва.

«Шанец быў, вельмі рэдкі. Відаць, грамадзтва, з пэўных прычынаў, не магло пакарыстацца гэтым шанцам», – казаў Васіль Быкаў.

І ўсё ж Адраджэньне было, і яно мела вынікі.

Галоўны вынік апошняй хвалі нацыянальнага Адраджэньня – аднаўленьне незалежнасьці Беларусі. На жаль, незалежнасьць не атрымала ў той час і ўсё яшчэ ня мае да сёньня гарантыяў незваротнасьці.

Стварыць такія гарантыі і будзе першачарговай мэтай наступнай (і па-сапраўднаму апошняй) хвалі.

Нью-Ёрк–Прага

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 3 (43) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/05/25

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

эсэістыка [image]2006

да Зьмітку

[image] [image] [image] **ПАВАЛ АБРАМОВІЧ**

Павал Абрамовіч Жорсткасьці

літаратурны крытык, сталы аўтар «ARCHE».

Часопіс «Полымя» пераўтварыўся зь літаратурна-мастацкага і грамадзка-палітычнага часопісу ў часопіс для мэталюргаў. «Уладзімер Цімашпольскі. Мікалай Андрыянаў. Флягман беларускай мэталюргічнай прамысловасьці» – чытаем анонс на вокладцы леташняга трэцяга нумару. Няцяжка здагадацца, што гаворка ў гэтым, выбачаюся, аглядным артыкуле ідзе пра Беларускі мэталюргічны завод (БМЗ). Напісаны ён «сталёвай» моваю, зразумелай усім, хто працуе з мэталамі: *«У 1998 годзе закончылася рэканструкцыя МБЛЗ-3 у мэтах павышэньня якасьці загатоўкі і павелічэньня на гэтай базе экспартнага патэнцыялу для вытворчасьці высока- і звышвысокатрывалых відаў мэталакорду, а таксама сартавога легіраванага пракату з палепшаным комплексам уласьцівасьцяў»*. Адмыслова для беларускіх літаратараў, вельмі далёкіх ад гэтых матэрыяў і матэрыялаў «з палепшаным комплексам уласьцівасьцяў» на старонцы 132 «Полымя» зьмешчаны здымак пракатнага стану 850, на старонцы 137 – падшыпніка, выробленага з пракату БМЗ, а на наступнай мы бачым устаноўку «печ-коўш» ЭСПЦ-2. Спадзяюся, што ўважліва прачытаўшы гэты нумар і разгледзеўшы фатаздымкі, нашыя творцы здолеюць (зь веданьнем справы!) напісаць ня тое што апавяданьне альбо верш, а раман ці паэму пра сучаснае жыцьцё флягману нашай цяжкай прамысловасьці. Крытыкі ж няхай пакуль уважліва азнаёмяцца з тэхнічнай дакумэнтацыяй на прадукцыю БМЗ. А раптам пісьменьнікі пераблытаюць «печ-коўш» ЭСПЦ-1 з

ЭСПЦ-2? Такога ў наш час дараваць нельга!

* * *

Аксана Бязьлепкіна, аўтарка кнігі «Разам і паасобку: Таварыства «Тутэйшыя» (2003), апавядае, як падчас працы над сваёй кнігай яна адмовілася ўзяць інтэрвію ў **Анатоля Сыса**, калі той патэлефанаваў і запрасіў яе да сябе: *«Па голасе Сыса было чуваць, што чалавеку тэрмінова трэба даць інтэрвію з бутэлькай і лівэркай, можна бяз здымкаў»* (ARCHE. 2005. № 4). *«Аніякай крыўды* (?) *на Сыса я не трымала»*, – дадае Бязьлепкіна.

Што ж, шчырасьць заўсёды трэба толькі вітаць, але ў гэтым выпадку Бязьлепкіна засталася без матэрыялу, яе кніга ня мае некалькіх старонак. Яна адмахнулася ад п'янога Сыса, забыўшыся, што галоўная задача дасьледчыка ўва ўсе часы – ніколі не адмаўляцца ад крыніцаў інфармацыі, зьбіраць зьвесткі, дзе толькі можна і калі толькі можна. І ніколі не крывіць нос, памятаючы, што ісьціна можа чакаць нас у самых незвычайных месцах. Маладым беларускім літаратуразнаўцам трэба раўняцца на **Нормана Шэры**, афіцыйнага біёграфа **Грэма Грына**. Шэры сышоў з пасады загадчыка катэдры ангельскай мовы ўнівэрсытэту ў Ланчэстэры, каб выправіцца ў падарожжа «па сьлядох» Грына. Гэта былі жудасныя вандроўкі. Прыкладам, у Панаме ў Шэры пачалася гангрэна, на Гаіці яго затрымалі ў аэрапорце і ледзь ня кінулі ў турму, у Лібэрыі дасьледчык захварэў на трапічны дыябэт – яго ўратавалі ад сьмерці дактары з Корпусу міру. А празь некаторы час Шэры трапіў у аўтамабільную аварыю – і гэта ўсё, зьбіраючы матэрыял у тых мясьцінах, дзе жыў і працаваў знакаміты літаратар. (Занепакоены Грын зрабіў усё магчымае, каб адгаварыць Шэры ад вандроўкі ў Конга, дзе месьціўся лепразорый, які фігуруе ў рамане пісьменьніка «Коштам страты».) Як вынік, Норман Шэры напісаў трохтомнае «Жыцьцё Грэма Грына» і атрымаў прэмію Эдгара По.

Прэмію за кнігу, якой не захацеў пісаць, седзячы дома ці ўва ўтульнай бібліятэцы.

* * *

Уладзімер Някляеў, новы кіраўнік Беларускага ПЭН-цэнтру, піша для «Нашай Нівы» афарызмы і нататкі пад агульнай назвай «Знакі прыпынку». Зь іх можна даведацца, што *«для таго, каб быць літаратарам, дастаткова ня піць»* (2005. № 23). Высокая мудрасьць! Лабухам яе не зразумець.

* * *

У творах для нашых дзетак лунаюць сьцягі антаганістаў. Так, у беларускай народнай казцы «Сіняя сьвіта налева пашыта» (Сэрыя «Казка за казкай». Менск: Юнацтва, 1986. Наклад 80 тыс. экз.) мастак **М. Купава** намаляваў шэраг ілюстрацыяў зь сярэднявечнымі замкамі, над якімі рэюць бел-чырвона-белыя сьцягі. Тутака і ваяры пад дарагім сэрцу штандарам (с. 12). А вось у 300-старонкавай чытанцы «Малышок» (Менск: Юнацтва, 2001. Наклад 3 тыс. экз.) ілюстратар **І. Волкава** на с. 19 выправіла ў плаваньне карабель з мышанятамі-маракамі, на мачце якога бачым чырвона-зялёны сьцяжок.

Некалькі кропелек фарбы ў дзіцячых кніжках. Ці не ад іх залежыць будучыня нацыі?

* * *

Як чытачу, асабіста мне не зусім падабаецца, што **Ўладзімер Арлоў** піша сваю падарожную прозу ад другой асобы: *«Ты падымаесься й прапануеш ушанаваць памяць выбітнага продка ягоным улюбёным тостам. (...) Твой сябар пытаецца, ці маеш ты намер вяртацца сёньня ў Прагу. Ты марудзіш з адказам. Тваю скуру апякае салодка-вусьцішны струмок халадку. Ты бачыш у рэстаранным мэню ліпавы мёд і разумееш, што ў гэтую хвіліну на цябе заахвочвальна глядзіць сама муза гісторыі Кліё»* (Па сьлядах князя Жыгімонта. Наша Ніва. 2002. № 4). Ну не «падымаўся і не прапаноўваў» я нічога ў Празе, спадар Арлоў! І эфэкту прысутнасьці ў мяне не нараджаецца, а толькі раздражненьне. Бо я – гэта я, а вы – гэта вы.

* * *

Уздоўж шашы, якая вядзе з Койданава ў вёску Машніца, у якой жыве мая бабуля, растуць дзічкі, пасаджаныя колькі дзесяцігодзьдзяў таму. Гэта нізкія, кволыя, недагледжаныя дрэвы, галіны якіх ссохліся, але яны па-ранейшаму спрабуюць даваць ураджай, радаваць людзей. Толькі вось дзічкі тыя страшэнна маленькія, кіслыя і сушаць рот. Вяскоўцы на тыя дрэвы нават не зьвяртаюць увагі, бо ня маюць столькі вольнага часу, жаданьня і цукру, каб прыгатаваць зь іх варэньне. Да таго ж вакол дзічак расьце ў вялікай колькасьці крапіва – не падыдзеш!

Гэтыя дзічкі, дакладней, стаўленьне да іх вясковага люду, нагадваюць мне адносіны большасьці беларусаў да нацыянальнай літаратуры: для іх зьбіраць і спажываць тыя плады – гэта выпрабаваньне, а не задавальненьне.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/05/27**
[image]

археалогія•крытыка•гісторыя•**эсэістыка**•літаратура•палеміка•рэцэнзіі

Аляксей Каўка Як Улашчык за мяжу ўцякаў

АЛЯКСЕЙ КАЎКА (нарадзіўся ў 1937 г. у вёсцы Равіцкі Бор (цяпер Машчаліна) Чэрвеньскага р-ну Менскай вобл.) – літаратуразнаўца, гісторык. Аўтар апублікаванага ў самвыдаве «Письма к русскому другу» (1976–1977), у якім падымаліся пытаньні культурнай асымілянцыі і нацыянальнай гістарыязофіі беларусаў. Рэдактар ўпартасьць, адзін журналіст назваў талентам «перайтрымаць

Некалі расейскі гісторык, акадэмік М. Ціхаміраў, ён жа дырэктар Інстытуту гісторыі колішняй Акадэміі навук СССР, прыязна-паблажліва прыкмеціў ці не найістотнейшую рысу ў характары свайго супрацоўніка М. Улашчыка: «тихое белорусское упрямство».

Нядаўні выпускнік Беларускага ўнівэрсытэту падзялілу горкі выгнаньніцкі лёс з многімі славутымі дзеячамі нацыянальнай культуры: Ластоўскім, Лёсікам, Бабарэкам, Дубоўкам, братамі Гарэцкімі, Касьпяровічам, Смолічам, Азбукіным... (справа так званага «Саюзу вызваленьня Беларусі»). З той першай трагічнай «зачысткі» Ўлашчык – адзін зь нямногіх ацалелых. Гадай што адзіны, хто змог стаць Беларускім Гісторыкам.

Пакліканьне быць гісторыкам змоладу віравала ў яго рамантычна-мяцежнай істоце – пагартайма трапяткія й калярытныя старонкі Ўлашчыкавага «Краязнаўства». Лагернай бараніла ад роспачы й фізычнага вычарпаньня на «гулагаўскіх» тупіках. А ўрэшце дапамагло выжыць, каб зьдзейсьніць задуманае, – зноў жа варта вярнуцца да яго «Хронікі».

Неадольную прагу да выжываньня, памянёную беларускую

гісторыі» (Алег Гардзіенка. Гісторык, які перайграў «Скарыніч» // Arche. 2000. № 4). Зыркая, прываблівая мэтафара. А ўсё ж ня вельмі стасоўная, адэкватная драматычнаму Ўлашчыкаваму лёсу. Жорсткая д'ябальская гульня безь якіх-колечы правілаў не варажыла нашаму «гульцу» ані кроплі надзеі на посьпех. Гульні з д'яблам небясьпечныя і безнадзейныя. Герой наш – такі ж герой – гэта добра разумеў. І – адчайна змагаўся зь цяжкімі трагічнымі абставінамі, выходзячы, урэшце, пераможцам. Хаця ў тым зацятым супрацьстаяньні шалі дэманічных акалічнасьцяў ня раз пераважвалі яго рашучую натуру, і скон змагара здаваўся немінучым.

Як у выпадку з правальным намерам уцёкаў з ссылкі за мяжу, аб чым цьмяна згадвалася ва ўспамінах яго старэйшага калегі па выгнаньні Яўхіма Кіпеля. Мы маем уласнаручныя паказаньні самога ўцекача, напісаныя 24 сакавіка 1933 году сьледчаму ОГПУ (справа М. Улашчыка ў Інфармацыйным цэнтры МУС Кіраўскай вобласьці). Цытуем арыгінал:

Под влиянием того, что считал приговор слишком жестоким и не соответственным вине, я по приезде на место ссылки в Нолинск решил бежать за границу. Для этого я решил предварительно просить перевода в Вятку, так как из самого Нолинска ввиду дальности расстояния от жел[езных] дорог бежать было трудно. В Вятку приехал после двукратного заболевания воспалением лёгких, слишком слабый для побега и имея предупреждение врача, что третье заболевание будет, вероятно, смертельным. В Вятке лечился у врачей, и раз под влиянием минуты сказал Чернушевичу, что, не имея никаких перспектив и сильно скучая, решил бежать из ссылки. Чернушевич отнесся к этому отрицательно, говоря, что это риск головой и что этого не следует делать ни в коем случае. Уговаривал он все время до самого момента моей посадки на пароход. Бежать думал через Вятку – Нижний [Новгород] – Москву – Бологое. Дальше смотря по обстоятельствам. При переходе рассчитывал, что помогут буржуазные белорусские организации, так как при переходе должен быть арестован. При мне был бессрочный паспорт, как документ для дороги, и цианистый калий, чтобы окончить самоубийством при случае ареста на советской стороне. Ц[ианистый] калий высыпал в

камере при аресте в Слободском. Достал ц. калий в лаборатории Нолинской Ш[колы] К[рестьянской] М[олодежи], взял сам при посещении лаборатории, приходя к зав[едующему] лабораторией Киппелю. Ц[ианистый] калий взят без его ведома. Ц. калий был мною украден. При обыске в Медведке паспорт был у меня в носке, его не нашли.

(...) Вторично категорически заявляю, ручаюсь головой

(падкрэсьлена ў тэксьце. – А. К.) *и всем вообще, чем можно поручиться, что Чернушевич Н. Ф. очень резко и настойчиво уговаривал меня не делать побега, возвратиться в Нолинск и ждать конца ссылки. Писал собственноручно Улащик Н. Н.*

Пастановай Калегіі ОГПУ тагачаснага Горкаўскага краю пяцігадовая ссылка М. Улашчыка (тэрмін адлічваўся з дня першага арышту 11 чэрвеня 1930 году) замяняецца зьняволеньнем у папраўча-працоўным лягеры «на оставшийся срок».

Такі вось няпросты, варты адмысловай аповесьці сюжэт кшталту «Выжыць, каб перамагчы» – з усімі, адпаведна жанру, аксэсуарамі: інтрыга, канфлікт, драматычная разьвязка... Але да катарсіснай палёгкі пакуль ох як далёка!

Напярадзе – вызваленьне, вясной 1935-га. На радзіму шлях зачынены, і «сьвяціцца» там небясьпечна. Ён адчуў гэта адразу ж цягам караценькага адскоку ў Менск, да радні, убачыўшы павернутыя сьпіны ўчорашніх знаёмцаў. Пра аднаго з такіх насьцярожліва-абачлівых пазьней Улашчык занатуе ў сваёй «Хроніцы»:

Я ведаў Крапіву, ён мяне ведаў з часу арганізацыі Цэнтральнага бюро краязнаўства, дзе [Кандрат] быў інструктарам па краязнаўстве, а я, стараючыся ў тыя часы ўсіх зрабіць краязнаўцамі, часта [туды] заходзіў. Я толькі што ня тыцнуў рукі Крапіву, як убачыў, што ён ня хоча ні бачыць мяне, ні тым больш вітацца. Тое ж было і пры спатканьнях, калі ўжо быў цалкам «нармальны», калі баяцца не было чаго.

Можна ўявіць сабе далейшы паварот Улашчыкавага шляху, калі б ён затрымаўся на бацькаўшчыне даўжэй, дзе яго нечаканае зьяўленьне імгненна ставіла «на вушы» тутэйшых віжоў. Ніну Ўлашчык (у замуставе Бялькевіч), старэйшую сястру Мікалая, вядомую пад той час настаўніцу, аўтарку некалькіх мэтадычных выданьняў з практыкі пэдагагічнай працы, празь які час арыштуюць і сашлюць на Калыму за адну толькі адмову стаць таемным канфідэнтам спэцслужбаў. Але ж і ў злавесную пару татальнага застрашэньня й падазронасьці далёка ня ўсе «стукалі».

[image]

[image]

№ 3 (43) - 2006

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/05/27

[image]

[redacted]’2000)

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

[image] [image] [image]

Гутарка з пісьменнікам Анатолем Кудраўцом «Не вечна беларускую культуру будуць таптаць генеральскія боты»

— Вы нарадзіліся ў першы дзень 1936 года, а можа нават і ў саму навагоднюю ноч…

— Болей скандальнага пытання ў адносінах да мяне нельга і прыдумаць: калі нарадзіўся? Усё было добра, калі я вучыўся ў Аколіцкай пачатковай, а потым – у Каўбчанскай сямігадовай школах. Толя Кудравец і Толя Кудравец… Але пасля заканчэння Каўбчанскай сямігодкі, калі мне і майму аднакласніку Толю Марозу былі выдадзены Пахвальныя граматы, і ён, і я надумаліся паступаць у Слуцкае педагагічнае вучылішча, узніклі праблемы. Да пашпарта я яшчэ не дарос, а «метрыку»

павінен быў мець. Але «метрыкі» ў мяне не было: усе архівы – і сельсавецкія, і раённыя згарэлі ў часе вайны. На пытанне «хто я?» адказвала школа, тая ж Пахвальная грамата, а вось «дзе? калі?» – павінен быў адказаць нехта іншы. Гэтым «нехта» былі дзве сімпатычныя (так у мяне засталося ў памяці) жанчынкі (а можа, дзяўчыны) у белых халатах, якія па «наружнаму віду» павінны былі вызначыць і ўзаконіць год і дзень майго нараджэння. Год вызначалі яны, а месяц і дзень чалавек меў права выбіраць сам. Не ведаю, дзе там хавалася хітрасць і ў чым яна заключалася, але калі я сказаў, што нарадзіўся ў 1936 годзе, у абедзвюх белахалатніц палезлі ўгору бровы. Справа ў тым, што перада мной у іх на прыёме быў хлапец, на галаву, а то і болей вышэйшы за мяне. Ён даказваў, што нарадзіўся ў 1937 годзе. Ён выйшаў – я зайшоў. І сам сказаў, што нарадзіўся ў 1936 годзе. «Ну вось, а ты сумнявалася. Бачыш: там – трыццаць сёмы, а тут – трыццаць шосты...» Гэта, па ўсім, быў працяг іхняй дыскусіі, пачатку якой я не чуў. А чаму я назваў 1936 год? Віной была аб'яўка ў газеце, што ў Слуцкае педвучылішча прымаюцца асобы ад 14 да 30 гадоў. На той момант Анатолю Кудраўцу яшчэ не было чатырнаццаці (у школу я пайшоў у шэсць з хвосцікам), і я баяўся, што ў педвучылішча мяне могуць не прыняць. Далей было шмат розных праблем, звязаных з гэтай круглай датай... Я нават хацеў вярнуцца да мамінай даты (26 сакавіка), але патрэбны былі сведкі і г. д., і нехта мудры ўгаварыў мяне не браць лішняга клопату, што я і зрабіў.

— У свой час Вас падтрымаў Янка Брыль...

— Вельмі важна, калі на пачатку творчай дарогі нехта з Маэстраў цябе заўважыць. А яшчэ болей – пахваліць. Я быў тым шчаслівым чалавекам. Мяне не толькі ўбачыў, але і пахваліў сам Янка Брыль. Падкрэсліваю: САМ. Бо для мяне Брыль быў і тады, застаецца і цяпер чалавекам строгай маральнай асновы, што звязваецца са словам «беларус». Не нейкае размытае, што хочуць навязаць беларусу, нешта «памяркоўнае», усяяднае, згодніцкае «чего изволите», а сапраўднае, годнае, мужыцкае Я. Я тады ўжо добра ведаў, чытаў-перачытваў яго апавяданні, яго «Марылю», яго «Маці», каб зрабіць выснову, што значыць слова такога мастака.

— Вы доўга не затрымліваліся на адным працоўным месцы...

— Дзіўна падумаць, але так выходзіла, што я не шукаў месца працы, а месца працы шукала мяне. На трэцім курсе універсітэта, былі мы тады на сельгаспрактыцы, зграбалі салому, «Калгасная праўда» надрукавала мае вясковыя замалёўкі, выдзеліла другую прэмію (першай рэдкалегія нікому не прысудзіла), і мяне запрасілі (галоўны рэдактар Фясько В. І.) на сталую працу. Там я цэлы год і працаваў, сумяшчаючы працу з вучобай. Пасля заканчэння універсітэта (1963) мяне ўзяў на працу ў літрэдакцыю Белрадыё Мікола Матукоўскі. А далей усё пайшло, як пайшло.

На Белрадыё я не затрымаўся, бо ўбачыў, што радыё – бяздонная бочка: колькі ні кідай – усё мала, а толку як з той жа пустой бочкі: прабарабаніў, хто пачуў, хто не пачуў. Словам, усё ўпустую.

Потым быў «ЛіМ» з Нічыпарам Пашкевічам. Як ні дзіўна, гэты строгі крытык любіў падхалімаў. Такім я, дзякаваць Богу, не стаў і не мог стаць. Неяк сустрэў Алесь Бажко і сказаў, што ў выдавецтве «Беларусь» у яго рэдакцыі (мастацкай літаратуры) ёсць месца рэдактара па прозе. Я і пайшоў. Здаецца, і Нічыпар Пашкевіч з гэтай прычыны не надта перажываў.

Міколу Ткачову (дырэктару выдавецтва «Мастацкая літаратура», якое стварылася на базе трох рэдакцый выдавецтва «Беларусь») давялося доўга патаптацца, каб уламаць мяне ісці да яго галоўным рэдактарам. Незадоўга да таго я прыйшоў адказным сакратаром у «Маладосць» на месца Уладзіміра Юрэвіча, і праца там мне падабалася (Алесь Асіпенка, Васіль Зуёнак, Вера Палтаран, Сцяпан Кухараў, Янка Раманоўскі, Пятро Лысенка – што табе трэба?), але пасля трэцяй сустрэчы, якая скончылася ў ягонай прасторнай кватэры закуссю з рачной івасі, якую, кажуць, любіў Чэрчыль, я «пазямляцку» падняў рукі ўгору і здаўся.

— Як «вярстаўся» тэматычны план «Мастацкай літаратуры» ў пачатку 1970-х?

— Тэматычныя планы складаліся з таго, што было. Першы год, наколькі памятаю, было 170 назваў, потым 190, потым за 200. Намеснікам галоўнага, як было і ў выдавецтве «Беларусь», заставаўся Уладзімір Шахавец, а я над ім начальнікам. Праблемы часцей за ўсё ўзнікалі не на полі мастацкасці, а на полі, скажам так, маральнасці. Пахмяліцца хочацца заўсёды, калі нешта было ўчора і ёсць ахвота і ахвотнікі, а яны не

зводзіліся, і часам узнікалі сітуацыі чыста камедыйныя.
У плане была паэтычная кніжка Сцяпана Гаўрусёва. Рэдактар Іван Калеснік, загадчык рэдакцыі паэзіі Уладзімір Паўлаў, намеснік галоўнага рэдактара ўсё той жа «дзядзька Шах». Заставалася распісацца Кудраўцу – і кніга ідзе ў набор. Кудравец надумаўся пачытаць рукапіс і схапіўся за галаву, так усё ў ім было няроўна і разбэрсана. Сабраўся ўвесь калектыў: аўтар, рэдактар, загадчык, намеснік галоўнага – што рабіць? Сілы былі няроўныя: адзін (галоўны рэдактар) супраць чатырох. Ты слова – яны як мінімум чатыры, і ўсе паэты, усе «класікі». Праз гадзіну бясплённай гаварыльні я знайшоў бяспройгрышны ход: выдавецтва заказвае Сцяпану Гаўрусёву рэцэнзію на зборнік вершаў Сцяпана Гаўрусёва і плаціць ганарар за рэцэнзію. Нейкі час Сцяпан Захаравіч пазіраў на галоўнага, як на блазна. Потым рашуча мацюкнуўся: «Пайшоў ты... Колькі часу даеш на дапрацоўку?» – «Як толькі будзе гатова, адразу ў набор...»
Праз тры месяцы Сцяпан Захаравіч вярнуўся з Каралішчавіч з новым зборнікам.

— Як здарылася, што Вас запрасілі на працу ў ЦК КП Беларусі?

— Па ўсім, галоўным віноўнікам, што я трапіў на працу ў ЦК КПБ, быў Іван Мележ. Бо гэта ён неяк зайшоў у выдавецтва і сказаў, звяртаючыся да мяне: «Ну, ты хутка будзеш кіраваць намі». Я пасмяяўся, а праз тыдзень мяне паклікаў загадчык аддзела культуры ЦК Марцалеў с. В. і пасля нядоўгай гаворкі, як і што ў выдавецтве, павёў на пяты паверх да сакратара па ідэалогіі Кузьміна А. Т. Там мне ўжо прыпякло добра, але было позна.

— Гэта Вы паспрыялі, каб на працу ў ЦК КПБ патрапіў Сяргей Законнікаў?

— З'яўленне Сяргея Законнікава, як і Алеся Жука, у апараце ЦК КПБ адбылося без ніякай актыўнай маёй ролі. У мяне спыталі: «Як Вы ацэньваеце гэтых хлопцаў?» – я адказаў, што хлопцы таленавітыя і чэсныя. Далей усё ішло па старых праваных шляхах: хто бацька, хто маці, судзімы, рэпрэсаваны і г. д. Як даведаўся пазней, бацькі самога Машэрава былі рэпрэсаваныя. З аднаго боку – баявы Герой Савецкага Саюза, з другога, калі б некаму захацелася калупнуць... бацькі сасланыя і г. д.
З ЦК мяне ніхто не выстаўляў. Я рады быў магчымасці пайсці

адтуль, тым болей – галоўным рэдактарам «Нёмана». Гэта была ганаровая высылка.

— Пра Вашую творчасць пісалі бадай усе вядомыя тагачасныя крытыкі. Міхась Стральцоў нават адзначыў, што ў «Сачыненні на вольную тэму» абазначаны адзін са шляхоў выхаду з крызісу… раманнай думкі». Наколькі я зразумеў, Стральцоў пад крызісам меў на ўвазе моду на «грувасткія «эпапеі», што маюць нахіл да храналагічнай бясконцасці.

— Болей чым хто мяне разумеў Міхась Стральцоў. Гаварыў ён мала, але заўсёды пакідаў прастору для думак. Сваіх і чужых. Міхась Стральцоў страшэнна не любіў бясконцых эпапеяў, запеў якім даў Міхась Лынькоў, а пасля пайшло-паехала – і рэвалюцыя, і вайна – цягні дзень за днём, як ката за хвост – ён упіраецца, крычыць што ёсць сілы, а яны цягнуць… «Сачыненне на вольную тэму» з'явілася ў нейкім плане і яго адказам на шматкіламетровыя палотны. Міхась Стральцоў быў першым чытачом майго рамана, ён быў вельмі ашчадны да папяровай плошчы.

Яшчэ што пра Стральцова. Асмелюся быць нейкім суддзёю. Пасля таго, як ён вярнуўся з «хіміі» і тыцкаўся то ў «Полымя», то ў «Маладосць», то ў «ЛіМ», і ніхто не сказаў яму таго слова, якое б нейкім чынам падтрымала яго, заставаўся толькі «Нёман», рускамоўны «Нёман», якім кіраваў тады Кудравец, даў чалавеку магчымасць жыць і выжыць.

Потым была Вера Сямёнаўна Палтаран. Як у жанчыны, эмоцыі ў яе беглі наперадзе. Болей таго, яна часам бачыла тое, што ёй хацелася бачыць, а не тое, што было, але калі яна злавалася – злавалася па-мужчынску крута. Адзін вядомы пісьменнік і той, каго нельга было не надрукаваць, напісаў аповесць пра нешта непражытае, а Вера Сямёнаўна была дзяжурная па нумары, і я трапіўся ёй пад гарачую руку. Яна накінулася на мяне, быццам гэта я напісаў тое: «Анатоль Паўлавіч, дык гэта ж ананізм!..»

— Што Вы лічыце сваёй галоўнай творчай удачай?

— Думаю, «Раданіца». Яна мне далася лёгка, і мне здавалася, што далей іх, такіх «Раданіц», будзе шмат. І калі Мікола Гамолка прапанаваў аформіць дакументы на вылучэнне Саюзам пісьменнікаў аповесці на Дзяржаўную прэмію, я адмовіўся гэта зрабіць.

— Як Вы ацэньваеце стварэнне СПБ Чаргінца? Ці было гэта

для Вас нечаканасцю?
— Што датычыцца стварэння клона СП. Кожны чалавек мае права стварыць свой саюз – хоць нумізматычны, хоць спартовы, хоць міліцэйскі і г. д. Я лічыў, што генералы маюць трошкі больш здаровага сэнсу. Хаця сумненні былі. Бо той жа генерал, стаўшы старшынёй Літфонду, прапанаваў вылучыць сябе на нейкую фіктыўную прэмію зноў жа фіктыўнай саюзнай дзяржавы і дамогся, каб галасаванне было адкрытае, каб бачыць: «тот, кто не с нами, тот против нас». Безумоўна, гэта была сур'ёзная праверка і генералітэту, і яго радавых. Кандыдатура генерала не прайшла. Па прычыне элементарнай: калі няма дзяржавы, то якая можа быць прэмія? Праўда, яна адзначана дзесяццю тысячамі долараў... А гэта ўжо грошы. Літаратуру ствараюць не генералы, літаратуру ствараюць радавыя, або, на крайні прыклад, лейтэнанты. Нельга змешваць спорт і літаратуру. Футбольны мяч круглы, а алфавіт, скажам так, рознакаліберны.
— Як беларуская літаратура будзе развівацца далей?
— Усялякія прагнозы – справа рызыкоўная. Яшчэ не так даўно я думаў, што беларуская літаратура – гэта «Новая зямля» і «Адвечная песня». Мне здавалася, што жыццё ідзе ад жыцця. Пасля я пераканаўся, што жыццё ідзе ад ідэі. Аркадзь Куляшоў – самы геніяльны з паэтаў пасляваеннага перыяду, і не толькі ў беларускім абсягу. Яму Твардоўскі зайздросціў, а Твардоўскі талент выключны. Сёння ён непатрэбны, але як толькі задыміцца Урал, яго знойдуць. Аркадзь Куляшоў «знайшоў» «Александрыну». Час патрабуе свайго. Гэты час знайшоў Мулявіна – рускага, русака, які прачытаў беларускую «Александрыну», куляшоўскую «Александрыну», якая стала «Александрынай» сусветнай.
Літаратура будзе развівацца. Як бульба. У пограбе яна спіць, вынеслі на сонца – і пайшла ў рост. Літаратура развіваецца не самахоць: яе клічуць – яна расце. Не паклікала б жыццё Багушэвіча, і яго магло не быць. Так і з Купалам, і з Коласам, і Танкам, і Мележам, і Быкавым, і пакаленнем так званых «шасцідзесятнікаў». Тоўстыя раманы ў век тэлевізара і Інтэрнета цяжка чытаюцца. Але гэта не значыць, што іх ніхто не напіша.
— Ці маеце дзе друкавацца?
— Пытанне з друкаваннем ёсць, але яно не такое страшнае, як

здаецца. Галоўнае – напісаць твор. Праўда, хацелася б і ганарар за яго які-небудзь атрымаць. Але сёння ўсе дзяржаўныя ганарары ці ў «холдынгу», ці яшчэ ў каго.

— І традыцыйнае пытанне пра планы.

— А планы... Напісаныя дзве кніжкі – навелы пра пісьменнікаў, апавяданні. Адна праляжала чатыры гады ў выдавецтве «Кніга», дырэктар з года ў год абяцаў выдаць, а цяпер ужо, здаецца, і сам не дырэктар... Але... будзем аптымістамі. Не вечна ж беларускую культуру, літаратуру будуць таптаць генеральскія боты.

Гутарыў Алесь Аркуш

[image]

[image]

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/05/27

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

[image] [image] [image]

ДЗМІТРЫ ДЗМІТРЫЕЎ (нар. 1976) – пераможца літаратурнага конкурсу імя Натальлі Арсеньневай Беларускага ПЭН-Цэнтру. Жыве і працуе ў Магілёве.

Дзмітры Дзмітрыеў

Абвяшчэнне:
«**АБВ** – яшчэ не я»

* * *

словы з кімсьці бачыліся ў сне
і менавіта гэта паэтычыцца мяне

* * *

у ц*нотны стан заносіў ноту,*
ствараючы музычную зіготу

* * *

«усё наперадзе», – казаў гадзіннік...
а ён, вядома ж, знаны летуцынік

* * *

літара –
літаратара тара

выявы

1.
вы

2.
я

3.
вы

* * *

маўчым на разнастайных мовах,
перабіраем лапкамі ў галовах:
і ўсё адно складаем вершы
у падмурашнік Вавілонскай вежы?

* * *

па вадзе пайдзе па-боску босы
не ласы да кусанікаў Спакусы
Хрыстос – хто стос гароты да гары
знясе…

а сёння –
уладароў дары
ды херувімаў віхуры

* * *

сцізорыка лязо ля зор найноўшых
з сузор’я рэзала шыкоўны коўшык

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 3 (43) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/05/27
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image] [image]2006

[image] [image] [image] **АЛЯКСЕЙ ДЗЕРМАНТ**

Аляксей Дзермант, Сяргей Санько Этнагенез Беларусаў II: Яшчэ раз пра навуку і ідэалогію, або Куды вядзе «логіка здаровага розуму»

культуроляг, асьпірант Інстытуту філязофіі НАН Беларусі. Сяргей Санько – філёзаф, этноляг. Рэдактар і аўтар энцыкляпэдычнага слоўніка «Беларуская міталёгія» (2004).

Трэба любіць сваіх апанентаў…

Ніцшэанскае

Пераацэнка ўсіх каштоўнасцяў, гэты клічнік, такі чорны, такі пачварны, што ён кідае сцень на таго, хто яго ставіць, – гэткая задача кону змушае кожнае імгненне выбягаць на сонца, абцярушваць з сябе сур’ёзнасць, што стала цяжкой, збыт цяжкой. Тут добры ўсякі сродак, тут усякі «выпадак» – шчаслівы выпадак. Перадусім вайна…

Ф. Ніцшэ. «Азмрачэнне бажкоў, або як філасафуюць з молатам»

Сваю нядаўнюю спробу скрай радыкалізаваць аўтэнтычны беларускі этнагенетычны дыскурс мы завяршылі словамі: «Падаецца, што дыскусія ў любым разе вартая працягу, бо аргументы і факты далёка яшчэ не вычарпаныя. І лепей, калі

сапраўды ініцыятыва ў развязанні праблем этнагенезу беларусаў будзе зыходзіць ад беларускіх даследнікаў»[1]. І былі вельмі ўсцешаныя, калі водгукі пачалі з'яўляцца, у прыватнасці, водгук сп. Ю. Пацюпы з Горадні[2]. Нашаму шаноўнаму апаненту мы ўдзячныя за тое, што ён звярнуў увагу на адзін істотны аспект, які ў папярэднім тэксце быў разгледжаны зусім не дастаткова, а менавіта – лінгвістычны аспект. Дзякуючы надрукаванаму водгуку сп. Пацюпы ў нас ёсць добрая нагода ў гэты раз звярнуць на згаданы аспект больш увагі. Але не толькі на яго і нават не столькі на яго.

Гэтае «не толькі» звязана з тым, што аўтар водгуку і не цікаваў, як ён сам шчыра прызнаўся, мэты аспрэчыць нашы ранейшыя высновы. Мэта была іншая – «адбараніць» беларускую мову. Зрабіць гэта ён намануўся не ў асадах тэарэтычнага дыскурсу, а ў асадах «логікі здаровага розуму». Як мы пакажам далей, апеляцыя да здаровага розуму і лінгвацэнтрызм крытыкі аказваюцца натуральным чынам звязаныя. І пачнём мы, такім чынам, з эксплікацыі характару гэтай сувязі.

ДЭКАНСТРУКЦЫЯ «ЛОГІКІ ЗДАРОВАГА РОЗУМУ»

Філосаф у барацьбе са сваімі супернікамі, напрыклад, з навукай: тут ён становіцца скептыкам; тут ён пакідае за сабой права на такую форму пазнання, якая, на ягоную думку, недасяжная вучонаму… Усякі напад на сябе ён лічыць нападам на мараль, на дабрадзейнасць, рэлігію і парадак. Ён умее дыскрэдытаваць сваіх супернікаў як «спакуснікаў» і «людзей, што робяць падкопы», тут ён ідзе рука ў руку з уладаю.

Ф. Ніцшэ. «Воля да ўлады»

Наш шаноўны апанент пачынае разгортваць лініі абароны беларускай мовы наступным «метадалагічным» тэзісам: «Мае запярэчанні – гэта сумневы чалавека збоку, які абапіраецца не на адумысныя даследаванні ў данай галіне, а толькі на логіку здаровага розуму».

Аўтар, што праўда, ніяк не спецыфікуе, што *ён* разумее пад

[1] Дзермант А., Санько с. Этнагенез беларусаў: навука і ідэалогія // ARCHE. 2005. № 5. с. 233–253. Гл. таксама: DRUVIS. Almanach Centru entakasmalogiji «Kryŭja». 2005. № 1.

[2] Пацюпа Ю. Куды вядзе легіка балцкага аўтахтанізму // ARCHE. 2006. № 1–2. с. 163–168.

«логікай здаровага розуму», наогул пад «здаровым розумам». Між тым, гісторыя апеляцый да здаровага розуму налічвае амаль два з паловай тысячагоддзі і пачынаецца калі не з Сакрата, то пэўна ўжо са стоікаў. І цягам гэтай гісторыі як матывы, так і асаблівасці такіх апеляцый былі вельмі адрозныя. Здаровы розум для адукаваных немца, француза ці англічаніна – гэта проста розныя існасці. Таму нам давядзецца самастойна паспрабаваць дазнацца, з якім «здаровым розумам» мы будзем мець справу ў нашым выпадку.

Насамрэч, працытаваны тэзіс сп. Пацюпы выказвае не так і мала. Калі мы маем справу з так званым «здаровым розумам», істотным аказваецца не тое, *што* ім выказваецца, і нават не тое, *як* гэта выказваецца, а найперш тое, *дзеля чаго* нешта выказваецца, а ўжо таму і тое, што ім не выказваецца, замоўчваецца, калі нават не ўтойваецца. г. зн., што ў любых апеляцыях да здаровага розуму ёсць свая – выказаная ці нявыказаная – прагматыка.

У нашым выпадку, паколькі разбіраны тэзіс папераджае наступныя разважанні і вырокі нашага апанента, прагматыка найперш палягае ў тым, каб перавесці тэарэтычны дыскурс у сферу практычнага розуму, дзе сам тэарэтычны дыскурс губляе свае прывілеі выказваць ісціны розуму. Бо апошнія ўсталёўваюць дачыненні пазнання з прадметам пазнання, тады як практычны розум аруплены дачыненнямі паміж людзьмі, у тым ліку і з нагоды пазнання. У першым выпадку вырокі будуюцца паводле семантыкі ісціны, у другім выпадку – паводле семантыкі разумення[3]. Хаця – і гэта добра бачна на прыкладзе тэкста сп. Пацюпы – у рэальным дыскурсе можа адбывацца бесперапыннае пераключэнне з адной семантыкі на другую або, так бы мовіць, мадуляцыя адной семантыкі другой. Перад тым, як знітавацца ў адно цэлае ў прасторы аднаго тэксту, гэтыя семантыкі знітоўваюцца ў адной галаве, і гэтая галава зусім не абавязкова будзе даваць сабе ў тым справаздачу. Больш за тое, здаровы розум і не павінен гэтага рабіць па прычынах, якія будуць растлумачаны ніжэй.

Не варта думаць, што мы гэтым самым закідаем нашаму апаненту наіўнасць думкі. Зусім не, таму што падобнае

[3] Fillmore C. J. Frames

перапляценне тэарэтычных і прагматычных, а таксама тэхнічных і герменеўтычных аспектаў – азнака рэальнай навукі, псіхалагічныя, сацыялагічныя або культуралагічныя кампаненты – гэта трывала дзейныя чыннікі рэальнага пазнання.

and the semantics of understanding // Quaderni di semantica. Vol. VI. No. 2. 1985. P. 221–254.

Цягам больш як дзвюхтысячагадовай гісторыі процістаяння «здаровага розуму» і «тэарэтычнага розуму» першы не раз «уздымаўся на шчыт» у змаганні з фантомамі апошняга, гэтаксама як апошні не раз маніўся першага «ўсадзіць на кол» педантычнага метадызму або вытанчанай рэфлексіі. З іх сутыкнення пачынаецца сама еўрапейская філасофія.

Арыстоцель у «Нікамахавай этыцы» зазначае: «…мудрасць (*σοφία*) ёсць ведай і інтуіцыяй найбольш каштоўных па сваёй прыродзе рэчаў. Таму Анаксагора, Фалеса і да іх падобных называюць мудрымі (*σοφοί*), але не разважлівымі (*φρόνιμοι*)[4], бачучы, што яны ігнаруюць уласную выгаду, і кажуць, што яны ведаюць нешта вылучнае, уразлівае, цяжкае і боскае, але дарэмнае, бо яны шукаюць не чалавечых дабротаў» (Arist. Nik. eth. VI 7 1141 b 2–8). «Апавядаюць… што, назіраючы зоркі і гледзячы ўгару, Фалес зваліўся ў калодзеж, а нейкая фракіянка – слічная і гумарная служанка – усчала з яго смяяцца: ён, маўляў, прагне ведаць тое, што на небе, а таго, што перад ім і пад нагамі, не заўважае» (Plato Theaet. 174 a 4). Фалес, праўда, не надта замарудзіў з адказам. «Апавядаюць, што калі Фалеса, з прычыны яго беднасці, дакаралі ў марнасці філасофіі, то ён, сцяміўшы па назіранні зорак будучы [багаты] ураджай маслінаў, яшчэ ўзімку – балазе ў яго было крыху грошай – аддаў іх у задатак за ўсе алеяціскальні ў Мілеце і на Хіасе. Наняў ён іх за бясцэнак, бо ніхто не даваў болей, а калі прыйшла пара і попыт на іх раптам узрос, то пачаў аддаваць іх у паднаём па сваім меркаванні і, сабраўшы багата грошай, паказаў, што філосафы пры жаданні лёгка могуць разбагацець, ды толькі гэта не тое, пра што яны дбаюць. Вось якім чынам, кажуць, Фалес выказаў сваю мудрасць» (Arist. Polit. A IV 4 1259 a 3–6). Сутыкненне Фалеса з «здаровым розумам» абываценяў запомнілася грэкам перамогай Фалеса. Наступнікам Фалеса шэнціла менеў.

Геракліту, нашчадку эфескага царскага роду, «добрая» праўнь дабрачэслівага дэмасу адпомсціла брутальнай байкай пра ягоную смерць. Байка, відавочна, узнікла не без сувязі з уйдаць, папулярнымі трактатамі «Аб старажытнай медыцыне» і «Аб прыродзе чалавека», аўтарства якіх прыпісвалася Гіпакрату, і ў якіх тэарэтыкі-філосафы крытыкаваліся з гледзішча развагі практычнага розуму грамадска карыснага лякарскага нама», якое мастацтва, якое не дапускала генералізацыі метадаў лячэння. Так што, прынамсі, з VI–V стст. да н. э. шляхі тэарэтычнага і практычнага розумаў яўна разыходзяцца, каб потым яшчэ не раз скрыжавацца. Не забываймася, што VI–V стст. да н. э. – гэта пачатак антычных «дэмакратычных рэвалюцыяў». І праўсюль, дзе перамагалі дэмакратычныя рэжымы, філасофскі розум трапляў, сама мала, пад падазрэнне або і пад адкрытыя пераследы. Так, абвінавачаны дэмагогам у блюзнерстве, пакідае Афіны (уратаваны ад смерці вучнем – слынным Перыклам) Анаксагор. Абвінавачаны афінскім судом у блюзнерстве і разбэшчванні юнакоў і пасаджаны ў астрог канчае жыццё самагубствам Сакрат, добраахвотна выпіўшы блёкату… Дэмакратычная бальшыня антычных полісаў больш цаніла практычную разважлівасць і жыццёвую мудрасць (здаровы розум), чымся ўзвышанае разумаванне (філасофію). І менавіта з дэмакратычнага асяроддзя паўстаюць адмыслоўцы «здаровага розуму», што зрабілі апрацоўку здаровага розуму выгодным прадпрыемствам, – сафісты, гэтыя сімулякры-намады антычнасці. Эгалітарызм, лібералізм, прагрэсізм, індывідуалізм – з іх ідэйнага арсеналу. Так, Антыфонт цвердзіў: «Па прыродзе мы ўсе ўва ўсіх адносінах роўныя, прытым (аднолькава) і барбары, і эліны. Дарэчы звярнуць увагу на тое, што ва ўсіх людзей патрэбы ад прыроды аднолькавыя». Яго падтрымліваў адзін з малодшых сафістаў, вучань Горгія, Алкідамант, цвердзячы, што «бог зрабіў усіх вольнымі, прырода нікога не зрабіла рабом»[5].

Дзейнасць сафістаў найбольш імпанавала гандлёва[5] …І, як прамысловым колам антычных полісаў, якія складаліся з чужынцаў (метэкаў), непаўнапраўных палітаў (гарадскіх), вольнаадпушчанікаў і да іх пад. Для іх прапаганда чуецца голас спрыроджаных правоў чалавека, у прыватнасці, свабоды нараджэння (па прыродзе) – змаганне за больш спрыяльныя ўмовы для прадпрымальніцтва. Дый самі сафісты, тэлячы з

[4] Параўнаць бейлару ўзяць, Р. і Аб мастацтва і ў развагі на ўласнае фіксуе апавяданні тэарэтычнага і н. э. – гэта паўстаць, здаровага) розумаў.

[5] …І, як здаецца, дзеянні, стаяў, сучасна гэта ўсяго, і Элінаў

полісу ў поліс, хацелі б у кожным з іх пачувацца як дома, зусім як цяперашнія ідэолагі і адэпты «адкрытага грамадства» ды «свету без межаў».

Паколькі ў сафістыцы галоўнае – навучанне паспяховым паводзінам у грамадскіх справах (на народных сходах, на судзе, у прыватных зносінах), г. зн. у стыхіі грамадскіх камунікацый, дзе цаніліся разважлівасць і здаровы розум, вялікая ўвага надавалася рыторыцы, лінгвістыцы (пазней, семіётыцы) і логіцы, да дысцыплінарнага станаўлення якіх яны першыя і спрычыніліся. Так, Пратагор зрабіў першую сістэматызацыю лагічных высноў, займаўся катэгорыямі словазмянення і сінтаксісам сказаў, а Продык заснаваў тэорыю сінонімаў.

Цікавая акалічнасць, што і пазней, як толькі ў філасофіі ўзнікалі спробы абмежаваць прэтэнзіі тэарэтычнага розуму праз апеляцыі да здаровага розуму, яны суправаджаліся ўзнясеннем рыторыкі, хаця ў пазнейшых аўтараў (навачасных, напрыклад) каштоўнасная афарбоўка паняццяў тэарэтычнага розуму, здаровага розуму і той жа рыторыкі магла адрозніваца аж да супрацьлеглай. Зрэшты, калізіямі філасофіі і рыторыкі адзначана ўся інтэлектуальная гісторыя Еўропы[6].

Тым не менш, менавіта рыторыка не раз намагалася ўратаваць філасофію ад заняпаду і ператварэння ў мараль «чандалы», г. зн. ад дэкадансу, нігілізму і постмадэрнізму[7]. Так было, прыкладам, у імператарскім Рыме, так было ў Еўропе на піку мадэрнізму (*casus Nietzsche*). Што праўда, трэба прызнаць: гэтыя высілкі пакуль былі марныя, бо разам з бруднай вадой, як правіла, выплюхвалася з ночваў і дзіця.

Сафісты першымі сталі свядома эксплуатаваць характэрную асаблівасць здаровага розуму – ягоную *сітуацыйную амбівалентнасць* і нават *палівалентнасць*. Жыццёвая мудрасць падсумоўвае ў сваіх максімах (выслоўях, прыказках ды прымаўках) усе жыццёвыя здарэнні без вынятку – на ўсе выпадкі жыцця[8]. Толькі вось здаровы жыццёвы розум ніколі «не блытае боб з гарохам» і разумее свае максімы ў адпаведнасці з канкрэтнасцю сітуацыі, г. зн., кажучы па-кагнітывісцку, у аднясенні да фрэйму інтэрпрэтацыі, у якім выказванне

дома, у свеце выракаваныя на заняпад. А тое, што розныя сацыяльныя групы, сёння хацелі б назваць элітай, ёсць самазванства… Не дзіва, філосафы-арыстакраты, ад Геракліта да Канстанціна Леонцьева, ненавідзелі і ненавідзяць прагрэс. Не таму, што над імі уладараць прагматычныя, «класавыя», як сказалі б марксісты, інтарэсы. А таму, што яны – носьбіты той культуры, якая пры прагрэсе відочна разбураецца. Пралетар не

становіцца рэлевантным, або, кажучы «па-сучаснаму», «фільтруе базар» па сітуацыі. Гэта акурат тое, што робіць здаровы розум (у сэнсе *sensus communis*) сапраўды здаровым (або сэнсе *bonus mens*). Сафіст, які сімулюе[9] філосафа-тэарэтыка, падмяняе семантыку разумення (суаднесеную з фрэймам інтэрпрэтацыі) з семантыкай ісціны (паводле вызначэння, сітуацыйна-інварыянтнай), атаесамляе розныя фрэймы (сумяшчае розныя сітуацыі ў адной інтэрпрэтацыйнай плашчыні) і, гэтым самым, ловіць здаровы розум у пастку супярэчнасцяў, парадоксаў, абсурду. Сафіст заўсёды імкнецца менавіта *sensus communis* як інварыянтны адносна ўсіх сітуацыі (практара[11]) агульназначны сэнс, які з гэтай прычыны лепей называць паспалітым розумам, а яшчэ лепей – становіцца абыдзённым розумам, нейтралізуючы пры гэтым *bonum mens* – «добрае», здаровы розум. І гэткім вось шляхам *генералізацыі пра* ўсё *камуналізацыю* перавёўшы дыскурс у плашчыню абстракцыяў, прымушае здаровы розум запінацца акурат там, дзе ведамы розум усё яшчэ лічыць, што ён па-ранейшаму ў сваёй буйнай стыхіі.

Пазіцыя сп. Пацюпы ўяўляе сапраўднае рытарычнае адзінства трох момантаў: 1) дэкларованай «незаангажаванасці» (квазіаб’ектыўнасці); 2) здаровага (тут: абыдзённага) розуму; 3) скепсісу. Гэтым тэзісам дэкларуецца, што выказвацца будзе прыватны пункт гледжання, які, тым не менш, прэзентуецца як агульназначнасць і права засумнявацца ў слушнасці нейкага іншага прыватнага пункта гледжання. А на гэтай падставе і вынесці вердыкт, што да вартасцяў гэтага іншага пункта гледжання. Наш апанент сваім «сумневам чалавека з боку» (ці падкрэслівае і незаангажаванасць свайго пункта гледжання), такім чынам – яго аб’ектыўнасць. І не заўважае, што гэтым самым ён ужо ператварыў сваю пазіцыю ў адну з прыватных пазіцый, ператварыў сябе ў адну з прыватных асобаў, ператварыў свой пункт гледжання ў адзін з прыватных пунктаў гледжання. Навошта ён тады ўвогуле ўступіў у палеміку? Ці ён не ведаў, што ў яго ёсць права на свой пункт гледжання

надстаўляе назіральніка, які ствараецца ў выніку ўзаемадзеяння, а не
ёсць нешта, што існуе незалежна ад назіральніка. Гэта ідэя, якая
ляжыць у аснове ўсіх канструктывісцкіх тэорый, у тым ліку і
радыкальнага канструктывізму. Пры гэтым, як адзначае Ф. Варэла,
«канструктывізм – гэта не адна тэорыя, а хутчэй назва для
сямейства падобных тэорый, якія ўзніклі ў розных галінах
даследаванняў» [12, с. 9]. Адным з першых, хто ўвёў тэрмін
«канструктывізм» у філасофскі дыскурс, быў Ж. Піяжэ, які ў
1967 г. выкарыстаў яго для апісання сваёй генетычнай
эпістэмалогіі. Пазней гэтую ідэю развівалі многія іншыя
даследчыкі, у тым ліку Э. фон Глазерсфельд, Х. фон Фёрстэр,
Г. Матурана, Ф. Варэла, Н. Луман, І. Прыгожын, І. Стэнгерс і
інш. Канструктывізм – гэта не адзіная філасофская плынь, але
ён мае шэраг агульных рысаў, якія дазваляюць аб'яднаць
прадстаўнікоў розных напрамкаў у адну групу. Да іх адносяцца:
1) адмаўленне аб'ектыўнага, незалежнага ад назіральніка
свету; 2) прызнанне актыўнай ролі назіральніка ў стварэнні
ведаў пра свет; 3) разуменне ведаў як інструмента для
арганізацыі вопыту, а не як адлюстравання рэчаіснасці;
4) акцэнт на ролі мовы, камунікацыі і сацыяльнага кантэксту ў
фарміраванні ведаў; 5) адмаўленне ідэі канчатковай ісціны і
прызнанне магчымасці існавання розных, часам
супярэчлівых, але аднолькава карысных апісанняў свету.

Канструктывізм узнік як рэакцыя на крызіс класічнай
эпістэмалогіі, які быў выкліканы развіццём квантавай фізікі,
тэорыі адноснасці і іншых навуковых дасягненняў XX стагоддзя.
Гэтыя тэорыі паказалі, што назіральнік не можа быць
цалкам аддзелены ад назіранага аб'екта, што ставіць пад
сумненне ідэю аб'ектыўнага, незалежнага ад назіральніка
свету. Канструктывісцкія ідэі развіваліся ў розных галінах
ведаў, ад біялогіі і кібернетыкі да сацыялогіі і філасофіі.
Адным з першых, хто выкарыстаў тэрмін «канструктывізм» у
філасофскім кантэксце, быў Ж. Піяжэ, які ў 1967 г. ужыў яго
для апісання сваёй генетычнай эпістэмалогіі. Пазней гэтую
ідэю развівалі многія іншыя даследчыкі, у тым ліку і
радыкальнага канструктывізму. Пры гэтым, як адзначае Ф.
Варэла, «канструктывізм – гэта не адна тэорыя, а хутчэй назва
для сямейства падобных тэорый, якія ўзніклі ў розных галінах
даследаванняў» [12, с. 9]. Адным з першых, хто ўвёў тэрмін
«канструктывізм» у філасофскі дыскурс, быў Ж. Піяжэ, які ў
1967 г. выкарыстаў яго для апісання сваёй генетычнай
эпістэмалогіі. Пазней гэтую ідэю развівалі многія іншыя
даследчыкі, у тым ліку і радыкальнага канструктывізму. Пры
гэтым, як адзначае Ф. Варэла, «канструктывізм – гэта не адна
тэорыя, а хутчэй назва для сямейства падобных тэорый, якія
ўзніклі ў розных галінах даследаванняў» [12, с. 9]. Адным з
першых, хто ўвёў тэрмін «канструктывізм» у філасофскі
дыскурс, быў Ж. Піяжэ, які ў 1967 г. выкарыстаў яго для
апісання сваёй генетычнай эпістэмалогіі. Пазней гэтую ідэю
развівалі многія іншыя даследчыкі, у тым ліку і радыкальнага
канструктывізму. Пры гэтым, як адзначае Ф. Варэла,
«канструктывізм – гэта не адна тэорыя, а хутчэй назва для

[16] Трубачев О. Н. Этногенез и культура древнейших славян: лингвистические исследования. Изд. 2-е, доп. — М., 2003. С. 198, 310.

а) рускія, б) беларускія, в) украінскія. Гэта ж сфера, дзе «суб'ект» назіральнікам». Гэткая, прыкладам, культура ў дачыненні да прыналежнага да яе ж культуролага. Гэткая ж уся праблематыка этнагенезу і этнічнай гісторыі этнасу, да якога належыць «суб'ект» этнагенетычнага даследавання. Тут чын пазнання адначасна з'яўляецца фактам этнічнай гісторыі, тэорыя становіцца генеалогіяй, а добрае «паводжанне» супадае з мэтай пазнання і падсумоўваецца наступнай архаічнай формулай: «Знай свой род»[16].

Здаровы розум сп. Пацюпы (у сэнсе *sensus communis*) мае мову за сваю *неабходную* ўмову, але ўмову далёка не дастатковую. Неабходныя яшчэ, прынамсі, дзве галоўныя ўмовы: 1) прыналежнасць – і нават перажыванне – супольнай традыцыі; 2) антыцыпацыя супольных мэтаў. Відавочна, што тры названыя ўмовы рэпрэзентуюць тры тэмпаральныя мадальнасці *sensus communis*: мінулага (традыцыя), цяперашні (мова) і будучыні (кону).

Гэтыя тры мадальнасці невыдаляльныя, нават калі рэфлексія будзе фіксаваць адно мову як умову *sensus communis*, г. зн. выяўляць гэты апошні толькі ў модусе цяперашні. Два другія модусы будуць самаўзнаўляцца, але заціскаючы *sensus communis* у чыста моўныя асады: у мінулым – генезіс мовы і яе гісторыя, у будучыні – яе лёс як мовы.

Sensus communis «сведамага беларуса», як ён выказваецца сп. Пацюпам, па сутнасці цалкам лінгвацэнтрычны. Таму і аргументацыя выбудоўваецца вакол моўнага пытання.

Спачатку выказваецца «трывога» з таго, што «высновы, да якіх вядзе разгляданая тэорыя, …вельмі …заблытваюць праблему глотагенезу». Гэта зразумела, бо глотагенез у відалі цяперашні не можа не выглядаць зусім іначай, чымся ў пэўнай транстэмпаральнай відалі. І наш апанент, усведамляючы гэта, ужо зусім пэўна зацямляе: «Шаноўныя аўтары сваім «несупярэчлівым» развязаннем праблемы этнагенезу заганяюць праблему паходжання беларускае мовы ў беспрасветны тупік». А нарэшце і выносіць суворы вырок: «Між іншым, менавіта для ідэалогіі, а дакладней для «беларускае ідэі» пытанне «мовы»

куды важнейшае за пытанне «крыві» ці пытанне «веры». Як бы гэта парадаксальна ні дачынялася да запраўднасці – усё ж беларуская культура – мовацэнтрычная, і ўсякі падкоп пад мову ёсць «ідэалагічнай дыверсіяй». Траха не інтэлектуальным тэрарызмам…

Але гэткі і ўсякі *sensus communis* наогул. У ім заўсёды выказвае сябе нейкае партыкулярнае агульнае. Любое пытанне, якое выводзіць па-за межы прынятых дыскурсіўных практык, спачатку ўспрымаецца як бессвядомая турбота, а потым інтэрпрэтуецца як «дыверсія». Гэтак паводзіцца *sensus communis* любой адносна замкнёнай супольнасці. Напрыклад, навуковай супольнасці. *Sensus communis* многіх рэлігійных сектаў прымушае іх адэптаў успрымаць любыя несанкцыянаваныя канонам пытанні як простую агрэсію і выклікаюць сапраўдную агрэсію ў адказ. Зрэшты гэтак паводзяцца і тыя супольнасці, якія прысабечылі права рэпрэзентаваць *sensus communis* усяго грамадства, – бюракратыі рознага кшталту: дзяржаўная, навуковая, культурная і да іх пад.

У выпадку разгляданага тут лінгвацэнтрычнага *sensus communis* «усякі падкоп пад мову ёсць «ідэалагічнай дывэрсіяй» менавіта таму, што на мову ўскладаюць неўласцівую ёй, як мове, функцыю – быць паслугачкай ідэалогіі. Адсюль другасная семіятызацыя самой мовы і, як вынік, яе раскол на «сваю» беларускую мову і «чужую», на тарашкевіцу і наркамаўку. Адсюль тая, амаль рэлігійная, прывязанасць да графічнага пазначэння мяккасці зычных у пэўных пазіцыях з дапамогай мяккага знака, месца якому насамрэч у арфаэпічных слоўніках. Дык якую ж беларускую мову адбараніў, як ён спадзяецца, наш апанент? Беларускую мову наогул? Ці тую з іх, якая змешчана ў асяродак звыклага *sensus communis*? І ці не сведчыць гэта за тое, што мова праблематызаваная яе ідэалагізацыяй болей, чым інтэлектуальнымі «дыверсіямі» «балцкіх аўтахтаністаў»?

Чамусьці раманамоўным румынам ці французам не надта замінае тое, што яны зусім не спадчыннікі славутых рымлянаў, а штудыі з кельтшчыны, тракійшчыны або ілірыйшчыны не ўспрымаюцца як «дыверсія».

Выракі Пацюпы, па сутнасці, – каштоўнасныя выракі, яны

абапіраюцца на пачуццё задавальнення (мне падабаецца, мне не падабаецца), а выказваюцца ў форме выракаў ісціны. Наш жа метад палягае не ў тым, каб старанна ўтойваць метафізічныя прэсупазіцыі свайго дыскурсу, а, эксплікаваўшы *годныя* прэсупазіцыі, свядома пакласці іх у падмурак гэтага дыскурсу.

ЭТНАГЕНЕЗ CONTRA ГЛОТАГЕНЕЗ? АБО ПРА ТОЕ, ЯК «НЕ ТРЭБА БЛЫТАЦЬ БОБ З ГАРОХАМ»

Само это филигранное искусство схватывать и понимать вообще, этот указатель nuances, эта психология оттенков и изгибов…

Ф. Ніцшэ. «Ecce homo»

Шаноўны апанент перакананы, што высвятленне некаторых праблем этнічнага паходжання (між іншым, пытанні кшталту «А хто з славянаў – праўдзівыя славяне?») не вартыя для навукі выедзенага яйка. Прыкра, што сп. Пацюпа альбо зусім не ведае прадмета этнагенетычнай навукі, дзе гэткія пытанні займаюць вельмі важнае месца, альбо мае пра яе вельмі павярхоўнае ўяўленне, абмежаванае ўласнай «логікай здаровага розуму». З гэтага ж шэрагу і наступныя ягоныя развагі: «ці слушна этнагенез разглядаць ізалявана ад глотагенезу? Або, урэшце, ці можа этнагенез супярэчыць глотагенезу? Думаю, на абодва пытанні адказ будзе адмоўны». У сваім артыкуле мы звярталі ўвагу на метадалагічную неправамернасць змешваньня этна-, глота- і культургенетычных праблематык, што далёка не ёсць тоесным ізаляцыі этнагенезу ад глотагенезу. Зусім не зразумела, што наш апанент мае на ўвазе пад «супярэчнасцю» этна- і глотагенезу? У навуцы ўжо даўно існуе распрацаваная тыпалогія этнагенетычных сітуацый[17]. Адным з пастулатаў нашай канцэпцыі ёсць дастасаванне да праблемы паходжання беларусаў наступнай сітуацыі: прыхадні складаюць меншыню, будучы пэўны час кіроўнай палітычнай сілай, яны перадаюць мясцоваму насельніцтву сваю мову і аказваюць пэўны ўплыў на яго культуру. Але шлюбныя кантакты з мясцовым насельніцтвам нязначныя, і ў выніку ўтвараецца народ, які

практычна не адрозніваецца ад мясцовых продкаў, але які гутарыць на адрознай ад іх мове і мае новыя рысы культуры. У спецыяльнай літаратуры даюцца шматлікія апісанні рэалізацыі гэткай мадэлі, прыкладам, іранскамоўныя асецінцы ёсць класічнымі прадстаўнікамі каўкасійнага антрапалагічнага тыпу, для якога на тэрыторыі пражывання асецінскага этнасу фіксуецца працяглая генетычная пераемнасць, тады як сярэднявечныя аланы, што ўважаюцца за лінгвістычных продкаў асецінцаў, антрапалагічна нагэтулькі розняцца ад апошніх, што гэта цалкам пярэчыць генетычнай роднасці паміж імі. Адсюль заканамерная выснова, што прышлае насельніцтва (аланы) перадало мясцоваму сваю мову, але фізічна сучасныя асецінцы збольшага звязаныя з дааланскім насельніцтвам Цэнтральнага Каўказу. Падобнае можна сцвердзіць і ў дачыненні да цюркамоўных турак, якія згодна з антрапалагічнымі і генетычнымі матэрыяламі, блізкія да армянаў, персаў і найдаўнейшага насельніцтва Пярэдняй Азіі[18].

Менавіта для ідэалогіі, або, дакладней, ідэалогіі пэўнага кшталту, пытанні пра тое, хто кім ёсць напраўдзе, ніадрабязней: вартыя, а зацікаўленне імі або альтэрнатыўнае меркаванне ўспрымаюцца неадэкватна. Між тым, перспектыўнасць «балцкага аўтахтанізму», на шчасце, усведамляецца не толькі спецыялістамі, але і некаторымі вядомымі беларускімі інтэлектуаламі. Для іх балцкая ідэнтычнасць беларусаў азначала б не толькі зварот да праўдзівых вытокаў, але адкрывала б і пэўныя далягляды прышласці: «Балцкая ідэалогія, бадай, мела б шанцы на заўтра. Толькі спачатку нехта мусіць яе стварыць, выпісаць, зрабіць прывабнай, падаць ужо на ёй меў бы шанцы ўз'ехаць на пасад новы прэзідэнт краіны»[19] (С. Паўлоўскі (Дубавец)). с. Харэўскі звяртае ўвагу на гістарычную значнасць «балцкай тэмы»: «Нават у самой Літве няма археалагічнага музея. А было б цалкам справядліва стварыць музей тутэйшых абарыгенаў-балтаў. Бадай, тады мы б не гэтак тузаліся ад сваіх надзённых палітычных крутасаў, пазіраючы на іх з вяршыні дзвюхтысячагадовае гісторыі»[20]. г. Лех – кіраўнік Міжрэгіянальнага аб'яднання беларускай моладзі – яшчэ больш катэгарычны ў сваіх высновах: «У кожным беларусе «сядзіць» балт, хочам мы таго ці не хочам»[21].

[17] Гл. падрабязней: Аванесов В., Бромлей Ю. К изучению процессов формировании этнических общностей // Советская этнография. 1968. № 2. с. 35–45; Аванесов В. Пры[illegible]. г. Эдинбург. Москва, 1979. с. 182–190;

Між іншым, цяпер відавочна, што да пералічанага нами корпуса «генезаў» трэба яшчэ ўлучаць і нацыягенетычную праблематыку і сцвердзіць, што этна-, глота-, культура- і нацыягенезы – гэта далёка не тое самае. І гэта ў сваім часе добра прадэманстраваў М. Эліадэ на прыкладзе румынаў[22]. Рым і ідэя лацінскасці былі ад XVI ст. на першым плане ў фармаванні румынскай культуры, але з другой паловы XIX ст. пачаўся «бунт аўтахтонных глыбінь», у выніку чаго сталі «рэабілітаваныя» як продкі румынаў. Працэс беларускай нацыягенезу дасягнуў сваёй крытычнай кропкі толькі цяпер, калі бальшыня краін Еўропы жыве ўжо ў эпоху постнацыяналізму. І як часта бывала ў гісторыі, апазіцыя нацыятварэння спадарожнічае пэўная канфрантацыя, супярэчнасць імплозіі, якая скіроўваецца ўнутр супольнасці, і эксплозіі, скіраванай навонкі. Беларускі нацыянальны праект вельмі падобны да хімеры з адной галавой у выглядзе нацыі «савецкіх беларусаў» і другой – у выглядзе заканаванай меншасці «свядомых беларусаў». Аднак гэтая хімера часам спараджае у абедзвюх галовах калі не ідэалагавыя імкненні, дык некаторыя ідэі. Прыкладам, план танкавага бліцкрыгу наўрымна злучыў бы шмат якіх прадстаўнікоў варожых беларускіх табараў, а апісанні падступнасці «жмудзінаўлетувісаў», што скралі назву і славутую гісторыю, магло б паспаборнічаць з прапагандай ВТ пра намеры літоўскага боку атрымаць радыеактыўным выпадам палову сённяшняй рэспублікі. У такім раскладзе «балцкі аўтахтанізм» непазбежна будзе сутыкацца з нервовай рэакцыяй з абодвух бакоў. Злева ўвачавідкі «падконы» над славянска-рускую гісту беларусаў, справа – супраць беларускай мовы і «вялікага княства».

Цыт. паводле: Свистунова С. «Диаспора» Башкирского исторического Мемориала как феномен этнической истории // Этнокультурное наследие народов Башкортостана. Уфа, 1989. С. 18–25

[22] Eliade M. The Romanians: a concise history. – Bucharest, 1992; Eliade M. Od Zalmoksisa do Czyngis chana. Warszawa, 2002. S. 70–75.

Сцвердзіць, што ў беларусаў, як і ў іншых народаў, ёсць свой этнагенез, свая этнічная гісторыя, – гэта значыць нічога не сцвердзіць. Этнагенез, этническая история, историческая этнография (Междисциплинарные исследования). Ленинград, 1989. С. 1, 8–25

[18] Пра гэтыя ды іншыя прыклады гл.: Алексеев В., Бромлей Ю. К изучению роли переселений народов в формировании новых этнических общностей // Советская этнография. 1968. № 2. с. 35–45.

[19] Паўлойскі с. Будзь гатовы! // Наша Ніва. 1997. 30 чэрвеня.

[20] Башкирский исторический Мемориал

[21] Цыт. паводле: Свистунова С. «Диаспора» Башкирского исторического Мемориала как феномен этнической истории // Этнокультурное наследие народов Башкортостана. Уфа, 1989. С. 18–25

[23] Седов В. К происхождению белорусов (проблема балтского субстрата в этногенезе белорусов) // Советская этнография. 1967. № 2. с. 112–119; Седов В. Еще раз о происхождении белорусов // Советская этнография. 1969. № 1. с. 105–121; Седов В. Славяне в Верхнем Поднепровье и Подвинье. Москва, 1970. (Материалы и исследования по археологии СССР. № 163).

Седов В. К происхождению белорусов (проблема балтского субстрата в этногенезе белорусов) // Советская этнография. 1967. № 2. с. 112–119; Седов В. Еще раз о происхождении белорусов // Советская этнография. 1969. № 1. с. 105–121; Седов В. Славяне в Верхнем Поднепровье и Подвинье. Москва, 1970. (Материалы и исследования по археологии СССР. № 163).

Менавіта ў сваіх класічных працах[23] перакананча давёў, што агульны антрапалагічны тып, характэрны для беларусаў і літоўцаў, фанетычныя асаблівасці беларускага моўнага комплексу, спецыфічныя археалагічныя, этнаграфічныя і міфалагічныя рысы амаль дакладна супадаюць з арэалам суцэльнага пашырэння балцкай гідранміі, што і лучыць беларуска-літоўскі абшар ды адрознівае яго ад велікарускага. Заходнія расійцы, у

этнагенезе якіх балцкі субстрат таксама адыграў значную ролю, яшчэ зусім нядаўна збольшага далучаліся да беларускага этналінгвістычнага арэалу. На іншых расійскіх тэрыторыях, дзе знаходзяцца сляды балцкай прысутнасці, ужо досыць выразна фіксуецца фіна-вугорскі элемент. І калі ўжо шукаць падстаў нейкай лучнасці для беларусаў і расійцаў (перадусім цверчукоў, пскавічоў, наўгародцаў), то не на аснове «рускага» або «славянскага» элементу, а ў гістарычнай традыцыі – экспансіі Вялікага Княства Літоўскага на ўсход, якая, дарэчы, магла мець і цалкам імаверную этнакультурную матывацыю: «З самога заснавання Літоўскага княства літоўцы прэтэндавалі на пэўныя часткі былога балтыйскага абшару. Яны досыць выразна памяталі яго межы і, відаць, свядома накіроўвалі свае вайсковыя выправы ў гэтыя бакі»[24].

Хацелася б адмыслова зацеміць, што наш апанент дазволяе сабе карыстацца вельмі небяспечнай, з нашага гледзішча, рыторыкай, кшталту «ўсякі падкоп пад мову ёсць «і сеадзіна дыверсіяй», якая вельмі нагадвае аргументы савецкіх навуковых тузоў, скіраваныя супраць тэорыі «балцкага субстрату». Адразу ж паўстае і пытанне – паводле якіх крытэрыяў вызначаецца «дыверсійнасць» «падкопаў» супраць беларускай мовы?

Раней пад аналагічнымі лозунгамі («нацыяналістычная дыверсія супраць адзінства ўсходнеславянскіх народаў») рэпрэсаваліся даследаванні балцкай асновы этнагенезу беларусаў, таму ёсць усе падставы засцерагацца, ці не трапяць сюды ж, прыкладам, штудыі беларускіх балтызмаў, якія непазбежна будуць выяўляць іх усё большую колькасць і, такім чынам, «псаваць» славянскае аблічча беларускай мовы? Пагатоў, калі гэткія штудыі дазваляюць зусім у іншым ракурсе паставіць саму праблему ўсходнеславянскіх балтызмаў, бо, паводле У. Тапарова, «тыпалогія балтызмаў гэткая, што пры разглядзе іх няма патрэбы ўва ўсіх выпадках канечне допускаць звычайную двухчленную сітуацыю – пазычбнае і тое, што пазычае. У шмат якіх выпадках гэткая схема – толькі даніна традыцыі. Калі б за гэтымі суадносінамі не стаяў этналінгвістычны пераход (балц. > слав., канкрэтна: рас., бел. ды да т. п.), дык, мабыць, балтызмы ва ўсх.-слав. гаворках і не

[24] Толпаров В. Образ «сеадзіна» в становлении этнического самосознания (русская литовская перспектива) // Славяне и их соседи. Этно-психологический стереотип в средние века (сборник тезисов). Москва, 1990. с. 9.

разглядаліся б як пераважна пазычанні. У кожным разе тут трэба звярнуць увагу на магчымасць прынцыпова іншага разумення ўсх.-слав. балтызмаў, а менавіта: у расійскіх гаворках метраполіі балтызмы, строга кажучы, не ёсць пазычаннямі; тут яны ў сябе дома; яны не навіна, а архаізм. Самі сабою балтызмы нерухомыя адносна розных моўных комплексаў (як, прыкладам, ва ўласна балтыйскім арэале), але вакол гэтых ацалелых архаізмаў балтыйскай мовы само моўнае асяроддзе змянілася нагэтулькі радыкальна, што яны з часткі мацерыка ператварыліся ў астраўкі і на фоне зменаў, што адбыліся навокал, сталі ўспрымацца зусім у іншым топасе. За асноўнае і выходнае стала ўважацца тое, што з гістарычнага гледзішча, строга кажучы, і ёсць пазычанне (г. зн. уласна расійскія словы)»[25].

Балтызмы – гэта не ўзятыя звонку словы, а часцінкі, што «ўтрымаліся» ў мове пасля «вымывання» з-пад яе балцкай асновы. Балцкі складнік беларушчыны – нібы «нітка», на якую нанізаныя славянскія «пацеркі». Балтызмы фармуюць адметнасць нашай мовы, вызначаюць яе апрычонасць. Таму і закід Пацюпы ў наш бок, быццам балцкі аўтахтанізм – «цудоўная цацка ў руках г. зв. «расейскамоўных» беларусаў, цалкам пазбаўлены рацыі, бо беларушчына праз прызму тэорыі паўстае сёння не толькі як складнік этнакультурнай ідэнтычнасці, але і найважнейшым кансервуючым элементам нашай адметнасці, праз які мы можам спазнаваць таямніцы свайго паходжання. Наша мова, карыстаючыся словамі В. Ластоўскага, – гэта «музыка ўсіх пачуццяў, якія перажывае наш народ», таму мы і ёсць не толькі пераканаными прыхільнікамі гэтай «музыкі», у адрозненне ад іншай (расійскай), толькі ў ёй мы можам пачуць мелодыі тутэйшай душы, толькі праз яе гучыць складаная праўда нашай мінуўшчыны. Нельга пагадзіцца і з тым, што «мы лёгка страцілі балцкую мову, бо працэс славізацыі, па вялікім рахунку, не скончыўся», а мова дняпроўска-дзвінскіх балтаў усё яшчэ жыве, дзякуючы арганічнай асновай беларускай мовы і яе дыялектаў.

[25] Тапоров В. Пацюпа, радыкулы і балцкі субстрат // Спадчына. 2007. № 4. С. 49.

Агулам, той жа У. Тапароў, які, без перабольшання, зрабіў аграмадны ўнёсак у вывучэнне балцкай спадчыны і які не раз спатыкаўся з суворай крытыкай з боку апанентаў за сваю

тэорыю паходжання славянскіх моваў, вельмі трапна ахарактарызаваў пазіцыю, грунтуючыся на якой сп. Пацюпа высоўвае супраць нас эмацыйныя абвінавачанні: «У ненармальных умовах, пры панаванні прадузятых перакананняў, якія становяцца хутчэй справай веры, як вынікам вольнага крытычнага даследавання з'яваў, перад некрытычна настроеным «спажыўцом» нярэдка ўзнікае спакуса выбару ў якасці праўдзівага вырашэння таго, што ён уважае за найбольш «прэстыжнае» (сама «прэстыжнасць» становіцца ў гэткім выпадку як бы крытэрыем праўдзівасці). У падобнай сітуацыі часта выступае на сцэну тая добра вядомая ў мінуўшчыне і ў цяпершчыне «патрыятычная» дэмагогія, мэта якой – «паляпшэнне» сваёй генеалогіі (вядома, заўсёды ўяўнае), з аднаго боку, і з другога, – дыскрэдытацыя, у прыватнасці з дапамогай абвінавачанняў у «антыпатрыятызме», даследнікаў, якія трымаюцца іншых прынцыпаў маральнасці і якія прыйшлі да вынікаў, што не супадаюць з «прэстыжнымі»[26].

Рэзкая ацэна сп. Пацюпам «балцкага аўтахтанізму» выносіць жадання ўзвысіць дзеля актуальных ідэалагічных мэтаў «прэстыжнасць» беларускай мовы праз падаўжэнне і канструкцыі яе славянскага радаводу. Маўляў, толькі гэтак мы здзейснім сваю мову дадатковымі аргументамі перад больш моцнымі канкурэнтамі: расійскай і польскай мовамі. Але гэта даклад тое, што мы ў сваім тэксце вызначылі як *рэпрэсіўнасць інтэрпрэтуючай рэтраспекцыі*, якая адштурхоўваецца ад наяўнага стану, праектуючы яго на вялізныя храналагічныя зрэзы ў мінулае. Не пазбег наш апанент і яшчэ адной спакусы, на якую мы звярталі ўвагу: аднясення фактаў да рэлевантных і нерэлевантных паводле адмыслова прынятых крытэрыяў ды ігнаравання нерэлевантных фактаў. Не іначай як толькі гэтак можна патлумачыць, чаму ніяк не была пракаментаваная досыць падрабязная і забяспечаная адпаведнай бібліяграфіяй частка нашага тэксту, прысвечаная асаблівасцям антрапалагічнага аблічча сучасных беларусаў і іх продкаў. Высновы, якія вынікаюць з аналізу шматгадовых доследаў у галіне фізічнай антрапалогіі і генетыкі (гэта, паўторым, між іншым, канстатацыя працяглай генетычнай пераемнасці карэннага насельніцтва і адсутнасці слядоў масавых міграцый), наш апанент з зайздроснай лёгкасцю перакрэслівае ўсяго

[26] Тіхаеров В. К. Ленинградский Ленинград. Москва, 1988. с. 266.

толькі цытатай М. Ермаловіча, аўтарытэт якога ў беларускай, польскай ды літоўскай гістарыяграфіях не толькі ў пытаннях этнагенезу, але і генезісу Вялікага Княства Літоўскага фактычна блізкі да нуля. Мы нездарма прысвяцілі шмат увагі менавіта антрапалагічным матэрыялам дзеля таго, каб паказаць, што сітуацыя выглядае якраз зусім іначай, як уяўляецца М. Ермаловічу і Ю. Пацюпу, бо тыя антрапалагічна-генетычныя рысы, якія дамінуюць сярод сучасных беларусаў і вызначаюць апрычонасць яго фізічнага аблічча, сягаюць сваімі вытокамі да аўтахтоннага даславянскага насельніцтва.

Больш таго, цверджанне пра дэмаграфічную перавагу славянскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі вымагае спецыяльнага навуковага аналізу, якому прыхільнікі масавай славянскай міграцыі ніколі не надавалі належнай увагі. Між тым, у гэтым абсягу ёсць вельмі цікавыя дасягненні. Гістарычная дэмаграфія становіцца сур'ёзным аргументам у дыскусіі на тэму паходжання славянаў і прычын іх пашырэння. І, дарэчы, пакуль не знаходзіць пацверджання гіпотэза пра «дэмаграфічны выбух» сярод славянаў, які нібыта і быў штуршком іх шырокамаштабнай экспансіі[27]. Менавіта з гэтых прычын апошнім часам усё больш чутныя галасы навукоўцаў, якія ставяць пытанне ў зусім іншым ключы: «Можа, мы павінны гаварыць хутчэй не пра экспансію «славянаў», але пра экспансію «славянскасці»? Можа быць, трэба дапоўніць простую візію «люду», які пашыраецца, комплекснай гіпотэзай пра пашырэнне спецыфічнага культурнага ўзору, які выходзіць паза асады дэмаграфічнай экспансіі?»[28].

Гэткая перспектыва дазваляе па-іншаму ўявіць і паставіць пытанні нашага паходжання: сапраўднай праблемай становіцца балцкая аснова беларускага народу, але этнагенез славянізаваны і адэкватнае вытлумачэнне працэсу славянізацыі аўтахтоннага насельніцтва. Развязанне гэтай праблемы таксама нельга абмежаваць толькі рамкамі геаграфічнай лакалізацыі праславянскага этнасу на абшарах альбо паміж Віслай і Одрам, альбо паміж Дняпром і Бугам, хаця б таму, што абавязкова трэба мець на ўвазе прынятую большынёю лінгвістаў гіпотэзу пра развіццё славянскіх моваў з перыферыйных балцкіх дыялектаў[29] або нават класіфікацыю праславянскай мовы

[27] Piontek J. Antropologia historyczna. Społeczeństwo tradycyjne. Warszawa 1999.

[28] Słowiańszczyzna. Studia nad genezą i ekspansją. Red. Andrzej Buko. Warszawa 2008.

[29] Zinkevičius Z. Apie lietuvių kalbos dialektų kilmę. Vilnius 1966; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius 1996; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius 2005; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius 2011; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius 2015; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius 2017; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius 2019; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius 2021; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius 2023; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius 2025; Zinkevičius Z. Lietuvių dialektologija. Vilnius

адной з заходнябалцкіх[30].

ДЫК ПРА ШТО Ж НАМ ГАВОРЫЦЬ СМАЛЕНСКАЯ ГРАМАТА?

«Логіка здаровага розуму» нашага апанента дае збой акурат у пункце, які ім самім уважаецца за *argumentum crucis* «вырашальны аргумент». Сп. Пацюпа прыводзіць вялізную вытрымку з Смаленскай граматы 1229 г., адаптаваную да сучаснага правапісу. І, зрабіўшы адаптацыю, як ён сам прызнаецца, «з нагоды, наспех», не без пераможнага пафасу пытаецца: «Хто заявіць, што перад намі не беларуская мова?!» І робіць *тэарэтычны* ўнёсак: «Што з сказанага вынікае? Тое, што дыялекты, якія леглі ў аснову сучаснае беларускае мовы, як зазначае Віктар Мартынаў, ужо на момант станаўлення беларускае дзяржаўнасці мала чым розніліся ад сучасных гаворак».

Але ўжо тут, які, як сказана было вышэй, ніжыць у падмурку «здаровага розуму» (у сэнсе ст.-грэц. *ὑφορόων*[31] здаровая разважлівасць, памяркоўнасць, выхаванасць, сціпласць, цнатлівасць; лац. *bonus mens* здаровы (добры) розум; франц. *bone sense* (тое самае), у адрозненне ад «абыдзённага розуму» (*sensus communis*), мусіў бы выклікаць спантаннае, «інстынктыўнае» «эпах» (затрымку, устрыманне ад вынясення канчатковых вырокаў або вызначэнняў). Але абыдзенны розум прынцыпова не здатны праводзіць адрозненне паміж фактам і інтэрпрэтацыяй, бо свае ўяўленні аб рэальнасці ён заўсёды схільны атаесамляць з самой рэальнасцю. У гэтым палягае «наіўны рэалізм» абыдзённага розуму, угрунтаваны у «прыроднай установцы свядомасці» (Э. Гусэрль).

Самаценкі прыклад дыялектычнай супярэчнасці – гэта гістарычны факт. Але тое, што гэтая мова называлася «смаленскай», «старабеларускай мовай», «рускай» мовай, «польскай» і «літоўскай» – гэта ўжо інтэрпрэтацыя. Разгледжаны факт гаворыць нам напэўна, што мовай княскай адміністрацыі была «руская» мова, што пісары рэкрутаваліся найчасцей з мясцовага насельніцтва, што фаналагічныя сістэмы канцылярскай мовы і мясцовых гаворак

antropologów fizycznych // Przekazy rozwoju antropologii w Polsce. Piąte warsztaty antropologiczne. Warszawa, 2002. S. 27—49.

[28] Urbańczyk P. Władza i polityka we wczesnym średniowieczu. Wrocław, 2000. S. 136.

[29] Падрабязна на гэты конт гл.: Иванов В., Топоров В. К постановке вопроса о древнейших отношениях балтийских и славянских языков // Исследования по славянскому языкознанию. Москва, 1961. С. 273—305; Топоров В. К проблеме балто-славянских языковых отношений // Краткие сообщения Института славяноведения Академии наук СССР. Вып. 33—34. Актуальные проблемы славяноведения: Материалы первого координационного совещания по актуальным проблемам славяноведения. 1961. С. 211—218; Топоров В. Категории времени и пространства и балтийское языкознание // Балто-славянские исследования. 1980. Москва: Наука, 1981. С. 11—15; Мартынов В. Балто-славянские языковые отношения и глоттогенез славян // Балто-славянские исследования. 1980. Москва: Наука, 1981. С. 16—26; Мартынаў В. Этнагенез славян: мова і міф // Спадчына. 1996. № 4. С. 164—182; Мартынов В. Праславянский язык и его место в балтийском и лингвистическом континууме // Acta Baltico-Slavica. 2000. T. XXV. 2000. С. 179—212.

[30] Zeps V. Is Slavic a West Baltic language? // General Linguistics. Vol. 24. 1986. № 4. P. 213—222.

не супадалі. Апошняя акалічнасць сведчыцца шматлікімі выпадкамі змешвання на пісьме Ь, *е* і ь; ъ і *о*; *тс*, *ц* і ч; *в* і *у* і некаторымі іншымі. Пры гэтым павінна была б насцярожыць адсутнасць слядоў акання і якання, так характэрных для беларускай мовы. Сапраўды, такія сляды ў помніках старабеларускай пісьмовасці з'яўляюцца толькі ў XV ст. (у смаленска-полацкіх граматах – з 1478 г.) і не адлюстроўваюцца ў граматах вялікіх князёў літоўскіх, тады як у Маскве яны праяўляюцца ўжо ў 1339 г.[31]. Прычына, відаць, у тым, што, як паказвае вывучэнне запазычанняў з мовы крывічоў у латыскай і прыбалтыйска-фінскіх мовах, прынамсі, да XIII ст. (магчыма, і пазней) у мове крывічоў яшчэ існавала супрацьпастаўленне даўгіх і кароткіх галосных, а таксама супрацьпастаўленне акута і цыркумфлекса[32]. Яны і ставаліся засцерагальнікам ад акання-якання. Вось сп. Пацюпу і чарговы «падкоп», а, калі заўгодна, то і цэлая «дыверсія». Хаця «партызаншчына», відаць, у крыві ў тутэйшых…

Што да блытання на пісьме лабіяльна-дэнтальнага *в* (этымалагічнага) з білабіяльным *у* ў пазіцыях перад наступным зычным (*всемъ, всѣмоу, възяти,* але *уздоумал, оу римѣ, оу роусе, оузяти* і г. д.), то збег *v* з наступным зычным забараняе акурат у балтыйскіх мовах, гэтак жа, як і супрацьпастаўленне акута і цыркумфлекса, і даўгіх і кароткіх галосных, сведчыць адметныя асаблівасці фаналагічнай сістэмы крыўскага варыянта, якія, імаверна, спадкуюць асаблівасці мовы т. зв. дняпроўска-дзвінскіх балтаў, тут абмяркоўваць няма магчымасці[33].

Важна, аднак, зацеміць іншае. З усіх падсістэм мовы лексічная з'яўляецца самай лабільнай і першай зазнае кардынальныя трансфармацыі ва ўмовах *нераўнапраўнага* моўнага ўзаемадзеяння. Гэта звязана з тым, што слова праз экстэнсіянал шчыльна суадносіцца з экстралінгвістычнай рэальнасцю (з культурнай і сацыяпалітычнай у тым ліку), а праз інтэнсіянал – са свядомасцю. Кожная моўная фонетычная з'ява, якая ўзнікае ў выніку ўзаемадзеяння моў, можа быць (і, як правіла, бывае) ідэнтыфікавана носьбітамі мовы, якая ўспрымаецца як «чужая», і ўспрымаецца, як правіла, адмоўна. Таму лексічныя трансфармацыі фонетычнага характару, як правіла, ідуць хутчэй, чым іншыя.

[31] Лекцыі па гісторыі беларускай мовы / Склалі М. І. Нікіфароўскі, І. І. Замоцін, Ф. І. Піваварчык. Мінск, 1958. С. 159.

[32] Гл., напрыклад: Лехтисало М. И. К реконструкции фонетической системы языка восточных балтов (II) // Балто-славянские исследования. 1981. Москва: Наука, 1981. С. 159.

[33] Гл., напрыклад: Лехтисало М. И. К реконструкции фонетической системы языка восточных балтов (II) // Балто-славянские исследования. 1981. Москва: Наука, 1981. С. 159.

Лехтисало М. И. Проблема балтийского субстрата в этноязыковые контакты. Москва: Наука, 1980. с. 161.

Якімаў, 1982. с. 88–96; Николаева Т. Из наблюдений над акцентными особенностями говоров Среднего Поднепровья // Вопросы славянского языкознания. Вып. 5. М., 1960. с. 154; Сведась, 1986. с. 225.

[34] Прохаравай акурат на ўсходзе беларускага арэала – Славяна-Смаленшчыне і Браншчыне. Гэта формы кшталту *балотвайскія пайсці ў грыбы, ехаць з канём, пісаць з асадкай*. Ёсць і сінтаксічныя заходнебеларускія прыклады, як, напрыклад, *вучыцца* з *доктарку*, але апошнія відавочна звязаныя з адпаведнымі

Прохаравай акурат на ўсходзе беларускага арэала – Славяна-Смаленшчыне і Браншчыне[34]. Гэта формы кшталту *балотвайскія пайсці ў грыбы, ехаць з канём, пісаць з асадкай*. Ёсць і сінтаксічныя заходнебеларускія прыклады, як, напрыклад, *вучыцца* з *доктарку*, але апошнія відавочна звязаныя з адпаведнымі

[34] Прохаравай акурат на ўсходзе беларускага арэала – Славяна-Смаленшчыне і Браншчыне

літоўскімі канструкцыямі і ў гэтым сэнсе менш паказальныя. Хаця, трэба сказаць, што колькасць лексічных балтызмаў на Смаленшчыне таксама зусім не малая.

Дык пра што сведчыць так шчодра працытаваная сп. Пацюпам Смаленская грамата. Ды акурат пра тое, пра што мы і пісалі мінулым разам, а менавіта, што «асаблівасці фармавання беларускай этнічнай супольнасці адпавядаюць этнагенетычнай сітуацыі, калі меркаваныя перасяленцы складалі меншыню, якая праз адміністрацыйна-рэлігійны чыннік выклікала змены ў моўна-культурным ландшафце мясцовага насельніцтва». Не імкнучыся перабольшыць рэлігійны чыннік і ролю хросту ў моўнай славянізацыі мясцовых балтаў, мы адмыслова падкрэслілі ролю «адміністрацыйна-рэлігійнага» чынніку, бо, з увагі на працяглае існаванне актыўнага дзвюхвер'я, што праіснавала да пачатку XX ст., толькі рэлігійны чыннік наўрад ці даў бы назіраны вынік. *Роля адміністрацыйнага рэсурсу была прынцыповая*. Ды не забываймася, што царква, як даўней, так (мы гэта бачым) і цяпер, з'яўляецца не толькі рэлігійным інстытутам. Гэта яшчэ і вельмі ўплывовы палітычны і ідэалагічны інстытут. А ў Сярэднявеччы царква – яшчэ і адзін з наймагутнейшых землеўладальнікаў і наогул фондатрымальнікаў і заўсёды ахвоча прэтэндавала на сваю долю «кесарава».

Пра тое, як дзяржава праводзіла сваю моўную палітыку, сведчыць прадпісанне Статуту Вялікага Княства Літоўскага 1566 г.: «А писаръ земскій маеть по Руску литерами и словы Рускими вси листы и позвы писати, а не иншымъ языкомъ и словы, и такъ маетъ писаръ присегати»[35]. Гэта пры тым, што князі Вялікага Княства Літоўскага і ўрадоўцы не маглі не памятаць свайго балцкага (у тым ліку і літоўскага) паходжання. Прынамсі, для XV ст. вядомы выпадкі публічнага выкарыстання літоўскай мовы (на перамовах паміж Ягайлам і Вітаўтам у Луцку ў 1429 г., у дыпламатыі Казіміра Ягелона і інш.)[36]. Вызначаць у Статутах 1566 і 1588 гг. афіцыйны статус «рускага языка» трэба было таму, што рэальная моўная сітуацыя ў ВКЛ трапляе пад вызначэнне ды- і поліглассіі. Не кажучы ўжо пра польскі чыннік, нельга забывацца на тое, што не толькі ўрадоўцы літоўскага паходжання ведалі і актыўна

карысталіся роднай мовай, паслугуючыся ў справах службовых афіцыйнай мовай справаводства – «рускай», але і ўрады «русінскага» паходжання часта добра валодалі літоўскай мовай.

Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць запіс у 6-й Кнізе судовых справаў Метрыкі ВКЛ, дзе апавядаецца, што напачатку 1529 г. у Ейшышскую воласць Лідскага павета цэнтральнай адміністрацыяй ВКЛ быў пасланы дэцкі Васько (Васіль Бесцкан, «русін»), каб апытаць сведкаў па спрэчнай грамадзянскай справе Пётры Сумарока. Ход разважання справы дэцкі занёс у пратакольнай дакладнасцю і, між іншым, запісаў: «Изъдзял 4, почалъ пытати: «Сумороче, где светъки», и он ми указалъ светковъ у березнику. Потомъ, кгды светки передо мною стали и хотели сознати справедливость(ъ), и Сумороко почалъ имъ говорити по литовски передо мною и просилъ их: «для бога не выдайте мя, а што есмя вамъ обецалъ, то дамъ, а вас в том не выдамъ». И я, видячы несправедливость Суморокову, тых светковъ есьми пыталь»[35].

Але нам варта сумнявацца, што пэўны білінгвізм існаваў і на дыялектным узроўні. Арфаграфія літоўскіх тэкстаў XVI ст. не адрознівае нават фанетычныя варыянты, якія ў XVII ст. ляглі ў аснову арфаграфічнай сістэмы літоўскай мовы. Гэта сведчыць пра тое, што ў XVI ст. фіксуецца сітуацыя актыўнай дыгласіі.

Заканадаўчая рэгламентацыя афіцыйнай моўнай практыкі была выклікана не ў апошнюю чаргу і тым, што ўжо напачатку XVI ст. робяцца першыя спробы пісьмовай фіксацыі літоўскай мовы, а ў 1547 г. у Караляўцы выдаецца першая друкаваная кніга на літоўскай мове, але да XVII ст. у літоўскай арфаграфіі панаваў поўны хаос[38]. У XVI жа стагоддзі ўзрастае цікавасць да літоўскай мовы ў асяроддзі адукаваных людзей ВКЛ. Так, у 1550 г. выходзіць трактат Міхалона Літвіна «Аб норавах татар, літоўцаў і маскавітаў», да якога аўтар прытачыў слоўнік лацінска-літоўскіх простых адпаведнікаў, каб падмацаваць папулярную ўжо ў той час «тэорыю» паходжання літоўскай арыстакратыі ад рымлянаў. Так што мы можам разглядаць гэты

[35] Судзебник Великого Княжества Литовского 1529 года. Минск, 2003. Изд. 2. Кн. 1. Ст. 1.

[36] Дзярновіч О. И. О факторе литовского языка в многокультурном обществе Великого княжества Литовского XV – XVIII ст. // Исторический путь литовской письменности: Тезисы международной научной конференции, посвященной 100-летию отмены запрета литовской печати. 4–6 ноября 2004 г. Москва, 2004. с. 19–23.

[37] Там самым с. 20.

[38] Дубакова А. Ў. Орфографія литовских памятников XVI в. в контексте орфографических систем // Исторический путь литовской письменности: Тезисы международной научной конференции, посвященной 100-летию отмены запрета литовской печати. 4–6 ноября 2004 г. Москва, 2004. с. 23–24.

твор як адну з першых у нашай гісторыі спробаў рэалізацыі кантрастыўна-культуралагічнага даследавання…

Прадпісанне ж Статуту 1566 г. засведчыла, што этналінгвістычны пералом адбыўся і стаў незваротным, хаця сітуацыя балта-славянскай дыгласіі трывала яшчэ пэўны час. Бо частка балцкага насельніцтва – не ў карэнных Жамайціі і Аўкштайціі, а ў самым крыўскім асяродку (у наваколлі в. Дзераўная цяперашняга Стаўпецкага р-на, в. Абольцы на Талачыншчыне, на Лагойшчыне і ў іншых месцах) – яшчэ доўга захоўвала сваю адметнасць, пакуль – і тут чыннік каталіцызацыі ўжо не можа быць недаацэнены, бо тут былі збудаваныя адны з першых касцёлаў – не збеларусізавалася або спалячылася канчаткова. Падчас «другой рэлігійнай рэвалюцыі», распачатай Ягайлам, значная колькасць яшчэ не хрышчанага насельніцтва была абернута ў каталіцтва, сталася «пятай калонай» паланізацыі – і не толькі на захадзе Беларусі, але і на «праваслаўным» усходзе (у Воршы, Магілёве, Гомелі і інш.). Зрэшты, сярод заснаваных вялікімі князямі бажніц на тэрыторыі Віленскага біскупства ў значнай частцы яшчэ ў XVI ст. (паводле дакументаў 1501 г.) служылі ксяндзы, што ведалі літоўскую мову, а менавіта на тэрыторыі Беларусі: Васілішкі, Ліда, Валожын, Маладэчна, Красны (Чырвоны?) Двор, Радашкавічы, Беліца, Моўчадзь, Слонім, Койданава[39].

Так што ўсё было не так проста і адназначна. Заўважым, што менавіта ў асадах нашай канцэпцыі праблема беларускага глотагенезу была сфармулявана такім чынам, каб сканцэнтраваць даследаванне на вывучэнне механізмаў і асаблівасцяў працякання інтэрферэнцыйных працэсаў у кожным канкрэтным выпадку міжмоўнага (у нашым выпадку балта-славянскага) узаемадзеяння з максімальна магчымым прасторавым і часавым рэзальвацыяй. Паралельна гэтаму яшчэ напачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя на паседжаннях семінару ў Цэнтры этнакасмалогіі «Крыўя» і праведзеных у той час дзвюх канферэнцыях была акрэслена і праблематыка гістарычнай дэмаграфіі. Ні ў балта-славянскай тэорыі Сядова, ні ў славянскіх тэорыях паходжання беларусаў на неабходнасці такога кшталту даследаванняў акцэнты ніколі не рабіліся, між іншым, справа тут была не толькі ў ідэалогіі, а перш

[39] Вусцінавічус А. Этнічная гісторыя Літвы. Вільнюс, 2005. С. 139.

спецыфіцы тых самых «здаровых розумаў», рацыяналізацыяй якіх сталіся адпаведныя канцэпцыі. Ясная рэч, што Беларусі ва абыдзённаму розуму (*sensus communis*) такая «гістарычная крыміналістыка» ані не патрэбная.

Што да кірунку моўнай славянізацыі «горад» – «вясковая акруга», то за гэта могуць сведчыць дадзеныя і 10 тамоў «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы»[40], і ўнікальны на сёння «Словарь балтизмов в славянских языках» Ю.А. Лаўчутэ[41]. А яны, між іншым, сведчаць за тое, што бальшыня беларускіх балтызмаў – гэта словы, што азначаюць рэаліі сельскагаспадарчага жыцця, навакольнае асяроддзе або датычаць сферы міжасабовых адносін (т. зв. пеяратыўная лексіка). За часы ВКЛ з'явілася пэўная колькасць і культурных тэрмінаў, такіх як *дзякла, дойлід* і інш. Нямала балтызмаў выяўляецца і ў помніках старабеларускай і старапольскай пісьмовасці[42].

Пры жаданні сп. Пацюпы ці каго-колечы яшчэ мы гатовыя працягнуць дыскусію і ў лінгвістычным кірунку.

Балазе ў Цэнтры этнакасмалогіі «Крыўя» ўжо распачатая праца па стварэнні як мага поўнага «Слоўніка беларускіх балтызмаў» і анатаванага бібліяграфічнага паказальніка «Балтыка Беларусі». Калі судзяць багі і гэтая праца будзе даведзена да публікавання, можа быць, наш шаноўны апанент, сп. Ю. Пацюпа зменіць сваю «прыродную ўстаноўку» на крыху больш крытычную. А гэта і будзе яго ўласным чынам дэсімулякрызацыі. Постмадэрнізм, без сумневу, для многіх яшчэ будзе – і доўга – утульнай «калыскай», але камусьці калісьці ўсё ж трэба зрабіць першы крок у самастойнае дарослае жыццё, з усёй яго негарантаванасцю, але неўніковай адказнасцю.

Сп. Пацюпа, напэўна, хоча немагчымага: быць свядомым беларускім нацыяналістам, але жыць у постмадэрнісцкай, постнацыяналістычнай, дэцэнтралізаванай глабалізацыяй «правінцыі»[43].

Можа, лепей пахадзіць па *зямлі*, каб адчуць усю ману віртуальных тэрыторыяў – воласцяў сваёй віртуальнай жа

Літвы і Беларусі ва Ўкмяргe (Вілкмярге), Нямянчыне, Майшагале, Вільні, Медніках, Крэве, Айне, Абольцах – 1387 г., а таксама ў Мяркіне, яшчэ ў Вільні, у Ашмяне, Быстрыцы – 1388–1392 гг. Вітаўт заклаў касцёлы і кляштары ў яшчэ многіх мясцінах Літвы і Беларусі – ад Меднікаў (у Жамайціі) да Наваградка, Горадні, Браслава і Берасця (Тамсама. с. 137, 147).

[40] Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. I–X. – Мінск, 1978– 005.

[41] Лаучюте Ю. Словарь балтизмов в славянских языках. – Ленинград, 1982.

[42] Яны даследаванні ў гэтай галіне: Jabłoński K. Litewski żywioł w gwarach ludowych powiatu sejneńskiego. Kraków, 1911; Ułaszyn W. Z zakresu litewskich wpływów w gwarach ludowych powiatu sejneńskiego // Rocznik Komisji Językowej. Lwów, 1934. T. 10. Словарь балтизмов в славянских языках… С. 95—96.

[43] «А вяртаючыся да правінцыйнасці, мушу ўрэшце прызнацца, што з таго часу, як я стаў больш думаць пра, як казаў Ян Станкевіч, «нашыя заданні» і пісаць менавіта пра іх, а рупіцца толькі пра беларускага чытача (бо француз найперш дбае пра прачытанне для адэкватнасці разумення напісанага. Праўда, «пісаць» і «чытаць» – могуць таксама быць рэчамі рызыкоўнымі, бо пісаць можна й крывёю, а чытаць з уласнае памяці. Як у Ніцшэ: «Хто піша крывёю, той хоча, каб яго не чыталі, а вывучвалі на памяць» («Так сказаў Заратустра»).

P. S. Калі ў тэксце даюцца спасылкі, то гэта не дзеля таго, каб дэманстраваць эрудыцыю, а дзеля таго, каб гэтыя крыніцы былі (але не аднастайнай!) вялікай правінцыяй… Зразумейце мяне па-добраму, шаноўныя прысяжныя… Шчыра прабачаюся!

Дзіцятка ж маё – постмадэрнізм кляты, – хоць і гадкае, збрыдлае для бацькі, але ж свая крывіначка, родная… А калі кожны яе будзе крыўдзіць, казаць, дзей беларускага постмадэрнізму наагул не існуе, дык узнікае пытанне: што ж мы рабілі пятнаццаць гадоў таму?» (Пацюпа Ю. Постмадэрнізм, калыска мая // ARCHE. 2004. № 3).

[image]

[image]

№ 3 (43) - 2006

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/06/04

[image]

Мінулыя (1’2000)

[image]
ARCHE Пачатак № 3 (43) - 2006
[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]
[image]2006
[image]
[image]
[image]

«нацыянальнага праекту»? Як мне здаецца, выкарыстаньне самой «праграмы аб'яднаньня» як нашага калектыўнага патэнцыялу тутэйшасьці. А праграму гэтую, як вы ведаеце не па чутках, а з «вуснаў» цытаваных вамі Сьміта і Тэйлара, Фуко і Габэрмаса, можна зразумець і задаць зусім па-рознаму.

Калі паспрабаваць рэканструяваць вэрсію гэтай праграмы Рудкоўскага, то гэта вэрсія вольнага і крытычнага індывідуальнага і калектыўнага самавызначэньня Тут і Цяпер, у сувязі з тутэйшай культурай і гісторыяй. Праўда, у сувязі з гэтым да Пётры ў мяне пытаньне: чаму скіраванасьць на тутэйшы кантэкст абавязкова значыць маральную сьпеласьць? І яшчэ такое пытаньне: чаму мова апрыёры ёсьць маральнай вартасьцю? Інакш кажучы, як з гэтых вартасьцяў вынікаюць вартасьці асобы, чалавечай годнасьці і неабходнасьці павагі да другой годнасьці, якія, уласна кажучы, і робяць магчымым дыскурс правоў чалавека?

На мой погляд, скіраванасьць на тутэйшасьць МОЖА ўтрымліваць маральны складнік, калі робіць яго сваёй МЭТАЙ. Тое самае можна сказаць і пра нацыянальную праграму аб'яднаньня: яна ня ёсьць апрыёры «добрай» (дэмакратычнай) або «злой» (таталітарнай), такой яе робяць ейныя канкрэтызацыі. У такім разе, каб скіраванасьць на тутэйшасьць набыла маральную афарбоўку, яна мусіць зрабіць тэму годнасьці чалавека сваёй цэнтральнай тэмай. Тэйлар, калі спаслацца тут на аўтарытэт, бачыць у якасьці такой найважнейшай тэмы нацыянальнага дыскурсу тэму лібэральнай дэмакратыі. Інакш кажучы, як мне здаецца, мала гаварыць, што такі складнік утрымліваецца ў такой і такой вэрсіі нацыянальнага праекту, а трэба зрабіць гэты складнік тэмай для абмеркаваньня і сьцьверджаньня. (Не адмаўляючы, вядома ж, іншых тэмаў.) Гэта як у сытуацыі пераасэнсаваньня Фуко праграмы Асьветніцтва Канта: Фуко пераводзіць праграму самакрытычнай рэалізацыі Асьветніцтва ў рэгістар ЗАДАЧ, адзначаючы пры гэтым, што адсюль вынікае неабходнасьць аналізу перадумоваў і варункаў магчымасьці такую задачу ставіць і вырашаць. Вось тут мы і бачым адваротны бок разгляду годнасьці чалавека ў якасьці тэмы нацыянальнага дыскурсу. Гэты разгляд магчымы акурат УНУТРЫ гэтага

дыскурсу, а не абстрагуючыся ад яго. Гэта значыць, як нацыянальны праект можа і мусіць працаваць сёньня ў Беларусі на вартасьць чалавечай годнасьці і на грамадзтва, здольнае гэтую годнасьць абараняць, так і вартасьць чалавечай годнасьці і адпаведнае ёй грамадзтва можа і мусіць абапірацца на нацыянальны праект як на культурна-гістарычны кантэкст свайго спараджэньня, нават калі працэс спараджэньня будзе трансцэндаваць гэты кантэкст. А трансцэндаваньне гэтае непазьбежнае, і гэтага не адмаўляе ні Рудкоўскі, ні вы, бо ўсякая ідэнтычнасьць канструюецца ва ўзаемадзеяньні зь іншымі ідэнтычнасьцямі.

У сувязі са сказаным пярэчаньне ў мяне выклікае патас вашага канструктывізму. Я ніяк не магу зразумець, ці вы гаворыце пра Беларусь? «Неабходна дыстанцыявацца ад сваёй культуры, адмовіцца ад зьместу нацыянальнага наратыву (як наратыву пра нашу супольную мінуўшчыну) і г. д.». У мяне такое пытаньне: а ці мы ведаем, што такое беларуская культура? Ці дастаткова ў нас ведаў пра нашу мінуўшчыну? Скажу толькі са свайго досьведу: не! І першы крок, які хочацца зрабіць і які я пачала рабіць, – разабрацца з нашай гісторыяй і культурай, як і з сучаснымі формамі беларускай штодзённасьці і беларускімі формамі веды. То бок ваш крок як бы другі або абавязкова мае на ўвазе першы, які і робіць Пётра! Зразумела, і ў гэтым Пётру можна закінуць, што нацыянальны дыскурс не ахоплівае «ўсёй» Беларусі, г. зн. зьяўляецца толькі адной з праграмаў яе аб'яднаньня. Але хіба гэта праграме не неабходна? Хіба мы не жывём, паводле словаў Акудовіча, у архіпэлягу?

Як піша Тэйлар, калі ў грамадзтве ня будзе існаваць праграмаў аб'яднаньня, адчуваньня прыналежнасьці да калектыўных ідэнтычнасьцяў, то і да дэмакратыі і грамадзянскай ідэнтычнасьці справа ня дойдзе, бо людзі не захочуць абмяркоўваць адзін з адным справаў полісу. Яны таемна будуць адзін аднаго ненавідзець і адкрыта адзін аднаму не давяраць. У гэтым сэнсе нетыранічным грамадзтвам патрэбная значна большая салідарнасьць, чым грамадзтву тыранічнаму. Наратыў пра супольную гісторыю і культуру, інакш кажучы, нацыянальны праект, цалкам можа адыгрываць ролю такога кантэксту абмеркаваньня. Рудкоўскі, як мне здаецца, настойвае

на нацыянальным праекце акурат у такім сэнсе: у сэнсе праграмы ўключэньня, а не выключэньня. Хоць, як вы ведаеце, выключэньне непазьбежнае, бо людзі ўсё ж занадта розныя, каб сфармаваць нейкую адну калектыўную ідэнтычнасьць. Пытаньне тады палягае ў сувымернасьці першага і другога.

Аднак, вядома ж, трэба мець на ўвазе, што ёсьць у Беларусі і іншыя нацыянальныя праекты, напрыклад, праект Пазьняка, які выклікае ў людзей адпрэчваньне і страх. З трэцяга боку, многія ўвогуле ня зьвязваюць сябе з нацыянальным праектам, бо часьцей за ўсё нічога пра яго ня ведаюць (і ўсё яшчэ жывуць у СССР або ў Расеі). То бок, Беларусі патрэбная, перш за ўсё, тэматызацыя, словамі Сяргея Панькоўскага, – ператварэньне яе ў «дасьледчую праблему», дасьледчую праблему для кожнага. Думаю, такая тэматызацыя не пазбавіць нас ні ад звароту да гісторыі і культуры, ні ад звароту да грамадзянскай ідэнтычнасьці. Пры гэтым мне чамусьці здаецца, што першае цалкам можа працаваць на другое, пры ўмове, што другое будзе працаваць на першае (як я пісала вышэй); і што беларускі нацыянальны праект у пэўнай яго вэрсіі, напрыклад Рудкоўскага, Булгакава, Акудовіча, Мацкевіча, дэманструе нам акурат такую працу. Хоць я, вядома ж, магу і памыляцца.

30.12.2005 18:20
Рыгор Мінянкоў

У аналізаваным сп. П. Рудкоўскім маім артыкуле я зазначыў, что напісаны намі тэкст пачынае жыць сам. І значэньне мае ня столькі тое, што мы мелі на ўвазе, калі яго пісалі, колькі тое, як яго прачытаюць і зразумеюць. Гэта я адношу і да свайго тэксту. Праўда, сп. Рудкоўскі чамусьці вырашыў, што я забараніў яму ўдакладняць сваю пазыцыю. Думаю, што гэтае яго выказваньне ёсьць толькі рытарычнай фігурай, якіх, дарэчы, досыць багата ў яго адказе.

Крытычны аналіз сп. Рудкоўскім майго артыкулу мне ўвогуле спадабаўся. З аднаго боку, ён удакладніў сваю пазыцыю, некалькі размытую ў яго зыходным артыкуле, з другога, зрабіў шэраг вельмі слушных заўваг, асабліва што тычыцца лёгікі маіх разважаньняў і дакладнасьці ўжываньня паняткаў. Згодны

таксама, што ў некаторых месцах я выказаўся залішне рэзка, чым мог пакрыўдзіць сп. Рудкоўскага. Калі гэта так, прыношу свае прабачэньні. Праўда, у сваёй крытыцы мой апанэнт засяродзіўся ў асноўным на тэмах, якія ня мелі асаблівага значэньня для маіх разваг, напрыклад, тая ж роля мэтафараў, ацэнка Асьветніцтва ці ўзровень аналізу беларускімі аўтарамі розных відаў ідэнтычнасьці. Усё гэта – пытаньні спэцыяльнай размовы, і я ня буду яе зараз распачынаць. (Хіба толькі адзначу, што, хоць я і не спэцыяліст у гендэрнай праблематыцы, усё ж думаю, што гендэрны аналіз – гэта не зусім пра кабет, а можа, нават зусім не пра кабет.) Мяне больш цікавіць канцэптуальны бок праблемы. Але менавіта гэты момант сп. Рудкоўскі цалкам абышоў пры разглядзе майго артыкулу. Мусіць, гэта і ёсьць тыя 75 % паўтору сказанага апанэнтам, толькі іншымі словамі. Можа й так, але ёсьць у мяне некаторыя сумневы ў гэтым.

Асноўным для нашай дыскусіі са сп. Рудкоўскім, мне падаецца, ёсьць пункт чацьверты яго адказу. Тут я павінен пагадзіцца, што не зусім дакладна зразумеў пазыцыю сп. Рудкоўскага адносна яго інтэрпрэтацыі сутнасьці нацыяналізму. Але прычыны гэтага я бачу ў самім яго тэксьце. Прызнаюся, што я некалькі разоў перачытаў артыкул Рудкоўскага, каб зразумець, як ён ставіцца да выкладзенай ім характарыстыкі нацыяналізму. Я добра бачыў, што ён спрабуе ўнесьці нейкія папраўкі сваім зваротам да лібэральнага нацыяналізму. Але я нідзе не знайшоў адназначнага адказу: прызнае ці абвяргае аўтар дадзенае ім апісаньне нацыяналізму. Дарэчы, ня толькі ў гэтым месцы свайго артыкулу аўтар пазьбягае даваць прамыя адказы. Але пагадзіцеся: калі аўтар ня кажа «не», то лягічна думаць, што ён кажа «так». Я і прыйшоў да такой высновы. У сваім адказе на мой артыкул сп. Рудкоўскі выказваецца намнога больш канкрэтна, спасылаючыся пры гэтым на В. Булгакава. Я ведаю пазыцыю апошняга і лічу яе прымальнай. Але ў самім артыкуле спасылкі на Булгакава не было. Здольнасьцямі ж да тэлепатыі я, на жаль, не валодаю. Каб усё ж такі больш-менш зразумець пазыцыю Рудкоўскага, я зьвярнуўся да лёгікі яго артыкулу. Так, аўтар гаворыць аб магчымасьці ненацыяналістычных канцэпцыяў грамадзтва, праўда, са шматлікімі агаворкамі, якія зноў жа не дазваляюць зразумець

яго сапраўдную пазыцыю. А потым у яго зьяўляюцца – ды яшчэ ў кампаніі з арганіцызмам – «нацыябудаўніцтва» і «народ». Прычым тут Рудкоўскі якраз вельмі ясна выказвае свае погляды. І менавіта гэта прывяло мяне да высновы, что аўтар зусім ня ставіцца адмоўна да апісанай ім мадэлі нацыяналізму. Якраз зь яе вынікаюць і «нацыябудаўніцтва», і «народ» у інтэрпрэтацыі Рудкоўскага. І справу тут ніяк не папраўляюць лібэральныя засьцярогі. Аднак, з улікам няяснасьці пазыцыі аўтара, я і выкарыстоўваў у сваім тэксьце безасабовыя звароты тыпу «што ж мне прапануюць», а не «што мне прапануе Рудкоўскі». Дарэчы, я вельмі добра ведаю, што нацыяналізм ня ёсьць «гамагеннай зьявай зь нераходнай сутнасьцю». Але я вёў гаворку выключна пра той нацыяналізм, пра які выказаўся Рудкоўскі.

Колькі словаў пра «нацыябудаўніцтва». Тэарэтычна – гэта прыгожая канцэпцыя. Рудкоўскі гаворыць, што ў карысьці гэтай канцэпцыі яго пераконваюць факты. Не прызнаваць гэтай ідэі мяне таксама пераконваюць факты: трагедыі дзьвюх сусьветных войнаў, этнічныя чысткі, генацыд, крывавыя войны ў краінах «трэцяга сьвету», распад Югаславіі і да т. п. За ўсім гэтым, прабачце, стаяла менавіта «нацыябудаўніцтва». З гэтай жа прычыны мне не здаецца пераканаўчай ідэя «лібэралізму, які выключае нацыяналізм, але ўключае нацыянальнае пачуцьцё». Пачуцьці, як вядома, справа вельмі няпростая. Ну, не падабаюцца камусьці, напрыклад, «рыжыя», «чорныя», «шэра-бура-малінавыя» і г. д. Выгнаць іх з краіны як мага хутчэй. Праяваў такіх пачуцьцяў мы бачым зашмат, прычым і ў самых прасунутых краінах. А тое, што пасьля таго, як выганяць, вуліцы ператворацца ў сьметнікі, неяк ня ўлічваецца. Па мне дык лепш «рацыянальны нацыяналізм», чым «нацыянальныя пачуцьці». Як я разумею, сп. Рудкоўскі прапануе этычную канцэпцыю нацыянальных адносінаў. Але этыка, калі не памыляюся, абапіраецца не на пачуцьці, гэта вельмі рацыянальная рэч. Дый з тым самім лібэралізмам ня ўсё так проста. Таму я і прапанаваў зьвярнуцца да канцэпцыяў радыкальнай дэмакратыі.

Вельмі коратка пра іншыя крытычныя заўвагі сп. Рудкоўскага. Мой апанэнт абвінавачвае мяне ў эсэнцыялізьме паводле

прынцыпу «сам такі». Магу толькі сказаць, што якраз гэтае абвінавачаньне гаворыць пра тое, што ён цалкам абышоў канцэптуальную аснову майго артыкулу, менавіта, развагі аб універсалізьме і партыкулярызьме, дзе я абапіраюся на ідэі Э. Лакло. Я ня буду паўтараць напісанага мной і як адсюль мы выходзім да грамадзянскай ідэнтычнасьці. Дарэчы, тут фактычна я выкарыстоўваю той самы мэтадалягічны наміналізм, пра які гаворыць Рудкоўскі. Мабыць, гэта тыя самыя 75 %.

Пра касмапалітызм. Заўвагі Рудкоўскага, што я не прызнаю дыфэрэнцыяванага падыходу да касмапалітызму, я ня буду камэнтаваць, бо спадзяюся, што хутка скончу вялікі артыкул, дзе якраз і пішу пра гэты падыход і паказваю, што касмапалітызмаў значна больш, чым два. Але не магу не падкрэсьліць, што тут, як і ў справе з нацыяналізмам, зноў выявіўся своеасаблівы мэтад сп. Рудкоўскага. Толькі зь яго крытычнай нататкі я даведаўся, што ён, як высьвятляецца, прызнае «стаіцкі» касмапалітызм, а крытыкуе толькі «глябалістычны» (?). Таму ў сваім артыкуле ён першага касмапалітызму і не крытыкаваў, а – як трэба разумець – прызнаваў. Цікавы мэтад выказваньня сваёй пазыцыі. Застаецца зьвярнуць увагу на тое, што і апісаньня нацыяналізму, якое ён даў у сваім артыкуле, Рудкоўскі таксама фактычна не крытыкаваў.

І апошняе. Усё, пра што я пісаў дагэтуль, ёсьць прадметам дыскусіяў, абмеркаваньняў, удакладненьняў. У канцы ж сваёй крытычнай нататкі сп. Рудкоўскі не стрымаўся і перайшоў «на асобы». Я таксама лічу, што «мысьленьне ў катэгорыях «адсталае» – «прагрэсіўнае» даўно згубіла значэньне». Гадоў дзесяць таму я нават спэцыяльна пісаў пра гэта. Але ў маім артыкуле такое мысьленьне адсутнічае як такое. Я пісаў пра некаторыя ідэі як адсталыя, але, мабыць, трохі завостра, за што прашу прабачэньня. Сапраўды, я лічу, што асобныя падыходы сп. Рудкоўскага не адпавядаюць сучасным падыходам. І ў гэтым няма ніякага патэрналізму, які недзе знайшоў у мяне сп. Рудкоўскі. Але пры гэтым я ясна выказваў сваю пазыцыю. Можа, гэта мой апанэнт і прыняў за патэрналізм?

*02.01.2006 12:29**
Вольга Шпарага

І ўсё ж. Ці ёсьць грамадзянская ідэнтычнасьць адзінай і дастатковай умовай для разьвязаньня надзённых, як я разумею, перадусім палітычных праблемаў Беларусі? Бо гэта ж цэнтральны момант абмеркаваньня, ці я няправільна зразумела? Калі адказаць на пытаньне дадатна, то ці не грамадзянскую ідэнтычнасьць фармуе сёньня дзяржыдэалёгія і дзяржпрапаганда? Акурат у гэтай сувязі, у сувязі з фармальнасьцю гэтага панятку, ягоную цэнтральнасьць адмаўляе, да прыкладу, досыць аўтарытэтны палітычны філёзаф Леа Штраўс. Па сутнасьці, такія меркаваньні датычаць і грамадзянскай супольнасьці, тут да Штраўса далучаецца і Тэйлар (яны даюць некалькі яе вызначэньняў і выбіраюць тое, зь якім варта працаваць). г. зн. неабходна ўвядзеньне зьмястоўных момантаў, якія б, акрамя канкрэтызацыі панятку, яшчэ й дазволілі сфармуляваць яго прывязку да Беларусі. Прычым акурат зьмястоўныя моманты, бо ўсякі панятак – дэмакратыя, рынак, правы чалавека – у нас ужо фармальна ўжываецца акурат дзякуючы таму, што зьмест яго мала хто ведае, і ўлада на гэтым гуляе. З нацыянальнай ідэяй адбываецца, як падаецца, нешта прыблізна такое: пераважае пэўнае разуменьне, і мы ніяк ня можам выйсьці за ягоныя межы. Можа, выпрацуем прымальнае супольнае для нас вызначэньне найважнейшых паняткаў? Тады й непаразуменьняў ды крыўдаў ня будзе (і артыкул Мінянкова, і адказ яму Рудкоўскага ў «ARCHE» падаліся мне вельмі горкімі і поўнымі крыўды). Акрамя таго, мне вельмі хацелася б правесьці круглы стол на тэму «Нацыянальная ідэя і варыянты будучыні Беларусі» (або нешта накшталт таго) з удзелам Булгакава, Мінянкова, Рудкоўскага, Адамянца, Палескага, карацей кажучы, з удзельнікамі абмеркаваньня. Што думаеце?

03.01.2006 15:14
Пётра Рудкоўскі

Дзякую спадарству за водгукі і за ўвагу да маіх тэкстаў.

З прыемнасьцю магу адзначыць, што з гэтай нагоды я

пераканаўся ў трох рэчах:

– пацьвярджаецца тое, што нашыя погляды (маю на ўвеце перадусім мае і спадара Мінянкова) сапраўды ў значнай ступені ўзаемадапаўняльныя;

– існуе добрая воля да ўзаемапаразуменьня, аб'яднаньня дзьвюх філязафічных моваў (так, мне здаецца, што мы размаўляем на розных філязафічных мовах, чаму так думаю, пасьля паспрабую растлумачыць);

– наша палеміка дала мне магчымасьць усьвядоміць стылістычную неаднароднасьць майго тэксту («Нацыянальны дыскурс...»), што сталася аб'ектыўнай прычынай непаразуменьняў.

Што тычыцца трэцяга пункту, дык хацеў бы зазначыць, што я, пішучы згаданы тэкст, ніяк не плянаваў яго як «Пасьляслоўе». «Пасьляслоўе» асацыюецца з «апошнім словам», «канчатковым падагульненьнем», а мой тэкст меў іншы характар. Калі выказацца вельмі асабіста, дык я сказаў бы, што, пішучы «Нацыянальны дыскурс», я заставаўся «студэнтам-шукальнікам», або лепш «студэнтам-пытальнікам». Мне хацелася: 1) перш за ўсё прапанаваць новую (прынамсі, мне здаецца, што новую) выясьняльную мадэль нацыябудаўніцтва; 2)абараніць лібэралізм; 3) зрабіць зарыс этычнай канцэпцыі суіснаваньня расейска- і беларускамоўных.

Пры ўсім гэтым маёй галоўнай ідэяй было «адкрыць» каналы ўзаемапаразуменьня паміж беларускамоўнымі і расейскамоўнымі, бо мяне ўжо доўгі час турбуе тое, што шмат станоўчай энэргіі марнуецца ў зьвязку з «грызьнёй» паміж гэтымі дзьвюма моўна-культурнымі опцыямі. І я вельмі рады, што гэты мэсыдж заўважаны і ацэнены як сп. Мінянковым, так і спн. Шпарагай.

Цяпер паспрабую пракамэнтаваць больш праблемныя пункты.

1. Насамперш адносна камэнтара спадарыні Вольгі: «і артыкул Мінянкова, і адказ яму Рудкоўскага ў «ARCHE» падаліся мне вельмі горкімі і поўнымі крыўды».

Як па мне, дык наша са сп. Мінянковым «перастрэлка» цалкам зьмяшчаецца ў рамках тэрміну «ПОЛЕМІКЕ» ў крынічным сэнсе гэтага слова. Наяўнасьць словаў і фразаў з эмацыйна-экспрэсіўнай афарбоўкай ня сьведчыць яшчэ, што гэты дыскурс трэба лічыць «горкім» і «поўным крыўды», быццам апрача эмоцый там нічога больш не было.

Далейшыя мае рэплікі будуць адносіцца да выказваньня сп. Мінянкова:

2. «У аналізаваным сп. П. Рудкоўскім маім артыкуле я зазначыў, что напісаны намі тэкст пачынае жыць сам. І значэньне мае ня столькі тое, што мы мелі на ўвазе, калі яго пісалі, колькі тое, як яго прачытаюць і зразумеюць».

Задаю сабе пытаньне, ці не надзяляеце вы, спадару Рыгор, «ідэю» празьмернай аўтаноміяй? Вы так моцна падкрэсьліваеце працэс «аліенацыі ідэі» (калі можна гэтак назваць вашу пазыцыю), што ў будучым я хіба буду баяцца выказаць якую-кольвек ідэю: а раптам яна пачне жыць па-свойму, ня так, як я захацеў?.. Насамрэч «ідэі» – гэта ўсяго толькі інтэнцыянальныя быцьці, яны цалкам залежныя ад актаў сьвядомасьці чалавека – ці то «стваральніка», ці то «ўспрымальніка», ці то «прапагатара» гэтай ідэі.

3. «Але я нідзе не знайшоў адназначнага адказу: прызнае ці абвяргае аўтар дадзенае ім апісаньне нацыяналізму. Дарэчы, ня толькі ў гэтым месцы свайго артыкулу аўтар пазьбягае даваць прамыя адказы. Але пагадзіцеся: калі аўтар ня кажа «не», то лягічна думаць, што ён кажа «так».

З часоў сярэднявечча ў лёгіцы пануе прынцып: ex potentia ad essentiam non valet consequentia – «ад магчымага да рэальнага няма лягічнага пераходу», і, здаецца, ніхто яшчэ не аспрэчыў гэтага прынцыпу. Стасуючы яго да разумаваньня сп. Мінянкова: «калі аўтар ня кажа «не», то з гэтага вынікае адно толькі, што «МАГЧЫМА, ШТО «ТАК», але з магчымага не вынікае рэчаіснае.

Гэта ўсяго толькі лягічна-мэтадалягічная заўвага, але тут трэба, бясспрэчна, удакладніць сёе-тое і наконт мэрытум справы.

А) Калі я здолеў паказаць праблематычнасьць мар’яжу лібэралізм + нацыяналізм, дык на гэтым магу супакоіцца. Я не лічу, што трэба падводзіць дэфінітыўную рысу пад спробамі такога мар’яжу. Няхай добрыя людзі шукаюць, калі хочуць, спосабаў ажаніць адно і другое, абы яны толькі ўсур’ёз успрынялі складанасьць такое задумы, а канкрэтна: неабходнасьць фундамэнтальнай рэдэфініцыі «нацыяналізму». Магчыма, сп. Мінянкоў лічыць, што трэба раз і назаўсёды забараніць дыскусію наконт магчымасьці злучыць нацыяналізм і лібэралізм, г. зн. сказаць рашучае НЕ такому саюзу. На гэта ён мае поўнае права. Але я, у сваю чаргу, маю права абмежавацца адно толькі «памяркоўным скептыцызмам» адносна такога тыпу мар’яжу, магчыма, у будучыні мой скептыцызм будзе ўзмацняцца або слабець у залежнасьці ад таго, ці формула нацыяналізм + лібэралізм будзе больш пераканаўчай або менш пераканаўчай. Я – у адрозьненьне ад Р. Мінянкова – папросту горш ведаю, «куды ісьці», жадаю застацца адкрытым да магчымых будучых прапановаў з боку лібэральных нацыяналістаў.

Б) Пішучы пра стасункі паміж нацыяналізмам і лібэралізмам, я заставаўся – прызнаюся – пад уплывам лібэрала Стывэна Голмза, паводле якога лібэралізм ня ёсьць ex definitione ворагам нацыяналізму, лібэралізм жадае адно толькі дэмілітарызаваць яго, пазбавіць агрэсіўнае формы.

В) Што тычыцца дэмілітарызацыі і пазбаўленьня нацыяналізму агрэсіўнае формы, то дазволю зьвярнуць вашую ўвагу на разьдзел «Прывід нацыяналізму», а таксама «Амбівалентны Дух Абсалютны» з артыкулу «Пагоня за духамі ды ідэямі», дзе я бескампрамісна крытыкую ўсякія нацыяналізмы, у якіх заўважны якія-кольвек аўтарытарныя-таталітарныя імплікацыі. Магу запэўніць, што я буду першы, хто падтрымае бунт сп. Мінянкова супраць Вялікае Маткі, Вялікага Брата ці чаго-кольвек іншага Вялікага, калі Яно, гэтае Вялікае, будзе пагражаць чалавечай свабодзе!

4. «У сваім адказе на мой артыкул сп. Рудкоўскі выказваецца намнога больш канкрэтна, спасылаючыся пры гэтым на В. Булгакава. Я ведаю пазыцыю апошняга і лічу яе прымальнай.

Але ў самім артыкуле спасылкі на Булгакава не было. Здольнасьцямі ж да тэлепатыі я, на жаль, не валодаю».

Філёзаф павінен валодаць самымі рознымі здольнасьцямі, у тым ліку і тэлепатычнымі! У мяне не было спасылак шмат на што, між іншым, таксама і на свой уласны артыкул «Панская Польшча і бяспанская Беларусь», дзе адзін з загалоўкаў быў: «Народ – прыродная стыхія ці мастацкі твор?».

Я ўсё ж такі ня бачу вялікай праблемы ў тым, што ня даў спасылак на згаданыя творы. Застаючыся ў межах «Нацыянальнага дыскурсу», ня цяжка – я ў гэтым перакананы – было заўважыць, што прапанаваная мною гермэнэўтыка народу мае на мэце паказаць якраз УМОЎНАСЬЦЬ, КАНВЭНЦЫЙНАСЬЦЬ, гм, можна сказаць, НЕСАПРАЎДНАСЬЦЬ ды ІЛЮЗІЙНАСЬЦЬ народу як такога. А гэта якраз тое, чаму аберуч будуць працівіцца артадаксальныя нацыяналісты-натуралісты, якія вераць у народ як самабытную Субстанцыю. Адначасна ж гэтая ЎМОЎНАСЬЦЬ не перашкаджае нам добраахвотна аб'ядноўвацца паміж сабой на базе СЬВЯДОМАГА ЎЗАЕМАПАРАЗУМЕНЬНЯ.

У артыкуле «Панская Польшча...» я пасунуўся нават да таго, што сказаў: «няма насамрэч чагосьці такога, як народ ці нацыя, рэальна існуюць толькі людзі, якія акрэсьліваюць сябе паводле той і іншай нацыянальнай прыналежнасьці». Называньне народу/нацыі «адкрытым мастацкім творам» мае далёкасяжныя de facto АНТЫНАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫЯ імплікацыі!

5. «Тэарэтычна гэта прыгожая канцэпцыя. Рудкоўскі гаворыць, што на карысьць гэтай канцэпцыі яго пераконваюць факты. Не прызнаваць гэтай ідэі мяне таксама пераконваюць факты: трагедыі дзьвюх сусьветных войнаў, этнічныя чысткі, генацыд, крывавыя войны ў краінах «трэцяга сьвету», распад Югаславіі і да т. п. За ўсім гэтым, прабачце, стаяла менавіта «нацыябудаўніцтва».

Ну, такое разумаваньне мне падаецца – кажучы далікатна – ня вельмі субтэльным. Агрэсіўны нацыяналізм як палітычная практыка і нацыябудаўніцтва як філязафічная тэорыя – гэта зусім розныя рэчы, і ня трэба іх зьмешваць. Ёсьць іншыя

прыклады такога тыпу зьмешваньня: некаторыя даказваюць наяўнасьць наўпростае сувязі паміж рацыяналізмам Асьветніцтва і крывавым тэрорам Францускай рэвалюцыі, паміж філязофіяй Дэкарта і таталітарызмамі ХХ ст. (славуты «лёгацэнтрычны крымінал»), але дазвольце, каб я папросту выказаў сваю алергію да такога тыпу разумаваньняў і нават гэтага не абгрунтоўваў.

Калі былі факты, што людзі забіваліся й рэзаліся ў імя «братэрства», «роўнасьці» і «свабоды», то гэта яшчэ ня значыць, што нам трэба раз і назаўсёды адмовіцца ад асэнсоўваньня гэтых ідэалаў (братэрства, роўнасьці і свабоды). Дакладна і тут: калі лілася кроў у імя «нацыябудаўніцтва», то трэба яшчэ разабрацца, ці вінаватая была (асэнсаваная) ідэя, ці наадварот: адсутнасьць рацыянальнага асэнсаваньня гэтай ідэі. Адмаўляючыся ад тэарэтычнага асэнсаваньня нацыянальнай ідэі, мы папросту «здаём» яе агрэсіўным нацыяналістам, якія зробяць зь ёю, што захочуць. Ідэю значна цяжэй зрабіць інструмэнтам нізкіх дэструктыўных інстынктаў, калі гэтая ідэя інтэлектуальна асвоена.

6. «Я пісаў пра некаторыя ідэі як пра адсталыя, але, мабыць, крыху завостра, за што прашу прабачэньня».

Па-першае: няпраўда, было выказана ў асабістай форме: «На жаль, аўтар безнадзейна адстаў», а не ў безасабовай «ідэі… адсталыя».

Па-другое, прабачце, але вы зноў дапускаеце супярэчнасьць (аналягічна як і зь веданьнем/няведаньнем, куды ісьці): «Я таксама лічу, што «мысьленьне ў катэгорыях «адсталае» – «прагрэсіўнае» даўно згубіла значэньне» – гэта вашыя словы. Калі хтось прызнае, што існуе мноства М, элемэнтамі якога зьяўляюцца «адсталыя ідэі», то тым самым апэруе і мысьліць у катэгорыях «прагрэсіўнае–адсталае». Я бы ня бачыў у гэтым вялікай крамолы, бо часам і сам (напр. выказваючыся пра белыдэалёгію) ужываю гэтыя экспрэсанты, але ў выпадку сп. Мінянкова насьцярожыў мяне «аб’ектывізм» (бо няма суб’ектывізуючых фразаў тыпу «на маю думку»), ну і форма «ad personam».

Пры ўсім гэтым хачу шчыра запэўніць, што вельмі цаню заангажваньне сп. Мінянкова ў гэтую дыскусію і лічу гэтае заангажаваньне вельмі канструктыўным. Прызнаю таксама, што стылістычная неаднароднасьць майго артыкулу «Нацыянальны дыскурс...» магла стацца аб'ектыўным фактарам непаразуменьняў. Пад «неаднароднсьцю» разумею наяўнасьць лягічна-аналітычнае мовы, якая потым перайшла ў мову філязафічнай паэтыкі, а потым у этычны дыскурс. Я абавязкова вазьму да ўвагі ў будучыні прагматычную праблематычнасьць такой стратэгіі.

Іншая праблема – гэта моўная праблема. Я гадаваўся спачатку ў арыстотэлева-тамістычнай атмасфэры (Дамініканскі калегіюм), а цяпер у аналітычна-пазытывісцкай (лепш: постаналітычна-постпазытывісцкай). Гэта зусім розныя кірункі, але іх лучыць моцная ўстаноўка на эмпірычную рэфэрэнцыйнасьць. Мне цяжка ідэнтыфікаваць філязафічны стыль сп. Мінянкова (фэнамэналягічны?), але адчуваецца выразная адрознасьць пры ўсім гэтым дэкляратыўным акцэптаваньні «дыфэрэнцыяванага падыходу» і «мэтадалягічнага наміналізму». Ня ведаю, які з гэтых стыляў «лепшы», сыгналізую толькі адрознасьць.

*04.01.2006 10:26**
Вольга Шпарага

Пётра, вялікі дзякуй за камэнтар. Сапраўды, ён шмат што патлумачыў. Цікава ў сувязі з гэтым, наколькі трэба быць адчувальным да манеры пісьма; для мяне такога кшталту адчувальнасьць ёсьць адным з дадатных момантаў пераварота мэтраў.

Камэнтар пацьвердзіў маю вэрсію разуменьня вашага тэксту. Хоць і дазволіў крыху завастрыць уласную пазыцыю: на цяперашні момант мне ўсё ж бачыцца цікавым і магчымым знайсьці супольную мову для нацыяналізму і лібэралізму, сьледам за Тэйларам я выходжу з таго, што і першаму, і другому неабходны перагляд, бо ўмовы іх існаваньня сёньня зьмяніліся. Застацца ж у полі гэтых паняткаў прымушае мяне іх існаваньне, або значэннасьць (Geltung) у полі ня толькі

дыскусіяў, але і саміх жыцьцёвых сьветаў. Вядома, можна прыдумаць новае сучаснае абазначэньне «вялікай» калектыўнай ідэнтычнасьці, аднак панятак нацыі гэтак шматзначны сёньня (тут можна спаслацца хоць бы на Сьміта), што дазваляе працаваць зь ім недагматычна, пры гэтым з улікам яго дагматычных (небясьпечных) прачытаньняў.

І ўсё ж, Пётра, у мяне засталося да вас пытаньне, якое я ўжо зафіксавала ў камэнтары да тэксту Мінянкова. Якім чынам вы адшукваеце (дапускаеце) этычны і маральны складнік у нацыянальным праекце і, у прыватнасьці, у выбары мовы і адчувальнасьці да гісторыі і культуры?

Маюцца на ўвазе такія вашыя выказваньні:

1. «Беларуская мова, быўшы адным (але не адзіным) з народазлучальных сымбаляў, мае этычную каштоўнасьць».

Пытаньне: як аб'яднаньне народу зьвязана з этыкай? Ці можна лічыць гэтую сувязь апрыёрнай? Бо аб'ядноўвацца ж можна вельмі па-рознаму і для розных, далёка не этычных, мэтаў.

2. «На якой падставе Палескі прыпісаў «паталёгію нацыянальнага пачуцьця» «беларускамоўнай» эліце? Крытычных заўваг у бок апошняй, наяўных у тэксьце Палескага, малавата, каб на іх падставе дыягназаваць нейкую паталёгію. Ці «паэтызацыя пісьма за кошт «эмацыянальных» доказаў» у артыкуле А. Дынька ёсьць праявай «паталёгіі пачуцьця»? Альбо ўстаноўка на нацыянальную тоеснасьць і націск на культурную прыналежнасьць? Павышаная адчувальнасьць да нацыянальнае мовы? Усё гэта бязь цяжкасьцяў можна раслумачыць пры дапамозе катэгорыі маральнай сьпеласьці, а не паталёгіі».

Пытаньне: мне незразумела, адкуль вынікае тут маральная сьпеласьць?

07.01.2006 11:50
Пётра Рудкоўскі

Дзякую, Вольга, за заўвагі і пытаньні.

1. Пачну з другога вашага пытаньня:

«Пытаньне: мне незразумела, адкуль вынікае тут маральная сьпеласьць?»

Каб мая пазыцыя была лепш зразумелай, пачну ад мэтадалягічнай аўтадэкларацыі. Этычны дыскурс (зь якім маем дачыненьне ў гэтым выпадку) ёсьць для мяне перадусім прасторай дыялёгу, а не сыстэмы аксіёмаў і дэдукцый або сыстэмы эмпірычна правяральных тэзаў. Таму хай гэта ня будзе ўспрынята як уніканьне аргумэнтацыі, калі паспросту скіруюпытаньне да вас: а як вы лічыце: каб растлумачыць Дынькову «паэтызацыю» і «эмацыйнасьць», больш падыходзіць катэгорыя «паталёгіі» ці «маральнай сьпеласьці», або які-небудзь больш нэўтральны тэрмін?

Але тут я прадугледжваю яшчэ адзін адказ на вашае пытаньне. У артыкуле, што мае зьявіцца ў студзеньскім «ARCHE», я прапаную «прынцып этычнай асымэтрыі», згодна зь якім прэзумпцыя добрай волі мусова мае апрыёры вышэйшы этычны статус, чым прэзумпцыя злой волі. Кажучы інакш, БЕСПАДСТАЎНЫ ДАВЕР мае вышэйшы этычны статус, чым БЕСПАДСТАЎНЫ НЕДАВЕР. І на гэтым усё. Такая мая этычная вера, якую я магу задэкляраваць, ну, а калі трэба, тлумачыць і інтэрпрэтаваць, але якой ня маю намеру даказваць, бо даказаць яе немагчыма. «Няма, – казаў рацыяналіст Попэр, – рацыянальных падставаў этыкі, хоць ёсьць этычныя падставы рацыянальнасьці». Я з гэтым згодны.

2. «І яшчэ такое пытаньне: чаму мова апрыёры ёсьць маральнай вартасьцю?»

Два аргумэнты: 1) нацыянальны; 2) пэрсаналістычны.

Наконт (1) – я прапанаваў бачаньне белмовы як аднаго з нацыязлучальных сымбаляў, як інтэгравальны элемэнт. Магчыма, не для ўсіх гэты аргумэнт прымальны, але прынамсі для некаторых – так.

Наконт (2) – нават калі кагосьці не пераконвае «нацыянальны» аргумэнт, то, на маю думку, застаецца важным яшчэ і «персаналістычны» аргумэнт: У ІМЯ ПАВАГІ да асобаў, для якіх мова мае вялікае значэньне, мова набывае «апасродкаваную каштоўнасьць». Аналягічна як у выпадку сяброўства, сямейнага жыцьця і г. д., калі для майго сябра нешта мае велізарнае экзыстэнцыяльнае значэньне, то я таксама гэтае нешта буду імкнуцца рэспэктаваць, хоць непасрэдна яно можа ня мець для мяне асаблівай каштоўнасьці. І ўжо напэўна ня буду пагарджальна выказвацца пра тое, да чаго ён вельмі прывязаны.

*08.01.2006 10:43**
Вольга Шпарага

Дзякуй, Пётра. У прынцыпе, такі адказ можна прыняць, бо за ім стаіць некалькі вэрсіяў этыкі, кожная зь якіх мае сваё права на існаваньне і, магчыма, вымагае прэзэнтацыі і артыкуляцыі сама сабою, таму што, як мне здаецца, у нашых унівэрсытэтах усё яшчэ дамінуе постсавецкі этычны дыскурс, які нават ня ведаю, як абазначыць... гэтакі дэтэрмінісцкі эклектызм...

Складнікі вашай этычнай пазыцыі, як я разумею: ДОБРАЯ ВОЛЯ, ДЫЯЛЁГ і ПАВАГА ДА АСОБЫ. Такога варыянту этыкі прытрымліваюся і я. Безасноўнасьць (безосновность) гэтых складнікаў па сутнасьці выражае «свабода», што ляжыць у іх аснове і якая не абазначае выбару толькі дабра (узыходзячы да свабоднай волі), аднак зьвязаная з надзеяй на такі выбар. Думаю, эўрапейская цывілізацыя шмат у чым абапіраецца акурат на гэтую «слабую аснову», і яе мысьленьне, мастацтва і г. д. даюць самыя розныя варыянты абгрунтаваньня магчымасьці і неабходнасьці такога выбару, і чым далей мы рухаемся па гісторыі гэтай цывілізацыі, тым, як мне здаецца, больш дыскурсіўнымі робяцца гэтыя варыянты (адпаведна, палітыка ўсё больш зьвязана з выпадковасьцю і абмеркаваньнем). Цікавыя ў гэтай сувязі, напрыклад, развагі Эка ў яго «Калі на сцэну выходзіць Другі».

Аднак вернемся да Беларусі. Арыентацыя на пералічаныя паняткі здаецца мне абсалютна неабходнай для зьменаў

існуючай у Беларусі сытуацыі. І ўсё ж я ня думаю, што гэтыя этычныя складнікі непасрэдна зьвязаныя з нацыянальным праектам. Выходзіць хутчэй наадварот: нацыянальны праект мае этычнае вымярэньне ў тым разе, калі ў ім прысутнічае добрая воля, дыялёг і павага да асобы. Ці можна аднесьці гэтыя складнікі да беларускага нацыянальнага праекту ўвогуле? Або неабходна фармуляваць этычнае вымярэньне ў якасьці прыярытэтнага, у якасьці аднаго з найважнейшых вымярэньняў разгортваньня гэтага праекту, у якасьці адной зь яго цэнтральных задачаў? Думаю, гэта магчыма, дакладней, нават неабходна. Тады іншае пытаньне: ці варта тут весьці гаворку акурат пра нацыянальны праект, а не, скажам, як гэта робіць Рыгор Мінянкоў, пра розныя формы калектыўных ідэнтычнасьцяў або пра грамадзянскую ідэнтычнасьць? Маё бачаньне гэтага аспэкту: а) нацыянальны праект ужо існуе; б) у часткі ягоных прадстаўнікоў ёсьць устаноўка на важнасьць этычнага вымярэньня, значыць, ён можа зрабіцца ўзорам – у сьцьверджаньні гэтага вымярэньня – для іншых формаў калектыўных ідэнтычнасьцяў, як і для іншых прадстаўнікоў таго самага нацыянальнага праекту. г. зн. УЖО існуе пэўная форма супольнага быцьця ў Беларусі, зразумелая перадусім як кантэкст для дыялёгу, добрай волі і павагі да асобы. Навошта ж ад яе адмаўляцца? Але гэта ня значыць, што не патрэбныя іншыя формы. Магчыма, мы вынайдзем у Беларусі для іх новыя імёны. Або іх вынайдуць тыя, хто, як Мінянкоў, Акудовіч, Палескі, лічаць ідэю нацыянальнага праекту вычарпанай для сучаснасьці. Але, думаю, рэч ня ў назвах, а ў вузлавых ЭТЫЧНА-ПАЛІТЫЧНЫХ складніках нашых пазыцыяў Тут і Цяпер.

*09.01.2006 21:15**
Пётра Рудкоўскі

«Ці варта тут весьці гаворку акурат пра нацыянальны праект, а не, скажам, як гэта робіць Рыгор Мінянкоў, пра розныя формы калектыўных ідэнтычнасьцяў або пра грамадзянскую ідэнтычнасьць?»

Вольга, я прымаю «нацыянальны праект» толькі ў вэрсіі «самаабмежаванага» праекту, г. зн. праекту без мэсіянска-

таталітарных складнікаў (асьцярога сп. Мінянкова, што спэцыялісты па гуманітарным праекце могуць захацець «зьвяртаць» – per fas et nefas – іншых у «сваю веру», мне таксама блізкая. Іншая рэч, што я, відаць, больш асьцярожны, чым Мінянкоў, у фармуляваньні падазрэньняў. Я схільны бачыць таталітарны ўхіл у нацыянальных праектах, напрыклад, Лыча або Крукоўскага, але ня бачу ў выказваньнях Дынька або Булгакава). Мяжой, перад якой Праект павінен спыніцца (дазволю сабе пэрсаніфікаваць), ёсьць Сумленьне Асобы. То бок, калі нейкі чалавек лічыць, што «нацыянальная прапіска» яму не патрэбная, то нельга «завяртаць», г. зн. мэтадычна пераконваць яго, што ён цёмнае і бессаромнае стварэньне. Але тут трэба памятаць і пра тое, што «нацыянальныя скептыкі» (так назавём тых, якія лічаць, што ім не патрэбная «нацпрапіска») таксама могуць стварыць сваю ідэалёгію, згодна зь якой усе прыхільнікі нацпраекту – патэнцыйныя «фашысты», і іх трэба хутчэй зьвярнуць у вызнавальнікаў постнацыянальнай або «глябалісцкай» веры. Так што я прадугледжваю права і тых, і гэтых культываваць свой дыскурс (ці то нацыянальны, ці то «постнацыянальны»), але ў дэідэалягізаванай вэрсіі, без намёкаў, што той «другі бок» уяўляе сабой субстанцыяльную небясьпеку. Аднак «дэідэалягізацыя» дыскурсаў зусім ня значыць выключэньня крытычнага кампанэнту, і тая, і другая група мае права крытыкаваць апанэнта.

То бок: хай жыве крытыка!

Але: далоў дэманізацыю апанэнта!
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 3 (43) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/06/04
[image]

ДЗІМА СМАЛЯКОЎ
студэнт 3 курсу філязофскага факультэту БДУ. Цікавіцца экзістэнцыяльнай філязофіяй. Піша раман «Хронікі ўнутраных рэвалюцыяў».

Дзіма Смалякоў

Адчужаныя сутнасці Алены Гапавай

Гапава А. *Што такое бацька і яго «бацькоўскі клопат»*. //ARCHE. № 4 (33) 2004.

Гапава А. *Нацыя «паміж» і ў мары аб сваіх жанчынах* // Фрагмэнты. № 11.

Гапава А. *Жанчына як «іншае» ў дыскурсе беларускай дэмакратыі* // Фрагмэнты. № 9.

Нагодай для гэтага тэксту сталіся тры эсэ Алены Гапавай, якія, здаецца, выклікалі пэўны рэзананс у інтэлектуальных колах нашай краіны. Яны патрабуюць тлумачэння і аб'ектыўнай крытыкі. Тлумачэння – з прычыны звышэмацыйнасці некаторых месцаў, а крытыкі – з прычыны неймавернасці ці недасканаласці пэўных прапанаваных аргументаў. Выключыўшы з поля зроку ўсё непатрэбнае, мы ставім за мэту пошук ісціны ў выніку рэфлексіі над гэтымі тэкстамі.

Адразу трэба сказаць, што гэтая работа не ставіць за мэту абарону мужчынскасці ці маскуліннасці ад крытыкі спн. Гапавай або выкрыццё яе прафесійнай заангажаванасці. Мы таксама не маем на мэце высвятляць, чаму гэтыя эсэ мала чым розняцца між сабой або чаму для напісання іх

выкарыстоўваецца адзін і той жа эмпірычны матэрыял.

Калі не зважаць на псіхалагічны негатыў для мужчынскага культурнага ўспрымання гэтых эсэ, іх сэнс даволі просты. Апазіцыя, якая абвінавачвае жанчын у нерацыянальнасці выбару А. Лукашэнкі як прэзідэнта, праз гэта адбудоўвае сваю маскуліннасць. Вобраз жанчыны сексуалізуецца, і праз гэта адбываецца адчужэнне жанчыны ад палітычнага дыскурсу як носьбіта пэўных сацыяльных, культурных і эканамічных роляў. Жанчына ўспрымаецца як нерацыянальны, антыдэмакратычны пачатак у культурнай сітуацыі. Жанчына, ва ўяўленні апазіцыі, непрадказальна адмаўляецца ад рынкавых адносін, дэмакратыі, свабоды, лібералізму, яе выбар цалкам рацыянальны і базуецца на жаданні сацыяльнай бяспекі, чаго не могуць заўважыць заангажаваныя ўдзельнікі палітычнага працэсу. Акурат праз праблематычнасць эканамічнай мабільнасці з прычыны дзетанараджэння жанчыны галасуюць за пераразмеркаванне рэсурсаў, якое гарантуе ім пэўную эканамічную і сацыяльную бяспеку. Такім чынам, не разумеючы сапраўднага эканамічнага падмурку жаночай «ірацыянальнасці», беларуская апазіцыя стварае новы «патрыярхат», дзе праз вылучэнне жанчыны як іншага спрабуе кампенсаваць свае культурныя комплексы.

«Я марксістка і мушу шукаць матэрыяльныя прычыны», – піша спн. Гапава ў эсэ «Што такое бацька і яго «бацькоўскі клопат», тым самым рэпрэзентуючы свае парадыгмальныя ўстаноўкі. Як і кожны марксіст, яна ва ўсіх культурных феноменах шукае эканамічны базіс, ствараючы досыць аднабаковае бачанне праблемы. Для яе рацыянальнага светаўспрымання цалкам неістотны той факт, што акрамя ўздзеяння эканомікі на культуру ёсць уздзеянне культуры на эканоміку. Аўтарка лёгка стварае эканамічнага чалавека і яго эканамічным досведам спрабуе аргументаваць культурную сітуацыю, якая мусіла скласціся.

Вядома, што каб усебакова разгледзець праблему, не прыніжаючы ролі эканамічнага фактару, трэба звярнуцца і да культурных рэалій. Эканамічнае бачанне – рэч неабходная, але,

на жаль, не дастатковая. Цяжка згадзіцца з тым, што антыфемінная скіраванасць апазіцыі, як і маскулінізацыя вобраза прэзідэнта, ёсць працэсамі, якія грунтуюцца выключна на эканамічнай фенаменалогіі. Яшчэ больш цяжка пагадзіцца з меркаваннем пра тое, што «мова і гісторыя ў гэтым (міжкласавым) процістаянні – толькі сімвалічныя рэсурсы, пэўныя культурныя коды, за якімі стаяць вельмі практычныя рэчы». Але ўсё па парадку.

«На нашых вачах спрацаваў механізм выключэння жанчыны як «іншага» з «нацыянальнага» палітычнага канструкту і яе ператварэння з чалавека, суб'екта, у аб'ект (сексуальнай) палітыкі». Цытата, вядома, выбрана не так проста. Менавіта ў гэтай цытаце і закладзены ўвесь марксісцкі пафас адчужэння чалавека (у гэтым варыянце менавіта жанчыны як гендэра), які быў разгорнута прадэманстраваны ў эканамічна-філасофскіх рукапісах К. Маркса. Такім чынам, жанчына спрашчаецца да сваіх біялагічных функцый і аб'екта задавальнення мужчынскіх сексуальных патрэб, для таго, каб праз адбудову «іншага» ў механізме палітычнага дыскурсу, частка палітычнай супольнасці змагла пераадолець свае палітычныя комплексы. Іншымі словамі, апазіцыя мае сталы псіхоз з немагчымасці прыйсьці да ўлады і праз абразы жанчын імкнецца кампенсаваць такое становішча. Між тым цікава, што менавіта ў гэтай сітуацыі спн. Гапава не выкарыстоўвае марксісцкую метадалогію для апісання праблемы, а карыстаецца псіхааналізам (у прыватнасці, Лаканам). На гэтым прыкладзе відавочна, што выключна эканамічных фактараў мала. Аўтарка і тут адшуквае эканамічныя падмуркі, якія знаходзіць у савецкім існаванні. Але ўсё ж гэта падмуркі, якія датычацца рабочага на заводзе, што не атрымлівае зарплаты і з зайздрасцю глядзіць на жонку, якая зарабляе больш за яго. Гэтая сітуацыя датычыцца кожнага беднага, але, на жаль, не датычыцца палітычнага працэсу. У выніку гэтага паўстае пытанне, чаму спн. Гапава пераходзіць з псіхааналізу да марксізму? Чаму яна пакідае сферу культуры і пераносіцца ў сферу эканомікі?

Як бы там ні было з культурнай сітуацыяй у Беларусі, жанчына

ўспрымаецца як іншае ва ўсім капіталістычным (і не толькі) свеце. Без увагі на эканамічнае становішча краіны мы бачым побач са спецагентамі-мужчынамі ў амерыканскіх баевіках прыгожых, сексапільных дзяўчат. На подыумах ёсць месца толькі сексуальна нафарбаваным мадэлям, і нават пры распродажы жаночых тавараў прысутнічаюць жанчыны з яскрава выражанымі праявамі аголенай сексуальнасці. Ва ўсім свеце, незалежна ад краіны, дзе толькі ёсць капіталістычныя дачыненні, жанчына ўспрымаецца як іншае, як цела, як сексуальная функцыя. Жанчына ёсць іншым. Жанчына ёсць таварам, жанчына ёсць жаночай сексуальнасцю, і гэтую сексуальнасць з радасцю прадаюць мода, кіно, тэлебачанне, музыка. Жанчына ёсць сродкам існавання. Жыццё ў пэўным сацыяльным рэжыме патрабуе пэўных сацыяльных праяў. У гэтым свеце жанчына ёсць адарванай, пазбаўленай ідэнтычнасці сутнасцю. Тут няма розніцы, ці гэта будзе Клаўдыя Шыфер або Анжэліна Джолі, галоўнае, каб праступала сексуальнасць, а чыя менавіта гэта сексуальнасць – цікаўнасці не выклікае.

Трэба заўважыць, што ў гэтай сітуацыі жанчына як іншае ёсць такой для самой жанчыны. Жанчына – гэта нешта другаснае, нешта ірацыянальнае, нешта дурненькае з караценькай спадніцай, доўгімі абцасамі і белымі валасамі. Хто не хоча быць жанчынай, хто не хоча быць іншым, той надзявае штаны і каротка стрыжэцца. Хто не хоча быць жанчынай, той ідзе ва універсітэт, чытае кніжкі і не карыстаецца касметыкай. Жанчына – прыніжанае, нешта дзетароднае, нешта эканамічна занядбанае. Жанчына – функцыя, функцыя для задавальнення сексуальных патрэб, ці функцыя для нараджэнні ваяроў для дзяржавы. Яе функцыя даглядаць дзяцей, прыбіраць кватэру, мыць посуд, сачыць за дабрабытам. Жанчына ёсць целам, тым, чым можна захапляцца, тым, на што можна глядзець. Жанчына ёсць узнагародай за багацце, уладу, розум. Прыктычна пры рэкламе ўсіх тавараў для жанчын скарыстоўваецца жаночая сексуальнасць. Менавіта жаночая сексуальнасць павінна прыцягваць жанчыну для набыцця тавару. Жанчына ў культуры ёсць бонусам, зручным дадаткам да багацця.

Аўтарка звяртаецца да праблемы асэнсавання жанчыны ў культуры, але робіць гэта выключна ў дачыненні да апазіцыі. Менавіта апазіцыя вылучае жанчыну як іншае і праз свае прыватныя комплексы спрабуе выдаць сваю заклапочанасць за заклапочанасць усіх. «Увасабленне жанчыны як іншага ад «нас» дазваляе прыхаваць, што мы выдаем свае – «карпаратыўныя» – інтарэсы кола інтэлектуалаў за інтарэсы народу». Пры гэтым само культурнае стаўленне да жанчыны застаецца па-за ўвагай. Жанчына як цела, жанчына як сексуальнасць, жанчына як тавар сучаснай індустрыі ёсць такім жа іншым для спн. Гапавай, як і для аўтараў артыкулаў, якія яна цытуе. Жанчына як вянок, жанчына як узнагарода для аўтаркі ёсць сімулякрамі апазіцыі, яны не існуюць у рэчаіснасці. Тут жанчына – занядбаны эканамічны суб'ект. Менавіта ў эканамічнай занядбанасці аўтарка шукае падмуркі сексісцкіх падыходаў. Яна не дабіваецца пераадолення ўспрымання жанчыны як функцыі, яна хоча толькі таго, каб гэтую функцыю аплачвалі, эканамічна кампенсавалі культурную другаснасць. Складаецца такое ўражанне, што жанчына для Алены Гапавай цікавая толькі таму, што яна ёсць суб'ектам эканомікі, пазбаўленым сацыяльнай мабільнасці. Як толькі жанчына атрымлівае эканамічнае забеспячэнне, яна адразу робіцца нечым іншым – прафесарам, дэпутатам, дырэктаркай Цэнтра гендэрных даследаванняў. Жанчына – гэта заўсёды нешта іншае, нешта не тут і не са мной. Жанчына – такі ж сімулякр, як і беларуская апазіцыя.

У гэтай сітуацыі аўтарчын марксісцкі падыход ігнаруе марксісцкую ісціну, што «грамадскае быццё абумоўлівае свядомасць». Алена Гапава забываецца на гэтую свядомасць. Для яе ёсць толькі тут і цяпер. Яна не шукае генеалогіі праблем. Яна робіць высновы на газетных матэрыялах і «шэдэўрах» беларускай паэзіі. Для яе жанчына – такое ж іншае, як і для любога іншага эканамічна забяспечанага суб'екта. Такі суб'ект карыстаецца набыткамі эканомікі напоўніцу, таму жанчына як сексуальнасць – гэта ўсё тое ж іншае, рэч, якую трэба прадаваць і набываць, апісваць і даследаваць. У гэтай культуры жанчына заўсёды ёсць аб'ектам...

«Жанчынам дапушчальна быць беднымі, мужчынам – не. Я маю на ўвазе наступнае: жанчына, нават бедная, застаецца жанчынай «праз сваё цела», і амаль нішто (калі гэта не нешта незвычайнае) не можа змяніць гэтага папулярнага ўяўлення. З мужчынамі іншая справа: мужчынскасць быццам бы звязана не з целам, і тыя, у каго мала грошай (ці ўлады), нейкім чынам пазбаўлены значнай часткі мужчынскага». Маскуліннасць такога кшталту, на думку спн. Гапавай, – гэта рэч, якая існуе апрыёры ў культуры, нешта спрадвечнае. Галоўнае ж тут – эканамічная заангажаванасць. Менавіта эканамічныя характарыстыкі выступаюць у ролі гендэрных маркераў. «Я кажу тут пра канструяванне традыцыйнай, «нарматыўнай» маскуліннасці, калі ён «мужчына», таму што плаціць у рэстаране. Адваротнае таксама справядліва, ён плаціць, таму што мужчына (жанчына, што плаціць сама, не даказвае гэтым сваю жаноцкасць)». Такім чынам, у спрадвечным уяўленні пра мужчыну апошні павінен быць мужам, бацькам, абаронцам. Ён павінен такім быць, бо такім яму кажа быць культура. Культура, дзе асноўную выхаваўчую, педагагічную ролю, ролю для стварэння свядомасці нацыі адыгрываюць жанчыны, стварае такога мужчыну.

Калі прасачыць яшчэ з савецкага часу, то ўвесь выхаваўчы персанал дзіцячых садкоў – жанчыны, большасць настаўнікаў у школе – жанчыны, большасць выкладчыкаў на гуманітарных факультэтах ВНУ – жанчыны, у Мінадукацыі – жанчыны, у судах большасць – жанчыны. Калі дзеці не ходзяць у дзіцячы садок – яны застаюцца з маці. Калі сям'я распадаецца, судовая інстанцыя, дзе суддзя звычайна – жанчына, дзіця пакідае маці. Бацька ёсць грашовым апендыксам у гэтай сістэме. Менавіта маскуліннасць як эканамічны чыннік ёсць вынікам жаночага дагляду, ёсць вынікам жаночай мары пра страчаную за часы савецкага шчасця маскуліннасць. Маскуліннасць як эканамічны канструкт – стварэнне жаночае, менавіта жанчына хоча бачыць моцнага, самаўпэўненага самца сваім мужам, сынам, які будзе мужам іншай, бацькам дзяцей, якія будуць яе ўнукамі. Такім чынам, беларуская культура ёсць культурай матрыярхальнага з настальгіяй па былой маскуліннасці. Паколькі маскуліннасці не здабыць, а адукацыя працуе ўсё ў тым жа дыскурсе, па

тэлевізіі паказваюць здаравезных самцоў, вакол якіх баражыруюць сексапільныя дзяўчаты, і ўтвараюцца псіханеўралагічныя комплексы, прычыну якіх не знайсці выключна ў эканамічных падмурках. Усё ж Аляксандр Рыгоравіч ёсць не толькі гарантам сацыяльнай абароненасці і дзяржаўных ільгот, ён да таго жа і сімвал жаночай мары аб страчанай маскуліннасці, ён ёсць прадуктам жаночай адукацыі, ёсць вынікам жаночага жадання будучыні. Прэзідэнт ёсць абаронцам жанчыны, які клапоціцца пра жанчыну, але ёсць і сімвалам, ёсць вынікам культуры. Прэзідэнт ёсць найвышэйшай кропкай беларускай адукацыі і гендэрнай палітыкі судоў і Мінадукацыі, сацыялістычнага дзяржапарату. Вядома, карані ідуць з Савецкага Саюза, але справа не ў гэтым. Справа ў рознабаковасці палітычнай рэальнасці, сярод чыннікаў якой існуе не толькі эканамічная занядбанасць, але і псіхалагічныя, педагагічныя фактары. Менавіта іх спн. Гапава і не бачыць. Для яе жанчына ёсць рацыянальным эканамічным суб'ектам, пазбаўленым псіхалагічнай чыннасці. Замест таго, каб пісаць артыкул «Нацыя «паміж» і ў мары аб сваіх жанчынах», не лішне было б напісаць артыкул «Нацыя «пасля» і ў марах пра сваіх мужчынаў». Але за гэта ААН грошай не дае, і праект за мужчынскае лідэрства відавочна не пройдзе, дый не патрэбны ён. Такі праект рэалізуецца кожны дзень, калі чарговая мама (незалежна ад культурнага, адукацыйнага і эканамічнага статусу) кажа свайму сыну, кім ён павінен быць і якім яму трэба зрабіцца.

У культурнай сітуацыі мары пра маскуліннасць, у культуры, дзе маскуліннасць уяўляецца носьбітам такіх мадальнасцяў, як сіла, моц, праўдзівасць рашэнняў, некаторыя высновы Гапавай патрабуюць пераасэнсавання, а некаторыя проста трэба адкінуць. У гэтай сітуацыі не «беларускае таму, што мужчынскае», але мужчынскае таму, што правільнае. Культура марыць пра сваю маскуліннасць. Усё правільнае, валявое будзе асацыявацца менавіта з ёй, незалежна ад дачынення да пэўных палітычных арыентацый. Маскуліннасць, пра якую мараць, – праўдзівая, менавіта яна ёсць носьбітам і санкцыянерам праўды.

Гэты артыкул не ставіць за мэту знайсці вінаватага. Крытыка гэтых эсэ не скіравана на расстаўленне акцэнтаў, хто вінаваты больш і хто за каго адказвае. Мэта стаіць знайсці ісціну, таму, карыстаючыся лозунгам самой Гапавай, «хопіць Лакана! Даеш Маркса!»

З яе пункту гледжання апазіцыя ёсць вялізным сімулякрам, які займаецца сімуляваннем апазіцыйнай дзейнасці. З гэтым можна пагадзіцца, але такія феномены, як беларуская мова і беларуская гісторыя, сімулякрамі назваць цяжка, як цяжка іх назваць працэсамі. Мова і гісторыя ёсць феноменамі, і феноменамі не сімуляцыі «беларускіх інтэлектуалаў», якія мараць, каб набывалі іх кніжкі – гэта феномены сацыяльнага быцця, менавіта таго быцця, пра якое дужа часта забываецца спн. Гапава. Мова і гісторыя ёсць сімваламі, калі хочаце, з таго ж шэрагу, што і прэзідэнт. Мова і гісторыя ёсць сродкамі ідэнтыфікацыі. Трэба ж яшчэ чалавеку нейкім чынам ідэнтыфікаваць сябе, акрамя як жанчынай або мужчынам.

Як і кожная матэрыялістка, спн. Гапава шукае матэрыялістычных фактараў ва ўсіх праявах жыцця. Але акрамя матэрыялістычных фактараў ёсць яшчэ і ідэі. Калі не прымаць пад увагу ідэй, то патлумачыць генезіс беларускамоўнага асяроддзя ў савецкай расійскамоўнай рэчаіснасці практычна немагчыма. Трэба ўсё ж згадзіцца, што мова і гісторыя не з'яўляюцца феноменамі чыёйсьці сімуляцыі. Мова і гісторыя – гэта ідэі, вакол якіх гуртуецца пэўная культурная і сацыяльная рэчаіснасць. Мова і гісторыя ёсць феноменамі духу (зноў жа Гегель – як без яго?), а сучасная сітуацыя ёсць толькі разгорнутым этапам рэалізацыі ідэі.

«Беларускамоўныя інтэлектуалы будуюць сваю ідэнтычнасць у значнай ступені праз супраціў «каланізатару-іншаму», які хоча захапіць і згвалціць нашу жанчыну-нацыю. Палітычная праграма, дадзеная праз сексуальную метафару, кліча да «патэнцыі» і мужчынскасці як падставаў незалежнасці, таму што ў посткаланіяльным культурным канструяванні слабыя «туземныя» мужчыны ёсць ідыёмай бяссілля ў адносінах з

каланізатарам». Каментуючы гэтую цытату, варта звярнуцца да досведу нашага ўсходняга суседа, які відавочна не пакутаваў ад праяваў каланіялізму, калі толькі не свайго ўласнага. У Расійскай Федэрацыі, як ні дзіўна, таксама прысутнічае сексуальная рыторыка. Пра тое, што каму адрэжуць і што дзе больш не адрасце, пра тое, што дэпутат Дзяржаўнай думы У. Жырыноўскі казаў пра «паімець» і «*бануць» разам з прэзідэнтам ЗША Грузію, усім даўно вядома. Вядома таксама пра рыторыку «магчы і не магчы» ў час змянення ўлады Б. Ельцына на ўладу У. Пуціна. Гэты прыклад усяго толькі паказвае падабенства дзвюх постсавецкіх рэальнасцяў, рэальнасцяў мары пра згубленую маскуліннасць. Адсюль відаць, што не беларускамоўныя інтэлектуалы са свайго суб'ектыўнага быцця абумоўліваюць пэўную сацыяльную парадыгму, але ўсё сацыяльнае быццё абумоўлівае свядомасць кожнага беларускага інтэлектуала. Такім чынам, не віна недарэчных пісьменнікаў, што яны валодаюць сапсаванай сексісцкай свядомасцю. Іх віна толькі ў тым, што яны ў сваёй свядомасці не бачаць аніякіх заган. Зноў жа вяртаемся да культуры, якая не дае спакою нармальнаму эканамічнаму развіццю ў рынкавых абставінах.

У сітуацыі мары пра згубленую маскуліннасць усё, што знаходзіцца ў рэчышчы ідэальнага, якое патрабуе санкцыі праўды, будзе знаходзіцца ў абшары маскуліннасці. Пры гэтым усё рэчаіснае будзе перайначана ў зусім іншыя колеры. Усё тэарэтычна правільнае будзе мужчынскім, а ў сапраўднасці мужчынскімі будуць толькі заганы, дрэнныя звычкі і інфантылізм. Гэта толькі ў марах мужчыны могуць быць праўдзівымі, моцнымі, валявымі, у сапраўднасці яны могуць быць альбо алкаголікамі, альбо рабочымі на заводзе, што ў сучаснай ментальнасці адно і тое ж. Мужчына ў сапраўднасці апрыёры бессаромны, бязглузды алкаголік з нясталым заробкам, хутчэй за ўсё, беспрацоўны, хутчэй за ўсё, з няспраўджанымі марамі. Мужчына ў рэальнай свядомасці ёсць рэнегатам, мужчына ёсць маргіналам, а маргіналаў дзяржава не надта любіць.

З усяго вышэйсказанага вынікае, што культура ў беларускай

сучаснасці ўяўляецца як матрыярхат з марай пра згубленую маскуліннасць. Уся заходняя рэклама пра тое, што «прага першынства нараджаецца разам з мужчынам» і «гэта наш, мужчынскі свет», прапагандуе стаўленне да мужчыны як да абаронцы дому. Лозунгі «баязлівец не гуляе ў хакей», «танкісты – гэта найлепшыя хлопцы маёй краіны» і іншыя сведчаць пра тое самае. Мужчына, паводле гэтай прапаганды, ёсць узброеным дзідаю паляўнічым, які выходзіць паляваць на маманта. Разам з тым, у той жа апазіцыйнай рыторыцы ёсць згадкі пра тое, што мужыкі слабыя, не могуць даць адпору, патрэбныя ваяры, а не палітыканы. Гэтыя словы часцей гучаць з вуснаў беларускамоўных ці палітычна заангажаваных жанчын. Мара пра маскуліннасць ёсць чыннікам культуры, і яго не перабіць павелічэннем колькасці жанчын у парламенце ці праектам за жаночае лідэрства. Патрэбна цярпімасць, але калі справа даходзіць да эканомікі, цярпімасць страчваецца.

Штодзённыя разборкі ў звычайнай сям'і круцяцца вакол таго, хто колькі прынёс і чаму так мала, бо трэба болей. Эканамічная незадаволенасць і мара пра маскуліннасць нараджаюць шматлікія комплексы, якія прысутнічаюць як у дзяржаўным сектары палітыкі, так і ў апазіцыйным. Як ні дзіўна, тая выснова, што апазіцыянеры не адрозніваюцца ад дзяржнаменклатуры, бо існуюць у сітуацыі адной культуры, ёсць праўдай. Эканоміка, вядома, мае пэўнае значэнне, але першаснае значэнне мае сацыяльнае быццё.

Сёлета на Новы год прэзідэнт краіны казаў пра п'янства і іншыя дрэнныя звычкі. Дрэнныя звычкі ў сучаснай культуры асацыююцца выключна з мужчынскім пачаткам, а значыць, менавіта да жаночага электарату звяртаўся прэзідэнт. Прынамсі, лозунг Б. Ельцына на яго апошніх выбарах «галасуй не розумам, а сэрцам» быў адрасаваны таксама жанчынам, хоць выключна традыцыйна і беспадстаўна. Пры гэтым, з адмоўным рэйтынгам Ельцын здолеў выйграць выбары. Але справа не ў гэтым. Сацыяльнае быццё зрабіла з мужчыны носьбіта дрэнных звычак, і з гэтымі дрэннымі звычкамі павінна змагацца менавіта жанчына. Менавіта жанчына як маці павінна даглядаць сваіх дзяцей, мужа. Клапаціцца пра ўсіх. І з гэтым ёй

дапамагае дзяржава. Дзяржава стварае матрыярхальную утопію, дзе з дапамогай сродкаў размеркавання рэсурсаў яна дапамагае трымаць няшчасных і занядбаных дагледжанымі. Менавіта жанчына як галоўны даглядчык сям'і і робіцца сімвалам гэтай палітыкі. Грамадзяне краіны выяўляюцца такімі ж дзецьмі, якім патрэбны догляд маці, і ў гэтай сітуацыі не прэзідэнт выходзіць на пярэдні план. На пярэдні план выходзіць дзяржава як галоўны дарадца жанчыне ў яе штодзённай барацьбе з праявамі інфантылізму. Сістэма ёсць наступствам дзяржаўнай палітыкі. Сістэма ёсць абаронцай краіны, даглядчыкам краіны. Сістэма – вялікая маці беларускага народу. Сістэма – канструкт культуры. Культура стварае бачанне сістэмы як маці. На жаль, гэтае бачанне так і не пераадольвае стаўлення да жанчыны як да функцыі. Жанчына нават у гэтым матрыярхаце ёсць функцыяй, функцыяй для дагляду ўсяго.

Але, што такое беларуская мова і беларуская гісторыя ў гэтай культуры? Як ні дзіўна, гэтыя феномены ёсць ідэямі, вакол якіх гуртуюцца пэўныя колы. Менавіта на падставе гэтых ідэй і ідзе сапраўдны апазіцыйны працэс, а не тая сімуляцыя, якую ажыццяўляюць кіраўнікі апазіцыйных партый. Апазіцыя – гэта не партыйная наменклатура. Апазіцыя ёсць духам у сучаснай беларускай сітуацыі. Ты апазіцыянер, калі гаворыш па-беларуску. Ты апазіцыянер, калі цікавішся сваёй гісторыяй. Мова і гісторыя не ёсць сродкамі адмежавання, выпуклення сваёй іншасці. Мова і гісторыя ёсць ідэямі, дзеля якіх і вакол якіх гуртуюцца сапраўдныя прадстаўнікі апазіцыі, г. зн. тыя, хто ідзе на мітынгі, хто агітуе знаёмых, хто не згодны з сучаснай сітуацыяй. Мова і гісторыя не залежаць ад гендэра і гендэру не належаць. Мова і гісторыя – гэта не бунт супраць сістэмы, якую стварае дзяржава. Мова і гісторыя – гэта не бунт супраць несвабоды. Мова і гісторыя – гэта падставы існаваць кімсьці, гэта падставы існавання дзеля чагосьці. Сапраўды, сацыяльнае быццё абумоўлівае свядомасць, але і ідэі кіруюць светам. Тут слова «апазіцыя» абазначае не нейкае палітычнае дачыненне, тут яно азначае ідэнтычнасць, пэўную чыннасць свядомасці... Але ўсё ж пра «іншае».

Такім чынам, для Алены Гапавай мова і гісторыя ёсць такім жа іншым, як і жанчына ў яе адчужаных сутнасцях. Мова і гісторыя ёсць нейкімі адчужанымі сутнасцямі, якія належаць камусьці іншаму. А. Гапава не разумее і не хоча разумець, што за гэтымі адчужанымі сутнасцямі існуюць сапраўдныя людзі. Гэтыя сапраўдныя людзі ёсць феноменам рэчаіснасці, яны сапраўды існуюць і валодаюць гэтымі адчужанымі сутнасцямі. Для спн. Гапавай і жанчына як цела, і апазіцыянеры, што сапраўды носяцца са сваёй мовай і гісторыяй дзеля самой мовы і гісторыі, ёсць «іншым», адчужаным, далёкім. Спн. Гапава не кажа пра эмансіпацыю чалавека, як трэба было б казаць сапраўднаму марксісту, яна кажа пра адчужаныя сутнасці і вінаваціць. Вінавачанне – добрая справа, але яна толькі тады добрая, калі робіцца шчыра. Пра шчырасць жа нельга казаць, калі размова ідзе пра сухія аб'екты, за якімі хаваюцца абстрактныя адчужаныя сутнасці, а не жывыя людзі. Праблемы пабытовага гвалту, жаночай беднасці, сексуальнага рабства сапраўды дужа актуальныя ў сучаснасці. Але іх не вырашыць, пакуль носьбітаў гэтых праблем мы будзем успрымаць як «іншае». Калі за аголенай сексуальнасцю мы пачнём бачыць сапраўдных людзей, то мы зразумеем, што не існуе гендэрных праблем, а існуюць праблемы ўсяго грамадства. Само грамадства гэтыя праблемы стварае і само з імі павінна змагацца.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: **2006/06/04**

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (43) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

палеміка [image]2006

ада Зтыка•крытыка•гісторыя•эсэістыка•літаратура•**палеміка**•рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Алена Гапава
Усё адразу

АЛЕНА ГАПАВА
дацэнт Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ў выгнаньні, дырэктарка створанага пры гэтай установе Цэнтру гендэрных дасьледаваньняў. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – палеміка «Міты пра міты беларускай сацыялегіі» (1–2/2006).

...тры эсэ Алены Гапавай, якія... патрабуюць тлумачэння і аб’ектыўнай крытыкі... з прычыны... неймавернасці аргументаў.

Дзіма Смалякоў. 2006 г.

Этого не может быть, потому что этого не может быть никогда.

Антон Чехов. «Письмо к ученому соседу». 1880 г.

Свабода гаварыць прадугледжвае свабоду слухаць. Тыя, хто павінны слухаць, на самай справе нічога нам не павінны. І, ведаючы гэта, мы мусім гаварыць адно тое, чаго, здаецца, нельга не сказаць. І памятаем пра сваю адказнасць за тое, што гаворым.

Вось з гэтага – пачуцця, што не ўсё магчыма, што існуе паняцце пра «нельга» і што дарослы чалавек мае адказнасць вызначаць, што можна, а што не, і сам сабе ставіць мяжу – мне здаецца, што трэба растлумачыць чытачам, што тут адбываецца. Таму што той ці тая, што прачыталі папярэдні тэкст, напэўна, пытаюцца ў саміх сябе: хто тут звар’яцеў? Можа, аўтарка – калі яна сапраўды напісала тое, што ёй прыпісвае студэнт Дзіма: што мова і гісторыя ёсць «сімулякрам», і што ў мужчынаў псыхоз, і што марксізм – гэта адзін эканамічны базіс, і што жанчына ёсць толькі сваёй «біялагічнай функцыяй» і ўсё

астатняе. А можа, студэнт Дзіма? Але не з прычыны зместу ягонага тэксту (як апантаны студэнт трэцяга курса можа пісаць такія тэксты, увогуле зразумела), а калі вырашыў даслаць свой паток свядомасці ў рэдакцыю – і ніякія тармазы ў яго не завішчалі. А можа, рэдактар? Калі паставіў (не важна, з якой прычыны) тэкст у нумар, быццам забыўшыся, на што прэтэндуе часопіс, які ён рэдагуе.

На тэкст студэнта адказваць няма сэнсу, таму што сэнсу там няма, а ёсць «бытавая свядомасць». Паводле гэтага тэксту нават нельга меркаваць, што сапраўды напісана ў тых эсэ, якія ён крытыкуе, і дзе заканчваецца пункт гледжання аўтаркі і пачынаецца ягоны (і таму калі цікава, пра што эсэ, трэба іх і чытаць). Ёсць такая перадача на НТВ – «Усё адразу». У студэнцкім тэксце сапраўды «ўсё адразу» (што зразумела, таму што калі пішаш пра гендэр, аказваецца, што гэта пра ўвесь свет), прычым у адным месцы поўная процілегласць таму, што гаворыцца раней ці пазней. Як казала ў фільме гераіня Ноны Мардзюковай: «То яму тое, а то раз – і гэта». Ну, бывае. Ён яшчэ вучыцца. Але нешта ж адбываецца «ў інтэлектуальнай прасторы»,«культурным пасведчаннем» чаго ёсць гэтая публікацыя. І калі размова ідзе «пра гендэр», з яго ў дачыненні да факту публікацыі я і пачну.

Тэкст студэнта Дзімы не мог з’явіцца ад імя дзяўчыны. Не таму, што яна не магла такое ж напісаць (гэта якраз агульначалавечае), а таму, што не даслала б гэта ў рэдакцыю. Дзяўчаты праходзяць праз іншыя дысцыплінарныя практыкі (ім часцей кажуць – рознымі спосабамі, – што яны дурныя, альбо нават што «ўсе яны дурныя», і што трэба закрыць рот, і што гэта не жаночая справа), і яны прывучаюцца паводзіць сябе іншым чынам. Яны цэнзураваныя – і таму ў публічнай прасторы, дзе сканцэнтравана ўлада, спараджаюць значна меней тэкстаў. Гэта частка іх сацыяльнай кампетэнтнасці – стрымвацца; праз такі кантроль адбываецца «адняцце голасу». Бо, як вядома, «цэнзура ніколі не бывае такой дасканалай і нябачнай (invisible), як тады, калі цэнзураванаму няма чаго сказаць акрамя таго, што яму дазволена сказаць: у гэтым выпадку яму нават не трэба быць сваім уласным цэнзарам, таму што ён цэнзураваны раз і назаўсёды»[1]. Акрамя таго,

дзяўчаты заўсёды гавораць з пазіцыі, калі – цытуючы студэнта Дзіму – усё «аб'ектыўна правільнае» (!) абвяшчаецца мужчынскім. Не будзем пытацца ў студэнта філасофіі, як аб'ектыўна правільнае вылучаецца ў залежнасці ад таго, хто вылучае (альбо як залежаць вынікі рэферэндуму ад таго, хто лічыць галасы), і ці можна гэтую сацыяльную канструкцыю рэканструяваць. Для яго аб'ектыўна правільнае існуе самастойна, «разліта ў прасторы», і некаторыя «асабліва прыбліжаныя» спадабляюцца яго ўразумець. І абвясціць мужчынскім. І таму яно такім і ёсць.

І пасля гэтага нехта кажа, што «гендэра няма»? Ёсць, вядома, колькі. І ён напрамую звязаны з размеркаваннем улады, у гэтым выпадку ў сімвалічнай прасторы: ці то праз сэксуальнасць, якую гаварыць увогуле (якую ў цябе аднялі, заставіўшы пачуццё, што табе трэба маўчаць), ці праз абмежаванне таго, што табе (такім, як ты) можна сказаць, ці праз адносіны таго, што ты «як жанчына» кажаш, да «аб'ектыўна правільнага».

Але вернемся да тэмы. Зразумела, што «проста так» тэкст студэнта Дзімы з'явіцца не мог. Хоць ён піша, што «нагодай для гэтага тэксту сталіся тры эсэ Алены Гапавай, якія з'явіліся ў узбудзілі пэўны рэзананс у інтэлектуальных колах нашай краіны», але рэзананс узбудзіўся цяпер, а эсэ з'явіліся (як прамя апошняга) шэсць гадоў таму. І ў той час нічога і нікога не ўзбудзілі. Іх ніхто не заўважыў, а можа, і не прачытаў – таму што тое, што піша жанчына, якая займаецца «гендэрнымі даследаваннямі», не мае навуковай ці інтэлектуальнай якасці апрыёры. Вядома, што навукі такой няма, займаюцца ёю нячэсныя навукоўцы (у асобе аўтаркі), якія сталі выдаваць гэтае фуфло, калі за яго пайшло бабло (фармулёўка М. Кацука), і што праблемы, пра якую яны гавораць, не існуе. Праўда, некаторыя жанчыны, а таксама мужчыны сцвярджаюць, што існуе – але яны так гавораць, таму што яны жанчыны, і, такім чынам, гэта ёсць жаноцкім пунктам гледжання. Правільным пунктам гледжання ёсць тое, што кажуць тыя, хто кажа, што яе няма. Тая частка, што гэта кажа, ніколі жанчынамі не была і досведу такога быцця не мае, але за першую палову ўсё добра ведае. Як сказаў Л. Талстой, «Наташа Растова – гэта я». Не важна, што гэта толькі палова. Паколькі яна (гэтая

1. Bourdieu, Pierre, Masculine Domination, Stanford University Press, 1998. P. 1.

2. Bourdieu, Pierre, Language and Symbolic Power. Harvard University Press, 1994. P. 138.

палова) мае ўладу вызначаць, што ёсць праўдай, а што не, яе пункт гледжання ёсць таксама агульначалавечым. Альбо, паводле Бурд'ё, якая версія будзе лічыцца легітымнай, залежыць ад статусу прамоўцы на полі сімвалічнай вытворчасці.

Друкавалі тыя эсэ адно часопісы, што абяцалі няшчаснаму народу нашаму лепшую долю праз доступ да «ўсіх тых багаццяў, што выпрацавала чалавецтва» (У. Ленін) у выглядзе посткаланіяльных даследаванняў, дэканструкцыі і яшчэ сёй-той дэрыды, ды і тое таму, што так «трэба было». Паколькі на Захадзе – адкуль прыйшлі ўсе гэтыя новыя навукі разам з рэсурсамі на іх распаўсюджанне – так званыя «гендэрныя даследаванні» ідуць з імі ў адным флаконе, дык гэткім чынам і ў нас патрэбна іхняя прысутнасць у інтэлектуальных выданнях. Ну, калі дзеля таго, «каб людзьмі звацца», дык няхай будуць, вырашылі тыя, хто адказваў у незалежнай Беларусі за інтэлектуальнае вяртанне ў Еўропу. Мы ж не горшыя. А эсэ тыя нікому не заміналі – так, займалі паўаркуша, быццам бы іх і няма.

Але аднойчы аўтарка тых эсэ – якая дзесьці там за мяжой нешта піша, ці выкладае, ці яшчэ што – ёсць за ёй нейкае «замежнае» імя, і таму яе і ў нас друкуюць (без сацыяльнага капіталу, якім з'яўляецца «Western connection», каму патрэбна жанчына «з гендэрнымі даследаваннямі»?) – дала ў зборнік, які мусіў апавядаць пра сур'ёзную рэч, якая завецца «казусам Беларусь», тэкст[2]. Дзе было ўсё тое ж самае, што раней. І нават часткова тымі ж словамі. Пра клас і нацыю і трошкі пра інтэлектуалаў, але без гендэру. Яна яго проста адтуль дастала, каб не ўскладняць аналіз яшчэ адной стратыфікацыйнай катэгорыяй. І вось тады гэтае старое-новае эсэ нечакана прачыталі. І некаторым здалося, што нейкім дзіўным чынам яно тычыцца ўсяго самага сур'ёзнага. Можна нават сказаць, святога. І не толькі тычыцца, а на яго замахваецца.

Што тут пачалося. Інтэлектуалы паўсталі. Яны ішлі шаблонымі радамі, як і хацеў аўтар незалежніцкага гімну Макар Крапаўцоў (але мне здаецца, што ён меў на ўвазе іншыя абставіны). Плячом да пляча. Яны баранілі Беларусь. Альбо сябе. Шчодрыя інтэлектуалы:

[2] Гаплова, Е. Кра Беларусские и Шлоссе

вядома, адно і тое ж самае. Бо, як піша студэнт Дзіма, нагадваючы Гегеля: «Апазіцыя ёсць духам у сучаснай беларускай сітуацыі». А хто лічыць інакш, той «замахваецца». Зрэшты, Гегель і замахваецца, таму што ён адмаўляў гісторыю (як праяву духу) народам, што жывуць на Усходзе Германіі, бо працаваў (калі пісаў пра «дух») у абставінах постнапалеонаўскай Еўропы на карысць канкрэтнай ідэі, мовы, гісторыі і дзяржавы. Але з Гегелем жа біцца не будзеш. Лепей з гендэрам.

между классом и капиталом // Пятніца. 2005. № 1(10).

Філосаф, а таксама рэдактар часопіса, што надрукаваў шэсць гадоў таму першае з нагаданых эсэ (паміж Саідам і Бадрыярам, з нагоды чаго ў аўтаркі нешта здарылася з вестыбулярным апаратам), сказаў на міжнародным круглым стале: «Вы спусцілі ўсіх беларускіх інтэлектуалаў ва унітаз». Аўтарка хацела адказаць, што спусціць ва унітаз можна толькі тое, што там ужо знаходзіцца, але стрымалася. Таму што ў такіх канцэптах, у адрозненне ад філосафа, пра людзей не думае, па-першае, і таму што баялася, што ўвечары яе паб'юць ў пад'ездзе, па-другое. Як пісаў беларускі класык у хрэстаматыйным вершы пра камсамольскі білет, «жыццё ж даражэй». Але пачала думаць, чаму замест аргументаў адносна сацыяльнай стратыфікацыі і прычын змены «грамадска-эканамічнай фармацыі» (менавіта гэта адбылося ў 1991 г. і пра гэта быў тэкст) Філосаф абвяшчае яго «нелегітымным» і імкнецца выкрасліць з дыскурсу. Чаму ён не спрачаўся па сутнасці справы, а імкнуўся выдаліць і «зачыніць»?

Найлепшы сацыёлаг краіны напісаў ёй у інтэрнет-дыскусіі: «Вы – Выскочка. Вы создали себе имидж на волне гендерных исследований, когда за это пошло бабло... Вы же – ничего из себя не представляете...»[3]

Мадэратар сайту, які спрабаваў заклікаць аўтара рэплікі калі не да поўнай шляхетнасці, дык хаця б да засцянковасці, быў названы душыцелем свабоды накшталт Мураўёва-Вешальніка і абвінавачаны ў злачынствах супраць розуму. Нейкія непадпісаныя асобы падкладалі ў агеньчык хто галінку, хто дрэва. Я часам думаю пра тых непадпісантаў. Яны цікавяць мяне як «з'ява» – такім жа чынам, як пісьменніка зацікавіў

феномен Паўліка Марозава, пасля чаго ён напісаў кніжку пра тое, як ідэалагічная машына стварыла постаць піянера-героя для легітымацыі «даносу» ў савецкім сацыяльным парадку[4]. Сапраўды, што павінен гаварыць сабе дарослы адукаваны чалавек, калі, не назваўшыся, піша пра другога чалавека (які ўвогуле не ўдзельнічае ў абмеркаванні) нешта такое, што мадэратар вымушаны выдаляць (я не ведаю, што гэта было). Якой «ідэяй» апраўдвае ён тое, што робіць? Чаму лічыць, што застаецца пасля гэтага такім жа, як быў раней? Ці важна ў гэтым выпадку, што гэты чалавек беларускамоўны? Можа, ён такім чынам нешта бароніць? Тады што?

Такім чынам, праз вялацякучы скандал гэтыя даўнія эсэ трапілі на вочы маладому чалавеку, студэнту. Без наводкі сяброў, таварышаў ён бы пра іх нават і не ведаў, таму што яны былі напісаныя, калі ён вучыўся у 8-м класе.

Малады чалавек цікавіўся экзістэнцыйнай філасофіяй, якая, ён лічыў, да гендэру дачынення не мае. Тое, што «экзістэнцыя» не абыякавая да полу, відаць, не прыходзіла яму ў галаву. Як і тое, што жаночая «экзістэнцыя» дагэтуль асэнсаваная не была, а калі такія спробы рабіліся, яны адразу ж аб'яўляліся аб'ектыўна няправільнымі. І што экзістэнцыя – гэта таксама і гісторыя цела, а цела культурай прыпісваецца полу (нават калі яно не хоча гэтага прыпісвання, а хоча мяняць свае азначэнні, рабіць з іх гульню і перформанс і тым разбураць сацыяльны парадак). І што цела, якое можа прымаць у сябе «іншага» – пеніс альбо дзіця, таксама мае досвед каланізацыі[5]. І што сексуальнасць ёсць досведам і сродкам пазнання. І што пол і сексуальнасць ёсць аднымі з фундаментальных катэгорый ідэнтычнасці, якія ляжаць у падмурку самой суб'ектнасці, а таксама ёсць спосабамі азначэння ўлады. І што гісторыя чалавецтва ёсць тымі трансфармацыямі, праз якія праходзілі целы, задавальненні і жаданні ў сваіх адносінах да прыватнага і публічнага жыцця. І што галоўны экзістэнцыйны філосаф Сартр пражыў усё жыццё побач з Сімонай дэ Бавуар, якая напісала першую ў свеце кніжку пра гендэр – «Другі пол», і нават кажуць, што напісала яе «з падачы» Сартра. І што ў гэтай кніжцы яна распрацавала паняцце «іншага»: жанчына ёсць «іншым» у дачыненні да мужчыны, які дзеля таго, каб акрэсліць

4 Дружников, Юрий. Доносчик 001, или Вознесение Павлика Морозова. – Москва, 1995.

сваю ідэнтычнасць як вышэйшага, абвясціў сябе ўладальнікам прыроды, да якой належыць і жанчына (і тады яна застаецца «целам», што б яна ні зрабіла – як і пісала аўтарка ў адным са сваіх тэкстаў, і што крытыкаваў студэнт, які адначасова аб'яўляў усіх жанчын сэксуальным бонусам, не разумеючы, што кажа тое ж самае). І такім чынам мужчына памясціў жанчыну ў пазіцыю гегелеўскага раба: «Жанчына заўсёды была калі не рабом мужчыны, дык яго васалам», напісала Бавуар, дадаўшы – «Жанчынай не нараджаюцца, жанчынай становяцца», бо няма нічога ў самой чалавечай прыродзе, што прыпісвае жанчыну да «іншага», і гэта ёсць сацыяльнай канструкцыяй. І яе канцэпцыя «іншага», распрацаваная адносна жанчыны, працуе адносна ўсіх маргіналізаваных, эксплуатаваных, прыгнечаных і абвешчаных «аб'ектыўна няправільнымі», і што на паняцці «іншага» будуюцца посткаланіяльныя даследаванні, якія ў нас зараз накшталт Евангелля. І што «эсэ», якія ён крытыкуе, якраз пра тое, як робяцца «мужчынамі» і «жанчынамі» ў сітуацыі постсавецкага класабудавання, ён таксама не зразумеў, таму што ні пра што такое яго не вучылі.

А пра фемінісцкую філасофію ён увогуле не чуў. Таму пра тэ, як вядома з Фуко, дзеля таго, каб з'явіўся аб'ект дыскурсу (паўная тэма альбо пункт гледжання), неабходныя гістарычныя ўмовы, каб пра яго «можна было нешта сказаць» і каб шматлікі пра яго сказаць нешта рознае. Неабходныя ўмовы, каб ён быў упісаны ў абсяг роднаснасці з іншымі аб'ектамі, устанавіў з імі адносіны падабенства, розніцы, ператварэння – гэтыя ўмовы не простыя і вызначаюцца структурай уладных адносін. А тады «нельга гаварыць пра што заўгодна ў які заўгодна перыяд часу»[6], бо структура поля не дазваляе гэтага самымі розным спосабамі. У тым ліку праз арганізацыю вытворчасці ведаў і таму на факультэце, дзе ён філософію вывучаў, панаваў «аб'ектыўна правільны» прынцып падзелу па галінах і дысцыплінах, і вытворчасць ведаў таксама лічылася «аб'ектыўным працэсам». Рацыянальным, лагацэнтрычным, які да гендэру не мае адносінаў. А каб гэтых адносін «не было», трэба было палову чалавечага досведу з тых студый увогуле вывесці. І тыя супярэчнасці, якія тут узнікалі ў адносінах да сацыяльнай сканструяванасці ведаў («агульначалавечае» патрабавала выдалення паловы чалавечага), сістэм ёсць

[5] Пра гэта, як існу (паўная тэма альбо пункт гледжання), неабходныя гістарычныя ўмовы, каб пра яго «можна было нешта сказаць» і каб шматлікі пра яго сказаць нешта рознае. Неабходныя ўмовы, каб ён быў упісаны ў абсяг роднаснасці з іншымі аб'ектамі, устанавіў з імі адносіны падабенства, розніцы, ператварэння – гэтыя ўмовы не простыя і вызначаюцца структурай уладных адносін. А тады «нельга гаварыць пра што заўгодна ў які заўгодна перыяд часу»[6], бо структура поля не дазваляе гэтага самымі розным спосабамі. У тым ліку праз арганізацыю вытворчасці ведаў і таму на факультэце, дзе ён філософію вывучаў, панаваў «аб'ектыўна правільны» прынцып падзелу па галінах і дысцыплінах, і вытворчасць ведаў таксама лічылася «аб'ектыўным працэсам». Рацыянальным, лагацэнтрычным, які да гендэру не мае адносінаў. А каб гэтых адносін «не было», трэба было палову чалавечага досведу з тых студый увогуле вывесці. І тыя супярэчнасці, якія тут узнікалі ў адносінах да сацыяльнай сканструяванасці ведаў («агульначалавечае» патрабавала выдалення паловы чалавечага), сістэм ёсць

Pulsi Heterosexuality and Lesbian Existence», у якім яна сцвярджае, што для жанчыны сітуацыя сэксуальны ёсць заўсёды права,

палітычных дактрын і ўсяго астатняга, у дактароў філасофіі пытанняў не выклікалі. Як і тое, што такім чынам ведаў з'яўляліся вынікам пэўнага сацыяльнага парадку і тамуіны з «аб'ектыўнасць» была ўяўнай. Бо дактары філасофіі – яны ж людзі. А людзі мусяць абвяшчаць «натуральным» альбо «аб'ектыўна правільным» той стан рэчаў, які ставіць мы (іхні досвед) у прывілеяванае становішча. Калі мы займаемся філасофіяй, мы гендэру адцураемся. Той факт, што ўсё аб'ектыўна правільнае з'яўляецца «мужчынскім» і што, такім чынам, мужчыны і жанчыны адцураюцца вельмі па-рознаму, яму ніхто не сказаў. А Фуко ён яшчэ не прачытаў[7]. А пра гендэрную эпістэмалогію не ведаў.

Вось у такога інтэлектуальнага досведу – з упэўненасці, што ўсё значнае знаходзіцца па-за гендэрам, малады чалавек ў адказ на «гендэрныя» эсэ напісаў свой тэкст, таму што не мог маўчаць. Яны нешта такое закраналі, што тычылася самой магчымасці «быць кімсьці». Ён верыў, што адстойваў «аб'ектыўна правільнае» і што не воля да абароны мужчынскасці падштурхнула яго да тэксту. І сапраўды, не гэта было прычынай – не абарона мужчынскасці, альбо не мужчынскасці *per se*, а толькі як складніка ідэнтычнасці альбо «класавай пазыцыі» пэўнай групы. Тэкст ускосна (ці прама?) звязаны з тымі дыскусіямі вакол эсэ, што ішлі сярод старэйшых таварышаў і выкліканы да жыцця непакоем групы інтэлектуалаў адносна сваёй ролі і статусу, бо нейкім чынам тэксты пра гендэр іх закраналі. Змест іх у наступным. Я пераказваю далей свае больш новыя тэксты, для якіх эсэ шасцігадавой даўніны сталі пачаткам; яны апублікаваныя па-ангельску і па-расейску[8]. Ад старых яны адрозніваюцца тым, што лепей прагавораны «клас» (без якога ўся канструкцыя не мае «фізічнага сэнсу»).

Сэнсам таго, што адбываецца на постсавецкай прасторы, ёсць фармаванне (праз дзеянне рынку) эканамічнай нярэдкасці, г. зн. класатварэнне, а «нацыянальнае» ёсць той формай, праз якую новыя эліты (карані якіх знаходзяцца ў камуністычнай сістэме) маюць магчымасць атрымаць палітычную ўладу (бо «нацыі» з'яўляюцца адзінымі арганізацыйнымі формамі, якім мелі ў 1991 г. інстытуцыянальную гісторыю). «Нацыянальнае»

6 Фуко, Мишель. Археология знания. т. Москва, 1996.

7 Пішучы гэта, я разумею, што страшэнна спрашчаю «гендэр» да ідэнтычнасці, а ён ёсць таксама сацыяльнай пазыцыяй, а калі гаворка ідзе пра вытворчасць ведаў, то і метадалогіяй (якая цяпер ёсць больш пытаннем – «Якая яна павінна быць?», чым адказам на гэта пытанне), але нельга абхапіць «усё адразу».

8 Гэта ёсць Бунаці, Г. Гендэр, класа і нацыя ў сістэме камунізме

стала тым прынцыпам, які дазволіў прадставіць 1991 г. як «справядлівае», г. зн. зрабіўся спосабам легітымацыі сістэмы і іншай сістэмы няроўнасці.

Новы сацыяльны парадак (класавы як «нацыяльны») будуецца, перш за ўсё, праз змену сістэмы гендэрных адносін, таму што гендэр ёсць першым, самым элементарным узроўнем сацыяльнага, тым спосабам, пры дапамозе якога канструююцца і легітымізуюцца дачыненні падпарадкавання/дамінавання паміж мужчынамі і жанчынамі, якія ёсць фундаментальнымі пры азначэнні адносін улады[9]. Канкрэтныя гендэрныя азначэнні рэканструююцца кожны раз, калі мае месца барацьба за перадзел улады ў грамадстве; і хаця гэта барацьба заўсёды ўключае гендэр (таму што ён ёсць часткай сацыяльнага), яе сэнс не ў змене гендэрных адносін як такіх, а ў атрыманні той сацыяльнай улады, часткай якой яна з'яўляецца. Іншымі словамі, праз выпрацоўку пэўных дачыненняў паміж мужчынамі і жанчынамі будуюцца нацыя і клас. Новая «капіталістычная» маскуліннасць звязана з доступам да рэсурсаў і дэманструецца праз «валоданне жанчынамі» (у якіх – у ідэале – «няма рэсурсаў»). Што не значыць, што пры новым сацыяльным парадку такімі робяцца ўсе мужчыны (і тыя, што такімі не робяцца, павінны выпрацоўваць маскуліннасць праз іншыя рэсурсы – гл., напрыклад, зб. пад рэд. с. Ушакіна «О муже(N)ственности» (Москва: НЛО, 2002), але мужчына – гэта «моц», якая даказваецца праз валоданне жанчынай, але ўрэшце раўнуецца класавай пазіцыі.

Тут цікава глядзець на прыкладах розных культурных сведчанняў ужыванне «нацыянальнага праекту» як сімвалічнага рэсурсу пры будаванні новых дачыненняў дамінавання і падпарадкавання. Прачытайце тэкст студэнта: пра яго «быць кімсьці» праз нацыянальнае самавызначэнне, пра мужчынскае як аб'ектыўна правільнае і пра тое, кім у яго нацыянальнай мары атрымліваецца жанчына. Абвешчаная ў ідэальным нацыянальным парадку сексуальным «бонусам», яна ў лепшым выпадку «даглядае мужчыну» ў ролі «нацыянальнай маці». «Быць кімсьці», г. зн. мець незалежную суб'ектнасць альбо

Гендэрные и сексуальные исследования. 2005. № 13; Gapova, Elena. Conceptualizing Gender, Nation and Class in Post-Soviet Belarus // Post-Soviet Women Encountering Transition: Nation Building, Economic Survival, and Civic Activism / Carol Nechemias, Kathleen Kuehnast eds. – Woodraw Wilson Center Press, 2004.

9. Joan, Scott. Gender and the Politics of History. Columbia University Press, 1988. P. 2.

аўтаномію, яе не тычыцца, бо нацыя ёсць «мужчынскім братэрствам», у якое жаночае «дапускаецца» ў пэўнай ролі і функцыі. Калі ж «жаночае» выходзіць за дазволеныя ёй межы і набывае незалежную суб'ектнасць, яно «цэнзуруецца» вельмі жорстка і «выдаляецца» з публічнай прасторы. У 2003 г. я зрабіла кніжку «Женщины на краю Европы»[10], якую рыхтавала шэсць гадоў, а аўтараў шукала на ўсім свеце (ва ўступе пад назвай «Кроя края Европы» я пішу пра гэта – яно само па сабе цікава). Рэцэнзіі на яе з'явіліся, між іншым, у «Slavic Review» і «Russian Review» – двух галоўных славісцкіх часопісах. Гэта адзіная выдадзеная ў Беларусі кніжка, якая была такім чынам заўважана. Мне давялося стаць рэдактарам серыі календароў «Жанчыны Беларусі: гісторыя ў паўсядзённасці» (выйшла ўжо шэсць выпускаў[11]). Гэта «візуальны» праект, які мае сваёй мэтай рэпрэзэнтаваць усходнееўрапейскае культурнае пагранічча праз артэфакты яго сацыяльнай гісторыі: плакатамі, карыкатурамі з часопісаў, фатаздымкамі з прыватных архіваў і іншымі сацыяльнымі дакументамі. Кожны выпуск (пачынаючы з 2001 г.) мае сваю тэму і ёсць вынікам навуковага праекту, таму што ў гатовым выглядзе гэтыя «дакументы» нідзе сабраныя не ляжаць, і навукоўцы, што робяць гэтыя выданні, прэзентуюць у іх вынікі сваіх шматгадовых пошукаў. Ніводнага разу ніводзін з рупліўцаў бацькаўшчыны, якія жываты свае кладуць за несавецкую версію нацыянальнай гісторыі, ніколі нідзе і ніяк публічна не заўважылі гэтых выданняў і працы многіх людзей: не пакрытыкавалі, не пахвалілі, не «раздраконілі», не нагадалі, бо «жаночай гісторыі» няма месца ў той версіі, якую яны будуюць. Дарэчы, нацыя, казаў Карл Дэйч, – гэта пастаянны працэс перамоў пра тое, хто мае права ў яе ўваходзіць, гэта няспынны працэс ўключэння адных і выключэння іншых. І гэта тычыцца не толькі «этнічнасці», але і гендэру.

Калі паглядзець на дыскусіі адносна незалежнасці, гістэрыі, дэмакратыі, грамадзянства, сям'і, прыватнага і публічнага – за апошнія 15 гадоў у незалежных беларускіх СМІ, тых самых, што выступаюць за «правы чалавека», «вяртанне ў Еўропу», «дэмакратыю», «свабоду слова» і г. д., жаночае там можа быць альбо «бонусам», альбо (рэдка) маці. Амаль ніколі жаночае там як «чалавечае». Іншага жаноцкага ў «Нашай Ніве», і яно нават не пачынае выпрацоўвацца. А пра «Белгазапромбанк» казаць не хочацца.

[10] Гэтую кніжку я хрысціла Памяці Пятроўскай, Тацяне Іванаўне (Рипинской).

Аналіз культурных сведчанняў, што існуюць у газетах, часопісах і г. д. (яны ёсць элементамі дыскурсіўнай расказы, і іх аналіз ёсць легітымным сацыялагічным метадам), не тры не падабаецца студэнту (як калісьці і Філосафу). Яны сцвярджаюць, што гэта нязначныя тэксты, і што людзі, якія іх пісалі, не пра што «такое» і не думалі (а некаторыя вельмі крытычна адносяцца да ідэй «вялікага мінулага» і іншай нацыянальна арыентаванай міфалогіі[12]). І я веру, што не думалі (таму і прагаварыліся). І нават лічу, што іх аўтары – часта «нармальныя людзі». Толькі чамусьці гэтыя людзі 15 гадоў пішуць толькі так. Яны здольныя прагаварыць сабе мужчыны (нават інтэлектуальна) толькі праз «валодаюць жанчынай». Будаваць сваю мужчынскую ідэнтычнасць і ў чынам яны не ўмеюць. Што рабіць, калі жанчына не ёсць бонусам, не ведаюць. Таму што тады ўвесь сацыяльны парадак, што пабудаваны на «мужчынскай прывілеяванасці», разбураецца. А гэта ўжо перадзел улады, бо гендэр ёсць спосабам яе канцэнтрацыі.

Ох, расказы, і мне тры не войны, дзе, якія іх вельмі нашы своего тэкса – и про аўтары – едзі 15 гадоў. Гэтыя людзі як лодочки, что были у нее в детстве. Па парадак, моей мамы, Валентины Гаповой. Она научила меня самому главному в жизни: подать нищему, ответить убогому, накормить того, кто пришел в дом и, более всего, – жить интеллектуальной целью». Для мяне вельмі важна сказаць, што «як чалавек» я паходжу

ад гэтых дзвюх жанчын і заўсёды памятаю тыя маральныя выбары, што яны рабілі ў жыцці.

[11] Можна паглядзець тут.

Незалежныя выданні пазіцыянуюць сябе асяродкам дэмакратыі, за якую я галасую як грамадзянка (і таму пішу пра яго, а не чым пра дзяржаўную прэсу). Для мяне няма пытання, галасаваць за «той бок» ці за «гэты». Але вось што – разумець вышэй – абяцяе мне тая «дэмакратыя», што прадстаўлена ў апазіцыйных выданнях, і з гэтага пункту гледжання яна ідэалогія, што і ў дзяржаўных[13]. Адзін бок пад дзяржаўнымі фанфары ладзіць конкурс прыгажосці як сродак барацьбы з гандлем жанчынамі (!) – так сказаць, не дамо за мяжу вывозіць, «выкарыстаем» сам. І другі – гаворыць тое ж самае. Таму для мяне як для жанчыны ў гэтай сітуацыі выбару ўвогуле не існуе. Сапраўды, Вірджынія Вулф ведала, што казала, калі напісала (на пачатку ХХ ст.), што ў жанчын няма нацыі: «As a woman, I have no nation». Дарэчы, гэта ўсё пра грамадзянства як гендэрную катэгорыю.

[12] Гл. Акудовіч, В. Без нас // Рабочы. – 2004. – 74–77.

[13] Гл. пра гэта: Gapova, Elena. Reinventing Men and Women within the Belarusian Nationalist Project // From Gender to Nation / Julie Mostov, Rada Iveković ed. – Longo Editore: Ravenna, 2002.

[14] Гл. пра гэта: Гапова, Елена. О политической экономии «национального языка» в Беларуси // Ab Imperio. Исследования по новой имперской истории и национализму на постсоветском пространстве. № 3. 2005.

[15] Гл. пра гэта: Gapova, Elena. Intellectuals and the Anticolonial Struggle: Theories of the New Class // Intellectuals and Power. – Minneapolis, London: University of Minnesota Press, 2004; Suni R., Kennedy M. Ideology, Intellectuals and the Anticolonial Struggle // The University of Michigan Press, 2001.

Гэта парадоксальна, але ўнікальнасць інтэлектуалаў у постсавецкім сацыяльным працэсе ў тым, што менавіта яны артыкулююць нацыю праз апеляцыю да мовы, іншай версіі гісторыі, да размеркавання рэсурсаў праз рынак, да «дэмакратыі» і г. д. (гістарычна нацыю заўсёды артыкулююць інтэлектуалы). Упэўненыя, што не маюць іншага інтарэсу, акрамя служэння «аб'ектыўна правільнаму» і свайму «народу», яны артыкулююць інтарэсы паўстаючага класа (новых эліт), таму што нацыя ёсць «прыкрыццём» новай класавай

стратыфікацыі. Я ўсведамляю, што пішу, але тут няма месца для абмеркавання гэтага пытання: падрабязна я пісала пра гэта ў іншым тэксце[14], і ўвогуле пра гэта існуе багатая літаратура[15]. Такім чынам, інтэлектуалы ўцягнуты ў сацыяльны (гістарычны) працэс, якога не могуць пазбегнуць. З гістарычнага працэсу нельга выйсці, бо ён існуе па-за намі, але можна ў гэтых умовах шукаць сацыяльных зменаў на карысць усіх. А можна замяшчаць інтарэсы ўяўнага народу сваімі карпаратыўнымі інтарэсамі, якія вырастаюць з ролі інтэлектуалаў у полі сімвалічнай вытворчасці і якія, хаця і не непасрэдна эканамічнай прыроды, звязаны з магчымасцямі, сацыяльным капіталам і ўладай. І якія ўключаюць «гендэр», але толькі як частку класавага парадку.

Вось гэты сацыяльны парадак вельмі добра выяўляецца праз гендэрны аналіз. Як і тыя інтарэсы, што стаяць за «дэмакратыяй», як і тое, хто на чый інтарэс працуе. Вось гэта тая «праўда», якую нельга было «сказаць» і якую імкнуліся «цензураваць» удзельнікі абмеркавання «эсэ» – і філосаф, і сацыёлаг, і непадпісанты, а зараз выказаўся студэнт Дзіма (які хоча «кімсьці быць»). Той інтарэс, які яны баранілі. Як «класавы», так і гендэрны. Усё адразу.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/06/04**
[image]

АНАТОЛЬ ТРАФІМЧЫК
гісторык, супрацоўнік Баранавіцкага ўнівэрсытэту.

Анатоль Трафімчык
Развянчанне брэнду беларускага Таджыкістана

Парашкоў С. А. *Гісторыя культуры Беларусі*. Мінск: Беларуская навука, 2003. – 444 с.

Любая рэцэнзія праз сваю жанравую спецыфіку надзелена пэўнай ступенню эмацыйнасці – ці то яна станоўчая, ці то наадварот. Любое выданне, якое бярэцца для напісання рэцэнзіі, з першага ж судакранання, знаёмства з аўтарамі, рэцэнзентамі (калі ёсць) etc., ужо выклікае нейкія спярша эмоцыі, а пасля – думкі. Гэтаксама сталася з падручнікам (відаць, найлепей так маркіраваць выданне, якое, паводле анатацыі, «носіць вучэбны характар») па «Гісторыі культуры Беларусі» С. А. Парашкова, выдадзеным пад грыфам Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова ў менскім выдавецтве «Беларуская навука».

Першая асацыяцыя пры знаёмстве з выходнымі звесткамі кнігі (у прыватнасці, з месцам выдання) была з жартаўлівай прапановай Юрася Барысевіча пабудаваць Савецкі Саюз у «асобна ўзятай краіне», дзе Магілёўская вобласць з’яўлялася б Таджыкістанам. Да таго ж асабістае знаёмства з нашым усходам ужо было: на банкеце, які ладзіўся пасля літаратуразнаўчай канферэнцыі ў МДУ (люты 2002 г.), мяне ажно страсянула, калі рэй павялі ў духу панславізму

«старэйшыя браты» з Расіі (прычым нацыянальна настроеныя «асобы» талерантна, «па-беларуску», нават слова не сказалі папярок); ды калі да ўсяго наладзілі дыскатэку пад спевы найвульгарнейшага расійскага гурта «Рукі ўверх» – сапраўдны шабас. Не вытрымаўшы хаўрусу такой «эліты», я пасунуў, не спужаўшыся марозу, на вакзал чакаць цягніка.

Далей настала чарга рэцэнзентаў. Іх склад разнародны, што тым больш штурхае да высвятлення пытання, чыя ж пазіцыя перамагла. Бо калі імёны г. Я. Галенчанкі ды А. У. Рагулі гучаць у беларускім гістарыяграфічным дыскурсе нейтральна, то прозвішча П. Ц. Петрыкава хутка ўжо стане сінонімам даследчыкаў, што пішуць «новую старую гісторыю» (дэфініцыя польскага гісторыка В. Сьляшынскага). Дастаткова зірнуць на адну з апошніх публікацый беларускага гісторыка-«аксакала»[1], каб пераканацца, што яе аўтар – шчыры homo soveticus, а не гісторык. А прозвішча, якое носіць яшчэ адзін рэцэнзент, даўно ўжо стала імем агульным, хадзячай назвай, ці, як сёння модна казаць, брэндам (прашу прабачэння ў яго носьбіта – А. Л. Абэцэдарскай, так разумею, дачкі сумнавядомага Л. С. Абэцэдарскага).

Структурна падручнік не адрозніваецца ад падобных выданняў: традыцыйныя «Уводзіны», 9 раздзелаў асноўнай часткі, кароткае «Заключэнне», спіс выкарыстанай літаратуры з амаль 100 пазіцый, дастаткова багаты слоўнік тэрмінаў (с. 371–443).

Ва ўводзінах пасля разважанняў стасоўна дэфініцыі «культура» аўтар пераходзіць да разгляду беларускай гісторыі культуры, адзначаючы, што яна «прайшла асноўныя этапы, характэрныя для еўрапейскай культуры» (с. 5). Далей аўтар закранае метадалагічную праблему вывучэння гісторыі культуры, звяртаючы ўвагу на тое, што такі метадалагічны падыход, які «склаўся за савецкі час» («гаварыць пра культуру, па-першае, як выключна пра культуру мастацкую і, па-другое, як пра «надбудову» – ідэалагічную ілюстрацыю ўсёмагутнасці эканамічнага базіса»), «пакуль утрымліваецца ў тыповых праграмах курсаў «Гісторыя Беларусі» і «Гісторыя культуры Беларусі», якія зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь для вышэйшых навучальных устаноў» (с. 7). Такім

чынам, чытачу даецца зразумець, у якім рэчышчы выкладаецца матэрыял. Аднак абнадзейвае прыслоўе «пакуль», якое пранікла быццам бы выпадкова, праз недагляд рэцэнзента і за якім можа хавацца і сапраўдная пазіцыя аўтара.

Пазначаны і мэты, якім служыць гэтае выданне, перадусім – павышэнне нацыянальнай свядомасці насельніцтва, у першую чаргу – моладзі (с. 8).

Структурызацыя працы збольшага прывычная для беларускай гістарыяграфіі. Як павялося, першасная ўвага ў гісторыі Беларусі першай паловы XX ст. надзяляецца ўсходняй частцы краіны, а вось «тэму, якую ўмоўна можна назваць «Культурнае развіццё (жыццё) Заходняй Беларусі» аўтар «свядома не ўводзіць і падрабязна не разглядае» (с. 9), за чым можа стаяць або яго некампетэнтнасць, або адсутнасць магчымасці больш-менш аб'ектыўна рэпрэзентаваць тую тэму ў гэтым выданні. Будаўнікі «светлай будучыні» з пункту гледжання варункаў, створаных для развіцця беларускай нацыянальнай культуры савецкай уладай, паўсталі б адыёзнейшымі за польскіх шавіністаў II Рэчы Паспалітай, што ў сучасным афіцыёзе лічыцца «няправільным».

1 Петриков П. Т. Основные направления историографии Беларуси конца XX – начала XXI веков // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі. Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі 28 лістапада 2003 года. Мінск, 2003. Частка 2. С. 499–508.

Не абышлося і без даніны створанай прэзідэнтам Беларусі дзяржаўнай ідэалогіі[2] (с. 11–13). Наогул подых цяперашняга ідэалагічнага дыктату практычна не адчуваецца ў першых раздзелах, але ўзмацняецца пры набліжэнні да перыядаў ці момантаў, якія не страцілі палітычнага значэння.

Першы раздзел «Культура беларускіх зямель у IX–XIII стст.» (с. 13–51) пасля палітычнай прэамбулы (з яе пачынаецца кожны з раздзелаў, бо сацыяльна-палітычны кантэкст сапраўды ў многім дэтэрмінуе развіццё культуры) коратка апісвае прыход хрысціянства на землі Русі і ў гэтай сувязі распаўсюджванне

пісьменства, якому надзяляецца значная ўвага. Аднак аўтар не наважваецца нават згадаць спрэчкі адносна старажытнасці «Слова аб паходзе Ігаравым», хоць сёння яго стварэнне ў XII ст. хутчэй не даказана, чым даказана, тым больш, што пры наяўнасці сур'ёзных контрверсій С. Парашкоў звычайна не пазбягае іхняе згадкі. Рэч, мусіць, у такім жа падыходзе да «Слова…» ў свежай акадэмічнай «Гісторыі Беларусі»[3]. Раздзел другі «Развіццё культуры Беларусі ў XIV – першай палове XVII ст.» (с. 52–129) звяртае ўвагу, што «пэўны час дамінуючае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім займалі цэнтральныя (беларускія) землі» (с. 53). Адпаведным чынам акрэсліваецца роля, якую адыгрывала старабеларуская мова ў ВКЛ, і расказваецца пра асноўныя пісьмовыя помнікі тае эпохі, іх стваральнікаў. Прычым, на «працэсах, якія адбываліся ў гэты час вакол беларускай мовы» аўтар прыпыняецца падрабязней (с. 55–58). Беларуская культура эпохі Адраджэння слушна асвятляецца ў шчыльнай сувязі з агульнаеўрапейскай.

Перыяд, які разглядаецца ў наступным раздзеле (другая палова XVII – XVIII стст., С. 130–165), «быў вельмі складаным для Беларусі». Аднак гэта не значыць, што культурнае развіццё ў Беларусі прыходзіла ў заняпад. Наадварот, яно часамі было імклівейшым, чымся ў Кароне Польскай, пра што сведчыць прыведзены, прыкладам, факт узвядзення ў Нясвіжы першага ў цэлай Рэчы Паспалітай помніка архітэктуры барока – касцёла езуітаў (с. 138). У той жа час аўтар дае зразумець чытачу, што паланізацыя і акаталічванне для развіцця беларускай культуры не спрычыняліся да яе заняпаду ў такой ступені, як пры наступе візантыйска-азіяцкай расійшчыны. Напрыклад, што тычыцца беларускай іканапіснай школы, дык адзначаецца спыненне яе развіцця як самабытнай з'явы «ў выніку забароны уніяцтва і насаджэння праваслаўнай царквой на Беларусі псеўдавізантыйскіх форм мастацтва» (с. 143), хоць гэты факт «перабег» з наступнага раздзела.

Рэзюмуючы сказанае ў раздзеле, аўтар дае высокую ацэнку развіццю культуры ў Беларусі ў XVII–XVIII стст., хоць у канцы XVIII ст. яго «стрымлівала палітыка царскіх улад, а таксама інтэнсіўная паланізацыя, што закрывала шлях беларускай культуры» (с. 164). Праўда, прыведзеныя прыклады з'яўляюцца

найлепшым доказам таго, што першы чыннік (расійскі імперыялізм) быў большай перашкодай, чым польскі фактар.

На самым пачатку раздзела «Культура Беларусі першай паловы XIX ст.» (с. 166–202) гаворыцца пра мэты і інтарэсы Расійскай імперыі на далучаных у канцы XVIII ст. землях, а менавіта – «дасягненне пэўнага сацыльна-эканамічнага і культурна-этнічнага адзінства расійскага і беларускага грамадства» (с. 166). Ды неўзабаве, забягаючы наперад, аўтар, нягледзячы на канстатаванне жорсткага ўціску пад прэсам расійскай культурнай палітыкі (пры далейшым працягу значных уплываў пальшчызны) заключае: «І ўсё ж у дачыненні да нацыянальна-культурнага развіцця беларускага народа далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі аб'ектыўна адыграла станоўчую ролю» (с. 169). Маўляў, «яно стварыла такую сітуацыю, якая востра паставіла праблему нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў» (с. 169). Далейшае ж асвятленне працэсаў у сферы культуры адбываецца збольшага палітычна нейтральна і блізка да аб'ектыўнасці.

Раздзел «Культура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Рух за беларускае культурнае адраджэнне» (с. 203–241) дакладней ахоплівае храналагічны перыяд з 1861 г. (добры дзесятак гадоў выпадае, што не адпавядае назве) да восені 1917 г. Пасля азначэння паняцця «нацыя» ідзе грунтоўны і паказальны (трохі большы за папярэднія) агляд палітычнай, эканамічнай, сацыяльна-дэмаграфічнай сітуацыі ў Беларусі, паказчыкі якой сведчылі «пра эканамічнае нераўнапраўе беларускай нацыі, яе малую канкурэнтаздольнасць не толькі ў эканамічным, але і ў культурным жыцці» (с. 206). Асобна падкрэсліваецца склад інтэлігенцыі «Северо-Западного края», сярод якой беларусы складалі 15,8 % (трэція пасля яўрэяў – 55,1 % і расейцаў – 19,3 %) з усіх разам 9 тыс. (с. 207). Дый тыя паўтары тысячы інтэлігентаў-беларусаў, як уважае аўтар, «не дараслі да асэнсавання сваіх асобных ад расійскай рэчаіснасці ці польскай ідэі дзяржаўна-палітычных ідэалаў» (с. 207), «важнай асаблівасцю» чаго С. Парашкоў лічыць «страту пераемнасці». Найбольшая ўвага ў раздзеле надаецца апошнім гадам дваццаці азначанага перыяду: толькі да гэтага часу развіццё беларушчыны змагло набыць імклівасць, якая

засведчыла, што беларусы не толькі не міф, але нацыя са сваёй шматвяковай гісторыяй і культурай.

Шостым раздзелам «Культурнае будаўніцтва на Беларусі (кастрычнік 1917–1941 гг.)» (с. 242–303) аўтар чарговы раз пацвярджае, што ён ці то не надта абазнаны ў палітычных працэсах (якія не страцілі актуальнасці і сёння), ці то, шукаючы «залатую сярэдзіну», свядома дапускае супярэчлівыя сцверджанні. Кажучы, што пасля «Кастрычніцкай рэвалюцыі ўзнікла рэальная магчымасць нацыянальна-культурнага адраджэння беларускага народа» (с. 242), С. Парашкоў не толькі не падмацоўвае аргументамі гэтую тэзу, але і надалей фактычна канстатуе, што бальшавіцкая ўлада ад пачатку пераследавала беларускі нацыяналізм. Аўтар аддае ёй належнае ў правядзенні адукацыйнай палітыкі. Але за голай статыстыкай не раскрываецца фактычны ўзровень намінальнай адукацыі і сутнасць працэсаў, у ходзе якіх зжываліся нацыянальныя элементы (пра гэта – адным сказам) і татальна насаджалася русіфікацыя і ідэалагізацыя навучання. Дый наогул, як сведчаць сучасныя даследаванні, беларусізацыя – гэта быў усяго толькі сродак для выяўлення і элімінацыі яе перадумоў і праваднікоў, ужыванне якога пасля выканання яго функцыі было згорнута[4]. С. Парашкоў сцвярджае, што дасягненні беларусізацыі і многія яе дзеячы былі знішчаны, беларуская мова шляхам рэформы наблізілася да расейскай, але ўпарта не хоча належна ацаніць нанесеную саветамі шкоду беларускай культуры, хоць і прызнае яе «непапраўнай» (с. 294).

У раздзеле «Развіццё культуры БССР у першае пасляваенае дзесяцігоддзе (1945–1956 гг.)» (с. 304–319) аўтар канстатуе прасякнутасць культурнага жыцця Беларусі «сталінскім таталітарызмам ва ўсіх кірунках літаратуры, асветы, культуры, мастацтва», паноўнай ідэалогіяй і класава-партыйным падыходам (с. 319).

Наступны перыяд (другая палова 1950-х – першая палова 1980-х гг.), як і папярэдні, не атрымаў разгорнутага асвятлення, заняўшы паўтара дзесятка старонак (с. 320–334), хоць як правіла, у сінтэзах з гісторыі ступень увагі ў меры набліжэння да сучаснасці ўзрастае. У гэтым раздзеле аўтар дыпламатычна

[4] Калінаў І. Беларусізацыя // Беларускі Гістарычны Агляд. Т. 8. Сш. 1–2 (14–15). 2001. С. 273–295. Гл. таксама: Беларусізацыя:

пазбягае ацэнкі палітычнай сітуацыі, у якой развівалася 1920-я гады: нацыянальная культура, адзначаючы супярэчлівасць яе развіцця, і побач з адзначэннем поспехаў кажа пра правядзеныя русіфікацыі і «празмернай ідэалагізацыі», абмежаваныя «свабоды творчасці», «дэфіцыт нацыянальнай культуры», «страту нацыянальнай свядомасці» (с. 334). Гэта наводзіць на думку, што розныя раздзелы рэцэнзавалі розныя рэцэнзенты, таму і сустракаюцца непаслядоўнасці.

Затое апошні раздзел «Сучаснае культурнае жыццё Беларусі» (с. 335–366) нібыта «кампенсуе» ўсе ранейшыя ідэалагічныя «недапрацоўкі». Паводле яго можна падумаць, што ўздым навуковага і культурнага развіцця настаў з сярэдзіны 1990-х гг. (чытай: пасля абрання прэзідэнтам А. Лукашэнкі), хоць аўтар, падводзячы рысу раздзела, адзначае наяўнасць недапрацовак у дзяржаўнай палітыцы, але іх не называе. Так, наступствы ўвядзення расійскай мовы другой дзяржаўнай «тактоўна» абмінаюцца. Іншы раз інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці: Парашкоў гаворыць пра ліберальныя варункі для літаратурнай творчасці (с. 347), хоць вядома, што Славамір Адамовіч апынуўся за кратамі менавіта за верш, чым паўтарыў лёс згаданага на С. 273 Алеся Дудара. Не чутно ў кніжцы і голасу «сумлення беларускай нацыі» – Васіля Быкава. Найбагацейшы пласт культуры (перадусім фолк- і рок-музыкі, мастацкай літаратуры, гісторыі) таксама застаецца па-за ўвагай, відавочна, з прычыны нелаяльнага стаўлення іх дзеячаў да сённяшняй дзяржаўнай палітыкі. Гэта, мусіць, іх С. Парашкоў называе нігілістамі (с. 348, 359).

Галоўнае, што можна і нават неабходна вынесці з падручніка, – гэта ўсведамленне неспрыяльных, за выключэннем рэдкіх часавых адрэзкаў, умоў развіцця беларускай культуры, пры якіх яе выжыванне з’яўляецца ці не найлепшым доказам яе самабытнасці і значнасці, нягледзячы на сумненні і абвяржэнні нігілістаў, у тым ліку самага высокага рангу.

І ўсё ж недахопы гэтай кнігі з грыфам дзяржаўнай установы можна «спісаць» на этап сучаснай навукі і культуры афіцыйнай Беларусі, які трэба перажыць. Яе аўтар у пэўнай ступені разбурае стэрэатып, які склаўся ў многіх беларускіх

інтэлектуалаў пра ўсё, што made in Магілёў, як пра нешта глыбока непаўнавартаснае.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/06/04
[image]